В. Дз. Старычонак

# 150 сачыненняў

## па беларускай літаратуры:

## У ДАПАМОГУ АБІТУРЫЕНТАМ І ШКОЛЬНІКАМ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск
"Вышэйшая школа"
1999

УДК 808. 26-8
ББК 81. 2 Беи- 922
С 77

**Старычонак В. Дз.**

150 сачыненняў па беларускай літаратуры: У дапамогу абітурыентам і школьнікам. — Мн.: Выш. шк., 1999. — с.

ISBN 985 - 06 - 0408 - 5.

У дапаможніку прыводзіцца 150 тэкстаў сачыненняў на самыя разнастайныя тэмы: па гісторыі беларускай літаратуры, аналізу творчасці пісьменнікаў, харатарыстыцы асобных персанажаў, аналізу твораў сучаснай літаратуры. Значная ўвага ўдзяляецца сачыненням на вольную (свабодную) тэму, напісанне якіх выклікае ў абітурыентаў пэўныя цяжкасці.

Дапаможнік будзе карысны для абітурыентаў, вучняў старэйшых класаў, слухачоў падрыхтоўчых курсаў.

**УДК 808.26 - 8**
**ББК 81. 2. Беи - 922**

ISBN 985 - 06 - 0408 - 5.

© В. Дз. Старычонак, 1999
© Выдавецтва “Вышэйшая школа”, 1999

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## АД АЎТАРА

Кніга “150 сачыненняў па беларускай літаратуры” з’яўляецца працягам папярэдніх выданняў “Ах, сачыненні, сачыненні...”, “55 сачыненняў па беларускай літаратуры”, “100 сачыненняў па беларускай літаратуры”. У ёй прыводзяцца тэксты сачыненняў на самыя разнастайныя тэмы: па гісторыі літаратуры Сярэднявечча і Адраджэння, аналізу празаічных і драматычных твораў XIX — XX стагоддзяў, характарыстыцы літаратурных герояў, параўнальнаму аналізу вобразаў, творчаму шляху пісьменнікаў і паэтаў. Змешчаны ў дапаможніку і сачыненні на свабодную тэму. Яшчэ раз хацелася б нагадаць, што сачыненне — жанр славеснай творчасці, і прадугледжвае граматнае, лагічнае, паслядоўнае, эмацыянальнае і стылістычна правільнае выкладанне ўласных думак, глыбокае разуменне літаратурнага твора, веданне асноўных літаратурна-крытычных артыкулаў, уменне мысліць, разважаць, супастаўляць, аналізаваць, суперажываць... Таму нельга завучваць сачыненні на памяць і спрабаваць выдаваць іх за свае “творы” на экзамене. Гэта прывядзе толькі да зніжэння адзнакі. Карысць можа прынесці толькі творчая перапрацоўка прыведзеных сачыненняў, якія трэба не столькі чытаць і запамінаць, колькі аналізаваць, рэцэнзаваць і тым самым трэніраваць сябе, удасканальваць сваю ўласную манеру пісьма.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА НАПІСАННЯ САЧЫНЕННЯЎ

Пісьмовы экзамен па беларускай мове і літаратуры ў ВНУ праводзіцца ў форме сачынення — жанру славеснай творчасці. Экзамен сведчыць аб узроўні эстэтычнага і духоўнага развіцця абітурыента, суме фактычных ведаў па мове і літаратуры, іх глыбіні. Сачыненне прадугледжвае граматнае, лагічнае, паслядоўнае, эмацыянальнае і стылістычна правільнае выкладанне абітурыентам сваіх уласных думак, глыбокае разуменне літаратурнага твора, веданне асноўных літаратурна-крытычных артыкулаў. Паспяхова здаць экзамен — гэта значыць не толькі ведаць літаратурны матэрыял, але і праявіць свае здольнасці мысліць, разважаць, супастаўляць, аналізаваць, суперажываць...

Работа над сачыненнем патрабуе ад абітурыентаў пэўных навыкаў. Паступаючыя ў ВНУ павінны звярнуць увагу як на старажытны перыяд развіцця беларускай літаратуры (летапісы, хронікі, жыціі) і дзейнасць выдатных дзяржаўных і культурных асоб Беларусі (Рагвалод, Усяслаў Чарадзей, Ефрасіння Полацкая і інш.), так і на агульны стан сённяшняга літаратурнага працэсу, яго вядучыя тэндэнцыі, жанравае багацце і тэматыку твораў, іх нацыянальныя асаблівасці і гуманістычны змест. Абітурыент павінен паказаць нацыянальную адметнасць і высокія эстэтычныя вартасці літаратуры ХХ ст., яе адраджэнска-патрыятычны пафас. Акрамя ведання творчасці пісьменнікаў, разумення ідэйнага зместу твора, характарыстыкі галоўных герояў, абітурыент павінен разбірацца ў літаратурным працэсе, добра ведаць пытанні тэорыі літаратуры і біяграфіі пісьменнікаў. Безумоўна, біяграфія якога-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

небудзь пісьменніка сама па сабе не можа стаць тэмай сачынення, але ў многіх выпадках творчы шлях пісьменніка не можа быць раскрыты без ведання яго жыццёвага шляху. Так, напрыклад, пытанне пра заснавальніка крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры Ф. Багушэвіча не можа быць поўна і ўсебакова асветлена без ведання біяграфічных звестак: яго працы судовым следчым, удзелу ў паўстанні 1863 г. пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага, жыцця на чужыне, без ведання яго публіцыстычных выступленняў, адносін Ф. Багушэвіча да роднай мовы і беларускага народа.

На выкананне пісьмовай работы адводзіцца чатыры астранамічныя гадзіны. Гэта не так ужо многа. І таму абітурыент павінен працаваць рацыянальна, з улікам часу на напісанне чарнавіка, яго праверкі, унясення неабходных выпраўленняў, перапісвання ў чыставы варыянт. Дарэчы, у чарнавіку зусім не абавязкова прадстаўляць поўны тэкст. Ён можа ўяўляць сабой пэўныя тэзісы, апорныя фразы, найбольш важныя цытаты ці проста разгорнуты план. Істотную эканомію часу прынясе замена ў чарнавіку поўнага напісання падзей, твораў, аўтараў іх літаратурнымі абазначэннямі (напрыклад, ВАВ — Вялікая Айчынная вайна, “Т. ш.” — “Трывожнае шчасце”, “Р. г.” — “Раскіданае гняздо”, К. — Я. Купала, П. — П. Панчанка). Гэты навык спатрэбіцца будучым студэнтам і пры канспектаванні лекцый.

Важным этапам работы над сачыненем з’яўляецца праверка напісанага. Перачытваючы чарнавы і чыставы варыянты, неабходна быць вельмі ўважлівым. Трэба ўдумвацца ў кожнае слова. Калі правапіс пэўнага слова выклікае сумненне, то трэба паспрабаваць успомніць правіла, а клі гэта немагчыма, то лепш за ўсё замяніць слова іншым. Не менш уважліва трэба праверыць знакі прыпынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Абітурыент павінен растлумачыць сабе, чаму менавіта тут пастаўлены (ці не пастаўлены) той ці іншы пунктуацыйны знак. Праверка сачынення — гэта праверка няўдалых выразаў, словазлучэнняў, няўдалага парадку слоў, паўтарэнняў. Трэба ўмець бачыць свае памылкі.

Звычайна на экзамене прапануюцца тры тэмы: дзве па курсе літаратуры XI — XX ст. і адна вольная (свабодная) — грамадска-палітычнага ці маральна-этычнага характару. Тэма — гэта асноўны кірунак зместу творчай працы, тое, пра што трэба расказаць. Лепш за ўсё спыніць увагу на тэме, якую абітурыент добра ведае, на тым творы, які лепш помніцца. Добрае веданне твора (а не падручніка і крытычнай літаратуры) — галоўны аргумент у выбары тэмы. Сачыненне павінна адпавядаць тэме. Нельга падмяняць адну тэму другой, самавольна пашыраць ці звужаць прапанаваную тэму, спыняць увагу на малазначных звестках, падзеях. Прывядзём некаторыя прыклады тэм, прапанаваных на ўступных экзаменах 1996-97 гг.:

I. 1. Вобраз князя Вітаўта ў паэме М. Гусоўскага “Песня пра зубра”.

2. Праблема чалавечага шчасця і сэнсу жыцця ў рамане І. Шамякіна “Трывожнае шчасце”.

3.Мая Бацькаўшчына: мінулае і сучаснае.

II. 1. Падзеі і факты беларускай гісторыі ў “Слове пра паход Ігараў”.

2. Жыццёвая дарога Міхала (паэма Якуба Коласа “Новая зямля”).

3. “Усё пакінуць след павінна...” (П. Броўка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

III. 1. “Я родам з Адраджэння. Ды цяпер усім часам, прасторам я належу” (значэнне асветніцкай дзейнасці Ф.Скарыны).

2. “Сацыяльныя пераўтварэнні ў рамане К. Чорнага “Трэцяе пакаленне”.

3. О Беларусь, мая калыска, жыццё маё, прытулак мой...

IV. 1.Вобраз палясоўшчыка Тараса ў паэме “Тарас на Парнасе”.

2. Праблемы дабра і зла ў камедыі К. Крапівы “Брама неўміручасці”.

3. “Трапяткое, жывое, як сонца ў росах, несмяротнае, роднае матчына слова!” (Н. Гілевіч).

Асноўныя тыпы сачыненняў, некаторыя патрабаванні да іх, а таксама характарыстыку памылак і сродкі іх выпраўлення можна паказаць у наступнай табліцы:

| Тып тэмы | Прыкладныя тэмы | Што патрабуецца? | Магчымыя памылкі | Як іх пазбегнуць? |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| Аналіз мастацкага твора | 1. “Новая зямля — энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства ў дарэвалюцыйны час”. 2. Паэма Ф. Багушэвіча “Кепска будзе!”Паэма А. Куляшова “Сцяг брыгады” | Раскрыць ідэйна-эстэтычную вартасць твора | Просты пераказ твора, адсутнасць літаратуразнаўчага аналізу | Выкарыстоўваць паняцці *тэма, ідэя, кампазіцыя, сюжэт, замысел* і інш. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Характарыстыка літаратурнага героя | 1. Вобраз палясоўшчыка Тараса ў паэме “Тарас на Парнасе”. 2. Аксён Каль — шукальнік праўды, народны заступнік (трылогія Якуба Коласа “На ростанях”. 3. Услаўленне народнай гераіні Бандароўны ў аднайменнай паэме Янкі Купалы | Раскрыць ідэйную сутнасць вобраза, паказаць эвалюцыю характару, сродкі яго ўвасаблення, аўтарскую пазіцыю | Аднабаковасць аналізу, адсутнасць свайго погляду і тлумачэння прыёмаў мастацкага ўвасаблення | Выкарыстоўваць паняцці *літаратурны тып, характар, партрэт, моўная характарыстыка* |
| Паказ гістарычнай асобы | 1. Нябесная заступніца Беларусі Ефрасіння Полацкая. 2. Подзвіг і трагедыя Ф. Скарыны. 3. Жыццёвы шлях К. Каліноўскага і яго рэвалюцыйна-асветніцкая дзейнасць | З сённяшняга пункту гледжання раскрыць значэнне дзейнасці гістарычнай асобы | Не паказваецца адметнасць эпохі, няма сувязі з сённяшнім днём | Звярнуць увагу на жыццёвы і творчы шлях гістарычнай асобы, на ўспрынясце яе нашымі сучаснікамі |
| Групавая характарыстыка герояў | 1. Крытыка царскай судовай бюракратыі ў камедыі В. Дуніна- | Выдзеліць агульнае, тыповае, а пазней — | Механічнае спалучэнне індывідуальных характарыстык | Праводзіць паслядоўны лагічны аналіз ад часткі да |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Марцінкевіча “Пінская шляхта”. 2. Тутэйшыя ў аднайменнай трагікамедыі Янкі Купалы. | індывідуальнае | герояў у адно цэлае | цэлага і наадварот |
| Параўнальны аналіз вобразаў, твораў | 1. Паўлінка і пан Быкоўскі ў камедыі Янкі Купалы “Паўлінка”. 2. Вобрах Петрака і Сцепаніды ў аповесці В. Быкава “Знак бяды”. 3. Шляхі-дарогі Васіля і Ганны (“Палеская хроніка” І. Мележа) | Параўнальны аналіз вобразаў, твораў, вызначэнне іх падабенства і адрозненняў | Падмена параўнання двума аналізамі. Параўнанне не па істотных, а па другасных прыкметах | Праводзіць параўнанне па галоўных і дадатковых рысах, якасцях, па розных параметрах (час, эпоха, абставіны, мова) |
| Абагульняльная | 1. Паэтызацыя творчай дзейнасці чалавека, красы жыцця і маладосці ў творах М. Багдановіча. 2. “О Беларусь, мая шыпшына...” (творчасць У. Дубоўкі) | Абагульняльнае разважанне аб некаторых падобных з’явах, прадметах | Не раскрываецца праблема, не назіраецца сувязь паміж з’явамі, прадметамі | Зразумець сутнасць тэмы, выдзеліць у ёй галоўнае і пабочнае |
| Мастацкай формы | 1. Майстэрства Якуба Коласа-гумарыста і | Правесці літаратуразнаўчы аналіз | Няведанне пытанняў тэорыі літаратуры | Выкарыстоўваць паняцці: *род, жанр, метад,* |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | сатырыка ў апавяданні “Соцкі падвёў”. 2. Эвалюцыя жанру камедыі ў творчасці А. Макаёнка | мастацкіх сродкаў | | *кампазіцыя, сатыра, гумар* і інш. |
| Вобраз аўтара | 1. Супярэчлівы характар адносін В. Дуніна-Марцінкевіча да прыгоннага ладу ў паэме “Гапон”. 2. Тэма паэта і паэзіі ў творчасці Янкі Купалы | Раскрыць аўтарскую пазіцыю (адносіны да чалавека, да рэчаіснасці) | Няпоўнае ці няправільнае раскрыццё тэмы | Выкарыстоўваць паняцце *вобраз ааўтара* |
| Вольная | 1. Усе шляхі адкрыты маладым. 2. Мой сучаснік у жыцці і літаратуры. 3. Пра маці можна гаварыць бясконца. 4. Радзіма мая — Беларусь | Раскрыць тэму на літаратурным матэрыяле, паказаць свае адносіны да твора, аўтара, вобразаў | Тэма раскрыта не на літаратурным матэрыяле, дрэнны стыль | Абавязкова выкарыстоўваць творы мастацкай літаратуры, падумаць над стылявым афармленнем |

Кожная з тэм патрабуе ад абітурыента ведання агульнага стану развіцця беларускай літаратуры, яе жанравага і тэматычнага багацця, умення аналізаваць мастацкія творы, разумення іх сутнасці. Пры гэтым неабходна паказаць свае адносіны да апісаных пісьменнікам з’яў, падзей, герояў, іх дзеянняў і ўчынкаў. Пісьмовыя работы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

павінны характарызавацца сучасным прачытаннем ужо вядомых твораў (“Новай зямлі” Якуба Коласа, “Трэцяга пакалення” К. Чорнага, “Палескай хронікі” І. Мележа, “Аблавы”, “Сцюжы” В. Быкава і інш.) . Сачыненне толькі выйграе, калі ў ім будзе прасочвацца суцвязь тых часоў, калі жыў пісьменнік ці пісаўся пэўны твор, з нашымі днямі.

Пэўныя цяжкасці ў абітурыентаў узнікаюць пры аналізе вершаў. Неабходна абавязкова ўказаць на прыналежнасць твора да аднаго з відаў лірыкі (грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай, інтымнай), ахарактыразаваць вобразы і карціны, створаныя паэтам, вызначыць выяўленчыя сродкі (эпітэты, метафары, параўнанні, гіпербалы і інш.), пры дапамозе якіх паэт стварыў мастацкую карціну. Не трэба блытаць аўтара верша і лірычнага героя — вобраза той асобы, ад імя якой ідзе размова ў вершы.

Асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на вольную (свабодную) тэму. Свабода тут — толькі ў выбары літаратурнага матэрыялу, характары выкладання. Такую тэму трэба раскрываць на аснове літаратурных твораў (пажадана апошніх дзесяці — дваццаці гадоў). Пры гэтым абітурыент павінен паказаць не толькі веданне літаратуры, але і сваю эрудыцыю, інтэлектуальную і духоўную сталасць, уменне выкласці на паперы свае ўласныя думкі, меркаванні. Само разважанне павінна быць самастойным, абгрунтаваным, правільным. Сустракаюцца выпадкі, калі з-за адсутнасці свайго погляду разважанне ператвараецца ў самаўзвышэнне, якім часта абітурыент спрабуе прыкрыць няведанне твора. У такіх сачыненнях апраўданным з’яўляецца ўжыванне пабочных слоў і выразаў тыпу *магчыма, мусіць, мабыць, здаецца,*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*можа, напэўна, бясспрэчна, безумоўна, трэба думаць, тым не менш, на жаль, на нашу думку* (на пісьме выдзяляюцца коскамі.

Даволі часта сустракаюцца сачыненні, напісаныя без памылак, але і без выкарыстання твораў беларускай літаратуры. Такія працы, абмежаваныя толькі выказваннем агульных палажэнняў, як правіла, ацэньваюцца нездавальняюча. Так, сачыненне на тэму "Абараніць прыроду — значыць абараніць Радзіму" часта з'яўляецца часопісным ці газетным артыкулам пра беларускую зямлю, яе прыгажосць, пра беражлівыя адносіны да навакольнага свету. Пры гэтым не выкарыстоўваюцца творы мастацкай літаратуры, не ўспамінаюцца беларускія паэты і пісьменнікі. А пра чароўныя мясціны Беларусі, пра адвечную прыгажосць роднай прыроды так многа сказалі Я. Купала, Я. Колас, М. Лынькоў, І. Мележ, І. Шамякін, М. Танк, Р. Барадулін, У. Караткевіч і многія іншыя. Узор падобнага сачынення можна знайсці ў гэтым дапаможніку.

Некаторыя сачыненні на вольную (свабодную) тэму, наадварот, уяўляюць сабой пераказ зместу асобных твораў без выказвання адносін да іх. Адсутнасць уласнага погляду на свет, асабістых меркаванняў, якія ў сачыненнях на свабодную тэму павінны займаць асноўнае месца, зніжае вартасць працы і пры наяўнасці дастатковай колькасці памылак дазваляе экзаменатарам ацэньваць сачыненне нездавальняюча.

Пры напісанні сачыненняў, прысвечаных аналізу мастацкіх асаблівасцеў твораў, іх жанрава-тэматычнай разнастайнасці, характарыстыцы пэўных вобразаў, персанажаў, тлумачэнню аўтарскай пазіцыі пісьменніка, яго майстэрству, традыцыям і наватарству, нельга абысціся без літаратуразнаўчых тэрмінаў. Іх, дарэчы, часта называюць алгебрай гармоніі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аб'ём сачынення — пяць-шэсць старонак вучнёўскага сшытка, на якіх неабходна выказаць свае думкі па абранай тэме. Прыкладна адну старонку займае ўступ (У) і заключэнне (З), чатыры-пяць старонак — галоўная частка. Суразмернасць усіх структурных частак можна выразіць даволі распаўсюджанай формулай У + З = 1/4 V, дзе V — аб'ём сачынення. Усе структурныя часткі павінны быць узаемазвязанымі.

У с т у п — своеасаблівая прадмова, падрыхтоўка да ўспрыняцця разважання абітурыента. Уступ не павінен быць занадта абагульненым, далёкім ад тэмы, перагружаным непатрэбнымі фактамі, якія не маюцьб прамога дачынення да тэмы. У ім можна сказаць пра час, калі жыў аўтар, паведаміць біяграфічныя звесткі, адзначыць асноўныя творы, расказаць пра тэму, ідэю разглядаемага твора, абставіны яго стварэння і інш. Напрыклад, уступ да сачынення "Новая зямля" — энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства ў дарэвалюцыйны час" можа быць аналітычным (у ім раскрываецца цэнтральнае паняцце тэмы): *Энцыклапедыяй называюць даведачнае выданне ў выглядзе слоўніка, дзе звычайна даюцца асноўныя звесткі па ўсіх ці асобных галінах ведаў. "Новую зямлю" Я. Коласа справядліва называюць энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства канца XIX — пачаткуXX ст. І невыпадкова. Паэма — вялікі эпічны твор аб гістарычным лёсе беларускага сялянства і пошуках ім шляхоў да свабоды, і шчаслівага жыцця. Паэт расказвае аб усім, чым багатае і цікавае сялянскае жыццё сялян...*

Біяграфічнымі звесткамі можна пачаць сачыненне пра паэму А. Куляшова "Сцяг брыгады": *Падзеі першых дзён вайны засталі А. Куляшова ў Мінску. Адступленне нашых войск, жорсткія налёты*

*фашысцкай авіяцыі, незлічоныя людскія ахвяры на вуліцах палаючага Мінска ўразілі паэта нечаканасцю і трагізмам. А. Куляшоў апрануў шынель, каб абараніць Радзіму ад ворага, і прайшоў праз суровыя выпрабаванні. У цяжкіх франтавых умовах 1942 г. паэт напісаў паэму "Сцяг брыгады".*

Пераклічкай з сучаснасцю можна пачынаць сачыненне пра Бандароўну; характарыстыка эпохі адраджэння можа стаць уступам да сачынення пра Ф. Скарыну ці М. Гусоўскага; агульнай характарыстыкай твора часта пачынаюць сачынне "Падзеі і факты беларускай гісторыі ў "Слове пра паход Ігараў"; параўнанне творчасці Цёткі і яе папярэднікаў — добры ўступ да сачынення "Рэвалюцыйна-вызваленчыя матывы ў творчасці Цёткі" (гл. гэтыя сачыненні ў асноўнай частцы дапаможніка).

У галоўнай частцы раскрываецца змест тэмы. Тут неабходна абагульніць фактычны матэрыял, выдзеліўшы з яго найбольш важнае, істотнае. Аналіз літаратурнага твора павінен праводзіцца ў адзінстве яго зместу і мастацкай формы, адзінстве агульнага і прыватнага. Менавіта сам твор (а не літаратурна-крытычныя артыкулы аб ім) павінен стаць асновай разважання абітурыента. Крытычная літаратура можа выкарыстоўвацца ў якасці дадатковага матэрыялу для пацвярджэння ўласных тэзісаў, разважанняў. Імкнучыся да паўнаты і дакладнасці аналізу твора, трэба ўмець выбіраць толькі тыя эпізоды, падзнеі, якяія спрыяюць развіццю тэмы. Асаблівую ўвагу абітурыент павінен звярнуць на майстэрства пісьменніка, прыналежнасць яго да пэўнага літаратурнага напрамку, на жанравыя асаблівасці твора. У сачыненнях на гістарычную тэму ў галоўнай частцы неабходна асвятліць значнасць пэўнай гістарычнай падзеі, яе месца ў лёсе

Айчыны, успрыняць яе с пункту гледжання сучаснікаў. Галоўная частка — гэта сістэма тэзісаў і аргументаў, само разважанне. Гэта самая вялікая частка сачынення

З а к л ю ч э н н е — вывад з усяго сказанага, абагульненне назіранняў. Яно надае разважанню закончаны выгляд, указвае, дзеля чаго напісана сачыненне. Даволі часта абітурыенты забываюць пра заключную частку, абрываючы свае разважанні, што, безумоўна, уплывае на якасць працы. Каб поўна і ўсебакова раскрыць тэму, многія абітурыенты спачатку складаюць п л а н, па якім затым і пішуць сачыненне. Будзе карысным напомніць словы М. Горкага: “Перш чым пачынаць пісаць, я задаю сабе тры пытанні: што я хачу напісаць, як напісаць і для чаго напісаць?” План — неабходнае звяно любой творчай працы, ён акрэслівае галоўныя пытанні, якія пазней будуць разгледжаны ў сачыненні. План дазваляе лагічна і паслядоўна выкласці думкі, пазбегнуць паўтораў, выпадковых адхіленняў ад тэмы, пропускаў. Ён можа быць разгорнутым (падрабязным) і больш агульным. Па сутнасці гэта фіксацыя руху думак, іх фарміравання, гэта сэнсавы, паняційны пункцір сачынення. План павінен вынікаць з тэмы, раскрываць яе. Напрыклад, для сачынення “Ф. Скарына — выдатны прадстаўнік беларускай культуры эпохі Адраджэння” план можа выглядаць наступным чынам:

1. Кароткая характарыстыка эпохі Адраджэння.

2. Біяграфія Ф. Скарыны.

3. Выдавецка-асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны.

4. Асаблівасці выданняў Ф. Скарыны:

а) пераклад кніг Біблii на зразумелую большасці насельніцтва старабеларускую мову;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

б) тэхнічная дасканаласць, мастацкасць апрацоўкі выданняў;

в) ілюстрацыі як сродак раскрыцця ў мастацкіх вобразах зместу кнігі;

г) прадмовы і пасляслоўі.

5. Значэнне Ф. Скарыны (дзейнасць яго паслядоўнікаў С. Буднага і В. Цяпінскага).

План да сачынення “Вобразы засцянковай шляхты ў п’есе В. Дуніна-Марцінкевіча “Пінская шляхта” можа ўключаць наступныя пункты:

Уступ. Жанр п’есы “Пінская шляхта”. Гумар, іронія і гратэск як сродкі выкрыцця адмоўных з’яў у жыцці грамадства.

Галоўная частка. 1. Вобразы Івана Цюхая-Ліпскага і Ціхона Пратасавіцкага, прычыны іх сваркі.

2. Падабенства рыс шляхціцаў і простых сялян (непісьменнасць, цемната, абмежаванасць, баязлівасць у адносінах да начальства і інш.).

3. Адрозненне шляхты ад сялянства (паперка аб дваранскім паходжанні, мелі крыху больш грошай).

4. Ганарлівасць, фанабэрыстасць як асноўныя рысы шляхцюкоў
(выпадак з пакараннем розгамі на голай зямлі без дывана).

5. Харытон Куторга: далікатнасць, хітрасць. Вобразнасць мовы гэтага персанажа.

6. Роля ў п’есе вобразаў Статкевіча і Альпенскага.

Заключэнне. Значэнне п’есы “Пінская шляхта”, прычыны яе доўгага сцэнічнага жыцця.

План сачынення на ўступных экзаменах не патрабуецца, але ў чарнавіку яго мэтазгодна напісаць у якасці рабочага моманту, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўносіць парадак і дакладнасць, неабходныя для глыбокага раскрыцця тэмы.

З ідэяй і зместам сачынення звязаны эпіграф. Ім можа быць кароткі і выразны ўрывак з празаічнага твора, літаратурна-крытычнага артыкула, вершаваны радок, крылаты выраз, прыказка ці прымаўка. У сачыненні эпіграф лічыцца неабавязковым, адзнака з-за яго адсутнасці не зніжаецца. Але калі ён падабраны ўдала і выражае галоўную думку сачынення, то гэта будзе сведчыць, што аўтар глыбока разумее твор ці наогул творчасць пісьменніка, і сачыненне ад гэтага толькі выйграе. Афармляецца эпіграф без двукосся. Спасылка на аўтара (прозвішча і ініцыялы) размяшчаецца ніжэй эпіграфа справа без дужак. Напрыклад, у якасці эпіграфа да паэмы П. Броўкі “Беларусь” выкарыстаны наступныя радкі:

Мой родны кут,
Як ты мне мілы!..

*Якуб Колас*

Эпіграфам да верша Р. Барадуліна “Вогнепаклонніца” служыць яго ўласнае чатырохрадкоўе:

Спакой нізінаю цячэ,
Увечар сцежка ў руцэ-мяце,
А вогнішча гарыць яшчэ
Самаахвярнае, як маці...

*З радкоў памяці*

Абітурыентам неабходна звярнуць увагу і на афармленне цытат і знакі прыпынку пры іх. Цытаты —даслоўныя вытрымкі з якога-небудзь тэксту — з’яўляюцца важным сродкам, які дапамагае больш аргументавана і глыбока выказаць асноўную думку, прыдаць выказванню эмацыянальную афарбоўку. Цытата тлумачыць ці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пацвярджае думку, але не паўтарае яе. Цытуючы мастацкія творы, неабходна адчуваць меру: у сачыненні нельга ўжываць празмерную колькасць вытрымак з мастацкіх твораў ці выпісваць даволі вялікія ўрыўкі. У такіх выпадках сачыненне нагадвае нагрувашчанне чужых думак, назіранняў, злёгку падмацаваных асобнымі заўвагамі і даволі слабымі разважаннямі аўтара працы. Аднак нельга і ігнараваць цытаты, без якіх становіцца зразумелым, што абітурыент у недастатковай ступені ведае змест твора або знаёмы з ім толькі па крытычнай літаратуры. Цытаты павінны быць дакладнымі і арганічна ўпісацца ў тэкст сачынення. Усе вытрымкі з мастацкіх твораў абітурыент павінен ведаць на памяць, бо карыстацца літаратурнымі тэкстамі на экзамене нельга.

Выкарыстоўваючы цытаты, неабходна помніць пра знакі прыпынку.

1. Звычайна цытаты заключаюцца ў двукоссі і афармляюцца, як канструкцыі з простай мовай. Напрыклад: *Не паспеў Кручкоў пачаць разгляд справы, а ўжо гучыць яго загад, каб шляхта несла хабар: "Няхай аддадуць хурману, ды спакуйце там харашэнька ў возе";, "Служыць свайму народу ўсімі сіламі сваёй душы і сэрца", — так усведамляў сваё прызванне Я. Купала.*

2. Цытату можна ўвесці з дапамогай пабочных слоў: *На думку Уладзіміра Калесніка, Беларусь для Янкі Купалы не толькі "геаграфічнае, гістарычнае ці палітычнае паняцце, назва краіны і дзяржавы, але паняцце філасофскае, гуманістычнае — скарбніца духоўных каштоўнасцей, створаных народам за вякі"; На думку У. Гніламёдава, "паэзія — душа народа і яго гісторыя"; Па меркаванні І. Жука, Тварыцкі — "апошні з магікан, апошні з тых, хто з*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*коласавымі пакутамі шукаў “новую зямлю”, трагічны абрыў распавітай беларускай літаратурнай ніткі”.*

3. Калі цытата ўводзіцца ў якасці даданай часткі складаназалежнага сказа, то першае слова ў ёй пішацца з малой літары. Напрыклад: *Антось так смяецца, што “аж галава з шырокім плехам і з сівым воласам трасецца”; Пра зборнік “Шляхамі барацьбы” П. Глебка пісаў, што ў ім “аўтар зрабіў надзвычай удалую спробу перадаць жывыя пульсы чалавечага пачуцця”.*

Калі цытатай з’яўляецца вершаваны тэкст, які захоўвае радкі і строфы арыгінала, то двукоссі не ставяцца. Напрыклад: *І даносіцца адтуль, з пачатку ХХ стагоддзя, малады і задорны голас Максіма Багдановіча пра самую прыгожую і радасную пару чалавечага жыцця:*

*Будзь жа, век малады,*
*Поўны светлымі днямі!*
*Пралятайце, гады,*
*Залатымі агнямі!*

*Спасцігаючы мнагастайнасць адзінства чалавека з навакольным светам, малады паэт А. Каско піша:*

*Я часцінка зямлі,*
*і таму мне балюча,*
*калі нішчацца дрэвы,*
*высыхаюць крыніцы.*
*Гэты мой востры боль*
*крыкам жаласным кані*
*прылятае так часта*
*да сяліб з сенажацей.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Пропуск у цытаце якіх-небудзь слоў абазначаецца шматкроп’ем. Напрыклад: *Аналізуючы творчасць Наталлі Арсенневай, М. Мішчанчук піша, што яна “...змагалася за права гаварыць народу праўду, быць з народам і Радзімай і ў радасны (такіх было мала), і трагічны, скрутны час”; Былі там і вядомыя пісьменнікі: “Сам Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі... прыйшлі, як павы, на Парнас”.*

Каб сачыненне мела стройны і закончаны выгляд і ў ім прасочвалася лагічная паслядоўнасць мыслення абітурыента, неабходна звярнуць увагу на спецыяльныя адзінкі, якія служаць сродкамі сувязі паміж сказамі. Да ліку такіх адзінак адносяць злучнікі, злучальныя словы, пабочныя словы і выразы тыпу: *па-першае, па-другое, акрамя таго, перш за ўсё, у першую чаргу, у той жа час, такім чынам, па сутнасці, вядома, аднак, а значыць. гэта значыць, іменна, пагэтаму, як мы бачым, як ужо адзначалася, на самай справе, уласна кажучы, з аднаго (другога) боку.* Неабходна таксама помніць і пра абзацы, у якіх выдзяляюць адносна закончаныя думкі, галоўныя ідэі, а таксама кампазіцыйныя элементы сачынення — уступ, асноўную частку і заключэнне. Вялікай колькасці абзацаў не павінна быць, як і не можа быць сачынення наогул без абзацаў. Паміж абзацамі трэба рабіць лагічныя пераходы, без якіх сачыненне становіцца бессістэмным. Неабходна помніць, што кожная наступная частка пасля абзаца пачынаецца з чырвонага радка.

Сачыненне павінна быць напісана граматна, без памылак. На жаль , гэта здараецца не так часта. Сярод памылак найчасцей сустракаюцца:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1. Памылкі ў змесце (павярхоўнае раскрыццё тэмы, непаслядоўнае выказванне думак, меркаванняў, перайначванне і скажэнне фактаў, з'яў, імён, назваў). Напрыклад: *Сымон Полацкі* (трэба *Сімяон*); *Максім Зарэцкі* (трэба — *Міхась*); *Гарлахвацкі ўзначальваў інстытут палеанталогіі* (трэба — *геалогіі*); *Ф. Скарына напісаў 23 кнігі Бібліі* (трэба — *пераклаў на беларускую мову*); *Дунін-Марцінкевіч закончыў Віленскі універсітэт* (трэба — *вучыўся ў Віленскім універсітэце,* бо закончыць яго з-за адсутнасці матэрыяльных сродкаў і па прычыне хваробы не давялося).

2. Моўныя памылкі (ужыванне слова не ў тым значэнні, неапраўданы паўтор слоў ці сказаў, ужыванне рускага слова замест беларускага, ужыванне лішняга слова). Напрыклад: *Аліндарка нарадзіўся ў марце* (трэба — *сакавіку*); *відзеў у Рыме бой быкоў* (трэба — *бачыў*); *эфектны спосаб* (трэба — *эфектыўны*); *паміраючы Міхась сказаў Антосю, каб Антось прадоўжыў справу Міхала* (трэба — *...каб той прадоўжыў яго справу*).

3. Граматычныя памылкі (неадпаведнасць роду ці ліку назоўнікаў, ужыванне слова не ў той скланяльнай ці спрагальнай форме, няправільнае спалучэнне некалькіх слоў, няправільнае ўтварэнне слоў). Напрыклад: *узнагародзілі залатой медаллю* (трэба — *залатым медалём*); *ён расказваў з боллю ў сэрцы* (трэба — *з болем*); *у чыстам полі* (трэба — *у чыстым*); *двух дзяўчынак* (трэба — *дзвюх*); *Яўхім ажаніўся на Ганне* (трэба — *ажаніўся з Ганнай*); *сустракаліся па вечарам* (трэба — *па вечарах*); *больш мацнейшы* (трэба — *больш моцны*); *два маладых паэты* (трэба — *два маладыя паэты*); *чытая творы* (трэба — *чытаючы творы*).

4. Арфаграфічныя памылкі (правапіс галосных і зычных, злітныя. праз дэфіс і асобныя напісанні, ужыванне вялікай і малой

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

літар). Напрыклад: *гораччу* (трэба — *горыччу*), *календар* (трэба — *каляндар*), *дзясяты* (трэба — *дзесяты*), *казьба* (трэба — *касьба*), *міл'ярд* (трэба — *мільярд*), *стагодзе* (трэба — *стагоддзе*), *чацьвёрты* (трэба — *чацвёрты*), *поздні* (трэба — *позні*).

5. Пунктуацыйныя памылкі (знакі прыпынку пры аднародных адасобленых членах, сказы з пабочнымі словамі і зваротамі, знакі прыпынку пры параўнальных зваротах, у складаных і простых сказах).

6. Сінтаксічныя памылкі (аб'яднанне ў адзін рад несумяшчальных, несуадносных паняццяў, парушэнне парадку слоў, лагічнай і сінтаксічнай сувязі паміж часткамі тэксту). У сачыненнях абітурыентаў можна знайсці даволі многа такіх памылак (ці алагізмаў). Напрыклад: "Васіль быў кулаком. У яго былі розныя вочы."; "Але многа разоў былі людзі, якія хвалююцца толькі аб сабе, аб сваім багацці, якія не жадаюць міру на зямлі, якія думалі раз'яднаць нашы краіны, украсць здабытае сваімі рукамі"; "На вершы "Разлад", які напісаў Янка Купала ў дакастрычніцкі перыяд, я і хачу астанавіцца. У гэтым вершы ён паказаў, якая наша краіна ў цяперашні час, якая яна адсталая, як дрэнна жывецца сялянам у гэты час"; "Зараз мы жывём у 1987 годзе"; "Гарлахвацкі да сябе ў кабінет, абклаў сябе кніжкамі і рабіў выгляд, што іх прачытае"; "Туляга піша аб нейкай свінячай костцы, якая ляжала каля сталовай"; "Перада мной адкрыты ўсе шляхі на свеце. Адзін з іх — педагог"; "Нялёгка спачатку давялося Міканору. У куце вісяць абразы, у сенцах — парасяты"; "Становячыся падлеткам, пайшоўшы ў школу, зноў жа Чалавек патрабуе да сябе ўвагі маці. У юнацкім узросце яна стане добрым дарадчыкам: дапаможа выбраць шляхі ў жыцці, у працы і г. д. І так на працягу ўсяго жыцця маці для яго лепшы сябар. З яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вуснаў ніколі не будзе сыходзіць “Мама”; “У бедных сялян забіралі зямлю, гаспадарку, неабходныя істоты”; “Мележ таксама паўстае супраць такога знясільства і з дапамогай алоўка асуджае уласніцтва”; “Праз радкі рамана мы даведваемся, што вёска Курані сапраўдны геаграфічны пункт”; “Для калектывізацыі цяжкія дарогі да Куранёў — не перашкода”; “Без Ганны галоўнай справай яго з’явілася зямля”; “Жаночая доля, на мой погляд, цяжалей у душэўным плане”; “Сэрца дзяўчыны бязконца на працягу ўсяго жыцця, перажывае за каханага”; “Каханне з’явілася непрыкметна і хутка ахапіла іх з галавы да ног”; “Яўхім Глушак паклаў на Ганну вочы”; “На нашых вачах зялёны хлопец ператвараецца ў мужчыну”; “Сеня Пясоцкі ніколі не страчаў сваёй чалавечай вартасці”; “Гамана, жарты, смех, якія назаўсёды нарадзіў суровы час”; “Праз свой раман Мележ паказвае нам, што ні якая праца, ні што другое не змогуць заглушыць боль да каханага, боль да любви” (прыклады ўзяты з сачыненняў абітурыентаў 1995 г., а таксама з кнігі М. В. Абабуркі “Культура беларускай мовы” (Мн., 1994).

Пры напісанні сачынення абітурыент павінен звярнуць увагу на сінтаксічныя нормы, асаблівасці словазлучэнняў у беларускай мове.

Нагадаем некаторыя з іх:

1. Дзеясловы руху *ісці, бегчы, хадзіць, ехаць, ляцець*, ужытыя з мэтавым значэннем, спалучаюцца з назоўнікамі ў вінавальным склоне з прыназоўнікам *па: ісці па лекі, пайсці па сястру, ехаць па дровы, збегаць па хлеб*. Калі ж назоўнікі з”яўляюцца назвамі ягад, грыбоў, то пры іх ужываецца прыназоўнік *у*: *ісці ў грыбы, адправіць у чарніцы* ( параўн. рус.: *идти за лекарством, сбегать за хлебом, отправить за черникой).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Дзеясловы *жартаваць, насміхацца, смяяцца, рагатаць, дзівіцца, здзекавацца* спалучаюцца з назоўнікамі (займеннікамі) у родным склоне з прыназоўнікам *з: жартаваць з Антося, насміхацца з яго, здзекавацца з жывёліны (* параўн. рус.: *шутить над Антосем, Смеяться над ним, издеваться над животным).*

3. Дзеясловы ветлівасці *дзякаваць, дараваць, прабачаць* і іх вытворныя формы спалучаюцца з назоўнікамі ( займеннікамі) у давальным склоне: *дараваць сяброўцы, дзякаваць брату, прабачце мне* (параўн. рус.: *простить подругу, благодарить брата, извините меня).*

4. Дзеясловы *ажаніць, ажаніцца, пажаніць, пажаніцца* спалучаюцца з назоўнікамі ( займеннікамі) у творным склоне з прыназоўнікам *з*: *ажаніўся з Ганнай, ажанілі з суседкай* (параўн. рус.: *женился на Ганне, женили на соседке).*

5. Прыметнікі ці прыслоўі ў форме вышэйшай ступені параўнання спалучаюцца з назоўнікамі (займеннікамі) у вінавальным склоне з прыназоўнікам *за: прыгажэйшы за сястру, старэйшы за брата, большы за іх (* параўн. рус*.: красивее сестры. старше брата, больше их).*

6. Дзеясловы са значэннем спосабу дзеяння ці стану ( *хадзіць, ісці, слаць, бачыцца, сустракацца* і інш.) спалучаюцца з назоўнікамі ў месным склоне з прыназоўнікам *па: бачыцца па вечарах, займацца па пятніцах, хадзіць папалях* (параўн. рус.: *видеться по вечерам, заниматься по пятницам, ходить по полям).*

За пісьмовую работу выстаўляецца адна адзнака. Асноўнымі крытэрыямі гэтай адзнакі з’яўляюцца як узровень раскрыцця тэмы, глыбіня веданне тэкстаў мастацкіх твораў, так і наяўнасць/

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адсутнасць памылак. Ніжэй мы прыводзім асноўныя крытэрыі адзнакі сачыненняў:

| **Адзнака** | **Асноўныя крытэрыі ацэнкі** | **Пісьменнасць** |
| --- | --- | --- |
| “5” (пяць) | 1. Тэма раскрыта поўна і ўсебакова. 2. Фактычныя памылкі адсутнічаюць. 3. Змест перадаецца паслядоўна (па складзеным плане ці без яго). 4. Работа вызначаецца багаццем слоўніка і дакладнасцю словаўжывання, разнастайнасцю выкарыстаных сінтаксічных канструкцый. | Дапускаецца: 1 нязначная арфаграфічная, або 1 пунктуацыйная, або 1 граматычная памылка. |
| “4” (чатыры) | 1. Змест работы ў асноўным адпавядае тэме (маюцца адзінкавыя фактычныя недакладнасці і нязначныя адхіленні ад тэмы). 2. Мацца нязначныя парушэнні паслядоўнасці ў выказванні думак. 3. Лексічны і граматычны лад мовы дастаткова разнастайны. 4. Стыль работы вызначаецца адзінствам, дастатковай выразнасцю. У рабоце дапускаецца не больш чым 2 недакладнасці ў тэксце і | Дапускаецца: 2 арфаграфічныя і 2 пунктуацыйныя памылкі, або 1 арфагрфічная і 3 пунктуацыйныя, або 4 пунктуацыйныя памылкі пры адсутнасці арфаграфічных, а таксама 2 граматычныя памылкі. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | |
|---|---|---|
| | не больш 3-4 моўных недакладнасцяў. | |
| “3” (тры) | 1. У рабоце дапушчаны істотныя адхіленні ад тэмы. 2. Змест работы ў асноўным правільны, але маюцца асобныя фактычныя недакладнасці. 3. Дапушчаны асобныя парушэнні ў паслядоўнасці пераказу. 4. Бедны слоўнік і аднастайныя сінтаксічныя канструкцыі, сустракаецца няправільнае ўжыванне слоў. 5. Стыль работы не вызначаецца адзінствам, мова недастаткова выразная. У рабоце дапускаеццане больш чым 4 недахопы ў змесце і 5 моўных недакладнасцяў. | Дапускаецца: 4 арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі, або 3 арфаграфічныя і 5 пунктуацыйных памылак, або 7 пунктуацыйных памылак пры адсутнасці арфаграфічных, а таксама 4 граматычныя памылкі. |
| “2” (два) | 1. Работа не адпавядае тэме або тэма поўнасцю не раскрыта. 2. Дапушчана шмат фактычных недакладнасцяў. 3. Парушана паслядоўнасць пераказу думак ва ўсіх частках работы, адсутнічае сувязь паміж імі , ёсць памылкі ў словаўжыванні. 4. Парушана стылёвае адзінства тэксту. У рабоце | Дапускаецца: 7 арфаграфічных і 7 пунктуацыйных памылак, або 6 арфаграфічных і 8 пунктуацыйных, або 5 арфаграфічных і 9 пунктуацыйных памылак, а таксама 7 граматычных памылак. |

РЕПОЗІТОРИЙ БГПУ

дапушчана 6 недахопаў у змесце і да 7 моўных недахопаў.

Абітурыенты павінны звярнуць увагу на характар памылак і пры неабходнасці паўтарыць пэўныя правілы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## МАГЧЫМЫЯ ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ

Постаці далёкай мінуўшчыны.

Нябесная заступніца Беларусі Ефрасіння Полацкая.

"Слова пра паход Ігараў" — помнік старажытнай гісторыі.

Падзеі і факты беларускай гісторыі ў "Слове пра паход Ігараў".

Беларуска-літоўскае летапісанне.

Беларускі "златавуст" Кірыла Тураўскі.

Францішак Скарына — выдатны прадстаўнік беларускай культуры эпохі Адраджэння.

Гістарычная роля дзейнасці Ф. Скарыны ў культурнай гісторыі ўсходніх славян.

Патрыятычны пафас творчай дзейнасці Ф. Скарыны.

Подзвіг і трагедыя Ф. Скарыны.

Ён верыў у свой народ. Жыццё і подзвіг Ф. Скарыны.

"Я родам з Адраджэння. Ды цяпер усім часам, прасторам я належу" (значэнне асветніцкай дзейнасці Ф. Скарыны).

Сымон Будны і Васіль Цяпінскі — прадаўжальнікі традыцый Ф. Скарыны.

Паэма М. Гусоўскага "Песня пра зубра".

Вобраз князя Вітаўта ў паэме М. Гусоўскага "Песня пра зубра".

Сучаснасць і мінуўшчына ў паэме М. Гусоўскага "Песня пра зубра".

Паэтызацыя роднай зямлі ў паэме М. Гусоўскага "Песня пра зубра".

Палемічная літаратура (канец XVI — пачатак VVII ст.)

Рэлігійна-асветніцкая дзейнасць Мялеція Сматрыцкага.

Літаратурная спадчына Сімяона Полацкага.

Дзейнасць школьных тэатраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Творчасць Яна Чачота.

“Мінулае вучыць нас, як жыць сёння” (па творах Яна Баршчэўскага).

Паэма “Энеіда навыварат” В. Равінскага.

Вобразы траянцаў і Энея ў паэме В. Равінскага “Энеіда навыварат”.

Вобраз палясоўшчыка Тараса ў паэме “Тарас на Парнасе”.

Рэальнае і казачнае ў паэме “Тарас на Парнасе”.

Паказ ідэйна-эстэтычнай барацьбы ў літаратуры 30 — 50-х гг. XIX ст. у паэме “Тарас на Парнасе”.

Жаўруковая песня Паўлюка Багрыма.

“Каб збыць няволі путы...” (дзейнасць філаматаў і філарэтаў).

Жыццёвы шлях К. Каліноўскага і яго рэвалюцыйна-асветніцкая дзейнасць.

Супярэчлівы характар адносін В. Дуніна-Марцінкевіча да прыгоннага ладу ў паэме “Гапон”.

Гуманістычны пафас паэмы В. Дуніна-Марцінкевіча “Гапон”.

Народ у паэме В. Дуніна-Марцінкевіча “Гапон”.

Крытыка царскай судовай бюракратыі ў камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча “Пінская шляхта”.

“Тут, брат, нам будзе харошае жніво” (вобраз Кручкова ў “Пінскай шляхце” В. Дуніна-Марцінкевіча).

Вобразы засцянковай шляхты ў п’есе В. Дуніна-Марцінкевіча “Пінская шляхта”.

Праблема бацькоў і дзяцей у камедыі В. Дуніна-Марцінкевіча “Пінская шляхта”.

“Ідылія” В. Дуніна-Марцінкевіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ф. Багушэвіч — абаронца правоў прыгнечанага беларускага сялянства.

Духоўнае аблічча беларускага селяніна ў паэзіі Ф. Багушэвіча.

Асноўныя тэмы і вобразы паэзіі Ф. Багушэвіча.

“Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!” (Ф. Багушэвіч).

Праблема нацыянальнай інтэлігенцыі ў творчасці Ф. Багушэвіча (“Не цурайся”, “Калыханка”).

Паэма Ф. Багушэвіча “Кепска будзе!”.

Жыццёвы шлях Аліндаркі — адлюстраванне горкай долі працоўнага народа (па паэме Ф. Багушэвіча “Кепска будзе!”).

Гуманістычныя матывы прозы Ф. Багушэвіча.

. “Лірнік зямлі беларускай” (творчасць Уладзіслава Сыракомлі).

“Не я пяю — народ божы” (творчасць Янкі Лучыны).

Творчы шлях Адама Гурыновіча.

Рэвалюцыйна-вызваленчыя матывы ў творчасці Цёткі.

“Думаць усюды аб народзе, родны край усюды сніць” (творчасць Цёткі).

Тэма рэвалюцыі ў апавяданні Цёткі “Прысяга над крывавымі разорамі”.

Янка Купала — песняр і прарок нацыянальнага адраджэння.

“Песня мая не ўзышла сярод кветак...” (асноўныя матывы і вобразы дакастрычніцкай паэзіі Янкі Купалы).

Вобразы роднага краю ў паэзіі Янкі Купалы.

Паэтызацыя стваральнай працы ў лірыцы Янкі Купалы.

Тэма паэта і паэзіі ў творчасці Янкі Купалы.

Услаўленне народнай гераіні Бандароўны ў аднайменнай паэме Янкі Купалы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гарманічнае спалучэнне знешняй прыгажосці і ўнутранага хараства ў вобразе Бандароўны (па паэме Янкі Купалы “Бандароўна”).

Вобразы Паўлінкі і пана Быкоўскага ў камедыі Янкі Купалы “Паўлінка”.

Паўлінка і Якім — носьбіты лепшых маральных якасцей беларускага народа (камедыя Янкі Купалы “Паўлінка”).

Тэма мастака і мастацтва ў паэме Янкі Купалы “Курган”.

“На вялікі сход! Па Бацькаўшчыну!” (драма Янкі Купалы “Раскіданае гняздо”).

Пошукі шляхоў да сацыяльнага разняволення ў драме Янкі Купалы “Раскіданае гняздо”.

Вобраз Сымона Зябліка ў драме Янкі Купалы “Раскіданае гняздо”.

Вобраз Лявона Зябліка як увасабленне трагедыі народа (па драме Янкі Купалы “Раскіданае гняздо”).

Матывы трагізму ў драматычных паэмах Янкі Купалы “Адвечная песня” і “Сон на кургане”.

Паказ трагічнага лёсу народнага паэта ў паэме Янкі Купалы “Тарасова доля”.

Янка Купала і рэвалюцыя. Трагедыя паэта.

Тэма Беларусі ў лірыцы Янкі Купалы першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя.

“Тутэйшыя” ў аднайменнай трагікамедыі Янкі Купалы.

Героі “мінскай” брахалкі (Мікіта Зносак і яго хаўруснікі).

Вобразы роднага краю, малюнкі беларускай прыроды ў творчасці Якуба Коласа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўныя матывы і вобразы дарэвалюцыйнай лірыкі Якуба Коласа.

Вобраз дарогі ў вершах Якуба Коласа.

Майстэрства Якуба Коласа — гумарыста і сатырыка ў апавяданні “Соцкі падвёў”.

Беларускі музыка-Арфей (па паэме Якуба Коласа “Сымон-музыка”).

“Новая зямля” Якуба Коласа — гімн свабоднай працы незалежнага селяніна на сваёй уласнай зямлі.

Паэма Якуба Коласа “Новая зямля” — энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства ў дарэвалюцыйны час.

Паказ духоўнага багацця чалавека працы ў паэме Якуба Коласа “Новая зямля”.

Жыццёвая дарога Міхала (паэма Якуба Коласа “Новая зямля”).

Вобраз дзядзькі Антося ў паэме Якуба Коласа “Новая зямля”.

Вобразы Міхала і Антося ў паэме Якуба Коласа “Новая зямля”.

Незабыўны свет маленства (дзеці ў “Новай зямлі” Якуба Коласа).

Карціны прыроды ў паэме Якуба Коласа “Новая зямля”.

“Малюнкі родныя і з”явы! Як вы мне любы, як цікавы!” (Якуба Колас).

Духоўны свет, маральная высакароднасць Андрэя Лабановіча (трылогія Якуба Коласа “На ростанях”).

Андрэй Лабановіч і Саханюк (трылогія Якуба Коласа “На ростанях”).

Сяляне-палешукі і інтэлігенцыя ў трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”.

Інтэлігенцыя і народ у трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аксён Каль — шукальнік праўды, народны заступнік (трылогія Якуба Коласа “На ростанях”).

Жаночыя вобразы ў трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”.

Свет кахання ў трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”.

Тэма Радзімы ў лірыцы Якуба Коласа.

“Казкі жыцця” людскога... (алегарычныя апавяданні Якуба Коласа).

“Жыві і цэльнасці шукай, аб шыраце духоўнай дбай” (М. Багдановіч).

Творчасць М. Багдановіча — залатая старонка ў гісторыі беларускай літаратуры.

Народ і Радзіма ў творчасці М. Багдановіча.

Паэтызацыя творчай дзейнасці чалавека, красы жыцця і маладосці ў творах М. Багдановіча.

Філасофскае сцвярджэнне сэнсу жыцця як творчасці ў лірыцы М. Багдановіча.

Лірыка кахання ў паэзіі М. Багдановіча.

Верш М. Багдановіча “Пагоня” як узор патрыятычнай лірыкі.

Патрыятычны гімн Беларусі (верш “Пагоня” М. Багдановіча).

Творчасць Алеся Гаруна.

Асноўныя матывы творчасці Змітрака Бядулі.

Вобраз Самсона Самасуя ў рамане А. Мрыя “Запіскі Самсона Самасуя”.

“У васкросшую верыць краіну...” (творчасць Цішкі Гартнага)

“Гляджу я ў потнае акно вялікай будучыні...” (творчасць Міхася Чарота)

Творчы шлях Платона Галавача

Пачынальнік вялікай прозы (творчасць Ядвігіна Ш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Першы народны артыст Беларусі (драматургічная спадчына Уладзіслава Галубка)

Вялікая проза Міхася Зарэцкага.

Сэнс назвы рамана М. Зарэцкага "Вязьмо".

"Браму скарбаў сваіх адчыняю..." (творчасць М. Гарэцкага).

Майстэрства К. Крапівы-байкапісца.

Сацыяльная накіраванасць сатырычных вобразаў у байках К. Крапівы.

Праблема дабра і зла ў камедыі К. Крапівы "Брама неўміручасці".

Вобраз Дабрыяна ў камедыі К. Крапівы "Брама неўміручасці".

Выкрыццё Гарлахвацкага і гарлахватчыны ў камедыі К. Крапівы "Хто смяецца апошнім".

Вобраз Тулягі ў камедыі К. Крапівы "Хто смяецца апошнім".

Ці перавяліся ў нашым жыцці Гарлахвацкія?

"О Беларусь, мая шыпшына..." (творчасць У. Дубоўкі).

Матывы і вобразы паэзіі У. Жылкі.

Па старонках твораў Кузьмы Чорнага.

Сацыяльныя пераўтварэнні ў рамане К. Чорнага "Трэцяе пакаленне".

Ці быў Міхал Тварыцкі ворагам народа? (па рамане К. Чорнага "Трэцяе пакаленне").

Параўнальная характарыстыка вобразаў Міхала і Зосі (па рамане К. Чорнага "Трэцяе пакаленне").

Праблема будучыні ў рамане К. Чорнага "Трэцяе пакаленне".

Трагічны воблік эпохі ў апавяданнях М. Лынькова пра змаганне з інтэрвентамі і фашыстамі.

Васька Шкетаў і Ванька Разанскі ў апавяданні М. Лынькова "Над Бугам".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вобраз Захара Крымянца ў аповесці М. Лынькова “Сустрэчы”.

Страты Захара Крымянца ў змаганні за справядлівае жыццё (аповесць М. Лынькова “Сустрэчы”).

Асноўныя тэмы і вобразы лірыкі П. Броўкі.

Паэзія П. Броўкі ваенных гадоў.

Антываенная накіраванасць паэмы П. Броўкі “Голас сэрца”.

Вобраз маці-паланянкі ў паэме П. Броўкі “Голас сэрца”.

“... І сябе асудзіў на пакуты” (творчасць Пятра Глебкі).

Асноўныя тэмы і вобразы пасляваеннай лірыкі А. Куляшова.

Паэма А. Куляшова “Сцяг брыгады”.

Гераічнае і трагічнае ў паэме А. Куляшова “Сцяг брыгады”.

Давераснёўская лірыка М. Танка.

Патрыятычная лірыка М. Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Вобраз часу і чалавека ў пасляваеннай лірыцы М. Танка.

Тэма мастака і мастацтва ў творчасці М. Танка.

Агульначалавечыя матывы ў творчасці М. Танка.

“Я сэрцам пісаў сваю кожную песню”. Матывы лірыкі М. Танка.

Грамадзянскі пафас лірыкі П. Панчанкі.

“У паэта няма забароненай зоны” (патрыятычныя і грамадзянскія матывы ў творчасці П. Панчанкі).

“Я вярнуся туды, дзе мой народ” (па рамане Я. Брыля “Птушкі і гнёзды”).

Высакароднасць герояў у апавяданнях Я. Брыля “Маці” і “Memento mori”.

Шчасце... У чым яно? (паводле апавядання Я. Брыля “Галя”).

Шляхі-дарогі Васіля і Ганны (раман І. Мележа “Людзі на балоце”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Драма Васіля Дзятла ў “Палескай хроніцы” І. Мележа.

Вобраз Ганны (“Палеская хроніка” І. Мележа).

Вобраз Яўхіма Глушака ў рамане І. Мележа “Людзі на балоце”.

Трагедыя Аляксея Башлыкова (“Палеская хроніка” І. Мележа).

“Палеская хроніка” І. Мележа — адзін з лепшых твораў беларускай літаратуры.

Лёс беларускага народа ў цыкле раманаў І. Мележа “Палеская хроніка”.

Палеская вёска 20-х гг. (“Палеская хроніка” І. Мележа).

Трагедыя сейбіта (Міхал у “Новай зямлі” і Васіль у “Палескай хроніцы”).

Тэма калектывізацыі ў беларускай літаратуры.

Праблема чалавечага шчасця і сэнсу жыцця ў рамане І. Шамякіна “Трывожнае шчасце”.

Шляхі-дарогі Пятра Шапятовіча і Сашы Траянавай (па пенталогіі І. Шамякіна “Трывожнае шчасце”).

Гартаючы старонкі твораў Івана Шамякіна

Аповесць Івана Шамякіна “Ахвяры”

“Люблю ўсе колеры жыцця” (творчасць Сяргея Грахоўскага)

“А часу больш, чым вечнасць...” (творчасць Масея Сяднёва)

“Ты мой боль святы, Беларусь мая...” (творчасць Ларысы Геніюш)

Гуманістычны пафас ваеннай тэмы ў прозе В. Быкава.

Вобразы Петрака і Сцепаніды (аповесць В. Быкава “Знак бяды”).

“Свае” і чужыя ў аповесці В. Быкава “Знак бяды”.

Трагічны лёс беларускага сялянства ў аповесцях В. Быкава “Знак бяды”, “Аблава”, “Сцюжа”.

Выяўленне сапраўднай сутнасці чалавека ў аповесці В. Быкава “Абеліск “.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Духоўны выбар герояў у аповесці Васіля Быкава “Сотнікаў”

Вобраз Ягора Азевіча (аповесць Васіля Быкава “Сцюжа”)

Новыя творы Васіля Быкава.

Гістарычнае мінулае ў творчасці У. Караткевіча.

Адлюстраванне пярэдадня паўстання 1863 г. на Беларусі ў рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”.

Рамантычны герой у рамантычных абставінах (па рамане У. Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”).

Вобраз Радзімы ў творчасці У. Караткевіча.

Матывы і вобразы лірыкі У. Караткевіча.

Надзённасць праблем, узнятых у камедыі А. Макаёнка “Выбачайце, калі ласка!”.

Драматургічная спадчына Андрэя Макаёнка

Вайна і сучаснасць у творах Івана Навуменкі

“Жыццё — выпрабавальнасць чалавека на чалавечнасць” (творчасць А. Дударава).

Сатырычная камедыя М. Матукоўскага “Амністыя”.

Паэзія Ніла Гілевіча.

Раман у вершах “Родныя дзеці” Н. Гілевіча — вострасюжэтны твор пра сучаснасць.

Ідэйна-тэматычная накіраванасць рамана ў вершах Н. Гілевіча “Родныя дзеці”.

“Трэба дома бываць часцей...” (па творах Р. Барадуліна).

Іван Чыгрынаў — празаік і драматург.

192.“З Мсціжаў бачны свет...” (творчасць Івана Пташнікава).

193.Пад мірным небам Бацькаўшчыны (творчасць Барыса Сачанкі).

194.Тэма вайны ў творчасці Алеся Адамовіча.

195.“Хараство і боль жыцця” (творчасць Вячаслава Адамчыка).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

196.“Мне ў душу стагоддзяў глянуць хочацца” (творчасць Леаніда Дайнекі).

197.Сляды, што пакінуў навекі шлях наш суровы (па творах Генрыха Далідовіча).

198.“Крыж пакутаў і памяці” (творчасць Віктара Казько).

199.Прырода і чалавек у творах Віктара Карамазава.

200.Вечны жураўліны крык (творчасць Алеся Жука).

201.Асноўныя тэмы ў прозе Алеся Асіпенкі.

202.“І ўсіх працягаў я — пачатак” (творчасць Васіля Зуёнка).

Асноўныя матывы творчасці Генадзя Бураўкіна.

Асноўныя матывы творчасці Янкі Сіпакова.

Паэзія Алеся Разанава.

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць... (па творах Анатоля Вярцінскага).

Асноўныя матывы творчасці Сяргея Законнікава.

Тэматычная скіраванасць твораў Аляксея Карпюка.

Вайна і сучаснасць у паэзіі Аляксея Пысіна.

Творчы шлях Наталлі Арсенневай.

Паэзія беларускай эміграцыі.

212.“Любоў мая, ты песня і маркота...” (творчасць Яўгеніі Янішчыц).

З гісторыяй на “Вы” (творчасць Уладзіміра Арлова).

Тэма Радзімы ў паэзіі беларускай эміграцыі.

Ваенная тэма ў сучаснай беларускай прозе.

Гістарычная тэма ў сучаснай беларускай літаратуры.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў беларускай літаратуры.

Тэма кахання ў беларускай літаратуры.

Дакументальная і мемуарная проза ў сучаснай літаратуры.

Беларуская драматургія на сучасным этапе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сучасная беларуская драматургія (агульны агляд).

Сучасная беларуская проза (агульны агляд).

Сучасная беларуская паэзія (агульны агляд).

Гімн жанчыне-маці ў беларускай літаратуры.

Пра маці можна гаварыць бясконца.

Мой сучаснік у творах беларускіх пісьменнікаў.

“Мой родны кут...” (Я. Колас).

“Люблю цябе, Белая Русь” (М. Стральцоў).

“Як ты сэрцу міла, дарагая Беларусь” (П. Броўка).

“Матчынай зямлі карэнні ніколі не адпусцяць нас” (П. Панчанка).

Нам засталася спадчына...

“О родная зямля! Ты — кніга вечнага жыцця!” (М. Танк).

“Беларускі мой радзімы краю” (А. Гарун).

Радзіма мая — Беларусь.

“Дзе карэнні твае, адкуль твой род пачаўся...”(Р. Барадулін).

І праз усе нягоды і адлегласці мне свецяць вочы роднай Беларусі.

“Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі” (Янка Купала).

“Я вітаю цябе, незабыўны мой кут” (А. Лойка).

“Зямля — аснова ўсёй Айчыне” (Я. Колас).

Мая Бацькаўшчына: мінулае і сучаснае.

“О Беларусь, мая калыска, жыццё маё, прытулак мой!” (П. Глебка).

Вандраванне па Беларусі.

“Роднае слова! Ты тлумачыш нам усе дзівы свету” (Цётка).

“Трапяткое, жывое, як сонца ў росах, несмяротнае, роднае матчына слова!” (Н. Гілевіч).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Паплыло паводкаю, загуло, як вецер, слова беларускае па вялікім свеце” (Я. Купала).

“Дзяды і бацькі нашу мову стваралі, каб звонка звінела, была, як агонь” (П. Броўка).

“Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная” (Ф. Багушэвіч).

“Табе складаю шчыры свой санет, прапрадзедаў маіх жывая мова” (Е. Лось).

“Пароль неўміручасці — родная мова” (П. Макаль).

“Жыла і будзеш жыць ты, песня матчына” (Н. Гілевіч).

“Песню сваю, мову сваю я да грудзей прытульваю” (П. Панчанка).

Хочаш міру — змагайся за мір!

“Ты кажаш, я не ведаю вайны...” (Н. Гілевіч).

Памяць вечная аб тых, хто загінуў.

Чалавек на вайне (па творах сучасных аўтараў).

Усе шляхі адкрыты маладым.

Без навук, як без рук.

Кім быць і якім быць?

Веды робяць чалавека моцным.

Кніга ў маім жыцці.

Калі чытаеш кнігі на роднай мове...

Прырода і мы.

Прырода — крыніца прыгажосці.

Абараніць прыроду — значыць абараніць жыццё.

“І сляпуча ў блакіце над намі злая зорка ўзышла” (М. Мятліцкі).

Будзе, будзе да скону мне Чарнобыль балець.

Зорка Палын (па творах беларускіх пісьменнікаў пра Чарнобыль).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Намацаць галінамі сонца” (Я. Колас).

“Самы светлы талент — дабрата” (С. Грахоўскі).

“Без чалавечнасці не будзе вечнасці” (П. Панчанка).

“Бяда і радасць ходзяць побач вечна, людзей ратуе толькі чалавечнасць” (П. Панчанка).

“Перажыві ж у момант век” (М. Багдановіч).

Сейце разумнае, добрае, вечнае.

“Праўда веку! Зрабі нас дужымі...” (П. Панчанка).

“Ніколі праўда не ўмірае” (У. Дубоўка).

“Наш лёс, бы кат з рукой забойнай” (У. Жылка).

“Колькі талентаў звялося” (Я. Колас).

След, які ты хацеў бы пакінуць пасля сябе.

“Усё пакінуць след павінна” (П. Броўка).

“Добра быць у дарозе, якую ты сам выбіраеш” (Я. Колас).

Свой лёс мы самі выбіраем.

Кожны з нас выбірае сцяжыну жыцця.

Без мінулага няма сучаснага і будучага.

Будучае пачынаецца сёння.

Сляды, што пакінуў навекі шлях наш суровы.

Па старонках твораў пра мінулае.

“Дзяды — вытокі кожнага народа” (А. Лойка).

Павага да бацькоў — павага да сябе.

“Ёсць чары ў забытым, старадаўнім!” (М. Багдановіч).

Чалавек — гэта цэлы свет.

“Лечыцца трава ад спёкі ліўнем, людзі ласкай лечацца людской” (П. Панчанка).

”Не стварайце сабе багоў, хай дюдзьмі застаюцца людзі” (Г. Бураўкін).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паміраюць паэты — застаюцца іх несмяротныя словы.

Мы хочам, каб мірнае неба не знала пажараў вайны.

Калі ёсць у народа такія героі, не загіне давеку народ.

Мой сучаснік у жыцці і літаратуры.

Мой любімы твор сучаснай беларускай літаратуры.

Мой любімы паэт (пісьменнік).

Бывай, XX стагоддзе!..

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Т Э К С Т Ы   С А Ч Ы Н Е Н Я Ў

## 1

## ДЗЯДЫ — ВЫТОКІ КОЖНАГА НАРОДА

Продкамі не грэбуйце ніколі,
Бо яны жыццём сваім, крывёю
Здабывалі і зямлю, і волю.
*Э.Валасевіч*

Дзень памяці продкаў у народзе называюць дзядамі. Гэты народны памінальны абрад паходзіць ад дахрысціянскага ўсходнеславянскага звычаю трызны і спраўляецца чатыры разы на год (перад Змітравым днём, на радаўніцу, перад масленіцай і сёмухай). Лічыцца, што ў гэты дзень душы памёршых продкаў прыходзяць да жывых, глядзяць на сваіх нашчадкаў, радуючыся за іх поспехі і сумуючы, калі ў хаце штосьці робіцца не так. Таму на дзяды гатавалі святочныя і абрадавыя стравы, запальвалі свечкі, успаміналі добрым словам памёршых дзядоў і прадзедаў, клікалі на вячэру, паклаўшы для іх на асобныя талеркі куццю.

А ці помнім мы сваіх дзядоў-прадзедаў? Ці можам адшукаць свае карані ў радаводным дрэве Беларусі? Такое пытанне ў адным з вершаў задае Р.Барадулін:

Дзе карані твае,
Адкуль твой род пачаўся,
Ці з прыцемкаў быцця, —
Ці з цемры небыцця...

Наш сучаснік наўрад ці можа адказаць на гэта пытанне. Добра, калі ён прыгадае прозвішча і імя дзеда ці прадзеда. Радавод, на жаль,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гэтым заканчваецца. Падкрэсліваючы кароткую радаводную памяць нашых сучаснікаў, А.Русецкі піша:

Я — мужыцкі сын, і радаслоўная
анідзе не значыцца мая,
дзед і прадзед, а далей замглёная
далячынь —
стагоддзяў акіян.

Гэтую ж думку пацвярджае і В. Вітка ў вершы “Спадчына”:

Адтуль вяду я свой жыццёвы след
І радаслоўную пішу спачатку,
Бо на той свет з сабою цемнік-дзед
Забраў і герб фамільны, і пячатку.

Калі ж прасачыць гісторыюБеларусі, то ў ёй можна без цяжкасцей адшукаць такія славутыя постаці, як князь Рагвалод, Рагнеда, Усяслаў Чарадзей, Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі. Пажаўцелыя старонкі летапісаў уваскрашаюць смелыя і адважныя ўчынкі чараўніка князя Усяслава, у час кіравання якога полацкая дзяржава дасягнула найвышэйшага росквіту; дзейнасць нябеснай заступніцы Беларусі Ефрасінні Полацкай, па заказе якой была пабудавана сусветна вядомая царква Спаса і створаны крыж — шэдэўр старажытнабеларускага мастацтва; творчы запал славутага пісьменніка, мастака, прапаведніка Кірылы Тураўскага. Эпоху Адраджэння нельга ўявіць без першаасветніка, друкара, рэфарматара мовы, лекара і батаніка Францішка Скарыны, багатая спадчына якога і сёння служыць ідэі нацыянальнага адраджэння. Яркім прыкладам служэння Айчыне з’яўляюцца жыццё і дзейнасць Льва Сапегі, Міколы Гусоўскага, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, Лявонція Карповіча, Лаўрэнція Зізанія. Нязгасныя імёны Кастуся Каліноўскага, Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча складаюць гонар і славу нашага народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выдатныя пісьменнікі, дзяржаўныя дзеячы, змагары за свабаду і незалежнасць Беларусі сеялі на зямлі зярняты вечнага дабра і праўды, паказвалі ўзоры мужнасці і самаахвярнасці.

Нагадваем гэтыя імёны, і гордасцю поўніцца сэрца. Значыць, мы "не без роду, без племені", значыць ёсць у нас спадчына, багатая, цікавая і разнастайная. Падкрэсліваючы гэта, народны паэт Беларуі Н.Гілевіч сцвярджае:

Мы ўзышлі не з насення, што ветрам занесена,
Мы не дзікай травы самарослыя парасткі.
У глыбінях зямлі, гераічнай і песеннай,
Нашых душ карані — з вузялкамі упартасці.

На дзяды памінаюцца і нашы далёкія продкі, і трагічныя фігуры сталінскіх рэпрэсій 30-х гг., і загінуўшыя ў гады ваенных ліхалеццяў, і нашы блізкія, родныя. У кожным з нас павінна жыць памяць аб іх светлых вобразах. Не павінна забыцца, сцерціся з памяці і бацькоўская вера, матчына мова, народныя звычаі, традыцыі. Без ведання гістарычнага мінулага не можа быць ні сучаснасці, ні будучыні. Мінулае — гэта карані нашага тысячагадовага радавога дрэва. Не будзе каранёў — загіне дрэва, не застанецца ў будучым і памяці пра нас. І таму трэба ахоўваць, берагчы не толькі радаводнага дрэва, але і кожную яго галіну, якая, тоячы ў сабе памяць далёкіх продкаў, павінна вечна шумець сакавітым лісцем.

## 2

## ПОСТАЦІ ДАЛЁКАЙ МІНУЎШЧЫНЫ

Новы дзень прыйдзе, і новыя людзі
Будуць пачатую думку снаваць
*Я.Купала*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праз смуту стагоддзяў, з пажаўцелых старонак летапісаў паўстаюць перад намі велічныя постаці сыноў і дачок беларускага народа, якія пакінулі важкі след у яго гісторыі і культуры. Сваімі справамі ўславілі яны наш родны край, назаўсёды стаўшы людзьмі-легендамі. Гэта былі дзяржаўныя і культурныя дзеячы Беларусі Рагвалод, Рагнеда, Усяслаў Чарадзей, Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі і яшчэ шмат і шмат выдатных асоб. Аб іхнім жыцці і справах на карысць Бацькаўшчыны мы даведваемся са старонак летапісаў. Так, з "Аповесці мінулых гадоў" і "Полацкага летапісу" вядома, што князем першай беларускай дзяржавы быў Рагвалод. Полацкае княства было тады даволі магутнай дзяржавай, і з ёй хацелі мець ваенны і палітычны саюз многія суседзі.

Жыццё нашых продкаў  часта праходзіла ў братазабойчых войнах з суседзямі. Аб адным з такіх эпізодаў нашай гісторыі расказваецца ў "Аповесці мінулых гадоў". Да дачкі Рагвалода Рагнеды прыслаў сваіх сватоў кіеўскі князь Уладзімір, аднак гордая палачанка адмовіла яму. Тады разгневаны Уладзімір пасылае на Полацк войска. У выніку  горад быў зруйнаваны, Рагвалод забіты, а сама Рагнеда трапіла ў палон і была вывезена ў Кіеў пад прымусам. Яна робіць замах на жыццё князя, аднак пасля няўдалае спробы была выслана пад Менск разам з сынам Ізяславам. Такой мужнай, незалежнай, гордай жанчынай была родапачальніца ўсіх полацкіх князёў.

У сярэдзіне ХІ ст. у Полацку княжыў унук Рагнеды Усяслаў Чарадзей. Менавіта пры ім беларуская дзяржава зазнала найвышэйшы росквіт, уздым. Дастаткова прыгадаць, што ў яго княжанне быў пабудаваны велічны Сафійскі сабор. У "Слове пра паход Ігараў" Усяслаў характарызуецца як чараўнік, шчыры і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

працавіты князь, чалавек непакорнага духу і вялікага розуму. Прыпісваюцца яму і незвычайныя здольнасці да чарадзейства.

Гордай пераемніцай добрых спраў і ўчынкаў сваіх папярэднікаў была ўнучка Усяслава Чарадзея, славутая палачанка Ефрасіння Полацкая, якая заслужыла добрую памяць і ўшанаванне за сваю ахвярнасць і самаадданасць народу. Па яе заказе дойлід Іван пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса ў Полацку, а ювелір Лазар Богша зрабіў славуты крыж — неацэнны помнік, шэдэўр старажытнабеларускага мастацтва. Ефрасіння Полацкая пашырала пісьмовае слова, уздымала свой голас супраць княжацкіх усобіц, братазабойчых войнаў. Яна стала адной з першых кананізаваных жанчын на ўсходніх землях, нябеснаю заступніцай не толькі Полацка, але і ўсёй беларускай зямлі.

Але не ў адным Полацку жылі тыя, хто складае сёння гонар нашай нацыі. У сталіцы Тураўскага княства жыў славуты пісьменнік, мастак, прапаведнік, царкоўны дзеяч Кірыла Тураўскі, якога нашы продкі называлі Златавустам. Творы К.Тураўскага, у якіх уздымаліся праблемы духоўнай дасканаласці суайчыннікаў, пытанні грамадска-палітычнага жыцця, склалі залаты фонд старажытнай літаратуры. Яны на працягу многіх стагоддзяў карысталіся вялікай папулярнасцю, памнажаліся і разыходзіліся ў сотнях рукапісных спісаў.

Гаворку на гэтую тэму можна працягваць бясконца. Можна прыгадаць сотні і тысячы імёнаў тых, хто паклаў “души своя” на алтар Айчыны. Але ўсіх іх аб’ядноўвае адно: дзяржаўныя і культурныя дзеячы мінулага былі высакароднымі, моцнымі духам, смелымі і адважнымі людзьмі. Яны са зброяй у руках баранілі ад ворагаў сваю Айчыну, гінулі ў сечах за вольнасць Бацькаўшчыны,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выдавалі кнігі, будавалі храмы, зберагалі з ўзбагачалі нашу спадчыну. Яны былі дзецьмі свайго часу, пачаткам нашай гісторыі. І мы павінны помніць пра іх, бо ў гэтых каранях і вытоках — наша сучаснасць і будучыня.

## 3

## ПА СТАРОНКАХ ТВОРАЎ ПРА МІНУЛАЕ

> Цікавасць да даўніны мае духоўны характар, яна караніцца ў сутнасці чалавека, жыццё якога вельмі кароткае, але чый розум жадае агарнуць неахопны час, зазірае ў будучыню і пранікае ў мінулае.
>
> *К. Тарасаў*

Сёння, як ніколі раней, узрасла цікавасць да гісторыі. Яе праблемы хвалююць не толькі спецыялістаў, але і шырокае кола грамадскасці. І на гэта ёсць прычыны.

На крутых паваротах гісторыі людзі заўсёды звяртаюцца да дзён мінулых, каб больш дакладна і глыбока ўсвядоміць дзень сённяшні, каб зразумець свае вытокі, карані. Забыццё і пагарджанне ўрокамі гісторыі спараджае непрадказальныя і недаравальныя памылкі і расчараванні. Гісторыя ўмее жорстка помсціць, але ж і ўмее вучыць тых, хто прагне гэтай навукі. “У падзеях мінулага, — сцвярджаў У. Караткевіч, — нашы карані. А дрэва без карэння не можа ні існаваць, ні тым больш прыносіць плады”.

Менавіта з імем У. Караткевіча звязана абуджэнне цікавасці да гісторыі нашай зямлі. Яркія, мужныя, самаахвярныя героі, якія жывуць і дзейнічаюць у яго творах, вучаць нас любові да Радзімы, да яе народа, мовы і культуры, сцвярджаюць, што мы не бязроднае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

племя на гэтай зямлі, што за нашымі плячыма — слаўныя прыклады духоўных і грамадзянскіх подзвігаў нашых продкаў. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова прайсціся сцежкамі персанажаў твораў “Сівая легенда”, “Цыганскі кароль”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, “Нельга забыць”, “Каласы пад сярпом тваім” і інш. Са старонак гэтых твораў паўстаюць змагары за народнае шчасце, прарокі, інтэлігенты, рыцары і прыгоннікі, кардыналы і чароўнай прыгажосці дзяўчаты. Яны ўмеюць па-свойму любіць, ненавідзець, пакутаваць, адстойваць свае погляды. Іх лёсы неадрыўныя ад гістарычных падзей і абумоўленыя гэтымі падзеямі. І ў кожным творы — эпоха, складаны і часам трагічны лёс Беларусі, народ, які не скарыўся перад нястачамі і прыгнётам, прагне волі і лепшай долі. У. Караткевіч не толькі ўзнаўляе карціны жыцця Сярэднявечча і наступных эпох, але і асэнсоўвае гістарычны працэс, што дазваляе зразумець таямніцы чалавечага быцця, аснову ўзаемаадносін людзей і навакольнага свету.

Аднак найбольш інтэнсіўны этап развіцця гістарычнага жанру ў беларускай літаратуры прыпадае на наш час. І звязаны ён з такімі імёнамі, як Л. Дайнека, А. Лойка, В. Іпатава, К. Тарасаў, А. Петрашкевіч, І. Чыгрынаў, У. Арлоў, Г. Далідовіч, М. Клімковіч.

Цікава ўваскрашае мінулае Беларусі Л. Дайнека ў раманах “Меч князя Вячкі”, “След ваўкалака” і “Жалезныя жалуды”. У цэнтры раманаў — вядомыя гістарычныя асобы, імёны якія можна знайсці на пажаўцелых старонках “Хронікі Лівоніі”, “Летапісца Вялікіх князёў літоўскіх”. Менавіта на “Хроніку Лівоніі” абапіраўся Л. Дайнека пры напісанні сваіх твораў. У “Жалезных жалудах” адным з герояў з’яўляецца князь Міндоўг, пачынальнік Вялікага княства Літоўскага, першай сталіцай якога быў Навагрудак. Адным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з персанажаў рамана "След ваўкалака" з'яўляецца праўнук Рагнеды, полацкі князь Усяслаў Чарадзей, у часы валадарання якога Полацкае княства дасягнула найвышэйшага росквіту і ўздыму.

Лёсу славутай палачанкі, унучкі Усяслава Чарадзея Ефрасінні Полацкай, прысвечаны раман Таісы Бондар "Спакуса". Ефрасіння ўсім сваім жыццём і падзвіжніцкай дзейнасцю заслужыла добрую памяць і ўшанаванне. Менавіта па яе заказе дойлід Іван пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса ў Полацку, а залатар Лазар Богша зрабіў крыж — неацэнны помнік, шэдэўр старажытнабеларускага мастацтва. Ефрасіння Полацкая пашырала пісьмовае слова, уздымала свой голас супраць княжацкіх усобіц і братазабойчых войнаў. Яна стала адной з першых кананізаваных жанчын з усходнеславянскіх земляў, нябеснаю заступніцай Полацка і ўсёй беларускай зямлі.

Грунвальдскай бітве 1410 г. прысвечаны твор К. Тарасава "Пагоня на Грунвальд". Між іншым, аб гэтым была і першая аповесць К. Тарасава "Дзень рассеяння". Празаічнаму зборніку У. Арлова "Дзень, калі ўпала страла" і аповесці "Час чумы" ўласцівы тонкі псіхалагізм, праўдзівасць адлюстравання далёкіх падзей. Трылер М. Клімковіча "Каханка д'ябла, або Карона Вітаўта Вялікага" — спроба пэўнай белетрызацыі гістарычнай літаратуры.

Гістарычны жанр у беларускай літаратуры перажывае час свайго сцвярджэння ў рэчышчы нацыянальнай і сусветнай культуры. І чым глыбей мы будзем асэнсоўваць сваё гістарычнае мінулае, карпатліва даследуючы яго невядомыя старонкі, тым глыбей будзем усведамляць сябе як самабытную нацыю, якая ведае, адкуль і куды яна ідзе па скрыжаваннях гісторыі і якое яе месца на гэтай зямлі. Таму літаратура пра мінулае нашай Бацькаўшчыны, спалучаная з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

добрым веданнем гісторыі свайго народа, адыгрывае ў гэтым працэсе самаўсведамлення вялікую ролю.

## 4

## НЯБЕСНАЯ ЗАСТУПНІЦА БЕЛАРУСІ ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ

Сілай духоўнай узвысіла Полацк
высока,
Тым, хто імкнуўся да кнігі,
свяціла, як зорка...
Мове, адзінай дзяржаве
шчэ толькі злучацца —
свет нас прымаў як народ
па адной палачанцы.
*Д. Бічэль-Загнетава*

З цемры мінулых стагоддзяў дайшлі да нас імёны выдатных дзеячаў беларускай культуры. Сярод іх асобае месца займае імя Ефрасінні Полацкай. З ёй асацыіруецца не толькі духоўнае жыццё на ўсходнеславянскіх землях у XII ст., але і ўся шматвяковая гісторыя Беларусі. Аб унучцы славутага князя Усяслава Чарадзея, князёўне, ігуменні, настаўніцы, выдатнай асветніцы, расказваецца ў "Жыціі Еўфрасінні Полацкай". Гэты найкаштоўнейшы помнік старажытнабеларускай літаратуры, створаны ў канцы XII ст. невядомым аўтарам, дайшоў да нас у шасці рэдакцыях, больш чым ста спісах.

Са старонак Жыція паўстае велічная постаць Ефрасінні Полацкай. Нарадзілася яна ў стольным горадзе Полацкага княства ў 1110 г., вучылася ў школе пры Сафійскім саборы. Калі дзяўчыне споўнілася дванаццаць гадоў, бацькі вырашылі аддаць яе замуж. Аднак князёўна выбірае іншы шлях: адмовіўшы сватам, яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пастрыглася ў манастыр і пачала займацца перакладчыцкай дзейнасцю, перапісваннем кніг Святога Пісання (“нача книгы писати своими руками”). Ефрасіння Полацкая сама пісала арыгінальныя творы (малітвы, казанні) і, на думку некаторых даследчыкаў, удзельнічала ў стварэнні Полацкага летапісу.

Паблізу Полацка Ефрасіння заснавала мужчынскі і жаночы манастыры, дзе былі арганізаваны школы і скрыпторыі — майстэрні па перапісванні кніг. Асветніца з роду Усяслава выступала супраць княжацкіх усобіц, братазабойчых войнаў. Багатыя славілі яе за мудрасць, бедныя — за спагаду і дабрыню. Як сведчыць аўтар Жыція, Ефрасіння была “памочніца пакрыўджаным, зажураным суцяшэнне, распранутым адзенне, хворым наведванне ці, проста кажучы, — для ўсіх была ўсім... Еўфрасіння — няўвядальная кветка райскага саду. Еўфрасіння — арол, што, лунаючы ў небе, праляцеў ад захаду да ўсходу, як прамень сонечны, прасвятліўшы зямлю Полацкую”.

Ефрасіння Полацкая нястомна збірала вакол сябе таленавітых людзей, з’яўлялася адной з першых нашых мецэнатак. Па яе заказе дойлід Іван пабудаваў сусветна вядомы Спасаўскі сабор, распісаны унікальнымі фрэскамі. Фрэскавыя замалёўкі XII ст. амаль цалкам захаваліся. І сёння яны ўражваюць сваёй дасканаласцю, хвалююць багаццем палітры, адухоўленасцю. З імем асветніцы звязана і стварэнне ў 1161 г. майстрам-ювелірам Лазарам Богшам славутага крыжа — шэдэўра старажытнабеларускага ювелірнага мастацтва. Крыж быў упрыгожаны 21 залатой пласцінкай, каштоўнымі камянямі, арнаментальнымі кампазіцыямі і 12 эмалевымі абразкамі з выявымі святых. У сярэдзіне крыжа ў пяці квадратных гнёздах былі змешчаны рэліквіі: кавалачак крыжа Гасподняга з кроплямі Ісусавай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

крыві, драбок каменя ад дамавіны Багародзіцы, часткі мошчаў святых Стэфана і Панцеляймона, а таксама кроў святога Дзмітрыя. На крыжы быў выбіты тэкст, у якім паведамлялася імя яго стваральніка, кошт дарагіх металаў і камянёў, што пайшлі на яго аздабленне, а таксама змяшчаўся праклён тым, хто ўкрадзе ці прадасць святыню. І ўсё ж праклён не падзейнічаў на сучаснікаў і нашчадкаў Ефрасінні Полацкай. Пасля смерці князёўны-ігуменні крыж быў вывезены ў Смаленск, пазней — у Маскву. Полацкая святыня была вернута на ранейшае месца ў 1563 г. У пачатку 20-х гг. нашага стагоддзя крыж стаў экспанатам царкоўна-археалагічнага музея ў Мінску, адкуль быў перавезены ў Магілёў. У гады Вялікай Айчыннай вайны шэдэўр ювелірнага мастацтва таямнічым чынам знік. Ёсць меркаванні, што ён нібыта знаходзіцца ў Амерыцы ў прыватнай калекцыі.

На схіле жыцця Ефрасіння Полацкая перадала ігуменства малодшай сястры Еўдакіі і здзейсніла паломніцтва ў Святую Зямлю. Захварэўшы ў дарозе, яна памерла (у 1173 г.) і была пахавана ў Іерусалімскім манастыры святога Феадосія. Яе мошчы былі перазахаваны ў Кіева-Пячэрскай лаўры, а ў 1910 г. перавезены ў заснаваны ёю Спасаўскі манастыр у Полацку, дзе захоўваюцца і сёння.

Ефасіння Полацкая пражыла вялікае жыццё, асветленае высакароднай ідэяй служэння народу. Яна стала адной з першых кананізаваных (прылічаных да святых) жанчын на ўсходніх землях, нябеснаю заступніцай (апякункаю) не толькі Полацка, але і ўсёй беларускай зямлі.

Незвычайны лёс Ефрасінні Полацкай натхніў на творчасць многіх гісторыкаў, літаратараў, мастакоў. Вобраз асветніцы паўстае са

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

старонак раманаў Таісы Бондар (“Спакуса”), Алеся Асіпенкі (“Святыя грэшнікі”), гістарычнай аповесці Вольгі Іпатавай “Прадслава”, кніг Уладзіміра Арлова “Асветніца з роду Усяслава” і “Еўфрасіння Полацкая”. Ёй прысвяцілі свае вершы Ларыса Геніюш, Наталля Арсеннева, Рыгор Барадулін, Алесь Разанаў, Генадзь Бураўкін, Сяржук Сокалаў-Воюш і інш. Самаахвярнае жыццё беларускай патронкі ўваскрашаюць палотны жывапісцаў Аляксея Марачкіна і Нінэлі Шчаснай, графічныя аркушы Арлена Кашкурэвіча, габелены Сымона Свістуновіча, фільм рэжысёра Вольгі Моракавай.

## 5

## БЕЛАРУСКІ “ЗЛАТАВУСТ” КІРЫЛА ТУРАЎСКІ

> Гора будзе ўсім тым, хто не трымаўся кніжнай
> мудрасці і наказаў духоўных бацькоў.
>
> *Кірыла Тураўскі*

Пісьменнік-прапаведнік, выдатны майстар аратарскай прозы, царкоўны дзеяч XII ст., Кірыла Тураўскі быў адным з самых адукаваных людзей свайго часу. Ён выдатна ведаў Святое Пісанне, класічную візантыйскую рыторыку і паэтыку, валодаў многімі мовамі. Праведнае жыццё, адукаванасць, красамоўства зрабілі імя царкоўнага дзеяча вядомым яшчэ ў маладосці.

У творчай спадчыне асветніка — аповесці, малітвы, “словы”, павучанні, пасланні, каноны, якія вызначаюцца ўзнёсласцю, лірызмам, эмацыянальна вытанчанай мовай. Да нашых дзён захавалася 8 “слоў”- пропаведзей (“Слова на свята Вялікдзень”, “Слова на вербніцу”, “Слова на ўшэсце” і інш.), некалькі аповесцей-прытчаў і казанняў (“Прытча пра чалавечую душу і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цела”, “Аповесць пра беларызца і манаства”, “Казанне пра чарнарызскі чын”), два каноны, каля трох дзесяткаў вершаў і малітваў. У творах К. Тураўскага адлюстроўваюцца багаслоўска-філасофскія і грамадска-этычныя погляды пісьменніка, тлумачыцца сімволіка многіх біблейскіх кніг, уздымаюцца праблемы духоўнай дасканаласці суайчыннікаў. Праз біблейскі змест прасочваюцца думкі аб радасцях чалавечага жыцця, харастве навакольнай прыроды, недасканаласцях дзяржаўнага ладу.

К. Тураўскі праяўляў асаблівы клопат пра духоўную дасканаласць суайчыннікаў. У “Прытчы пра чалавечую душу і цела” (ці “Слове пра сляпога і кульгавага”) пісьменнік выкарыстоўвае ў якасці сюжэта евангельскае апавяданне пра руплівага гаспадара. Пасадзіўшы вінаград, ён паставіў ля варот двух вартаўнікоў: сляпога і кульгавага.”Калі хто з маіх ворагаў захоча абакрасці вінаграднік, то кульгавы убачыць, а сляпы пачуе. Калі ж хто-небудзь з іх захоча ўвайсці ў вінаграднік, то кульгавы, не маючы ног, не зможа прайсці ўсярэдзіну; сляпы ж, калі і ўвойдзе, то, заблудзіўшыся, у прорве разаб’ецца”, — так разважае гаспадар. На самой справе ўсё адбылося інакш. Сляпы і кульгавы, аб’яднаўшы свае сілы (сляпы нёс кульгавага, а кульгавы паказваў дарогу), самавольна трапілі ў сад і прысвоілі чужое дабро. Гаспадар, даведаўшыся пра здзейсненае, загадаў прагнаць “злачынцаў”. К. Тураўскі ў вобразе сляпога паказаў чалавечую душу, у вобразе кульгавага — цела. Гаспадар — Бог, стваральнік свету — карае сляпога і кульгавага, выганяючы іх з саду. Гэтым самым аўтар сцвярджае думку аб адказнасці чалавека перад Богам і пакаранні за грахі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Высокамастацкія аратарскія творы К. Тураўскага склалі залаты фонд старажытнай літаратуры. Яны на працягу многіх стагоддзяў карысталіся вялікай папулярнасцю, памнажаліся і разыходзіліся ў сотнях рукапісных спісаў. Менавіта пагэтаму нашы продкі называлі асветніка Златавустам, параўноўваючы яго са славутым аратарам і майстрам красамоўства IV ст. н. э..

## 6

## ПАДЗЕІ І ФАКТЫ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ Ў "СЛОВЕ ПРА ПАХОД ІГАРАЎ"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выдатным помнікам старажытнай літаратуры з'яўляецца "Слова пра паход Ігараў", напісанае невядомым аўтарам у 1185—1187 гг. Галоўная ідэя твора — заклік да аб'яднання князёў, спынення імі міжусобных войнаў.

Матэрыялам для "Слова" паслужылі сапраўдныя гістарычныя падзеі: няўдалы паход ноўгарад-северскага князя Ігара на полаўцаў у 1185 г. Наступленне пачалося ў час сонечнага зацьмення, якое, як прынята лічыць, прадказвае дрэнны зыход пачатай справы. І сапраўды, выйграўшы першую бітву, дружыны князя Ігара і яго брата Усевалада затым палеглі, а браты былі захоплены ў палон. Іх стрыечны брат, кіеўскі князь Святаслаў, у сваім "залатым" слове папракае ваяводаў за неабдуманае выступленне, перажывае за паражэнне, асуджае іншых князёў за бяздзейнасць у справе абароны Айчыны, заклікае іх да згоды, да вядзення барацьбы ў адзінстве і згуртаванасці.

У "Слове" нагадваецца той далёкі час, калі ў Полацку валадарыў Усяслаў Чарадзей (яго княжанне лічаць часам найвышэйшага росквіту і ўздыму Полацкага княства). Аўтар малюе

князя як чараўніка, які, падобна казачным, былінным героям, мог ператварацца ў ваўка, тура, сокала, нечакана знікаць і зноў з’яўляцца ў самых розных мясцінах Русі. Усяслаў паказаны шчырым і працавітым князем, здольным і мудрым палкаводцам, чалавекам непакорнага духу і вялікага розуму:

Усяслаў-князь людзям чыніў суды,
Радзіў князям гарады,
А сам уночы ваўком рыскаў,
З Кіева паспяваў да пеўняў да Тмутараканя,
Хорсу вялікаму шлях перацінаў.
Яму ў Полацку пазвоняць ютрань рана
У званы святое Сафіі,
А ён той звон чуе ў Кіеве.

Аўтар “Слова” з болем і горыччу апісвае бітву на Нямізе 3 сакавіка 1067 г., у якой шмат палачан “паклалі жываты свае ў сечы, душы жамчужныя аддалі Богу”:

На Нямізе галовы сцелюць снапамі,
харалужнымі малоцяць цапамі,
жыццё кладуць на таку злюцела,
веюць душу ад цела.
Нямігі крывавыя берагі
не збожжам былі засеяны зноў —
засеяны косцьмі рускіх сыноў.

Пасля бітвы на Нямізе сыны Яраслава Мудрага падманным шляхам паланілі Усяслава: былы полацкі валадар быў кінуты ў цямніцу. Аднак праз год кіяўляне вызвалілі яго з няволі, абвясціўшы вялікім князем кіеўскім. І хоць толькі сем месяцаў кіраваў Усяслаў Руссю, але народ, як сцвярджае аўтар “Слова”, доўга памятаў справядлівае і мудрае княжанне свайго абранніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Слова пра паход Ігараў” цесна звязаны з вуснай народнай творчасцю. Так, плач жонкі Ігара Яраслаўны нагадвае народнае галашэнне. У ім выяўляецца не толькі асабістае гора жанчыны, але і трагічны лёс роднай зямлі і народа. Прырода, надзеленая чалавечымі якасцямі, быццам пачула просьбу Яраслаўны і дапамагла Ігару ўцячы з палону і вярнуцца ў Кіеў. Шматлікія параўнанні, метафары, эпітэты, сімвалы і паэтычныя звароты надаюць твору ўзнёсласць, урачыстасць (*светлае сонца, ясныя сокалы, чорныя вораны, залатое аплечча, жамчужная душа, сярэбраная сівізна, паляцець зязюлькай, сінім воблакам ахінуцца, развеяць весялосць па кавылі і інш.*).

“Слова пра паход Ігараў”, адкрытае ў пачатку 90-х гг. XVIII ст. гісторыкам А. Мусіным-Пушкіным, было апублікавана ў 1800 г. Мастацкай дасканаласцю, багаццем вобразаў, музычнасцю мовы яно натхніла паэтаў, кампазітараў, мастакоў на стварэнне новых твораў на гэтую тэму (опера “Князь Ігар” А. Барадзіна, карціны М. Рэрыха, В. Васняцова). “Слова” перакладалі А. Пушкін, Т. Шаўчэнка, А. Міцкевіч і інш. Першыя пераклады на беларускую мову былі зроблены М. Багдановічам (1910 г., урывак), Я. Купалам (празаічны ў 1919 г., вершаваны ў 1921 г.), М. Гарэцкім (1922 г.). У наш час перакладам выдатнага твора займаліся Р. Барадулін, І. Чыгрынаў, В. Дарашэвіч, Я. Крупенька.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 7

## БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАЕ ЛЕТАПІСАННЕ

У старажытнасці, да ўзнікнення кнігадрукавання, нашы продкі ўсе найбольш значныя падзеі свайго часу занатоўвалі ў форме летапісаў. Летапісы ўяўлялі сабою пагадовыя запісы аб самых

важных падзеях грамадскага, палітычнага, культурнага і эканамічнага жыцця краіны. Вельмі часта ў межах летапісаў змяшчаліся апавяданні, якія ў структурна-кампазіцыйным плане можна было б вылучыць у самастойныя творы. Гэта вынікае з таго, што летапісы мелі сінкрэтычны характар: яны ўтрымлівалі (з пазіцый сённяшняга літаратуразнаўства) апавяданні, аповесці, легенды, прытчы і міфы. Праца летапісца патрабавала вялікай вытрымкі і адукацыі: на перапісванне адной кнігі часам патрабавалася некалькі год. Вось як хораша піша пра гэта М. Багдановіч у вершы “Летапісец”:

Душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах,
Свой векканчае ён у манастырскіх мурах.
тут ціша, тут спакой, — ні шуму, ні клапот.
Ён пільна летапіс чацвёрты піша год
І спісвае усё ад слова і да слова
З даўнейшых граматак пра долю Магілёва.

У межах Беларуска-літоўскага летапісу 1446 г. выдзяляюцца самастойныя “Пахвала вялікаму князю Вітаўту” і “Аповесць пра Падолле”. У апошнім творы абгрунтоўваецца ідэя аб’яднання ўсходніх славян у адну дзяржаву — Вялікае княства Літоўскае. Летапіс пачынаецца са звестак аб паходжанні вялікіх князёў. Згодна яму, на беларуска-літоўскіх землях князі з’явіліся пасля таго, як рымскі імператар Нерон выразаў у Рыме шмат патрыцыянскіх сем’яў. Такое тлумачэнне неабходна было для абгрунтавання высокага сацыяльнага паходжання князёў, а таксама для пацверджання таго тэзісу, што, у адрозненне ад маскоўскіх, літоўскія князі мелі рымскія карані.

Сярод беларускіх летапісаў у першую чаргу патрэбна вылучыць Беларуска-літоўскі летапіс 1446 гг., “Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх” і “Хроніку Быхаўца”. “Беларуска-літоўскі летапіс 1430 — 1446 гг., які

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

першапачаткова ўзнік у Смаленску, храналагічна ахоплівае час ад сярэдзіны IX да сярэдзіны XV стагоддзя. Шмат увагі ў ім надаецца апісанню геаічнага змагання ўсходнеславянскіх плямёнаў з іншаземнымі заваёўнікамі, а таксама вобразу князя Вітаўта.

"Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх" апавядае аб жыцці, подзвігах і дзяржаўных справах вялікіх князёў ад Міндоўга да Вітаўта. Найбольш пранікнёнымі з'яўляюцца радкі, прысвечаныя князю Вітаўту, апісанню росквіту беларуска-літоўскай дзяржавы ў часы ягонага княжання. Летапісец лічыць Вітаўта найвыдатнейшым і найслаўнейшым дзяржаўным дзеячам за ўсю гісторыю Вялікага княства Літоўскага:

І быў князь вялікі Вітаўт моцным гаспадаром,
І слава аб ім ішла па ўсіх землях,
І мноства князёў і цароў служылі пры ягоным двары.

У гэты ж летапіс уваходзіць і апавяданне аб падзеях, якія адбываліся ў Вялікім княстве напярэдадні і пасля заключэння Крэўскай уніі 1385 г.: прыгодніцкая гісторыя аб уцёках Вітаўта ў землі Тэўтонскага ордэна пасля гвалтоўнай смерці Кейстута, шлюб Ягайлы з польскай каралеўнай Ядвігай, аб змаганні Вітаўта супраць Ягайлы пасля таго, як той прызначыў сваім намеснікам не яго, а Свідрыгайлу. Тут жа змешчана і апавяданне пра знакамітую Грунвальдскую бітву 1410 года.

У адрозненне ад вышэйзгаданых летапісаў, у "Хроніцы Быхаўца" гісторыя дзяржавы выкладзена найбольш поўна. Пачынаецца "Хроніка" апісаннем уцёкаў 500 знатных рымскіх сем'яў у Літву ад гневу Нерона, а заканчваецца апавяданнем аб разгроме татарскіх войскаў пад Клецкам у 1506 годзе. Акрамя пісьмовых крыніц аўтар карыстаўся і вуснымі паведамленнямі сваіх сучаснікаў. Аўтар імкнецца ўзвялічыць гісторыю Бацькаўшчыны, паказаць найбольш светлыя моманты яе слаўнай мінуўшчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Летапісы, як вядома, нельга аднесці да літаратуры ў сучасным яе разуменні. Але яны спрыялі ўзнікненню і развіццю ў беларускай літаратуры такіх жанраў, як апавяданне, аповесць і раман. Акрамя таго, у іх у сціслай і займальнай форме адлюстравана гісторыя беларускага і літоўскага народаў перыяду іх сумеснага жыцця. Таму летапісы — гэта не толькі каштоўныя літаратурныя помнікі, але і неацэнныя крыніцы пазнання шматвяковай гісторыі нашай Айчыны, асэнсавання яе ролі і значэння ў гісторыі еўрапейскіх народаў.

## 8

## ФРАНЦІШАК СКАРЫНА — ВЫДАТНЫ ПРАДСТАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ

Любіце і шануйце, як святыню,
роднае слова, з якім вас літасцівы
Бог на свет пусціў.
*Ф. Скарына*

Пра людзей мы мяркуем па справах, якія яны здзейснілі, па спадчыне, якую яны пакінулі сваім нашчадкам. І наш славуты зямляк Францішак Скарына — у гэтым сэнсе найярчэйшы прыклад. Ён з'яўляецца сімвалам усёй беларускай культуры эпохі Рэнесансу. Гэты час называюць Адраджэннем, бо менавіта тады адраджаліся цэлыя народы і нацыянальныя культуры, рабіліся вялікія геаграфічныя і творчыя адкрыцці. У эпоху Адраджэння Калумб адкрыў Амерыку, а Магелан здзейсніў першае кругасветнае падарожжа. Сучаснікамі Скарыны былі Капернік, Галілей, Леанарда да Вінчы, Мікеланджэла, Рафаэль, Петрарка, Шэкспір, Дантэ, Сервантэс і іншыя волаты духу — вучоныя, мастакі, пісьменнікі. Беларускія землі ўваходзілі тады ў склад Вялікага Княства

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Літоўскага, дзе беларуская мова выконвала ролю дзяржаўнай. Эпоха Адраджэння нарадзіла і Ф. Скарыну — чалавека невычэрпнай энергіі і ініцыятывы, першадрукара і гуманіста, паэта, медыка, батаніка, астранома.

Нарадзіўся Ф. Скарына ў апошняй чвэрці XV ст. (каля 1490 г.) у Полацку, закончыў Кракаўскі універсітэт і ў 1506 г. быў удастоены вучонай ступені бакалаўра вольных мастацтваў. У далейшым лёс звязвае яго з Італіяй, дзе ў 1512 г. у Падуанскім універсітэце ён бліскуча вытрымлівае экзамен на годнасць доктара медыцыны. Але не вольныя мастацтвы і не медыцына сталі сэнсам яго жыцця. Скарына "избрал оставити в науце и в книгах вечную славу и память свою". Яго кнігі на роднай мове сталі той паходняй, якая ўказвала людзям сапраўдны шлях у будучае, тым знічам, які саграваў і асвятляў людское жыццё ў непагадзь і завею.

Першая з кніг — "Псалтыр" — была надрукавана ў Празе ў 1517 г. Услед за гэтым выходзяць яшчэ 22 кнігі Бібліі, перакладзеныя на зразумелую тады для большасці насельніцтва старабеларускую мову. У 1522 г. выйшла ў свет першае віленскае выданне Скарыны — "Малая падарожная кніжыца", якая паклала пачатак кнігадрукаванню ў нашай краіне. Праз тры гады (у 1525 г.) была надрукавана апошняя кніга Ф. Скарыны "Апостал".

Усе пераклады кніг Бібліі Ф. Скарына прысвяціў "людем посполитым к доброму научению". Ён хацеў пашырыць асвету сярод суайчыннікаў, дапамагчы простым людзям пазнаць мудрасць і навуку. З гэтай мэтай кожную з кніг Ф. Скарына суправаджаў прадмовамі і пасляслоўямі, якія складаюць аснову яго літаратурна-публіцыстычнай спадчыны. У іх першадрукар выказваў свае грамадскія і асветніцкія погляды, заклікаў да ўмацавання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

правапарадку, да стварэння справядлівых заканадаўчых кодэксаў аб дзяржаве, войску, зямлі, тлумачыў незразумелыя словы і звароты, змяшчаў рэлігійныя легенды, а таксама розныя звесткі па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, філасофіі, астраноміі. Так, у “Малай падарожнай кніжыцы” Ф. Скарына змясціў розныя каляндарныя і астранамічныя звесткі (беларускія назвы месяцаў, знакаў задыяка) — усё тое, што неабходна было чалавеку ў дарозе. “Псалтыр” (зборнік 150 псалмаў, па якіх ў сярэднявеччы вучыліся грамаце) Ф. Скарына адрасаваў “дзецям малым як пачатак усякай добрай навукі”, а таксама дарослым у якасці настольнай кнігі, душавыратавальнага чытання. Псалмы “Псалтыра”, лічыць Ф. Скарына, — “гэта скарб, безліч каштоўных каменняў!” Па “Пеўніцах”, на думку Ф. Скарыны, можна было навучыцца музыцы. Засвоіць арыфметыку можна па кнігах Майсеевых, геаметрыю і астраномію — па кнізе Ісуса Навіна.

Немалаважнае значэнне ў кнігах адводзілася тэме любові да роднай зямлі. Асветнік быў патрыётам Айчыны, роднай мовы, таму і праславіў ён біблейскую гераіню Юдзіф, якая выратавала свой народ, адсекшы галаву начальніку чужаземнага войска Алаферну. У сувязі з гэтай легендай Скарына выказвае свае думкі пра патрыятычны абавязак кожнага чалавека перад сваім народам, вернасць радзіме, пра бескарыслівае служэнне грамадскаму дабру, пра глыбокую прывязанасць чалавека да зямлі, на якой ён нарадзіўся. Да свайго роднага кутка, да свайго народа, які называў “братия моя, Русь, люди посполитые”, Скарына заўсёды ставіўся з вялікай пашанай. У прадмове да кнігі “Юдзіф” ён выказвае гэтыя ўзнёслыя думкі: “Звери, ходящие в пустыни, знают ямы своя; рыбы, плывущие по морю и в реках, чуют виры своя; пчелы и тым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

подобная боронять ульев своих. Тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по Бозе, к тому месту великую ласку имають”. У сучаснай інтэрпрэтацыі С. Панізніка гэтыя цудоўныя словы гучаць так:

Ад нараджэння звяры,
што ў чашчобах блукаюць, —
ведаюць ямы свае;
Птушкі, паветра свідруючы, —
гнёзды свае не губляюць;
Рыбы ў морах бурлівых —
чуюць свой вір без памылкі;
Пчолы і іншая жыўнасць —
вуллі бароняць заўжды.
Гэтак і людзі: дзе нарадзіла іх маці,
на шчасце ўскарміўшы, —
ласку да месца таго
берагуць заўсягды!

Выданні Ф. Скарыны з боку тэхнічнай дасканаласці, з боку мастацкасці апрацоўкі выкананы на ўзроўні лепшых еўрапейскіх выданняў XVI ст. Высокі паліграфічны ўзровень кніг доўгі час не маглі пераўзысці галандскія і германскія друкары. Ф. Скарына ўводзіць у свае выданні ілюстрацыі як сродак раскрыцця ў мастацкіх вобразах зместу кнігі. Першадрукар выкарыстоўваў гравіраваны тытульны ліст, увёў прамежкі паміж словамі, абзацы. Па гэтай прычыне кнігі шырока распаўсюджваліся ў Еўропе і мелі вялізны ўплыў на чытачоў у многіх краінах свету.

“Напісанае застаецца”, — гаварылі старажытныя рымляне. Ф. Скарына пакінуў нашчадкам кнігі, у якіх засталіся самыя патаемныя, выпакутаваныя яго думкі. Гэтыя кнігі вялікага беларуса ўспрымаюцца сёння як самая дарагая нацыянальная святыня, як

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сімвал усёй тысячагадовай беларускай культуры. Як запавет нашчадкам даносяцца да нас з XVI стагоддзя пранікнёныя і мудрыя словы Ф. Скарыны: “Любіце кнігу, бо яна — крыніца мудрасці, ведаў і навукі, лекі для душы”.

## 9

## СЫМОН БУДНЫ І ВАСІЛЬ ЦЯПІНСКІ — ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ ТРАДЫЦЫЙ Ф. СКАРЫНЫ

Годнымі пераемнікамі гуманістычных традыцый Ф. Скарыны называем мы сёння Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага. Гэтая пераемнасць выявілася і ў тым, што яны перакладалі і выдавалі свае творы па-беларуску, і ў тым, што спрыялі гэтым пашырэнню цікавасі да навукі сярод насельнікаў Вялікага княства Літоўскага, і ў тым, што ўдасканальвалі майстэрства кнігавыдання. Але самае галоўнае тое, што дзейнасць сваю яны ахвяравалі “людем посполитым”, тым самым “народу своему услугуючи”.

Галоўным жыццёвым клопатам Васіля Цяпінскага стала справа адукацыі народа. З гэтай мэтай ён прыняўся за цяжкую працу перакладчыка на беларускую мову Евангелля — састаўной часткі Бібліі. Ахвяруючы ўласнымі сродкамі, асветнік у сваім маёнтку Цяпіна (цяпер Чашніцкі раён) заснаваў друкарню і выдаў Евангеллі ад Мацвея, Марка і часткова ад Лукі. Надрукаваны яны ў два слупкі. Паралельна з беларускім перакладам змяшчаўся тэкст царкоўнаславянскай крыніцы, што давала магчымасць пераканацца не толькі ў адэкватнасці, але і якасці перакладу. У Евангеллі змешчана 210 глос (слоў-перакладаў), дзе тлумачыліся незразумелыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і малавядомыя словы, прыводзіліся даведкі пра паходжанне асобных слоў.

Да Евангелля Васіль Цяпінскі напісаў палымяную прадмову, якая па невядомых прычынах не была апублікавана (рукапіс яе захоўваецца ў Пецярбургскай бібліятэцы ім. М. Салтыкова-Шчадрына). З прадмовы паўстае вобраз непрымірымага барацьбіта, патрыёта, выразніка нацыянальных і культурных інтарэсаў беларускага народа. Асветнік змагаўся за пашырэнне асветы і кнігадрукавання на беларускай мове, за кансалідацыю “зацного, славного, острого, довстипного” беларускага народа. Ён заклікаў адкрываць нацыянальныя школы, каб у іх “детки смыслы свои неяко готовали, острили и в вере прицвичали”. Тым жа, хто цураўся “наукам в слове своем”, прыводзіў у прыклад братоў Кірыла і Мяфодзія, якія сталі гонарам славянскай і сусветнай культуры.

Яшчэ больш шматграннай была творчая дзейнасць Сымона Буднага, у асобе якога сумясціліся філосаф, гісторык, перакладчык, актыўны дзеяч рэфармацыйнага руху. У 1574 г. у Лоску беларускі асветнік надрукаваў пераклад Новага Запавету з грунтоўнай прадмовай, каментарыямі і заўвагамі. Дзякуючы  фенаменальным здольнасцям С. Буднага, яго таленту, эрудыцыі, дасканаламу веданню старажытных моў, Новы Запавет  стаў адным з самых вядомых еўрапейскім выданнем. Пазней былі выдадзены ўласныя творы  С. Буднага “Пра дзве сутнасці Хрыста”,  “Супраць хрышчэння дзяцей”, “Кароткі доказ, што Хрыстос не з’яўляецца такім жа Богам, як айцец...”, “Пра найважнейшыя палажэнні хрысціянскай веры”. Апісанню гісторыі сваіх сацыяльных і рэлігійна-філасофскіх разнагалоссяў з “левымі” (Пятром з Гоняда, Якубам з Калінаўкі, Янам Немаеўскім) прысвечаны  трактат “Пра

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

свецкую ўладу”. У адрозненні ад “левых”, якія патрабавалі знішчэння дзяржавы, суда, войска, канцылярыі, адміністрацыі, С. Будны выступіў у абарону ўрада і дзяржавы. Гэты трактат з’яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі беларускай Рэфармацыі і грамадска-філасофскай думкі.

Рэлігійна-філасофскія ідэі Сымона Буднага былі даволі наватарскімі для еўрапейскай думкі таго часу. Незадаволены памяркоўнасцю кальвінізму, беларускі асветнік у сярэдзіне 1563 г. перайшоў на больш радыкальныя пазіцыі антытрынітарызму і пачаў вызнаваць адзінага Бога, адмовіўшыся ад догмату пра боскую Тройцу. Беларускі мысліцель па-свойму трактаваў паняцці замагільнага свету і пасмяротнай узнагароды, натуралістычна вытлумачваў біблейскія цуды.

Сымон Будны выступаў за роўнасць усіх саслоўяў перад законам, патрабаваў абмежавання феадальнага самавольства, крытычна адносіўся да захопніцкіх войнаў. Як гуманіст і заступнік інтэлектуальнай свабоды, ён заклікаў да верацярпімасці, выступаў за свабодную стваральную працу, абураўся супраць фізічнай расправы над іншадумцамі. Як адзін з самых адукаваных філосафаў-асветнікаў свайго часу, ён лічыў, што развіццё беларускай мовы і культуры з’яўляецца адным з фактараў станаўлення нацыянальнай свядомасці.

Памяць пра выдатнага дзеяча беларускай Рэфармацыі Сымона Буднага ўшаноўваецца на Беларусі. Яго імем названы шматлікія вуліцы ў гарадах рэспублікі, тыпаграфія ў Нясвіжы.Там жа яму пастаўлены помнік.

Дзейнасць беларускіх асветнікаў і гуманістаў з’яўляецца яркім прыкладам самаадданага служэння свайму народу, служэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ахвярнага і бескарыснага. І ў гэтым таксама выявіўся іх гуманізм і любоў да роднага краю.

## 10

## ПАЭМА МІКОЛЫ ГУСОЎСКАГА “ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА”

Кожны народ не без роду і племя
і мае
Летапіс свой і гісторыі след
на старонках.
*М. Гусоўскі*

Мікола Гусоўскі — наш славуты зямляк эпохі Адраджэння, сучаснік Францішка Скарыны. Сёння мы не ведаем дакладна, ні колькі жыў, ні калі памёр паэт. Не акрэслена пакуль што і месца на беларускай зямлі, якое дало свету геніяльнага чалавека, бо паселішчаў і рэк з назвамі Гусаў, Усава, Уса на Беларусі шмат. Адно несумненна: паэт з Гусава нарадзіўся на беларускай зямлі Вялікага княства Літоўскага.

Пяру М. Гусоўскага належаць тры паэмы, больш за дзесяць вершаў. Самы ўдалы твор, якому былі суджаны доўгае жыццё і вялікая слава, — паэма “Песня пра зубра” (поўная назва “Песня пра постаць, дзікі нораў зубра і паляванне на яго”). Дзякуючы таленту і багатаму жыццёваму вопыту паэта паэма стала песняй яго сэрца, гімнам бацькаўшчыне, паэмай жыцця зямлі “пад зоркай Палярнай”.

Цудоўны высокапатрыятычны твор “Песня пра зубра” напісаны ўдалечыні ад радзімы (у 1522 г.) па просьбе папы Льва Х, які хацеў пачуць праўдзівае паэтычнае слова пра паляванне на зуброў. Напісана паэма на лацінскай мове — на той час мове навукі, культуры, міжнародных зносін у Еўропе. На беларускай мове “Песня” з’явілася ў другой палове 60-х гг. ХХ ст. у перакладзе Язэпа

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Семяжона. У 1994 г. чытач змог пазнаёміцца з новым варыянтам славутага твора ў перакладзе У. Шатона.

Паэма прасякнута любоўю паэта да роднага краю, глыбокім адчуваннем радзімы як месца адзінага і непаўторнага. “Думкай ляціш быстракрылай ноччу і днём на радзіму, — піша М. Гусоўскі, — у памяці сеці вабіш той час незабыўны, што некалі ў нетрах родных лясоў разгубіўся, і кліч — не даклічаш...” Аўтар замілавана любуецца пушчай, дзе прайшло яго дзяцінства і юнацтва, захапляецца “дзівосным прыстанкам загадак і цудаў”. Лес і прырода для паэта — “эліксір маладосці, бадзёрасці духу”.

У беларускіх пушчах незлічоныя багацці, мноства звяроў, птушак, у нераст рыба кішыць не толькі ў рэках і азёрах, але і ў лужынах:

Нашы лясы — гэта нашых даброт і багацця
невычарпальны калодзеж.

А як маляўніча ён іх апісвае! Хмаркі навіслі на “макаўках кронаў”, ад ранняй вясны да позняй восені пушча напоўнена водарам кветак, спевам птушак. І гэтыя “скарбы свае нашы людзі на золата нават не прамяняюць”.

Царом беларускіх лясоў і пушчаў з’яўляецца грозны і магутны асілак — зубр. Такіх магутных звяроў, піша аўтар, прырода захавала толькі пад зоркай Палярнай — у нас, на Беларусі. Зубр у паэме — алегарычны вобраз роднага краю, сімвал яго былой магутнасці. Надзелены незвычайнай сілай, зубр — звер міралюбівы, бяскрыўдны, калі яго не зачапіць, не патрывожыць. І ён люты, бязлітасны, калі абараняецца пры нападзе ворагаў. Паэт маляўніча апісвае зубрыны статак: тут адлюстраваны і стадны інстынкт, і вернасць у парах, якую можа парушыць толькі смерць, і скрытая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сіла, і невычэрпная энергія, і магутнасць. М. Гусоўскі надзяляе зубра здольнасцю мысліць, чуйна рэагаваць на дабро і зло:

Зубр, як мы лічым спрадвеку, хоць звер, але ж ратнік,
Ён прызнае перамогу, здабытую чэсна, —
Сілай на сілу, у рожкі і мужнасць на мужнасць.

Безліч радкоў прысвячае паэт паляванню ў пушчы: зубр трапляе ў пастку, і на яго сыпецца цэлы град стрэл і коп'яў, упіваючыся ў цела і грыву; кроў сочыцца з яго, пеняцца ёю свежыя раны; вочы поўныя гневу; раз'юшаны звер доўга яшчэ бушуе, спрабуючы адпомсціць ворагам "і за кроў, і за раны, і за парушанае мірнае жыццё"; паступова сілы пакідаюць зубра; па звычаі двое юнакоў клінкамі дабіваюць яго. Страшнае відовішча! І паэт асуджае бессэнсоўнае знішчэнне зуброў, узнімае праблему беражлівых адносін да прыроды.

Зубр у паэме параўноўваецца з адважным і смелым князем Вітаўтам, у час княжання якога Вялікае княства Літоўскае дасягнула небывалага росквіту. Вітаўт паказаны ў паэме ў паўсядзённым жыцці. Ён высакародны, справядлівы, чулы, патрабавальны чалавек, жорсткі ў адносінах да злачынцаў і хабарнікаў. Воінская мудрасць дапамагала князю дасканала рыхтаваць будучых воінаў, прывучаючы іх да вернасці клятве, справядлівасці, бясстрашнасці: "Ох, не любіў баязліўцаў... і клятваадступнікаў-сведак". Найважнейшым вынікам дзейнасці Вітаўта, лічыць М. Гусоўскі, з'яўляецца тое, што "густа ён справамі век насяліў свой", і справы прынеслі княству і багацце, і дастатак.

У паэме цудоўным чынам пераплятаюцца вобразы зубра, князя і народа. М. Гусоўскага да глыбіні душы хвалююць усе беды і пакуты беларусаў. Прычыну іх гаротнага становішча аўтар бачыць у тым, што князі і баяры, усе, хто мог бы заступіцца за простых людзей,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

глухія да іх “і не горай, чым жорсткі татарын, душаць пятлёй галасы абурэння ў народзе”. Гора і пакуты нясуць простаму люду і войны. М. Гусоўскі асуджае іх як сродак высвятлення адносін паміж людзьмі:

Войны! Злачынная справа — вайна выклікае
Гнеў мой, і слёзы, і боль.

Ворагі (крыжаносцы, татара-мангольскія заваёўнікі) урываюцца на беларускія землі, агнём і мячом усталёўваюць свой лад, жорстка распраўляюцца з прыхільнікамі нашай веры, вынішчаюць мястэчкі і сёлы, не шкадуючы ні жанок, ні дзяцей. Там, дзе пройдуць варожыя войскі, застаюцца толькі “асмолкі ды печышчы, попел ды косці, зграі варон ды чароды сабак адзічэлых”. Галоўную прычыну паражэнняў паэт бачыць ў раз’яднанасці людзей, іх незгуртаванасці, таму і заклікае ўсіх князёў беларускай зямлі да аб’яднання, адкрыта асуджае міжусобіцы, братазабойствы:

Ад сваіх міжусобіц мы ўсе не дужэем,
Нашы ж мячы падсякаюць і веру Хрыстову.

Заканчваецца паэма малітвай да Дзевы Марыі, у якой паэт просіць Маці Боскую спыніць забойствы і кровапраліцці, даць больш мудрасці і раўнавагі князям і ваяводам, супакою, ладу і шчасця свайму пакутнаму краю і народу.

М. Гусоўскі ў сваёй паэме не толькі апісаў зубрыныя ловы. Ён стварыў узнёслую песню пра беларускую зямлю, пра тое, чым яна багата, пра яе людзей, іх думы і пачуцці, пра прыроду, жывёльны свет гэтага цудоўнага краю. Гэта споведзь пра любоў і нянавісць, жыццё і смерць, вайну і мір. Паэма вучыць нас любові да роднай зямлі, да свайго народа, яго гісторыі, культуры, нацыянальных традыцый, любові і павазе да іншых народаў і іх культур. Паэма

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

заклікае сумленна жыць, змагацца за справядлівасць і праўду, весці няспынную барацьбу за мір і свабоду, за святло і шчасце.

## 11

## ВОБРАЗ КНЯЗЯ ВІТАЎТА Ў ПАЭМЕ М. ГУСОЎСКАГА “ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА”

Век залаты той названы па простай прычыне: дзяржаўца
Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна
Ставіў багацце духоўнае — злата дзяржавы.

*М. Гусоўскі*

У творчай спадчыне нашага славутага земляка Міколы Гусоўскага асаблівае месца займае “Песня пра зубра”. Гэты твор, дзякуючы таленту і багатаму жыццёваму вопыту паэта, стаў песняй яго сэрца, гімнам бацькаўшчыне, кнігай жыцця зямлі “пад зоркай Палярнай”.

У паэме раскрываюцца вобразы двух уладароў Вялікага княства Літоўскага — Вітаўта і Жыгімонта. Апісанню Жыгімонта — смелага паляўнічага, які першым кідаецца на раз’юшанага звера, — у творы адводзіцца нямнога радкоў. Паэт аддае перавагу Вітаўту, які выступае ў паэме як дзяржаўны муж, кіраўнік, выхавацель, многабакова развітая асоба. Відавочным з’яўляецца тое, што пры стварэнні сваёй паэмы Гусоўскі арыентаваўся на добра вядомы яму “Летапісец вялікіх князёў Літоўскіх”.”Летапісец” заканчваецца так званай “Пахвалой Вітаўту”, у якой высока ацэньваюцца дзяржаўна-палітычныя заслугі князя:

І Вялікі Ноўгарад, і Вялікі Пскоў —
Усе паслухмяны былі вялікаму князю Вітаўту.
Цары і князі ў вялікай прыязні з ім былі,
А іншыя служылі яму і гонар вялікі,
І дары шматлікія прыносілі яму.

Княжанне Вітаўта — гэта час гераічных спаборніцтваў, дзе кожны меў права і вялікія магчымасці для здзяйснення подзвігаў і сцвярджэння сваёй годнасці. Самым вялікім багаццем уладар лічыў “багацце духоўнае — злата дзяржавы”. У часы княжання Вітаўта дзяржава дасягнула небывалага росквіту і ўздыму, мела дыпламатычныя сувязі з усімі заходнееўрапейскісі краінамі. З князем стараліся жыць у міры і згодзе многія суседзі, якія не столькі палохаліся яго, колькі паважалі яго за адважнасць, мудрасць, справядлівасць:

Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы
Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,
І называюць той век залатым.

Вітаўт паказаны ў паэме ў паўсядзённым жыцці. Ён высакародны, справядлівы, чулы, патрабавальны чалавек, жорсткі ў адносінах да злачынцаў і хабарнікаў. Князь па заслугах і шчодра адорваў воінаў-змагароў, але сурова і справядліва караў баязліўцаў, клятваадступнікаў, ілжывых сведак:

Строга й сурова караў звычкі дурныя людзей.
Ён справядлівасць любіў, шанаваў яе нормы святыя,
Не дазваляў, каб махляр дзесьці абходзіў закон...
Жорстка ўладар катаваў ілжывых падкупленых сведкаў,
З тым, каб ніхто надалей суддзям хлусіць не пасмеў.

З мэтай падрыхтоўкі сваіх воінаў да барацьбы з ворагам Вітаўт часта наладжваў у пушчах паляванні, якія лічыліся своеасаблівай школай вайсковага выхавання. Палюючы на лясных звяроў, воіны прывучаліся валодаць кап’ём, рагацінай, лукам. У гэтых дзікіх аблавах на звяроў выпрабоўваўся характар воіна, загартоўваўся яго баявы дух. Галоўнымі якасцямі воіна, на думку Вітаўта, павінны быць смеласць, адважнасць, ваяўнічасць, баявое майстэрства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вітаўт быў для М. Гусоўскага ідэалам кіраўніка, палітыка і грамадскага дзеяча. У яго вобразе паэт хацеў уславіць дзейнасць свабоднай, мужнай і адважнай асобы, шчыра адданай сваёй Бацькаўшчыне.

## 12

## ПАЛЕМІЧНАЯ ЛІТАРАТУРА (КАНЕЦ XVI — ПАЧАТАК XVII СТ.)

Да палемічнай літаратуры адносяцца памфлеты, звароты, адкрытыя лісты, трактаты, адозвы і іншыя віды творчасці, тэматычна звязаныя з актывізацыяй палемікі вакол пытання пра аб'яднанне царквы і касцёла пад вяршынствам папы рымскага, т. зв. ідэі уніі.

Літаратурная палеміка пачалася пасля выхаду кнігі Бенядзікта Гербеста "Указанне шляху", у якой ставілася пытанне аб неабходнасці царкоўнай уніі з Рымам у інтарэсах праваслаўнай царквы Вялікага княства Літоўскага. Гэту ідэю падхапіў і развіў вядомы рэлігійны і палітычны дзеяч Пётр Скарга, які імкнуўся даказаць, што сапраўднае веравызнанне ідзе ад рымска-каталіцкай царквы — пераемніцы і носьбіта апостальскіх традыцый. Адказам на выказванні П. Скаргі сталі ананімныя творы "Пасланне да латын з іх жа кніг", "На багамерзкую на паганую лаціну", а таксама "Ключ царства нябеснага" Г. Сматрыцкага, шматлікія памфлеты. Іх аўтары выступалі ў абарону праваслаўнай царквы, узнімалі вострыя сацыяльныя праблемы таго часу, праяўлялі заклапочанасць жыццём селяніна, выказваліся за права народа мець свае погляды ў пытаннях рэлігіі.

Актывізацыя палемічнай літаратуры пачалася пасля Брэсцкай уніі 1596 г., паводле якой праваслаўная царква прызнала вяршэнства папы рымскага і прыняла сімвал веры ў каталіцкім разуменні, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

захавала сваю мову богаслужэння і сваю абраднасць. У абарону уніі выступіў сенатар Рэчы Паспалітай, Уладзіміра-Брэсцкі епіскап Іпацій Пацей і П. Скарга, які трактаваў унію як праяўленне бескарыслівай апекі папы рымскага над занядбалым праваслаўным людам.

Актыўнымі змагарамі супраць уніяцтва сталі царкоўныя дзеячы Стафан Зізаній, Хрыстафор Філалет і Лявонцій Карповіч,якія сцвярджалі, што унія была абумоўлена своекарыслівай палітыкай католікаў і вышэйшага праваслаўнага духавенства, іх мэтай дамагчыся матэрыяльных выгод, рэлігійных прывілеяў, палітычных правоў. Апаненты уніі падкрэслівалі, што знявага інтарэсаў праваслаўнай апазіцыі можа прывесці да класавага антаганізму, адстойвалі традыцыі і культурныя дасягненні усходнеславянскіх народаў.

Адным з яркіх прадстаўнікоў палемічнай літаратуры з’яўляўся грамадска-палітычны і царкоўны дзеяч Мялецій Сматрыцкі, аўтар вядомых твораў “Антыграфі”, “Трэнас, альбо Плач святой усходняй царквы”, “Грамматики славенския правилное синтагма” і інш.), які прайшоў цяжкі і складаны шлях ад прызнання і абароны праваслаўя да яго адмаўлення. Прадстаўнікам апошняга этапу ў развіцці палемічнай літаратуры быў Афанасій Філіповіч — змагар, барацьбіт, непахісны абаронца правоў беларускага народа за свае нацыянальныя і рэлігійныя правы, аўтар вядомага “Дыярыуша”.

У жанравых адносінах “Дыярыуш” з’яўляецца сінкрэтычным творам, які спалучае рысы і асаблівасці публіцыстычна-палемічнай, гісторыка-мемуарнай і дакументальнай літаратур. У склад яго ўвайшлі дарожныя і тлумачальныя запіскі, успаміны і дзённікі, легенды, містычныя прывіды і бачанні, пасланні, лісты,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выкрывальныя прамовы, памфлеты, філасофскія трактаты, аўтабіяграфічны нарыс, а таксама вершы і нотныя запісы музыкі да іх. Са старонак “Дыярыуша” паўстае праўдзівы змагар, барацьбіт, ваяўнічы абаронца роднага краю, яго святы пакутнік. Ён выступае супраць пануючых у дзяржаве каталіцкай і уніяцкай цэркваў, знешняй і ўнутранай палітыкі Рэчы Паспалітай, якая, блаславіўшы ”праклятую унію”, зрабіла ворагамі, сутыкнула “в князствах, поветах, в местах, в местечках и в селах селян з селянами, мешчан з мешчанами, жолнеров з жолнерами, панов з поддаными, родичов з детками, духовных з духовными”. “Дыярыуш” з’яўляецца адным з найбольш яркіх і значных помнікаў палемічнай літаратуры XVII ст., у якім праўдзіва адлюстравалася барацьба беларускага народа за свае нацыянальныя і рэлігійныя правы, звычаі, традыцыі і культуру.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 13

## РЭЛІГІЙНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МЯЛЕЦІЯ СМАТРЫЦКАГА

Мялецій Сматрыцкі ўвайшоў у гісторыю беларускай літаратуры як адзін з яркіх прадстаўнікоў палемічнай літаратуры, грамадска-палітычны і царкоўны дзеяч, вучоны-філолаг і педагог. Ён з’яўляецца аўтарам палемічных твораў “Антыграфі”, “Трэнас”, “Апраўданне невіноўнасці”, “Абарона апраўдання”, “Збор з’едлівых лістоў”, а таксама падручніка па славянскім мовазнаўстве.

Першым друкаваным творам М. Сматрыцкага, што дайшоў да нашых часоў, з’яўляецца “Антыграфі”. У ім пісьменнік выступіў супраць кніг уніяцкага мітрапаліта Іпація Пацея “Ерасі” і “Гармонія”. Ён адвяргае абвінавачванні уніятаў у парушэннях

праваслаўнымі законаў і ўчыненні імі беспарадкаў і злачынстваў, адстойвае асноўныя догматы праваслаўя.

У 1610 г. пад псеўданімам Тэафіла Арталога быў надрукаваны “Трэнас, альбо Плач святой усходняй царквы” — адзін з лепшых і найбольш значных твораў М. Сматрыцкага. У цэнтры твора вобраз праваслаўнай маці-царквы, якая церпіць фізічныя і душэўныя пакуты ад бязлітаснага ўціску католікаў і уніятаў. Апісваючы стан праваслаўнай царквы, М. Сматрыцкі карыстаецца народна-паэтычнай, міфілагічнай і біблейскай сімволікай:

Гора мне беднай,
бяда — гаротнай!
З усіх бакоў я абрабавана,
з усіх уладанняў сваіх
абабрана,
з усіх убранняў сваіх
абадрана
на ганьбаванне свету!..
Я пагарджаная,
я абылганая,
я абакраная,
я прагнаная,
але ж і вам,
што мною спагардзілі, —
гора,
што абылгалі мяне —
бяда,
што абакралі мяне —
галеча,
і што прагналі мяне —
туга.
Сыноўняя непабожнасць —
бацькам знявага,
а матчын праклён,
а матчын праклён —
загуба сынам.
*(пераклад А. Разанава)*

З “Трэнаса” царква паўстае беднай, гаротнай, абрабаванай, з ярмом на шыі, з путамі на нагах, з мячом “паваротнавострым над галавою”. Царква ў творы сімвалізуе прыгнечаную радзіму, дзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“бяда і гора ў гарадах і вёсках, у дубровах і палях, на сцежках і на шляхах”, дзе народ плача ад свайго гаротнага становішча, перад бяссілем абараніцца ад грознага наступу каталікаў і уніятаў. У творы аўтар абвяргае адзін з догматаў каталіцкай царквы аб бязгрэшнасці папы рымскага, дае знішчальную характарыстыку маральнаму абліччу пастыраў, лічыць здраднікамі тых, хто ўдзельнічаў у падпісанні Брэсцкай уніі, заклікае народы Беларусі і Украіны да аб’яднання ў барацьбе супраць каталіцызму.

Супраць “Трэнаса” і яго аўтара выступілі з палемічнымі творамі Пётр Скарга і І. Марахоўскі. М. Сматрыцкага абвінавацілі ў дзяржаўнай здрадзе, назвалі “агентам Масквы”, “вучнем Лютэра” і інш. Твор быў забаронены каралём Жыгімонтам ІІІ, кіруючымі коламі Рэчы Паспалітай, каталіцкімі і уніяцкімі святарамі. За яго распаўсюджанне ці куплю накладваўся штраф у памеры пяці тысяч “червоных злотых”. Брацкая друкарня ў Вільні, дзе быў выдадзены “Трэнас”, была зачынена, кнігі і шрыфт знішчаны, а рэдактар і карэктар Лявонцій Карповіч зняволены ў турму. Аўтара твора ад пакарання выратаваў псеўданім.

М. Сматрыцкі вядомы як выдатны педагог і вучоны-філолаг. У брацкіх школах ён выкладаў старaславянскую, грэчаскую і лацінскую мовы, з’яўляўся рэктарам Кіеўскай брацкай школы. Абагульненнем педагагічнай і навуковай дзейнасці М. Сматрыцкага стала “Грамматики славенския правилное синтагма”, дзе ўпершыню ў гісторыі славянскага мовазнаўства выкладзены поўны курс граматыкі і яе асноўных раздзелаў — арфаграфіі, этымалогіі, сінтаксіса і прасодыі (маўлення). Граматыка двойчы перавыдавалася ў Маскве і лічылася па тых часах самым аўтарытэтным падручнікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

па славянскім мовазнаўстве. М. В. Ламаносаў вучыўся па гэтай граматыцы і называў яе “вратамі” сваёй вучонасці.

У 20-я гг. XVII ст. М. Сматрыцкі выступіў з антыкаталіцкімі творамі “Апраўданне невіноўнасці”, “Абарона апраўдання”, “Збор з’едлівых лістоў”, “Прашэнне” і шматлікімі пасланнямі, у якіх заклікаў спыніць апалячванне насельніцтва, патрабаваў свабоду і роўнасць для прадстаўнікоў праваслаўнай веры. Гэтыя творы адыгралі значную ролю ў пашырэнні антыкаталіцкіх народных хваляванняў. У віцебскім паўстанні 1623 г. быў забіты і кінуты ў Дзвіну епіскап-уніят Іясафат Кунцэвіч. М. Сматрыцкі быў абвешчаны саўдзельнікам забойства, што стала асноўнай прычынай яго выезду ў Палесціну, Егіпет і Грэцыю. Вярнуўшыся праз тры гады, М. Сматрыцкі адыходзіць ад палемічнай барацьбы, таемна пераходзіць ва уніяцтва і парывае з усім тым, за што змагаўся дваццаць гадоў. У “Апалогіі”, “Пратэстацыі”, “Экзатэзісе” і іншых твораў ён адкрыта адмовіўся ад сваіх мінулых поглядаў і асудзіў дзейнасць праваслаўных пісьменнікаў-палемістаў. Творы уніяцкага перыяду раскрываюць душэўны неспакой і трывогу рэлігійнага дзеяча, глыбіню яго асабістай трагедыі, якая стала адлюстраваннем той складанай і бурнай эпохі, у якую ён жыў. Дваістасць натуры М. Сматрыцкага, як піша У. Кароткі, прадвызначыла і апошняе яго жаданне — “пакласці ў труну грамату ерусалімскага патрыярха і брэве папы рымскага”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 14

# ЛІТАРАТУРНАЯ СПАДЧЫНА СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА

Літаратурная спадчына славутага беларуска-рускага паэта, драматурга, асветніка і філосафа Сімяона Полацкага даволі разнастайная і непаўторная. Ён складаў оды, элегіі, гімны, казанні, панегерыкі, загадкі, эпітафіі, плачы, удзельнічаў у падрыхтоўцы поўнага перакладу расійскай Бібліі і напісанні праекта першай у Расіі найвышэйшай навучальнай установы, паводле якой пазней была ўтворана Славяна-грэка-лацінская акадэмія. У царскіх харомах Сімяон Полацкі адкрыў незалежную ад патрыярхавай цэнзуры друкарню, першай кнігай якой стаў “Буквар языка славенскага, сиречь начало учения детем хотяшим учиттися чтению писаний”. Наш зямляк стаяў ля вытокаў першага ў расіі тэатра, створанага ў 1672 г. пры двары Аляксея Міхайлавіча.

Адзін з самых адукаваных людзей свайго часу, Сімяон Полацкі лічыў абавязкам несці людзям веды ў літаратурных творах. Творы нашага славутага земляка прысвечаны розным рэлігійным святам, падзеям царкоўнага жыцця, роднай зямлі, яе гарадам (Полацку і Віцебску) і святыням. Так, у элегіі “Пралог да прападобнай маці Ефрасінні” паэт, услаўляючы асабістыя заслугі ўнучкі Усяслава Чарадзея, разважае аб гістарычным лёсе Айчыны, трывожыцца за яе будучыню. Творчасць паэта захоўвала традыцыі славянскай гімнаграфіі, і таму нямала хвалебных узнёслых радкоў прысвечана пэўным асобам, падзеям. Культ жа асобы маскоўскага цара ў творах набывае асабліва манументальны характар. Паэт ідэалізуе яго як абаронцу радзімы, мудрага і справядлівага дарадчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Творчасць Сімяона Полацкага вызначаецца энцыклапедычнасцю, шырокім ахопам падзей. У вершах уздымаюцца сацыяльна-філасофскія і гістарычныя пытанні, выкрываюцца заганы тагачаснага феадальнага грамадства, асуджаецца каставая іерархія, выказваюцца адносіны да “праведных” і “няправідных” войнаў, да творчай дзейнасці асобных мастакоў, прапагандуецца ідэя пашырэння асветы, культуры і навукі.

У вершы “Глас последний ко господу Богу царя Алексея Михайловича” паэт ад імя памерлага расійскага цара разгортвае перад яго сынам-спадкаемцам вялікую, грунтоўна прадуманую праграму дзяржаўнай, грамадскай і асветніцкай дзейнасці, уключаючы і выдавецкую справу.

У Маскве Сімяон Полацкі зрабіў вершаваны пераклад “Псалтыра”. Ён прызначаўся для сямейнага чытання і быў упрыгожаны гравюрамі, што, безумоўна, спрыяла яго шырокаму распаўсюджанню. У 1678 г. Сімяон Полацкі падрыхтаваў да друку два зборніікі. У першым — “Рыфмалагіёне, або Вершаслове” — былі змешчаны ўзнёслыя вершы пра царскую сям’ю і яе акружэнне. Другі зборнік — “Вертаград мнагацветны” — з’яўляўся на той час сапраўднай энцыклапедыяй ведаў па гісторыі, антычнай міфалогіі, філасофіі, тэалогіі, маралі і хрысціянскай сімволіцы.

Сімяон Полацкі з’яўляецца аўтарам двух п’ес — “Камедыі-прытчы пра блуднага сына” і трагедыі “Пра Навухаданосара цара...”. У іх ён імкнуўся асучасніць евангельскія творы, наблізіць іх да рэальных падзей тагачаснага жыцця. Так, гісторыя пакут і раскаяння блуднага сына выкарыстоўвалася з выхаваўчай мэтай: маладое пакаленне, пакорлівае і паслухмянае, павінна паважна

ставіцца да старэйшых, імкнуцца да пераемнасці традыцый, да стварэння сацыяльнай гармоніі ў грамадстве. Праз біблейскі сюжэт пра жорсткага і ганарлівага валадара-тырана старажытнай дзяржавы Навухаданосара аўтар спрабаваў сцвердзіць ідэю гуманнасці, высакароднасці, чалавекалюбства ў грамадстве. Навухаданосар пад уплывам знешніх абставін (выратавання трох юнакоў-іншадумцаў) мяняе свае адносіны да вернападданых, становіцца больш велікадушным, гуманным.

Літаратурная спадчына Сімяона Полацкага адыграла вялікую ролю ў станаўленні беларускай паэзіі і драматургіі, развіцці іх жанраў і пашырэнні тэматычнай разнастайнасці.

**15**

## ДЗЕЙНАСЦЬ ШКОЛЬНЫХ ТЭАТРАЎ

У часы позняга Рэнесансу і ранняга барока (XVI — XVIII ст.) пры духоўных і асветніцкіх навучальных установах (акадэміях, брацкіх школах, калегіях) ствараліся школьныя тэатры. Упершыню яны ўзніклі ў краінах Заходняй Еўропы як сродак вывучэння лацінскай мовы, правіл паэтыкі і рыторыкі, выпрацоўкі адпаведных эстэтычных густаў, выхавання хрысціянскай дабрачыннасці**.** Пашырэнне школьных тэатраў на Беларусі звязана з дзейнасцю езуітаў, скіраванай на акаталічванне беларускага насельніцтва. Езуіцкія школьныя тэатры дзейнічалі ў 14 гарадах Беларусі, і на іх сцэнах было пастаўлена каля 100 школьных драм.

Спектаклі (у адпаведнасці з канонамі мастацтва барока) уяўлялі сабой пышнае відовішча з музыкай, песнямі, танцамі. У творах, што складалі рэпертуар школьных тэатраў (трагедыях, камедыях, літургічных драмах, інсцэніроўках, дыспутах, судовых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пасяджэннях), праслаўлялася вечнае быццё, апавядалася пра пакуты Ісуса Хрыста і яго паслядоўнікаў, асуджалася грэшнае жыццё, расказвалася пра высакароднасць мясцовых мецэнатаў-магнатаў і інш. Пастаноўкі спектакляў часта суправаджаліся інтэрмедыямі — кароткімі п’есамі ці сцэнамі сацыяльна-бытавога зместу, якія выконваліся паміж актамі драматычнага або опернага твора. Часцей за ўсё інтэрмедыі ставіліся на беларускай мове. Па змесце яны нагадвалі забаўныя анекдоты, гісторыі, апавяданні, дзеючымі асобамі якіх з’ўляліся сяляне, карчмары, паны. Цёмныя і абмежаваныя сяляне, з якіх заўсёды насміхаліся, якіх цураліся паны, у інтэрмедыях пераўтвараюцца ў дасціпных, разважлівых, вострых на язык людзей. Да нашага часу дайшло каля 20 беларускіх інтэрмедый, найбольш завершанымі з якіх з’яўляюцца “Чорт Асмалейка”, “Селянін і вучань”, “Літаратар, селянін, Самахвальскі”, “Ігра Фартуны”.

Для школьнага тэатра ствaралі творы вядомыя дзеячы другой паловы XVIII ст. Каятан Марашэўскі і Міхал Цяцерскі. Спектаклі па іх творах ставіліся на сцэне Забельскага тэатра (вёска Валынцы Верхнядзвінскага раёна) пры дамініканскім манастыры, дзе абодва драматургі працавалі выкладчыкамі паэтыкі і рыторыкі. М. Цяцерскі з’яўляецца аўтарам польскамоўных трагедый на сюжэты з антычнай гісторыі “Сапар” і “Фемістокл”, а таксама беларуска-польскай пераробкі камедыі Ж.-Б. Мальера “Лекар па прымусу”. К. Марашэўскаму належыць беларуска-польская “Камедыя” і польская трагедыя “Свабода ў нявoлі”.

У “Камедыі” К. Марашэўскага цесна спалучыліся барочныя рысы драмы-маралітэ (павучальнасць фіналу, выкарыстанне біблейскага матыву) з асветніцкімі традыцыямі (праўдзівасць паказу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сялянскага жыцця, адлюстраванне супярэчнасцей прыгоннай вёскі) . Галоўнымі дзеючымі асобамі ў “Камедыі” з’яўляюцца селянін Дзёмка і Чорт. Селянін наракае на сваю долю: ён павінен цяжка працаваць, але жыццё ад гэтага не паляпшаецца (няма грошай нават на сярмягу). Ва ўсім гэтым Дзёмка вінаваціць пана, карчмара і нават чорта. З’яўляецца Чорт (у вобліку пана) і прапануе палепшыць жыццё селяніна, калі той зможа маўчаць на працягу адной гадзіны. Дзёмка прымае прапанову, але, на жаль, сваё слова не стрымлівае. Ён тройчы прайграе заклад (маўчанне парушана свядома, з-за бескарыслівасці, высакароднасці героя), за што Чорт цягне яго ў пекла і забірае душу. Аўтар камедыі, прытрымліваючыся царкоўна-дыдактычнай маралі (непаслухмянасць, невыкананне рэлігійных прадпісанняў прыводзіць да пагібелі душы), выказвае асветніцкую думку аб тым, што фармальная перамога яшчэ не з’яўляецца перамогай маральнай, што шчасце залежыць не ад боскага прызначэння, а ад чалавечых якасцей, учынкаў, дзеянняў.

Школьныя тэатры аказалі значны ўплыў на развіццё нацыянальнага мастацтва. У канцы XVIII ст. яны страцілі сваю актуальнасць і іх функцыю пачалі выконваць прафесійныя тэатры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 16

## ВОБРАЗ ПАЛЯСОЎШЧЫКА ТАРАСА Ў ПАЭМЕ “ТАРАС НА ПАРНАСЕ”

Паэма “Тарас на Парнасе” напісана ў сярэдзіне XIX ст. Аўтарства яе прыпісвалася В. Равінскаму, Т. Манькоўскаму, В. Дуніну-Марцінкевічу, А. Вярыгу-Дарэўскаму, студэнтам Горы-Горацкага сельскагаспадарчага інстытута. Г. Кісялёў лічыць, што

паэму напісаў Канстанцін Вераніцын, які нарадзіўся на Віцебшчыне. Гэтай думкі сёння прытрымліваецца большасць даследчыкаў.

Галоўны герой паэмы — палясоўшчык Тарас. Гэта чалавек дасціпны, кемлівы, сумленны ў адносінах да сваёй працы. Ён па-свойму, крыху смешна, успрымае жыццё і тлумачыць яго на свой сялянска-практычны лад.

Аднойчы, стомлены нялёгкай працай, Тарас прысеў адпачыць і заснуў. У сне з ім здараюцца неверагодныя прыгоды: уцякаючы ад мядзведзя, Тарас трапляе ў яму і аказаўся на тым свеце пры дарозе, што вяла на гару Парнас. Падымаючыся на гару, ён сустракаецца з вядомымі пісьменнікамі Пушкіным, Лермантавым, Жукоўскім, Гогалем, якія выступалі за дэмакратызацыю літаратуры, яе народнасць і гуманізм. Тут жа, ля падножжа гары, Тарас бачыць пісьменнікаў-рэакцыянераў Грэча і Булгарына, да якіх адносіцца з іроніяй, сарказмам. Так, партрэтная замалёўка Булгарына носіць з’едлівы, выкрывальны характар:

Гляджу сабе — аж гэта сівы,
Кароткі, тоўсты, як чурбан,
Плюгавы, дужа некрасівы,
Крычыць, як ашалелы, пан.

Аўтар твора, як бачым, добра ведаў літаратурна-грамадскую барацьбу таго часу, выступаў супраць афіцыйных ідэй класіцызму, супраць ідэалізаванага паказу жыцця беларускага сялянства, псеўданароднасці.

На Парнасе Тарас трапляе ў палац, дзе жывуць багі. Гэта звычайны сялянскі двор, на якім “свінні ходзяць, сабакі, козы, бараны”. Багі, адкрывае для сябе Тарас, жывуць як звычайныя сяляне, падобныя да іх. Яны вядуць гаспадарку, носяць звычайнае адзенне, ядуць традыцыйныя сялянскія стравы (кулеш, капусту,

крупнік), танцуюць народныя танцы, мыюць у начоўках кашулі і порткі. Венера, напрыклад, нагадвае герою паэмы сялянскую дзяўчыну. Яна “чырвона, тоўста, круглаліца”, што адпявядае сялянскаму ідэалу жаночай прыгажосці. Праўда, не зусім падабаецца яна Тарасу, бо ўвесь час круціцца перад люстэркам, дбаючы толькі пра сваю прыгажосць. Не даспадобы палясоўшчыку разбэшчаныя, схільныя да п’янства, уладалюбівыя багі (Зеўс, Бахус, Амур). І толькі да Гебы, якая вядзе ўсю гаспадарку, Тарас ставіцца з сімпатыяй і спачуваннем.

З багамі Тарас трымае сябе ўпэўнена, з пачуццём уласнай годнасці. Яму ўласцівы народны гумар, уменне адчуваць прыгожае і захапляцца ім. Сваім танцам герой паэмы зачараваў, здзівіў багоў:

Як стаў прыстуківаць атопкам,
Аж рот разявілі багі:
То ён прысвісне, то прытопне,
То шпарка пойдзе у кругі.

Калі ўжо багі захапіліся танцам селяніна, то, мусіць, неабходна звярнуць увагу на народнае мастацтва, на таленавітасць простага чалавека. Гэтая прагрэсіўная думка і выказваецца ў паэме. Просты беларус, лічыць аўтар, мае поўнае права заняць месца сярод багоў, міфічных герояў і людзей самага высокага рангу. На Парнас (і ў літаратуру) прыйшоў кемлівы, разважлівы, дасціпны, разумны чалавек.

Паэма “Тарас на Парнасе” спалучае ў сабе два моманты: рэальны і казачны. Рэальнымі з’яўляюцца паляванне і служба Тараса, адносіны да яго пана і войта, апісанне заняткаў простых людзей (як яны “хазяйства водзяць”, як лапці падплятаюць, робяць рыбалоўныя сеці, як апранаюцца, што ядуць, як праводзяць вольны час). Казачнай (умоўнай) з’яўляецца сцэна пад гарой і на гары

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Парнас, дзе Тарас сустракаецца з вядомымі і невядомымі пісьменнікамі, літаратурнымі персанажамі, антычнымі багамі (дзеянне адбываецца ў сне). Такая кампазіцыя твора, дзе пераплятаецца рэальнае і казачнае, дазволіла аўтару смела выявіць свае адносіны да пісьменнікаў і літаратурнага працэсу, да жыцця багатых і бедных людзей. Сам жа твор нагадвае вясёлую казку: ёсць у ёй падземнае царства, незвычайныя прыгоды, здарэнні і шчаслівы канец. І гэтай казцы з слаўным палясоўшчыкам Тарасам суджана доўгае жыццё і нязменны поспех у чытачоў.

Паэма з’явілася крыніцай натхнення для сучасных беларускіх пісьменнікаў. У канцы 80-х гг. была апублікавана паэма Ф.Ведзьмака-Лысагорскага “Сказ пра Лысую гару”, у якой таксама ў форме дасціпнага жарту паказана жыццё сучасных пісьменнікаў.

## 17

## ПАЭМА В. РАВІНСКАГА “ЭНЕІДА НАВЫВАРАТ”

Доўгі час паэма “Энеіда навыварат” лічылася ананімнай. Шматгадовыя спрэчкі наконт яе аўтарства літаратуразнаўцы (услед за Г. Кісялёвым) вырашаюць на карысць Вікенція Равінскага, удзельніка войнаў з французамі 1805 — 1807 і 1812 гг. Паэма , упершыню надрукаваная ў рускім часопісе “Маяк” у 1845 г., з’яўляецца перайманнем, наследаваннем старажытнарымскай паэме Вергілія (70 — 19 гг. да н. э.). Такія ж пародыі ўзніклі (праўда, крыху пазней) і ў іншых славянскіх літаратурах (“Энеіда” ўкраінскага пісьменніка І. П. Катлярэўскага, “Вергилиева Энеида, вывороченная наизнанку” рускага паэта М. Осіпава). Усе яны высмейвалі нарматыўную эстэтыку класіцызму з яе адарванасцю ад

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

народнага жыцця, высокім стылем, узвышанымі і гераічнымі вобразамі.

Вергілій у сваёй паэме расказвае пра гераічныя подзвігі Энея, унука траянскага цара, які за доўгія 7 гадоў дасягае Італіі і становіцца там царом. Персанажамі беларускай "Энеіды навыварат", як і "Энеіды" Вергілія, з'яўляюцца старажытнагрэчаскія і старажытнарымскія багі і героі. Узаемаадносіны паміж антычнымі багамі і траянцамі нагадваюць узаемаадносіны паміж панамі і прыгоннымі сялянамі.

Уладнай, вяльможнай паняй у паэме з'яўляецца Юнона — багіня неба, сямейнага дабрабыту, ахоўніца шлюбу. Яна паказана як "баба злая, адроддзя панскага, ліхая". З адкрытай нянавісцю адносіцца яна да траянцаў і ўсіх простых людзей, бесчалавечна абыходзіцца з прыгоннымі. Помслівай і жорсткай намалявана ў "Энеідзе навыварат" Дыдона — багіня Месяца, заснавальніца Карфагена. Дзесяцкага яна "прыбіла" за тое, што той "распраўшчыны не знае і без пашпартаў усіх пускае". Бог вятроў Эол паказаны распусным падпанкам, жорсткім войтам, што зганяе на паншчыну людзей. Багіня прыгажосці Венера — засцянковая шляхцянка-модніца. Вобраз вярхоўнага бога, цара і бацькі багоў і людзей Зеўса намаляваны з гумарам, гратэскам. Калі да яго прыходзіць з паклонам Венера, Зеўс

...сядзеў у клеці,
Гарэлку з мёдам там сцябаў,
Без сораму, як малы дзеці,
З падоння пальцам калупаў.

Багі падоўгу сядзяць на печы, спяць на палацях.

Аўтар, адмоўна адносячыся да багоў, з прыхільнасцю і сімпатыяй ставіцца да траянцаў. У паэме яны параўноўваюцца з

валачобнікамі. Гэта простыя рамеснікі і прыгонныя сяляне. Сярод іх — працавітыя, кемлівыя, вынаходлівыя, сумленныя Піліп (ганчар), Пракоп (цясляр), Саўка (земляроб і знахар). Аўтар паказвае іх працу, звычаі, абрады і вераванні.

Галоўным героем "Энеіды навыварат" з'яўляецца Эней. Ён хоць і пан, але з павагай адносіцца да людзей. У Рыме Эней намерваецца заснаваць сваё царства, у якім "паны не будуць так багаты", дзе будуць новыя парадкі.

Паэма "Энеіда навыварат" праўдзіва (праўда, у парадыйнай форме) адлюстроўвае жыццё беларускага народа. У ёй упершыню створаны рэалістычныя вобразы сялян і прыгоннікаў, адкрыта крытыкуецца дваранска-арыстакратычная літаратура класіцызму. Створаная на народнай аснове, паэма сведчыць аб цеснай сувязі беларускай літаратуры XIX ст. як з вуснай народнай творчасцю і народнай паэзіяй, так і з літаратурамі, што дасягнулі высокага ўзроўню развіцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 18

## МІНУЛАЕ ВУЧЫЦЬ НАС, ЯК ЖЫЦЬ СЁННЯ" (ПА ТВОРАХ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА)

Літаратурную дзейнасць Ян Баршчэўскі пачаў у Полацкай калегіі паэмамі "Пояс Венеры" і "Псіхея", вытрыманымі ў стылі польскага класіцызму. Твораў, напісаных на беларускай мове, захавалася мала. Гэта дыдактычныя вершы"Дзеванька" і "Гарэліца", а таксама паэма "Рабункі мужыкоў" ("Размова хлопаў"), прысвечаная падзеям 1812 г. Гэтыя творы прадуманыя з боку кампазіцыі, ім не адмовіш у лірызме і пэўнай сатырычнай скіраванасці. Так, у вершы "Дзеванька" аўтар папракае маладую асобу за беспадстаўныя прэтэнзіі на панскасць, а ў

вершы “Гарэліца” — п’яніцу за празмерную прыхільнасць да “зялёнага змія”.

Пад уплывам пісьменнікаў-рамантыкаў Я. Баршчэўскі пачаў апрацоўваць беларускія паданні, легенды, казкі, песні, прыказкі і прымаўкі, у выніку чаго была напісана “кніга сэрцаў і характараў людскіх” “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”. У гэтым чатырохтомным зборы апавяданняў, які параўноўваюць з цыклам “Тысяча і адна ноч”, пісьменнік абгрунтаваў думку пра самабытнасць, веліч і духоўнае багацце беларускага народа.

Скразным вобразам, які аб’ядноўвае твор у адзінае мастацкае цэлае, з’яўляецца шляхціц Завальня. Ён гасцінна сустракае ўсіх падарожных, шчодра частуе іх, уважліва слухае жыццёвыя гісторыі і казкі. З такіх гісторый мы даведваемся пра багатага Карпа, рыбака Родзьку, пана Сівоху, сляпога Францішка, паляўнічага Сямёна і іншых герояў, якія аказваюцца ў самых розных і неверагодных жыццёвых сітуацыях, трапляюць пад уплыў чорных сіл, змагаюцца, перамагаюць, выратоўваюцца, гінуць... (“Пра чарнакніжніка і змяю, што вылупілася з яйка, знесенага пеўнем”, “Карона вужа”, “Зухаватыя ўчынкі”, “Вогненныя духі”).

Фантастычныя апавяданні Я. Баршчэўскага, адметныя і непаўторныя, звязаны з “духам і паэзіяй народа”. Яны насычаны афарызмамі, трапнымі выслоўямі і параўнаннямі: “*Хто вучыцца, той павінен пра ўсё ведаць”; “Помстаю не супакоіш пакуты”; “Чалавек без рэлігіі на ўсё гатовы”; “Якая карысць спрачацца з людзьмі, якія маюць абмежаваныя веды і пачуцці?”; “Перасаджваць дубы — найвялікшае няшчасце”.* У іх сцвярджаюцца вечныя ісціны чалавечага быцця: міласэрнасць, дабрыня, вернасць, уседаравальнасць, любоў да бліжняга і роднай

зямлі. Праз сістэму выяўленчых сродкаў і на аснове багатых фальклорных матэрыялаў Я. Баршчэўскаму ўдалося стварыць сімвалічны і непаўторны вобраз Плачкі-Беларусі і яе пакутніцкага лёсу.

## 19

## ТВОРЧАСЦЬ ЯНА ЧАЧОТА

Творчы шлях Яна Чачота, сябра вядома паэта Адама Міцкевіча, даволі складаны. У час навучання ў Віленскім універсітэце ўступіў у студэнцкае таварыства філаматаў, дзе з’яўляўся кіраўніком літаратурнага аддзела. Пасля выкрыцця царскім урадам студэнцкіх згуртаванняў быў зняволены ў Віленскую турму, а потым сасланы на Урал у крэпасць Кізіл. Вярнуўшыся на радзіму ў 1833 годзе, пачаў займацца збіраннем фальклорных матэрыялаў, якія былі выдадзены ў шасці фальклорных зборніках “Сялянскія песенькі”.

Першыя беларускія творы Яна Чачота непасрэдна звязаны з дзейнасцю студэнцкага таварыства філаматаў і па форме нагадваюць імянныя вітанні. Яны былі прысвечаны сябрам Ю. Яжоўскаму, Д. Хлявінскаму, А. Міцкевічу, Ф. Малеўскаму і інш. (“Да пакіньце ж горла драць”, “Імяніннае павіншаванне”, “Едзеш, міленькі Адам”) і складзены па ўзоры беларускіх народных песень і іх вобразна-выяўленчых сродкаў. Вялікай папулярнасцю сярод філаматаў карысталіся песні “Што старыя за вар’яты”, “Прэч, прэч, сум, нудоты”, напісаныя па матывах папулярных у тыя часы народных песень і, як правіла, сцвярджаючыя вольналюбівыя настроі моладзі. Фалькларыстычныя мастацкія прынцыпы аказалі вялікі ўплыў і на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

польскамоўныя балады Я. Чачота “Наваградскі замак”, “Свіцязь”, “Бекеш”, “Узногі”, у якіх спалучыліся элементы рамантызму і сентыменталізму.

Другі перыяд творчасці Я. Чачота (пасля вяртання з ссылкі) характарызуецца пільнай увагай паэта-фалькларыста да беларускай народнай песеннай творчасці. На працягу прыкладна 10 гадоў ён сабраў і выдаў у Вільні 6 кніг “сялянскіх песенак” (тры з іх перакладзены на польскую мову, а астатнія апублікаваны ў арыгінале, на беларускай мове). Побач з народнымі песнямі ў кнігах змяшчаліся прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы, уласныя вершы аўтара. У гэтых творах паэт з павагай пісаў пра беларускую мову і яе носьбітаў — сялян. Так, у прадмове да кнігі “Сялянскія песенькі з-над Нёмана” даследчык зазначае: “Сяляне нашы, люд добры, лагодны, працавіты, справядлівы, павінны абуджаць у нас самыя прыхільныя да сябе пачуцці. З імі можам быць шчаслівыя. За працу іх рук аддаючы ім працу розуму і нашай асветы, можам памножыць агульнае дабро. Не думайма, каб і ад іх мы не маглі чаму навучыцца. Многаму навучымся, вывучаючы іх становішча і нораў: знойдзем у іх паданні, казкі, легенды, і найбагацейшым будзе жніво песенак, якія дазваляюць спазнаць іх пяшчотныя, прыгожыя, тонкія нават і глыбокія пачуцці”.

У беларускіх вершах “Да мілых мужычкоў”, “Покуль сонца ўзыдзе”, “Плакала бяроза ды гаварыла”, “Нашто нам дым выядае вочкі”, “Быў я калісь кавалём” паэт адстойваў інтарэсы сялян, імкнуўся прымірыць іх з панамі, выказваўся за маральнае ўдасканальванне чалавека працы. Асноўную прычыну цяжкага жыцця селяніна Я. Чачот бачыў у абыякавых адносінах да яго пана, у нядобрым і злым аканоме. І таму ён заклікаў:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пане ты наш, пане!
Будзь жа нам ласкавы,
Не дай аканома,
Што асцёбаць жвавы.

У змаганні за гуманістычныя адносіны да чалавека працы, жаданні палепшыць яго долю, сцвярджэнні ідэі грамадзянскай роўнасці  сялян і паноў, у імкненні зацікавіць пануючыя класы жыццём сялянства, а таксама маральна-этычнай змястоўнасцю і эстэтычнай каштоўнасцю народных песень вызначаецца асветніцкая і дэмакратычная значнасць дзейнасці Я. Чачота. Творы паэта на беларускай мове, як справядліва зазначае К. Цвірка, — яскравае сведчанне “нараджэння новай беларускай літаратуры і адначасова нацыянальнага адраджэння аднаго з самабытных і вялікіх народаў”.

## 20

## ЖАЎРУКОВАЯ ПЕСНЯ ПАЎЛЮКА БАГРЫМА

У горане часу неспапялімыя
Над Беларуссю яго жаўрукі.
*З. Дудзік*

У літаратуры кожнага народа ёсць мастакі слова, у спадчыну ад якіх нам засталося не так і шмат. У беларусаў — Паўлюк Багрым. Цяжкім і няпростым быў лёс гэтага юнака: гаротнае жыццё беднага сялянскага хлопца, рэкрутчына за распаўсюджанне антыпрыгонніцкіх вершаў, працяглая служба ў глыбіні Расіі. Але, нягледзячы на цяжкія выпрабаванні лёсу, ён заставаўся мастаком слова — уладаром чалавечых душ.

У творчай спадчыне П. Багрыма было тры вучнёўскія сшыткі, якія бясследна зніклі пры арышце юнага паэта. Напэўна, гэта былі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вершы пра цяжкую долю беларускага народа, вершы антыпрыгонніцкай накіраванасці. А, можа, гэта былі вершы пра каханне, аб прыгажосці беларускай зямлі. Захаваўся толькі адзін верш "Зайграй, зайграй, хлопча малы...", напісаны паэтам у 15-гадовым узросце. Верш прысвечаны Крошынскаму паўстанню 1828 г. Лірычным героем твора з'яўляецца падлетак-пастушок, уласнасць жорсткага пана, які "кіямі" закатаваў бацьку. Каб пазбегнуць рэкруцтва, хлопчык вырашае пакінуць родны дом і пайсці ў "свет, у бездарожжа". Думкі і пачуцці прыгоннага падлетка, скіраваныя ў бок пошукаў выйсця з безвыходнага становішча, вызначаюцца адчаем і бездапаможнасцю. Падлетак гатовы абярнуцца ў ваўкалаку, зноў нарадзіцца каршуном — тады яго ў "паншчыну б не пагналі, у рэкруты б не забралі і ў маскалі не аддалі". Ён шкадуе, што да яго не дакрануўся сваім крылом кажан — тады б, па народным павер'і, ён навекі застаўся недаросткам і пазбег бы салдатчыны і паншчыны. Асабліва адчайна гучаць радкі, дзе пастушок зусім не хацеў бы нараджацца. Гэту думку ён звязвае з найдаражэйшым чалавекам — маці, якая, напэўна б, была больш шчаслівай і змагла пазбегнуць пакут з-за трагічнага лёсу сына:

Каб ты мяне не радзіла.  
Каб ты мяне не карміла,  
Шчасліўшая ты бы была!

У вершы П. Багрыма, які І. Навуменка назваў творам "з ліку бязлітасна-адчайных аб нежаданні жыць", матыў безвыходнасці крыху паслабляецца жаданнем героя знайсці выйсце, супрацьстаяць антычалавечым абставінам жыцця, не скарыцца лёсу. Верш кранае сілай пратэсту супраць прыгонніцтва і рэкруцтва, арганічнай спалучанасцю формы і зместу. Цесна звязаны з фальклорнымі традыцыямі (вобразы ваўкалака, каршуна, кажана, народна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

песенныя звароты, паўторы), ён выявіў вялікія магчымасці беларускага паэтычнага слова.

Вярнуўшыся з рэкрутаў, пастарэлы і знясілены, П. Багрым ужо не наважваўся брацця за пяро. Ён працаваў у Крошыне кавалём. Да нашага часу захавалася металічная жырандоль з арнаментальнымі жаўранкамі, па-мастацку зробленая П. Багрымам. Толькі два адбіткі свайго жыцця — верш і жырандоль — пакінуў нам у спадчыну П. Багрым. Пакінуў дзве жаўруковыя песні.

## 21

## "КАБ ЗБЫЦЬ НЯВОЛІ ПУТЫ..." (ДЗЕЙНАСЦЬ ФІЛАМАТАЎ І ФІЛАРЭТАЎ)

Ты нас вярні з выгнання на зямлю Айчыны.
Перанясі душу маю адсюль з чужыны,
Да ўзгоркаў тых лясных, да тых лугоў зялёных,
Над сінім Нёманам раскінутых, прымглёных,
Да тых палёў, размаляваных пад блакітам
Пшаніцай залатой ды серабрыстым жытам.
*А. Міцкевіч*

Дзейнасць філаматаў і філарэтаў з'яўляецца надзвычай важнай старонкай у гісторыі беларускай літаратуры і нацыянальнага адраджэння. Гэта былі таленавітыя, рамантычна ўзнёслыя юнакі, бязмерна адданыя сваёй Айчыне, ахопленыя прагай да асветы.

Тайнае студэнцкае таварыства філаматаў было створана восенню 1817 г. у Віленскім універсітэце па ініцыятыве Тамаша Зана і Адама Міцкевіча. Мэта таварыства — творчае ўдасканаленне юнакоў, узаемадапамога ў набыцці і паглыбленні ведаў, садзейнічанне ўсеагульнай "асвеце", вывучэнне гісторыі роднага краю, вуснапаэтычнай народнай творчасці. На пасяджэннях арганізацыі слухаліся і абмяркоўваліся навуковыя даклады і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэфераты на самыя разнастайныя тэмы, а таксама ўласныя мастацкія творы. Даволі часта філаматы наладжвалі маёўкі, розныя святкаванні (асабліва дні нараджэнні). Для такіх мерапрыемстваў складаліся цэлыя сцэнарыі, у якіх выкарыстоўваліся ўласныя вершы, народныя песні, музычныя творы. Асабліва папулярнымі на гэтых урачыстасцях былі імянныя вітанні Яна Чачота, прысвечаныя сябрам-філаматам і складзеныя па ўзоры беларускіх народных песень.

З мэтай пашырэння адукацыі народа філаматы рыхтавалі да друку падручнікі, навуковыя энцыклапедыі, арганізоўвалі школы. Францішак Малеўскі, напрыклад, адкрыў школу для сялян у Шчорсах на Навагрудчыне. Для ажыццяўлення сваіх асветніцкіх задач філаматы стварылі свае адгалінаванні — больш масавыя арганізацыі тыпу Саюза сяброў (братолюбцаў), Таварыства прамяністых, Навуковага таварыства, Саюза маладых адвакатаў, Саюза айчынных натуралістаў.

Найбольш вядомым і прадстаўнічым было Таварыства прамяністых, асновай дзейнасці якога была абвешчаная Тамашам Занам тэорыя прамяністасці. Згодна з ёй, прамяністым можа быць той, хто імкнецца стаць высокамаральным, духоўна багатым чалавекам, хто выпраменьвае святло і тым самым уздзейнічае на іншых, духоўна і маральна ўдасканальвае іх. У 15 правілах прамяністых адзначалася, што важнейшымі крокамі на шляху да маральнага ўдасканалення чалавека з’яўляюцца “прыхільнасць да айчыннай зямлі”, веданне яе гісторыі, захаванне традыцый і звычаяў сваіх бацькоў, іх мовы, гатоўнасць да самаахвярнасці дзеля выратавання айчыны і інш. Масавасць Таварыства прамяністых напалохала універсітэцкае кіраўніцтва, і ў канцы мая 1820 г. па

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

загадзе рэктара Сымона Малеўскага яно было распушчана. Замест прамяністых філаматы стварылі тайнае таварыства філарэтаў (прыхільнікаў маральнай чысціні).

Таварыства філарэтаў, старшынёй якога з'яўляўся Тамаш Зан, мела 4 аддзелы (адпаведна факультэтам універсітэта) : матэматычна-фізічны, юрыдычны, літаратурны, медыцынскі. Сваёй мэтай аб'яднанне лічыла не толькі маральнае ўдасканаленне чалавека, але і вырашэнне разнастайных культурна-асветніцкіх і палітычных задач.

У 1823 г. дзейнасць філаматаў і філарэтаў была выкрыта. Доўгія месяцы ішло следства. Прысуд быў жорсткі: 10 філаматаў і 10 філарэтаў, сярод якіх Тамаш Зан, Ян Чачот, Адам Міцкевіч, Юзаф Яжоўскі, Францішак Малеўскі, Адам Сузін, Мікалай Казлоўскі, Ян Крыніцкі, былі высланы з Літвы ў аддаленыя губерні Расіі. Тамашу Зану і Яну Чачоту і Адаму Сузіну ў дадатак было прысуджана зняволенне ў крэпасці. Над 80 філаматамі і філарэтамі быў замацаваны пільны паліцэйскі нагляд. Жорстка караючы маладых людзей за іх вольнадумства, царскі ўрад імкнуўся вынішчыць беларускі нацыянальны дух з перадавой навучальнай установы. Аднак ён не змог пагасіць высокіх пачуццяў і шчырых парываў студэнтаў, скарыць моц і незалежнасць іх духу. Параскіданыя па свеце, філаматы і філарэты засталіся вернымі сваім юнацкім ідэалам, якія натхнялі іх на высакародныя дзеі і патрыятычныя ўчынкі, дапамагалі выстаяць у самых складаных жыццёвых сітуацыях, ажыццявіць задуманае.

## 22

## "ЛІРНІК ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ" (ТВОРЧАСЦЬ УЛАДЗІСЛАВА СЫРАКОМЛІ)

Будзеш жыць! Будуць векі ісці за вякамі, —
Не забудуцца дум тваіх словы,
Як і слоў беларускіх, жывучы між намі,
Не забыўся ты, лірнік вясковы.
*Я. Купала*

У. Сыракомля шырока вядомы ў славянскім свеце як аўтар лірычных вершаў і паэм, народных гутарак, гісторыка-літаратурных даследаванняў, фальклорных прац і перакладаў з лацінскай мовы. Сваё літаратурнае крэда пісьменнік выразна акрэсліў ў наступных радках:

Не я пяю — народ Божы
Даў мне ў песні лад прыгожы,
Бо на сэрцы маю путы
І з народам імі скуты.

Першы верш У. Сыракомлі "Паштальён" з'яўляецца пераказам гісторыі з жыцця старога селяніна, пачутай аўтарам у адзін кірмашовы дзень у Міры. У маладыя гады гэты селянін служыў фурманам на пошце ў Міры. У вёсцы, непадалёку ад тых мясцін, жыла яго каханая. Неяк сярод ночы , у лютую мяцеліцу, разбудзіў яго пісар і загадаў тэрмінова везці лісты. Дарогаю пачулася фурману , што ў полі хтосьці, заблудзіўшыся, кліча на дапамогу, просіць паратунку. Ён памкнуўся на голас, але перадумаў, хацеў хутчэй справіцца з заданнем. Вяртаючыся назад, "паштальён" убачыў ля дарогі замёрзлую на марозе дзяўчыну. Жах і адчай ахапіў яго, калі, падышоўшы бліжэй, пазнаў у незнаёмай сваю каханую. Гэта гісторыя ўзрушыла Уладзіслава Сыракомлю, і ў тую ж ноч ён напісаў верш "Паштальён", які быў надрукаваны ў віленскім часопісе "Athenaeum" пад псеўданіма NN. Першаму твору Уладзіслава Сыракомлі наканавана было нарадзіцца двойчы. Праз чвэрць стагоддзя верш, перакладзены на рускую мову яраслаўскім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

паэтам Леанідам Трэфалевым, стаў надзвычай папулярнай песняй “Когда я на почте служил ямшиком...”.

Падзагаловак верша “Паштальён” — “народная гутарка” — як бы прадвызначаў асноўны жанр паэтычных твораў У. Сыракомлі, героямі якіх сталі селянін, араты, шляхціц, лірнік, фурман, грабар, цясляр, жабрак. У гутарках і вершах “Хадыка”, “Доля”, “Груган”, “Крук”, “Жніўная песня”, “Нядзеля”, “Лялька” аўтар паказаў не толькі галечу, беднасць і бяспраўнае становішча працоўных людзей, але і іх высокія маральныя якасці, унутраную прыгажосць, сумленнасць, высакароднасць, дабрыню. Паэт параўноўвае сябе з вясковым лірнікам, які ў любай старонцы, “святой Літве сваёй” будзе “граць людзям”, дапамагаць ім у цяжкім жыцці:

Сэрца, жыццё я аддаць гатовы,
Пяю табе, мой народ шарачковы,
Толькі з табой спадзяванні злучаю,
Смутак і радасць, хвіліны адчаю.

Многія творы вясковага лірніка (“Пілігрым”, “Кавалак хлеба”, “Вандроўкі па маіх былых ваколіцах”, “Вёска”, “Манаграфія ракі Нёман”) прасякнуты абвостраным пачуццём любові да бацькоўскай зямлі. “Заўсёды мне здавалася, — пісаў У. Сыракомля, — што нельга палюбіць Маці-зямлю родную без уважлівага вывучэння ўсяго яе аблічча. Навучыцца бачыць іскру, што ўпала з яе павек, плакаць яе слязьмі, якія з вачэй яе цяклі або цячы маглі, нават з любасцю лічыць маршчыны на яе твары — усё гэта абавязковыя ўмовы любові. Даследаваць нашу родную зямлю ў гістарычных, прыродных, этнаграфічных, археалагічных, геаграфічных адносінах — гэта, здаецца, вельмі просты вынік таго, што прынята называць любасцю да радзімы”. Прытрымліваючыся гэтага крытэрыю вызначэння любові да Бацькаўшчыны, паэт падкрэслівае, што сувязь

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавека з роднай зямлёй — ёсць праяўленне яго высокай духоўнасці.

У аснову гутаркі “Жменя пшаніцы” пісьменнік паклаў распаўсюджаны казачны сюжэт пра бацьку і яго трох сыноў. Старэйшыя сыны Сцяпан і Рыгор, пабываўшы за мяжой, сталі грэбаваць роднай мовай, культурай, традыцыямі свайго народа. Малодшы ж сын Сымон вярнуўся з мяшком пшаніцы, бо думаў аб карысці, якую ён зможа прынесці сваім аднавяскоўцам. Адарванасць чалавека ад народа і роднай зямлі асуджаецца пісьменнікам і ў паэме “Начлег гетмана”, галоўны герой якой Рыгор Суліма, атрымаўшы адукацыю і высокае становішча ў грамадстве, стаў па сутнасці касмапалітам, страціў сувязь з радзімай свайго маленства.

Беларускамоўныя вершы “Добрыя весці”, “Ужо птушкі пяюць усюды” грунтуюцца на кантрастнасці інтанацый, паэтыцы супастаўлення. Праз вобразы ветра, што прынёс добрыя весці, птушак, кветак, вясны аўтар сцвярджае непазбежнасць абнаўлення жыцця, хуткі надыход лепшых дзён, за якія трэба яшчэ змагацца.

Творчасць Уладзіслава Сыракомлі, нястомнага руплíўца, збіральніка народнай творчасці, паэта, краязнаўца, этнографа, шчырага абаронцы простага люду, і сёння ўражвае абвостраным і нязменным пачуццём любові да Радзімы, глыбокім веданнем гісторыі і культуры беларускага і польскага народаў, асаблівасцей іх характару і нацыянальнай псіхалогіі.

## 23

## “ІДЫЛІЯ” В. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА

На долю п’есы В. Дуніна-Марцінкевіча “Ідылія” (другая назва — “Сялянка”) выпаў шчаслівы лёс. Напісаная ў 1846 г., яна і ў нашы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дні з поспехам ставіцца на сцэнах многіх тэатраў, карыстаецца папулярнасцю ў гледачоў. Сам аўтар, які быў душою аматарскага калектыву і ўдзельнічаў у многіх яго пастаноўках, з сімпатыяй адносіўся да герояў "Ідыліі" Менавіта ў гэтым спектаклі ён бліскуча выконваў ролю Навума — самабытнага, яркага, эмацыянальнага вобраза, захавальніка духоўных традыцый. Гэта роля прынесла В. Дуніну-Марцінкевічу вядомасць і папулярнасць і як акцёру, і як пісьменніку. Пазней імя і прозвішча любімага вобраза сталі літаратурным псеўданімам аўтара.

У аснове сюжэта п'есы — актуальная для таго часу праблема ўзаемаадносін селяніна і пана. Падзеі адбываюцца ў маёнтку Кароля Лятальскага — лугкадумнага маладога пана, які большую частку часу праводзіць у забавах, прыемных вандроўках, "лётаючы" па свеце. Вярнуўшыся з Францыі ў свой спадчынны маёнтак, Лятальскі з жахам думае аб тым, як можна жыць у гэтым нецывілізаваным краі сярод мужыкоў. У хуткім часе ён сустрэўся з "прыгоннай сялянкай" Юліяй і закахаўся ў яе. Пад уплывам сустрэч з Юліяй і яе бацькам герой п'есы па-іншаму пачынае глядзець на прыгонных сялян, лічачы, што ў іх добрыя сэрцы і што яны здольныя на высокія пачуцці і высакародныя ўчынкі. Лятальскі прапануе дзяўчыне руку і сэрца, клянецца быць клапатлівым бацькам для сялян. "Хачу іх любіць, і каб яны мяне любілі...", — усклікае ён. У канцы п'есы высвятляецца, што Юлія — пераапранутая паненка, якая сваімі дзеяннямі вырашыла змяніць погляды Лятальскага на сялян і свой край. П'еса заканчваецца сцэнай заручын маладых людзей. В. Дунін-Марцінкевіч, такім чынам, паказвае перараджэнне памешчыка-франкамана ў гуманнага, добразычлівага пана, які ўжо

не прагне паездкі за мяжу, а хоча жыць на ўлонні прыроды сярод сялян.

На фоне любоўнай ідыліі Лятальскага і Юліі В. Дунін-Марцінкевіч змог разгарнуць шырокую карціну жыцця ў прыгоннай вёсцы, стварыць каларытныя, самабытныя і праўдзівыя характары прадстаўнікоў народа. Сапраўдным героем твора стаў Навум Прыгаворка —чалавек разумны, кемлівы, дасціпны. Ён выразна ўсведамляе сваё паднявольнае становішча, але пры гэтым ведае сабе цану і не губляе пачуцця ўласнай годнасці. У творы шырока выкарыстоўваюцца народныя песні, прыказкі, прымаўкі і фразеалагізмы: *Да бога высока, да пана далёка. Ад ліха — ціха, а дабра не чуваць. Цягаў воўк, пацяглі воўка. Ранняя птушка крылкі цярэбіць, а позняя — вочы працірае. Абяцанка цацанка, а дурному радасць. Хто каго любіць, той таго чубіць. І сцены маюць вушы. Што напішаш пярцом, то не вырубіш тапарцом. Пій, ды розуму не прапій.* Укладзеныя ў вусны Навума, гэтыя выслоўіне толькі вызначаюць сцісласць, лаканічнасць, вобразнасць і каларытнасць сялянскай мовы, але і набываюць сацыяльнае гучанне: простаму чалавеку цяжка жывецца, яго многія крыўдзяць; піць гарэлку трэба з розумам; грошы ў жыцці адыгрываюць не апошнюю ролю і інш. Вобразам Навума аўтар адстойваў права на паказ у літаратуры ў якасці галоўнага героя селяніна і тым самым змагаўся за дэмакратычную, народную літаратуру.

У п’есе “Ідылія”, якая спалучае ў сабе рэалістычныя і ідэалістычныя рысы, па-майстэрску дасканала вымалеваны вобразы сялян і паноў, якія ў рэшце рэшт становяцца добрымі сябрамі. Вобразы сялян (яны, у адрознене ад паноў, размаўляюць па-

беларуску) шмат у чым прадвызначылі далейшае паглыбленне пісьменніка ў беларускі матэрыял.

## 24

## ГУМАНІСТЫЧНЫ ПАФАС ПАЭМЫ В. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА “ ГАПОН”

Першыя творы В. Дуніна-Марцінкевіча былі вытрыманы ў духу сентыменталізму. Для іх характэрна ідэалізаванае адлюстраванне жыцця вёскі, пільная ўвага да душэўных перажыванняў герояў, заклік да чалавечнасці, стварэнне вобразаў добрых памешчыкаў. Аб гэтым сведчыць і ранні твор пісьменніка — паэма “Гапон”. Заснаваная на праўдзівым здарэнні, паэма раскрывае калізіі кахання маладога селяніна Гапона да Кацярыны.

Складаецца твор з 4 раздзелаў-песень, у якіх раскрываюцца разнастайныя аспекты жыцця герояў. Найбольш яркі — першы раздзел, дзе апісваецца вечарынка ў карчме. Сярод прысутных найбольш вылучаецца Гапон, “зух дзяціна”, які ўмее не толькі хораша танцаваць, але і “пастаяць за сваіх”: ён не хаваецца, а з калом у руках бароніцца ад аканомавых паслугачоў. Гэтым учынкам В. Дунін-Марцінкевіч падкрэсліў смеласць, рашучасць характару Гапона, яго ўменне выступіць у абарону сяброў і сваёй чалавечай годнасці.

У другім раздзеле, ідэя якога выказана эпіграфам “над сіратою бог з калітою”, расказваецца пра жыццё Кацярыны пасля таго, як Гапона за бунт, непакору і агітацыю сярод сялянскай моладзі супраць рэкрутчыны аддалі ў салдаты. Працавітую, кемлівую, здольную дзяўчыну ўпадабаў аканом — заядлы прыгоннік, хлуслівы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і амаральны чалавек. Пра паклёп на Гапона, узведзены бессаромным аканомам, даведваецца старая пані. Яна выганяе аканома з маёнтка і здае яго ў рэкруты, а Кацярыну забірае ў двор пакаёўкай, дзе тая навучылася чытаць і пісаць.

У наступных раздзелах расказваецца пра Гапона, прыродны розум, дасціпнасць якога дазволілі яму — сыну прыгоннай сялянкі — даслужыцца да афіцэра і стаць па сутнасці дваранінам. Гэтым самым В. Дунін-Марцінкевіч заклікаў сялян не ўхіляцца ад воінскай службы, паказваў, што кожны сумленны і працавіты чалавек можа дасягнуць высокіх чыноў і званняў.

Вярнуўшыся дамоў, герой паэмы просіць у пані блаславення на шлюб. Пані дае сваю згоду:

А пані — не пані, маці!
Маўляў роднаму дзіцяці,
Прыгожы пасаг дала,
Радасна слёзку ўраніла,
Маладых благаславіла,
Сама к вянцу павяла.

Дабро, такім чынам, перамагае зло. Заканчваецца паэма сцэнай вяселля, якое аўтар апісвае дасканала, вельмі каларытна і падрабязна. Канфлікт паміж сялянамі і панамі, як бачна з паэмы, вырашаецца шляхам усталявання гарманічных, гуманных адносін паміж імі. Віну ж за душэўную чэрствасць, жорсткасць, цяжкае становішча сялян аўтар ускладае не на паноў, а на іх паслугачоў — аканомаў (дарэчы, у п’есе “Сялянка” такім з’яўляецца аканом Выкрутач, паўнапраўны гаспадар у маёнтку Лятальскага).

Паэма “Гапон” вылучаецца майстэрствам В. Дуніна-Марцінкевіча ў паказе сялянскага побыту, добрым веданнем вуснай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

народнай творчасці і ўменнем арганічна ўвесці яе ў твор у выглядзе песень, прыпевак, трапных народных выслоўяў.

## 25

## КРЫТЫКА ЦАРСКАЙ СУДОВАЙ БЮРАКРАТЫІ Ў КАМЕДЫІ В. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА “ПІНСКАЯ ШЛЯХТА”

Камедыя “Пінская шляхта” — выдатнае дасягненне беларускай нацыянальнай драматургіі. Значны ўплыў на стварэнне камедыі аказала паўстанне 1863—1864 гг., да якога В. Дунін-Марцінкевіч аднёсся насцярожана, з пункту гледжання шляхецкай дэмакратыі. Няма падстаў лічыць яго актыўным удзельнікам тых падзей, аднак яны не маглі не паўплываць на далейшы жыццёвы і творчы шлях пісьменніка. Больш за год В. Дунін-Марцінкевіч знаходзіцца пад следствам у мінскай турме, а яго старэйшую дачку за ўдзел у паўстанні саслалі ў Сібір. І таму камедыя рэзка адрозніваецца ад папярэдніх твораў (п’есы “Сялянка”, паэмы “Гапон”). У ёй назіраецца ўжо іншы падыход аўтара да шляхты (учарашніх бунтаўшчыкоў), да прадстаўнікоў царскай улады — паліцэйскіх, судовых чыноўнікаў, следчых. Цэлая армія іх была прыслана ў Беларусь праводзіць палітыку “православия, народности”, палітыку прышчаплення вялікадзяржаўнай ідэі самаўладства.

Дзеянне ў “Пінскай шляхце” адбываецца ў адным з глухіх палескіх засценкаў Пінскага павета, дзе ўсе лічаць сябе шляхціцамі, дваровымі. Двое “шляхцічаў” Іван Цюхай-Ліпскі і Ціхон Пратасавіцкі пасварыліся і нават пабіліся з-за таго, што адзін абазваў другога мужыком. За гэту вялікую “абразу” Ліпскі падае на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пратасавіцкага ў суд. На разгляд справы ў закінуты мядзведжы куток прыязджае станавы прыстаў Кручкоў з пісарам Пісулькіным.

Каб больш яскрава паказаць тыповыя рысы “судовых людзей”, В. Дунін-Марцінкевіч уводзіць у п’есу сцэну судовага пасяджэння, якая ўспрымаецца як вострая пародыя на царскі суд. Кручкоў не судзіць, а камандуе, загадвае, адным словам, распараджаецца ў судзе, як яму толькі ўздумаецца. “Найяснейшая карона” пускае ў ход усе свае здольнасці: корчыць сур’ёзную фізіяномію, адзін вус ставіць угору, а другі — уніз, спасылаецца на неіснуючыя законы, указы, дапускае такія сцвярджэнні, ад якіх у вачах цёмна робіцца. Так, ён сцвярджае, што імператрыца Лізавета Пятроўна выдавала свае ўказы ў 1893 г., у той час як сам герой дзейнічае ў 60-х гг. XIX ст. Па Кручкову, у красавіку налічваецца 49 дзён, у верасні — 75, у кастрычніку — 45. І гэту бязглуздзіцу з увагай слухае шляхта (былое рыцарства польскіх каралёў і феадалаў). Яна нават прыходзіць ў захапленне ад юрыдычных здольнасцей прыстава. Гэтым аўтар высмейвае не толькі тупасць, нахабства, самавольства Кручкова, але і невуцтва, адсталасць правінцыяльнай шляхты, якая нават не ведае летазлічэння, веку і году, у якім жыве. На думку В. Дуніна-Марцінкевіча, шляхта перарадзілася ў саслоўе, якое толькі аддалена (хутчэй па прэтэнзіях і амбіцыях) нагадвае панства. На самай жа справе яна ўяўляе безнадзейна адсталае, інертнае асяроддзе; часам шляхціц жыве горш за селяніна. І гэта кансерватыўнае, ганарыстае “асяроддзе” служыла ў часы рэакцыі апорай царскага самаўладства і такіх яго “дзеячаў”, як прыстаў і пісар. Панаванне кручковых і пісулькіных толькі і магчыма сярод забітай, цёмнай, але ганарлівай шляхты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыстаў, надзелены ўладай, сярод шляхты не лічыць патрэбным нават захоўваць знешнюю форму правасуддзя. Ён аб'яўляе вінаватымі тых, хто ніякіх адносін да справы не мае: "Сведкі, каторыя бачылі драку, а не баранілі, — па 9-ці рублёў, а вся прочая шляхта, што не бачыла дракі, за тое, што не бачыла, — па 3 рублі". Кручкоў наскрозь бачыць закасцянелую, пыхлівую шляхту і скарыстоўвае любую магчымасць, каб вывудзіць з яе кішэняў грыўны, рублі і чырвонцы. Аднаму з шляхціцаў ён прысуджае пакаранне ў 25 лоз без дывана, на голай зямлі. Добра ведаючы, што такое пакаранне лічылася мужыцкім, "нечуваным уніжэннем", ён тым самым здзірае з яго апошнія грошы. Цёмныя ж пінчукі так бароняць свой шляхецкі гонар, што гатовы аддаць апошнюю кашулю, абы толькі пазбегнуць лоз на голай зямлі.

Нахапаўшы досыць грошай, прыстаў не грэбуе сушанымі грыбамі, рыбай, мёдам, зайцамі. "За добры гасцінчык" найяснейшая "карона" згаджаецца дапамагчы закаханым Грышку і Марысі. У канцы камедыі Кручкоў сутыкае шляхціцаў Альпенскага і Статкевіча, каб яшчэ раз прыехаць за спажываю, спадзеючыся на новае "жніво".

Вобраз Кручкова пададзены ў п'есе ў сатырычнай форме. Аб гэтым сведчаць блытаніна ў фактах і законах, яго знешні выгляд, мова, падобная да страшэннай мешаніны слоў, розных выразаў, запазычаных з судовых дакументаў, тыпу "лічнасць падвергнецца апаснасці", "пусть выступят вперод", "в пользу врэменнага прысуцтвія".

Двайнікам свайго непасрэднага начальніка, яго верным слугою і надзейным памочнікам з'яўляецца пісар Пісулькін. Ён, як і Кручкоў, займаецца хабарніцтвам. З вялікім задавальненнем пісар

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прызнаецца: “Харашо быць пісьмавадзіцелем у разумнага чалавека, маляваныя госцікі (грошы) самі ў карман лезуць, не нада і рук выцягваць”.

В. Дунін-Марцінкевіч ў вобразах станавога прыстава Кручкова і яго памочніка Пісулькіна па-мастацку дасканала і знішчальна выкрыў царскае чыноўніцтва Расіі (асноўную палітычную апору расійскага самадзяржаўя), для якога характэрнымі былі хцівасць, хабарніцтва, грубасць, свавольства, невуцтва, п’янства. Напэўна, па гэтай прычыне ў 1890 г. віленскі губернатар рашуча запратэставаў супраць друкавання камедыі.  І толькі ў 1918 г. выдатны твор В. Дуніна-Марцінкевіча ўбачыў свет.

## 26

## ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ К. КАЛІНОЎСКАГА І ЯГО РЭВАЛЮЦЫЙНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

Бывай здаровы, мужыцкі народзе,
Жыві ў шчасці, жыві ў свабодзе
І часам спамяні праз Яську свайго,
Што загінуў за праўду для дабра твайго.

*К. Каліноўскі*

Барацьбітом за разняволенне, роўнасць, нацыянальнае адраджэнне Беларусі з’яўляецца правадыр паўстання 1863—1864 гг. Канстанцін Вінцэнт Каліноўскі. Нарадзіўся ён у шляхецкай сям’і на Гродзеншчыне ў вёсцы Мастаўляны (зараз тэрыторыя Беластоцкага ваяводства ў Польшчы). Вучыўся ў Свіслацкай гімназіі і на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта. Атрымаўшы званне кандыдата права, К. Каліноўскі вяртаецца на радзіму, дзе разам з паплечнікамі В. Урублеўскім (будучым генералам Парыжскай камуны) і Ф. Ражанскім наладжвае выпуск першай беларускай газеты “Мужыцкая праўда”. Упершыню на роднай мове

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў ёй апавядалася аб праўдзе, у чаканні якой так збалеліся сялянскія сэрцы. Невялікая па фармаце, газета нагадвала лістоўку-заклік, ў якой на адным ці двух баках папяровага ліста лацінскімі літарамі друкаваўся тэкст. Усяго ў 1862—1863 гг. выйшла сем нумароў газеты (спачатку ў Беластоку, потым у Вільні), падпісаных псеўданімам К. Каліноўскага “Яська — гаспадар з-пад Вільні”.

Разгортваючы карціны народнага бяспраўя, крыўд, рэкруцкіх павіннасцей, газета ў даступнай форме паказвала антынародную сутнасць царскай палітыкі і суда, тлумачыла прычыны сацыяльнай няроўнасці, выкрывала грабежніцкі характар сялянскай рэформы 1861 г., дараванай царом Аляксандрам II — “вызваліцелем”. Суд, на думку К. Каліноўскага, быў толькі дадаткам царскай адміністрацыі. Ён справядліва параўноўвае судовых чыноўнікаў з воўчай зграяй, “дзе не разбіраюць, чы за табой праўда, чы не, а скубуць адно як могуць”. Бунтарская па ўсёй сваёй сутнасці, “Мужыцкая праўда” заклікала беларускі народ да ўзброеннага паўстання супраць існуючага ладу. Так, заключныя радкі першага і трэцяга нумароў газеты заклікаюць сялян да згуртавання, да ўсведамлення сябе людзьмі высокай чалавечай годнасці, да ўсенароднай барацьбы за вольнасць, свабоду: “Няма чаго ждаці ад нікога, бо той толькі жне, хто пасее. Так сейце ж, дзецюкі, як прыйдзе пара, поўнаю рукою, — не шкадуйце працы, каб і мужык быў чалавекам вольным”. Апошнія радкі сёмага нумара поўныя аптымізму, бязмежнай веры і ўпэўненасці ў перамозе над маскоўскім прыгнётам: “Станьма дружна разам за нашу вольнасць!.. А будзе ў нас вольнасць, якой не было нашым дзядам ды бацькам”.

Выяўляючы самой назвай газеты яе народнасць, паэтызуючы сялянскую мару аб справядлівасці і праўдзе, К. Каліноўскі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сцвярджаў сацыяльна-палітычныя ідэі, даволі актуальныя і ў нашы дні. Так, словы “не народ для ўрада, а ўрад для народа” (іх у якасці эпіграфа можна прачытаць на першай старонцы газеты “Рэспубліка”) гучаць вельмі злабадзённа і сёння, у час адраджэння беларускай дзяржаўнасці. Зямля ў новым грамадстве, лічыць К. Каліноўскі, павінна належаць народу.

“Мужыцкая праўда” стала яркім выражэннем адносін яе аўтара да рэлігіі і шляхты. У шостым нумары газеты К.Каліноўскі выступае ў абарону уніяцтва — фактычна нацыянальнай рэлігіі нашых дзядоў-прадзедаў. Узнікшы паводле Берасцейскай уніі 1596 г., гэты кірунак хрысціянства быў скасаваны ў 1839 г. Прызнаючы асноўныя каноны каталіцызму з рымскім папам на чале, вернікі маліліся на роднай мове па ўсходнім абрадзе. Падчас паўстання 1863—1864 гг. амаль 80% насельніцтва Беларусі лічылі сябе уніятамі. І К. Каліноўскі, разумеючы абмежаванасць шляхты з яе саслоўнымі традыцыямі, класавым эгаізмам, імкнуўся ўзняць на паўстанне супраць царызму асноўныя масы сялянства.

Паўстанне пачалося ў студзені 1863 г. Спачатку К. Каліноўскі ўзначальваў Літоўскі правінцыйны камітэт, а затым быў рэвалюцыйным камісарам на Гродзеншчыне і кіраўніком Віленскага паўстанцкага цэнтра, які падзяліўся на дзве часткі: “чырвоных”, прыхільнікаў радыкальных змен, і “белых”, гатовых да кампрамісаў з царызмам. “Чырвоныя”, прадстаўленыя дробнай шляхтай (часам беззямельнай) і разначыннай інтэлігенцыяй, ставілі сваёй мэтай утварэнне незалежнай ад Расіі і Польшчы Беларускай Рэспублікі. “Белыя”, прадстаўленыя “вялікімі беларускімі панамі” (У. Ігнатоўскі), стаялі за ўтварэнне вялікай Польшчы з захаваннем старога ладу на Беларусі. Сяляне, прыслухоўваючыся да поклічу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“чырвоных”, прымаюць дзейсны ўдзел у паўстанні і вядуць барацьбу на два франты: супраць 200-тысячнага войска генерала-вешальніка Мураўёва, прысланага на Беларусь для падаўлення паўстання, і супраць “белых” здраднікаў. Такая барацьба непасільная для іх, і паўстанне паступова пачынае заціхаць. Уначы 10 лютага 1864 г. пад імем Ігната Вітажэнца быў арыштаваны К. Каліноўскі. Ваенна-палявым судом ён быў асуджаны і публічна павешаны на гандлёвай плошчы Лукішкі ў Вільні. Царскі ўрад жорстка расправіўся і з удзельнікамі паўстання, баявымі сябрамі К. Каліноўскага: 128 чалавек асуджана на смяротную кару, больш за дзве з паловай тысячы паўстанцаў сасланы на катаргу, паселены ў аддаленыя месцы Сібіры, каля 9 тысяч аддадзены пад суд.

Перад смерцю К. Каліноўскі здолеў пераслаць з-за турэмных кратаў “Пісьмо з-пад шыбеніцы” — сваё развітальнае слова народу, свой хвалюючы запавет.

Пройдзе час. Запавет К. Каліноўскага беларускаму народу — ваяваць за сваё чалавечае права — ажыве ў творчасці іншых слаўных сыноў Беларусі. Яго жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць стане тэмай многіх твораў пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**27**

## Ф. БАГУШЭВІЧ — АБАРОНЦА ПРАВОЎ ПРЫГНЕЧАНАГА БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСТВА

Францішак Багушэвіч — самая значная і яркая фігура ў гісторыі беларускай літаратуры парэформеннага часу. Імя таленавітага паэта, вясковага настаўніка, удзельніка паўстання 1863 г., судовага следчага і адваката стала першым у шэрагу імёнаў вялікіх беларускіх нацыянальных паэтаў. Ён ведаў нялёгкую долю беларускага

сялянства і разумеў яе прычыны. Таму ў цэнтры ўвагі яго быў просты чалавек, селянін-пакутнік, якога абяздолілі, абдзялілі і які заслугоўвае лепшага жыцця. Адвакат па прафесіі, Ф. Багушэвіч і ў літаратуры стаў адвакатам — абаронцам правоў прыгнечанага беларускага сялянства.

Большасць твораў Ф. Багушэвіча прысвечана жыццю беларускага сялянства. Селянін, працавіты і руплівы земляроб, жыве ў холадзе і галечы. З яго здзекуюцца, называючы цёмным і дурным. Працай жа яго карыстаюцца іншыя, не пакідаючы стваральніку матэрыяльных даброт самага неабходнага: мужыком пабудаваны прыгожыя палацы і касцёлы, сам жа ён "жыве ў мокрай яме", яго рукамі ўзведзены чыгункі, дарогі і масты, а сам ён не мае грошай нават на білет. Такая думка падкрэсліваецца ў вершах "Дурны мужык, як варона", "Бог не роўна дзеле", "Воўк і авечка".

Ф. Багушэвіч, абараняючы мужыка, паказвае, як у яго прачынаецца пачуццё ўласнай годнасці, расце пратэст супраць несправядлівасці. Так, у вершы "Ну цурайся" аўтар параўноўвае жыццё селяніна і паніча: іх знешні выгляд, адзенне, жыллё, адукацыю.

На кашулю глядзіш крывым вокам,
Што у хаце мне бабы пашылі,
Прапацела яна маім сокам,
Цэлы тыдзень яе не памылі...
А твая ж? як той снег, як папер,
І пацеў хто, і ткаў, і бяліў,
І хто шыў, і хто праў... а цяпер
Ты той пот на сябе узваліў.

Селянін не толькі скардзіцца, але і патрабуе лепшага жыцця, бо ён — стваральнік усіх матэрыяльных каштоўнасцей на зямлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Супраць здзекаў і прыгнёту, несправядлівасці царскіх законаў і парадкаў выступае селянін і ў вершы “У астрозе”. За знішчэнне межавога слупа селяніна садзяць у астрог, але здзекі і пабоі не могуць зламаць волі і імкнення героя да свабоды.

Ідэя справядлівасці, роўнасці ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі выказваецца ў вершы “Ахвяра” — своеасаблівым маральным кодэксе селяніна, малітве, у якой спалучаюцца рэлігійныя пачаткі і шматвяковая народная мудрасць. Лірычны герой верша звяртаецца да бабулі з просьбай памаліцца за яго:

Маліся ж, бабулька, да Бога,
Каб я панам ніколі не быў:
Не жадаў бы ніколі чужога,
Сваё дзела як трэба рабіў.

Герой верша не хоча быць панам, бо з панствам у яго асацыіруецца ўсё самае адмоўнае ў жыцці: амаральнасць, разбэшчанасць, сквапнасць, фанабэрыстасць, прага да нажывы, пагарда да слабейшых. Усё жыццё герой хоча быць толькі мужыком, бо ён ва ўсіх адносінах вышэйшы за паноў, з’яўляецца чалавекам у самым шырокім і прывабным значэнні гэтага слова: жыве сваёй працай, сам арэ сваю зямельку, любіць сваю радзіму і да канца ёй адданы, не квапіцца на чужое, перад меншымі не дзярэ носа, паважае іншыя народы, прызнае людзей за братоў, маральна чысты, не гультай і не злодзей, не здраднік і не п’яніца. Такая ж думка падкрэсліваецца і ў вершы “Калыханка”. Маці, люляючы сваё дзіця, спявае, што не хацела б бачыць яго “панам ці вялікім капітанам”:

Можа, будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
Людцоў Божых будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясці, як ліхога,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прасіць смертанькі ад Бога...
Ой, не будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам...

Селянін з’яўляецца галоўным героем і ў сатырычным вершы “Гора”. Пакутлівае жыццё працоўнага чалавека, яго думкі і настроі Ф. Багушэвіч перадае ў форме народнай песні з паўторам-рэфрэнам “Ой, гора ж маё!” Селянін спрабуе пазбавіцца ад гора: кідае яго ў рэчку, у полымя-агонь, прывязвае ў лесе да пня, закопвае ў вялікі роў, адвозіць у далёкую Амерыку. Але гора не пакідае мужыка. Мабыць, простаму чалавеку ў несправядлівым грамадстве пазбыцца гора нельга. Да такой думкі прыходзіць паэт. Праўда, сам верш гучыць не песімістычна. Няшчасце селяніна — хутчэй за ўсё насміханне з свайго гора, ад якога ніяк не можа пазбавіцца чалавек і якое ў той жа час не можа пазбавіць чалавека жыцця.

У вершаванай аповесці “Кепска будзе!” Ф. Багушэвіч расказвае пра цяжкі лёс Аліндаркі. Паказваючы невыносныя ўмовы жыцця беларускага народа, вострую нянавісць яго да прыгнятальнікаў, абуджэнне пачуцця чалавечай годнасці, смеласці і свабодалюбства, паэт сцвярджае: людзі, якія жылі на гэтай зямлі без свайго імя, пачынаюць шукаць і знаходзіць яго, пачынаюць усведамляць сваё чалавечае “я”.

Ф. Багушэвіч быў перакананым рэвалюцыянерам-дэмакратам, пуцяводнай зоркай для якога сталі ідэі К. Каліноўскага. Ён свядома выбраў шлях цяжкіх выпрабаванняў і барацьбы, бо найважнейшым для сябе лічыў справядлівасць і праўду. Пошукамі праўды, якая “згінула ў свеце”, якую “каменнем накрылі”, марай пра лепшы час, калі “перастанем плакаць мы над сваёй доляй”, прасякнута творчасць Ф. Багушэвіча і ўсе парывы яго шчырай душы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 28

## “НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ НАШАЙ БЕЛАРУСКАЙ, КАБ НЕ ЎМЁРЛІ” (Ф. БАГУШЭВІЧ)

Той люд жыве, што свае песні мае...

*Ф. Багушэвіч*

Рэвалюцыянера-дэмакрата, пачынальніка крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры Ф. Багушэвіча часта называюць будзіцелем гістарычнай і нацыянальнай свядомасці беларускага народа. У многіх творах, асабліва ў прадмовах да зборнікаў “Дудка беларуская” і “Смык беларускі”, якія лічацца мастацкімі маніфестамі нацыянальнага адраджэння, вяршыняй дэмакратычнай думкі, паэт выступае ў абарону беларускай культуры, мовы і народа.

Зборнік “Дудка беларуская” пачынаецца задушэўным зваротам Ф. Багушэвіча да ўсіх беларусаў: “Братцы мілыя, дзеці Зямлі-маткі маей! Вам афяруючы працу сваю, мушу з вамі пагаварыць трохі аб нашай долі-нядолі, аб нашай бацькавай спрадвечнай мове, каторую мы самі, да і не адны мы, а ўсе людзі цёмныя “мужыцкай” завуць, а завецца яна “беларускай”. У прадмове да зборніка аўтар падкрэслівае спрадвечнасць бацькоўскай мовы, якая такая ж “людская і панская, як і французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая”. “Наша мова для нас святая, — піша Ф. Багушэвіч, — бо яна нам ад Бога даная”. Параўноўваючы Беларусь з “Булгарыяй, Харватыяй, Чэхіяй” і іншымі краінамі, якія “маюць па-свойму пісаныя і друкаваныя” кніжкі і газеты (“і набожныя, і смешныя, і слёзныя”), паэт заўважае, што культурны чалавек павінен ведаць іншыя мовы, але найперш “трэба знаць сваю”.

Аўтар прадмовы нагадвае часы Вялікага княства Літоўскага, калі беларуская мова з’яўлялася дзяржаўнай: “Чытаў я ці мала

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

старых папераў па дзвесце, па трыста гадоў таму пісаных у нашай зямлі і пісаных вялікімі панамі, а нашай мовай чысцюсенькай, як бы вот цяпер пісалася”. З гневам ён абураецца тым, што зараз, калі напішаш ліст да бацькоў па-свойму, па-беларуску, людзі высмеюць цябе як дурня і скажуць, што “піша па-мужыцку”. Ф. Багушэвіч, не высвятляючы прычын гэтага, з жалем папракае саміх жа беларусаў: “мы самі пусцілі яе (мову) на здзек”.

Паэт лічыць нацыянальную мову найважнейшай формай выяўлення духоўнасці народа. “Гаворка, язык і ёсць адзежа душы”, — сцвярджае дэмакрат, злучаючы ў адно людскую душу і матчыну мову. Аўтар, раскрываючы ў творах таямніцы душы простага чалавека, яго імкненне да вольнасці, незалежнасці, не хоча, каб душа беларуса стала чужой, падменнай. Ф. Багушэвіч з гневам выкрывае тых, хто грэбуе роднай мовай, абыякава ставіцца да лёсу свайго народа, яго культуры і традыцый. “Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, — засцерагае паэт, — каб не ўмёрлі!” Уздымаючы голас у абарону роднага люду, паэт-дэмакрат выказвае глыбокую павагу да іншых народаў і іх моў.

Прадмовы да зборнікаў “Дудка беларуская” і “Смык беларускі” з’уляюцца глыбока патрыятычнымі творамі, у якіх аўтар абгрунтоўваў права беларускага народа на развіццё сваёй мовы і культуры. На жаль, і сёння, больш чым праз сто гадоў пасля напісання прадмоў, словы Ф. Багушэвіча застаюцца актуальнымі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 29

## ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ АЛІНДАРКІ — АДЛЮСТРАВАННЕ ГОРКАЙ ДОЛІ ПРАЦОЎНАГА НАРОДА (ПА ПАЭМЕ Ф. БАГУШЭВІЧА “КЕПСКА БУДЗЕ!”)

Тут, здаецца, і сканаў бы,
За свабоду жыццё б даў бы!
*Ф. Багушэвіч*

Ф. Багушэвічу было добра вядома цяжкае жыццё сялянства, якое задыхалася ад беззямелля, цярпела нястачы. У паэме “Кепска будзе!” паэт паказвае бесчалавечнасць царскіх чыноўнікаў і паноў, бясконцыя пакуты простага беларускага мужыка.

Аліндарка — галоўны герой твора — нарадзіўся ў сакавіку, нешчаслівым, па народных павер’ях, месяцы. Зімовыя запасы ўжо з’едзены, а да лета яшчэ далёка. “Кепска будзе!” — такімі словамі сустракае бацька нараджэнне сына, як быццам ведаючы наперад яго лёс:

Як я толькі нарадзіўся —
Бацька сказаў: “Кепска будзе!”
Ну дык жа ж не памыліўся:
Здзекаваліся Бог і людзі.

І словы бацькі спраўдзіліся. Ад самага нараджэння хлопчыка суправаджаюць няшчасці: недарэчнае хрышчэнне халоднай вадой з рэчкі, смерць бацькоў, галеча і голад. Даў прытулак сіраце Айчым, які выхаваў Аліндарку працавітым, чулым, спагадлівым чалавекам. У дваццацігадовым узросце хлопца западозрылі ў імкненні ўхіліцца ад рэкруцтва (ён не быў запісаны ў метрычнай кнізе) і кінулі ў астрог. Айчым, які верыць, што “праўда гдзесьці не змёрла”, бярэцца за цяжкую справу па вызваленні свайго прыёмнага сына. “Помні... мяне, сыну, а я хіба што загіну, а цябе вярну да вёскі”. З торбай на

плячах айчым абівае парогі судовых інстанцый Вільні і Ліды і дамагаецца свайго — вызваляя Аліндарку з няволі.

У паэме “Кепска будзе!” Ф. Багушэвіч паказвае шлях абуджэння чалавечай годнасці беларускага сялянства. Людзі, якія жылі на гэтай зямлі без свайго імя, пачынаюць шукаць і знаходзіць яго, пачынаюць усведамляць сваё чалавечае “я”, сцвярджае паэт. Бяздольны, пазбаўлены чалавечых правоў, Аліндарка не страціў сваіх лепшых якасцей, добрых намераў. Хлопец вырас працавітым, кемлівым, з чулай душой. Жыццёвыя нягоды не зламалі героя, а, наадварот, загартавалі яго характар. Калі асэсар зневажае яго і б’е па твары айчыма, Аліндарка паводзіць сябе смела і рашуча. Ён дае належны адпор крыўдзіцелю, узяўшы яго загрудк і пхнуўшы лбом у дзверы.

У астрозе Аліндарка сваімі вачыма бачыць здзекі і глумленні з людзей, часта ні ў чым не вінаватых. Ён спачувае ім, жадае хутчэйшага вызвалення. Турэмнае зняволенне, зняважлівыя адносіны да Аліндаркі турэмшчыкаў яшчэ больш развілі ў ім імкненне да свабоды. Птушка, нагадвае герой твора, каб не быць у няволі, б’ецца ў клетцы галоўкай, пакуль не заб’ецца; лоўленая лісіца распорвае сабе чэрава, каб памерці, а не жыць у няволі; нават змяя-мядзянка, зачыненая ў шкляным посудзе, будзе джаліць сябе, пакуль не загіне. І таму свабода для Аліндаркі раўнацэнна жыццю. “Тут, здаецца, і сканаў бы, за свабоду жыццё б даў бы!” — усклікае ён.

Расказваючы пра цяжкі лёс Аліндаркі, Ф. Багушэвіч паказвае невыносныя ўмовы жыцця беларускага народа, вострую нянавісць яго да прыгнятальнікаў, абуджэнне пачуцця чалавечай годнасці, смеласці і свабодалюбства. Такім людзям будзе кепска да той пары,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сцвярджае паэт, пакуль яны не募 пераадолеюць сваёй патрыярхальнасці і не пачнуць актыўна змагацца з несправядлівасцю і прыгнётам.

## 30

## “НЕ Я ПЯЮ — НАРОД БОЖЫ” (ТВОРЧАСЦЬ ЯНКІ ЛУЧЫНЫ)

Нядоўгім, але творча насычаным было жыццё Янкі Лучыны. Пісаць ён пачаў рана, яшчэ ў дзевяцігадовым узросце, у час навучання ў прыватным пансіёне. Першы верш, “Не дзеля славы ...”, напісаны па-руску, носіць дэкларатыўны характар. Аўтар гаворыць, што ўсё жыццё ён будзе служыць “стране глухой, забитой, где мрак невежества царит, в лачуге где, соломой крытой, мужик печально дни влачит.” Аб паэтычных і эстэтычных прыярытэтах Я. Лучыны можна меркаваць па яго перакладах з польскай мовы, у прыватнасці, па перакладзе верша Ул. Сыракомлі “Не я пяю — народ божы...”. Пісьменнік адкрыта заяўляе, што сваёй творчасцю ён выказвае спрадвечныя мары і спадзяванні народа, што яго творчасць — гэта голас цёмнага і прыгнечанага народа:

З ім я зліўся з добрай волі,
Чы то ў долі, чы ў нядолі,
Чы гдзе гора абзавецца,
Як асіна, грудзь трасецца.

Творчасць Я. Лучыны на трох мовах выконвала ролю своеасаблівай пасярэдніцы ў польска-рускім літаратурным дыялогу, адлюстроўвала розныя аспекты беларускай рэчаіснасці канца 19-га ст. Калі ў польска- і рускамоўных вершах паэт застаецца традыцыяналістам, то ў сваёй беларускамоўнай творчасці ён з”яўляецца наватарам. Адметнасць беларускіх вершаў Я. Лучыны ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тым, што яны ўяўляюць сабою вынік удалага перапляцення рэалістычнага і рамантычнага пачаткаў. І гэта невыпадкова, бо напрыканцы 19-га ст. ў рускай літаратуры была моцнай рэалістычная, а ў польскай — рамантычная плыні. У беларускай жа літаратуры Я. Лучына заслужана лічыцца пачынальнікам філасофскай лірыкі

Беларускія вершы Я. Лучыны выйшлі асобным зборнікам (“Вязанка,1903) ужо пасля яго смерці. Тэматыка творчасці пісьменніка не вызначаецца асаблівай шырынёй: гэта пераважна жыццё беларускай вёскі. Галоўным героем звычайна з”яўляецца просты селянін — найбольш варты, на думку аўтара, прадстаўнік роднай зямлі і носьбіт высокіх маральных якасцей. З асаблівай любоўю і лірызмам піша пра яго паэт у вершы “Што думае Янка, везучы дровы ў горад”. Аўтар па-мастацку тонка і выверана перадае трывожны ўнутраны стан героя, яго перажыванні за свой лёс і крыўду на жыццё, у якім “усюды песні і гулянкі”, адзін толькі ён вымушаны ехаць прадаваць дровы ў горад, каб купіць трохі жыта. Рамантызм Я. Лучыны, спалучаны з рэалістычным адлюстраваннем жыцця, надае значную адметнасць, у параўнанні з польскамоўнай спадчынай, такім яго беларускім вершам, як “Сівер”,”Вясна” і “Роднай старонцы”. Жыццё сялян параўноўваецца ў гэтых творах з лютай зімой, якая ніяк не хоча саступаць месца вясне. Так, звяртаючыся да сіверу, галоўны герой верша ўсклікае:

Хоць бы раз без цябе зарунець бы палям,  
Хоць бы раз у свой час адышла бы зіма!  
Ўстрапянуўся бы дух ў чалавечай грудзі,  
Дый забылі бы мы мора смутку дый слёз...

Такім чынам, перамены да лепшага звязваюцца з надыходам вясны, якая асацыіруецца са светлай зарой, пасля ўзыходу якое

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

селяніна спаткае шчаслівая доля. Паэт непахісна верыць у надыход такога часу. Аб гэтым сведчыць і яго прасякнуты аптымізмам верш “Роднай старонцы”:

І будуць жыці дзеткі патомныя
Добраю доляй — доляй шчасліваю.

Я. Лучына не прызнаваў капіталістычных адносін у грамадстве, але верыў, тым не менш, у тэхнічны прагрэс, народжаны капіталізмам. Не прымаў паэт таксама і спажывецкіх настрояў у адносінах да прыроды. Таму цалкам заканамерным было з’яўленне польскамоўнай паэмы Я. Лучыны “Паляўнічыя замалёўкі”. Галоўны герой паэмы, Грышка, “дзіця прыроды вольнага Палесся” жыве ў гармоніі з прыродай і людзьмі, таму ён балюча ўспрымае ідэю аб пракладцы чыгункі праз запаветныя лясы. Паэма, у якой паказаны жыццё і побыт леснiковай сям”і, з”явілася своеасаблівым прадвесцем “Новай зямлі” Я.Коласа.

Я. Лучына не толькі паэт, але і аўтар двух нарысаў, драматычнага абразка І шматлікіх перакладаў твораў Ул . Сыракомлі, М. Някрасава, Г. Гейне, Гамера. Яго творчасць адыграла значную ролю ў паглыбленні лірызму нацыянальнай паэзіі, яе гуманістычнага пафасу і аптымістычнага погляду ў будучыню.

**31**

## РЭВАЛЮЦЫЙНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ЦЁТКІ

Палымяная творчасць Цёткі пачалася не на голым месцы: яна ўвабрала ў сябе дэмакратычныя ідэі і прынцыпы папярэднікаў, і перш за ўсё Ф. Багушэвіча. Нават назва яе зборніка “Скрыпка беларуская” асацыіруецца з назвамі зборнікаў Ф. Багушэвіча “Дудка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларуская” і “Смык беларускі”. І калі Ф. Багушэвіч хацеў адшукаць “такой вадзіцы ды з такой крыніцы, што як хто нап’ецца, дык вольным стаецца”, то Цётка марыць “зярном пшаніцы ўпасць на ніўкі вёскі, зазалаціцца без мятліцы, даць хлеб смачнейшы трошкі”. Але Цётка, у адрозненне ад Ф. Багушэвіча, жыла ў іншы час. Рэвалюцыя дапамагла таленту паэтэсы адкрыцца перад людзьмі, абудзіла няўрымслівае жаданне данесці праўду да свядомасці працоўных, выказаць яе голасна, ледзь не на ўвесь свет.

Бурлівы, кіпучы 1905 год цалкам захапіў Цётку. “Люблю ўраганы... У буры я адчуваю рай”, — прызнаецца паэтэса. Раз’юшанай марской стыхіяй здаецца ёй рэвалюцыя ў вершы “Мора” (яго падзагаловак — “Рэвалюцыя народная”). Шырокае, неабсяжнае мора становіцца неспакойным. Грыміць гром — і хвалі ўспененага мора ўздымаюцца да неба, рвуць берагі, змываюць векавыя горы і скалы.

Мора вуглем цяпер стала,
Мора з дна цяпер гарыць,
Мора скалы пазрывала,
Мора хоча горы змыць.

Раз’юшаная стыхія на моры — гэта барацьба паўстаўшых мас супраць самаўладства. І ніхто не можа стаць папярок народнаму гневу, які, як мора, крышыць і змятае на сваім шляху ўсё гнілое, старое, струхлелае. У такой бясстрашнай барацьбе нараджаюцца героі-гіганты, для якіх лепш загінуць, чым адступіць, здацца.

Такі бой вякамі жджэцца,
Такі бой гігантаў дасць,
У такім бою толькі грэцца,
У такім бою толькі пасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Паэзія Цёткі, якую можна ўпэўнена назваць летапісам рэвалюцыі 1905 г., уздымала рэвалюцыйны дух народа, паказвала сілу і моц працоўнага чалавека, які яшчэ так нядаўна пакорліва цярпеў прыніжэнне і прыгнёт. У вершы "Вера беларуса" паэтэса сцвярджае, што беларускі народ стаіць на парозе сваёй свабоды, што яшчэ адзін націск — і падуць ланцугі.

Веру, братцы: людзьмі станем,
Хутка скончым мы свой сон;
На свет Божы шырай глянем,
Век напіша нам закон.

Магутнасць народа яна параўноўвае з каменем, з жалезам, а душу яго — з дынамітам, якому дастаткова адной іскрынкі, каб узарваць і знішчыць ненавісны лад. Верш, поўны аптымізму і веры ў народную сілу, напісаны ў канцы 1905 г., калі рэвалюцыйны рух быў на ўздыме, і Цётка кідала свае вершы ў полымя рэвалюцыі, каб вышэй і ярчэй яно разгаралася.

Цяпер, братцы, мы з граніту,
Душа наша з дынаміту,
Рука цвёрда, грудзь акута,
Пара, братцы, парваць пута!

Асаблівым рэвалюцыйным запалам вызначаецца верш "Хрэст на свабоду", які апявае саму рэвалюцыю і адлюстроўвае падзеі крывавай нядзелі 9 студзеня. Расстрэл мірнай дэманстрацыі паказаў, што цар і самадзяржаўе з'яўляюцца галоўнымі ворагамі народа. Верш расказвае і пра бясслаўную руска-японскую вайну, у якой па віне цара "кроў ракамі льецца ў мора, салдат гіне там ад гора без кашулі і без хлеба". Разбуджаны расстрэлам студзеньскай дэманстрацыі, працоўны люд уздымаецца на барацьбу і патрабуе знішчэння "бюракратаў", антыхрыстаў, павешання цара. Сваёй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палітычнай накіраванасцю, выкрывальным пафасам верш “Хрэст на свабоду” нагадвае паэтычную лістоўку (пракламацыю), што заклікала да ўсенароднага паўстання супраць цара і самадзяржаўя.

Цётка добра разумела, што ў барацьбе з царызмам працоўныя Беларусі не павінны быць ізаляванымі, што дабіцца перамогі можна толькі ў еднасці з іншымі народамі. У вершы “Суседзям у няволі” паэтэса звяртаецца да брацкіх народаў, якія таксама пакутуюць у няволі, з заклікам узняцца на барацьбу супраць прыгнятальнікаў:

Мы вам родны. Праўду знайце:
Ці у долі, ці ў нядолі —
З вамі станем ў адным полі,
Рука ў руку з вашым братам,
За свабоду перад катам.

Дванаццаць гадоў пісала Цётка, пакінуўшы нам каля чатырох дзесяткаў вершаў і некалькі апавяданняў. Здавалася б, нямнога. Але гэтыя творы, у якіх сплавілася жыццё творцы з жыццём народа, заклікалі беларусаў да змагання, паказвалі шлях да лепшай долі.

## 32

## ТЭМА РЭВАЛЮЦЫІ Ў АПАВЯДАННІ ЦЁТКІ “ПРЫСЯГА НАД КРЫВАВЫМІ РАЗОРАМІ”

На золаку ХХ ст., калі Расію ўскалыхнулі хвалі першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, на Беларусі цвёрда і ўпэўнена, паэтычна натхнёна загучаў голас Цёткі. Паэтэса-рэвалюцыянерка, асветніца, рэдактар, настаўніца, публіцыст, вучоны, медыцынскі работнік — такую жанчыну падарыла беларускаму народу эпоха рэвалюцыйных бітваў. Цётка быццам знарок была народжана для такога бурлівага часу, які стаў для яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

творчасці зорным. Паэтэса адкрывае новую старонку ў беларускай літаратуры — старонку мужнасці і барацьбы.

Талент палымянай рэвалюцыянеркі выявіўся не толькі ў паэзіі, але і прозе (пераважна ў жанры апавядання). Першым празаічным творам Цёткі з'яўляецца алегарычнае апавяданне “Прысяга над крывавымі разорамі”. Гэта невялічкая замалёўка з жыцця беднага і гаротнага селяніна Мацея нагадвае пракламацыю з выразна акрэсленай рэвалюцыйнай ідэяй — патрабаваннем права на зямлю і волю.

Экспазіцыя апавядання даволі лаканічная. Стары, слабы, змучаны цяжкай працай і нястачай Мацей павінен працаваць на полі, бо болей няма каму. Тры сыны Мацея разляцеліся, як птушкі, па свеце: адзін наняўся парабкам, другі стаў рабочым, трэцяга забралі ў войска. І прыходзіцца старому чалавеку, хвораму і нямогламу, апрацоўваць сваю зямлю самому. А яшчэ ж трэба адправіць доўг: “Мардасовічу — за лён, Бізуноўскаму — за пашу, а там і за бульбу плужы і плужы штодзень на адработках”. Змарыўся Мацей, прылёг адпачыць і заснуў. І сніцца яму, што на яго палосцы “сабралася моц народу” (і маладыя, і старыя, і мужчыны, і жанчыны, і дзеці) і ўсе крычаць: “Вузка! Цесна! Мала!” Беднякі з натоўпу ставяць пытанне: “А скуль узяць? Скуль дастаць?” І ў адказ ім чуюцца галасы: “Глядзіце, во прасторы! Во нівы, лясы, палі! Усё гэта наша!” Сусед жа Мацея Астап запалохвае: “Не дадуць: то казённае, дворнае, — ні я, ні вы не маеце права... Не дадуць, паб'юць...” Сярод натоўпу бачыць Мацей і трох сваіх сыноў, якія становяцца на калені і прысягаюць: “Мы дамо! Мы — сіла! Мы — права!” Тры браты, якія сімвалізуюць адзінства рабочых, сялян і салдат, здольны дабіцца свабоды свайму народу, даць зямлю беззямельным. Сон Мацея —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

не проста яго спрадвечная мара аб зямлі, не проста яго гора і боль, а папярэджанне аб вялікай крыві, якая пральецца на гэтай зямлі.

Апавяданне заканчваецца сімвалічна: “Разоры стаяць поўны крыві, а над імі вісяць тры скрыжаваныя далоні...” Цётка паказвае гэтым, што дарагой цаной прыйдзецца плаціць за зямлю і волю, што гэта барацьба патрабуе адзінства і згуртаванасці. Гісторыя пацвердзіла гэта. Змест твора супадае з сённяшнімі рэаліямі. Нам, беларусам, адзінства і згуртаванасць неабходны, як сонца і паветра. Любую бяду лягчэй пераносіць разам. Ніхто не дапаможа нам у вырашэнні сацыяльных, эканамічных, экалагічных праблем, калі мы самі, усе разам, не адпаможам сабе. Прыйдзе час, і разоры гісторыі запоўняцца новым сэнсам. І не kроў і слёзы будуць сімвалізаваць гэты час, а ўрадлівая ніва, каласы якой будуць згінацца пад цяжарам зерня.

**33**

**ТЭМА МАСТАКА І МАСТАЦТВА Ў ПАЭМЕ ЯНКІ КУПАЛЫ “КУРГАН”**

Кожны сапраўдны паэт усёй сваёй творчасцю служыць высокім ідэалам мастацтва, якія для яго не штосьці абстрактнае, надуманае, а сродак раскрыцця перад чытачом уласных эстэтычных і маральных перакананняў. Для паэта важна не толькі ў прыгожых вобразах і прыгожымі словамі перадаць думку, пачуццё, але і выказаць сваё стаўленне да пэўнай з’явы, грамадскай падзеі, факта рэчаіснасці. У нашай літаратуры адным з першы, хто найбольш глыбока развіў тэму паэта і паэзіі, узаемаадносін мастака і мастацтва, быў Янка Купала. Гэтай тэме прысвечана і яго паэма “Курган”, якая справядліва лічыцца класічным узорам нацыянальнай герoіка-рамантычнай паэмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У цэнтры ўвагі пісьменніка — паядынак сівога Гусляра з усемагутным князем. Каб пацешыць вяльможных гасцей на вяселлі сваёй дачкі, князь запрасіў вядомага на ўсю ваколіцу Гусляра і паставіў перад ім умову:

Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям —
Поўны гуслі насыплю дукатаў;
Не пад мысль песня будзе каму-небудзь нам —
Канапляную возьмеш заплату.

Гусляр, валадар слова, пастаўлены перад маральным выбарам: або падпарадкавацца дэспатычнай волі князя і гэтым самым паставіць сваю музу на службу разбэшчанай асобе, або прыняць лютую смерць, але застацца самім сабой. Гусляр разумее, што, здрадзіўшы песні, ён страціць сэнс свайго існавання як мастака, што гэтая духоўная смерць для яго будзе значна страшнейшай, чым смерць фізічная. Таму ён, добра ведаючы жорсткасць і дэспатычнасць князя, адмаўляецца іграць песню-пацеху для магната і яго п’янай хеўры, бо мастацтва ў яго разуменні — не пацеха, а сэнс жыцця. “Гуслям, княжа, не пішуць законаў: небу справу здае сэрца, думка мая сонцу, зорам, арлам толькі роўна”, — такі адказ дае музыка князю. У гэтым учынку выявіліся бескампраміснасць, самаахвярнасць Гусляра, магутнасць яго духу, сіла перакананняў і непадкупнасць таленту. Замест услаўлення магната ён выконвае праўдзівую песню-праклён, якая расказала пра бясчынствы пана, яго амаральнасць, разбэшчанасць, пра бязмерныя пакуты людзей, іх гнеў і абурэнне супраць прыгнятальнікаў, пра непазбежнасць расплаты.

Пясняр паўстае перад намі як абагульнены вобраз ўсяго прыгнечанага беларускага народа. Аўтар праўдзіва адлюстраваў думкі і памкненні нашых продкаў. Таму постаць Гусляра набывае значэнне вобраза-сімвала, народнага заступніка. Праўдзівая песня

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

напалохала князя: “ён збялеў, ён дрыжыць...”. За невыкананне загаду Гусляр быў закапаны жывым разам з гуслямі. Але ўлада князя аказалася бездапаможнай перад свабоднай і праўдзівай песняй Гусляра, якая назаўсёды засталася жыць у народзе. На месцы магілы музыкі ўзнёсся курган, які засведчыў вечную памяць народа аб сваім заступніку і яго таленце. Такой памяці варты толькі той мастак, які здольны аддаць народу не толькі свае праўдзівыя песні і думы, але і жыццё. Сапраўднае мастацтва, веліч і сіла якога ў праўдзе і непадкупнасці, павінна служыць народу. І толькі ў гушчы народа сапраўдны мастак можа “сэрца мільёнаў падслухаць біцця”, толькі народ можа даць яму моц і нязломную веру ў барацьбе з сіламі зла. Такі мастак бессмяротны, бо ён мае свой працяг у бясконцай гістарычнай памяці людзей. Такая галоўная ідэя твора.

**34**

## МАТЫВЫ ТРАГІЗМУ Ў ДРАМАТЫЧНЫХ ПАЭМАХ ЯНКІ КУПАЛЫ “АДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ” І “СОН НА КУРГАНЕ”

У драматычных паэмах Янкі Купалы “Адвечная песня” і “Сон на кургане” ў найбольш канцэнтраваным выглядзе выявіліся элементы трагічнага: трагедыя духоўна актыўнай і крытычна думаючай асобы, адчужэнне паміж героем і народам, супярэчлівы разлад мары з жыццём, жорсткасць рэчаіснасці, здольнай забіць у чалавеку ўсё чалавечае.

Паэма “Адвечная песня” ў структурным плане складаецца з 12 раздзелаў-праяў, якія даволі поўна раскрываюць жыццё чалавека ад нараджэння да смерці. На хрэсьбіны сялянскага сына злятаюцца цені Жыцця, Долі, Бяды, Холаду і Голаду, якія даюць хлопчыку імя Мужык. Цень Жыцця прарочыць нованароджанаму, што ён стане царом прыроды:

Пад уладай сваёй будзе меці
Як ёсць усё чыста на свеце;
　　Ён будзе ўсіх чыста дужэй,
　　Ён будзе ўсіх чыста мудрэй.
І рэкі, і долы, і горы
Яго будуць слухаць з пакорай.

На самой жа справе лёс чалавека склаўся інакш. Мужык становіцца не царом, а пакутнікам, ахвярай варожых сацыяльных сіл, якія зрабілі яго гаротным, цёмным і бяспраўным. У пошуках кавалка хлеба герой твора ўладкоўваецца на працу ў лесе і там гіне пад спілаванай ім жа сасной. У апошняй сцэне над магілай узнімаецца цень Мужыка, якому хочацца даведацца аб падзеях, што адбыліся пасля яго смерці. Але яго зноў чакае расчараванне: няма "сцежкі к прасвету", усё "чахне без сіл". У такой сітуацыі для Мужыка лепш быць у магіле, чым жыць. І таму ён усклікае: "Раскрыйся нанова магіла: страшней цябе людзі і свет". У паэме, такім чынам, асуджаецца тагачасная рэчаіснасць, дзе чалавеку лепш памерці, чым цягнуць ярмо адвечнай пакуты і прадаўжаць спрадвечна-трагічны кругазварот жыцця.

Галоўным героем паэмы "Сон на кургане" з'яўляецца Сам — рамантычна настроены праўдашукальнік, бунтар-адзіночка, які хоча змяніць, перайначыць жыццё, але не ведае канкрэтных шляхоў да здзяйснення намечанага: "хаджу і блуджу я ўжо колькі гадзін, і, дзе ні ступлю я, не бачу пуцін". Згубіўшы ў лесе дарогу, ён прылёг на кургане. Вакол яго сабраліся русалкі і ў фантастычна-казачным плане паказалі "казку долі" яго. Гэта казка — страшны сон, сімвал безвыходнасці, бездапаможнасці ў барацьбе. Дарэмнымі аказаліся яго імкненні знайсці ў руінах старога замка скарбы. Вакол Сама — змрочныя варожыя сілы (увасабленне рэакцыі), ахвярай якіх ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

становіцца. Дзеянне ў паэме паступова пераходзіць у рэальнае жыццё. Сам накіроўваецца ў родную вёску, дзе здараецца пажар. Ён бег ратаваць ахопленую пажарам вёску, але яго абвінавацілі ў падпале; па сведчанні аднавяскоўцаў, Сам быццам бы бег са смолкай, саломай і сякерай з мэтай падпаліць вёску. Безумоўна, пажар — алегарычны вобраз рэвалюцыі 1905 г. Далейшае жыццё Сама яшчэ больш трагічнае: за рэвалюцыйную дзейнасць ён трапляе ў турму і Сібір, памірае яго жонка, а сын, здрадзіўшы бацькоўскаму запавету, перакідваецца ў варожы стан. На прыкладзе Сама Я. Купала хацеў паказаць не толькі асабістую драму рэвалюцыянера-адраджэнца, але і цяжкі, пакутлівы шлях беларускага народа да свайго самавызначэння, да найвялікшага скарбу — свабоды і незалежнасці.

Паэмы Янкі Купалы “Адвечная песня” і “Сон на кургане” насычаны ўмоўнымі персанажамі, дэманічнымі і міфічнымі фігурамі. Праз, сімвалічныя і фантастычныя карціны паэт паказвае тыпова рамантычную, пазбаўленую гістарычнай канкрэтнасці карціну жыцця ў буржуазным грамадстве з яго бесчалавечнымі, варожымі законамі і парадкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**35**

## УСЛАЎЛЕННЕ НАРОДНАЙ ГЕРАІНІ БАНДАРОЎНЫ Ў АДНАЙМЕННАЙ ПАЭМЕ ЯНКІ КУПАЛЫ

Паэма “Бандароўна” напісана ў 1913 г. па матывах беларускіх і ўкраінскіх народных песень аб Бандароўне і польскім магнаце Патоцкім, пры жыцці якога ў 1768 г. на Украіне ўспыхнула паўстанне пад кіраўніцтвам Максіма Жалезняка і Івана Гонты.

Бандароўна — галоўны герой твора. Гэта надзвычай прыгожая дзяўчына, якой захапляецца сам паэт:

Хараства такога ў свеце
Не было, не будзе;
Аб ёй людзі гаварылі,
Як аб нейкім цудзе.

Гэта пра яе, Бандароўну. Гэта яе губкі параўноўвае Янка Купала з малінай, твар — з лілеяй, косы — з іскрыстасцю брыльянцістых рос, вочы — з зоркамі, ад якіх яснее свет. Сваёй чароўнай прыгажосцю Бандароўна “задзіўляе ўсіх чыста, як зара якая”. Такія ж прыгожыя і ўчынкі дзяўчыны, яе духоўны свет. А якая непакорлівасць, якое свабодалюбства! Як гэтага не хапае цяпер нам, беларусам.

Бандароўна — чалавек непадкупнага сумлення. Для гэтай гордай і свабодалюбівай дзяўчыны самае святое — дзявочы гонар, чалавечая годнасць. Яна больш за ўсё цэніць свабоду і ніколі не стане жыць у няволі. Гэту свабоду яна прадаць не можа. І калі вырашаецца лёс Бандароўны, яна не можа здрадзіць сабе. Гераіня вырашае лепш загінуць, чым паступіцца сваім сумленнем:

Перад панам тым з Канева
Смела дзеўка стала,
Смела гледзячы у вочы,
Смела адказала:
— Не такую, ясны пане,
Бачыш прад сабою,
Што захоча чэсць і славу
Прадаваць з табою.

Адкуль такая сіла, моц Бандароўны? Гераіня сама адказвае так: “За мной праўда і народ мой”. Так, народ са сваімі традыцыямі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сваімі ўяўленнямі аб прыгажосці выхаваў, выпеставаў не адну такую дзяўчыну.

Народ любіць сваю гераіню, яна — яго крывінка, яго дачка. “Уцякай жа за пагодай, донька маладая”, — вучаць дзяўчыну старэйшыя. Яе смерць стала той апошняй кропляй, што перапоўніла чашу народнага цярпення. І народ уздымаецца на помсту за сваю гераіню, якая “налажыла... за ўсіх галавою”. Хаваючы Бандароўну, людзі прыбралі яе, як да шлюбу, у бель і вэлюм, звілі вяночкі з руты-мяты. Белы колер, кветкі руты-мяты — сімвал чысціні дзявочай. Як бачым, не толькі перад  мужнасцю, але і перад гэтай чысцінёй схіліліся галовы людскія.

Ды што людзі. Бандароўнай захапляецца сама прырода. Яна — блізкі сябар і дарадчык дзяўчыны. Прырода раздзяляе разам з гераіняй яе радасці і гора. Уцякае Бандароўна ад панскай пагоні — ночка абдымае яе, вецер расплятае косы, песціць белыя грудзі:

Ночка цёмная глядзела
Ды цямнейшай стала,
Адна зорка мігацела —
І тая прапала.

Асаблівыя адносіны да Бандароўны ў аўтара. Паэт любуецца, захапляецца дзяўчынай, спачувае ёй. Аб гэтым гавораць не толькі прамыя звароты да “галубкі” (так пяшчотна называе яе Я. Купала), але і кожны радок паэмы. Аўтар не проста апісвае знешні выгляд, паводзіны Бандароўны, ён зачараваны ёю. І таму паэт можа казаць толькі так: губкі, ручкі, галоўка, вочкі.

Многія эпітэты, параўнанні, словы-сімвалы запазычаны з вуснай народнай творчасці нездарма. Ніхто не можа лепш ацаніць вартасці чалавека, чым народ. Таму ў паэме жыве і вецер крылаты, і бярозка бела, і рута-мята, і тры таполі. Усё тут працуе на вобраз

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бандароўны, нават вобраз пана Патоцкага. З асаблівай стараннасцю малюе Я. Купала разбэшчанасць, пагардлівасць да людзей пана з Канева, лютасць яго. Ён “ні старому, ні малому не спускае жартаў”. Гэты бязлітасны прыгнятальнік — увасабленне сіл тыраніі, жорсткасці і амаральнасці. Пад яго прыгнётам “стогне змучана Украіна, к небу шле праклящце”. І чым цямнейшыя фарбы выбірае аўтар для стварэння гэтага вобраза, тым вышэй узнімаецца над ім Бандароўна. Сапраўды, прыгажосць асабліва яскрава вылучаецца на фоне пачварнага.

**36**

## ВОБРАЗ СЫМОНА Ў ДРАМЕ Я. КУПАЛЫ “РАСКІДАНАЕ ГНЯЗДО”

Кончылася вечнае начаванне, і
світанне агністае пачынаецца на зямлі
ад краю да краю, ад мора да мора!
*Я.Купала*

Драма “Раскіданае гняздо” напісана Я. Купалам у 1913 г. на аснове фактаў з сям’і дзеда Ануфрыя, у якога князь Радзівіл адабраў зямлю і хату. Асэнсоўваючы сямейную трагедыю як агульнанародную, Я.Купала паказаў у творы цяжкі шлях беларускага сялянства ў пошуках страчанай бацькаўшчыны, зямлі і волі.

Галоўны герой драмы — Сымон, старэйшы сын Зябліказў. Гэта свабодалюбівы, непакорны, моцны духам чалавек. Ён здольны абараніць сваю чалавечую годнасць, заступіцца за іншых. “Свайго ў крыўду не папушчу, хоць бы там свет дагары нагамі перакуліўся”, — гаворыць ён. Зоська і Незнаёмы параўноўваюць яго з вольнай птушкай, магутным арлом: “Птушкаю-арлом быць бы табе і лётаць па паднябессі, як лётае вецер гэты вольны!”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вобраз Сымона пададзены ў развіцці. Спачатку ён, як і яго бацька, спадзяецца на справядлівасць суда і законаў. Упэўнены ў сваёй праваце, ён, калі дваровыя людзі заворваюць пасевы, з сякерай ў руках бароніць сваю зямлю. Як чалавек рашучы, настойлівы і ўпарты, Сымон хоча дабіцца праўды ўласнымі сіламі. На бацькавай магіле ён дае клятву “жывым не сысці з гэтага месца, з гэтага разграбленага гнязда,... хай б’юць, рэжуць, катуюць”. На прапанову маці скарыцца, пайсці да паніча на службу Сымон рашуча адказвае: “Пакарыцца?.. Гэта, мамачка, значыць: прадаць, утапіць сябе, цябе, нас усіх у няволю ім на векі вечныя — запрасіцца ў вечнае рабства, з якога выхаду ніколі не знойдзем ні мы, ні тыя, што пасля нас рабства ў спадчыну атрымаюць”. Прымірыцца з панічом для Сымона — гэта здрадніцтва, адступніцтва. Становіцца зразумелым, чаму герой так строга асуджае Зосю, якая свядома пайшла на сувязь з панічом і аддала сябе на “загубу, на глум вечны”.

Шлях да актыўнай і дзейснай барацьбы Сымон адшукаў не адразу. Пераканаўшыся ў марнасці намаганняў сваімі сіламі дабіцца справядлівасці, Сымон пачынае задумвацца над сэнсам бацькавых слоў, што “трэба розумам ваяваць, а не тапаром”. Пад уплывам перажытага (смерці бацькі, страты зямлі і хаты, ганьбы Зоські), а таксама агітацыі Незнаёмага погляды галоўнага героя драмы на шляхі вызвалення з няволі мяняюцца: “І я розумам буду ваяваць і другіх вучыць да гэтае вайны. Годзе крыўды, годзе няпраўды!” Разам з Незнаёмым ён ідзе “на вялікі сход! Па Бацькаўшчыну!” На гэтым сходзе, па словах Незнаёмага, будзе вырашацца пытанне аб тым, як выгнаць з роднай зямлі сташнага смока-упыра, як далей змагацца за поўнае вызваленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, на прыкладзе Сымона Я. Купала паказаў працэс абуджэння нацыянальнай свядомасці беларускіх сялян, пошукі імі шляхоў да вызвалення. Адшукаць страчаную бацькаўшчыну, вырвацца з-пад прыгнёту і ўціску, здабыць зямлю і волю можна толькі шляхам барацьбы, змагання — такая асноўная думка твора.

**37**

## ВОБРАЗЫ ПАЎЛІНКІ І ПАНА БЫКОЎСКАГА Ў КАМЕДЫІ ЯНКІ КУПАЛЫ “ПАЎЛІНКА”

Паўлінка і пан Быкоўскі з’яўляюцца цэнтральнымі вобразамі камедыі “Паўлінка”. Увесь сюжэт п’есы будуецца на супрауцьпастаўленні і супрацьстаянні гэтых двух герояў. Такі прыём дазволіў аўтару стварыць не толькі каларытныя і запамінальныя вобразы, але і цудоўную, адметную беларускую камедыю.

Паўлінка з’яўляецца ўжо ў першым акце п’есы, і ўсе далейшыя падзеі прама або ўскосна звязаны з ёю. Хаця, зрэшты, яна і ёсць тая прычына, з-за якой пачынаецца ўвесь сыр-бор. Паўлінка — маладая, прыгожая і прывабная сялянская дзяўчына. У потайкі ад бацькі яна сустракаецца са сваім каханым сялянскім хлопцам Якімам, якога яе бацька ненавідзіць за “палітыку”. Для далейшага развіцця п’есы Я. Купала выкарыстоўвае даволі распаўсюджаны літаратурны сюжэт: больш заможны і “радавіты” шляхцюк сватаецца да дзяўчыны, увесь пасаг якой — яе дзявочая прыгажосць, а таму купіць гэты тавар, на яго думку, вельмі лёгка. Звычайна, здавалася б, сюжэт аб няроўным шлюбе аўтар уздымае да ўзроўню нацыянальнай праблемы. За знешняй згодай Паўлінкі з воляю бацькі, які знайшоў жаніха на кірмашы (даволі сімвалічны момант), прыхаваны пратэст дзяўчыны.

Быкоўскі з’яўляецца ў творы толькі ў другой дзеі, на вечарынцы  ў Крыніцкіх, хаця задоўга да з’яўлення героя п’есы

гледач ужо і падрыхтаваны да адпаведнага яго ўспрыняцця (са слоў Паўлінкі і яе бацькі). Быкоўскі, не мае вялікага багацця, добрай адукацыі, але сватаецца да багатай дзяўчыны. Ён са скуры вылузваецца дзеля таго, каб прадэманстраваць перад гасцямі і Паўлінкай сваю "вышэйшасць" і "разумнейшасць". Дзеля гэтага Быкоўскі адкрыта пагарджае ўсім "мужыцкім", асабліва беларускімі песнямі і танцамі. Яму здаецца, што дзяўчына, убачыўшы разумнага, кемлівага і багатага пана, адразу дасць сваю згоду на шлюб. Зрэшты, гэта яго не надта хвалявала, бо бацька Паўлінкі Сцяпан Крыніцкі ўжо загадзя з "зяцем" аб усім дамовіўся. Поўны гонару і фанабэрыстасці, упэўнены ў сабе, не разумеючы камічных сітуацый, у якіх ён аказваецца, паўстае перад намі пан Адольф. Аднак усё гэта падкрэслівае ягоную дурасць і недальнабачнасць. Таму Быкоўскі дасягае сваімі паводзінамі адваротнага выніку: усе героі, за выключэннем Сцяпана Крыніцкага, адкрыта кпяць з яго. Аднак пан Быкоўскі не звяртае на гэта ўвагі і яшчэ з большай сілай спрабуе падкрэсліць сваю "панскасць", ад чаго становіцца яшчэ больш нізкім, нікчэмным, мізэрным. У выніку нават сам Крыніцкі, які хацеў бачыць у ім свайго зяця, з ганьбаю выганяе пана са сваёй хаты.

Паўлінка, пан Быкоўскі — гэта своеасаблівая пара супрацьлеглых герояў, з дапамогай якой аўтар выяўляе два розных падыходы да адвечнага беларускага пытання — пытання "мужыцкасці" і "панскасці, шляхетнасці". Сватанне Быкоўскага выклікае ў Паўлінкі спачатку іронію і смех, а потым, калі ўсім стала зразумела, што за шляхетнасцю і ганарыстасцю пана нічога больш няма, — пагарду. Паўлінка разумее, што не так лёгка перамачы бацькаву волю, калі ісці напралом. Таму яна скарыстоўвае іншы

шлях: спачатку паказвае ўсім, хто такі на самой справе пан Быкоўскі, а потым сама выбірае свой лёс.

Сапраўды, колькі смеху выклікаюць у чытача тыя сцэны, дзе пан Быкоўскі вучыць Паўлінку “панскім” танцам, або дзе пана памылкова прымаюць за выкрадальніка Паўлінкі. У Я. Купалы гэта зусім не смех дзеля смеху. Вобразам Паўлінкі аўтар сцвярджае высокую чалавечую годнасць простых людзей; сцвярджае, што шляхетнасць — гэта стан душы чалавека, які не атрымаеш у спадчыну разам з родавым маёнткам.

П’еса, напісаная на пачатку ХХ ст., ужо мела сваіх папярэднікаў. “Быкоўскія” свайго часу востра крытыкаваліся ў “Пінскай шляхце” В. Дуніна-Марцінкевіча, “Модным шляхцюку” К. Каганца. Я. Купала ў вобразе Быкоўскага змог настолькі ўдала акумуляваць і сінтэзаваць адмоўныя рысы літаратурных герояў ранейшых твораў, што вобраз Адольфа Быкоўскага стаў сімвалічным, а яго прозвішча і імя ператварылася з уласнага ў агульнае, назыўное.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 38

## ТЭМА БЕЛАРУСІ Ў ЛІРЫЦЫ Я. КУПАЛЫ ПЕРШАГА ПАСЛЯРЭВАЛЮЦЫЙНАГА ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

*Я. Купала*

Тэма Беларусі з’яўляецца асноўнай у творчасці Я. Купалы першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя. Бацькоўская зямля, родны край,

яго веліч і краса, жальба і смутак, яго мінулае, сучаснае і будучае заусёды хвалявалі паэта.

Першае паслярэвалюцыйнае дзесяцігодддзе — складаны для паэта перыяд. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г., нямецкая і польская акупацыі, утварэнне БНР, БССР, Літоўска-Беларускай ССР і іншыя падзеі не маглі не паўплываць на творчасць Я. Купалы. Прымаючы рэвалюцыю з народных, дэмакратычных пазіцый, паэт не поўнасцю
разумеў яе сутнасці, асуджаў яе разбуральную і знішчальную сілу, не ўсё ўхваляў у паслярэвалюцыйнай савецкай яве, лічыў Беларусь ахвярай нашэсця чужынцаў. У час, калі пад пагрозай аказалася не толькі духоўнае, але і фізічнае існаванне нацыі, адраджэнская тэма ў творчасці Я. Купалы паступова затухае, адыходзіць на другі план. Бальшавіцкія парадкі не спрыялі творчаму настрою: на працягу 1916 -1917 гг. да восені 1918 г. Я. Купала не напісаў ніводнага верша. Водгукам на падзеі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны з’явіліся вершы, напісаныя толькі ў кастрычніку-снежні 1918 г. ”Я зноў заснуўшую было жалейку бяру і пробую ў ёй галасоў”, — напіша паэт у вершы “Для бацькаўшчыны”.

Многія вершы гэтага перыяду (“Паязджане”, “Буслы”, ”На прызбе”,”Сон”) народжаны канкрэтнымі рэальнымі абставінамі і пранізаны матывамі тугі, трывогі, безвыходнасці, трагізму і нявер’я ў чалавека. З мільёнаў людзей, што апынуліся ў бежанстве, у “злыбядусе”, “бездарожжы, беспрыстанні”, стварыў Я. Купала ўмоўна-абагульнены вобраз “паязджан”. У вершы “Паязджане”аўтар выказвае трывожную думку аб будучым Беларусі, якое ўяўляецца то густым сасоннікам у начной цемры, населеным рознымі пачварамі-зводамі, то завірухай: змораныя, стомленыя людзі кудысьці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

імкнуцца, хочуць чагосьці дасягнуць, а чаго — не разумеюць і не ведаюць:

Як у моры, ў белым снегу,
Без днявання, без начлегу,
Ў бездарожжа, ў беспрыстанне
Едуць, едуць паязджане.
Едуць, едуць,  ані следу,
Ні праслуху, ні прагледу,
Ні прасветку, ні надзеі, —
Ўсё ў  зацьмішчы, ўсё ў завеі.

Паэт, імкнучыся  вытлумачыць многія пытанні далейшага жыцця народа, улоўліваючы эпахальны для Беларусі момант (вызваленне ад нямецкай акупацыі, абвяшчэнне БНР), вялікую надзею ўскладаў на сход (вершы “На сход”,”Час!”). Аўтар, праўда, не дае тлумачэнне, што гэта за сход. Але ён упэўнены, што  на ім народ сам вырашыць, як яму ў далейшым жыць, “як заводзіць” новы лад жыцця. І таму заключныя радкі верша “Час!” уяўляюць сабой заклік:

Гэй, паўстань, народ!
За сябе сам пастаяці
І за Бацькаўшчыну-маці
Йдзі, народ, на сход!

Ідэяй незалежнасці Беларусі прасякнуты вершы“Паўстань...”, “Перад будучыняй”,“Акоў паломаных жандар...”, “Каб...”. У іх выявілася не толькі імкненне паэта да дзяржаўнай незалежнасці, але і гнеўная водпаведзь “ворагам Беларушчыны”, слугам “ацечаства, цара”. Верш “Паўстань...” акрэслівае і канкрэтныя ўмовы незалежнасці — вылучэнне з народа ўласнабеларускіх “прарокаў”, песняроў, воінаў і дзяржаўных дзеячаў (“уладароў”), якія б змаглі аб’яднаць у адну сям’ю Беларусь і абараніць яе ад ворагаў:

Паўстань з народу нашага, Прарок,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Праяваў бураломных варажбіт,
І мудрым словам скінь з народу ўрок,
Якім быў век праз ворагаў спавіт!
Збяры ў адну ўсю Беларусь сям'ю.
Вазьмі з яе прысягу і зарок,
Што не прадасць сябе, сваю зямлю...
Зняць путы бацькаўшчыне ўстань, Прарок!

"Агнём і жалезам куецца моц, гарт, доля і воля народная. Праміне віхор, патухнуць пажары, замрэ свіст меча, і настане светлы, радасны дзень змучанага і аграбленага нашага народа... Зямля, засеяная касцямі сыноў беларускіх, будзе вечна належаць да ўнукаў беларускіх; спаленую хату беларускі мазоль адбудуе, а сваю сяўбу ён сам будзе жаць", — скажа Я. Купала ў прамове, прысвечанай 15-годдзю творчай дзейнасці.

Першы паслярэвалюцыйны зборнік Я. Купалы "Спадчына" адкрываецца вершам з аднайменнай назвай. У ім аўтар выказвае вялікую любоў да роднай старонкі — спадчыны, што засталася нам ад продкаў. Паэт называе яе самым вялікім скарбам, які беларусы павінны зберагчы і захаваць для нашчадкаў. Прыгадваючы родныя мясціны, Я. Купала з хваляваннем успамінае "вясеннія праталіны, і лесу шэлест верасны, і ў полі дуб апалены", "стары амшалы тын", "крык вароніных грамад" на могілках. Усё помніцца яму да дробязей, бо ён і ў думках, і ў снах непарыўна звязаны з бацькоўскай зямлёй:

Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя...
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

Творчая дзейнасць Я. Купалы на пачатку аднаўленчага перыяду

была няпростай. У першай палове 20-х гг. паэт акрылены: усталяваўся мір, Беларусь набыла сваю дзяржаўнасць, у літаратуру ўлілося новае пакаленне, беларуская мова стала мовай справаводства, дзяржаўных і грамадскіх устаноў, пашырыліся межы рэспублікі... З’яўляюцца вершы аптымістычнага плана: “Вяртаюцца з выраю жоравы, гусі” (аб вяртанні беларускіх сыноў да сваёй маці-Айчыны), “Арлянятам” (аб з’яўленні новай літаратурнай змены),”На смерць Сцяпана Булата”, “Цішку Гартнаму”, “Наш летапісец” (у іх услаўляюцца дзяржаўныя і палітычныя дзеячы, вучоныя, журналісты). Радасцю, упэўненасцю ў светлым заўтрашнім дні Беларусі напоўнены многія радкі паэмы “Безназоўнае”:

Беларусь на куце
Ў хаце сваёй села, —
Чарка мёду ў руцэ,
Пазірае смела...

У канцы ж 20-х гг. у творчасці Я. Купалы зноў з’яўляюцца ноткі песімізму і трывогі. Безумоўна, яны былі выкліканы абставінамі таго складанага часу (уступала ў сілу таталітарная сістэма). Падазронасць, недавер, цэнзурныя рэпрэсіі, допыты ў ДПУ давялі паэта да спробы пакончыць жыццё самагубствам. На шчасце, Я. Купала выжыў, каб яшчэ многа чаго расказаць пра Бацькаўшчыну.

Я. Купалу называюць паэтам трагічнага лёсу. Поўнасцю аддадзены беларускаму народу, ён разам з ім выпіў да дна наканаваную лёсам чашу выпрабаванняў і пакут. Яго не палохаў бурны і крывавы паслярэвалюцыйны час. Боль, трывога і клопат аб Беларусі адчуваюцца ва ўсіх творах вернага сына Бацькаўшчыны. Сваёй мужнасцю і сваёй творчасцю Я. Купала паказаў свету, што была, ёсць і будзе жыць Беларусь, што яна смела глядзіць у будучыню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**39**

## ПАКАЗ ТРАГІЧНАГА ЛЁСУ НАРОДНАГА ПАЭТА Ў ПАЭМЕ ЯНКІ КУПАЛЫ “ТАРАСОВА ДОЛЯ”

Па творах Янкі Купалы можна прасачыць яго даўнюю цікавасць да братняга ўкраінскага народа, да яго гісторыі, культуры і літаратуры. Ён славіў шчырую дружбу, якая бярэ пачатак з далёкіх часоў. Паэт добра ведаў творчасць Тараса Шаўчэнкі, перакладаў на беларускую мову многія яго вершы і паэмы, удзельнічаў у рэдагаванні і выданні “Кабзара” на беларускай мове. У 1939 г., у сувязі са 125-годдзем Тараса Шаўчэнкі, Янка Купала напісаў паэму “Тарасова доля”. У аснове сюжэта — трагічнае, поўнае суровых нягод жыццё украінскага песняра.

Нарадзіўся Тарас у цяжкі прыгонны час, калі “зубы скаліла няволя, хахатала гора”. А далей — бязрадаснае дзяцінства, горкія вандраванні па свеце, ссылка ў Орскую крэпасць, забарона пісаць і маляваць, расстанне з каханай Аксанай, цяжкая хвароба і заўчасная смерць. Аднак Тарас не паказаны бяздзейснай ахвярай прыгону. Наадварот, ён — волат духу, чалавек вялікай сілы волі. Нязломны характар у спалучэнні з выключным талентам дапамаглі Тарасу не скарыцца перад жыццёвымі абставінамі, з якіх ён выходзіў годна, дастойна. Паэт верыў у лепшую будучыню народа, заклікаў да яе хутчэйшага набліжэння:

Заклікаў да лепшай долі,
Долі і свабоды,
Клікаў шчасце, клікаў сонца
Для свайго народа.

Яго бунтарскія словы выражалі думкі і мкненні ўсяго ўкраінскага народа, бо

Не танула песня ў моры,

Ў агні не гарэла,
Закаваць не мог у путы
Сатрап азвярэлы.

Праўдзівая песня Тараса Шаўчэнкі знайшла водгук і разуменне ў сэрцах беларусаў,

Бо йшла доля беларуса
З доляй украінца
Адналькова — ў поце, ў слёзах,
Церневым гасцінцам.

Расказваючы пра агульны лёс суседскіх народаў, Я. Купала падкрэслівае і агульнасць паэтычнага лёсу прадстаўнікоў дзвюх нацыянальных літаратур: “я таксама нарадзіўся ў ланцугах пад царам”.

Дакладныя апісанні жыцця і дзейнасці Тараса Шаўчэнкі, пранікнёныя суперажыванні яго лёсу, развражанні аб долі Кабзара і яго народа, шырокія і ёмістыя абагульненні надаюць адметнасць паэме, якая спалучыла ў сабе народна-паэтычныя традыцыі беларускага і ўкраінскага слова. У творы шырока выкарыстоўваюцца шматлікія ўвасабленні, адухаўленні, метафары (“заплакала Ўкраіна”, “гаманіць Дняпро са стэпам”, “не танула песня ў моры”), што збліжае “Тарасову долю” з паэмай “Бандароўна”.

Трагічныя абставіны, у якіх жыў Тарас Шаўчэнка, не перашкодзілі яму стаць бясстрашным абаронцам народных інтарэсаў, уладаром чаруючай песні. Такім уяўляўся Я. Купалу вялікі Кабзар.

**40**

**ТУТЭЙШЫЯ Ў АДНАЙМЕННАЙ ТРАГІКАМЕДЫІ ЯНКІ КУПАЛЫ**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Слова “тутэйшы” ў тлумачальным слоўніку прыводзіцца са значэннем “мясцовы, не прыезджы”. Я. Купала ў вершы “Тутэйшы” (1913 г.) ужывае гэта слова з асуджальна-іранічным адценнем. Тутэйшы — гэта чалавек з недастаткова развітай свядомасцю і нясмелымі палітычнымі імкненнямі, беспрынцыповы, пасіўны, скораны духам. Ён не ведае, што добра, а што дрэнна, не помніць нават, як “завуць” яго родны край:

Вось так не то жыву і не жыву,
Сваім, што бачу, не веру вачам,
Што чую — не бяру у галаву,
І што я знаю — ўжо не знаю сам.

Тутэйшасць, на думку Я. Купалы, з’яўляецца нацыянальнай бядой, з якой трэба змагацца. У п’есе “Тутэйшыя” (1922 г.), якая знаходзілася пад забаронай больш за паўстагоддзе, выявілася вялікая трывога аўтара за духоўную спадчыну беларускага народа, яго нацыянальную свядомасць. Падкрэсліваючы трагедыйны лад п’есы, Я. Купала назваў яе “трагічна-смяшлівымі сцэнамі”.

Падзеі ў п’есе разгортваюцца ў складаны для беларускага народа час — 1918—1920 гг., калі адна акупацыя змянялася другой. Цэнтральнай фігурай у творы з’яўляецца Мікіта Зносак (звычайны выхадзец з вёскі), які пры царызме быў калежскім рэгістратарам — ніжэйшым паводле рангу чыноўнікам. У новых умовах жыцця гэты чалавек забывае сваё паходжанне, мову, радзіму і пачынае жыць па прынцыпе: “Можна мець светапогляд адзін, думаць другое, гаварыць трэцяе, а рабіць чацвёртае”. Таму для Мікіты ўсё роўна, пры якой уладзе ён жыве (польскай, нямецкай, царскай, савецкай), хто ён сам (беларус ці не беларус), абы толькі была ежа, вопратка і добрая служба. Палітычная сітуацыя ўплывае нават на імя галоўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

персанажа, які называе сябе то па-польску (Нікіціуш Знасілоўскі), то па-руску (Никитий Зносилов).

У вобразе галоўнага персанажа Я. Купала ўвасобіў тып нацыянальнага нігіліста, здрадніка. Сапраўднае сваё аблічча Мікіта Зносак выяўляе ў час гутарак з настаўнікам Янкам Здольнікам, якога ён з пагардай называе “панам дырэктарам беларускай басоты”. Зносак адмаўляе ўсё беларускае, калі гаворыць пра “адзіны непадзельны рускі язык”, які б ён “завёў ад Азіі да Аўстраліі, ад Афрыкі да Амэрыкі і ад Смаленску да Бэрліну”.

У п’есе Я. Купала з’едліва і іранічна выкрывае не толькі Зноска, але і іншых тутэйшых: Усходняга і Заходняга вучоных, Спічыні, Насту Пабягунскую, Даму, Папа, Спраўніка, Пана і інш. Вучоныя Усходні і Заходні з’яўляюцца ў п’есе тройчы, у часы крутых паваротаў гісторыі, змены ўлады. Адзін другому яны спрабуюць даказаць, што тэрыторыя Беларусі належыць або да Расіі, або да Польшчы. Згаджаюцца вучоныя толькі ў адным: Беларусь не можа быць самастойнай. Вобразамі вучоных аўтар імкнецца паказаць згубны ўплыў на людзей невуцтва, псеўдавучонасці, нацыянальнага нігілізму.

Усіх герояў мінскай “брахалкі” можна назваць кампаніяй учарашніх гаспадароў жыцця, якіх бурлівыя падзеі выкінулі на сметнік гісторыі. Шукаючы цёплага месца пад сонцам, імкнучыся да асабістай нажывы, яны адракліся ад сваёй мовы, роднай зямлі, нават ад саміх сябе. Такія “тутэйшыя” выклікаюць не толькі насмешку, непрыязнасць, але і жаль, горыч, пакутлівы роздум аб тым, што хвароба “тутэйшасці” не вылечана і сёння. Мы настолькі звыкліся з ёй, што не заўважаем, як ганьбіцца беларуская культуры, забываецца родная мова. Я. Купала ў п’есе як бы прарочыў гэту хваробу і той

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

час, калі зноскі і спічыні стануць прадвызначаць лёс бацькаўшчыны. На шчасце, гэты час мінае. Праўда, і сёння не ўсе нашы сучаснікі змогуць даць адказ на пытанне, якое задаў Я. Купала яшчэ ў 1911 г.:

Прыйдуць людзі з Усходу,
Прыйдуць з Захаду людзі
І спытаюць у нас:
“Скуль, якога вы роду?
Дзе зямля ваша будзе,
Дзе айчызна ў вас?”

Няма “айчызны” ў герояў мінскай “брахалкі”. Няма яе і ў многіх сённяшніх беларусаў. І таму п’еса застаецца надзвычай актуальнай і ў нашы дні. Выкрываючы прыстасавальніцтва, лжывасць, здрадніцтва, псеўдавучонасць, яна вучыць праўдзе, выхоўвае пачуццё нацыянальнай гордасці, высокай чалавечай годнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 41

## ТЭМА ПАЭТА І ПАЭЗІІ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ

Я адплаціў народу,
Чым моц мая магла:
Зваў з путаў на свабоду,
Зваў з цемры да святла.
*Я.Купала*

Практычна ў кожнага паэта і пісьменніка ёсць творы, у якіх выяўляюцца іх погляды на прызначэнне мастака і мастацтва, выказваюцца думкі пра адказную місію паэта быць для народа прарокам, званаром, гусляром... Тэма паэта і паэзіі займае значнае месца і ў творчасці Янкі Купалы.

У адным з ранніх вершаў “Я не паэта” Я. Купала з жалем зазначае, што ў Беларусі, у параўнанні з іншымі краінамі, пакуль

што мала паэтаў, якія б на мове “пагарджанай, убогай” стваралі праўдзівыя творы аб жыцці народа:

А беларусы нікога ж не маюць,
Няхай жа хоць будзе Янка Купала.

Быць выразнікам дум і спадзяванняў народа, змагаром за яго лепшае будучае — справа нялёгкая. І ў вершы “Я не для вас...” Я. Купала сцвярджае думку, што сапраўдны паэт павінен служыць людзям працы, што яго песня, талент і сэрца павінны належаць “бедным і загнаным”:

Я не для вас, паны, о не,
А я для бедных і загнаных,
Я з імі мучуся ўраўне,
Ў адных закут з імі кайданах...

Погляды Я. Купалы на прызначэнне паэта і паэзіі выяўляюцца ў вершах “З кутка жаданняў”, “З маіх песень”, “Не кляніце мяне” і інш. Сваё пяснярскае прызнанне паэт бачыць у служэнні бацькаўшчыне, у праўдзівым паказе народнага жыцця. Грамадзянскі абавязак паэта — шукаць тыя шляхі-дарогі, якія б прывялі народ “к яснаму сонцу”, “к славе”. У вершы “З кутка жаданняў” Я. Купала гаворыць, што ён не жадае гучнай славы. Галоўнае для яго быць праўдзівым выразнікам дум мільёнаў працоўных людзей:

З цэлым народам гутарку весці,
Сэрца мільёнаў падслухаць біцця —
Гэткай шукаю цэлы век чэсці,
Гэта адно мне падпорай жыцця.
Песню стварыці ясну, як неба,
У кожнай з ёй хаце быць мілым гасцём...

Працягам размовы пра месца паэта ў жыцці, пра сутнасць сапраўднай паэзіі з’явіліся вершы “Мая навука”, “Трэба нам песень”, ”За ўсё”. У вершы “Мая навука” Я. Купала сцвярджае, што жыццё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

народа ва ўсіх яго праявах было калыханкай, якая нарадзіла ў паэта самыя светлыя думкі. Песня паэта ўвабрала ў сябе шум адвечнага бору, шэпт спелых пшанічных каласоў, шэлест лісця ўзмежных ігруш і таропкі плюскат вод... Прызнаным майстрам мастацкага слова, на думку Я.Купалы, можа стаць толькі той творца, які ўзгадаваны, успешчаны на нацыянальнай глебе. Асновай і крыніцай творчасці для сапраўднага паэта павінны быць створаныя народам духоўныя каштоўнасці, жыццё людзей, родная мова, прырода. Толькі ў гэтым выпадку паэт можа стаць уладаром беларускай песні.

Сваю ўдзячнасць народу за любоў да паэзіі, “за кут у родным краю, за хлеб-соль без клапот” выказвае пясняр у вершы “За ўсё”. Ён з’яўляецца своеасаблівай справаздачай паэта аб дваццацігадовай творчай дзейнасці. Да гэтага часу яму было прысвоега званне народнага паэта, і Я. Купала, аглядаючыся на пройдзены шлях, піша, што свае песні складаў ён і “сярод крыжоў, магіл”, пісаў не раз “крывёй з сваіх грудзей”, заўсёды быў разам з народам, жыў яго думамі і надзеямі. Былі яго песні невясёлыя, калі бачыў, як зневажаецца мова беларусаў, топчацца іх годнасць. Былі і радасныя песні, калі бачыў паэт, што яго заклікі да лепшай долі, яго праўдзівыя словы былі пачуты людзьмі.

Такім чынам, тэме паэта і паэзіі Я. Купала прысвяціў нямала твораў. Прачытаўшы іх, можна яскрава ўявіць паэта, адданага сына беларускага народа, тварыць для якога — значыць жыць для Бацькаўшчыны, быць непадзельна злітым з ёй, яе болем і радасцю, трывогамі і клопатамі, буднямі і святамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**42**

## АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ І ВОБРАЗЫ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЛІРЫКІ ЯКУБА КОЛАСА

Не пытайце, не прасеце
Светлых песень у мяне,
Бо, як песню заспяваю,
Жаль вам душу скалыхне.
Нешчаслiва наша доля:
Нам нiчога не дала.
Не шукайце кветак ў полi,
Бо вясна к нам не прыйшла.
*Якуб Колас*

Творчасць Якуба Коласа — гэта цэлы свет, свет дзівосны, багаты і непаўторны, у якім месціцца родная зямля, народ, яго жыццё і гісторыя. Багатая і разнастайная спадчына песняра ўвасобіла хараство народнай фантазіі, глыбіню, мудрасць, узвышанасць мар і імкненняў адвечнага працаўніка.

Песню Я. Коласа абудзіла да жыцця рэвалюцыя 1905 г., якая да самых глыбінь ускалыхнула мільённыя масы, узнёсшы на грэбені хваль і сына беларускага народа. Я. Колас, як і Я. Купала, выступае ад імя працоўных мас у якасці абаронцы і выразніка іх імкненняў, ідэалаў. Творчасць Я. Коласа — гэта прадаўжэнне дэмакратычных традыцый беларускай літаратуры мінулай эпохі. Падобна Ф. Багушэвічу, Я. Колас маляваў змрочную, прасякнутую сумам і жальбой карціну жыцця зняважанага і зняволенага мужыка. У яго першым вершы “Наш родны край”, надрукаваным у 1906 г., і ў пазнейшых творах “Вёска”, “Наша сяло”, “Ворагам” створана праўдзівая карціна старой жабрацкай Беларусі. Паэт заклікае бедны народ не гнуцца перад багатымі, не спадзявацца на іх дапамогу, а самому быць кавалём уласнага шчасця. У вершы-закліку “Ворагам”

сялянскі бунтар заклікае да расправы над прыгнятальнікамі, абяцае ім грозны, але справядлівы суд:

Багачы і панства,
Нашы “дабрадзеі”!
Мы на суд вас клічам,
Каты вы, зладзеі!

Галоўным героем паэзіі Я. Коласа з’яўляецца чалавек працы, вольналюбівы “мужык”, які не хоча мірыцца з існуючым ладам, не хоча больш цярпець і пакарацца. Ён хоча карыстацца плёнам сваёй працы, хоча жыць па-чалавечы. У вершы “Мужык”, напісаным у турме, Я. Колас не толькі расказвае пра цяжкае жыццё беларуса-працаўніка, але і заклікае яго да барацьбы за лепшую долю:

Я — мужык, а гонар маю,
Гнуся, але да пары.
Я маўчу, маўчу, трываю,
Але скора загукаю:
“Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!”

Рэальны вобраз беларускага селяніна створаны Я. Коласам у сатырычным вершы “Асадзі назад!” Селянін з сумнай іроніяй, нібы жартуючы, апавядае аб сваёй нялёгкай долі, аб сваім прыгнечаным становішчы. Куды б ён ні пайшоў, што б ні хацеў зрабіць, усюды ён чуе адно і тое ж: “Асадзі назад!” Рэфрэн “Асадзі назад!”, якім заканчваецца кожная страфа, набывае ў вершы розныя сэнсавыя адценні: і спачування, і гневу, і іроніі, і нянавісці да ворагаў. Верш накіраваны супраць бюракратычных парадкаў Расіі, супраць гвалтоўніцтва паліцэйскіх, разгулу рэакцыі. Селянін з’яўляецца не толькі ахвярай паліцэйскіх здзекаў, але і барацьбітом за сваю свабоду. “Узбунтаваўшы” народ, ён не адракаецца ад сваіх слоў, смела глядзіць праўдзе ў вочы, здольны на далейшую барацьбу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Верай у народ, у яго светлае будучае прасякнуты верш "Не бядуй!". Напісаны ў часы рэакцыі (пасля паражэння рэвалюцыі 1905 г.), ён заклікаў простых людзей не паддавацца роспачы, не траціць надзеі на прыход светлага дня свабоды. Я. Колас упэўнены, што на змену халоднай зіме прыйдзе сонечная вясна вызвалення, што прыгнечанне, несправядлівасць, панаванне рэакцыі хутка скончацца:

Дымам пойдзе ўсё ліхое,
Ўсё, што душыць нас і гне,
Вер, брат, — жыцце залатое
Будзе ў нашай старане.

Паэзія Я. Коласа была паэзіяй тугі і смутку. Невыпадкова свой першы зборнік вершаў паэт назваў "Песні жальбы". У ім многа лірычных, шчырых вершаў пра бацькаўшчыну, пра "забыты богам край". У вершы "Родныя вобразы" Я. Колас звяртаецца да роднага краю і да самога сябе з пытаннем-роздумам, якая сіла прываблівае яго да бацькоўскай зямлі, чаму напаўняецца яго сэрца смуткам і радасцю:

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я
К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя сумнай красы?

Цудоўныя беларускія мясціны выклікаюць у паэта не толькі радасць і замілаванне, але і сум. У гомане спелай нівы, у шуме-гудзе высокага лесу, у ціхай жальбе палёў паэт чуе "песні цягучыя, песні пакутныя" простых людзей працы. Яго сэрца баліць за прыгнечаны народ, зняволеную радзіму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тужлівы боль чуецца ў радках вершаў Я. Коласа пра родную старонку, пра жыццё вёскі і яе людзей. Сіратліва выглядаюць скрыўленыя хаткі, сумныя вербы, могілкі з пахіленымі крыжамі, вузкія сцежкі:

Край наш родны, бедна поле!
Ты глядзіш, як сірата,
Сумны ты, як наша доля,
Як ты, наша цемната.
*("Наш родны край")*

Сумам вее і ад верша "Маці", у якім Я. Колас расказвае пра цяжкі лёс жанчыны. Многа гора спазнала яна за сваё жыццё: смерць мужа-батрака, заключэнне ў астрог сына, беззямелле, голад і холад. У зімовую ноч, калі "вецер вые за вугламі, у коміне галосіць", "вербы плачуць", "глуха лес гамоніць", маці ўспамінае мінулае жыццё, у якім больш было гора і слёз, чым радасці. Паказваючы бязрадасную карціну сялянскага жыцця, моц мацярынскага цярпення, Я. Колас прымушае задумацца над прычынамі пакут простых людзей.

У Я. Коласа нямала вершаў, прысвечаных тэме паэта і паэзіі ("Песняру", "Дудка", "Родныя песні", "Не пытайце, не прасеце"). У іх аўтар патрабуе ад мастакоў слова быць выразнікамі дум і жаданняў народа, смела раскрываць праўду жыцця, пісаць узнёсла і ўсхвалявана. Паэзія, на думку Я. Коласа, — гэта зброя, якая павінна дапамагаць у барацьбе за перабудову жыцця. У вершы "Песняру" сілу і моц паэтычнага слова аўтар параўноўвае з магутнасцю прыродных сіл, з маланкай, з перуном:

Заспявай жа ты песню такую,
Каб маланкай жахала яна
І паліла нядолю людскую,
Каб грымела, як гнеў перуна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Такім чынам, асноўнымі тэмамі ў дарэвалюцыйнай лірыцы Якуба Коласа з’яўляюцца тэма Беларусі, роднага краю, красы роднай прыроды, сялянскага жыцця, цяжкай паднявольнай працы. Вершы паэта ўвабралі ў сябе надзеі і спадзяванні простых людзей, іх імкненне да свабоды і шчасця. Яны з’яўляюцца своеасаблівым гімнам у гонар чалавека працы, мастацкім выяўленнем рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый аўтара.

**43**

## ПАЭМА ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ” — ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСТВА Ў ДАРЭВАЛЮЦЫЙНЫ ЧАС

Энцыклапедыяй называюць навуковае даведачнае выданне ў выглядзе слоўніка, дзе звычайна даюцца асноўныя звесткі па ўсіх або па асобных галінах ведаў. “Новую зямлю” Я. Коласа справядліва называюць энцыклапедыяй жыцця беларускага сялянства канца XIX—пачатку XX ст. І невыпадкова. Паэма — вялікі эпічны твор аб гістарычным лёсе беларускага сялянства і пошуках ім шляхоў да светлай будучыні. Паэт расказвае аб усім, чым багатае і цікавае жыццё сялян: аб клопатах і занятках дарослых, аб забаўках дзяцей і іх вучобе, аб святочных днях і буднях, ясных летніх днях і ціхіх зімовых вечарах, калі дарослые пры дзецях “пачнуць казаць свае ўспамінкі, вясці размовы пра старынкі”. Успомнім, напрыклад, раздзелы “Раніца ў нядзельку”, “Падгляд пчол”, дзе аўтар па-майстэрску апісвае святочную раніцу працоўнага селяніна і снеданне сям’і Міхала. Яда ў сялянскай хаце — цэлы абрад са строга ўстаноўленымі правіламі і парадкам. За сталом збіраліся абавязкова ўсе члены сям’і:

Чатыры хлопцы, тры дзяўчаці
Ды бацька з дзядзькам, трэцця маці...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кожны меў сваё пастаяннае месца. На покуць звычайна саджалі пачэснага госця. Малыя дзеці, якія яшчэ не ведалі парадку, елі асобна. Там Юзік "пальцам поркаў страву і верашчакай мазаў лаву, а сёстры дужа сердавалі і за лаб Юзіка цягалі". За сталом жа, дзе сядзелі дарослыя, панавала цішыня і парадак, адчувалася павага да ўсяго таго, што знаходзілася на стале, як да здабытага цяжкай працай.

Працай былі запоўнены будні сялян. Працавалі і дарослыя, і дзеці. Міхал выконваў абавязкі лесніка, Антось "правіў гаспадарку", усю хатнюю работу выконвала Ганна — жонка Міхала. Я. Колас паказвае працэс ворыва, сяўбы, жніва, малацьбы. У час жніва калектыўная праца становіцца крыніцай прыгожага, напаўняе душу сялян радасцю, прыносіць ім задавальненне. Паэт можа расказаць цэлую гісторыю пра стары дзедаў човен, пра тое, як трэба ўмела выбраць касу. Апісанне касьбы — гэта цэлы гімн у гонар чалавека працы. Касцы параўноўваюцца з "ваякамі", якія ідуць, "нібы ў атаку", то "грамадою, то шнурам цягнуць, чарадою, то паасобку, то па пары". У паэме апісваюцца і прылады працы, створаныя ўмелымі рукамі (сярпок крывенькі, граблі, навой), і сялянская хата, гумно, павець. Я. Колас ведае, як звіваецца пчаліны рой і як яго трэба абіраць, як трэба слаць снапы на таку, каб было зручна малаціць. Аўтар услаўляе працоўную сілу народа, цяжкую сялянскую працу паказвае як штосьці велічнае і прыгожае, паэтызуе яе.

З энцыклапедычнай шырынёй апісвае Я. Колас звычаі і абрады, якія бытавалі ў той час на Беларусі. Гэта каляндарныя святы (Куцця, Вялікдзень, Каляды), звычаі ўзаемадапамогі (талака, кумаванне), кірмашы, сход. Я. Колас прыгадвае ўсе калядныя стравы, якімі частаваліся людзі, расказвае пра парадак іх ужывання і з чаго яны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

былі падрыхтаваны. Асобна гаворачы пра куццю, паэт успамінае і пра народныя прыкметы: снег на куццю — грыбы на лета..., а сцежкі чорны — ягад многа. На першы дзень Каляд збіралі сена са стала і кармілі жывёлу, шукалі ў сене зярняткі і па іх гадалі, ці ўродзіцца хлеб. Каляндарныя святы — даніна даўнім традыцыям і звычаям, што звязаны са светам сялянскіх уяўленняў і прынцыпаў.

Па-энцыклапедычнаму шырока апісвае Я. Колас сваю родную зямлю-маці. Апяваючы знаёмыя яму з дзяцінства мясціны, ён паказвае, наколькі прыгожая наша зямля і як многа хараства і паэзіі ў яе сціплых краявідах. Чаргуюцца дні і ночы, за зімамі ідуць вёсны, птушкі прылятаюць з выраю і зноў ляцяць у цёплыя краіны, ідуць дажджы, гуляюць завірухі, разліваюцца і замярзаюць рэкі — пра ўсё гэта расказваецца ў паэме. У вобразах роднага краю Я. Колас заўсёды чэрпаў натхненне і сілу. Ды хараство роднай прыроды выклікае ў паэта не толькі радасць і захапленне, але і смутак. Яго сэрца баліць за бяспраўнага, прыгнечанага і зняважанага селяніна. З паэмы мы ўяўляем яго знешні выгляд, у што ён быў апрануты, што еў і піў, аб чым марыў, на што спадзяваўся і ў што верыў. Працоўнаму чалавеку, які паўстае ў паэме ва ўсёй велічы, аддае Я. Колас усе сілы, сваю любоў і свой талент. Яму ён прысвячае і свой лепшы твор — паэму “Новая зямля”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 44

## ЖЫЦЦЁВАЯ ДАРОГА МІХАЛА (ПАЭМА ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ”)

... Маё апавяданне
Жыцця адбітак, разважання,
Нязжыты след прасцяцкай долі,
Адвечны водгук праўды, волі.

*Якуб Колас*

Паэма Я. Коласа “Новая зямля” — вяршыня паэтычнага майстэрства песняра. Працаваў над ёй аўтар больш за дванаццаць гадоў: паэма была пачата ў 1910 г., а апошні раздзел — трагічная развязка — напісаны ў 1923 г. З аповесці аб жыцці адной леснiковай сям’і паэма перарастае ў вялікі твор аб жыцці беларускага сялянства ў канцы XIX ст. (яго быце, звычаях, беззямеллі, збядненні, пошуках кавалка хлеба на панскай службе, яго абуджэнні і ўсведамленні сваёй чалавечай годнасці). Праблемы зямлі і волі з’яўляюцца асноўнымі ў творы.

Галоўны герой паэмы — Міхал. Беззямелле і галеча прымушаюць яго “вандраваць”у жыцці: “хадзіў на сплаў ён, на віціны, разоў са два хадзіў у Прусы”, а пасля наняўся лесніком да князя Радзівіла.
Міхал працуе не шкадуючы сіл, здароўя. Ён ахоўвае лес, даглядае за статкам, “правіць”сенакосы, “ставіць” рабочых, выконвае шматлікія загады і даручэнні пана ляснічага. У працы ён знаходзіць задавальненне, верыць у яе як аснову жыцця і дабрабыту, спадзяецца сваімі рукамі здабыць сваё шчасце. Дзякуючы руплівай і стараннай працы , неабжытыя і занядбалыя куткі, у якіх апынаецца герой паэмы, становяцца ўтульнымі і квітнеючымі:

Ўсё зацвіло, загаманіла,
Бы жыватворная тут сіла
Ад сну прыроду абудзіла.

Міхал — чалавек клапатлівы, спагадлівы. Ён верны муж і патрабавальны бацька. Шчыра любячы дзяцей, ён часам сур’ёзна ставіцца да іх. Наймаючы “дарэктара”, Міхал спадзяецца: “а вось мо’ з меншых што і будзе, няхай яны ўжо йдуць у людзі”. Герой твора чула адносіцца да брата Антося і разам з ім любіць пажартаваць, павесяліцца, падзяліцца земляробчай мудрасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Працуючы ў Радзівіла, Міхал сутыкаецца з жорсткімі і няўмольнымі законамі, якім трэба падпарадкоўвацца працоўнаму чалавеку. Служба ставіць яго ў поўную залежнасць ад волі пана ляснічага. Прыгнёт, знявага, прыніжэнне, лаянка, пагрозы, варожыя адносіны сялян — усё гэта цяжкім грузам кладзецца на душу Міхала. Героя не задавальняюць умовы жыцця і працы, і ён шукае выйсця з цяжкага паднявольнага становішча.

А дзе ж той выхад? дзе збавенне
З няволі цяжкай, з паланення?
Адзін ён ёсць: зямля,зямля,
Свой пэўны кут, свая ралля:
То — наймацнейшая аснова
І жыцця першая умова.
Зямля не зменіць і не здрадзіць,
Зямля паможа і дарадзіць.

Вызваліцца з-пад улады пана, стаць свабодным, на думку Міхала, можна шляхам набыцця зямлі:

Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,
Каб з панскіх выпутацца пут,
І там зажыць сабе нанова:
Свая зямля — вось што аснова!

Думка аб зямлі свяціла Міхалу “зоркай яснай” у самыя змрочныя дні, надаючы сэнс яго жыццю. Зямля ва ўяўленні Міхала — “аснова ўсёй айчыне”, надзея на вызваленне “з няволі цяжкай, з паланення”, “промень волі і свабоды”. Стаць гаспадаром на сваёй зямлі — значыць стаць распарадчыкам свайго лёсу:

Свая зямля, свая пасада!
Ці ёсць мацнейшая прынада?

Мара Міхала аб зямлі высакародная, узвышаная. Гэта не дробнаўласніцкі разлік (як раней лічылася ў літаратурнай крытыцы),

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а спроба духоўнага разняволення, самасцвярджэння асобы. Зямля павінна належаць таму, хто на ёй працуе. Галоўны герой хоча быць гаспадаром на сваёй зямлі. І калі б так стала, Міхал здабыў бы свабоду, незалежнасць, дабрабыт, адчуў бы асалоду вольнай працы. Але мара аб набыцці зямлі аказалася неажыццявімай, ілюзорнай. Міхал памірае з надзеяй, што Антось прадоўжыць пачатую ім справу:

Вядзі ж ты, рэй, вядзі...адзін...
Як лепшы брат, як родны сын.
Бог не судзіў мне бачыць волі
І кідаць зерні ў свае ролі...

Лёс Міхала з пункту гледжання сённяшняга дня ўспрымаецца з болем і трывогай. Я. Колас нібы прадчуваў трагічнасць шляху беларускага селяніна да сваёй зямлі. І рэальнае жыццё паказала, што справа Міхала не магла быць прадоўжана. Масавая калектывізацыя канца 20 — пачатку 30 -ых гадоў, якая нібы ратавала селяніна ад беднасці і забяспечвала шчаслівую будучыню, разбурыла сялянскія ідэалы і тым самым пацвердзіла марнасць шляху Міхала (і ўсяго сялянства) да зямлі. Мара Міхала аб уласнай зямлі ў паэме становіцца бяскрылай, пераўтвараецца ў ідэю без будучыні.

Паэма Я. Коласа “Новая зямля”, напісаная даўно, гучыць надзённа і сёння. Яна вучыць паважаць працу хлебароба, якая з’яўляецца не толькі крыніцай дабрабыту, але і асновай фарміравання вышэйшых маральных норм і якасцей чалавека.

**45**

## ВОБРАЗ ДЗЯДЗЬКІ АНТОСЯ Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ”

Адным з прыцягальных і захапляльных вобразаў паэмы “Новая зямля” з’яўляецца вобраз дзядзькі Антося. Дзядзька Антось

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— увасабленне сілы і таленту простых людзей з народа. Вызначальнымі яго рысамі з’яўляюцца бязмежная дабрыня, спагадлівасць, шчырасць, ветлівасць, дапытлівасць, лёгкая іронія ў стаўленні да жыццёвых праяў. Яны раскрываюцца ва ўчынках, паводзінах героя і нават яго партрэтнай характарыстыцы:

Ён невысок, не надта ёмак,
Ды карчавіты і няўломак,
А волас мае цёмна-русы,
І зухаўскія яго вусы
У меру доўгі, густаваты,
Угору чуць канцы падняты;
А вочы шэры, невялічкі,
Глядзяць прыветна, як сунічкі,
Але раптоўна і адразу
Не расчытаеш іх выразу:
То смех, то хітрасць з іх бліскае,
То дабрата, але якая!

Антось — камунікабельны, цікаўны да ўсяго чалавек. Варта прыгадаць ягоныя мімалётныя знаёмствы з “вакзальным сторажам” са Стоўбцаў або з Грышкам Верасам з Вільні, які, як і дзядзька, гатовы дапамагчы незнаёмаму чалавеку ў бядзе. Асабістае жыццё дзядзькі Антося склалася не вельмі ўдала: не знайшлося “ні ўдоўкі-любкі, ні дзяўчыны, каб палучыць дзве палавіны, каб разам шчасце здабываць і поруч долю падзяляць”. Наста, якую шчыра кахаў, здрадзіла яму і выйшла замуж за другога. Аднак Антось не замкнуўся ў сабе, не ачарсцвеў да людзей, не стаў ссохлай галінай на дрэве жыцця Наадварот, ён, як ніхто іншы з герояў паэмы, цікавіцца жыццём ва ўсіх яго праявах. Больш за тое, ён зрабіўся найлепшым прыяцелем братавых дзяцей, якія, адчуваючы дзядзькаву дабрыню, шчырасць і павагу да іх, цягнуцца да яго з усёй сваёй дзіцячай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

непасрэднасцю. Дзядзька Антось для дзяцей — самы галоўны дарадца, суддзя і настаўнік, які вучыць іх разумець вялікую, таямнічую і прыгожую кнігу прыроды. Калі ж Антось часам і спрачаўся з дзецьмі, то “як роўны з роўнымі трымаўся”. Ды і сама Антосева натура чымсьці яшчэ па-дзіцячы наіўная і шчырая.

Дзядзька Антось ахвярны чалавек, які ўмее жыць дзеля іншых. Фактычна на ягоных плячах ляжыць уся братава гаспадарка і выхаванне дзяцей. Але нават і пробліску незадаволенасці не выказвае герой твора. Праца для яго — такая ж натуральная з’ява, як штодзённы ўзыход сонца. Праца корміць Антося і дае яму сілу і натхненне. Таму ён “заложна і цярпліва ў зямлю ўкладваў свае сілы”, таму

Што ні замысліць, то ўсё зробіць,
І так прыгоніць, так аздобіць,
Што і для вока нават міла.
І ўсё выразна гаварыла,
Што ён не толькі гаспадар,
Але й прыроджаны штукар,
Якіх на свеце не так многа.

Антось паўстае перад намі як чалавек чулай і шырокай душы, які жыве ў міры і згодзе з людзьмі і прыродай. Калі ён трапляе ў Вільню, то шумны і мітуслівы горад выклікае ў ім пачуццё нейкай варожасці, разгубленасці і бездапаможнасці. Яму, які ні хвіліны ў жыцці не прасядзеў склаўшы рукі, гарадскі “вэрхал” здаецца непатрэбным. Яшчэ больш узрастае ў ім гэта пачуццё пасля знаёмства з бессаромнымі чыноўнікамі ў зямельным банку. І на чыноўніцкую пагарду да простага чалавека, хай сабе і ў думках, ён

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адказвае панам сваёй пагардай: “Няхай цябе водзяць сляпога, як водзіш ты за нос другога”.

Горад з яго вузкімі і крывымі вулкамі, грукатам, мітуснёй, адсутнасцю прыветлівых твараў і пагардаю панства да простага чалавека выклікаў у дзядзькі Антося моцны выбух злосці. Аднак той жа Антось, гледзячы на горад з замкавай гары, любуецца яго забудовай, але ж найбольш раздоллем далёкіх палёў, палоскамі нівак. І ў гэтым — уся вольналюбівая натура Антося: горад, штучнае ўтварэнне, бянтэжыць яго, бо абмяжоўвае “палёт думак”. Антось жа прывык да “палёў, задумаю спавітых”, дзе адчуваў сябе гаспадаром. І наўрад ці атрымаўся б вобраз Антося такім жывым і праўдзівым, калі б герой быў паказаны ў няспыннай сялянскай працы. Старонкі паэмы, прысвечаныя дзядзьку Антосю, як і тыя раздзелы, дзе свет паказваецца ва ўспрыняцці дзяцей, — адны з самых запамінальных і прачулых.

**46**

**НЕЗАБЫЎНЫ СВЕТ МАЛЕНСТВА (ДЗЕЦІ Ў “НОВАЙ ЗЯМЛІ” ЯКУБА КОЛАСА)**

Вобразам дзяцей у паэме Якуба Коласа “Новая зямля” ўдзяляецца значная ўвага. Разам з вобразам дзядзькі яны ўтвараюць непарыўнае, арганічнае адзінства. Я. Колас з вялікім майстэрствам апавядае аб гульнях, забавах і псіхалогіі дзяцей, аб асаблівасцях успрымання і разумення імі свету. Прычым гэтае светаразуменне, дзякуючы вобразам Юзіка, Алеся і Уладзі прасочваецца ад ранняга дзяцінства да часу юнацкага сталення. З дапамогай дзіцячых вобразаў паэт гаворыць пра тое, што дзяцінсва — гэта самадастатковае цэласнае быццё, поўнае суцэльнай радасці, бесклапотнасці і светлых настрояў. Так, кажучы пра Юзіка, Колас

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

піша: “А гэты Юзік-шаляніца, Малы яшчэ, зусім дурніца, Так пад нагамі і таўчэцца”. Больш сур’ёзным малюецца Кастусь: “Ну ты, Кастусь, чытаці любіш? — дарэктар Кастуся пытае... — Люблю, але яшчэ не ўмею”. Не далёка ад яго адышоўся і Алесь: “Што напішу, — такі пісака, — Не расчытае і сабака”.

Але не варта ўспрымаць дзяцей як нейкіх наіўных істот, якіх цікавяць толькі гульні ды забавы. Проста яны больш шчыра і адкрыта, у параўнанні з дарослымі, успрымаюць акаляючы свет. І, між іншым, часам не горш за іх разумеюць, “як тут зрабіць і што парадзіць”. Гэтаму спрыяла тое, што дзеці з малых год прывучаліся да працы і вучыліся яе шанаваць і любіць, бо яна часам ператваралася для іх у цікавы і пазнавальны працэс. Дзеці выхоўваліся ў вялікай сям”і і бачылі, якой цяжкай сялянскай працай здабываецца штодзённы хлеб. З ранніх год у чыстыя дзіцячыя душы закладвалася высокая народнаяч мараль, у іх выпрацоўваліся такія якасці, як непрыманне спажывецкіх адносін да жыцця, пачуццё адказнасці за даручаную справу, гонар за сваіх родных,  павага да ўстаноўленага продкамі ладу жыцця, чуласць у адносінах да ўсіх членаў сям”і. Бавячы час ля дарослых, занятых працай, дзеці вучыліся мудрасці жыцця. спасцігалі сакрэты працоўнага майстэрства. Вось як, напрыклад, Кастусь мацуе лядок:

І вось тут Костусь прыпыніўся.
На лёд глядзіць, штось разважае
І ў ход тапорык ён пускае.

Значную ролю ў фарміраванні характару, светапогляду дзяцей адыгрывае дзядзька Антось — прыроджаны весялун, штукар і жартаўнік. З-за ягонай “нестандартнасці” цягнуцца да яго дзеці: “Дык і не дзіва, што любілі, што на руках яго насілі”. З дапамогаю дзядзькі дзеці ператвараюць многія эпізоды паэмы ў камічныя

прадстаўленні. Прыгадаем апісанне паводзін дзяцей за нядзельным сталом:

...Юзік пальцам поркаў страву
І верашчакай мазаў лаву,
Але тут сёстры сердавалі
І залаб Юзіка цягалі.
Тады іх згода прападала —
Між імі бойка вынікала.

Можна прыгадаць таксама эпізоды, якія расказваюць пра “рамонт” дзедавага чоўна, пра “гучнае” паляванне на зайцоў або пра гатаванне клёцак на бярозавым соку. Я. Колас спецыяльна не апісвае дзяцей у штодзённых, шэрых сітуацыях. Гэтым ён хоча вылучыць тое, што з’яўляецца самым галоўным у дзяцінстве — няспынны працэс адкрыцця свету, адчуванне радасці ад гэтага, займальнасць гульняў і забаваў. Аўтар дае дзецям шырокую прастору для развіцця творчай думкі, для імправізацыі і рэалізацыі самых “шалёных” задумаў.

Не маючы магчымасці вывучаць навукі ў школе, дзеці з малых год спасцігаюць законы прыроды. Прырода — гэта тая кніга, па якой яны пазнаюць “свет безгранічны і ўласны лёс свой таямнічы”. Свет бачыцца ім у рамантычным святле: вечарамі яны любяць слухаць казкі і розныя здарэнні, “аб кнігах з чорнаю пячаццю, аб чараўніцтве, аб закляцці”. Цікавіць іх літаральна ўсё: таемныя гукі, што даносяцца з Нёмана, падаючыя зоркі, законы прыроды і норавы звяроў. Такая цікаўнасць развівае ў іх дапытлівасць, назіральнасць і абвостранае ўспрыняцце часам звычайных з’яў. Тым больш цікава чытаць раздзел “Начаткі”. Бацька наймае на зіму для Алеся і Кастуся дарэктара — такога ж, як і яны, простага вясковага хлопца, які трошкі лепш за іх умеў чытаць, пісаць і лічыць. Дзеці прывыклі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўсяму вучыцца практычна, таму абстрактная навука не выклікала ў іх вялікага захаплення, таму яны вырашаюць, “што каб палепшылась вучэба, то гэту кнігу знішчыць трэба”. Хлопцам больш важным было “сходзіць у луг на азярыны і патрывожыць род тхарыны”, чым грызці граніт навукі, якой іх вучыў дарэктар з пачатковай адукацыяй. Цікава, што хлопцы прыязна ставяцца да настаўніка як да таварыша па гульнях і забавах, але не як да дарэктара.

Наогул, вобразы дзяцей ажыўляюць паэму, надаюць ёй светлы, радасны настрой адчування свята ад сустрэчы з тым незабыўным і бесклапотным часам, імя якому — дзяцінства.

**47**

## КАРЦІНЫ ПРЫРОДЫ Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ”

Паэму Я. Коласа “Новая зямля” часта называюць энцыклапедыяй сялянскага жыцця. Аднак яе можна назваць і паэтычным гімнам прыродзе, паэтычным календаром прыроды, энцыклапедыяй беларускай прыроды. Якую б “прыродную” назву мы ні далі паэме, адно застаецца несумненным: твор не меў бы той адметнасці, якая яму ўласціва, без тэмы прыроды.

Тэма беларускай прыроды настолькі арганічна ўпісваецца ў паэтычную канву твора, што яе вобразы часам “ажываюць”. Вось перад намі “елка ў пары з хваіною, абняўшысь цесна над вадою, як маладыя ў час кахання, у апошні вечар расставання”, вось “крынічкі вузенькае ложа”, “як неба — лес, як мора — долы”. Чытаючы радкі паэмы, можна ўявіць усход сонца і летнюю раніцу, пачуць буслiны клёкат і спеў жаўрука, пабываць на квітнеючым лузе і пясчаным беразе. У паэме паказана ранняя беларуская вясна, летняя спёка, першыя дні восені, калі з палёў звезены хлеб, скошаны лугі, калі ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чырвань апрануты лес, а ў паветры носяцца ніці белай павуціны. Лютая зіма, што страшыць сваёй суровасцю, вабіць сваёй веліччу, непаўторнасцю:

Ёсць хараство і ў гэтых зімах,
І ў мёртва-белых тых кілімах,
Што віснуць-зззяюць хрусталямі
Над занямелымі лясамі.

Паэт захапляецца бязмежнасцю прыроднай стыхіі, яе магутнасцю і веліччу. Аднак гэтае апісанне-захапленне незаўважна набывае выгляд глыбокага філасофскага роздуму. Усім нам добра вядомыя словы “Мой родны кут!” знаходзяць сваё лагічнае завяршэнне не ў радках “Як ты мне мілы!”, а ва ўсёй паэме. Паэт не выпадкова пачынае твор са звароту да роднага краю і апісання яго прыроды: у гэтым ён знаходзіць натхненне для спакойнага разважання аб вечных таямніцах прыроды і чалавечага быцця. Паэт увесь час параўноўвае жыццё чалавека і жыццё прыроды, паказвае іх цесную сувязь і роднаснасць, падабенства законаў развіцця, сугучнасць прыроды чалавеку. Так, перадаючы прыгнечаны стан чалавека, яго ўнутраны адчай, паэт прыбягае да вобразу цёмнага хваёвага лесу, які стогне пад націскам буры. Затое лёгкі, бадзёры ранішні настрой героя па-майстэрску перадаецца апісаннем роснага летняга лугу. Сумным думкам Міхала аб недасягальнасці жаданай мэты адпавядае змрочная прырода. Хуткай зменлівасцю надвор’я аўтар падрыхтоўвае чытача да ўспрыняцццця хуткіх змен у жыцці герояў. “Прырода... з людзьмі жыве супольна, згодна”, — падкрэслівае гэту думку паэт. І сапраўды, з гэтым нельга не пагадзіцца. Земляробчы каляндар, усе асноўныя гадавыя святы, цяжкая сялянская праца (ворыва, летнія касавічныя клопаты, збор ураджаю) апісваюцца ў паэме на фоне прыроды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У паэме многія з’явы і карціны прыроды паказаны вачамі дзяцей,бо дзеці — больш непасрэдныя ў іх успрыняцці. Незвычайнай любоўю да хараства прыроды вылучаўся Кастусь, які цэлымі днямі мог слухаць спевы птушак, гоман ціхай крынічкі, шэпт траў. У некаторых выпадках аўтар цёпла падсмейваецца са сваіх юных герояў. Дастаткова прыгадаць страхі хлопцаў, звязаныя з незразумелымі начнымі гукамі з боку Нёмана.

Прырода ў паэме набывае характар асаблівага персанажа. Паэт успрымае яе ва ўсіх праявах як адно цэлае, як вялікую і таямнічую кнігу быцця. Гэтак, як адно непарыўнае цэлае, успрымае паэт і людзей, якія не могуць не жыць па законах вялікай і таямнічай кнігі — Прыроды.

**48**

## БЕЛАРУСКІ МУЗЫКА-АРФЕЙ (ПА ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА “СЫМОН-МУЗЫКА”)

Паэма “Сымон-музыка” ў творчасці Якуба Коласа займае адметнае месца. Яна, як і многія іншыя творы беларускіх пісьменнікаў (“Курган” Я. Купалы, “Люцыян Таполя” М. Танка, “Сады вятроў” Я. Пушчы) прысвечана тэме мастака і мастацтва. Гэта глыбокі роздум пра лёс мастака і нацыянальнага мастацтва, праўдзівасць, бессмяротнасць і непадкупнасць народнага мастацтва, пра цярністыя шляхі абуджэння самасвядомасці беларусаў. Сапраўднае мастацтва павінна быць непарыўна звязана з роднай зямлёй і народам, з усім багаццем гукаў і фарбаў навакольнага свету. Ва ўступнай песні да паэмы Я. Колас засвядчае, што яго твор

Ад роднае зямлі, ад гоману бароў,
Ад казак вечароў,
Ад песень дудароў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ад светлых воблікаў закінутых дзяцей,
    Ад шораху начэй,
    Ад тысячы ніцей,

З якіх аснована і выткана жыццё
І злучана быццё і небыццё, —
Збіраўся скарб, струменіўся няспынна,
Вясёлкавым ірдзеннем мне спяваў,
    І выхаду шукаў
    Адбітак родных з'яў
У словах-вобразах, у песнях вольнаплынных.

Галоўным героем твора з'яўляецца музыка-самародак Сымон, на долю якога выпалі цяжкія жыццёвыя выпрабаванні. Ад прыроды гэта быў незвычайных здольнасцей, таленавіты хлапчук, які глыбока ўспрымаў прыроду, адчуваў яе разнастайныя з'явы і змены:

У яго быў свет цікавы,
Свае вобразы, жыццё,
І ў душы яго ўсе з'явы
Сваё мелі адбіццё.

Значны ўплыў на развіццё здольнасцей хлопчыка аказаў дзед Курыла, у якім Сымон адчуў сябра, дарадцу, даверлівага субяседніка. Пасля смерці Курылы Сымону засталіся дзедавы скрыпка і смык. Жыццё ж змянілася карэнным чынам: бацькі жорстка абышліся з ім за тое, што на статак напалі ваўкі і парэзалі авечак. Без віны вінаваты Сымон з болем пакідае бацькоўскі дом, і з гэтага часу пачынаюцца яго цяжкія вандроўкі па свеце. На гэтых складаных жыццёвых дарогах Сымон сустракаецца з рознымі людзьмі (дзедам-жабраком, карчмаром, князем, Якімам, лёкаем Данілам, Ганнай), пазнаў горкі хлеб жабрака, цяжкую працу найміта і панскага служкі. Спасцігаючы людзей і навакольны свет з яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

шматлікімі супярэчнасцямі, Сымон не страціў дапытлівасці і цікавасці да ўсяго, не расставаўся з музыкай, якая ўносіла ў яго жыццё радасць, дазваляла выказаць сваё захапленне прыродай з яе гармоніяй і вечным аднаўленнем, перадаць разнастайную гаму чалавечых пачуццяў. Задумваючыся над сваім прызначэннем і роляй мастацтва ў грамадстве, ён паступова прыходзіць да філасофскага асэнсавання жыцця. На думку героя твора, музыка павінна прыносіць людзям радасць, “палёгку”, дапамагаць ім у пошуках шляхоў да лепшага жыцця, шчасця. І таму ён

Павандруе ў свет з скрыпуляй,
Песні будзе ён складаць,
Ён людзей дабром атуліць,
Каб палёгку людзям даць.

Паэма “Сымон-музыка” з асаблівай яскравасцю адлюстравала псіхалагічны стан Я. Коласа ў першыя паслярэвалюцыйныя гады. Паэт бачыў, што героем часу стаў не спагадлівы, міласэрны, разняволены рэвалюцыяй чалавек, а “асоба з ружжом”, якой зброя замяніла амаль усе законы і маральныя нормы. І таму аўтар як бы выключае героя паэмы з жыцця: Сымон-музыка засынае сімвалічным сном на могілках, дзе пахавана Ганна. У 1923-1924 гг. Я. Колас істотна перапрацаваў паэму. Разгортванне працэсу беларусізацыі дазволіла паэту паверыць у адраджэнне роднага краю, яго мовы і культуры, у магчымасць пабудовы незалежнай Беларусі. Аўтар паэмы абудзіў Сымона ад сну і даў яму магчымасць сваім чароўным граннем вярнуць да жыцця Ганну — жывое ўвасабленне маці-Беларусі. Гэтым паэт хацеў паказаць бязмежныя магчымасці мастацтва. Звязанае сваімі каранямі з народным жыццём, мастацтва можа выратаваць чалавека ад самай цяжкай хваробы, нават вярнуць яму жыццё.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 49

## ДУХОЎНЫ СВЕТ, МАРАЛЬНАЯ ВЫСАКАРОДНАСЦЬ АНДРЭЯ ЛАБАНОВІЧА (ТРЫЛОГІЯ Я.КОЛАСА “НА РОСТАНЯХ”)

Сотні новых, шчаслівых дарог
Рассцілае жыццё прад табою
*Я.Колас*

Трылогія “На ростанях” — самы буйны твор Якуба Коласа. Прачытаўшы назву твора, адразу ўяўляеш постаць вандроўніка, які стаіць на перакрыжаванні дарог і думае, на якую з іх ступіць, каб дайсці да мэты. Ростані для галоўнага героя трылогіі Лабановіча — гэта роздум аб сваім жыцці, пошукі шляхоў да лепшай долі, змена месца жыхарства і адлучэнне ад людзей, якіх ён зведаў і ацаніў, перагляд прывычнага ладу жыцця, праверка сябе. У імя высакароднага служэння народу герой нязменна шукае верную, правільную дарогу. Дзе ж яна, гэта дарога? Пакуль што малады настаўнік не ведае. Ён не толькі ўпэўнены, што яна ёсць: “Шмат на гэтай дарозе ям і калдобін, розных патырчак і злыдняў. Але калі ты чэсны і свядомы чалавек і перад табою паўстаюць цяжкасці, уразумей іх сваім розумам і адчуй сэрцам, не бойся, не адступайся ад праўды і ніколі, ні пры якіх умовах, не пагаджайся з тымі, хто зневажае народ, чыніць здзекі. Не паддавайся ні на якія спакусы і абяцанні, накіраваныя на крыўду народа”.

Я. Колас сутыкае свайго героя з рознымі людзьмі, ставіць у розныя сітуацыі, раскрываючы яго характар, духоўны свет, маральную высакароднасць.

Ужо на першых старонках трылогіі чытаем пра спрэчку Лабановіча з хатовіцкім папом Кірылам аб адносінах да мужыка. На

думку папа, мужык з’яўляецца ніжэйшай істотай, якая сама вінавата ў сваім цяжкім жыцці. Андрэй Лабановіч катэгарычна не згаджаецца з гэтым. Для яго мужык — гэта чалавек працы. У сваёй цёмнасці, забітасці і адсталасці народ не вінаваты. Такім яго зрабіў несправядлівы лад жыцця. І таму Лабановіч горача бярэцца за пашырэнне асветы не толькі сярод дзяцей, але і дарослых.

У сваю першую школу малады настаўнік прыехаў з мэтай быць карысным народу сваёй асветніцкай дзейнасцю. І таму спачатку яго клопатамі былі справы ў школе, якія прыносілі Лабановічу вялікае задавальненне. У адносінах дзяцей і настаўнікаў няма нічога казённага, афіцыйнага. Лабановіч не толькі вучыць, але і вучыцца сам. У адрозненні ад іншых настаўнікаў ён не саромеўся вучыцца ў простых сялян, пераймаць у іх жыццёвы вопыт. Напрыклад, Аксёна Каля ён не толькі вучыў, але і сам вучыўся ў яго, пачынаў глыбей разумець жыццё і становішча сялян. Як роўны з роўнымі размаўляе ён з непісьменнымі сялянамі, не ганарыцца перад імі, ніколі не крыўдзіць.

Наогул, адносіны героя да людзей характарызуюць яго з самага лепшага боку. Успомнім, напрыклад, цеплыню і клопаты, якімі былі прасякнуты яго адносіны да школьнай старожкі. Шчырае каханне да Ядвісі азарыла першыя жыццёвыя крокі Лабановіча, раскрыла яго багатую натуру. Успамінаючы Ядвісю, ён думае: можа, і лепей, што яны не пажаніліся, бо цяжкую дарогу ён сабе выбраў. І ў гэтай дарозе магла надламацца, не вытрымаць яе цяжару кволая дзяўчына. Сціплы, сумленны і патрабавальны да сябе, Лабановіч надзвычай прынцыповы ў адносінах да панямонскіх інтэлігентаў, якія здрадзілі сваёй справе, духоўна збяднелі, загразлі ў ціне мяшчанства, абывацельшчыны, карцёжных гульняў, п’янак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Бачачы амаральнасць панямонскай інтэлігенцыі, несправядлівасць улад у адносінах да сялян, Лабановіч часта задумваўся над складанымі праблемамі жыцця, ставіў перад сабой спрадвечныя філасофскія пытанні: што такое жыццё? у чым сэнс чалавечага жыцця? у чым прызначэнне асобы як грамадскай адзінкі? Думаючы над гэтымі пытаннямі на працягу ўсёй трылогіі, Лабановіч не знаходзіць пры гэтым поўнага адказу ні на адно з іх. Аднак, нягледзячы на гэта, ён не стаў песімістам, не расчараваўся ў жыцці. Наадварот, ён пачынае ўсведамляць, што для таго, каб здабыць свабоду і шчасце, трэба змяніць увесь лад жыцця. Праўда, як гэта зрабіць, герой твора яшчэ не ведае.

Пасля знаёмства з нелегальнай літаратурай, гутарак з Вольгай Андросавай і Галубовічам усе падзеі сталі ўяўляцца Лабановічу ў новым свеце. Ён адчуў вялікую радасць, што спазнаў тую праўду, якой жыў народ і за якую гінулі ў астрогах і на катаргах лепшыя яго сыны. Ён выходзіць на шлях актыўнай рэвалюцыйнай барацьбы, паступова набліжаецца да сваёй мэты — “намацаць галінамі сонца”.

Адданы справе, сумленны, Лабановіч гатовы пайсці на самаахвяраванне дзеля справы, за якую змагаецца народ. Самаахвярнасць — гэта таксама важная рыса характару, па якой можна меркаваць аб маральных якасцях Лабановіча. Успомнім эпізод, калі Лабановіч стаіць перад царскім судом. Яго абвінавачваюць у напісанні лістоўкі, аўтарам якой з’яўляўся іншы настаўнік. Лабановіч ведае прозвішча гэтага настаўніка, але таварыша па рэвалюцыйнай справе не выдае, хоць гэта каштуе яму трох гадоў турмы.

Лабановіч — чалавек вялікага інтэлекту, здольны радавацца і хваляваацца, адчуваць хараство роднай прыроды. Любоў да прыроды

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

— адна з самых адметных рыс у яго характары. Яму здаецца, што ў залежносці ад яго настрою нібы змяняецца сама прырода. Кожную вясну малады настаўнік адчувае радасць ад вечнага яе абнаўлення.

Складаны шлях прайшоў герой трылогіі Я. Коласа. Часамі ён памыляўся, але ніколі не ішоў на кампраміс са сваім сумленнем. Лабановіч быў мужным і непахісным у час суровых выпрабаванняў, з якіх выйшаў з адзінай думкай: “Чалавек павінен жыць для дабра, ён павінен быць карысным людзям”.

Падзеі, апісаныя ў трылогіі “На ростанях”, далёкія ад нашых дзён, але блізкай, актуальнай сёння з’яўляецца мара Лабановіча аб добраўпарадкаванні зямлі, аб гаспадарскім яе выкарыстанні. Надзённымі з’яўляюцца і клопаты галоўнага героя аб тым, каб было добра людзям, каб яны маглі карыстацца вынікамі ўласнай працы, клопаты пра беларускую мову, якая павінна заняць сваё месца ў жыцці беларусаў, і аб саміх носьбітах гэтай мовы, іх чалавечай годнасці і высокім прызначэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**50**

## СЯЛЯНЕ-ПАЛЕШУКІ І ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ Ў ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА “НА РОСТАНЯХ”

Новым крокам на шляху станаўлення беларускай прозы стала трылогія Я. Коласа “На ростанях”. Гэта першы твор нацыянальнай прозы, у якім адлюстроўваецца жыццё беларускага народа і інтэлігенцыі на пачатку XX ст. Аўтар праз маляўнічыя бытавыя сцэны, народныя легенды і паданні, праз апісанні народных абрадаў і рэлігійных свят стварае карціну народнага жыцця.

Галерэя герояў трылогіі даволі разнастайная. Тут і сяляне: бабка Мар’я, дзед Мікодым, стары Мікіта, Грыгор, Сцяпан Рылка, Бязручка, Цімох Жыга, Аксён Каль, і настаўнікі: Андрэй Лабановіч,

Алесь Садовіч, Янка Тукала, Саханюк, Анцыпік, Шырокі, Турсевіч, і памочнік начальніка раз’езда Сухавараў, пісар Дулеба, старшыня воласці Захар Лемеш, ляснічы Бяляўскі, і “найлепшая палеская кветка” Ядвіся.

Ужо на першых старонках твора мы знаёмімся з палешукамі — людзьмі мудрымі, асцярожнымі і разважлівымі. Прырода быццам наклала свой адбітак на іх характарах: бясконцыя балоты навучылі іх мудраму разважанню, лес выхаваў у іх засцярогу... У вобразах школьных старожак бабкі Мар’і і бабкі Параскі раскрываецца дабрыня, спагадлівасць, чуласць сялянскай душы, неабыякавасць да чужога гора. Старыя палешукі захоўваюць у памяці старажытныя легенды і гістарычныя падзеі. З захапленнем слухае Лабановіч расказ аб старым Грыгоры, які адабраў у мядзведзіцы медзведзяня і прынёс яго з лесу. Легенда пра Яшукову гару гучыць у творы як напамінак пра помсту народа сваім крыўдзіцелям. Уражваюць багатыя назіранні палешукоў над з’явамі прыроды, іх незвычайная мудрасць. Без агранамічнай адукацыі яны ведалі, у які дзень трэба пачынаць ворыва, пры якіх умовах сеяць тую ці іншую збажыну. Я. Колас расказвае аб цяжкіх умовах жыцця палешукоў, іх беднасці, непісьменнасці. Як словы тужлівай песні, льюцца з вуснаў дзядзькі Марціна скаргі га горкую долю працоўнага чалавека: “Няма, брат, простаму чалавеку ні волі, ні разгону”. Аднак гэтыя людзі не страцілі пачуцця чалавечай годнасці, захавалі глыбокую веру ў праўду і справядлівасць. Дзед Мікодым, напрыклад, падтрымлівае ў цельшынцаў веру ў непераможнасць праўды, якую нельга, як скварку ў кашы, з’есці, праглынуць.

Тыповым прадстаўніком найбольш свядомай часткі сялян з’яўляецца ў творы Аксён Каль. Ва ўсім яго абліччы адчуваецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сур’ёзнасць, прыгажосць. Дванаццаць гадоў Аксён вядзе судовую справу з панам Скірмунтам за сялянскія затокі і паплавы. Па гэтай прычыне ў воласці яго лічаць чалавекам неспакойным і небяспечным. Герой твора ўпэўнены ў станоўчым вырашэнні справы, але яшчэ не зусім добра разумее шляхі барацьбы і таму, як і большая частка сялян, верыць у добрага цара. Пад уплывам рэвалюцыйных ідэй таго часу, а таксама гутарак з Лабановічам нязломны праўдашукальнік пазбаўляецца гэтай веры. Ён прымае актыўны ўдзел у барацьбе сялян супраць Скірмунта і ў сутычцы з паліцэйскімі, якіх выслалі для падаўлення сялянскага бунту.

Значнае месца ў трылогіі займаюць прадстаўнікі “крапіўнага насення”, “мёртвых душ”, якія парвалі ўсялякую сувязь з народам, дбаючы толькі аб уласным дабрабыце. Былы прыяцель Лабановіча Турсевіч ператварыўся ў эгаіста, абываценля, паддаўся згубнаму ўплыву “балота”, знайшоў свае палітычныя ідэалы ў кадэцкай думе. Падобны да Турсевіча выганаўскі пісар Дулеба (былы настаўнік), які не пашкадаваў сотні рублёў земскаму начальніку за перавод на пісарскую пасаду. Ён настолькі адышоў ад перадавых ідэй, што ў час рэвалюцыі гатовы быў біць дэмакратаў. Хатовіцкі настаўнік Саханюк свой творчы патэнцыял скіраваў у бок набывання грошай, гаспадаркі, добрага парсючка. Ён не саромеецца браць плату за навучанне дзяцей, за напісанне пісем. Няма ніякіх спраў да жыцця народа і грамадскіх падзей тых часоў начальніку раз’езда Сухавараву, старшыні воласці Захару Лемешу, ляснічаму Бяляўскаму, настаўнікам Анцыпіку, Шырокаму. Жыццёвая філасофія іх заключаецца ў спакойным, ціхім, сытым і ўтульным жыцці-марненні. Кожнаму з іх Я. Колас дае трапную параўнальную характарыстыку. Так, галаву Дулебы пісьменнік параўноўвае з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

павялічанай у разоў дваццаць галавой дзятла, рукі дзяка Бацяноўскага — з вялізнымі лапамі крата, “настаўнік і грамадскі дзеяч” Базыль Трайчанскі нагадвае курыцу, валасны старшыня Язэп Брыль — акулу.

Прадстаўнікам панямонскай інтэлігенцыі ў трылогіі проціпастаўляюцца Андрэй Лабановіч і яго блізкія сябры. Алесь Садовіч і Янка Тукала выйшлі з гушчы народа і рана пазналі ўсе беды працоўнага чалавека. Людзі творчыя па натуры, яны не могуць сядзець склаўшы рукі і назіраць за жыццём збоку. Праўда, не заўсёды знаходзяць яны адказы на многія жыццёвыя пытанні, не ведаюць дакладна, як знайсці выйсце з цяжкага паднявольнага становішча сялян. Янка Тукала параўноўвае сябе і сваіх сяброў з дрэвам, галіны якога гнуцца туды, куды дзьме вецер. Лабановіч, удакладняючы гэта параўнанне, дадае: “Няхай мы — тыя дрэвы ў полі, што стаяць пад ветрам, няхай нахіляюцца галіны ў той бок, адкуль свеціць сонца. Штука ж уся ў тым, як намацаць галінамі гэтае сонца”. Гэтыя словы даюць вобразную характарыстыку прадстаўнікам інтэлігенцыі таго часу, якіх рэвалюцыйная бура раскідала ў розныя бакі. І толькі лепшыя з іх, блукаючы па жыццёвых прасторах, не парвалі сувязі з народам, імкнуліся да праўды, да сонца.

Такім чынам, Якуб Колас праз узаемаадносіны герояў твора і іх лёсы, шляхам апісання бытавых сцэн, народных легендаў, паданняў і рэлігійных свят стварыў маштабную і шырокую карціну жыцця сялян і інтэлігенцыі на пачатку XX ст. Пісьменнік гістарычна праўдзіва паказаў жыццяздольнасць, таленавітасць беларускага народа, адлюстраваў працэс яго абуджэння і змагання за сацыяльную справядлівасць, за будучыню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**51**

## "КАЗКІ ЖЫЦЦЯ" ЛЮДСКОГА... (АЛЕГАРЫЧНЫЯ АПАВЯДАННІ ЯКУБА КОЛАСА)

Значанае месца ў творчасці Якуба Коласа займаюць алегарычныя апавяданні "Казкі жыцця". Яны пашырылі ідэйна-тэматычныя і жанравыя межы беларускай прозы, бо скандэнсавалі ў сабе алегарычнасць і філасофскую мудрасць прытчаў, павучальнасць баек, фантастычнасць казак, вобразнасць фальклорных твораў. Працаваў над гэтымі апавяданнямі пісьменнік практычна ўсё жыццё. Першае з іх ("У балоце") было напісана ў 1908 г., а апошнія ("Адзінокі курган", "Страказа", "Цвіркун") пазначаны 1955 г.

Алегарычныя апавяданні пранізаны мяккім лірызмам, задуменасцю, казачнай загадкавасцю, мудрасцю, роздумам аб чалавеку і яго жыццёвым прызначэнні, сэнсе чалавечага існавання. У іх пісьменнік імкнецца абагульніць разнастайныя жыццёвыя з'явы, раскрыць складанасці навакольнага свету, паказаць адзінства чалавека і прыроды ("Адзінокае дрэва", "Вадаспад", "На чужым грунце", "Камень", "Хмарка", "Тры браты", "Жывая вада"). У казках жывёлы і птушкі размаўляюць чалавечым голасам, дрэвы перамяшчаюцца ў прасторы, рачулкі, хмаркі, камяні, светлячкі жывуць, думаюць, па-філасофску разважаюць. Надзяляючы прыроду рысамі чалавека, Я. Колас у вершы-запеве да казак сцвярджае адзінства чалавека і Сусвету, бясконцасць і непарыўнасць жыцця:

Не ў адной толькі нашай душы
    Зерне ёсць хараства —
Аб ім казку складае ў душы
    Колас нівы, трава.
Не ў адным толькі сэрцы людзей
    Іскра праўды гарыць —

Аб ёй песню пяе салавей,
    Аб ёй рэчка журчыць.
У той песні, шырокай, як свет,
    Чутны ветрык і гром.
Дык прымі ж ты прывет,
    Свет бязмежны, мой дом.

Кожны герой казак стварае пэўны асацыятыўны вобраз, што звязана са шматвяковымі народнымі традыцыямі і ўяўленнямі. Так, дуб сімвалізуе мужнасць, вечнасць жыцця, крумкач — увасабленне чагосьці трагічнага, матыль — легкадумнага, свіння — носьбіт такіх рыс, як абмежаванасць і тупасць. Белая Хмарка, што пакінула свой край і асудзіла тым самым сябе на бадзянне па шырокім свеце, увасабляе людзей "перакаці-поле", якія страцілі свае карані, згубілі бацькаўшчыну. Такіх людзей перасцярагае пісьменнік ў казцы "Крыніца". Пакінуўшы свой край, крыніца вярнулася на радзіму ў вобліку кропелек расы, якія ад прамянёў сонца высыхлі і бясследна зніклі.

Героем навелы "Супраць вады" з'яўляецца стары дзед, які панаваў над усім наваколлем. Адзіным жыццёвым клопатам яго было навядзенне парадку. Таму так пільна ахоўваў ён возера, каб стрымаць, напор яго вады. Дарэмна возера спрабавала пераканаць дзеда, што "трымаць на прывязі" ваду нельга, як нельга стрымаць рух жыцця, развіццё прыроды. Грымнула навальніца — і вада змыла дзеда разам з умацаваннямі. Спыніць развіццё, прагрэс нельга ніякімі сіламі і сродкамі — такую думку праводзіць аўтар навелы.

У пранізаных народнай мудрасцю радках "Казак жыцця" сцвярджаюцца агульнавядомыя і вечныя ісціны, якія ўспрымаюцца як коласаўскія афарызмы: "Лепш быць няшчасным, але відушчым, чымся шчаслівым, ды сляпым"; "Не воля аднаго, а воля ўсіх толькі і

можа мець сілу і права”; “Гэты сум, гэтая туга — адвечныя спадарожнікі тых, хто многа разважае, хто жыве адзін з сабой, а можа і праўда — такое ўжо жыццё, што не дае задавальнення”; “І хто ведае: можа, чым часцей наведваюцца да нас нягоды, тым глыбей пачуванне цаны жыцця, тым ясней яго светлыя моманты”.

Кнігай жыцця называюць коласаўскія алегарычныя апавяданні “Казкі жыцця”. Яны вучаць нас па-філасофску адносіцца да жыцця, прымушаюць выступаць супраць расліннага існавання чалавека, яго бяздзейнасці, духоўнай слепаты, заклікаюць жыць ярка і хвалююча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 52

## НАРОД І РАДЗІМА Ў ЛІРЫЦЫ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

У кожнай літаратуры ёсць паэты і пісьменнікі, якімі ганарацца іх нашчадкі. У беларускай літаратуры такімі былі Янка Купала, Якуб Колас і Максім Багдановіч. Апошняму з іх — М. Багдановічу — лёс адмераў толькі дваццаць пяць вёсен і зім. І за гэты кароткі жыццёвы шлях ён паспеў напісаць “Вянок”, споведзь яго душы. Кветкі, трапятліва сабраныя М. Багдановічам для “Вянка”, не завялі, а, наадварот, вабяць, прыцягваюць да сябе ўсё больш чытачоў.

Так здарылася, што жыць на беларускай зямлі Максіму давялося толькі першыя пяць гадоў. Пасля смерці маці ён быў аддзелены ад гэтай зямлі тысячамі вёрст: жыў у Ніжнім Ноўгарадзе, Яраслаўлі, Ялце. Беларусь паэт уяўляў толькі па легендах, народных павер’ях і паданнях. Любоў да яе была самым трапяткім, самым гарачым пачуццём Багдановіча. Родны край здаваўся яму дзівоснай казкай, поўнай незвычайных таямніц. Але М. Багдановіч добра

ведаў, што ў краіне казачных бароў і пушчаў, азёр і рэк гаруе і пакутуе працоўны народ. Таму так адчайна гучаць яго словы:

Краю мой родны! Як выкляты Богам —
Столькі ты зносіш нядолі.
Хмары, балоты... Над збожжам убогім
Вецер гуляе на волі.

Паэту балюча бачыць бедныя хаткі, убогія палі, абяздоленых людзей. Ён разважае над лёсам свайго народа і радзімы і бачыць прычыну ўсіх няшчасцяў і бед народных у сацыяльнай няроўнасці, драпежніцкай палітыцы прыгнятальнікаў. Так, у вершы “Мяжы” ён гаворыць аб “нязмерных вольных прасторах”, падзеленых межамі, перакапаных канавамі і рвамі. Гэтыя межы створаны з мэтай зрабіць людзей ворагамі, каб адны знемагалі ад сытасці, а другія паміралі з голаду:

Так многа ёсць паўсюль багацтва і красы,
А людзі нішчацца у голадзе, у зморы
Ад беднаты, ад цемнаты,
Бо скрозь — мяжы, бо скрозь — платы.

Але разам з тым паэт бачыць моц і красу беларускай прыроды: бяскрайняе мора збажыны, густыя лясы, духмяныя лугі і палі. Ён чуе, як “дрыжаць ад ветру зоркі”, “расце ў цішы трава”, як “срэбрам грукае крыніца”. Казачнаму беларускаму краю, населенаму лесунамі, вадзянікамі, русалкамі і іншымі міфічнымі істотамі, прысвяціў паэт цыкл вершаў “У зачарованым царстве” (“Вадзянік”, “Лясун”, “Змяіны цар”, “Возера”). У вершах гэтага цыкла спалучыліся вобразы народнай фантазіі і паэтычныя ўяўленні М.Багдановіча, злілася душа паэта з царствам светлай прыроды.

Паэт верыць у сваю радзіму і яе лепшую будучыню. Яна бачыцца яму шчаслівай, светлай, радаснай:

Беларусь, твой народ дачакаецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Залацістага, яснага дня.

Паглядзі, як усход разгараецца,

Сколькі ў хмарках залётных агня...

*(“Беларусь, твой народ дачакаецца...”)*

Верай у гістарычную перспектыву беларускага нацыянальна-вызваленчага руху і лепшую будучыню народа прасякнуты верш “Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...”, дзе аўтар паказаў сябе выдатным майстрам санета. У першых васьмі радках расказваецца пра зярняткі, якія знайшлі ў Егіпце. Яны праляжалі ў магіле некалькі тысяч гадоў, але не загінулі. Жыццёвая сіла іх нібы драмала на працягу многіх стагоддзяў. Трапіўшы ў вільготную глебу, зярняткі далі багатую рунь. У другой частцы санета паэт параўноўвае зерне з беларускім народам, які прыгнечаны, спіць, але і пад прыгнётам захаваў сваю жыццястойкасць. Паэт верыць, што духоўныя сілы народа праб’юцца на шырокую дарогу, пераадолеюць на сваім шляху ўсе перашкоды. Аўтар сцвярджае ідэю вечнасці, неўміручасці жыцця:

Вось сімвал твой, забыты краю родны!

Зварушаны, нарэшце, дух народны,

Я верую, бясплодна не засне,

А ўперад рынецца, маўляў крыніца,

Каторая магутна, гучна мкне,

Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

Спяшаючыся, прадчуваючы, што вельмі мала часу адмерана яму, каб нязгасна запалаў яго паэтычны талент, М. Багдановіч сеяў промні жыватворнага святла. І самы яркі з іх, які ззяе і праз тры чвэрці стагоддзя, безумоўна, “Пагоня”:

Толькі ў сэрцы трывожным пачую

За краіну радзімую жах, —

Успомню Вострую Браму святую

І ваякаў на грозных канях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Верш народжаны зацяжным і шчымлівым болем паэта за Беларусь. Воіны “Пагоні” — змагары супраць нацыянальнай здрады, супраць нявер’я ў народ. Непераможныя “коні” імчацца з далёкай мінуўшчыны на дапамогу сённяшняму беларусу, каб змог адчуць ён сябе вялікім:

Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Грозны прысуд здраднікам, адшчапенцам, тым, хто выракаецца сваёй бацькаўшчыны, кідае яе, гучыць і ў вершы “Эмігранцкая песня”. У ім расказваецца пра гістарычны лёс Беларусі, якой гандлявалі не толькі чужынцы, але і родныя сыны. Яны адракліся ад веры бацькоў, матчынай мовы, апалячыліся, абруселі. Асуджаючы гэтых людзей, паэт са спачуваннем адносіцца да тых беларусаў, якія па волі лёсу, а не па ўласным жаданні вымушаны былі пакінуць Радзіму. М. Багдановіч спачувае ім, спадзеючыся, што ў шумных замежных гарадах ім будзе “маячыцца” родная вёсачка, рэчка, бацькоўскі дом. Чытаеш апошнія радкі верша, і перад вачамі ўстаюць велічныя постаці Ігнація Дамейкі, Наталлі Арсенневай, Міхася Забэйды-Суміцкага, Ларысы Геніюш, Уладзіміра Жылкі, якія як бы ўсклікаюць:

Не рассталіся б мы з нашым краем,
Каб было дзеля нас у ім хлеба.

З роднай зямлёй, з краем белых буслоў М. Багдановічу па-сапраўднаму давялося сустрэцца толькі ў дваццацігадовым узросце (у 1911 г.). Каля двух месяцаў жыў і працаваў Максім у фальварку Ракуцёўшчына. Тут, па сутнасці, ён па-сапраўднаму адчуў “смак” беларускай мовы, вельмі ахвотна гаварыў на ёй. Праз мову ён пазнаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

душу беларускага народа і на яе высокі, прыгожы лад настроіў сваё маладое сэрца. Вынікамі творчай працы на Беларусі з’явіўся цыкл вершаў “Старая Беларусь”. Сюды ўвайшлі вершы “Летапісец”, “Перапісчык”, “Кніга”, “Слуцкія ткачыхі”, “Безнадзейнасць”, “Ціхі вечар”, “Па ляду, у глухім бары”, у якіх знайшлі сваё паэтычнае адлюстраванне здабыткі нацыянальнай культуры, старажытная гісторыя беларускага народа. Перад намі паўстаюць велічныя вобразы летапісца, што, як “рупная пчала”, хоча данесці да нашчадкаў “усю праўду пра жыццё у наш і пройшлы час, пра войтаў, лаўнікоў, і райцаў, і паспольства, пра розных каралёў, і бітвы, і пасольства”, перапісчыка, які “на чыстым аркушы, прад вузенькім акном, прыгожа літары выводзіць”, Скарыны, які “ў доўгай вопратцы на вежы сочыць зоры”.

Максіма Багдановіча часта называюць зоркай беларускай паэзіі. Яго параўноўваюць з метэарытам, які, згараючы, асвятляе ўсё вакол сябе. “Надтрэснутае сэрца” яго да канца заставалася мужным, гераічным, бо паэт бясконца верыў у народ і родны край. Паэзія вялікага чалавека сагравае і сённяшяе наша жыццё, трывожнае і неспакойнае. Затое заўсёды ціха і спакойна на  могілках у далёкай Ялце, дзе побач з магілай М. Багдановіча растуць два кіпарысы — сімвал вечнай журбы, сімвал вечнай маладосці. І даносіцца адтуль, з пачатку XX стагоддзя, малады і задорны голас М.Багдановіча пра маладосць — самую прыгожую і радасную пару чалавечага жыцця:

Маладыя гады,
Маладыя жадання!
Ні жуды, ні нуды,
Толькі шчасця кахання.
Будзь жа, век малады,
Поўны светлымі днямі!

Пралятайце, гады,

Залатымі агнямі!

**53**

## ЛІРЫКА КАХАННЯ Ў ПАЭЗІІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.

*М. Багдановіч*

Творчасць Максіма Багдановіча — гэта цэлае жыццё. У зборніку "Вянок" выявіліся мары, спадзяванні паэта, яго інтымныя пачуцці, шчырыя прызнанні ў любві да роднай зямлі. Значнае месца ў творчасці паэта займае інтымная лірыка. Каханне — пачуццё бязмернай павагі да жанчыны, выражэнне гуманнасці і высакароднасці чалавека, крыніца яго лепшых імкненняў. У творах М. Багдановіча гэта пачуццё сагрэта асаблівай цеплынёй, шчырасцю.

Сапраўдным паэтычным шэдэўрам інтымнай лірыкі з'яўляецца раманс "Зорка Венера". Ён кранае глыбокай задушэўнасцю, душэўнай чысцінёй, праўдзівасцю выказаных пачуццяў. Лірычны герой твора (юнак) засмучаны тым, што павінен расстацца з любай дзяўчынай. Ён абяцае, што ў далёкім краі, куды едзе, і ўсё сваё жыццё будзе помніць каханую. Пра яе будзе напамінаць і Венера, якой, безумоўна, вядома пра пакуты разлучаных сэрцаў:

Глянь іншы раз на яе, — у расстанні
Там з ёй зліём мы пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншы раз на яе...

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сімвалам кахання ў рамансе выступае Венера. Краса вячэрняга неба, яна настолькі моцна ўплывае на ўнутраны стан чалавека, што можа нават з’яднаць позіркі і пачуцці закаханых людзей, якія знаходзяцца ў расстанні.

Высакароднае пачуццё закаханага, боль ад расстання з любімым чалавекам, прызнанне ў нязменнай адданасці яму па-мастацку дасканала выказаны ў “Трыялеце”, кананічная форма якога патрабавала ад паэта вобразнасці параўнання, далікатнасці, такту:

Мне доўгае расстанне з Вамі
Чарней ад Вашых чорных кос.
Чаму ж нядобры час прынёс
Мне доўгае расстанне з Вамі?

У цыкле вершаў “Мадонны”, прысвечаным Ганне Какуевай, М. Багдановіч увасобіў сваё разуменне вобраза мадонны — ідэала высокай красы, жаноцкасці, хараства, дабрыні і чалавечнасці. Паэт знаходзіць рысы мадонны ў вобліку вясковай васьмігадовай дзяўчынкі (“У вёсцы”) і гераіні вершаванага апавядання “Вераніка”. Паэтычным эпілогам да “Веранікі” з’яўляецца верш “Ізноў пабачыў я сялібы...”, лірычны герой якога вяртаецца ў тыя мясціны, дзе прайшлі яго маладыя гады, дзе пазнаў ён першае каханне. “Там сцены мохам параслі”, у садзе ўсё зарасло травою. І толькі адзіны надпіс “Вераніка”, выразаны калісьці на ліпе, напамінаў аб былым шчасці:

Чым болі сходзіць дзён, начэй,
Тым імя мілае вышэй.

Імя Вераніка (асабліва пасля ўвасаблення верша ў музыцы І. Лучанком і ў вакале “Песнярамі”) стала ў беларускай літаратуры сімвалам чысціні і высокасці кахання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У нізцы вершаў “Каханне і смерць” пераважаюць сумныя, трагічныя ноты пра няшчаснае, згубленае каханне. Яны навеяны хутчэй за ўсё асабістай драмай сям’і Багдановічаў (спачатку смерцю маці, а затым другой бацькавай жонкі, жыццём заплаціўшай за нараджэнне сына). Радасць кахання і пакуты ў вершах гэтага цыкла пастаўлены побач. Аднак каханне — высакароднейшае і наймацнейшае пачуццё — здольна перамагчы нават жах смерці.

Вершы М. Багдановіча пра каханне сцвярджаюць ідэю бессмяротнасці, вечнасці гэтага высокага чалавечага пачуцця, яго вялікую жыццёвую і стваральную сілу. Яны спрыяюць раскрыццю лепшых якасцей чалавека, праяўленню гуманнасці, высакароднасці, садзейнічаюць выхаванню пачуцця павагі да жанчыны, яе хараства, прывабнасці, душэўнай чысціні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 54

## ПАТРЫЯТЫЧНЫ ГІМН БЕЛАРУСІ (“ПАГОНЯ” М. БАГДАНОВІЧА)

Яе так мусіць ашчаджаць і сёння
адважны, годны родны чалавек;
усюды пад спрадвечнаю “Пагоняй”
і наша ніва й песня ажыве.

*Аляксей Русецкі*

У 1913 годзе Максім Багдановіч напісаў верш, якому было наканавана стаць патрыятычным гімнам нашай Бацькаўшчыны. Ён прысвечаны сімвалу адзінства нашай нацыі — старажытнаму гербу “Пагоня”. У ім на лаканічнай мове геральдыкі адлюстравана ўся слаўная і мужная гісторыя беларускага народа.

Упершыню гэты герб паведамляецца ў беларуска-літоўскім летапісе каля 1270 годаю Старажытны славянскі сімвал, які

першапачаткова ўзнік як княжацкі і гарадскі ў Наваградку, хутка стаў гербам Вялікага кгяства Літоўскага. Вось як хораша піша пра гэта М. Багдановіч:

Ў белай пене праносяцца коні, —
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Пагоня невыпадкова набыла для нас, беларусаў, выключнае значэнне: на нашу зямлю часта прыходзілі нязваныя госці, несучы ёй ярмо і разбурэнне, сеючы смерць. Таму яшчэ з часоў Усяслава Чарадзея існаваў такі звычай: пасля нападу ворагаў на паселішча ўсе мужчыны, што маглі трымаць зброю, павінны былі дагнаць ворага і паквітацца з ім за азбітых супляменнікаў. Гэты звычай і меў назву пагоні.

Штуршком, які натхніў паэта на напісанне твора, паслужыла выява “Пагоні”, змешчаная на Вострай Браме ў Вільні :

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, —
Ўспомню вострую браму святую
І ваякаў на грозных канях.

Коннікі імчацца з сівой даўніны на дапамогу сённяшняму беларусу, на барацьбу са здраднікамі, адшчапенцамі, з тымі, хто выракаецца сваёй Айчыны, цураецца роднай мовы:

Бійце ў сэрцы іх — бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць! —

заклікае паэт вершнікаў. Сам вобраз узброенага конніка ўвасабляе нашых мужных і гераічных продкаў, якія крывёю і жыццём заплацілі за свабоду Радзмы. З Пагоняй змагаліся яны супраць Маскоўскай арміі ў 1514 г. пад Оршай, у Грунвальдскай бітве 1410 г. некалькі дзесяткаў харугваў мелі на сваіх штандарах герб пагоні, сімвалам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нацыянальна-вызваленчай барацьбы стала яна ў час паўстання 1863-64 гг.

Заклікаючы да помсты адрачэнцам, паэт усё ж не выключае для іх магчымасці даравання. Але яго можна купіць толькі коштам уласнага жыцця. Лепш памерці за сваю Айчыну, чым быць яе ворагам — такая думка закладзена ў падтэкст наступных слоў, звернутых да Радзімы:

Ты прабач. Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

У заключных радках свайго верша М. Багдановіч выказвае цвёрдую веру ў неперможнасць нацяыянальнага духу, у светлую будучыню свайго народа:

Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Так, у невялікім вершы паэт акумуляваў усё мінулае нашага народа, паказаў, якім шляхам павінна ісці Беларусь да сваёй светлай будучыні. Гэты твор нібы злучае ўсе мінулыя эпохі з нашым сённяшнім днём.Ён заклікае нас быць вернымі сынамі і дочкамі свайго народая, гнаць ворагаў прэч з роднай зямлі і ашчадна захоўваць тую спадчыну, якую пакінулі нам прашчуры і якую павінны мы перадаць сваім нашчадкам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 55

## Творчасць Алеся Гаруна

Ты спевам разбудзіў народ свой напрадвесні,
Якому на алтар свой дыямент прынёс...
Яшчэ акорд не змоўк тваёй прыгожай песні,
Хоць струны абарваў жыцця паганы лёс.

*Міхась Чарот*

Імя Алеся Гаруна доўгі час змоўчвалася. Яго адносілі да ліку нацынальна-дэмакратычных інтэлігентаў, якія пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. і ў час грамадзянскай вайны не здолелі зразумець сутнасці і характару класавай барацьбы, разабрацца ў нацыянальнай палітыцы бальшавікоў, дапамагалі легіёнам Ю. Пілсудскага. Сёння творчая спадчына паэта з’яўляецца аб’ектам пільнай увагі многіх чытачоў, літаратуразнаўцаў, а яго імя па праве займае пачэснае месца побач  з заснавальнікамі сучаснай беларускай літаратуры Янкам Купалам, Якубам Коласам і Максімам Багдановічам.

Друкавацца А. Гарун пачаў у 1907 г. Выступаў з публікацыямі вершаў і апавяданняў у газетах “Наша ніва”, “Беларус”, “Вольная Беларусь”. Пры жыцці выйшлі зборнік паэзіі “Матчын дар” (1918) і кніга дзіцячых п’ес “Жывыя казкі” (1920). У зборнік “Матчын дар” увайшлі вершы,  напісаныя  А. Гаруном у 1907 — 1914 гг. Гэты зборнік, як і “Вянок” М. Багдановіча, з’яўляецца кнігай лёсу паэта. Складаецца ён з трох раздзелаў (“Роднаму краю”, “На чужыне” і ”Прыявы роднага”): першы з другім утвараюць антанімічную (антытэзную)  пару, а  трэці, акумулючы іх асноўны змест, аб’ядноўвае  і як бы завяршае кампазіцыю кнігі. Пачынаецца “Матчын дар” своеасаблівым уступам — вершам “Людзям”, у якім паэт акрэслівае сваю паэтычную праграму і тыя тэмы, што знойдуць далейшае ўвасабленне ў зборніку:

Сваіх тут жменьку я спісаў
Маркотных песняў-дум;
Маёй душы іх сам спяваў
Па краю родны сум.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А. Гарун не ставіць заслону паміж сабой і народам, у жыцці якога бачыць вытокі сваёй творчасці (“дзе сам народ — пясняр”) і дзеля якога будзе тварыць.

Тэма паэта і паэзіі знайшла сваё далейшае вырашэнне ў вершы “Паэту”, які ўяўляе з сябе зварот-просьбу чытача да творцы:

Прашу цябе, спявай аб горы песнь адну ты
І наш гаротны лёс рабі яшчэ цяжэй,
Тады, убачыш сам, парвуцца духа путы
І будзе ясны дзень да нас тагды бліжэй.

Большасць твораў Алесь Гарун напісаў у выгнанні, дзе, па сутнасці, склалася яго творчая індывідуальнасць, выявіўся шматгранны пісьменніцкі талент, прыйшла мастацкая сталаць. У многіх творах пераважаюць сумныя, элегічныя настроі, абумоўленыя трагедыяй жыцця выгнанніка, бязвыхаднасцю свайго паднявольнага становішча, адарванасцю ад бацькоўскай зямлі, беларускага моўнага асяроддзя. “Долі я не бачу, радасці не знаю”, — гэтыя радкі з верша “Матчын дар” можна лічыць лейтматывам песень-дум, песень-жалоб “У выгнанні”, “Журба”, “Восень”, “Навокал”, “Думы ў чужыне”. Але жорсткі лагерны рэжым не змог вытравіць у паэта бязмерную любоў да Бацькаўшчыны, веры ў свой народ:

Ты паўстанеш, працавіты,
Гаратнічы, невымоўны,
Шчасця, долі прагавіты,
Мой сланэчны, мой чароўны!
Будзе час, пабачаць сведкі,
Хоць не мы, дык нашы дзеткі.
*(“Як надарыцца мінута..”)*

Верш “Начныя думкі” з’яўляецца элегічна-ўсхваляваным успамінам паэта пра родны край, ад якога быў адарваны турэмнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кратамі. У думках-снах лірычнага героя выказваецца любоў да Радзімы — казачна-міфічнага, “нязведанага” краю: да “стэпаў з-пад Нёмана”, глухой пушчы, жытняга поля, векавечных курганоў, лясной крынічкі, рэчкі з русалкамі:

Хочацца быць мне ў тым краю нязнаным,
Хочацца край той абняць з прастаты,
Хочацца крыкнуць: гэй, краю каханы,
Будзь мне, як маці, будзь родным мне ты!

Адчуваючы вялікія кантрасты жыцця ў гэтым нязведаным краі (то злосна-хмурлівым, то светлым, як рай, поўным шчасця і адначасова жалю, плачу), лірычны герой твора хоча парваць жалезныя путы і адшукаць купальскую кветку, шлях-гасцінец да шчасця.

Абвостранае пачуццё любові да Бацькаўшчыны, духоўная еднасць з роднай зямлёй, пратэст супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання, заклік да барацьбы адчуваюцца ў вершах “Мілая, родная старонка-маці!..”, “Навука”, “Мае думкі”, “Муляру”. Герой верша “Навука” — настаўнік — дае жыццёвы наказ вучню: у ім ён хоча бачыць змагара, патрыёта, які б змог смела глядзець у вочы праўдзе, з адвагай пайсці “на чэсць і смерць”.

Лірычны герой верша “Муляру” заклікае муляра закончыць складаць каменныя сховы смерці і ісці будаваць іншы мур — новае жыццё. Створаны сілай і розумам многіх людзей, гэты мур будзе нагадваць палац са сценамі, як з крышталю, столлю, як са шкла. Паэтычнымі радкамі верша паэт заклікаў да чалавечага братства, роўнасці, свабоды:

Мур вялікі, вольнай волі,
Мур высокі да нябёс,
Мур братэрства, роўнай долі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мур для радасці без слёз...

Асаблівае значэнне ў нацыянальным адраджэнні А. Гарун надаваў мове, у якой бачыў адну з галоўных прыкмет самастойнасці і цывілізацыі нацыі. Услаўленне роднай мовы ён лічыць адным са сродкам абароны правоў беларускага народа:

Хвала табе! О, дарагая!
О, беларуска проста мова!
Што сон магільны прарываеш,
Нясеш нам знак на жыцце нова!
Хвала табе! Вяліку справу
Спраўляеш ты між нас сярод,
Адвечнай кормячы нас стравай,
Даеш салодкі жыцця мёд.
*(Гімн роднай мове")*

У вершы "Песня-звон" паэт называе родную мову магучым бліскучым звонам, які "з срэбра літы, з злота збіты". І гэты звон павінен дапамагчы званару ў справе абуджэння народа, гусляру (песняру) — у справе праўдзівага паказу жыцця чалавека, спынення "жалю" (гора, галечы, беднасці).

У вершы "Ты мой брат, каго зваць Беларусам..." А. Гарун сцвярджае, што не можа бясследна загінуць той народ (нават калі яго абрабавалі, адабраўшы "і зямлю, і лясы, і кілімы", пазбавіўшы магчымасці выхоўваць дзяцей), які змог зберагчы родную мову — скарб, што захаваўся ад дзядоў і прадзедаў. У першым і апошнім чатырохрадкоўях гучыць заклік шанаваць, берагчы родную мову:

Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовы сваей не цурайся;
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Многія творы Алеся Гаруна скіраваны ўбок грамадска-палітычнага жыцця, прысвечаны надзённым падзеям тых часоў. У вершах “Праводзіны”, “На варце”, “У чужыне”, “Чалавечая кроў” паэт адгукнуўся на пачатак першай сусветнай вайны. Сцвярджаючы, што ў час войнаў пакутуюць не іх пачынальнікі, а простыя людзі, аўтар выкрывае і асуджае ганебную сутнасць войнаў, паказвае іх бесчалавечны і трагічны характар. У складаных умовах 1917-1920 гг. пісьменнік спрабаваў акрэсліць напрамкі і перспектывы грамадскага развіцця, даць ацэнку дзейнасці палітычным партыям і іх праграмам. У творах гэтага перыяду ўзмацняецца пачуццё трывогі за лёс шматпакутнай Беларусі, гучыць матыў самаахвярнага змагання за родны край, асабістай адказнасці за яго далейшы лёс, вера ў лепшую долю народа. Вершам “Брацця, к агульнаму шчасцю...”, “Кліч” уласцівы дэкларацыі, звароты, заклікі да роўнасці, братэрства, да вызвалення з-пад рабскага духу, на штурм “трона крыўды”, пракляцці тым, “хто свой карк захоча гнуць, й рукі ворагу лізаць, й словы льсцівыя казаць”.

У творчай спадчыне Алеся Гаруна нямала філасофскіх твораў, напоўненых элегічнай танальнасцю, камернасцю (“Nocturno”, “Ідуць гады”, “На смерць”). Лірычны герой гэтых вершаў разважае над глабальнымі праблемамі рэчаіснасці: сэнсам чалавечага жыцця, яго скарацечнасцю, вечным і нястрымным рухам у прыродзе і грамадстве, мэтазгоднасцю чалавечага існавання і інш.

Алесь Гарун унёс значны ўклад у развіццё беларускай прозы і драматургіі. Яго 6 апавяданняў, лірычная легенда “Першы снег”, п’есы для дзіцячага тэатра значна пашырылі ідэйна-тэматычныя і жанравыя формы беларускай літаратуры і яе выяўленча-мастацкія сродкі. У цэнтры апавядання “Пан Шабуневіч” — гісторыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

змагання рамесніка-шаўца (з чыноўніцкім светам, з жонкай-каталічкай) за права карыстацца роднай мовай у штодзённым жыцці, за права звацца беларусамі. У апавяданні “Свята” праз сцэны жыцця палітычнага пасяленца Грыневіча і сібіракоў паказваецца гістарычная сувязь пакаленняў, звязаных рэвалюцыйнымі падзеямі XVIII і XIX ст.

У драматычных творах выявілася багацце творчай фантазіі аўтара, цудоўнае веданне ім народных казачных вобразаў і свету дзіцячых уяўленняў, адчуванне прыгажосці беларускай прыроды. Героем п’есы-казкі для дзяцей “Хлопчык у лесе”, у якой змешчана шмат песень з нотамі, з’яўляецца вясковы Хлопчык. Заблудзіўшысяч ў лесе, ён трапляе ў царства магутнага чараўніка, дзе выратоўвае запалоненых Сялянaчку, Ткачыху і чатырох Папрадух. У казачнай краіне, шлях да якой Хлопчыку дапамаглі знайсці добрыя кветкі, ён дабыў жалейку і ігрой на ёй выгнаў гаспадара зачараванага царства. Праўда, дабро ў п’есе, як і ў большасці казак, перамагаюць, і Хлопчык знаходзіць сваю маці і атрымлівае цудоўныя падарункі: боты-скараходы, шапку-цемязень, незвычайную вопратку, залаты клубок і жалейку.

Творчасць Алеся Гаруна — яркая старонка ў гісторыі беларускай літаратуры. М. Багдановіч яшчэ ў 1913 г. у артыкуле “За тры гады: Агляд беларускай краснай пісьменнасці 1911 — 1913 гг.” пісаў, што “лёгкасць і мілазычнасць верша, рупная шліфоўка яго, новае і вельмі пекнае счэпліванне рыфм — усё гэта дужа аздабляе яго /А. Гаруна/ паэзію. У дзе-якіх творах спатыкаецца сіла і сціснутасць мовы. Глаўна ж тое, што пры ўсім гэтым А. Гарун ні да каго іншага не падобны, што ён не зрабіўся нічыім “падгалоскам”. Гэта зарука, што нашы надзеі на яго талент не пойдуць намарна”. І

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сапраўды, А. Гарун цалкам спраўдзіў надзеі М. Багдановіча. Творы пісьменніка, які “народу на алтар свой дыямент прынёс”, займаюць пачэснае месца побач з творамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча.

## 56

## “У ВАСКРОСШУЮ ВЕРЫЦЬ КРАІНУ...” (ТВОРЧАСЦЬ ЦІШКІ ГАРТНАГА)

Мой верш — мая душа
І думка шчырая мая!
У кожным слове маё я.
Мой верш — мая душа.
*Ц. Гартны*

Цішка Гартны ўвайшоў у гісторыю беларускай літаратуры як актыўны творца і наватар, пачынальнік буйной беларускай прозы, адкрывальнік рабочай тэматыкі. Дарэвалюцыйныя вершы навеяны ідэямі нацыянальнага адраджэння, рэвалюцыйна-вызваленчым рухам. Некаторым з іх уласціва лозунгавасць, абстрактнае ўхваленне перамогі рэвалюцыі. У вершы “Роднай краіне” паэт стварыў вобраз роднага краю, дзе “раскінуліся шэрыя вёскі” са старажытнымі курганамі, “Дзвіна й чысты Нёман... свае воды ў мора нясуць”, чуюцца песні — “долі людской адгалоскі”. Заканчваецца верш прызнаннем лірычнага героя ў яго бясконцай любові да тых месц, дзе ён нарадзіўся і вырас. Ідэю ўваскрэсення краіны паэт звязвае з”нястрыманай яскравай свабодай”, што хутка “заззяе для народа” (верш “Да надзеі”). Паэт, на думку Ц. Гартнага, павінен прыняць актыўны ўдзел у абуджэнні народа, барацьбе за знішчэнне рабскіх устояў:

Размахні рукою і званова сэрца

Скалыхні сярдзіта. Хай грымяць удары,
І хто спіць, хто дрэмле, ўстане-скалыхнецца
І спяшыць на зовы. Не праспі, званару!

Тэма паднявольнага жыцця селяніна і яго цяжкой працы знайшла адлюстраванне ў вершах “Да  Нёмна”, “Касьба”, “Песня жняі”, “Сявец”. Захапляючыся спорнай працай касцоў, паэтызуючы працу жняі, пад сярпом якой “хутка жыта гнецца, сноп за снопам у радок покладам кладзецца”, аўтар сцвярджае высокія маральныя нормы селяніна: праца павінна прыносіць асалоду, задавальненне, бо

Праца ўвесь свет ускарміла,
Праца нам шчасце дае.
Працаю сілы прыроды
К людзям у слугі ідуць,
З ёю ж у свеце народы
Лепшае долі прыждуць.

У вершах “Каваль”, “Гарбар на вандроўцы”, “Песні гарбара” Ц. Гартны ўпершыню ў беларускай літаратуры звярнуўся да вобраза рабочага, выказаў веру ў яго вялікія магчымасці. Апісваючы кавальскую і гарбарскую працу, разважаючы пра цяжкую долю гарбара (яго ў жыццёвых вандроўках заўсёды суправаджае гора), паэт стварае абагульнены вобраз “рыцара працы цяжкой”, які ганарыцца сваёй прафесіяй і верыць, што ў працы адшукае лепшую долю, выкуе сваё шчасце.

Сярод празаічных твораў Ц. Гартнага найбольш значны — раман  “Сокі цаліны”, які з’яўляецца першым шматтомным творам у нашай нацыянальнай літаратуры, дзе праўдзіва адлюстравана грамадска-палітычная атмасфера тых часоў, жыццё горада і рабочае асяроддзе. У структурным плане ён складаецца з 4 кніг (квадраў), аб’яднаных галоўнай ідэяй аўтара: паказаць, як “багатая сокамі цаліна агромнай краіны расціла маладыя пасынкі”. Дзеянне ў рамане

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ахоплівае цэлае дзесяцігоддзе, у межах якога змясціліся такія значныя падзеі, як першая сусветная вайна, Лютаўская рэвалюцыя, а таксама шматлікія мітынгі, дэманстрацыі.

Галоўным героем твора з’яўляецца вытрыманы ва ўсіх адносінах, адданы рэвалюцыйнай справе, свядомы пралетарый Рыгор Нязвычны. У першай кнізе “Бацькава воля” расказваецца аб прыездзе Рыгора з Рыгі ў вёску Сілцы, яго ўзаемаадносінах з Зосяй Прыдатнай, яе бацькамі і іншымі аднавяскоўцамі. Рыгора не магло задаволіць ціхае, замаруджанае жыццё ў вёсцы, бо ён прагнуў рэвалюцыйнай дзейнасці, змагання за людское шчасце, у надыход якога свята верыў. Дзеянне ў наступных кнігах (“На перагібе”, “Крыжавыя дарогі”, “Чырвоныя зарніцы”) адбываецца ў вёсках Сілцы, Смагін, Ступкі, а таксама ў Мінску, Рызе, Пецярбургу. Крыжовыя дарогі сталі суровым выпрабаваннем для герояў твора. Многія з іх мужнелі, загартоўваліся, іншыя, наадварот, гублялі веру ў ажыццяўленне рэвалюцыйных ідэй. Рыгор практычна ва ўсіх жыццёвых сітуацыях паказаны бездакорным бальшавіком, усе клопаты якога скіраваны на грамадскую дзейнасць. Аўтар захапляецца ім, прыўздымае над іншымі персанажамі і як бы не заўважае яго халоднага рацыяналізму, душэўнай чэрствасці, нячуласці, абыякавасці (стаўленне да маці, развагі пра Зосіны пакуты, адносіны да арышту Петруся). Катэгарычным, але рэвалюцыйна “правільным” з’яўляецца сцвярджэнне Рыгора аб сялянстве як непаўнацэнным і ніжэйшым, у параўнанні з рабочымі, класам. У выніку гэтага вобраз набыў спрошчаны, дэкларатыўны і ў многім штучны характар, што, безумоўна, паўплывала на мастацкія вартасці твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**57**

## АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ ТВОРЧАСЦІ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ

Змітрок Бядуля адносіцца да ліку пісьменнікаў, якія закладвалі падмурак беларускай літаратуры. Першы яго зборнік “Абразкі” склалі лірычныя імпрэсіі-мініяцюры. У іх праглядваецца выдатнае ўменне аўтара занатаваць на паперы першаснае, ледзь узнікшае ўражанне аб людзях, падзеях, рэчах і аформіць яго ў выглядзе пачуццёва-вобразнай, кідкай, выразнай дэталі. Большасць імпрэсій, напісаных сакавітай мовай, характарызуюцца рамантычным успрыманнем жыцця, паэтызацыяй беларускай вёскі, захапленнем родным краем, асуджэннем несправядлівасці. Сацыяльным зместам вылучаюцца імпрэсіі “Не пячы гэтак, сонейка”, “Ля вапеннай гары”, “Араты”, “Жальба”, лірычны герой якіх востра адчувае ўсе супярэчнасці жыцця, спачувае бедным і абяздоленым, перажывае за людскія пакуты. І толькі ў свеце прыроды ён знаходзіць зладжанасць, гармонію і спакой.

Тэма цяжкага сялянскага жыцця прадаўжаецца і ў хрэстаматыйных апавяданнях “Пяць лыжак заціркі”, “Малыя дрывасекі”, “Летапісцы”, “Велікодныя яйкі”. Гэтыя рэалістычныя творы, на думку І. Навуменкі, — дыяменты, залатыя зярняты..., якія могуць упрыгожыць самую развітую літаратуру”. Героі іх пастаўлены ў выключныя, трагічныя абставіны, з якіх практычна няма выйсця, няма надзеі на прасвет у будучым (гінуць у снежнай завірусе малыя, галодныя дрывасекі Цішка і Халімон; з-за адсутнасці фарбы маленькі Сцяпанка малюе партрэт забітага на вайне бацькі ўласнай крывёю).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апавяданні другой паловы 20-х гг.  прысвечаны тэме новага жыцця, зменам у быце і светапоглядзе людзей. Пісьменнік піша пра арганізацыю калгасаў, адкрыццё хат-чытальняў, гурткоў па ліквідацыі непісьменнасці, пра нараджэнне новых людзей — гаспадароў новага ладу, змагароў з класавымі ворагамі (“Дзед Арцём”, “У тыя дні”, “Тры крыжыкі”, “Шрам”, “На абодвух берагах рэчкі”). У гэтых творах З. Бядуля выконваў патрабаванне ад мастакоў слова сцвярджаць новую ідэалогію, палітыку сацыялістычнага будаўніцтва. І таму героі твораў даволі схематычныя, звычайныя выканаўцы новых грамадскіх парадкаў.

У фальклорна-рамантычнай аповесці “Салавей” (1927) З. Бядуля выкарыстаў гістарычны сюжэт з часоў прыгоннага тэатра. Галоўнага героя твора Сымона празвалі Салаўём з-за незвычайнай здольнасці падрабляць гукі прыроды і жывых істот. Гэты талент хацеў выкарыстаць дзеля ўласнай забавы пан Вашамірскі. Але Сымону невыносна быць пацехай для пана ў яго маёнтку. Ён бачыў фізічныя катаванні акцёраў, жудасныя расправы над іншымі прыгоннымі і цяжка пакутаваў ад гэтага. Пасля трагедыі ў сям’і Каспара, смерці Зоські Сымон  вырашае быць не панскім салаўём, а мужыцкім заступнікам. І яму ўдалося, як гэта бачна са зместу твора, адпомсціць панам за здзекі над сялянамі. Паказваючы драматычны лёс мастака ва ўмовах прыгоннага тэатра,  З. Бядуля сцвярджае, што асновай сапраўднай творчасці з’яўляецца духоўная свабода і незалежнасць чалавека.

Пасля аповесці “Салавей” З. Бядуля выдаў зборнікі апавяданняў “Дзесяць”, “Незвычайныя гісторыі”, раман “Язэп Крушынскі” (пра вёску напярэдадні калектывізацыі), аўтабіяграфічную аповесць “У дрымучых лясах”. У апошнім творы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

"Сярэбраная табакерка" (1940), якi па жанры з'яўляецца лiтаратурнай казкай, ён звяртаецца да адвечных тэм жыцця i смерцi, дабрынi i зла. У лiтаратурнай спадчыне З. Бядулi нямала крытычных i публiцыстычных твораў, прысвечаных развiццю беларускай лiтаратуры, культуры i тэатра.

Наогул, тэматыка твораў З. Бядулi ўсеабдымная, унiверсальная. Яго цiкавяць i чалавек у яго адвечным шляху ад нараджэння да смерцi, i ягоныя думкi, i настроi, дзiвосны, непаўторны свет прыроды. Усё гэта, спалучанае з глыбокiм веданнем жыцця, фiласофскiм светапоглядам i вялiкай любоўю да людзей, i надае творам пiсьменнiка прыцягальнасць, эстэтычную вывeранасць, актуальнасць i папулярнасць.

**58**

**ВОБРАЗ САМСОНА САМАСУЯ Ў РАМАНЕ А. МРЫЯ "ЗАПIСКI САМСОНА САМАСУЯ".**

Раман А.Мрыя напiсаны ў форме дзённiка, у якiм герой шчыра i без прыхарошвання расказвае аб тых з"явах, якiя былi характэрныя для савецкага грамадства ў 20-ыя гады. Дзённiк дае большае, у параўнаннi з аб"ектыўным апавяданнем, поле для выказвання героем уласных ацэнак i меркаванняў. Герой рамана дае i сваё ўласнае тлумачэнне выбару такой формы: "У маiм цяперашнiм пакоi я павесiў на сцяне плакат са словамi аднаго вучонага, якi сказаў: "Каб мы ведалi ўсе дробязi жыцця якой-небудзь казюлькi, мы шмат якiх памылак маглi б i не зрабiць!" Такiм чынам аўтар адразу давярае свайму герою не толькi выкладанне, але i тлумачэнне фактаў. А.Мрый настолькi ўдала справiўся з задачай, што, як ён пiша ў лiсце "Другу працоўных Iосiфу Вiсарыёнавiчу Сталiну", у рэдакцыю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

часопіса, які друкаваў “Запіскі”, прыходзілі лісты з патрабаваннем выключэння з партыі “прымазанніка Савецкай улады” Самасуя.

Аб ранейшым жыцці Самасуя мы даведваемся нямнога: аўтар нібы кажа чытачу, што ўсе галоўныя падзеі яшчэ наперадзе, а з мінулага Самсона паведамляе толькі тыя факты, якія сведчаць аб асноўных рысах характару героя. Самсон паходзіць з сялян, аднак да сялянскай працы ставіцца з пагардай, шукае лёгкага хлеба. “Як жа? Буду калупацца ў пясочку вашым? Няхай трошку пачакае! Якое тут жыццё?” — кажа ён бацькам. З-за гэтай рысы свайго характару і вымушаны ён рэгулярна змяняць род заняткаў. Ён любіць смачную ежу і шыкоўнае адзенне — ”хварэе на пана”, як трапна гаворыць пра яго бацька.

На першы погляд тая рэчаіснасць, якую апісвае Самсон, выглядае абсурднай. Безумоўна, аўтар не мог абысціся без пэўных перабольшванняў, але яны выконваюць чыста мастацкую функцыю. Нельга ж адмаўляць той факт, што ў 20-ыя гады ў савецкай краіне сапраўды мелі месца паказушнасць і імкненне да татальнага кантролю над усімі сферамі грамадскага жыцця. На прыкладзе Самасуя А.Мрый з сарказмам апавядае аб савецкім чыноўніку, які ўзвальвае на сябе па дзесяць пасад з тым большай ахвотай, што ў выніку не адказвае ні за што. Афіцыйная прапаганда тых часоў вытлумачвала гэта недахопам кадраў для культурнай рэвалюцыі, якую хацелі правесці кавалерыйскім наскокам і якая ператваралася ў выніку ў звычайную паказушнасць і падмену канкрэтнай справы пустой балбатнёй на розных сходах, паседжаннях і маёўках. Той жа Самасуй адначасова з”яўляецца старшынёй дзіцячай камісіі, таварыства “Прэч несвядомасць”, сябрам РВК і раённым інспектарам працы. “Кіпучая дзейнасць” героя не такая ўжо і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бязглуздая для яго, ён мае пэўную мэту — круціцца так, каб заўважыла і ацаніла начальства, і дасягнуць гэтым больш высокага становішча ў бюракратычнай пірамідзе. Самсон разумее, што гэтая сістэма прабачыць яму ўсё, акрамя самастойнасці і непаслушэнства. “Такія людзі нам патрэбны. Часам дзірку якую заткнуць. Але яго трэба ў рукі ўзяць, тады Самасуй будзе добрай прыладай для знішчэння старога”, — так кажа пра яго старшыня райвыканкама Сом.

З аднаго боку, Самасуй смешны і вясёлы чалавек, поўны энергіі і жыццярадаснасці. Але ж ён малакультурны і неадукаваны, яго энергія скіравана не на стварэнне. а на разбурэнне. Мала таго, ён яшчэ і нецярпімы да іншадумства, самазадаволены і не церпіць ніякай крытыкі на свой адрас. А колькі іх было, такіх самасуяў і самасуйчыкаў, якія трымалі пад пільным наглядам грамадскае жыццё ў краіне Саветаў! Ці ж трэба здзіўляцца сёння таму культурнаму заняпаду, які мы штодня бачым на свае вочы?

Такія “вінцікі” , як Самасуй, былі для сталінскай таталітарнай машыны як паветра для рыбы, быць “вінцікам” азначала ні за што не адказваць. Самасуй адразу правільна схоплівае асноўныя прынцыпы дзейнасці мясцовай улады: усё старое разбураць, усе няпісаныя (г. зн. і маральныя) законы адкідвай прэч, будуй новае, і не важна што; або, у крайнім выпадку, рабі выгляд , што нешта робіш у патрэбным рэчышчы. Нават сваю мову перапрацаваў ён на новы капыл: настолькі засвоіў пратакольна-канцылярскі стыль, што нават сам да сябе звяртаецца на новамове: “з неаслабнай энергіяй вёў сваю амурную лінію”,”смех у яго быў як у акулы імперыялізму”,”ва ўсесаюзным маштабе дурыла ты”,”пасля змагання з сваім тэмпераментам вынес рэзалюцыю” і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Трэба адзначыць, што ў творы А.Мрыя няма ніводнага становучага персанажа. Магчыма,што аўтар зрабіў гэта наўмысна, насуперак тагачаснай вульгарызатарскай крытыцы, якая патрабавала абавязковай прысутнасці ў творы становучага героя. Акрамя таго, лічылася. што савецкі лад — залатая мара чалавецтва, што пры ім не можа існаваць ніякіх адмоўных з”яў .

“Запіскі Самсона Самасуя” — гэта вяршыня не толькі беларускай. але і ўсёй савецкай сатырычнай прозы наогул. Іх адметнасць заключаецца  і ў сіле мастацкага абагульнення, і ў шырокай палітры сатырычных прыёмаў, і ў выбары сатырычнага матэрыялу, формы яго падачы і стылёвай самабытнасці.

Твор А. Мрыя папярэджвае аб небяспецы, імя якой — культ асобы. І проста дзіву даешся, наколькі прадбачлівым ён аказаўся, друкуючы свой раман на самым пачатку злавесных сталінскіх рэпрэсій — у 1929 годзе. Таму не было б памылкай назваць яго, як справядліва адзначае крытык Т. Мушынская, раманам сацыяльнага і палітычнага прадбачання.

**59**

## “ГЛЯДЖУ Я Ў ПОТНАЕ АКНО ВЯЛІКАЙ БУДУЧЫНІ...” (ТВОРЧАСЦЬ МІХАСЯ ЧАРОТА)

Я шумлівы чарот, я мяцежны бунтар.
Я балота буджу гучным шумам.
У вадзе я жыву і абмыт дажджом хмар,
Але змоўкнуць не дам сваім струнам.
*М. Чарот*

Творчасць М. Чарота ў многім тыповая для пакалення пісьменнікаў, што прыйшло ў літаратуру адразу пасля Кастрычніка. Яго творам уласцівы рамантычная акрыленасць, урачыстасць, узнёсласць, дынамічнасць, мяцежна-бунтарскі дух. Паэт

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адлюстроўваў гераічны пафас рэвалюцыйнай барацьбы, жыццё ў яго бурлівым развіцці, вялікае супрацьстаянне новага і старога. Вобразы буры, ветру, навальніцы, завірухі, чырвонага вогнішча, веснаходу, буралому, агню, пажару складаюць аснову першых зборнікаў М. Чарота “Завіруха”, “Веснаход” і выяўляюць іх рэвалюцыйны змест.

М. Чарот лічыцца ў беларускай літаратуры адным з пачынальнікаў рэвалюцыйнай тэматыкі, якая атрымала ў яго ў вялікай ступені сацыяльна-класавую, палітычную акрэсленасць.У героіка-рамантычнай паэме “Босыя на вогнішчы” жорсткая і крывавая рэвалюцыя паказваецца як непазбежнасць і адзіная ўмова разняволення сіл беларускага народа. Паэт супрацьпастаўляе дзве непрымірымыя сілы — “босых” (рабочых і сялян) і іх прыгнятальнікаў (паноў, чыноўнікаў, афіцэраў, папоў) — і верыць у неабходнасць зруйнавання старога ладу, надыход “вялікай будучыні” дня.

Змагаецца праца з багаццем:
Свет новы жыццё утварае.
Зышліся дзве моцныя раці,
І праўда няпраўду змагае.

У цэнтры паэмы — мастацка-абагульнены вобраз народа, грамады, магутная рака рэвалюцыйнага руху:

Яны — байцы вялікай раці.
Іх хата там, дзе ёсць прастор.
Няволя, крыўда — вось іх маці!
Ідуць яны да сонца й зор.

Своеасаблівым працягам “Босых на вогнішчы” можна лічыць паэму-фантазію “Чырванакрылы вяшчун”, героем якой з’яўляецца новы (савецкі) чалавек. Ён узняўся на незвычайным аэраплане над рознымі краінамі і кантынентамі з мэтай падняць дух рэвалюцыйна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вызваленчай барацьбы працоўных гэтых краін. Верай у заўтрашняе сонца радасці, у Вялікую Будучыню, калі “жыць стане лепей”, Беларусь стане “Вольнай, Вялікай” і “шчырае дзякуй скажуць нам дзеці будучай светлай камуны”, напоўнены радкі паэм “Беларусь лапцюжная”, “Карчма” і вершаў “Бунтар”, “Буралом”, “На новай зямлі”, “Заўтра”.

У некаторых вершах М. Чарот выступае як тонкі псіхолах, філосаф, даследчык чалавечай душы. Так, лірычны герой вершаў “З сучасных настрояў”, “На шляху адраджэння” задумваецца над складанымі супярэчнасцямі жыцця, адчувае драматызм свайго становішча, немагчымасць адкрыта выяўляць свае адносіны да рэчаіснасці:

Я нейкім чорным туманом
Усё жыццё сваё спавіты...
Я бачыў шчасце толькі сном...
Мой човен хвалямі разбіты.

М. Чарот унёс значны ўклад у развіццё беларускага тэатральнага мастацтва і драматургіі. Ён спяваў у хоры В. Тэроўскага, быў старшынёй тэатральнай групы “Маладзік”, удзельнічаў у многіх спектаклях трупы Уладзіслава Галубка, пісаў п’есы для тэатральных пастановак. З драматычных твораў найбольш вядомы п’есы “Мікітаў лапаць” (яна і зараз у рэпертуары Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы) і “На Купалле” (паводле яе была створана опера “Кветка шчасця” А. Туранкова).

М. Чарот вядомы і як аўтар празаічных твораў, у якіх у большай ступені прытрымліваўся рэалізму, чым рамантызму. Яны, як правіла, прысвечаны беларускай вёсцы 20-х гг. Па аповесці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Свінапас”, якая ўзнаўляе падзеі грамадзянскай вайны, быў створаны першы беларускі мастацкі фільм “Лясная быль” (1926).

У 30-я гады пясняр рэвалюцыі адчуў неажыццявімасць сваіх рамантычных мар, атручаных жорсткай рэальнасцю, зведаў на сабе несправядлівую крытыку за адсутнасць “акрэсленай мастацкай пазіцыі” і ўрэшце быў арыштаваны за контррэвалюцыйную дзейнасць і асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Апошні свой верш “Прысяга” М. Чарот запісаў на сцяне мінскай турмы, дзе яго ўдалося прачытаць і захаваць у памяці М. Хведаровічу.

## 60

## ВЯЛІКАЯ ПРОЗА МІХАСЯ ЗАРЭЦКАГА

Міхась Зарэцкі адносіцца да ліку той вялікай плеяды беларускіх пісьменнікаў,чыя творчасць доўгія гады знаходзілася пад забаронай або папросту замоўчвалася. І хоць асобныя творы друкаваліся і ў савецкі час, большасць з таго, што складае стрыжань творчай манеры пісьменніка, не было вядомым шырокаму колу чытачоў. А між тым пяру Зарэцкага належаць такія выдатныя аповесці і раманы, як “Голы звер”,”Вязьмо”,”Сцежкі-дарожкі”, незакончаны раман “Крывічы”. Росквіт таленту празаіка прыйшоўся на часы так званай беларусізацыі і пачатку сталінскага тэрору. Дзве згаданыя акалічнасці не маглі, безумоўна ж, не паўплываць на тэматыку і дух яго твораў.

Аповесць “Голы звер” з”яўляецца спробай стварэння псіхалагічнага твора. У ёй расказваецца пра гісторыю ўзаемаадносін дзяўчыны Лідачкі з пыхлівым, эгаістычным, подлым маладым чалавекам — Віктарам Яроцкім.Для яго, як вынікае з далейшага разгортвання падзей, не існуе нічога святога ў жыцці: ён

уладкоўваецца на працу ў якасці памочніка бухгалтара, якога ўводзіць у зман абяцаннямі багатага і бесклапотнага жыцця, а потым ускладвае на яго адказнасць за фінансавыя махінацыі . Лідачка, якая шчыра пакахала Яроцкага, не задумваецца, адкуль ён можа мець столькі грошай. Віктар жа, абяцаючы Лідачцы ажаніцца з ёю, на самой справе хоча толькі пазабавіцца , рэалізаваць свае юрлівыя жаданні . Ён прыводзіць Лідачку ў прытон, дамагаецца свайго і выкідвае бедную дзяўчыну, як непатрэбную анучу. Пасля гэтага выпадку у Лідачкі адкрываюцца вочы на тое, хто ж такі Яроцкі насамрэч. Апісанні вострых душэўных перажыванняў дзяўчыны І ўнутраныя маналогі Яроцкага з”яўляюцца самымі запамінальнымі старонкамі аповесці.

Адным з першых беларускіх раманаў, прысвечаных тэме калектывізацыі, справядліва лічыцца раман М. Зарэцкага “Вязьмо”. Гэты раман па сваёй сацыяльнай завостранасці пераўзыходзіць усе творы пра калектывізацыю, якія друкаваліся па-беларуску ў даваенны час. М. Мушынскі нават лічыць, што ў рамане “праведзена ідэя немэтазгоднасці суцэльнай калектывізацыі”. Аднак гэтая ідэя праводзіцца ў рамане ў скрытай, завуаляванай форме. Неабходна адзначыць, што , ствараючы свой раман на пачатку 30-х гадоў, М. Зарэцкі ўжо бачыў сацыяльна-палітычныя і эканамічныя вынікі калектывізацыі. Таму ён паказвае сапраўдную сутнасць падзей, па-мастацку адкрыта выказвае сваё стаўленне да іх: паказвае, як руйнуюцца лёсы людзей ва ўгоду палітычным інтарэсам, як духоўна нявечацца людзі, пераўтвараючыся ў ахвяр штучна створанай атмасферы страху, падазронасці і варожасці. У першай частцы рамана паказана беларуская вёска пярэдадня калектывізацыі, чытач знаёміца амаль з усімі героямі, у тым ліку і з Сымонам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Карызнам, якога сумненні наконт правільнасці эканамічнай палітыкі партыі даводзяць да дэпрэсіі. У другой частцы распавядаецца аб спробах стварэння ў Сівалапах з беднякоў і серадмякоў калгаса, які павінен засведчыць перавагі новага ладу гаспадарання. Сымону Карызну ўдаецца дамагчыся разбурэння гэтага калгаса і пераводу старшыні Зеленюка ў другую гаспадарку. Трэцяя частка распавядае аб выніках прымусовай калектывізацыі для сялян і для асабістага лёсу Сымона Карызны. Праз лёс галоўнага героя аўтар ставіць і вырашае праблему ўзаемаадносін дзяржавы і асобы. Вязьмо — гэта вынік адсутнасці свабоды дзеянняў, выбару, немагчымасць рэалізацыі сваі ідэй.

Адным з самых цікавых твораў М. Зарэцкагаз”яўляецца раман “Сцежкі-дарожкі”. Храналагічна ён ахоплівае Лютаўскую рэвалюцыю, грамадзянскую вайну і барацьбу з бандытызмам. Галоўную ўвагу чытача прыцягвае група вымышленых персанажаў — Васіль Лясніцкі, яго сябра Андрэй, анархіст Халіма, Андрэева сястра Ніна  і панская дачка-прыгажуня Раіса. Многія з герояў твора моцна рамантызаваныя, вызначаюцца ўнутранай супярэчлівасцю. Свой твор М. Зарэцкі ствараў у той час, калі з”яўляўся шчырым прыхільнікам афіцыйнай ідэалогіі. І таму не дзіўна, што ў выніку сваіх пакутлівых пошукаў галоўны герой твора Васіль Лясніцкі прыходзіць да высновы аб наебходнасці падпарадкавання “дружнай грамадзе, вялікаму калектыву.”Яшчэ больш заканамернымі ў рэчышчы тагачаснай афіцыйнай прапаганды выглядае аўтарскае вырашэнне ўзаемаадносін паміж Васілём і паненкай Раісай: аўтар усімі магчымымі сродкамі аддаляе іх збліжэнне (Раіса палае страсцю да ўласнага дзядзькі і яна мае венерычную хваробу), каб абгрунтаваць тэзіс пра выраджэнне паноў як класа. Раман

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пабудаваны так, што ўсе сюжэтныя лініі завязваюцца вакол вобраза Лясніцкага, праз узаемадзеянне з іншымі героямі твора высвечваюцца розныя аспекты яго характару. Сваёй стылёвай адметнасцю, канфліктнасцю і дынамізмам дзеяння раман выгадна адрозніваецца ад многіх твораў тае эпохі.

Напрыканцы неабходна адзначыць, што з-за палітычных рэпрэсій М. Зарэцкі не змог завяршыць шэраг сваіх цікавых задумак. Сведчаннем таму з”яўляецца незавершаны раман “Крывічы”, які меўся быць вытрыманы ў здаровым нацыянальным духу. Але творчым планам пісьменніка не суджана было збыцца. Тым не менш, тое, што захавалася, сведчыць аб высокім майстэрстве Зарэцкага-празаіка, аб яго непаўторнай манеры пісьма, аб імкненні да стварэння высокапсіхалагічнага беларускага рамана. Амаль ва ўсіх творах яму ўдалося пазбегнуць заангажаванасці і палітыканства, праўдзіва адлюстраваць складаны і супярэчлівы твар эпохі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 61

## БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ... (ТВОРЧАСЦЬ М. ГАРЭЦКАГА)

Доўгі час творчая спадчына аднаго з пачынальнікаў нацыянальнай прозы Максіма Гарэцкага была невядомай шырокаму колу чытачоў. Лічылася, што аўтар паддаўся нацыянальна-буржуазным тэндэцыям і ў сваіх творах не змог “правільна” адлюстраваць тагачасную рэчаіснасць, стаў на пазіцыі антысавецкай, контррэвалюцыйнай дзейнасці. Сёння спадчына выдатнага беларускага пісьменніка становіцца часткай класічнага фонду беларускай літаратуры. У 1986 г. выйшаў Збор твораў М. Гарэцкага

ў 4-х тамах, а ў 1993 г. па рашэнні ЮНЕСКА шырока адзначыўся стогадовы юбілей таленавітага мастака слова.

Творы М. Гарэцкага (першае апавяданне “У лазні” надрукавана ў 1913 г.) характарызуюцца складанай грамадска-сацыяльнай і філасофскай праблематыкай, глыбокім псіхалагізмам, вялікай духоўнай змястоўнасцю, дасканаласцю мастацка-выяўленчых сродкаў. М. Гарэцкі з’яўляецца аўтарам вядомых раманаў “Віленскія камунары”(напісаны ў 30-я гг., надрукаваны ў 1965 г.), “Камароўская хроніка” (надрукаваны ў 1966 г.), аповесцей ”Дзве душы”, “У чым яго крыўда”, “На імперыялістычнай вайне”(1926), “Ціхая плынь”(1930), зборнікаў апавяданняў “Рунь”, “Досвіткі”, першай “Гісторыі беларускай літаратуры”, шэрагу цікавых драматычных абразкоў, шматлікіх-літаратурна-крытычных прац.

Трагедыя беларускага народа ў гады першай сусветнай вайны раскрываецца ў аповесці “На імперыялістычнай вайне”, апавяданнях “Літоўскі хутарок”, “Рускі”, “Генерал”, “На этапе”. Усе яны напісаны на аснове дзённікавых запісаў і заметак, якія вёў М. Гарэцкі ў кароткіх перапынках паміж баямі, і адкрываюць новую для тагачаснай беларускай літаратуры тэму — тэму вайны.

М. Гарэцкага заўсёды цікавіла не вайна сама па сабе, а яе ўспрынящце асобным чалавекам. Так, дакументальна-мастацкія запіскі “На імперыялістыянай вайне” аб’яднаны не толькі асобай галоўнага героя — салдата Лявона Задумы, — але гуманным стаўленнем аўтара да чалавечай асобы, антываенным пафасам. Вайна ў аповесці паказана праз прызму яе ўспрымання радавым салдатам. Праз душу і сэрца салдата-байца прайшла цэлая гама чалавечых пачуццяў, ад самых высакародных да самых ганебных. Ён бачыў забітых, параненых, смерць батарэйцаў, чуў лозунгі ўра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

патрыётаў і шавіністаў, шкадаваў безабаронных пехацінцаў і ездавых бежанцаў, спачуваў немаладым немцам, шукаючых свайго 15-гадовага сына, якога павезлі з сабой рускія салдаты, адчуваў агіду ад рабавання і амаральных паводзін Шалапутава, ганарыўся высакароднасцю, высокім маральным ўзроўнем рускага афіцэра... Прайшоўшы цяжкімі ваеннымі дарогамі і добра ведаючы цану вайне і міру, Лявон выступае супраць братазабойстваў, марыць пра вызваленне свайго народа.

У апавяданні “Літоўскі хутарок” пісьменнік паказаў, што вайна прыносіць толькі гора, разбурэнні, смерць. Ад некалі квітнеючага хутара, дзе жыў Ян Шымкунас са сваёй сям’ёй, засталася толькі палова будоўлі з прабітай страхой, абгарэлымі сценамі, выбітымі вокнамі. Вайна прынесла невымерныя пакуты людзям (самому Яну, яго дочкам Монці і Ядвісі), бо іх дом аказаўся ў цэнтры баявых дзеянняў, на перадавой. Імперыялістычная бойня ў гэтым апавяданні страсна асуджаецца з пункту гледжання простых людзей, гаспадароў хутарка.

Асобае месца ў творчасці М. Гарэцкага займае аповесць “Ціхая плынь”. У цэнтры твора — гісторыя жыцця хлопчыка Хомкі Шпака ад яго нараджэння да заўчаснай гібелі на фронце. Аўтар даволі падрабязна апісвае сцэны ранняга дзяцінства Хомкі, вучобы ў школе, парабкоўства. Падлетка, якога поп памылкова запісаў у царкоўную кнігу на два гады маладзейшым, мабілізавалі ў армію. Хомка, не паспеўшы налюбавацца задужай для яго вайсковай формай, гіне ў першым баі з ворагам. Безумоўна, ён не змог разабрацца ў дзяржаўнай палітыцы і зразумець сваю роль у гэтай бойні. Ён памёр сярод грымотаў і салдацкіх стогнаў з застылым на вуснах пытаннем “За што?”. Частковым адказам на яго могуць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

служыць словы Янкі Купалы, змешчаныя ў якасці эпіграфа да фінальнага раздзела аповесці:

Выйшлі роднай вёскі дзеці
Паміраць на белым свеце,
Рассяваць па свеце косці
Праз кагосьці, за кагосьці.

У вобразе Хомкі (яго знешнім абліччы, унутраным свеце) М. Гарэцкі ўвасобіў нацыянальныя рысы характару беларусаў. Смерцю героя твора аўтар выказаў грозны прысуд імперыялістычным войнам і іх пачынальнікам.

Аповесць "Дзве душы", напісаная па гарачых слядах вызначальных для Беларусі падзей 1918 — 1919 гг., адносіцца да філасофскіх твораў. Галоўны герой аповесці Ігнат Абдзіраловіч — армейскі афіцэр, у мінулым студэнт з дэмакратычнымі поглядамі. Ён жыве ў рэвалюцыйную эпоху, і неакрэсленасць яго пазіцый у многім вытлумачваецца неакрэсленасцю палітычнай сітуацыі ў краіне. Яго душэўны стан адлюстроўвае адпаведнае становішча беларускага народа на канкрэтным этапе яго развіцця. Адной з прычын душэўнай раздвоенасці Ігната з'яўляецца і блытаніна з паходжаннем. У 27-гадовым узросце герой твора даведаўся ад маці Маланні, што ён ад нараджэння — Васіль — селянін па паходжанні. Малання, узятая калісьці ў двор памешчыка Абдзіраловіча да нечакана асірацелага дзіцяці, падмяніла панскага сына сваім. Такім учынкам яна спадзявалася забяспечыць багатае і шчаслівае жыццё свайму роднаму сыну.

Дзве душы (сялянская і панская) не маглі ўжыцца разам: "Душа дваілася. Адна палова несказанна плакала і жалілася на другую, нашто яна мучыць яе падманкамі. І калі ён троху выстагнаўся, казала: "Уцячы... уцячы...". Супярэчлівымі з'яўляюцца не толькі

думкі, душэўныя разважанні Абдзіраловіча, але і яго паводзіны, учынкі: прызнаецца Алі Макасеевай у каханні, але за яго ніяк не змагаецца; знаходзіцца ў гушчы рэвалюцыйных падзей, але ўдзелу ў іх не прымае; заяўляе перад ворагамі беларушчыны, што ён беларус, а перад змагарамі за Бацькаўшчыну сцвярджае, што яго радзіма — Расія. Душа Ігната дваіцца, калі неабходна акрэсліцца ў адносінах да чырвоных і белых, трэба вызначыцца па пытаннях класавай барацьбы. У канцы твора ён быццам адолеў хваробу дваістасці (“ мяккацеласці”, “расхрыстанасці”, “разлезласці”), перастаў быць пабочным назіральнікам і “ціхім думаннннікам” і прызнаўся сабе: “Я з-за непаразумення трапіў у панскія сыны, я сын гэтай чорнай грамады і хацеў бы павесці яе ляпей за ўсіх да шчасця”.

У аповесці нямала іншых вобразаў, якія ў пэўнай ступені дапамагаюць раскрыць асноўную ідэю твора. Перш за ўсё звяртае на сябе ўвагу Іван Карпавіч Гаршчок — палітычны авантурыст, які, адчуўшы ў “бальшавізме нешта блізкае, роднае і любае”, бязлітасна забівае і катуе нявінных людзей. Лозунгам яго жыцця з’яўляецца дэвіз “Сячы трэба да карэння”. Антыподамі Гаршчка, змагарамі за беларускую ідэю, носьбітамі адраджэння ў аповесці выступаюць Мікола Канцавы, Іра Саковіч, Сухавей. У іх паводзінах многа рамантыкі і ўзнёсласці, і таму яны больш займаюцца самаўсведамленнем, агітацыяй за “беларускі спісак” , чым канкрэтнымі дзеяннямі, адраджэнскімі справамі.

Раман М. Гарэцкага “Віленскія камунары” прысвечаны гераічнаму змаганню патрыётаў у акупіраванай кайзераўцамі Вільні. У незакончаным рамане “Камароўская хроніка” праследжваецца лёс беларускага сялянства на працягу цэлага стагоддзя (XIX — пачатак XX ст.). Праз апісанні канкрэтных падзей, індывідуальных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

характараў, складаных лёсаў пісьменнік паказаў цяжкі, марудны, але няўхільны рух беларускай вёскі з мінулага ў будучае, стварыў вобраз эпохі, калектыўны партрэт народа, праспяваў гімн нязломнаму чалавечаму жыццю.

“Браму скарбаў сваіх” хацеў адкрыць М. Гарэцкі чытачам. На жаль, гэтаму перашкодзіла крывавая хваля сталінскіх рэпрэсій, якая на доўгія гады выкрасліла з нашых духоўных набыткаў амаль усе творы пісьменніка. Сёння ж спадчына М. Гарэцкага стала часткай класічнага фонду беларускай літаратуры.

**62**

## ТВОРЧЫ ШЛЯХ ПЛАТОНА ГАЛАВАЧА

Я хачу толькі, каб вы любілі
Беларусь так, як любім яе мы.
*П. Галавач*

Творы Платона Галавача вызначаюцца разнастайнасцю тэматыкі. У іх уздымаюцца пытанні землеўладкавання, перабудовы вясковага жыцця, калектывізацыі, узаемадзеяння бацькоў і дзяцей.

Аповесць “Вінаваты” адлюстроўвае грамадскую атмасферу канца 20-х гадоў, калі пашыраліся пошукі “ворагаў” народа, навешваліся ярлыкі, а вартасць чалавека вызначалася не яго справамі, а сацыяльным паходжаннем. У цэнтры твора — навучэнец тэхнікума, партыйны актывіст Алесь Шавец. Яго абвінавачваюць ва ўтойванні “праўдзівага свайго сацыяльнага паходжання, кар’ерызме” і выключаюць з тэхнікума і з партыі. Прычынай гэтага з’явілася выяўленне дакументаў аб тым, што яго бацька да рэвалюцыі быў паліцэйскім. Безумоўна, Алесь не можа адказваць за “памылкі” свайго бацькі і, здавалася б, не можа лічыцца вінаватым. Аднак аўтар прыводзіць іншыя доказы яго вінаватасці: яшчэ зусім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нядаўна Алесь жорстка нападаў на камсамольцаў за ідэалагічныя памылкі, падыходзіў да людзей з максімалісцкімі патрабаваннямі і лічыў класавымі ворагамі тых аднакурснікаў, якія дзеля паступлення на вучобу ўтойвалі сваё сацыяльнае паходжанне. У свядомасці героя, фанатычна адданага рэвалюцыі, адбываецца пераасэнсаванне поглядаў, расчараванне ў былых сябрах, адчуванне віны перад тымі людзьмі, у асобе якіх хацеў выявіць класавага ворага. У аповесці, такім чынам, выказваецца трывога аўтара за створаную ў грамадстве атмасферу падазронасці і недаверу, заклапочанасць выхаваннем пакалення, якое, вітаючы рэвалюцыю і новы лад жыцця, адмаўлялася ад сваіх каранёў, вытокаў.

Тэме вясковага жыцця і калектывізацыі прысвечаны аповесць "Спалох на загонах" і раман "Праз гады". У іх асабліва заўважаецца складанасць і супярэчлівасць пазіцый аўтара ў адносінах да перыяду "вялікага пералому". З аднаго боку, П. Галавач праводзіў у іх афіцыйную палітыку тагачаснага кіраўніцтва краіны і партыі (ён займаў у рэспубліцы адказныя партыйныя і дзяржаўныя пасады), а з другога, — не мог пагадзіцца з казарменным сацыялізмам, формамі і метадамі правядзення калектывізацыі і адлюстраваў жорсткую праўду таго часу, трагічнасць сялянскай долі ў тыя гады.

Дзеянне ў аповесці "Спалох на загонах" адбываецца ў вёсцы Цярэшкаў Брод, куды для правядзення калектывізацыі прыехаў з горада Панас — цэнтральны герой твора. Ён актыўна змагаецца за аб'яднанне зямлі і сялянскіх гаспадарак, за знішчэнне "рабства над сваёй уласнасцю". У гатай барацьбе і вялікім супрацьстаянні герой гіне на камунарскім полі — яго забіваюць раз'юшаныя жанчыны. Аўтар твора, які быў сведкам тагачасных падзей, не мог пазбегнуць паказу цяжкасцей калектывізацыі, трывог і сумненняў сялянства. І

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

таму на многіх старонках (нават пры няўдумлівым чытанні) можна адшукаць пярэчанні афіцыйнай трактоўцы. Гэта выразна гучыць у заявах вяскоўцаў аб выхадзе з калгаса і ў шматлікіх выказваннях героя аповесці рабочага Кліма.

У рамане “Праз гады” пісьменнік паказаў шырокую панараму жыцця беларускага сялянства на вялікім адрэзку часу. Адзін з самых запамінальных у творы — вобраз селяніна Тарэнты. Пісьменнік раскрывае яго багаты ўнутраны свет, падкрэслівае любоў і прывязанасць да зямлі, працавітасць. Доўгім і пакутлівым быў шлях Тарэнты да ўласнай гаспадаркі, дабрабыту. Паверыўшы ў праўду рэвалюцыі, атрымаўшы зямлю, уклаўшы ў яе нямала сіл і поту, ён не можа зразумець, дзеля чаго трэба аддаваць зямлю ў агульнае карыстанне, аб’ядноўваць гаспадаркі. Спрачаючыся з сынам, суседзямі і ўсімі, хто папікае яго добрым жыццём, ён сцвярджае, што мае права на такое жыццё, бо гэты дабрабыт створаны яго сумленнай працай. Тарэнта, такім чынам, выказвае думкі, уласцівыя многім серадняком, якія не хацелі расстацца з зямлёй, сваёй гаспадаркай.

**63**

**ПАЧЫНАЛЬНІК ВЯЛІКАЙ ПРОЗЫ (ТВОРЧАСЦЬ ЯДВІГІНА Ш.)**

Ядвігін Ш. (сапраўдныя імя і прозвішча пісьменніка Антон Лявіцкі) увайшоў у беларускую літаратуру як навеліст, нарысіст, фельетаніст, перакладчык, аўтар аднаго з першых беларускіх раманаў. Пісаў ён на беларускай, польскай і рускай мовах. Першыя апавяданні пісьменніка лічацца мастацкімі апрацоўкамі, інтэрпрэтацыямі народных жартаў, анекдотаў, гутарак, казак, нагадваюць байкі ў прозе і характарызуюцца вострай сатырычнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

скіраванасцю. У іх выкрываюцца зайздрасць, сквапнасць, празмерная цікаўнасць, забабоннасць і іншыя заганы чалавечай натуры. Героямі іх у большасці выпадкаў з’яўляюцца простыя людзі, сяляне, якім аўтар спачувае і якіх павучае з пазіцый народнай маралі. Так, у серыі гумарыстычных навел “Вучоны бык”, “З маленькім білецікам”, “Пазыка”, “Заморскі звер”, “Цырк” сяляне трапляюць у даволі кур’ёзныя сітуацыі гарадскога жыцця, дзе паводзяць сябе па-дзіцячы наіўна, даверліва, неразважліва, часам алагічна (прымаюць чалавека за малпу, вераць аб магчымасці вучобы бычка на чыноўніка, сушаць у партэры анучы, у цягніку замест вызначанага ў білеце месца займаюць туалет і інш.). Апавяданне “Рабы” з’яўляецца вострай крытыкай на людскoe хамства, блізарукае жыццё, “Падласенькі” — сатырай на тых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, якія, вывучыўшыся на бацькоўскія грошы, адракаліся ад іх, “Важная фіга” — высмейваннем злых і сварлівых свякрух, “Дачэсныя” — выкрыццём сквапнасці, несумленнасці, няўдзячнасці, ашуканства.

Пазнейшыя творы пісьменніка характарызуюцца большай рэалістычнасцю, сацыяльнай завостранасцю. Цяжкая доля вясковай жанчыны паказваецца ў апавяданнях “Гаротная” (пра шматпакутнае жыццё Тамашыхі), “Бярозка” (аб нялюбым замужжы і горкім лёсе Марысі), “Шчаслівая” (аб сквапнай жонцы, якая, падманутая мужам, памірае з думкай аб золаце ў гаршчку, дзе на самой справе знаходзілася ўсялякае смецце). У цэнтры алегарычнага апавядання “Дуб-Дзядуля” вобраз мужыка, які ў сне шукае ваду старому дубу. Пошукі прыводзяць селяніна да трох азёр, ля якіх ён сутракае трох бабуль — Працу, Бяду і Цярпенне. Бабулі хочуць дапамагчы людзям, але іх вялікія намаганні не могуць пазбавіць чалавека поту,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слёз і крыві. У апавяданні паказваецца цяжкі лёс беларускага селяніна, выказваецца шчырае спачуванне народу, мара аб яго лепшым будучым.

Раман Ядвігіна Ш. “Золата” спалучае ў сабе рэалістычныя, рамантычныя і дэтэктыўныя прыёмы і сродкі і раскрывае тэму ўлады грошай, іх згубнага ўплыву на чалавека. Падзеі ў рамане адбываюцца на Беларусі пасля адмены прыгоннага права. Цэнтральнымі героямі з’яўляюцца Мікола Стрончык, яго дачка Зося, Васіль Дубінскі, Прузына Салянічышка, Алёкса Гуронак, карчмар Лейба. Сюжэт твора будуецца вакол дэманічнай па натуры Зосі. Яна кахае Алёксу, якога бацькі хочуць ажаніць з багатай Прузынай. Люта ненавідзячы сваю саперніцу, Зося робіць закаханага ў яе Васіля Дубінскага забойцам Прузыны (яна была кінута ў калодзеж). Падазроным жа ў злачынстве аказаўся не Васіль, а Алёкса, які з-за гэтага вымушаны эмігрыраваць ў Амерыку. Зося ў хуткім часе выходзіць замуж за Васіля, сумеснае жыццё для якога становіцца невыносным, трагічным. У стане афекту (калі нованароджаную дачку назвалі Прузынай) ён кідаецца ў калодзеж. Самагубства Васіля ўспрымаецца як божае пакаранне, помста за заўчасную смерць дзяўчыны. У рамане, як адзначалася ў крытычнай літаратуры, перавага аддаецца сюжэту, дзеянню, меладраматычным сцэнам, а не псіхалагічнаму раскрыццю вобразаў, раскрыццю сацыяльна-класавых канфліктаў, што, безумоўна, крыху зніжае мастацкія вартасці твора.

**64**

ПЕРШЫ НАРОДНЫ АРТЫСТ БЕЛАРУСІ (ДРАМАТУРГІЧНАЯ СПАДЧЫНА УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тэматыка драматычных твораў У. Галубка даволі разнастайная. У іх уздымаюцца маральна-этычныя праблемы (“Душагубы”), крытыкуюцца царскія чыноўнікі і суддзі, сацыяльна-палітычныя парадкі ў царскай Расіі (“Пісаравы імяніны”, “Суд”), адлюстроўваецца жыццё ў Заходняй Беларусі (“Краб”, “Белы вянок”) і барацьба сялян у часы рэвалюцыйных хваляванняў (“Бязвінная кроў”). У сваёй творчасці аўтар аддаваў перавагу жанру меладрамы. Камедыйныя творы, пастаўленыя на сцэне з элементамі фарса, вадэвіля і батлейкі, прыемна ўражваюць і сённяшняга гледача.

Праблеме сацыяльнай няроўнасці, класаваму антаганізму ў дакастрычніцкай вёсцы прысвечаны п’есы “Плытагоны”, “Ганка”. Меладрама “Ганка” з’яўляецца адной з лепшых п’ес драматурга. Яна вызначаецца напружанасцю дзеяння, жыццёвасцю канфлікту, псіхалагізмам у абмалёўцы дзеючых асоб, арганічнай спалучанасцю трагедыйных і камедыйных элементаў. Галоўныя дзеючыя асобы — Васіль, Ганка, памешчыца-палкоўніца. У свае 18 год прыгажуня Ганка закахалася ў Васіля, які таксама моцна пакахаў яе. Але жорсткая і сквапная памешчыца, у якой выхоўваўся Васіль (як прыёмны сын) пад прымусам жэніць яго з багатай Марысяй. Безабаронную Ганку і яе бацьку (панскага пастуха) яна выганяе з дому. Зняслаўленая, Ганка канчае жыццё самагубствам, а яе бацька становіцца жабраком. Жыццё Васіля з нялюбай не склалася. У далейшым ён звязваецца з Незнаёмым, удзельнічае ў распаўсюджанні рэвалюцыйнай літаратуры. Палкоўніца ж, гатовая дзеля нажывы на любое злачынства, даносіць на Васіля ў паліцыю, за што ён трапляе ў турму. Заканчваецца п’еса вяртаннем Васіля ў родныя мясціны, дзе ён сустракаецца са сляпым жабраком і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзяўчынай-павадыром. Высвятляецца, што стары — бацька Ганкі, а дзяўчынка — Васілёва дачка. Малюючы дакастрычніцкую рэчаіснасць у такіх змрочных фабах, аўтар выносіць жорсткі прысуд бесчалавечнасці, бяздушнасці, уздымае праблему сацыяльнай няроўнасці і несправядлівасці ў грамадстве, бяспраўнага становішча ў ім простага чалавека.

П’еса “Пан Сурынта” прысвечана барацьбе беларускага народа з прыгнятальнікамі ў часы прыгоннага права. Сюжэт яе давоі складаны. Жорсткі і разбэшчаны Сурынта не лічыць прыгонных сялян за людзей, здзекуецца з іх чалавечай годнасці. Ён прымушае Касю стаць яго палюбоўніцай і тым самым разбівае шчасце закаханых Касі і Віцькі. Імкнучыся адпомсціць за здзекі і знявагі пана, Віцька становіцца кіраўніком паўстанцаў. Пазней высвятляецца, што Кася з’яўляецца роднай дачкой Сурынты, народжанай ад прыгоннай жанчыны. Пан перажывае душэўную драму, яго пачынаюць праследаваць цені закатаваных і абняслаўленых прыгонных. Не вытрымаўшы гэтага, пан Сурынта заканчвае жыццё самагубствам. П’еса, такім чынам, паказвае сацыяльна-класавы канфлікт паміж прыгоннікамі і прыгоннымі, асуджае панскую амаральнасць і разбэшчанасць.

Творчасць У. Галубка, увасобіўшы пэўныя этапы развіцця беларускай літаратуры, дала магутны штуршок развіццю нацыянальнай драматургіі і тэатра. І невыпадкова гэты таленавіты майстар слова і сцэны стаў першым народным артыстам Беларусі.

**65**

**МАЙСТЭРСТВА КАНДРАТА КРАПІВЫ — БАЙКАПІСЦА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларуская літаратура багата на таленавітыя творчыя асобы, але нават і сярод іх індывідуальнасць Кандрата Крапівы вылучаецца велічна, непаўторна, ярка. Талент сатырыка асабліва праявіўся ў жанры байкі.

Байкі К. Крапівы — самабытная з’ява ў беларускай літаратуры. Многія з іх выраслі з народных прыказак і прымавак, на прыкладзе якіх аўтар вучыўся выказваць свае думкі вобразна, сцісла, запамінальна: У чужое проса не сунь носа (“Сука ў збане”), Баба з калёс — каню лягчэй (“Дзед і Баба”), Кожны цыган сваю кабылу хваліць (“Пра Цыгана і кабылу”), Вялікаму каню — вялікі хамут (“Саманадзейны Конь”). Нямала ўласных афарызмаў пісьменнікаператварыліся ў прыказкі, прымаўкі, атрымалі агульнанародную вядомасць: *Другі баран — ні “бэ”, ні “мя”, а любіць гучнае імя* (“Дыпламаваны Баран”), *Каб сонца засланіць — вушэй асліных мала* (“Сава, Асёл ды Сонца”), *Як свінню ні кліч, яе заўсёды выдасць лыч* (“Заява”), *Бывае іншы раз і з нашым братам, што галаву заменьваюць мандатам* (“Мандат”).

Байкі К. Крапівы, “населеныя” мясцовымі жывёламі і птушкамі (свіннямі, парсюкамі, валамі, цялятамі, сабакамі, варонамі, совамі, зайцамі), бічуюць адсталыя людскія звычаі, п’янства, забабоны, пляткарства, асуджаюць бюракратаў, раскрадальнікаў народных здабыткаў, падхалімаў. Падзеі ў байках не алегарычныя, а канкрэтныя. Яны — з сялянскага жыцця, з вясковага побыту.

У байцы “Дыпламаваны Баран” сатырык расказвае пра Барана, які быў настолькі дурным, што нават не пазнаваў сваіх варот. Ганарыўся ж Баран сваім трывалым лбом:

Такога не страчаў ніколі лба я:
Калі няма разумніка другога,
Пабіцца каб удвух,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дык ён разгоніцца ды ў сцену — бух!
У іншага дык выскачыў бы й дух,
А ён — нічога.

Каб лягчэй было ўбачыць Барана і вылучыць з гурту, на шыю яму прывязалі мету, жартам назваўшы яе "дыпломам". Баран настолькі заганарыўся гэтым "дыпломам", што вырашыў паказаць сваю вучонасць перад Кошкай. Добра ведаючы абмежаванасць і тупасць Барана, Кошка растлумачыла, што свой "дыплом" ён заслужыў "не галавой, а лбом".

Крыкуноў, саманадзейных людзей, прагных да славы, ды "вузкіх у плячах", высмейвае К. Крапіва ў байцы "Саманадзейны Конь". У якасці эпіграфа да байкі сатырык выкарыстаў народную прыказку "Вялікаму каню — вялікі хамут". Конь, які быў "з сабаку, можа, так, мо з добрае шчаня", скардзіцца на ўсё сяло, што хамут "нібы не да яго", патрабуе ад Гаспадара вялікага хамута. І вось мізэрны Конь упрогся ў воз, які цягнуў ламавік. Воз жа не скрануўся з месца, а "пралезлі праз хамут канёвы персі й ногі, і затрымаўся ён аж ледзь на жываце". У вобразе Каня ўвасоблены рысы крыкуноў, людзей з прэтэнзіямі, якім не па заслугах "веліччу быць хочацца заўсёды".

Маральна-бытавыя праблемы асвятляе К. Крапіва ў байцы "Махальнік Іваноў". Яна гнеўна выкрывае падхалімаў і падхалімства. Сюжэт байкі даволі просты: ваенком, задаволены вынікамі стральбы сваіх падначаленых, вырашыў успомніць сваю маладосць і пастраляць. Стрэліў пяць разоў — і ні адна куля не закранула мішэні. Салдаты ж, якія сачылі за стральбой, далажылі (прамахалі), што ўсе кулі трапілі ў цэль. Западозрыўшы падман, ваенком пайшоў на хітрасць: пачаў страляць халастымі патронамі. Але і пасля гэтага махальнік Іваноў далажыў, што "ў цэнтру самую

ўсе пяць загналі зноў”. Шэф “пахваліў” Іванова, назваўшы яго сапраўдным падхалімам. Высмеяўшы аднаго падхаліма, К. Крапіва паказвае, што ў падхалімстве вінаваты не толькі асобныя людзі, але і грамадства ў цэлым.

Падзеям міжнароднага палітычнага жыцця прысвечана байка “Жаба ў каляіне”. Яна пачынаецца лірычнай замалёўкай летняй працы на сенакосе. “Пагода — проста нібы дым, у вёсцы ўздым”, усе напружана працуюць, стараючыся за пагодныя дні накасіць і насушыць як мага больш сена. І толькі Жабе не працуецца, ад злосці яна не знаходзіць сабе месца і, паразважаўшы трохі, вырашае перакуліць нагружаны сенам воз:

Вось толькі сяду ў каляіну,
Плячом пад кола таркану
І к чорту воз перавярну.

Вялікія патугі Жабы, але мізэрныя рэальныя магчымасці: “Тут колам — хрась!.. І кроў і гразь... Пад кола, Жаба, не падлазь”.

Байкі К. Крапівы, нацыянальна-самабытныя па характары, былі народжаны надзённымі патрэбамі часу. Яны з’явіліся дзейсным сродкам выкрыцця ўсяго таго, што перашкаджала рухацца наперад. Увабраўшы ў сябе невычэрпныя багацці жывой народнай мовы, народнай мудрасці, яны і ў наш час захавалі сваю дзейсную сілу і моц.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 66

## ВЫКРЫЦЦЁ ГАРЛАХВАЦКАГА І ГАРЛАХВАТЧЫНЫ Ў КАМЕДЫІ КАНДРАТА КРАПІВЫ “ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ”

Драматычныя творы Кандрата Крапівы атрымалі шырокае прызнанне не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Творчасць пісьменніка складае залаты фонд гісторыі тэатральнай

культуры, з'яўляецца школай мастацкага майстэрства для многіх беларускіх драматургаў. Найбольш вядомай і папулярнай п'есай К. Крапівы стала камедыя "Хто смяецца апошнім", якая адлюстроўвае атмасферу, што панавала ў краіне ў 1937—1938 гг.

Дзеянне камедыі разгортваецца ў навукова-даследчым інстытуце геалогіі, дзе дырэктарам з'яўляецца Гарлахвацкі. Да навукі дырэктар не мае ніякага дачынення: на пасаду кіраўніка інстытута яму дапамаглі ўладкавацца "сябры", выдаўшы фальшывую даведку. Гарлахвацкі адчувае сябе ў інстытуце, як рыба ў рацэ. Як гаспадар становішча, Гарлахвацкі тэрарызуе, шальмуе, запалохвае сумленных вучоных, хапаючы іх мёртвай хваткай (зусім невыпадкова драматург дае яму прозвішча Гарлахвацкі). Асабліва актыўнай стала яго дзейнасць пасля таго, як у інстытут прыйшла папера з патрабаваннем прадставіць спіс навуковых прац дырэктара. Не маючы ніводнай, Гарлахвацкі спрабуе выратаваць сваю шкуру шляхам шантажу, подкупа, пагроз, паклёпаў. І вось з яго лёгкай рукі былы настаўнік Варонежскай гімназіі Туляга раптам становіцца дзянікінскім палкоўнікам, асістэнтка Вера Міхайлаўна — распусніцай і амаральнай асобай, прафесар Чарнавус — здраднікам, ворагам народа, за што адхіляецца ад чытання лекцый, кніга яго здымаецца з выдавецкага плана, а над дачкой-студэнткай навісае пагроза выключэння з інстытута. Запалоханага Тулягу Гарлахвацкі прымушае напісаць за яго навуковы даклад.

Невуцтва і шарлатанства Гарлахвацкага поўнасцю выкрываюцца ў канцы п'есы, калі на вучоным савеце слухаецца даклад "Новы від дагістарычнай жывёліны". З сур'ёзным выглядам абараняе дырэктар тэорыю аб мамантавай свінні, напісаную

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Тулягам. Вобраз “свінтуса грандыёзуса”, праўда, асацыіруецца не з дагістарычнай жывёлінай, а з самім Гарлахвацкім.

У дасягненні жаданай мэты Гарлахвацкаму дапамагае малодшы навуковы супрацоўнік Зёлкін — падхалім і пляткар. Ён з’яўляецца правай рукой Гарлахвацкага, надзейным яго паслужнікам, які, як шкоднае зелле, атручвае вакол сябе атмасферу, сее падазронасць і недавер сярод вучоных. Не маючы здольнасцей да навукі, пазбаўлены прынцыповасці, Зёлкін можа неймаверна раздзьмуць кожную дробязь, адшукаць у выпадковым, сказаным без усялякага прыхаванага намеру слове небяспечны палітычны сэнс. Варта было яму пачуць што-небудзь дрэннае аб сваім знаёмым, як сумленны чалавек станавіўся ворагам народа.

Невуцтва і падхалімства Зёлкіна найбольш ярка праяўляюцца ў сцэне абароны Гарлахвацкім “навуковай працы”. У прадмове Зёлкін кідаецца расхвальваць вялікія адкрыцці свайго начальніка, яго канструктыўны розум, даследчыцкія здольнасці. Але калі высвятляецца, што даклад не мае навуковай вартасці і што напісаны ён Тулягам, Зёлкін, нават не чырванеючы, гаворыць адваротнае: “Я так і думаў! Не можа быць, каб вы, Аляксандр Пятровіч, такую бязглуздзіцу напісалі”.

Важную ролю ў п’есе адыгрывае Туляга. Гэта сумленны, працавіты і сціплы чалавек. Вызначальнай рысай яго характару з’яўляецца баязлівасць. Магчыма, карані яе ў былым жыцці Тулягі, прывучанага слухацца начальства, нікому не пярэчыць, быць пакорлівым. Страх Тулягі, безумоўна, абумоўлены і грамадскай атмасферай таго часу, калі існавалі ўсеагульныя падазронасць і недавер, калі чалавека без усякай прычыны маглі арыштаваць. Баючыся нават уласнага ценю, запужаны прайдзісветам

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гарлахвацкім, Туляга згаджаецца напісаць навуковую працу свайму дырэктару. Востра перажываючы сваё становішча вучонага-парабка, Туляга паступова пазбаўляецца ўласцівага яму страху. Нерашучы і баязлівы, ён у канцы камедыі з'яўляецца самым актыўным у барацьбе з Гарлахвацкім, у канчатковым яго выкрыцці. Ён піша даклад, які паказаў невуцтва лжэвучонага Гарлахвацкага, і з горда паднятай галавой, з выглядам пераможцы праходзіць паўз дырэктара. Безумоўна, шлях героя да перамогі быў нялёгкім. Пераадолець сваю баязлівасць і нерашучасць яму дапамаглі чулыя адносіны калег па працы — Чарнавуса, Веры, Левановіча. Дзякуючы іх намаганням зрываецца маска вучонага з невука і паклёпніка, высмейваецца падхалімства і прыстасавальніцтва, кар'ерызм і двурушніцтва. Апошнімі, на шчасце, смяюцца сумленныя вучоныя (у гэтым сэнс назвы камедыі).

У п'есе "Хто смяецца апошнім" выявілася майстэрства К. Крапівы як тонкага псіхолага, які знайшоў непаўторныя, індывідуальныя рысы для герояў, поўна і закончана "вымаляваў" іх партрэты. Імёны Гарлахвацкага, Зёлкіна, Тулягі, як і імёны шматлікіх гогалеўскіх і шчадрынскіх герояў, ператварыліся з уласных у агульныя. На жаль, падхалімства, нахабства, подласць, пляткарства часта сустракаюцца і ў нашы дні. Нямала ёсць людзей, якія робяць усё, каб падняцца па службовай лесвіцы, заняць больш высокую пасаду. Дзеля сваіх асабістых інтарэсаў такія людзі не грэбуюць нічым, ідуць на любую подласць. Змагацца з імі, лічыць К. Крапіва, трэба агульнымі сіламі, проціпаставіўшы невуцтву і ашуканству прынцыповасць, строгасць і ваяўнічасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**67**

## ПРАБЛЕМА ДАБРА І ЗЛА Ў КАМЕДЫІ КАНДРАТА КРАПІВЫ “БРАМА НЕЎМІРУЧАСЦІ”

Сатырычная камедыя “Брама неўміручасці” з’яўляецца вялікім дасягненнем Крапівы-драматурга. У ёй моцна праявілася сацыяльная пранікнёнасць К. Крапівы, яго ўменне арыентавацца ў складаных праблемах сучаснасці. Персанажы п’есы працягваюць галерэю сатырычных тыпаў, выведзеных у ранейшых п’есах драматурга. Сатыра ў камедыі скіравана супраць адмоўных з’яў у грамадскім жыцці — абывацельшчыны і кар’ерызму. У ёй востра ставяцца пытанні жыцця і смерці, дабра і зла, сэнсу чалавечага жыцця наогул, месца чалавека на зямлі.

Галоўным героем камедыі з’яўляецца прафесар Дабрыян. У лабаторыі, дзе ён працуе, быў адкрыты сакрэт неўміручасці. Хутка пра адкрыццё веку даведаліся амаль усе. Дабрыян стаў наваяўленай зоркай, і ў яго з’явілася шмат сяброў, аб якіх ён раней не здагадваўся. Цэлую ноч у кватэры прафесара не змаўкаў тэлефон. Прагнучых сустрэцца з ім не было магчымасці падлічыць.

Раніцай у кватэру з’яўляецца супрацоўніца Наташа і прапануе сябе ў вечныя спадарожніцы жыцця. Загадчык базы Караўкін гарантуе прафесару поўнае матэрыяльнае забеспячэнне за мандат на неўміручасць для сябе і ўсёй радні — ад дзевяностагадовай бабкі да шасцігадовага ўнука. Неўміручымі хочуць быць штатныя супрацоўнікі Мякішава і актывіст Сідаровіч, былы аднакурснік Дабрыяна Скараспей. Амерыканскі карэспандэнт Болдвін прапануе прафесару заняцца бізнесам і прадаваць за мільёны долараў ліцэнзіі на неўмірачасць за мяжу. Жыхарка з падшэфнага калгаса Алена Максімаўна хадайнічае аб неўміручасці не для  сябе, а для сваёй

старой кароўкі. Але ўсе неўміручымі быць не могуць. І таму на набыццё неўміручасці ўводзяцца цвёрдыя ліміты. Кандыдаты павінны мець не толькі добрае здароўе, але і чыстае сумленне. Жадаючыя неўміручасці абавязаны прадставіць чыстыя аналізы крыві, мачы, страўнікавага соку, даведку аб стане эндакрынных залоз, а таксама характарыстыку з месца працы. У чарзе на плошчы ідзе гандаль мачою (як пазней высветліцца, конскай). Каля прыёмнай Дабрыяна бурліць натоўп. Неўміручасць раздзяліла бацькоў і дзяцей, мужоў і жонак, сяброў, каханых. Найвялікшае адкрыццё прынесла многім крыўду і абразу.

На навуковым пасяджэнні наконт неўміручасці разгараюцца спрэчкі. Аказваецца, не ўсякі навуковы прагрэс нясе карысць чалавеку. Якія практычныя вынікі атрымаюцца з адкрыцця Дабрыяна? Навошта рабіць неўміручым зло, якога і так нямала на зямлі. А можа, лепш апраўдаць смерць як неабходную ўмову вечнага абнаўлення? І калі дыскусія зайшла ў тупік, навуковы супрацоўнік Наташа прынесла здохлага пацука, паведаміўшы, што паддоследныя здыхалі і раней, але яна іх падменьвала жывымі. Ад такога паведамлення многія прыйшлі ў разгубленасць, роспач, многія ж радаваліся такому зыходу справы, як бы гара ў іх з плеч звалілася. Калі ж спала напружанасць, Наташа расказала Дабрыяну, што пацук жыве, а такі падман яе абумоўлены жаданнем выратаваць вучонага ад націску людзей і даць яму магчымасць прадоўжыць доследы.

“Людзі няхай тым часам падумаюць, што рабіць з неўміручасцю”. Гэта пытанне ставіць перад чытачамі аўтар з надзеяй, што людзі здолеюць правільна адказаць на яго. Пад неўміручасцю К. Крапіва разумеў не фізічнае існаванне, а добрыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

справы, учынкі чалавека. Пражыць жыццё і пакінуць добрую памяць аб сабе — значыць застацца неўміручым.

## 68

## ПА СТАРОНКАХ ТВОРАЎ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА

Кузьма Чорны, прадаўжаючы і развіваючы гуманістычныя традыцыі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, аказаў значны ўплыў на развіццё беларускай аналітычнай прозы і яе эпічных жанраў. Ён з’яўляецца адным з пачынальнікаў псіхалагічай прозы. Пісьменнік адводзіў літаратуры важную ролю ў нацыянальным адраджэнні, лічыў яе “наймагутнейшай з’явай жыцця краіны, адным са сродкаў творчасці гэтага жыцця”.

Пачынаў пісьменнік свой творчы шлях на пачатку 20-х гадоў з лірычных і надзвычай эмацыянальных апавяданняў, якія па форме нагадвалі навелы ці імпрэсіі. Напісаныя на матэрыялах з жыцця вёскі і горада, яны паказвалі духоўнае абуджэнне народа.

У пачатку 30-х г. К. Чорны прыходзіць да гістарычна-канкрэтнага разумення новай рэчаіснасці. Яго ўвагу прыцягвае жыццё народа на вялікім адрэзку часу. У рамане “Бацькаўшчына”пісьменнік імкнуўся асэнсаваць і абагульніць змены ў жыцці грамадства, выкліканыя Кастрычніцкай рэвалюцыяй. Падзеі, апісаныя ў творы, ахопліваюць некалькі дзесяткаў гадоў.

Галоўным героем рамана з’яўляецца селянін Леапольд Гушка — чалавек без зямлі і бацькаўшчыны. Адвечная беднасць і нястача не заглушылі ў ім пачуцця чалавечай годнасці. Чалавек сумленны і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

цярплівы, надзелены незвычайнай сілай волі, ён не палохаецца жыццёвых цяжкасцей, “стаіць на нагах моцна”. Герой твора марыць аб набыцці кавалка ўласнай зямлі, на якой ён быў бы гаспадаром. Леапольд, як і Міхал з “Новай зямлі”, верыць, што на сваёй зямлі ён стане незалежным і шчаслівым, зажыве па-людску. Рэвалюцыя быццам бы здзейсніла мару Гушкі. Ён атрымаў некалькі дзесяцін камяністай няўдобіцы, на якой працаваў як закляты. Але змяніўся час. І герой твора становіцца змагаром за новы лад, новую бацькаўшчыну. Ён аддае ў камуну набыты з неймавернай цяжкасцю надзел зямлі і гэтым самым нібыта вызваляецца ад пакутаў уласніцтва. Логіка развіцця характару Леапольда відавочна парушаецца. І з сённяшняга пункту гледжання такія паводзіны героя рамана здзіўляюць, не паддаюцца лагічнаму аналізу і растлумачванню. Гэтым учынкам герой твора як бы перакрэслівае сваю ранейшую жыццёвую праграму. На апошніх старонках твора, даволі публіцыстычных і схематычных, мы бачым Лепольда старшынёй пагранічнага калгаса, кіраўніком пасяджэння раённага з’езда саветаў. Тут адчуваецца ўступка аўтара ідэям таго часу, калі неабходна было паказаць, як ва ўмовах савецкай рэчаіснасці былы батрак ператвараецца ў дзяржаўнага дзеяча, як селянін вызваляецца ад сляпой наіўнай веры ў сваё вызваленне шляхам набыцця ўласнай зямлі. Тэма фарміравання новага чалавека , які быццам бы ва ўмовах савецкай рэчаіснасці вызваляецца ад уласніцкай псіхалогіі, становіцца асноўнай і ў рамане К. Чорнага “Трэцяе пакаленне” .

На працягу 30-х гг. К. Чорны напісаў нямала твораў, у якіх, нягледзячы на кампраміс з часам, здолеў паказаць важныя праблемы новага часу. У аповесці “Люба Лук’янская” пісьменнік імкнуўся

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

раскрыць працэс фарміравання моцнага характару жанчыны, паказаць, як узнімаўся прыгнечаны, зняважаны і абяздолены чалавек з “дна” на высокія жыццёвыя вяршыні. Любе Лук’янскай, Валі Іваноўскай, братам Рыльскім у творы проціпастаўлены Сашка Стафанковіч і яго бацька, у вобразах якіх К.Чорны выкрыў дробнаўласніцкі ідэал жыцця чалавека, яго прыстасавальніцтва, чэрствасць, бяздушнасць і нікчэмнасць.

У творах К. Чорнага ваенных гадоў створана шырокая панарама
барацьбы беларускага народа супраць захопнікаў. Раман “Пошукі будучыні” ствараўся па гарачых слядах падзей і адлюстроўваў напружаны роздум пісьменніка аб лёсе народа ў складаны для яго час. Героі рамана больш-менш нагадваюць ужо знаёмых герояў папярэдніх твораў. Тое, што адбывалася ў мястэчку Сумлічы і яго ваколіцах, — гэта толькі невялікі эпізод барацьбы беларускага народа супраць захопнікаў. Аўтар прасочвае лёс герояў твора на працягу многіх гадоў (імперыялістычнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў). Таму ў рамане нямала экскурсаў у мінулае.

На першых старонках рамана мы сустракаемся з галоўнымі героямі твора — чатырнаццацігадовай Волечкай і шаснаццацігадовым Кастусём , якіх лёс звёў у адной хаце. Кастусь прывёз у вёску хворага нямецкага салдата Густава Шрэдэра, які ў знак падзякі за дапамогу пакінуў выратавальнікам залатыя рэчы, выграбленыя ў непрытомнага графа Паліводскага. Пазней мы ўбачым Вольгу і Кастуся сталымі, любячымі адзін аднаго мужам і жонкай, якія выхоўваюць дачку Лізу.

Значную ролю ў рамане адыгрывае вобраз простага селяніна-працаўніка Нявады, якому ў першую сусветную вайну бало суджана

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зведаць пакуты акопнага жыцця і нямецкага палону. Пасля многіх гадоў блуканняў і пакут ён вярнуўся ў родную вёску, сустрэўся з дачкой і дачакаўся ўнучкі. У дзецях Нявада бачыў будучае, прадаўжэнне сябе. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён аддае ўсе сілы для выратавання ўнучкі з канцэнтрацыйнага лагера і, не здейсніўшы гэтага, гіне. Унучку вызвалілі з палону партызаны на чале з Кастусём.

У творы яскрава выпісаны фашысцкія вылюдкі і іх паслугачы (стары і малодшы Шрэдэры, граф Паліводскі, Акаловіч). Салдат кайзераўскай арміі стары Густаў Шрэдэр спрабаваў знайсці будучыню сярод забітых на полі бою салдат, у якіх ён забіраў залатыя рэчы і грошы. Густаў марыў пабудаваць для свайго сына маёнтак, але трапіў у палон і павёз назад у Германію толькі злосць на сябе. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Шрэдар старэйшы зноў з’явіўся ў гэтых мясцінах, дзе яго сын , вырасшы пры фашызме, узначальваў акупацыйную ўладу, быў камендантам канцэнтрацыйнага лагера, забойцам. К. Чорны ў творы сцвярджае, што будучыні ў забойцаў не можа быць. І Шрэдэры, і Акаловіч гінуць ад партызанскіх куль.

На лёсе людзей невялічкага мястэчка К. Чорны паказаў барацьбу ідэй, поглядаў на свет у складаны для Беларусі час. Пісьменнік у творы ўпэўнівае, што вораг будзе выгнаны з беларускай зямлі, што беларускі народ не загіне ад чорнай фашысцкай навалы.

**69**

**ЦІ БЫЎ МІХАЛ ТВАРЫЦКІ ВОРАГАМ НАРОДА? (ПА РАМАНЕ К. ЧОРНАГА “ТРЭЦЯЕ ПАКАЛЕННЕ”)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Раман “Трэцяе пакалення” — адзін з найбольш вядомых твораў К. Чорнага, які часта называюць трагічнай старонкай гісторыі беларускай культуры і літаратуры.

Сам К. Чорны, адчуваючы супярэчнасці ўласнай пазіцыі і складанасці таго часу (а яму давялося перажыць васьмімесячнае турэмнае зняволенне), у чацвёртае выданне 1941 г. унёс пэўныя карэктывы і папраўкі. Праўда, яны не мянялі ідэйную канцэпцыю твора, а толькі кроху прыглушалі, змякчалі віну Міхала.

Міхал Тварыцкі — адзін з галоўных герояў рамана. Каб пракарміць сям'ю, Міхал вымушаны быў працаваць пастушком на хутары Скуратовіча. Тут ён сустрэўся з жорсткімі законамі эксплуатацыі, з прыніжэннем чалавечай годнасці, з сілай уласніцтва і багацця.

Запалоханы, Міхал Тварыцкі пойнасцю трапіў пад уладу Скуратовіча, які падачкамі і “спагадай” бярэ ў палон душу хлопца, нявечыць яе, выхоўвае страх перад людзьмі і жыццём. Паступлова ў душы Міхала прарастаюць зярняты эгаістычнай філасофіі: “Спадзявайся толькі на сябе, бо чалавек чалавеку воўк. Трымай пры сабе і свае думкі, і ўсё, што маеш, збірай багацце...” І гэта “філасофія”, засвоеная героем рамана з дзяцінства, стане ў далейшым вызначальнай у паводзінах Міхала.

Пасля рэвалюцыі і грамадзянскай вайны Міхал стаў самастойным гаспадаром (прыдбаў каня, карову, паставіў хату і гумно). Але не складваюцца адносіны ў сям'і: муж не разумее жонкі, а жонка мужа. Іх адносіны асабліва абвастраюцца, калі Міхал знайшоў украдзеныя з банка грошы і прысвоіў іх. Бясспрэчна, віна Міхала не выклікае сумнення. Ім авалодала адно імкненне: больш прыдбаць, стаць багацейшым. Але Міхал, жывучы цяжка і пакутліва,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

заслугоўвае хутчэй спачування, чым асуджэння. Няўпэўненасць у заўтрашнім дні, страх перад будучыняй, трывога за лёс дачкі не даюць яму спакою. Хто ж паклапоціцца аб сям'і? Толькі сам гаспадар. Разлічваць на клопаты з боку ўлады і на пераўтварэнні, якія павінны былі наступіць дзякуючы калектыўнай працы, герой твора не мог. Жонка ж не спрабуе дапамагчы Міхалу, а, наадварот, сама таго не ўсведамляючы, разбурае сям'ю, робіць мужа злачынцам. Так было тады, у 30-я гг., калі сын выдаваў бацьку, як Паўлік Марозаў ці Міколка з аповесці В.Быкава "Аблава", а жонка — мужа, як у гэтым рамане.

У час суда над Міхалам Зося, Назарэйскі і суддзі льюць на яго бруд, выкрываюць як ворага народа, уласніка. Але што ж гэта за вораг, які ад цямна да цямна працуе на сваёй зямлі і шчасце сваё бачыць у працы? Нават у лагеры Міхал працуе, як вол, знаходзячы ў працы "найвялікшую асалоду". Назарэўскі, абаронца дзяржаўных інтарэсаў, яшчэ здзекуецца з Міхала, называючы "працавічком". Ён спрабуе даказаць, што Тварыцкі здольны прадаць і Радзіму. Але доказаў гэтым хісткім, надуманым абвінавачанням мы не бачым.

Грамадскі абвінаваўца ў сваёй прамове насміхаецца з парванай смярдзючай адзежыны Міхала. А чаму ж улада, якую і прадстаўляе Назарэўскі, не паклапацілася аб лепшым адзенні для селяніна? Сабраную ж капейку аднаасобнік пускаў не на моднае адзенне, а на набыццё новага плуга, сеялкі. Сваёй іроніяй Назарэўскі засведчыў адарванасць ад набалелых праблем вясковага жыцця. Для людзей такога тыпу суд над Міхалам — не трагедыя чалавека, а выпадак, на прыкладзе якога можна было прыстрашыць іншых. Судзяць Міхала не толькі за прысвоеныя грошы, але і як хутараніна, аднаасобніка, які не хацеў падпарадкоўвацца загадам, а шукаў, як і героі Я. Коласа,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“новую зямлю”, спрабаваў ісці сваім шляхам. Гэты аднаасобнік, названы ворагам народа, хацеў звычайнага чалавечага шчасця. Незразумела, пры чым тут уласніцтва, калі селянін меў сваю зямлю, хату, гумно, каня? Хіба ж сёння ў нас называюць уласнікам таго, хто мае сваю хату ці кватэру, машыну? Гэта звычайныя рэчы, без якіх немагчыма асабістае існаванне. А вось у 30-х гг. гэтага не хацелі разумець як Назарэўскі з Зосяй, так і іншыя прадстаўнікі савецкай улады. Спачатку сялянам давалі зямлю, а затым, калі яны, дзякуючы сваёй працавітасці і ўпартай цягавітасці, пачыналі жыць крыху лепш, адбіралі. Сялян абвінавачвалі ва ўласніцтве, кулацтве, арыштоўвалі і без суда адпраўлялі ў папраўча-працоўныя лагеры ГУЛАГа ці на той свет. Раскулачванне, а затым прымусовая калектывізацыя амаль поўнасцю разбурылі сельскую гаспадарку. Вынікі гэтых працэсаў даволі балюча адчуваюцца і зараз, амаль праз паўстагоддзе.

Прайшоў час. І з сённяшняга пункту гледжання Міхала Тварыцкага нельга лічыць увасабленнем уласніцтва, злачынцам, ворагам народа. Ён, як лічаць сучасныя даследчыкі М. Мушынскі, І. Жук, Т. Грамадчанка, А. Ленсу, з’яўляецца ахвярай ненармальных сацыяльных адносін, нявольнікам лёсу. Гэтага селяніна, які заблудзіўся ў жыцці, якога лаюць, цкуюць, выхоўваюць свае і чужыя людзі, на самай справе можна лічыць гаспадаром жыцця — з тых, на якіх у той час моцна трымалася вёска.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 70

## “... І СЯБЕ АСУДЗІЎ НА ПАКУТЫ” (ТВОРЧАСЦЬ ПЯТРА ГЛЕБКІ)

О Беларусь, мая калыска,
Жыццё маё, прытулак мой!
З гарачаю любоўю нізка

Схіляюся перад табой.

*П. Глебка*

П. Глебка прыйшоў у літаратуру ў 20-я гады. У першых яго творах адлюстроўваліся настроі той моладзі, якая аптымістычна глядзела ў будучыню, верыла ва ўсталяванне справядлівых сацыялістычных адносін у грамадстве:

Сэрца, думкі — гэй, наперад!
Бо не нам у смутку жыць.
У душы — стальная вера, —
Значыць, буду ў шчасці жыць.

Вершы першай кнігі паэта "Шыпшына" напісаны крыху ў іншым кірунку. У іх больш філасофскай разважлівасці, псіхалагічнай паглыбленасці, лірызму. Тэматыка твораў П. Глебкі пашыралася за кошт вершаў пра жыццё вёскі і стваральную працу ("Радасць вёскі", "Красавала жыта", "Песня жняі"), каханне ("Краса маладосці", "Чуе сэрца трывожнае штосьці"). Творы пазнейшых зборнікаў прысвечаны ўслаўленню Кастрычніцкай рэвалюцыі, перамогі ў грамадзянскай вайне, поспехам у сацыялістычным будаўніцтве, вялікім правадырам Леніну і Сталіну (паэмы "Трывожны сігнал", "Арлянка", "Арка над акіянам", "Мужнасць", "У тыя дні"). Яны характарызуюцца аптымістычным светаадчуваннем, актыўным успрыманнем паслярэвалюцыйнага жыцця, рытарычнасцю, афіцыёзнасцю, адсутнасцю глыбіні аналізу.

У творчай спадчыне П. Глебкі вылучаюцца вершы перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Яны даносяць да чытача подых вайны, у іх чуецца гнеў і помста, крык болю кожнага сэрца, трывога і сум па родных і блізкіх. У вершы "Пасылка" паэт узнаўляе эпізод з франтавога жыцця: байцы атрымоўваюць пасылкі — невялікія падарункі, зробленыя рукамі дзяцей, маці, сясцёр, сябровак. Воін-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларус не чакае лістоў і пасылак, бо яго сям'я і родныя засталіся на часова акупіраванай радзіме. Але тут адбываецца нечаканае: яму прыносяць пасылку (хусцінку і кісет) ад незнаёмай грузінскай дзяўчыны, для якой гэты ўчынак — сімвал еднасці людзей розных нацыянальнасцей, пэўная далучанасць да тых, хто аказаўся на перадавой. І радасць, удзячнасць запаланяюць душу байца:

Я прыняў дарунак мілы
Перад боем уначы
І да самае магілы
Буду шчыра берагчы.

Смутак па бацькоўскай зямлі, што апынулася ў няволі, вялікая любоў да яе, гордасць за свой народ, які мужна ўзняўся супраць акупантаў, выліліся ў вершах "Вінтоўка", "Пісьмо з няволі", "Партызаны", "Беларусі", "Райком". Героем верша "Родны хлеб" з'яўляецца партызанскі пасланец з-пад Гродна, які па даручэнні партызан павінен перадаць праз лінію фронта звесткі. З сабой у дарогу партызан бярэ хлеб, "не квашаны і не салёны, для важных печаны патрэб". Воін не адломіць ад гэтага хлеба ні кавалка, пакуль не дойдзе да месца. І толькі мінуўшы ўсе перашкоды і небяспечныя месцы, хлопец, як самы дарагі скарб, дастане з кайстры "запрацаваны ў поце хлеб", пачастуе ім сяброў:

І — божа мой! — якім духмяным
Павее водарам яна.
Адразу кожны стане п'яным,
Але не з горкага віна.
Ён будзе п'яны з успамінаў
Аб нашай роднай старане,
Аб той калысцы і краіне,
Дзе маці песціла мяне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Хлеб у вершы — увасабленне Радзімы, яе цеплыні, ласкі і сумлення. Гэта сімвал жыцця, нязломнасці, веры ў хуткі надыход перамогі.

Нямала твораў у П. Глебкі пра мірную стваральную працу, мужных людзей, аднаўленне разбураных вайной гаспадарак. Сапраўдным гімнам у гонар чалавека-творцы з’яўляецца верш “Рака”. Ён уяўляе сабой філасофскі роздум аб прызначэнні чалавека на зямлі. Жыццё чалавека ў ім параўноўваецца з ракой. Вось цякуць струмені будучай ракі, вырываюцца з багны на шырокі прасцяг і становяцца ручаём. Чалавек, як кроплі ручая не можа быць адзін, ён заўсёды імкнецца да яднання з людзьмі, шукае дружбы. Ручаі, з’яднаныя ў адну раку, становяцца вялікай сілай. Рацэ-маці трэба жывіць нівы, паіць статкі, круціць млыны, несці на сваіх хвалях параходы. Яе шлях поўны сэнсу, высакароднага служэння людзям. І ў чалавека свой вялікі шлях, сваё ўласнае прызначэнне на зямлі, справы і турботы. І гэтыя справы павінны быць скіраваны не на ўласны дабрабыт, а на стварэнне шчасця для ўсіх людзей.

Ёсць у П. Глебкі творы пра мастацтва, прызначэнне паэта і паэзіі (“Скарга”, “Пра хімію і паэзію”). Мастак, на думку паэта, павінен быць патрабавальным да сваёй творчасці і сябе, знаходзіцца ў няспынным пошуку:

Шмат нам трэба зрабіць: можа тысячы
Пераабраць варыянтаў і тэм,
Каб з адзінай, як з мармуру, высечы
Вобраз, варты жыцця і паэм.

У незакончанай паэме “Дасэні” П. Глебка разважае аб грунце, на якім вырасла і трымаецца паэзія:

Усёй паэзіі аснова —
Пульс няўрымслівы радка і пачуцця,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не хараство нямога слова,

А хараство твайго жыцця.

У паэме “Карменсіта” аўтар спрабуе прааналізаваць свой творчы шлях, драматызм становішча мастака, які вымушаны служыць афіцыяльнай літаратуры і не можа вырвацца з кола аднастайных і казённых вобразаў і тэм.

Я сам у вершах сваіх чую

Іронію калючых слоў,

Фальшывую,

Наскрозь чужую,

Якой дагэтуль не было.

Верш “Скажы мне, краіна” прадаўжае гэтыя думкі. У ім аўтар канстатуе факт свайго служэння кан’юнктуры, сацыяльным заказам, патрабаванням афіцыйнай дактрыны і масавай пралетарскай культуры. І ў гэтым — сведчанне глыбокай драмы П. Глебкі, які ў пэўны момант не мог выстаяць перад жорсткасцямі тагачаснага жыцця і стаў ідэйным прапаведнікам літаратуры сацыялістычнага рэалізму.

**71**

## ПАЭЗІЯ ВОГНЕННЫХ ГАДОЎ

Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны характарызуецца высокім і напружаным гучаннем, тонкім сплавам палымянай публіцыстычнасці, грамадзянскай страснасці і спавядальнасці. Увесь свой талент і паэтычныя здольнасці аўтары скіроўвалі на тое, каб паказаць жорсткасць і бесчалавечнасць ворага, натхніць воінаў на гераічную барацьбу, уславіць іх мужнасць, адвагу, самаахвярнасць, упэўніць веру людзей у хуткую перамогу над фашызмам. Галоўнымі ў літаратуры ваенных часоў з’яўляліся “аператыўныя” жанры —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вершы-заклікі, вершы-звароты, балады, фельетоны, нарысы. У аснове многіх з іх — рэальныя ваенныя факты: звесткі аб падзеях на фронце, прыклады гераізму воінаў, эпізоды партызанскай і падпольнай барацьбы.

Воін-франтавік з’яўляецца героем многіх твораў ваенных часоў. Верш П. Броўкі “Спатканне” можна назваць салдацкай біяграфіяй. За плячыма воіна-салдата цяжкія ваенныя дарогі, гора, слёзы родных і блізкіх, смерць сяброў. З баямі ён дайшоў да бацькоўскай зямлі, знаёмых з дзяцінства мясцін, якія з цяжкасцю пазнаў. Пры відовішчы “засмучаных хат”, “здратаваных ніў”, “зганьбаванай” зямлі сціснулася ад болю сэрца салдата, запалала агнём помсты:

Гляньце ў сэрца маё, —
Я прынёс яго з бою.
На агні яго можна
Мячы гартаваць.

І мы верым, што не супакоіцца воін да таго часу, пакуль не дачакаецца канчатковай перамогі над ворагам, бо гэта яго вялікі абавязак перад народам і Айчынай.

Блізкім да “Спаткання” з’яўляецца верш П. Панчанкі “Кожны з нас прыпасае Радзімы куток...” У ім паэт расказвае пра цяжкія падзеі 1941 г. З акружэння на ўсход, за лінію фронту, прабіраюцца нашы воіны, адзін з якіх — беларус. Трапіўшы ў аршанскія лясы, родныя мясціны, баец падпоўз да сяла, расхінуў асцярожна куст юы і знямеў — каміны... каміны... Многа фашысцкіх здзекаў паспеў пабачыць салдат на спапялёнай і здратаванай ворагам роднай зямлі, але такое... Немагчыма было пазнаць родны куток: з усяго жывога застаўся толькі абгарэлы клён, які пасадзіў калісьці яго бацька. Вакол горкі пыл, жудасная цішыня, ні стуку, ні груку. І салдат упаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на зямлю, якая “прытулілася целам магутным” да яго, нібы просячы абараніць яе ад злых ворагаў-ліхадзеяў. У сэрцы салдата, што зведала горыч адступленняў, нечалавечы боль па ахвярах, па паланёнай Радзіме, мацнее яго нянавісць да ворагаў.

І прамыла раса мае сумныя вочы,
Каб убачыў я ўсё, каб запомніў усё,
Каб я думаў пра помсту і ўдзень, і ўночы.

У вершы П. Панчанкі “Герой” цесна перапляліся суровы рэалізм, глыбокі псіхалагізм, высокае гераічнае і трагічнае гучанне. Гэты невялічкі твор стаў сапраўдным помнікам простаму салдату, які вынес усе нечалавечыя пакуты вайны, сваім жыццём абараніў Радзіму. Ідзе наступленне, перад воінамі паўстае перашкода — калючы дрот. На ўвесь рост падняўся салдат

І лёг на змяіныя скруткі дроту.
І дзвесці салдацкіх запыленых ботаў
Прайшлі па яго спіне.

Салдат ахвяруе сваім жыццём, каб даць магчымасць іншым перамагчы ворага, хоць на некалькі хвілін прыблізіць перамогу.

Моцным антыфашысцкім пафасам, заклікам да змагання вызначаецца ваенная паэзія Я. Купалы. Асаблівай папулярнасцю ў народзе карыстаўся яго верш “Беларускім партызанам”, у якім аўтар пасылаў праклён Гітлеру-вампіру, фашысцкім псам, заклікаў партызан і ўвесь народ да барацьбы з лютым ворагам:

Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны.

Верш прасякнуты палымяным патрыятызмам, непахіснай верай у перамогу народа-змагара.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У вершы “Зноў будзем шчасце мець і волю” Я. Купала не толькі выказваў веру ў хуткую перамогу, але і прадбачыў той час, калі адновяцца зруйнаваныя гарады і сёлы, змоўкне кананада, мірна ўздыхнуць людзі.

У ваеннай лірыцы М. Танка (зборнікі “Вастрыце зброю”, “Праз вогненны небасхіл”) цэнтральнае месца займае вобраз Беларусі-партызанкі, паланёнай, але няскоранай. Паэт адчуў ніці, што звязваюць вайну на перадавой з бацькоўскім краем, перадаў трывожныя думы маці, якія чакаюць сыноў, жанчын, якія ў думках разам з мужамі і братамі ў баі. У паэзіі ваенных гадоў поруч з матывамі пагрозы фашызму выразна адчуваецца вера ў перамогу дабра над сіламі зла. Герой ваеннай лірыкі Максіма Танка ні на імгненне не забывае, за што, у імя чаго ён змагаецца. Вайна для яго не прызванне, а цяжкі, неабходны абавязак.

У гады Вялікай Айчыннай вайны А. Куляшоў сварыў цэлы баладны цыкл пра подвіг беларускага народа ў гады ліхалецця, у межах якога вылучаюцца вершы-балады “Млынар”, “Над брацкай магілай”, “Ліст з палону”, “Маці”, Балада аб чатырох заложніках”, “Балада аб знойдзенай падкове” і інш. Яны грунтуюцца на пэўных выпадках, эпізодах, здарэннях і з’яўляюцца адбіткам суровай біяграфіі ваеннага пакалення.

Пахаванне забітых воінаў-беларусаў каля вёскі Лажыны, што пад Старай Русаю, — такі асноўны змест верша “Над брацкай магілай”. Перадаючы момант пахавання, аўтар паказвае нясцерпны душэўны боль і незвычайную стрыманасць, уласцівую людзям, моцным духам. Ад імя ўсіх жывых салдат салдаты клянуцца здзейсніць запаветную мару загінуўшых — адпомсціць ворагу,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вызваліць радзіму ад чужынцаў. Воіны гатовы ісці на любыя выпрабаванні ў імя вызвалення Айчыны:

Беларусь мая родная,
Як жа я рвуся яшчэ раз
Пеша ўсю цябе змераць,
Увесь і чабор твой, і верас!...

Наглытацца хачу туманоў,
Твайго ветру і пылу;
Наглытацца хачу за сябе і за тых,
Што не ўстануць з нябыту;
Вочы просяць нябёсаў тваіх,
Ім твайго не хапае блакіту.

Верш "Ліст з палону" напісаны ад імя паланянкі, якую фашысты вывезлі ў няволю. Дзяўчына прадчувае пакуты і выпрабаванні, што выпадуць на яе долю, і гатова з годнасцю прайсці праз іх. У маналогу, звернутым да каханага, яна просіць адпомсціць за яе і ўсіх бязвінных ахвяр фашызму. Верш "Маці", напісаны паводле народнай балады, прысвечаны самаахвярнасці маці, яе гатоўнасці ў любы момант засланіць сваіх дзяцей ад бяды і небяспекі. У ім расказваецца аб цяжкім чаканні маці свайго сына. На шчасце, каб сын хутчэй вярнуўся з паходу, маці пасеяла зярняткі. Але яны ўпалі на камень і не ўзышлі. Дарэмна чакае маці:

Не ўзыдуць зярняты,
Бо ўпалі на камень шчарбаты.
Не першая ты
Каля камня заходзішся з жалю.
Не раз на ім сеялі, але ні разу не жалі.

І тады маці тройчы пракляла камень. Ад матчыных слёз "стаў камень зямлёю, сама ж яна каменем стала". Толькі тады ўзышлі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зярняты і дахаты вярнуўся сын. Вось такая вялікая моц матчынай любові і вернасці.

Творы беларускіх паэтаў перыяду Вялікай Айчыннай вайны вызначаюцца яркай палымянасцю, публіцыстычнасцю, страснасцю. Яны ўслаўляюць гераізм, рашучасць і самаахвярнасць воінаў-змагароў і партызан. У іх гучыць узнёсла-балючы голас чалавека, грамадзяніна, байца, голас нянавісці да ворагаў і ўпэўненасці ў перамозе і вызваленні Радзімы.

**72**

## "О БЕЛАРУСЬ, МАЯ ШЫПШЫНА..." (ТВОРЧАЦЬ УЛАДЗІМІРА ДУБОЎКІ)

Жыццё закон нязломны мае:
ніколі праўда не ўмірае.
*У. Дубоўка*

Творчы лёс аднаго з арганізатараў "Маладняка", актыўнага ўдзельніка "Узвышша" Уладзіміра Дубоўкі трагічны: амаль 28 гадоў ён знаходзіўся ў высылцы на Далёкім Усходзе і ў Сібіры. Нягледзячы на гэта, творы паэта сагрэты цеплынёй і пяшчотай, захапленнем роднай старонкай, хараством яе прыроды.

Пачаткам творчай дзейнасці "вялікага пакутніка" лічыцца 1921 год, калі быў надрукаваны яго верш "Сонца Беларусі". Затым выйшлі зборнікі "Строма" (1923), "Трысцё" (1925), "Credo" (1926), "Наля" (1927). Рамантычнаму пафасу, рэвалюцыйнай ідэйнасці, узнёсласці твораў, характэрных для маладнякоўскага перыяду, папярэднічалі матывы безнадзейнасці, трывожнага роздуму над сучаснасцю і будучыняй роднай зямлі. Падзеям пачатку 20-х гг., калі не зусім акрэсленым уяўлялася будучае жыццё, прысвечаны верш

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

"Імжа, і склізота, і прыкрая золь". У ім пераважаюць змрочныя, чорныя фарбы:

Імжа, і склізота, і прыкрая золь
за скрогатам ветру — навалай.
У чмарнасць убралася светава столь,
блакіт ад зямлі адарвала.
Журба расплялася кудлатай лазой,
у сэрцы цярушыцца шэрань.
А вецер шпурляе, як морскі прыбой,
пясок і журбу аб каменне.

І толькі апошнія радкі даюць надзею на выратаванне з гэтай варожасці, імжы, журбы: "а ўпартасць да мэты вядзе і вядзе, пра шчасце і радасць варожыць..."

Верай у нязломнасць народнага духу, упэўненасцю ў перамозе над усім варожым прасякнуты класічны верш У. Дубоўкі "О Беларусь, мая шыпшына". Ён пабудаваны на проціпастаўленнях, кантрастах. З аднаго боку, у ім прысутнічаюць рэвалюцыйна-рамантычныя вобразы, традыцыйныя для літаратуры 20-х гг. (праменне яснае, радасць, Камуна Свету), а з другога — песімістычныя, змрочныя фарбы (вецер дзікі, варожасць шляху, перашкоды). Тут, быццам, і жахліва-цяжкае прадказанне Чарнобыля, і вера ў паратунак. Аднак, нягледзячы на кантрастнасць вобразаў і фарбаў, верш гучыць аптымістычна:

О Беларусь, мая шыпшына,
зялёны ліст, чырвоны цвет!
У ветры дзікім не загінеш,
чарнобылем не зарасцеш.

Філасофская паглыбленасць, зварот да агульначалавечых праблем уласцівы вершу "Ніколі праўда не ўмірае". У алегарычнай форме ў ім сцвярджаецца неўміручасць праўды жыцця:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Жыццё закон нязломны мае:
ніколі праўда не ўмірае.
Адно хоць зернетка малое
ды застанецца пра былое.
Ні на пяску, ні на каменні
ушчэнт не выпетрае зерне:
узыдзе, ўсходы будуць з плёнам,
з адзінак вырастуць мільёны...

Талент У. Дубоўкі асабліва выявіўся ў жанры паэмы (“Там, дзе кіпарысы”, “Кругі”, “Крычаўская спакуса”, “Браніслава”, “І пурпуровых ветразей узвівы”, “Штурмуйце будучыні аванпосты!”). Большасць з гэтых твораў вызначаецца складанай кампазіцыяй, арганічным спалучэннем літаратурнага тэксту і скарбаў вуснай народнай творчасці (казак, легенд, паданняў, прытчаў, песень). Народная творчасць, на думку аўтара, ніколі не можа страціць сваёй пазнавальнай, філасофскай і эстэтычнай вартасці. Яе нельга выкрасліць з мастацкай літаратуры:

Цудоўны скарб у творчасці народнай
для нас сабраны мудрымі дзядамі.
Яго адкінуць — значыць без пашаны
паставіцца да продкаў працавітых.

Паэма “Крычаўская спакуса” ўзнаўляе гераічную старонку барацьбы жыхароў Крычава з панскімі ваякамі. І хаця паўстанне было жорстка падаўлена, яно расказала свету аб мужных і смелых крывічах, для якіх лепш “загінуць за шчасце аднойчы, чым да магілы пакутаваць з горам”.

Паэма “І пурпуровых ветразей узвівы” напісана ў форме дыялога Лірыка і Матэматыка, які характэрызуецца вострай напружанасцю, непрымірымасцю пазіцый. Псеўданаватарскі падыход да развіцця літаратуры, фальшывая паэтычнасць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

упэўненасць у неабходнасці ўсеагульнай машынізацыі выклікаюць адмоўную рэакцыю да Матэматыка. Для Матэматыка народная паэзія — нікому не патрэбная рэч і пра яе трэба забыцца:

У нашы дні руін і будаўніцтва,
і дыктатуры пралетарыяту
патрэбны нам паэты-змагары, —
не ліквідатары, не смутнагляды...
Павінны мы тварыць на грунце новым
сучаснае мастацтва для працоўных.

Духоўную перавагу аўтар аддае Лірыку і яго глыбокаму жыццёваму розуму, цвярозаму стаўленню да з’яў рэчаіснасці, праўдзе, мудрасці. Ён лічыць, што літаратура павінна развівацца на аснове спадчынных традыцый і народнай творчасці.

У паэме “Штурмуйце будучыні аванпосты!”(напісана ў 1929 г., апублікавана ў 1965 г.) У. Дубоўка выказвае свае погляды адносна калектывізацыі, адкрыта пратэстуючы супраць гвалтоўнага аб’яднання сялянскіх гаспадарак.

У першым нумары часопіса “Беларуская культура” за 1927 год быў надрукаваны верш У. Дубоўкі “За ўсе краі, за ўсе народы свету...” (другая назва — “На ўшанаванне новага падзелу беларускай зямлі”). У ім востра крытыкавалася акупанцкая палітыка бальшавікоў, адлюстроўваліся праўдзівыя настроі і думкі беларускага народа. Гэта з’явілася асноўнай прычынай арышту і ссылкі У. Дубоўкі.

Пасля вяртання з ссылкі У. Дубоўка напісаў шматгранную паліфанічную кнігу вершаў і паэм “Палеская рапсодыя”, вершаваныя казкі для дзяцей “Цудоўная знаходка”, “Залатыя зярняты”, “Кветкі — сонцавы дзеткі”, апавяданні-ўспаміны “Пялёсткі”, шэраг крытычных артыкулаў. Безумоўна, гэта з’яўляецца толькі невялікай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

часткай вялікага таленту шматпакутнага і цярплівага паэта, які, спазнаўшы на ўласным вопыце ўсе жахі таталітарнай сістэмы, змог выжыць, выстаяць, перамагчы.

**73**

## МАТЫВЫ І ВОБРАЗЫ ПАЭЗІІ УЛАДЗІМІРА ЖЫЛКІ

...Дух творчы Беларусі
Жыве й змагае ў вяках.
*У. Жылка*

Паэт рамантычнага складу і трагічнага лёсу, Уладзімір Жылка ўвайшоў у літаратуру на самым пачатку 20-х гадоў. Яго хвалявала становішча і далейшы лёс Айчыны ў цяжкія для яе гады.У сімвалічных вобразах У. Жылка паэтызаваў служэнне Бацькаўшчыне, змаганне за яе лепшую будучыню. У вершы “Віхор” аўтар паказвае абуджэнне беларускага народа і яго імклівы непераможны рух да свайго гістарычнага самасцвярджэння:

Грыміць, гудзе ўсё недарэчнае,
Штораз віхор гучней, прудчэй.
Услухайся, паймі адвечнае —
І гімны вырвуцца з грудзей.
Пара, пара дазнацца, зверыцца
Сваіх магутных сонных сіл!
Адважны, хто спыніць намерыцца
Размах жыцця і творчы пыл...

Праўда, не зусім акрэсленымі ўяўляюцца паэту шляхі, якўя прывядуць да незалежнасці: “Дзе йдзем? І дзе капцы канцовыя? Дзе ходу нашаму мяжа?..”

Блізкімі да гэтага верша па пафасе і тэматыцы з’яўляюцца вершы “Мы любім даўнія паданні...” і “Ізноў пытанні...”. У іх таксама няма адказу на пытанне аб шляхах выхаду з няволі. У радках

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

верша “Ізноў пытанні...” чуецца знітаванасць лірычнага героя з нявольным краем, патрыятычная адданасць яму.

У творах У. Жылкі назіраецца арыентацыя на класічныя формы еўрапейскай паэзіі, на традыцыі філасофскай лірыкі М. Багдановіча. Так, верш “Палімпсест”, які пераклікаецца з багдановічаўскімі “Перапісчыкамі”, “Летапісцам”, “Кнігай”, можна назваць сімвалам нацыянальнага адраджэння. Як палімпсесту ( старажытнаму сцёртаму рукапісу, сэнс якога “пайме не кожны”) патрэбна ачышчэнне ад пылу і наліплага бруду, так і краіне з яе “багаццем і хараством прыроды” неабходна ачышчэнне ад “вяковага бруду паганага”, адраджэнне сваёй гісторыі (“прошласці слаўнай”), сваіх каранёў і вытокаў.

У творчасці У. Жылкі, не ацэненай пры жыцці належным чынам, нямала разважанняў аб лёсе чалавека, які павінен быць свабодалюбівым, непакорным, з бунтарскім духам, з усведамленнем сваёй чалавечай годнасці. Толькі тады магчыма перамога. “Лепш быць пакутнікам, жабраком, чым рабом”, — сцвярджае паэт у вершы “Ляпей жабрачы лёс”:

Ляпей жабрачы лёс,
У рукі кій, за плечы торба;
Ляпей страха нябёс,
Бясконцы шлях і ліры корба;
Ляпей чужыны золь,
Сцякаць ад чорнай працы потам;
Ляпей, не змогшы боль,
Сканаць самотнаму пад плотам —
Але не лёс раба...

Такая ж думка выказваецца і ў вершы “Праметэй”. Вобраз Праметэя надзелены рысамі гордага змагара. Ён, нягледзячы на свае пакуты і прыніжэнні, што церпіць ад Зеўса, не можа скарыцца: “З

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гордых вуснаў не вылеціць стогн! Пакарацца, хіліцца не мне!” Гэты верш, на думку І. Багдановіч, “ можа ўспрымацца як сімвал зняволенага і раскрыжаванага роднага Краю, які зазнаў на сабе “магутны, няправедны” прымус”.

Пра былую веліч і славу краіны, калі яе сталіцай была Вільня, вядзецца размова ў “Вершах аб Вільні”. Твор прасякнуты настальгіяй па мінуўшчыне, калі Вільня была канкрэтным сведчаннем волі, росквіту і духоўнасці, кансалідуючым сімвалам вызваленчых ідэй беларускага народа. Лірычны герой вершаў называе горад крывіцкай Меккай, местам родным, любым. І таму зразумелым становіцца жаданне паэта пасля смерці быць пахаваным толькі ў Вільні. Уяўленнем свайго сімвалічнага пахавання “на могілках зацішных Росы” заканчваецца апошні твор У. Жылкі — паэма “Тэстамент”.

Творы тыпу жылкаўскага “Тэстаменту” вядомы ў беларускай літаратуры з даўніх часоў (гл. “Дыярыуш” Афанасія Філіповіча, “Пісьмо з-пад шыбеніцы” К. Каліноўскага). Па складзе паэма лічыцца аўтабіяграфічнай, філасофска-медытатыўнай. У цэнтры яе лірычны герой, у спавядальным маналогу якога — роздум над сваім лёсам, над прызначэннем творцы наогул. Аўтар як бы апраўдвае паэта (песняра і змагара) за міжвольныя грахі, якія ён мог дапусціць на цяжкім жыццёвым шляху. Грахі гэтыя зямныя, чалавечыя, і людзі змогуць знайсці ім вялікадушнае апраўданне, бо паэт заўсёды імкнуўся захаваць у сабе вышыню чалавечага духу. Асэнсоўваючы жыццёвы і творчы шлях, паэт сцвярджае агульначалавечыя прынцыпы жыцця:

На зломе дзвюх эпох злавесным,
У неспрыяльным ветры злым
Сваё жыццё прайшоў я чэсна:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пясняр, змагар, бядняк праз век, —
Быў перш за ўсё я чалавек.

Складаючы апафеоз зямлі, радзіме, працоўнаму чалавеку, паэт хоча пакінуць нашчадкам прыгожую, квітнеючую, плодную дабром і харaством зямлю:

Спявай, зямля, упіся сонцам,
Абмыйся чэрвеньскім дажджом,
Расці, цвіці, красуй бясконца,
Пладоў, зярнят насып каўшом.
Уцехай будзь маёй старонцы.
Дары красой, дары дабром!
Вітай, Цябе у сіле поўнай
Я аддаю сям'і працоўнай.

## 74

## ВАСЬКА ШКЕТАЎ І ВАНЬКА РАЗАНСКІ Ў АПАВЯДАННІ М. ЛЫНЬКОВА "НАД БУГАМ"

Народны пісьменнік Беларусі Міхась Лынькоў належыць да таго пакалення, на вачах якога адбываліся грандыёзныя падзеі часу. Ён не толькі быў сведкам гэтых падзей, але і актыўным іх удзельнікам. Са зброяй у руках ён змагаўся ў дні грамадзянскай вайны, удзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь, у перыяд Вялікай Айчыннай вайны рэдагаваў франтавую газету "За Савецкую Беларусь".

У творчасці пісьменніка знайшлі сваё адлюстраванне незабыўныя падзеі таго часу. У апавяданнях "Над Бугам", "Гой", "Крот", "Манчжур", прысвечаных грамадзянскай вайне, М.Лынькоў паказвае жорсткасць і бесчалавечнасць ворага, нараджэнне новага чалавека, змену міжнацыянальных адносін і ўсталяванне новага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

побыту. У цэнты ўвагі аўтара — асоба простага чалавека, кінутага ў віхуру грозных падзей.

Апавяданне “Над Бугам” прысвечана барацьбе Чырвонай Арміі з белапалякамі. Чырвонаармейцы рыхтуюцца да ранішняга наступлення, у выніку якога яны павінны авалодаць процілеглым берагам Буга, дзе акапаўся вораг. Рыхтуюцца да гэтай бітвы і Васька Шкетаў з Ванькам Разанскім.

Васька Шкетаў — чалавек без біяграфіі, які не памятае ні бацькоў, ні родных, ні сяброў. Мінулае яго — страшны сон, нейкае непаразуменне. Працаваў падкухаркам, у карчме. Быў басяком, злодзеем, задзірыстым буянам, якога не хацелі лічыць за чалавека. У пошуках шчасця ён пайшоў у Чырвоную Армію, стаў салдатам. Полк для яго — школа выхавання, у якой ён пераадольвае (праўда, з цяжкасцю) ранейшыя звычкі. Васька яшчэ можа ў вёсцы “пашукаць яек курыных”, але ўжо робіць гэта не толькі для сябе, але і для баявых сяброў. Паступова герой іншымі вачамі пачынае глядзець на жыццё, усведамляе сябе паўнацэнным чалавекам. “Жыву ж я цяпер, жыву, чалавек я цяпер, не абы-хто...”, — шэпча Васька перад наступленнем. Ён пачынае марыць аб шчасці, якога, праўда, яшчэ выразна не ўяўляе. Для яго яно “саткана з дзіўных жаданняў, са светлых надзей, апавітых нібы сонцам ружовым”.

Ванька Разанскі — патомны разанскі селянін, які пайшоў на вайну, пакінуўшы дома жонку і чатырох дзяцей. Ён сумуе “аб каласах жытніх на сваёй паласе”, “аб дзецях-румзах, аб жонцы”, якой збіраецца пасляць у падарунак свой салдацкі мяшок з кавалачкам воску, ніткамі, гузікамі, агрызкам алоўка. Гаспадарлівасць і разважлівасць вясковага хлопца, адказнасць за даручаную справу кіруюць учынкамі Івана. Ён рыхтуецца да

адказнага бою, дзе прыйдзецца стаяць насмерць, як да самай важный справы ў жыцці: прышывае гузік так моцна, што яго нельга было б адарваць паўротай салдат; наводзіць парадак у сваёй салдацкай торбе; перачытвае ліст жонкі; па даўнім сялянскім звычаі апранае самае лепшае адзенне. Усведамляючы сябе часцінкай вялікага калектыву, Ванька Разанскі чакае перадсвітальнага бою, каб на тым беразе Буга "сустрэць сонца, а з ім разам і залатую радасць жыцця".

Бераг быў узяты чырвонаармейцамі. Смяртэльна паранены ў баі, Васька Шкетаў перажывае пачуццё радасці ад таго, што вораг разбіты. Паміраючы, ён шэпча: "Эх, позна, позна, і так рана, рана..." У гэтых словах — шкадаванне, што яго шчаслівае жыццё прыйшло позна і што так рана трэба паміраць. Паміраючы ад ран, Ванька Разанскі ўжо думае не пра салдацкі мяшок, а пра свой "непераможны полк". Пра полк з пачуццём гордасці гаворыць Ванька і ў перадсмяротным пісьме да жонкі Алены.

М. Лынькоў, адлюстроўваючы напружаную барацьбу за новы лад, паказвае перавыхаванне чалавека ў агні грамадзянскай вайны. Героі апавядання "Над Бугам" markrознымі шляхамі прыйшлі ў Чырвоную Армію, і ў працэсе змагання з белапалякамі яны становяцця новымі людзьмі, аддаюць свае жыцці за справу вызвалення працоўнага чалавека.

**75**

**СТРАТЫ ЗАХАРА КРЫМЯНЦА Ў ЗМАГАННІ ЗА СПРАВЯДЛІВАЕ ЖЫЦЦЁ (АПОВЕСЦЬ М. ЛЫНЬКОВА "СУСТРЭЧЫ")**

Народны пісьменнік Беларусі Міхась Лынькоў быў сведкам падзей 1939 года і актыўным іх удзельнікам. Гэтыя падзеі леглі ў аснову твораў "Ядвісін дуб", "Тры злотых", "Капля малака", "Сустрэчы".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аповесць “Сустрэчы” напісана ў рэтраспектыўным плане. Пачынаецца з апісання старой жанчыны, якая кожны дзень прыходзіць на станцыю сустракаць цягнікі. Яна спадзяецца, што сярод прыезджых адшукае знаёмыя твары мужа і дачкі.

Вобраз Захара Крымянца (мужа старой жанчыны) ствараўся пад уражаннем асабістага знаёмства М. Лынькова з вядомым заходнебеларускім падпольшчыкам С. Прытыцкім. Герой аповесці, выконваючы рэвалюцыйнае заданне, кіруючыся ўласным пачуццём абавязку, забіў правакатара, свайго ранейшага сябра. За гэта Захар быў асуджаны на пажыццёвае турэмнае зняволенне. Семнаццаць гадоў прасядзеў гэты чалавек за турэмнымі кратамі. Нават у адзіночнай камеры ён сустракаў кожны новы дзень песняй, якой гаварыў ворагам, што ён яшчэ жыве і не збіраецца паміраць: “Іржа згрызе жалеза, струхнеюць каменныя сцены, косці ворагаў яго спапялеюць у зямлі, а ён будзе жыць, на зло ім, на страх.”

Вызваленне прыйшло ў 1939 годзе. З групай былых палітычных зняволеных Захар Крымянец вяртаецца на радзіму. Фізічна ён слабы і хворы, ён “ішоў заўсёды ўперадзе”, падтрымліваючы астатніх і бадзёрачы іх. Па дарозе дадому Захар сустракаецца з Геняй, якая разам з мужам апынулася ў турме, дзе ў яе нарадзілася дзіця. У хуткім часе дзіця памерла, а Гені нават не дазволілі быць на пахаванні. Маці запратэставала, за што была жорстка збіта. Смерць сына, няшчадныя пабоі, зверствы турэмшчыкаў падарвалі здароўе маладой жанчыны. Захварэўшы на сухоты, яна памірае па дарозе дадому, не дажыўшы некалькі гадзін да сустрэчы з байцамі Чырвонай Арміі. У перадсмяротных словах Гені быў не столькі смутак, колькі пачуццё гордасці ад усведамлення поўнасцю выкананага абавязку перад Айчынай: “Вы ведаеце, якая гэта вялікая

пакута — столькі цярпець і не ўбачыць тое, за што прыйшлося перацярпець... А яно ж блізка... Вы ж бачыце, гараць пад імі масты...”

А жорсткі лёс рыхтаваў для Захара новыя выпрабаванні. У старой. спакутаванай жанчыне ён ледзь пазнаў жонку, ад якой даведаўся пра смерць сына і арышт дачкі Вяруньки. А калі жонка паказала здымак. Захар зразумеў, што Геня, якую ён пахаваў на крутым беразе ракі, была ягонай дачкой.

У вобразе Захара Крымянца М. Лынькоў паказаў нязломнага змагара за свабоду, аптыміста. Загартаваны жыццёвымі выпрабаваннямі. ён мужна пераносіць асабістае гора і верыць у шчаслівую будучыню народа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**76**

## ПАЭЗІЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ ВАЕННЫХ ГАДОЎ

Творы Петруся Броўкі часта называюць паэтычным летапісам народнага жыцця. Значнае месца ў гэтым летапісе займае тэма Вялікай Айчыннай вайны. Героі яго твораў — воіны-франтавікі, партызаны, іх сёстры, бацькі, каханыя, простыя людзі, якім не сорамна глядзець у вочы маці-Радзіме, бо ўсе яны “сэрцам і душою” былі з ёй у цяжкую гадзіну, мужна абараняпі яе.

У вершы “Рана” расказваецца пра цяжкі шлях воіна да роднай зямлі. Аб вялікіх выпрабаваннях, якія выпалі на яго долю, сведчаць восем ран на целе. Зажылі раны салдата, але не можа загаіцца душэўны боль ад таго, што Беларусь яшчэ стогне пад ботам акупантаў. Суняць гэты боль можа толькі поўнае вызваленне роднага краю:

Знаю, сціхнуў бы боль,
Каб напіўся жывіцы
З той крыніцы,
Што смагу таліла не раз,
Каб чабору таго,
Каб тае медуніцы,
Каб паветра з бароў,
Што пад Мінскам у нас.

Салдат-беларус (верш “Спатканне”) дайшоў з баямі да родных мясцін. За плячыма — гора, смерць сяброў, цяжкія ваенныя дарогі. Ён з радасцю і хваляваннем любуецца полем, небам. Але пры відовішчы “засмучаных хат”, “здратаваных ніў” у воіна сціскаецца сэрца ад болю за зганьбаваную сваю зямлю. Агнём помсты палае сэрца салдата:

Гляньце ў сэрца маё, —
Я прынёс яго з бою.
На агні яго можна
Мячы гартаваць.

І мы верым, што не супакоіцца воін да таго часу, пакуль не дачакаецца канчатковай перамогі над ворагам, бо гэта яго вялікі абавязак перад народам і Айчынай.

У беларускай літаратуры многа твораў напісана на партызанскую тэматыку, і сярод іх верш П. Броўкі “Кастусь Каліноўскі”. Героем яго з’яўляецца калгасны трактарыст Каліна. Калі пачалася вайна, юнак з блакітнымі вачыма і льнянымі валасамі становіцца камандзірам партызанскага атрада. “Сілай магутны, душою агністы”, ён спапяляе ворагаў-пачвар, выклікаючы ў іх смяртэльны жах. Яго кулі даганяюць варожую варту за сотні кіламетраў і вызваляюць дзяўчат з фашысцкага палону. Мужнага і валявога камандзіра партызанскага атрада, нястомнага барацьбіта за

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

свабоду  Каліну народ назваў Кастусём Каліноўскім. Параўнанне звычайнага вясковага хлопца з кіраўніком паўстання 1863 г., правадыром нацыянальна-вызваленчага руху невыпадковае: у вобразах абодвух увасоблены мужнасць і свабодалюбства беларускага народа. Каліна з'яўляецца абаронцам як беларускіх маці (яны "праз доўгія сумныя вёсны ткуць пояс квяцісты герою на кроснах"), дзяўчат (яны "збіраюць яму валількі на кашулю"), так і беларускай прыроды, Радзімы наогул.

У гады Вялікай Айчыннай вайны П. Броўкам была напісана паэма "Беларусь" — паэтычны маналог аб Радзіме, усхваляваны зварот да яе. Пачынаецца паэма з апісання прыгажосці беларускай зямлі, яе бароў і дуброў, азёр і рэк, жытнёвых палёў і стужак дарог. Перад намі паўстаюць падзеі і людзі далёкага мінулага (бітвы пад Грунвальдам і на Чудскім возеры, вайна з Напалеонам, подзвігі Вашчылы, Хвясько і Каліноўскага, асветніцкая дзейнасць Ф. Скарыны). Шмат пакут, войнаў, чужынскіх навалаў зведала беларуская зямля, але яе шляхамі "вярнулася ворагаў мала дамоў", бо на працягу ўсёй гісторыі не стаў на калені,не скарыўся народ Беларусі. Паэт упэўнены, што як некалі былі пераможаны псы-рыцары і французскія ваякі, так і ў гады Вялікай Айчыннай вайны будуць пераможаны фашысцкія захопнікі.

Творы Петруся Броўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны вызначаюцца яркай палымянасцю, публіцыстычнасцю. Яны ўслаўляюць гераізм, рашучасць і самаахвярнасць воінаў-змагароў і партызан. У іх гучыць узнёсла-балючы голас чалавека, грамадзяніна, байца, голас нянавісці да ворагаў і ўпэўненасці ў перамозе і вызваленні Радзімы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**77**

## АНТЫВАЕННАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ПАЭМЫ П. БРОЎКІ “ГОЛАС СЭРЦА”

Трэба адрэзаць дарогу для войнаў,
Каб чалавецтва магло жыць спакойна.
*П. Броўка*

Вялікая Айчынная вайна закранула многіх людзей, прынесла амаль у кожны дом гора, няшчасце. Не абмінула яна і Петруся Броўку. Ён з першых дзён вайны быў на фронце, прайшоў тысячы вёрст франтавых дарог, якія ніколі не канчаюцца ні ў памяці, ні ў паэзіі. У самыя цяжкія дні паэт думаў пра родны край, трывожыўся за блізкіх, марыў аб тым, як ён сустрэнецца з маці, як яна папытаецца, што ён зрабіў для перамогі над ворагам. Яму будзе пра што расказаць, чым яе парадаваць. Наведаўшы родныя мясціны пасля вайны, П. Броўка жахнуўся: ён не ўбачыў сваёй хаты, дзе нарадзіўся. Яе знішчылі фашысты разам з усёй вёскай. Не давялося яму пабачыцца і з маці, якую фашысты спалілі ў Асвенціме.

У 1947 г. П.Броўка наведаў Асвенцім і яшчэ глыбей адчуў усю бязмежнасць людской трагедыі. Ён убачыў змрочныя халодныя баракі, печы крэматорыя, тыя коміны і сцены, якія былі нямымі сведкамі жахлівых відовішчаў.

Ад болю пачаў я хістацца,
Чорныя коміны ўбачыў на пляцы...
Колькі крыві на іх з дымам асела,
Колікі жыцця цераз іх праляцела.

Горыч ад гэтых уражанняў, невымерны боль за маці і нарадзілі паэму “Голас сэрца”, якую П. Броўка змог напісаць толькі праз пятнаццаць гадоў пасля сканчэння вайны. Яна прасякнута вялікім душэўным болем, які не сціхае праз многія гады. У паэме П. Броўка

ўзвышаецца над сваім горам, і яго боль за трагічны лёс маці перарастае ў боль і трывогу за лёс усяго чалавецтва, якому пагражае новая сусветная вайна. З грудзей яго вырываецца крык — гнеўны і суровы:

Там жа плач матак сабраны са свету...

Як жа забылі хутка пра гэта!

Зразумела, вобраз маці, сціплай сялянскай жанчыны, — галоўны ў паэме. Усё, што звязана з маці, паэт памятае да драбніц, памятае ўсе дэталі мірнага вясковага побыту, працу маці ў хаце. Як з жывой, размаўляе сын з маці, успамінаючы, як яна “спявала, як прала, як жала, як шыла кашульку, як вышывала”, як чакала сыноў з далёкай дарогі, каб абняць, пацалаваць і сагрэць іх, як свяціліся вочы яе ласкай і радасцю, як рукі пахлі “лебядою, і хлебам жытнёвым, і сырадоем”.

У гады ваеннага ліхалецця маці была разам з партызанамі. Яна ім “абвязвала раны белай хусцінкай, дзялілася з імі хлеба скарынкай”. І менавіта за сувязь з партызанамі маці пайшла на жудасную смерць. Сум па маці, а разам з тым любоў і павага сына да яе ўзрастае яшчэ і ад таго, што ў цяжкі час і яна была змагаром. Паэту нібы чуецца голас маці, які адначасова з’яўляецца і голасам усіх ахвяр вайны:

— Досыць па нас вы паплакалі, досыць,

Шануйце, пільнуйце, што збудавалі,

Каб болей пакутаў людзі не зналі.

Паступова матыў журбы і гора саступае месца іншым пачуццям паэта. П. Броўка, многа дзе пабываўшы, бачыў, што ў свеце неспакойна, што ёсць людзі, якіх “так цягне да бою”. Паэт занепакоены, што ў сучасным свеце яшчэ многія трымаюць у руках

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зброю, што цячэ кроў нявінных людзей, што пачынае падымаць галаву жудасная пачвара — вайна.

Чуеце, вораг узняўся, адужаў,
Ён не збіраецца несці вам ружы...
Сэрца ў гневе, маўчаць не магу я!

Паэт яшчэ раз нагадвае заклік Ю. Фучыка быць пільнымі:

Людзі! Не можам глядзець мы спакойна.
Бачыце, як ланцугі вам куюцца,
Помніце Фучыка: “Пільнымі будзьце!”

П. Броўка, асуджаючы войны, упэўнены, што на зямлі і без іх шмат праблем, шмат бедных, галодных і абяздоленых, і таму самае разумнае — накіраваць астранамічныя сродкі, якія ідуць на ўзбраенне, на будаўніцтва жылля, школ, бальніц, на хлеб, на вопратку, на павышэнне дабрабыту людзей. Паэтызуючы сцэны мірнага жыцця, нагадваючы чалавецтву пра яшчэ не зробленае на зямлі, паэт заклікае да захавання на зямлі міру:

Сёння магутныя нашыя словы
Скрозь над зямлёю праменнямі свецяць:
— Мір ва ўсім свеце! Мір ва ўсім свеце!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 78

## ДАВЕРАСНЁЎСКАЯ ЛІРЫКА МАКСІМА ТАНКА

Максім Танк лічыцца заснавальнікам рэвалюцыйнай літаратуры ў былой Заходняй Беларусі. Ужо на старонках першай кнігі “На этапах”, якая была канфіскавана паліцыяй, паэт-падпольшчык паказвае лёс і духоўны свет заходнебеларускіх працоўных.

Героем многіх даверасёскіх твораў М. Танка з’яўляецца прафесійны рэвалюцыянер. Мастацкай перакананаўчасцю вылучаецца

верш “Спатканне”, у аснову якога леглі рэальныя факты з жыцця палітычных зняволеных. Стары селянін прыходзіць да сына (палітычнага вязня) на спатканне. Замест сына-пакутніка бацька ўбачыў мужнага байца, чалавека, моцнага духам, якога не палохае асабістая няволя.

Верш “Паслухайце, вясна ідзе” прадаўжае тэму, вызначаную ў “Спатканні”. Палітвязень, устаўшы вясновай раніцай, не пазнаў куста бэзу: ён “расцвіў, агнём гарыць, такім пахучым, мяккім, сінім”. Бэз — вястун новай, заўтрашняй вясны. Цвіценне бэзу — надзея нявольніка на хуткае вызваленне, вяртанне на свабоду, а сваболa — гэта найвялікшае хараство. І як нельга спыніць цвіцення бэзу, так нельга ніякімі мурамі зламаць волю барацьбіта. І таму вельмі зразумелае жаданне героя верша вырвацца з-за кратаў на свабоду:

Я ціха разбудзіў другіх,
Ад слёз сінелі вочы бэзам.
І недзе хруснула ў худых
Руках іржавае жалеза.

Імкненне народа да ажыццяўлення вызваленчых нацыянальных задач знайшло сваё адлюстраванне ў журботна-лірычным вершы “Песня кулікоў”. Пад завыванне завірухі селянін, які зведаў усе цяжкасці паднявольнага жыцця, гутарыць з госцем (падпольшчыкам):

Бачыш: у нас голад, жыць нялёгка, браце,
Хлеб на стол кладзецца толькі для гасцей.
Добра, калі хопіць бульбы ў нашай хаце
Да вясны, да першых з выраю гусей...

У словах селяніна адчуваецца нянавісць да прыгнятальнікаў, хваляванне за будучыню народа, заклапочанасць не толькі сваім матэрыяльным становішчам, адсутнасцю ў хаце маладога гаспадара

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(сына яго пасадзілі на 10 гадоў у астрог), але і нацыянальнымі праблемамі ("Каб далі вучыцца нам на мове роднай"). Рэвалюцыянер-падпольшчык умацоўвае веру старога селяніна ў хуткае вызваленне і шчаслівую будучыню:

Кажаш, — ужо хутка выпрастаем плечы,
Кажаш аб шырэйшых нівах, аб вясне.
Вось і я, здаецца, вылез бы з-за печы,
Хай пакліча толькі моладзь і мяне.

Верш прасякнуты сімволікай. Вельмі мнагазначным з'яўляецца матыў песні кулікоў, якія звычайна спяваюць вясной. Маладая жанчына, жонка асуджанага, напявае малому калыханку, і ёй самой здаецца, што гэта не мяцеліца галосіць у полі, а ў імгле плачуць кулікі:

Спі, засні, маленькі... або лепш паслухай,
Як, зблудзіўшы недзе, плачуць кулікі.

Песня кулікоў зімой — гэта добры знак, прадвяшчэнне лепшай долі. І хоць мяцеліца, сімвал прыгнечанасці, яшчэ вые ў полі, але яе змяняе спеў кулікоў. Сустрэча юнака-падпольшчыка і старога селяніна сведчыць аб еднасці пакаленняў, у якіх адзіная мэта, адзінае жаданне.

У давераснёўскай лірыцы М. Танк з напружанай шчымлівасцю расказвае пра шматпакутную гісторыю народа, хараство родных палёў, лясоў, пра беларускую мову, скарбы народнага мастацтва. Ён узнімае голас пратэсту супраць жорсткай раз'яднанасці людзей ва ўласніцкам свеце. У гэты перыяд ён піша паэмы "Нарач", "Журавліны цвет", "Каліноўскі". Падзеям верасня 1939 г. М. Танк прысвяціў верш "Здарова таварышы", у якім выказаў пачуцці вызваленых працоўных Заходняй Беларусі, паказаў іх нялёгку барацьбу з прыгнятальнікамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Давераснёскую творчасць сам Максім Танк назваў “паэзіяй народнага гора і барацьбы”. У творах гэтага перыяду знайшлі праўдзівае адлюстраванне цяжкае жыццё народа, яго імкненне да вызваленчай барацьбы, пратэст супраць штучнай раз’яднанасці людзей, вера ў непазбежнасць падыходу лепшых дзён.

**79**

## АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

Я толькі частку невялічкую
Змог праспяваць
Таго, што расказалі мне
Вятры, дарогі,
Валуны і рэкі,
Лясы і зоры...
*М.Танк*

Паэзія Максіма Танка, народнага паэта Беларусі, лаўрэата Ленінскай прэміі, сагрэта дабрынёй і даверам да чалавека. Яна выхоўвае ў чытачоў душэўную прыгажосць, высокую інтэлектуальнасць, заклікае да філасофскіх роздумаў аб жыцці, аб чалавецтве. На працягу ўсёй сваёй творчасці паэт імкнецца знайсці адказы на пытанні чалавечага быцця: што такое жыццё і смерць, любоў і нянавісць, ісціна, вера сумленне, дабро, шчасце? У чым сэнс чалачага жыцця? І, безумоўна, адказы на гэтыя пытанні самыя розныя.

Адказам на пытанне, што такое чалавечае шчасце, можа служыць верш-мініяцюра М. Танка “Шчасце”:

Простае шчасце людское,
Так як і наша з табою,
Пэўна, складаецца з солі,
З хлеба, сабранага ў полі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З поту, дарожнага пылу,

З роднага небасхілу,

З дружбы, мацнейшай ад смерці,

З песні... І так мне здаецца:

Каб з чаго іншага скласці,

Дык ці было б яно шчасцем.

Голас паэта гучыць разважліва, прасветлена, суладна вечнасці і сусвету і ў вершы “Я спытаў чалавека...” Ён дае адказ на пытанне аб тым, што з’яўляецца на гэтым свеце самым цяжкім. У некалькіх радках скандэнсаваны вопыт і думкі цэлых пакаленняў:

Я спытаў чалавека,

Які прайшоў праз агонь,

І воды,

І медныя трубы:

— Што самае цяжкае

На гэтым свеце?

І ён адказаў:

— Прайсці праз вернасць.

У цэнтры ўвагі М. Танка заўсёды знаходзіцца чалавек. Агульначалавечыя адносіны да маці, жанчыны выяўляюцца ў вершах “Рукі маці”, “Мыццё бабкі Улляны”, “Голас”. Гімнам працавітым матчыным рукам, якія ніколі не ведалі адпачынку, можна назваць верш “Рукі маці”:

Іх цалавала зямля

Сваімі пясчанымі вуснамі

І каласамі;

Неба спякотай, вятрамі, дажджамі

Іх цалавала.

Маці з’яўляецца для паэта ўвасабленнем чалавечай дабрыні, высакароднасці, сціпласці, увасабленнем вечнасці. Рукі маці — гэта і дакор, бо яны — сведкі нялёгкіх часоў, на іх — сляды, “што навекі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пакінуў шлях наш суровы”. Ад цяжкай, непасільнай працы на іх з’явіліся чорныя глыбокія шрамы і маршчыны. І яны, гэтыя святыя рукі, стваралі людскую радасць і шчасце, неслі людзям святло і цяпло:

Колькі яны запалілі світанняў,
Зораў над намі.

Пасіveраным, парэпаным рукам бабулі, маці прысвечаны шчымлівыя радкі верша “Мыццё бабкі Улляны”. Памерла жанчына. Перад апошняю дарогай нябожчыцу пачалі абмываць і “ніяк яе адмыць рук не маглі ад скіб зямлі, ад каласоў і сонца, ад пялёнак і ануч, ад чорных і распаленых гаршкоў з бацвіннем, з бульбай...” Гледзячы на гэтыя рукі, усе загаласілі, “бо як рукамі гэткімі ды ў дзверы раю грукаць!”

Верш “Голас” прадаўжае тэму бязмежнай любові маці да дзяцей:

Голас незнаёмага можа здзівіць,
Голас друга — на хвіліну спыніць,
Голас любай — сагрэць сонцам лета,
Голас маці — вярнуць з таго свету.

Матчын голас, на думку паэта, можа нават вярнуць з таго свету. Вядома, гэта метафара. Але калі дзіця ў небяспецы, маці зробіць усё магчымае, каб яго выратаваць. Яе голас можа прымусіць жыць і змагацца, калі губляецца сэнс жыцця і душа пачынае стыць.

У творчасці М. Танка нямала цудоўных песень аб Бацькаўшчыне і гераічным беларускім народзе. Паэта хвалююць агульначалавечыя пытанні аб гістарычным мінулым і сённяшнім дні Беларусі, яе прыродзе, роднай мове, аб мастацтве, прызначэнні паэта і паэзіі. У вершах “Паэзія” і “Трактат аб паэзіі” аўтар лічыць, што паэзія можа вызваліць з “няволі і пекла”, можа прабіць кветкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вясновай “камень магільны”. Паэзія параўноўваецца з бліскавіцай, з вясновай кветкай, з сокам вінаграду. Для творчага ж чалавека паэзія — гэта “кроў, што пульсуе па жылах”, “сонца, якое прасторы святлом азарыла, і без чаго, як без маці або без радзімы, ні нараджацца, ні жыць на зямлі немагчыма”.

М. Танк, адчуваючы адказнасць за ўсё, што адбываецца ў краіне, выступае супраць духоўнага мяшчанства, прыстасавальніцтва, кар’ерызму. Трывога за сённяшні дзень гучыць у паэтычнай малітве “З даўніх запаведзяў”:

Ратуй, Божа, ад вар’яцтва,
Немаці і засляплення,
Ад пярэваратняў, злыдняў,
Ханжаскіх богаслужэнняў,
Пошасці,
вайны,
бясхлеб’я,
Нашых дум апусташэння.

У творчасці М. Танка, такім чынам, няцяжка адшукаць адказы на ўсе пытанні  чалавечага жыцця. Тое, што хвалявала людзей на працягу тысячагоддзяў, хвалюе паэта і сёння, у канцы XX стагоддзя. Творы яго, сагрэтыя вялікім чалавечым пачуццём, сцвярджаюць духоўныя каштоўнасці жыцця, дапамагаюць жыць у наш неспакойны і трывожны час.

**80**

## ТЭМА МАСТАКА І МАСТАЦТВА Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА

Непакой за цябе, зямля мая, —
Мой хлеб надзённы.
*М.Танк*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У творчасці Максіма Танка нямала твораў, прысвечаных тэме мастка і мастацтва. Прадаўжаючы традыцыі Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, паэт сцвярджае даўно выказаную думку аб цеснай і непарыўнай сувязі мастака з жыццём народа і сённяшнім днём, аб бессмяротнасці тых твораў, якія па-мастацку дасканала і праўдзіва адлюстроўваюць рэчаіснасць.

М. Танк задумваецца над сваёй творчасцю, прызначэннем паэзіі, яе сутнасцю. У вершах “Паэзія” і “Трактат аб паэзіі” аўтар лічыць, што паэзія можа вызваліць з “няволі і пекла”, можа прабіць кветкай вясновай “камень магільны”, дапамагае ў дружбе і каханні. Па вобразным выказванні М. Танка,

Паэзія — гэта адвечная цяга
Вяршынь да нябёс,
А траваў і дрэваў —
Да сонца.
Паэзія — гэта вясёлкавы мост
Ад сэрца людскога
Да мары.
Паэзія — дружба
Зярна і зямлі,
Агню і крыві
Прабуджэнне...
*(“Трактат аб паэзіі”)*

Паэзія параўноваецца з бліскавіцай, з вясновай кветкай, следам разведчыка, з сокам вінаграду. Але ўсё гэта не ахоплівае значэння паэзіі, якая для творчага чалавека — нешта большае:

А ты адказала большым:
Ты — кроў, што пульсуе па жылах,
Ты — сонца, якое
Прасторы святлом азарыла,
І без чаго, як без маці

Або без радзімы,
Ні нараджацца, ні жыць
На зямлі немагчыма!
*(“Паэзія”)*

Сапраўдным гімнам творчай працы і таленту з’яўляецца паэма М. Танка “Люцыян Таполя”. У аснове твора — лёс таленавітых мастакоў з народа, канфлікт народнага ўмельца, майстра па мастацкай разьбе Люцыяна Таполі (па мянушцы Багароб) з біскупам Сямашкам.

Шчыры мастак Люцыян, пад рукамі якога, “бы ад чараў нейкіх, ажывала нават нежывое”, выразаў для навагодняй батлейкі Ірада, падобнага да пана. Твар і постаць прасвятой багародзіцы ў батлейцы нагадвалі дзяўчыну Тэклю, да якой калісьці сватаўся Люцыян. Анёлы, выразаныя з чачоткавай бярозы, былі копіяй Сцяпана і Харытона — двух плытагонаў, мядзельскіх п’яніц. Біскуп Сямашка не мог дараваць такога простаму “хлопу”, чалавеку з народа, і прыдумаў цяжкую кару: “пад страхам пекла і пракляцця цэлых дзесяць год адбыць пакуты і не брацца за сваё майстэрства”. Для мастака гэта азначала духоўную смерць.

Прайшоў час. За дзесяць гадоў Люцыян “шмат пабачыў і бяды, і гора, зведаў шмат зямель”. Вярнуўшыся ў родныя мясціны, ён сустракаецца з біскупам, які, не пазнаўшы ў сівым “старцу” даўнейшага грэшніка, даручае яму будаваць новую святыню. І зноў пад рукамі народнага дойліда “ажывала нават нежывое, немагчымае рабілася магчымым: гнуўся камень, а з звычайнай цэглы, быццам з бронзы, паўставалі здані”. Увесь свой талент, і гнеў, і асабістую крыўду ўкладвае Люцыян у працу. Фігуры атрымаліся падобнымі да магнатаў, панскіх цівуноў, хітрых езуітаў. Біскупа ж Сямашку ён размясціў сярод хімер з рагамі, пачвар з зяпамі, гадаў з хвастамі і

іншых прадстаўнікоў пекла. Убачыўшы гэта, не вытрымлівае Сямашка і памірае.

Сваім талентам, праўдзівым мастацтвам, а не сілай, як гэта мы бачым у творы, змог адпомсціць Люцыян Таполя крыўдзіцелю народа. Чалавек, які пры жыцці мае бязмерную ўладу і незлічоныя багацці, пасля смерці можа бясследна знікнуць з памяці. Сапраўднае ж, праўдзівае мастацтва, на думку М. Танка, бессмяротнае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

81

## АСНОЎНЫЯ ТЭМЫ І ВОБРАЗЫ ПАСЛЯВАЕННАЙ ЛІРЫКІ А. КУЛЯШОВА

Я на ўсё жыццё абраў дарогу,
На якой калючак больш, чым руж.
Сэрца — як набат, што б’е трывогу
За мільёны падгарматных душ.
*А. Куляшоў*

“Спадарожнічаючы нам з дзяцінства, са школьных год, паэзія А. Куляшова нязменна хвалюе актыўнасцю ідэйнага пошуку, багаццем і дасканаласцю мастацкіх вобразаў, саграває сваёй непадробнай чалавечнасцю, наталяе прагу хараства”, — пісаў пра творчасць А. Куляшова У. Гніламёдаў.

У пасляваенны час творчасць А. Куляшова вызначаецца сталасцю, глыбокім філасофскім зместам, пільнай увагай да духоўнага свету чалавека. У гэтым сэнсе вельмі паказальным з’яўляецца верш “Спакойнага шчасця не зычу нікому...” Гэта верш-споведзь. Ён складаецца з дванаццаці радкоў, у кожным з якіх ставяцца пытанні: ці патрэбна чалавеку маланка з громам (а якая ж без іх навальніца?), пякучая смага, моцнае пачуццё, лес, зязюля?

Усё, што акружае чалавека, вартае яго ўвагі, бо ўсё гэта і ёсць жыццё, неспакойнае, нялёгкае, складанае. Паэт не прымае лёгкага шчасця, таго ўяўнага дабрабыту, якім жыве абывацель. Ён жадае ўсе свае пачуцці перадаць людзям, захапіць імі чалавечыя сэрцы.

Да філасофскага цыкла адносіцца і невялікі памерам верш “Я хаце абавязаны прапіскаю...”. Лірычны герой яго ўсім на свеце абавязаны роднай хаце. І самае галоўнае — ён “абавязан кожнай рыскаю, драўлянай лыжкаю, глінянай міскаю” маці, якая нарадзіла і выгадавала яго. Яго карані — ад зямлі, працы, Айчыны. Сам лірычны герой з’яўляецца выразнікам сумлення чалавека, які ў час вайны стаў салдатам, каб адстаяць незалежнасць сваёй Радзімы. І ён мае права сказаць:

Я — матчын спеў, я — матчыны трывогі,
Я матчын гнеў, які ўставаў на ногі,
Гнаў смерць на Захад...
Дыміліся сямі франтоў дарогі
За мной, як дынамітныя шнуры

І яшчэ больш права мае ён, былы воін-франтавік, на зварот да ўсіх людзей свету:

Пазбавіўшы ад грознага відовішча
Свет, не дазволю я, каб дым і пыл
Зямлю ператварылі ў бомбасховішча,
Мільярд прапісак — у маўклівы прысак,

Мільярд калысак — у мільярд магіл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У 1965 г. А. Куляшоў напісаў цыкл вершаў, аб’яднаных агульнай назвай “Маналог”. Ён прысвечаны памяці сяброў-паэтаў З. Астапенкі і Ю. Таўбіна, якія сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій. У першым вершы паэт як бы акрэслівае мэту і задачы цыкла:

Дзе б я ні быў, дзе б мне ні давялося
Убачыць дол сівы ад палыну,
Пякуча сэрца сціснецца, і лёс я
Загінуўшых без весткі памяну...

“Маналог” напоўнены глыбокім асабістым перажываннем, вернасцю быломy сяброўству і агульнай справе. “Я — ваша памяць, вы — маё сумленне, я — дрэўка, вы — трывалы сцяг на ім”, — сцвярджае аўтар. Дачасна загінуўшых сяброў ён называе кнігамі без старонак, лістамі без дрэў, дарогамі без слядоў, і таму грамадзянскі і маральны абавязак паэта — прадоўжыць справу загінуўшых сяброў юнацтва. Ён павінен быць “вартым тых спраў абарваных, кніг недапісаных”.

Цыкл “Маналог” адзначаны горкім, драматычным пафасам. “Ён быццам бы складзены з камення ці выкаваны з бронзы... Гэта як эпітафія, выбітая на каменні”, — скажа пра яго З. Азгур. У вершах “Маналога” — роздум паэта аб маральным абавязку людзей перад памяццю, аб непераможнай сіле праўды і справядлівасці, аб значэнні творчасці ў жыцці грамацтва, аб адказнасці творцаў перад часам і людзьмі. “Лепш цяжка жыць, чым быць бадзёрым трупам”, — сцвярджае А. Куляшоў.

Глыбокім роздумам над лёсам сваіх сучаснікаў, людзей пасляваеннага пакалення, сумным, элегічным настроем прасякнуты вершы “Перад падарожжам” і “Салдатаў веку, што на грозных цэлях...”. Лірычны герой першага верша пражыў складанае жыццё, пакуты сівізной леглі яму “на скронь”. Але ён не “абпаліўся жорстка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сам”, не ачарсцвеў (“не лёд душы, а боль пякучы я ў прагны кідаю агонь”), не перастаў змагацца супраць бездухоўнасці, несправядлівасці. Яго “дарожны дух” куецца для новых змаганняў, “для горных круч, для хваль высокіх, для самых грозных завірух”.

У лірыцы А. Куляшова 60 — 70 гг. выявіліся вялікія духоўныя і фізічныя мажлівасці чалавека — прага дзейнасці, адчуванне сваёй асабістаў велічы і вартасці, адказнасць за “цяжкую пасаду паэта”, за лёс Айчыны, разуменне сутнасці гістарычных падзей і ўсеагульнай сувязі з’яў:

Хацеў бы век, які ўжо на зыходзе,
Забраць мяне з сабой, а я  руку
Гарачую працягваю прыродзе —
З дваццатага ў трыццатае стагоддзе.

Паэт вымярае свой час не гадзнамі. а іляхамі, дарогамі, кіламетрамі, стагоддзямі. І таму лірычны герой вершаў адчувае сябе “ на паўмільярдным кіламетры паміж наступным і былым”, мільёны лёсаў змяшчаюцца ў яго “яшчэ да дна не вычарпаным лёсе”. І самому паэту здаецца, што за плячыма яго “не пяцьдзесят гадоў, а пяць стагоддзяў — самае малое”, і таму ён смела працягвае гарачую руку “з дваццатага ў трыдцатае стагоддзе”.

Жывучы ў суладдзі з часам, паэт піша паэмы “Цунамі”, “Варшаўскі тракт”, “Хамуціус”, у якіх перадае самаадчуванне чалавека ў наш трывожны, навальнічны час, яго барацьбу за будучыню без вайны, за чыстае паветра і ваду, за ачалавечванне свету, за ўсеагульнае шчасце. Паэма “Хамуціус” (такім быў адзін з псеўданімаў К Каліноўскага) прысвечана гераічнай барацьбе К. Каліноўскага за мужыцкую долю. Паэт імкнецца не толькі аднавіць гістарычныя і легендарныя старонкі Айчыны, але спасцігнуць і ўсе супярэчнасці нашага часу. Ён востр адчувае сваю адказнасць не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

столькі перад сабой, колькі перад ўсім грамадствам, яго гісторыяй і будучыняй.

## 82

## ПАЭМА А. КУЛЯШОВА “СЦЯГ БРЫГАДЫ”

Падзеі першых дзён вайны засталі А. Куляшова ў Мінску. Адступленне нашых войск, жорсткія налёты фашысцкай авіяцыі, незлічоныя людскія ахвяры на вуліцах палаючага Мінска — усё гэта ўразіла паэта нечаканасцю і трагізмам. А. Куляшоў апрануў шынель, каб абараніць Радзіму ад ворага, і прайшоў праз суровыя выпрабаванні. У цяжкіх франтавых умовах 1942 г. паэт напісаў паэму “Сцяг брыгады”.

Алесь Рыбка — галоўны герой паэмы — пакідае родны Мінск у трагічны час: вайна прынесла ў яго дом вялікае гора, разбурыла любімы горад, разлучыла з сям’ёй. Адчуваючы сябе сынам Радзімы, часцінкай свайго народа, ён ідзе на суровую і цяжкую бітву з фашызмам, даючы свяшчэнную клятву вярнуцца дамоў толькі з перамогай:

Я табе абяцаю і попелам родным клянуся,
Што з дарогі ўначы не саб’юся,
Вярнуся, вярнуся!..

Алесь Рыбка ні на хвіліну не губляе веры ў сілы народа. Нават у самыя драматычныя моманты свайго франтавога жыцця — развітваючыся з домам, выратоўваючы сцяг брыгады, пераходзячы лінію фронту, у цяжкіх умовах акружэння — герой верыць у перамогу, і гэта вера з’яўляецца для яго надзейным компасам.

Я прайду з табой многа дарог,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мой гадзіннік, мой браце,
І я ўбачу часы перамог
На тваім цыферблаце.

Ён хоча прыйсці дадому “не нікчэмным, слабым жабраком”, а пераможцам. Ён верыць у справядлівасць змагання. У героя паэмы высокае пачуццё грамадзянскага абявязку перад народам, сапраўдны гуманізм і нянавісць да ворага, яснае, чыстае сумленне і прыгожая душа. Усё гэта спалучаецца з мужнасцю і чэснасцю. Ён не шкадуе жыцця, выратоўваючы сцяг брыгады, выносіць з поля бою цяжка параненага камісара Заруднага і гэтым самым выконвае высокі воінскі і грамадзянскі абавязак.

Мужнасцю і стойкасцю вызначаецца і камісар Зарудны. У самыя цяжкія моманты бою ён натхняе байцоў брыгады сваёй верай у перамогу. Правобразам камісара паслужыў член Ваеннага савета 11-й арміі брыгадны камісар І. В. Зуеў, з якім А. Куляшоў быў асабіста знаёмы.

Разам з мужнасцю камісара Заруднага і Алеся Рыбкі паэт паказвае паводзіны Мікіты Ворчыка — былога наводчыка гарматы, аднаго з тых, каму пашанавала застацца жывым. Пад уплывам панічных чутак Ворчык губляе веру ў перамогу, не бачыць сэнсу ў далейшым змаганні, не знаходзіць у сабе дастаткова сіл, каб пераадолець разгубленасць. У выніку ён кідае баявых сяброў, шукаючы “цішыні і спакою” дома. Але не знаходзіць Мікіта сямейнага шчасця: дома ён даведваецца аб трагічнай смерці жонкі Марыны і яе перадсмяротнай запісцы з просьбай адпомсціць ворагу за здзекі і слёзы. Высвятляецца таксама, што Ворчык, пакідаючы сваіх сяброў, забраў ватоўку з зашытым брыгадным сцягам. За здраду Мікіту выносіцца суровы прысуд.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вобразамі старасты-паслугача Мядзведзкага, хутаранкі Лізаветы А. Куляшоў паказаў маладушных людзей, здраднікаў.

Паэма А.Куляшова “Сцяг брыгады” сцвярджае духоўныя каштоўнасці народа — нянавісці да ворагаў і здраднікаў, вальналюбства, высакародства, працавітасць, чалавечую годнасць. А. Твардоўскі назваў паэму “голасам сэрца, напоўненага болем за родную беларускую зямлю, плачам па ёй і гарачай светлай верай у яе сілы да барацьбы, у яе вызваленне”.

**83**

## “У ПАЭТА НЯМА ЗАБАРОНЕНАЙ ЗОНЫ” (ПАТРЫЯТЫЧНЫЯ І ГРАМАДЗЯНСКІЯ МАТЫВЫ Ў ПАСЛЯВАЕННЫХ ТВОРАХ П. ПАНЧАНКІ)

Такі наш век: не падай у знямозе!
Жыві між бур, маланак і трывог.
Ў дарозе я, а ўжо ў маім абозе
Тры тысячы маткоў зямных дарог.
*П. Панчанка*

Паэзія Пімена Панчанкі — мужная, сумленная, даверлівая, спагадлівая, непрымірымая, бескампрамісная, страсная, эмацыянальная, філасофская. Яна, на думку В. Зуёнка, “саткана з жывога агню: яна і сагравае, і апякае душу, яе не возьмеш у рукі — і яна заўсёды з табою”.У творах паэта, як пры святле маланак, кантрасна высвечваецца ўся глыбіня складанага чалавечага жыцця.

Адметнымі рысамі паэтычнага почырку П. Панчанкі з’яўляецца сплаў тонкага лірызму і палымянай публіцыстычнасці. У зборніках “Пры святле маланак”, “Снежань”, “Крык сойкі”, “Маўклівая малітва”, “І вера, і вернасць, і вечнасць”, “Горкі жолуд”, “Мы з тых беларусаў” і трывожны роздум над сутнасцю многіх з’яў і падзей, і клопат пра будучыню беларускай мовы, культуры, пра духоўнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўзвышэнне чалавека, і гатоўнасць адгукнуцца на чужыя праблемы, прыняць на сябе чужы боль, і сцверджанне адвечнай прыгажосці жыцця, і крытыка прыстасавальніцтва, хлусні, кар'ерызму. Асабліва хвалююць творы аб сутнасці чалавека, яго духоўным складзе, яго адметнасці і непаўторнасці.

У вершы "Белыя яблыні" паэт перадае веснавое шматгалоссе, "пялёсткаў шалёны хвалюючы пах". Белая квецень яблынь — гэта абнаўленне зямлі, прыроды, жыцця, гэта сімвал вечнай маладосці, радасць і шчасце першага кахання. Менавіта з расцвіўшых белых яблынь, на думку паэта, "нараджаюцца дзяўчаты на нашай зямлі". Другая частка верша прысвечана жонкам і маці, тым, у каго вялікая і святая місія на зямлі. П. Панчанка сцвярджае, што сусвет ачарсцвее "без ласкі вялікай жаночай", і таму жанчыны "заселяць любоўю" планеты і далёкія зоры. Любоў, спагада, хараство і веліч жанчыны ніколі не знікнуць на зямлі. Жыццё вечнае, як і вечнае хараство чалавечай душы.

У філасофскім вершы "І няма каго нам папракаць..." гучыць трывога за сённяшні дзень, за лад жыцця, які разбіў быт старой эпохі, дакор сённяшняму дню, маладзейшаму пакаленню, самому сабе за тое, што развучыліся па-гаспадарску адносіцца да зямлі, што шмат чаго бацькоўскага пазбавіліся ў наш цывілізаваны век:

І няма каго нам папракаць —
Быт стары эпоха раздрабіла.
Развучыліся мы коней запрагаць,
Не адрознім панарад ад біла.

Аўтар выступае супраць няшчырасці, раўнадушша, мяшчанства і прыстасавальніцтва. Ён верыць у высокі маральна-этычны патэнцыял чалавека, заклікае бараніць праўду ад маны:

Праўда веку!

Зрабі нас дужымі,

Рабства знішчыць дапамажы:

Рабства жонкі і рабства мужа,

Рабства дачаў і аўтамашын...

(“*Сумленне*”)

Глыбокі роздум над сучасным жыццём, трывога за лёс людзей і планеты, барацьба за “ісціны простыя, як хлеб, і праўдзівыя, як плач дзіцяці”, за чалавечнасць і такую дабрату, якая “ў будучыню сэрцы кіруе і ажыўляе слых у глухіх”, чуюцца ў вершах “Жыццё маё...”, “Вопыт”, “Прылучэнне”, “Пры святле маланак”.

У вершы “Жыццё маё...” аўтар сцвярджае, што лёс яго не быў зайздросным: у ім праламіліся святло і цень, удачы і няўдачы. Нягледзячы на цяжкасць жыцця, для аўтара свет усё роўна мілы і спагадлівы. І ён, як чалавек у самым высокім сэнсе гэтага слова, адчувае сваю віну перад калекамі (за іх пакуты), перад сінімі рэкамі (за атрутныя патокі), перад птушкамі (за браканьераў), перад памяццю мужных, перад старымі і маладымі. Аўтар — часцінка жыцця, і яму балюча за ўсе пакуты чалавецтва.

У вершы “Зямля бацькоў” П. Панчанка звяртаецца да Бацькаўшчыны, зямлі сваіх продкаў. Ён апісвае Палессе (радзіму І. Мележа), успамінае Ганну (гераіню“Палескай хронікі”), вёску Курані, якая нагадвае паэту яго родную вёску. Аўтар называе бацькоўскую зямлю святой:

Нас б’е па сэрцах паскарэнне,

Сціскаюцца прастора, час.

А матчынай зямлі карэнні

Ніколі не адпусцяць нас.

У многіх вершах П. Панчанка звяртаецца да сваіх сучаснікаў з просьбай верыць у бязконцасць, вечнасць чалавечага жыцця, якое

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

складаецца з дня ўчарашняга, сённяшняга і заўтрашняга, і яго штодзённае нараджэнне:

На нягоды жыцця не жальцеся,
Не было б перамог без нягод.
Нараджайцеся, нараджайцеся
Кожны месяц і кожны год.

*(“На нягоды жыцця не жальцеся...”)*

Нямала радкоў прысвяціў П. Панчанка роднай мове, прыгажосці і духоўнай вартасці беларускага слова. Мова продкаў для паэта вечная, як вечным з’яўляецца жыццё:

Кажуць мова мая аджывае
Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.
Для мяне ж яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара.

*(“Родная мова”)*

Жыццё з яго нязведанымі таямніцамі, рухам наперад, адкрыццямі і сустрэчамі з новым — невычэрпная крыніца для творчасці, і паэт востра рэагуе на ўсе праблемы сучаснасці. Ён адчувае адказнасць за ўсё, што было і ёсць у краіне пры яго жыцці. Сучаснасць жа ставіць такія пытанні, на якія не знойдзеш адказаў у папярэднікаў. Адсюль у творах ягоных такое высокае напружанне, хваляванне, а часам і спалучэнне іроніі, сатыры і лірыкі. П. Панчанку да ўсяго ёсць справа, таму ён выступае супраць усяго, што перашкаджае рухацца наперад, — бездухоўнасці, прыстасавальніцтва, раўнадушша, кар’ерызму, спажывецкіх адносін да прыроды. Аўтар лічыць страчанымі тыя дні, калі чалавек быў няшчыры, калі не падзяліўся радасцю з суседам, калі не паказаў дзецям “хараство людзей, і дрэў, і траў”. Паэзія П. Панчанкі ўзвышае, дапамагае жыць і думаць, яна сцвярджае цудоўныя каштоўнасці чалавечага жыцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 84

## “Я ВЯРНУСЯ ТУДЫ, ДЗЕ МОЙ НАРОД” (ПА РАМАНЕ Я. БРЫЛЯ “ПТУШКІ І ГНЁЗДЫ”)

Раман “Птушкі і гнёзды” не з’яўляецца лёгкім для чытання, бо ён расказвае пра жахлівыя і драматычныя падзеі, выпрабаванні, што выпалі на долю галоўнага героя Алеся Руневіча. Біяграфія героя амаль цалкам супадае з біяграфіяй самога Я. Брыля. Аднак пісьменнік не атаясамлівае сябе і героя рамана. Гэта твор пра цэлае пакаленне заходнебеларускай моладзі, пра тых, хто ў цяжкія для Бацькаўшчыны часы верылі ў перамогу над ворагам і рабілі ўсё для хуткага надыходу вызвалення. У. Калеснік называе гэту кнігу “інтэлектуальным раманам з уласцівай гэтаму жанру актыўнасцю духоўнай сферы”.

Кінуты ў вір крывавых ваенных падзей, адарваны ад дому і родных, Руневіч шукае адказу на пытанне: хто ён такі — лісцік, сарваны ветрам з дрэва і занесены на чужыну, ці часцінка свайго народа? Алесь — юнак з заходнебеларускай вёскі Пасынкі — вымушаны служыць у польскім войску. Служба для яго — вымушаны абавязак, які, безумоўна, аказаў значны ўплыў на фарміраванне характару маладога чалавека, яго светапогляду. Калі на Польшчу напала фашысцкая Германія, Руневіч трапіў у палон, дзе за доўгія месяцы зведаў не толькі цяжкую фізічную працу, здзекі, кпіны, голад, але і душэўныя пакуты. Ён спрабуе знайсці адказ на пытанне, чаму нацыя, вядомая ўсяму свету выдатнымі філосафамі, пісьменнікамі, музыкантамі, дазволіла сфарміравацца фашызму з яго чалавеканенавісніцкай, забойчай філасофіяй. Руневіч з годнасцю праходзіць праз усе жыццёвыя выпрабаванні.

У сваім рамане Я. Брыль паказвае звярынае аблічча фашызму з таго боку, з якога гэтага не рабіў у нашай літаратуры ніхто. Ён паказвае, як нечалавечая ідэалогія фашызму і шалёная гебельсаўская прапаганда ачмурае нямецкага абываццеля, “вызваляе” яго ад усялякай адказнасці за злачынствы супраць чалавецтва. Алесю Руневічу не раз даводзілася выслухоўваць лухту розных нямецкіх паноў і падпанкаў аб звышчалавечнасці немцаў, аб неабходнасці пашырэння іх жыццёвай прасторы і закабалення астатніх народаў. Але ў Руневіча няма сляпой нянавісці да Германіі: ён вучыцца распазнаваць, дзе немец, а дзе — фашыст, дзе “вечнае, народнае”, а дзе — вынік фашысцкай прапаганды. Адчуванне прыналежнасці да свайго народа, любоў да роднай зямлі — усё гэта дапамагае Алесю прайсці праз цяжкія жыццёвыя выпрабаванні і застацца чалавекам. Для яго непрымальная такая жывёльная філасофія, якую меў адзін з персанажаў рамана Цярэнь з-пад Ліды: “Дзе мне добра, там і маё”. Алесь жа ведае, што яго месца там, дзе народ у крыві здабывае свабоду, змагаючыся з ворагам. Таму ён ні на хвіліну не пакідае думкі аб свабодзе. Нарэшце, з другой спробы яму удаецца ўцячы з палону. У эпілогу твора расказваецца аб партызанскай дзейнасці героя.

У рамане многа экскурсаў у мінулае, успамінаў пра сям’ю, сваякоў, блізкіх, многа светлых юнацкіх мар і жаданняў, дзе выяўляюцца духоўныя каштоўнасці галоўнага героя твора, яго гуманістычная прыгажосць. Жахлівай рэчаіснасці жыцця ў палоне Алесь супрацьпастаўляе ўспаміны і мары аб светлых днях маленства, аб сям’і, аб роднай прыродзе. Гэты прыём дазваляе аўтару стварыць фон рамана і канкрэтызаваць для чытача дарагое сэрцу галоўнага героя слова “Радзіма”. Я. Брыль так вызначыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тэматыку свайго рамана:“Бурная маладосць майго пакалення, дні вайны, фашысцкі палон, партызанскія ночы”.

Ідэя рамана алегарычна выяўляецца праз яго назву. Руневіч вярнуўся на Радзіму, дзе нарадзіўся, атрымаў выхаванне, спазнаў першыя жыццёвыя радасці. І калі птушак цягне ў свае гнёзды біялагічны інстынкт, то ў чалавека сувязь з Бацькаўшчынай мацнейшая: дзеля вяртання на Радзіму ён гатовы прайсці праз самыя цяжкія выпрабаванні, жыццёвыя ахвяры. Толькі тады яго можна назваць сапраўдным сынам сваёй Радзімы, свайго народа.

**85**

## ВЫСАКАРОДНАСЦЬ ГЕРОЯЎ У АПАВЯДАННЯХ Я. БРЫЛЯ “МАЦІ” І “MEMENTO MORI”

Апавяданні Я. Брыля “Маці” і “Memento mori” аб’яднаныя агульнай тэмай — тэмай ахвярнасці звычайнага чалавека ў імя жыцця іншых людзей. І маці з аднайменнага апавядання і стары пячнік з “Memento mori” робяць свой выбар свядома, не думаючы аб нейкай гераічнасці сваіх учынкаў. Гэта — выяўленне сапраўднай сутнасці чалавека.

У апавяданні “Маці”, якое Д. Бугаёў адносіць да ліку самых выдатных узораў гэтага жанру ў беларускай прозе, паказваецца грамадзянскі і чалавечы подзвіг жанчыны-маці. Шмат гора зведала на сваім шляху гэта сціплая і мужная жанчыны: парабкоўства, смерць мужа, вайну, трывогу за двух старэйшых сыноў Уладзіка і Сцяпана, якіх выгнала з хаты вайна, і малодшага Васіля. У цяжкую для іх часіну ў хаце маці знайшлі кавалак хлеба, шклянку малака і мацярынскую пяшчоту знясіленыя палонныя, што ўцяклі з фашысцкага лагера. За гэты ўчынак маці расплачваецца жыццём.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апошні шлях жанчыны "ад роднай хаты да свежай ямы ў лапухах" асацыіруецца з пакутлівым шэсцем Ісуса Хрыста на Галгофу, шэсцем да несмяротнасці.

Трымаючы "свае худыя, так мала ў жыцці цалаваныя рукі" мазалямі да мазалёў, маці не просіць ні літасці, ні спагады, думае не пра сябе і не пра непазбежнасць смерці. Яна моліцца за сыноў: "Хавай іх, божа, усіх трох ад куль, дай ім усім убачыць матчыну магілу!.." Душа маці вяртаецца да палонных, з якімі так зрадніла яе доля (адзін з іх, "яшчэ зусім хлапчук, нядаўна астрыжаны пад машынку", нагадваў малодшага сына). Па твары жанчыны цякуць слёзы крыўды за чужых маці, якія нарадзілі фашыстаў-нелюдзяў. Заканчваецца апавяданне горкім папрокам тым, хто па розных прычынах не змог выратаваць маці, абараніць чалавека ад гвалту і здзекаў у сваёй хаце, роднай вёсцы: "Вобраз яе засядзе ў сэрцы многіх мужчын горкім, няўмольным дакорам, ... вочы і рукі яе ўспамінаць будуць нават дужыя людзі, выганяючы з душы апошні страх перад начной партызанскай атакай...".

Дзеянне ў апавяданні "Memento mori"( з лацінскага — думай пра смерць) адбываецца ў 1943 г. На адным з перагонаў Беларускай чыгункі ўзарваўся фашысцкі эшалон. Праз дзень карнікі сагналі жыхароў адной з навакольных вёсак у адрыну і спалілі. Ад смерці мог бы ўратавацца стары вясковы пячнік, якога пазнаў зондэрфюрэр (пячнік некалі ўдала змайстраваў у камендатуры пліту і галанку). Але ён не прыняў выратавання, просячы вызвалення з адрыны "усіх добрых людзей". "І ён згарэў — адзін, хто мог бы ў той дзень не згарэць. І ён жыве", — такімі жыццесцвярджальнымі словамі заканчваецца апавяданне. Печніка будуць успамінаць не толькі за ўменне класці добрыя печы, але і за хараство душы, маральную

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

высокасць, мужнасць, якую ён праявіў у апошнім сваім учынку. Гэты ўчынак печніка не можа сцерціся з людской памяці, бо не могуць загінуць тыя духоўныя каштоўнасці, якія заўсёды насіў у сэрцы гэты чалавек.

У чым жа сэнс назвы двух твораў Я. Брыля? Маці, нібы самаахвярная птушка-фенікс, кідае сваё жыццё ў ненажэрную пашчу вайны, абараняючы гэтым чужых сыноў. Назваю твора Я. Брыль хацеў падкрэсліць, што для сапраўднае маці не важна, чыіх дзяцей яна абараняе, — у яе свая, мацярынская сутнасць ахвярнасці. Не менш значная і назва другога твора — "Memento mori" ("Памятай пра смерць"). Чалавек павінен заўсёды быць гатовым да смерці — казалі старажытныя. Аўтар фіналам свайго твора ўдакладняе гэтае выказванне: чалавек не павінен чакаць смерці, але, калі яна яго напаткае, ён павінен застацца чалавекам да канца.

Героі абодвух твораў Я. Брыля ахвяруюць сабою дзеля іншых. У гэтым выявілася іх высакароднасць і сапраўдная чалавечнасць — любоў не толькі да сябе, але і да іншых людзей, да ўсяго свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**86**

## ШЧАСЦЕ... У ЧЫМ ЯНО? (ПАВОДЛЕ АПАВЯДАННЯ Я. БРЫЛЯ "ГАЛЯ")

Творчасць народнага пісьменніка Беларусі вызначаецца глыбінёй зместу, лірызмам, праўдзівасцю, завостранай публіцыстычнасцю, багаццем жанраў. Шырокае прызнанне чытачоў атрымалі яго апавяданні, лірычныя запісы, дарожныя нататкі, эсэ. У іх перадаюцца пачуцці, уражанні, асацыяцыі, назіранні, роздумы аўтара, яго выказванні аб людзях і свеце, аб надзённым і вечным.

Адным з лепшых узораў лірычнай прозы лічыцца апавяданне Я. Брыля "Галя". У ім цесна перапляліся каханне і суровая жыццёвая праўда. Пачынаецца апавяданне з апісання былога хутара, дзе жыве Галя з дзецьмі (сынам Антосем і дачкой Сонечкай). Пад гул трактара на калгасным полі гераіня з жалем і болем успамінае сваё мінулае жыццё. Гул трактара (на ім працуе Сярожа) выконвае ў творы ролю сімвала кахання: ён не дае Галі заснуць, трывожыць успамінамі, прымушае хваляваўцца, шкадаваць, спадзявацца, прасіць... Калісьці была яна шчаслівай, горача і базаглядна кахала Сярожу. Праўда, шчасце гэта было нядоўгім: каханага за рэвалюцыйную дзейнасць пасадзілі ў турму, а лёс прымусіў яе пайсці замуж за багатага Міколу Хамёнка.

Пакутлівым было жыццё Галі ў доме кулака-хутараніна, дзе ўсе жылі "для гумна". Увесь час яна адчувае сябе чужой, бо не бачыць людской павагі, сардэчнага цяпла, дабрыні. Усе ў доме старога Хамёнка жывуць па страшным уласніцкім прынцыпе: "Менш паспіш — болей зробіш. Не з'ясі, не зносіш — больш застанецца". Пасля смерці свёкра і свекрыві гаспадарыць на хутары стаў Мікола, якому генетычна перадаліся вечныя панурасць, незадаволенасць жыццём і сквапнасць. У гады вайны ён "захварэў" ("прастрэлілі руку") і адсядзеўся дома, спекулюючы самагонам (за што трапіў у турму).

Нягледзячы на ўсе складанасці жыцця, Галя не страціла сваіх духоўных сіл, не замкнулася ад людзей у сваім жаночым горы. У канцы апавядання яна вырашае назаўсёды пакінуць ненавісны хамёнкаўскі хутар, што засланіў ад яе белы свет, змяніць прозвішча і пачаць новае жыццё. У душы жанчыны, якой з каханым "калісьці цёпла было стаяць і на снезе", а цяпер "холадна ўжо і не летняй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

расе”, яшчэ не згасла надзея на шчасце, на новую сустрэчу з Сяргеем.

Такім чынам, канфлікт у творы завязаны на супярэчнасці паміж мінулым і сучасным галоўнай гераіні. Калісьці яна зрабіла свой выбар на карысць заможнага, як ёй тады здавалася, жыцця з нялюбым чалавекам, у пэўным сэнсе адрокшыся ад сябе. Аднак прайшоў час, і Галя зразумела, што шчасце прайшло міма; але яна ўсёй сваёй жаночай натурай разумее, што яго яшчэ не позна вярнуць. Ёй спатрэбіліся гады, каб усвядоміць сваю памылку.

“Вярніся ты хоць як-небудзь назад, мая харошая, мая загубленная маладосць. Вярніся, зірні мне ў вочы, і я сама падпалю гэты хутар, вазьму дзяцей, пайду за табою ўсюды, куды скажаш”, — просіць гераіня лёс. І ў гэтых словах, звернутых да Сяргея, нямала надзеі, спадзяванняў на тое, што шчасце ўсё ж прыйдзе да жанчыны. Сам-насам з гэтымі спадзяваннямі пакідае аўтар сваю гераіню. Пісьменнік не дае адказу на пытанне, у чым жа гэта шчасце. У багацці, здароўі, дзецях, магчымасці працаваць!.. Яно ў нечым іншым, у тым, што разнявольвае душу, робіць кожны жыццёвы крок асэнсаваным, кожны пражыты дзень напоўненым радасцю ад прысутнасці любімага чалавека, без якога цяжка ці проста немагчыма жыць.

Відаць, шчасце для Галі — гэта быць заўсёды пачутай і зразумелай для любімага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**87**

**ПАЛЕСКАЯ ВЁСКА 20-Х ГАДОЎ (“ПАЛЕСКАЯ ХРОНІКА” І. МЕЛЕЖА)**

Талент народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа з асаблівай сілай раскрыўся ў “Палескай хроніцы”, над якой аўтар працаваў з 1956 г. да канца сваіх дзён. Яна прысвечана сялянскаму жыццю ў першыя паслярэвалюцыйныя гады, калектывізацыі.

Палессе для І. Мележа — яго родны край, дзе прайшлі гады яго дзяцінства і юнацтва. Таму з сыноўяй любоўю “вымаляваў” ён кожны куточак бацькоўскай зямлі: лес, дарогу да Юравіч, грэблю, цагельню... Цеплынёй і замілаваннем сагрэта апісанне чэрвеньскай раніцы ў Куранях, калі “сонца выпырснула першыя праменні між вяршынь Церамоскага лесу, з каміноў на куранёўскіх стрэхах віліся ціхія ранішнія дымочкі, у расчыненых хлявах... чулася цырканне малака ў даёнкі”, ля зруба калодзежа “задаволена, радасна зарыпеў” журавель, “касцы ладзілі, адбівалі малаткамі косы”...

У апісанні куранёўскай раніцы адчуваецца і мінорны настрой аўтара, ледзь улоўны яго сум: цяжка жывецца селяніну ў вёсцы, адрэзанай ад знешняга свету непраходнымі палескімі балотамі. Сяляне заўзята і цярпліва працуюць на сваіх вузкіх палосках, але неўрадлівая зямля не здольна забяспечыць іх самыя скупыя патрэбы. Жывуць куранёўцы бедна: рэдка хто мае добрага каня і збрую, не ў кожнага ёсць карова. Таму пры самым ашчадным і старанным вядзенні гаспадаркі даводзіцца пазычаць у Глушака хлеб, бульбу, крупы, а пазней адрабляць за гэта касьбой, малацьбой, жнівом.

І. Мележ паказвае штодзённае жыццё куранёўцаў, тое знешне няяркае, аднастайна-шэрае, з чаго і складаецца жыццё мільёнаў людзей, моцна прывязаных да зямлі. Ніякіх значных подзвігаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нічога гераічнага куранёўцы не робяць. Кожны з іх заняты сваімі неадкладнымі справамі, клопатамі, якія паўтараюцца з году ў год. Яны жывуць паводле закону: летні дзень год корміць.

Жыхары вёскі Курані — яркія, запамінальныя, непаўторныя. Маўклівасцю, замкнёнасцю, нават дзікаватасцю вылучаецца Пракоп. Процілегласцю яго выступае Сарока, з вуснаў якой, нібы з рэшата, сыплюцца прымаўкі, трапныя выразы і характарыстыкі людскіх якасцей, учынкаў. Андрэя Рудога можна назваць вясковым кніжнікам, палітыкам, у якім адлюстравалася спрадвечная цяга сялянскага розуму да пазнання свету, у якім жыве чалавек, да ведаў. Ганну, якая выдзяляецца сярод аднавяскоўцаў надзвычайным спрытам, мы бачым у асноўным за працай: на сенажаці, у полі, за малатарняй, на копцы бульбы, у клопатах па гаспадарцы. Недаверлівы, упарты, Васіль не ўяўляе шчасця без зямлі. Ён ідзе да свайго поля, як “на сустрэчу з каханай”. Усіх куранёўцаў аб’ядноўвае любоў да штодзённай працы, якая перадалася ім ад бацькоў і дзядоў. У працы змалку загартоўваліся людзі.

У “Палескай хроніцы” шмат замалёвак побыту куранёўцаў, традыцыйных абрадаў (каляд, агледзін, змовін, дзявочніка, вяселля). Палешукі, жывучы сярод балот, не страцілі цікавасці да свету. Яны ўмеюць не толькі працаваць, але і адпачываць, радавацца жыццю, спадзявацца на лепшыя дні. Яны кахаюць і ненавідзяць, весяляцца і сумуюць, знаходзяць і губляюць...

Ціхае жыццё куранёўцаў было абуджана рэвалюцыяй і калектывізацыяй. На вачах пачаў мяняцца лад. Па-рознаму аднесліся да гэтых грандыёзных перамен жыхары вёскі. Кожны з іх не да канца зразумеў сутнасць складанай і супярэчлівай рэчаіснасці. Кінутыя ў буру сацыялістычных пераўтварэнняў, яны ўсё ж такі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

змаглі захаваць адметныя і непаўторныя рысы нацыянальнага характару.

І. Мележ у “Палескай хроніцы” паэтызуе, адухаўляе высокія чалавечыя якасці герояў, іх працавітасць, любоў да зямлі. Праўдзіва адлюстроўваючы жыццё палескай вёскі на пачатку нашага стагоддзя, пісьменнік стварыў мастацкія вобразы вялікай абагульняльнай сілы. Яму ўдалося так поўна, усебакова і па-майстэрску дасканала расказаць пра палешукоў, што яны зрабіліся цікавымі, запамінальнымі і блізкімі для многіх пакаленняў чытачоў.

## 88

## ДРАМА ВАСІЛЯ ДЗЯТЛА (ПА “ПАЛЕСКАЙ ХРОНІЦЫ” І. МЕЛЕЖА)

Васіль Дзяцел — цэнтральны герой “Палескай хронікі” І. Мележа. Знаёмства з ім адбываецца ўжо на першых старонках рамана “Людзі на балоце”. Ён жыве ў беднай сям’і з маці, старым дзедам і малодшым братам Валодзькам( бацька загінуў на імперыялістычнай вайне). Таму на худыя плечы хлапчука (адзінага работніка ў сям’і) кладуцца клопаты па гаспадарцы. У партрэтнай замалёўцы Васіля падкрэсліваецца яго панурасць, засцярожанасць, супярэчлівасць характару. Нават вочы яго былі рознымі: адно, “як вада, светлае, а другое, як жалудок”. З дзяцінства ў характары Васіля выспяваюць рысы сапраўднага гаспадара, які не толькі не баіцца цяжкай працы, але і знаходзіць у ёй сапраўднае задавальненне і асалоду. У працы, якая з’яўлялася маральна-філасофскай асновай вобраза Васіля, раскрываецца прыгажосць душы, характару героя.

Любоў да штодзённай сур’ёзнай працы перадалася Васілю ад бацькоў і дзядоў. Змалку загартоўваючыся ў працы, ён добра ведаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што “жыццё — не вясёлае, бесклапотнае свята, а найбольш доўгі і клопатны будзень”. Герой твора не чакае ад жыцця ніякай палёгкі і працуе да горкага поту, да здранцвення рук, спадзеючыся, што ўдасца падрамантаваць хату, купіць лепшага каня, адборнага зерня. Толькі не пад сілу гэта Васілю, бо на пустой ніве нічога не родзіць, а ўраджаю нават не хапае для сябе. І таму зразумелай становіцца мара Васіля прыдбаць кавалак глушакоўскага поля каля цагельні, дзе з году ў год збіраўся добры ўраджай. Гэта жаданне настолькі моцнае, што, не зважаючы на пагрозы Карчоў і новай улады, ён уначы самавольна заворвае поле, а пасля ўступае ў бойку з Яўхімам. Гэты ўчынак Васіля, як і пазнейшая сутычка за зямлю з Міканорам, успрымаюцца драматычна, выклікаюць шчымлівы боль і спачуванне герою. Зямля для Васіля — яго жыццё, радасці і гора, светлыя мары і горкія пакуты. Зямля — ён сам. Ён ідзе да свайго поля, як “на сустрэчу з каханай”. У адносінах да зямлі Васіль нагадвае Міхала з “Новай зямлі”. “Усе сілы чалавека — у зямлі, — разважае Васіль. — І сіла ўся, і радасць. Няма зямлі — няма, лічы, чалавека”. І з сённяшняга пункту гледжання мы разумеем, што на гэтым стаіць праўда жыцця, якую добра адчуў і паказаў у творы І. Мележ.

І. Мележ малюе свайго героя з любоўю, сімпатыяй і разам з тым не хавае адмоўных якасцей яго характару. Нагадаем той выпадак, калі Васіль без асаблівых хістанняў адмаўляецца даць Грыбку, у якога захварэла дзіця, лыжку мёду. Безумоўна, сквапнасць, эгаізм, а таксама недаверлівасць, няверʼе ў людзей, замкнутасць пэўным чынам вытлумачваюцца (уплывам асяроддзя, асаблівасцямі таго складанага часу, умовамі жыцця, выхаваннем, сацыяльнымі прычынамі), але не ўпрыгожваюць чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Прыгажосць і шчырасць душы Васіля асабліва раскрываюцца ў каханні да Ганны. Калі Ганна стала для яго дарагім чалавекам, то жыццё напоўнілася новым, радасным зместам, свет быццам перайначыўся, зазіхацеў рознымі фарбамі. З захапленнем і замілаваннем расказвае пісьменнік гісторыю кахання маладых і шчаслівых людзей, апісвае іх сустрэчы пад шапаткімі грушамі, раскрывае глыбіню пачуццяў, народжаных сярод цяжкай працы і вечных клопатаў пра кавалак хлеба. Здавалася, шчасце будзе бясконцым. Але ў жыцці ўсё склалася інакш. Першае каханне, трапяткое і нясмелае пачуццё, абразіў сам Васіль. Паверыўшы ў брыдкія плёткі, ён растаптаў усё тое прыгожае, што існавала паміж імі. І Ганна, абражаная і пакрыўджаная, насуперак свайму жаданню выходзіць замуж за Яўхіма, спадзеючыся на спрадвечнае “сцерпіцца — злюбіцца”. Але не злюбілася і не сцярпелася... Васіль жа, згубіўшы сваю радасць, сваю прыгожую “рабіну”, ажаніўся з багатай Маняй, якую ніколі не кахаў. Багаты пасаг нявесты ён прамяняў на каханне Ганны. Жаданне стаць заможным гаспадаром, “набіць снапамі гумно”, завесці “пяць кароў і стаенніка” перамагае. З-за зямлі і багацця Васіль з вялікім унутраным болем, але свядома і канчаткова адмаўляецца ад Ганны. Але яшчэ доўга ён будзе пакутаваць, і пякельны боль ад страты каханай увесь час будзе нагадваць аб сабе.

У планах будучых раздзелаў твора І. Мележ намерваўся правесці героя праз новыя выпрабаванні і драматычныя сітуацыі. У гады Вялікай Айчыннай вайны Васіль спачатку змагаецца на фронце (там яго параніла), пасля — у партызанскім атрадзе. Хроніка павінна была закончыцца прыездам Васіля ў Куранi з думкай: “І ўсё-такі мы будзем жыць. Нас — не задушыць. Бо мы — народ!”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 89

## ВОБРАЗ ГАННЫ (“ПАЛЕСКАЯ ХРОНІКА” ІВАНА МЕЛЕЖА)

Жаночы вобраз у беларускай літаратуры мае адносна невялікую гісторыю. Стварэнне паўнавартаснага жаночага вобраза звычайна звязваецца з літаратурай навейшага часу і асабліва тым перыядам яе развіцця, які прынята вызначаць як перыяд станаўлення беларускага рамана. Вялікая роля ў гэтым належыць Івану Мележу, які ў сваёй “Палескай хроніцы” стварыў запамінальны вобраз Ганны Чарнушкі. Галоўная заслуга аўтара заключаецца ў тым, што вясковая дзяўчына паўстае перад намі не як нейкі этнаграфічна-лубачны ўзор беларускай сялянкі, а як жывы, рухомы характар. На месца жанчыны-калгасніцы, жанчыны-змагаркі (чым грашыла наша літаратура да І. Мележа) прыходзіць жанчына-маці, якая прагне чалавечага кахання і любові. І таму твор І. Мележа, які адлюстроўвае жанчыну ў яе прыроднай сутнасці, мае такі вялікі поспех.

Ганна славілася на ўсё наваколле сваёй гарэзлівасцю і прыгажосцю. І. Мележ параўноўвае яе з рабінай: “І неспадзявана адбылося незвычайнае: ціхая, нявідная, у жнівеньскім росквіце рабіна заружавела, зазырчэла яркім, кідкім хараством, гарачым полымем агністых гронак. І не адны вочы, не абыякавыя, не ачарсцвелыя ў жыццёвых пакутах да хараства, глядзелі здзіўлена, зачаравана: “Глядзі ты!..” Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна”.

Прырода адарыла Ганну не толькі знешняй, бачнай кожнаму прыгажосцю, але і духоўным хараством, якое можа адкрыцца толькі блізкаму, роднаснаму чалавеку. І таму пошук гэтай роднасці душ складае асноўны напрамак яе духоўнага развіцця. У сваіх учынках

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ганна не кіруецца  карыслівасцю, прагматычнымі мэтамі. Яна жыве сэрцам і пазбаўлена халоднага разліку. На старонках твора Ганна часта паказваецца ў такіх сітуацыях, дзе выяўляюцца гэтыя  рысы яе характару. Яна жыве па прынцыпе: “Ніколі не рабіце іншым таго, чаго не хацелі б вы, каб вам рабілі іншыя”. Таму яе здольнасць чуйна адклікацца на чужы боль, падтрымліваць у цяжкую хвіліну іншых успрымаецца намі не як штосьці штучнае, напускное, а як глыбінная сутнасць характару гераіні. Магчыма, не апошнюю ролю ў гэтым адыграла яе звыкласць з маленства да цяжкай сялянскай  працы, дзе ёй не было роўных. Нездарма ж яшчэ Эпікур сцвярджаў, што чалавек працы мае самую чыстую душу. І ў рамане Ганну мы бачым у асноўным за працай: на сенажаці, у полі з сярпом у руках, за малатарняй у Карчоў,  у ягадах, на копцы бульбы, у клопатах па гаспадарцы.

Найбольш жа яскрава раскрываецца душэўная прыгажосць Ганны ў адносінах да Васіля, якога пакахала яна пяшчотна, шчыра і самааддана. Яна марыць аб простым  чалавечым шчасці — кахаць і быць каханай. Але гэтыя высокія пачуцці разбіваюцца аб халоднае каменне рэчаіснасці. Першае каханне, трапяткое, нясмелае і ў нечым сляпое (а таму і шчырае) пачуццё,  з самага пачатку абразіў той, на каго яно было скіравана, — Васіль. Паверыўшы чужым языкам, а не каханай дзяўчыне, ён растаптаў усё тое светлае і прыгожае, што існавала паміж імі. І Ганна ў хвіліну нясцерпнай абразы і пякучага болю прымае рашэнне звязаць свой далейшы лёс з Яўхімам. Ганна — дачка свайго часу, і ў гэты трагічны момант яна кіруецца не голасам сэрца, а спрадвечна сялянскім “сцерпіцца — злюбіцца”. Пераадоленне гэтага разрыву паміж марай і явай стварае асноўны накірунак далейшых духоўных пошукаў гераіні. Чым даўжэй яна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

жыве ў сям’і Глушакоў, тым большыя памеры набывае гэты разрыў і тым глыбей, выразней разумее Ганна ўсю жахлівасць свайго становішча — становішча жонкі-рабыні, якая павінна толькі працаваць ад усходу да заходу сонца, дагаджаць мужу, нараджаць дзяцей і цярпліва зносіць усе здзекі і абразы. Глухія Глушакі да ўсяго, што не тычыцца іхняй прагі да ўзбагачэння. Стары Глушак прымушае Ганну ехаць на сенакос разам з Верачкай, дзе тая захварэла і неўзабаве памерла. “Бог даў — бог узяў”, — вось рэакцыя Глушакоў на смерць дзіцяці.

Безумоўна, гэты жахлівы выпадак не мог не прывесці Ганну да душэўнага зрыву, надлому. Яна не можа больш жыць побач з такімі “сваякамі”, нялюбым мужам. Рэчаіснасць адпомсціла Ганне за здраду светлым марам. Але жыццё не скончана, яно працягваецца, узыходзячы на новую ступень развіцця. Ганна пакідае сям’ю Глушакоў і ідзе працаваць у школу (да настаўніцы Парасі), якая становіцца часовым прыстанішчам на яе далейшым жыццёвым шляху.

Лёс Ганны склаўся нялёгка. Надзеі на вяртанне былога кахання не апраўдаліся (Васіль застаўся з зямлёй), зварот у бацькоўскую хату душэўнага спакою не прынёс, пасля сустрэч з Башлыковым засталіся прыкрасць і горкая агіда...

Вобраз Ганны можна лічыць першым паўнавартасным жаночым вобразам у нашай літаратуры. Заслуга І. Мележа ў тым, што ён на першае месца вылучае духоўны свет жанчыны ва ўсіх складанасцях яго развіцця: ад радасцей першага кахання да жорсткіх рэалій рэчаіснасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**90**

## ШЛЯХІ-ДАРОГІ ПЯТРА ШАПЯТОВІЧА І САШЫ ТРАЯНАВАЙ (ПА ПЕНТАЛОГІІ І. ШАМЯКІНА “ТРЫВОЖНАЕ ШЧАСЦЕ”)

Не верце, калі хто скажа, што
хоць адна дарога ў жыцці лёгкая.
*І. Шамякін*

Сярод усіх твораў народнага пісьменніка Беларусі І. Шамякіна вылучаецца пенталогія “Трыважнае шчасце”. Лёс яе герояў асацыіруецца з лёсам усяго пакалення, што прайшло праз цяжкія выпрабаванні вайны, змагаючыся на франтах і ў партызанскіх атрадах, і ў цяжкіх пасляваенных умовах удзельнічала ў аднаўленні народнай гаспадаркі.

Галоўныя героі пенталогіі — Пятро Шапятовіч і Саша Траянава. У першай аповесці “Непаўторная вясна”, якую можна неназваць гімнам юнацкаму каханню, паказаны перадваенныя гады. Пятро (студэнт тэхнікума) і Саша (толькі што скончыла медвучылішча) кахаюць адзін аднаго. Іх першае пачуццё ўснёслае, непасрэднае, рамантычнае. Сарамлівы па натуры, поўны надзей і захапленняў, Пятро па натуры паэт. Усе яго вершы, крыху наіўныя, але шчырыя, прысвячаліся Сашы. Безумоўна, дзяўчына была вартай яго ўзнёслых вершаў і сардэчных прызнанняў. Адсутнасць жа жыццёвага вопыту, юнацкі максімалізм, пачуццё рэўнасці часам прыводзяць да непаразуменняў, спрэчак, складанасцей ва ўзаемаадносінах герояў. Аўтар імкнецца раскрыць духоўны свет маладых людзей, глыбіню іх пачуццяў, грамадзянскіх пазіцый. У хуткім часе непаразуменні герояў скончыліся, і Саша становіцца жонкай Пятра. Перад пачаткам вайны Пятра забіраюць у армію, і героі расстаюцца на доўгі час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У другой аповесці (“Начныя зарніцы”) расказваецца пра лёс Сашы ў гады вайны, пра разгортванне падпольнай і партызанскай барацьбы на Беларусі. Саша застаецца з дачкой Ленай на акупіраванай тэрыторыі і прымае актыўны ўдзел у змаганні з ворагам. Разам з братам Данікам, Цішкам Матылём, Колем Трапашом, Толем Кустарам яна выконвае самыя небяспечныя заданні. Характар Сашы асабліва ярка праявіўся ў эпізодзе, калі яна, выконваючы партызанскае даручэнне, павінна была выдаваць параненага камісара за свайго мужа. Партызанскім камісарам быў настаўнік Уладзімір Іванавіч Лялькевіч, які яшчэ да вайны рабіў Сашы прапанову выйсці за яго замуж. Праз узаемаадносіны Сашы з Лялькевічам пісьменнік праўдзіва, эмацыянальна, псіхалагічна абвострана паказаў, што цяжкасці вайны ўскладняліся і маральнымі выпрабаваннямі. Саша з годнасцю прайшла праз гэтыя выпрабаванні: не пайшла за абставінамі, выстаяла, захавала вернасць блізкім.

Суровы вопыт ваенных гадоў, калі І. Шамякін служыў на Поўначы ў зенітных войсках, лёг у аснову аповесці “Агонь і снег”. Яна прысвечана франтавому жыццю Пятра Шапятовіча. Напісаная ў форме франтавога дзённіка, аповесць вытрымана ў дакументальным стылі. У ёй праўдзіва паказаны шлях унутранага ўзмужання галоўнага героя (першы бой батарэі з нямецкімі афіцэрамі, першы збіты самалёт, смерць Сені Пясоцкага, бяздушнасць, залішняя падазронасць Кідалы, цяжкае раненне).

У чацвёртай аповесці Пятро пасля цяжкага ранення і выпіскі са шпіталя аказваецца ў родных мясцінах, дзе шырока разгарнулася партызанская барацьба. Адбываецца сустрэча Пеці і Сашы, але

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вайна настолькі пераблытала лёсы, ускладніла іх узаемаадносіны, што поўнага разумення героі не знайшлі.

Аповесць “Мост” — пра новы этап у каханні Пятра і Сашы. Дзеянне адбываецца пасля вайны. Героі не ваююць, але і ў 1946 г. ім не лягчэй. Пеця працуе настаўнікам, Саша — загадчыцай фельчарскага пункта. Аўтар паказвае цяжкія пасляваенныя гады. Мацнее пачуццё глыбокай унутранай блізкасці герояў, якія аднолькава адчуваюць жыццё, аднолькава ацэньваюць падзеі. Мост, які злучае два процілеглыя берагі ракі, злучыў два людскія сэрцы.

У вобразах Сашы Траянавай і Пятра Шапятовіча І. Шамякін увасобіў тыповыя рысы характару таго пакалення моладзі, на долю якога выпалі цяжкія гады ліхалецця і аднаўленчага перыяду. Героі прайшлі ўсе выпрабаванні жыццём, засталіся вернымі сабе і суровай праўдзе жыцця.

**91**

## ГАРТАЮЧЫ СТАРОНКІ ТВОРАЎ ІВАНА ШАМЯКІНА

Народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін належыць да пакалення пісьменнікаў, маладосць якіх была апалена і загартавана вайной. Магчыма, па гэтай прычыне большасць яго твораў так ці інакш звязана з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Тэме вайны прысвечаны аповесці “Помста”, “Гандлярка і паэт”, “Ахвяры”, раманы “Глыбокая плынь”, “Снежныя зімы”, “Сэрца на далоні”, пенталогія “Трывожнае шчасце”.

У цэнтры аповесці “Помста” — лёс маёра Раманенкі, у якога ў вайну загінулі маці, жонка і дачка. Герой твора, палаючы помстай, адшуквае сям’ю ката. Аднак адплаціць той жа манетай жонцы і дзецям Візэнера салдат-пераможца не змог: перамагла высокая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавечнасць, духоўная моц. Раман “Глыбокая плынь” прысвечаны партызанскай барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў. Цэнтральным героем у ім з’яўляецца настаўніца і партызанская сувязная Таццяна Маеўская, якая выратавала яўрэйскага хлопчыка, выдаўшы яго за сваё дзіця. Асноўная ўвага ў рамане акцэнтуецца на гераізме і бясстрашнасці патрызан, іх патрыятызме, адданасці Радзіме (вобразы камісара брыгады Лясніцкага, камандзіра брыгады Прыборнага, калгаснага пчаляра Карпа Маеўскага, разведчыка Буйскага, шафёра Майбарады).

Ваенныя падзеі ў рамане “Сэрца на далоні” паказваюцца ў рэтраспектыўным плане. Героі яго — доктар Яраш, пісьменнік і журналіст Шыковіч, дачка падпольшчыка Савіча Зося — змагаюцца супраць дэмагога і кар’ерыста Гукана за аднаўленне праўды і справядлівасці ў дачыненні да дзейнасці падполля і яго ўдзельнікаў, за рэабілітацыю імён адважных патрыётаў, выкрыццё сапраўдных здраднікаў. У цэнтры ўвагі пенталогіі “Трывожнае шчасце” — лёс пакалення, што прайшло праз цяжкія ваенныя выпрабаванні і засталося верным сабе і суровай жыццёвай праўдзе. Пра цяжкія ўмовы партызанскай і падпольнай барацьбы, няўмелае ўмешванне ў дзейнасць партызанскіх атрадаў прадстаўнікоў НКУС, пра лёс абаронцаў радзімы, якія і на вайне адчулі жудаснае ўздзеянне таталітарнай палітыкі страху і здзекаў, расказваецца ў аповесці “Ахвяры”.

У аповесці “Гандлярка і паэт” пісьменнік паказвае, як у гады ваеннага ліхалецця нават прадстаўнікі сацыяльных нізоў духоўна сталеюць, становяцца свядомымі змагарамі з ворагам. Камароўская гандлярка Вольга Ляновіч пад уплывам Алеся Шпака маральна перавыхоўваецца, пачынае адчуваць адказнасць не толькі за сябе і

свае ўчынкі, але і за іншых. У канцы твора яна (замест Алеся) выконвае рызыкоўнае заданне партызанскага камандавання і гіне як адданы патрыёт, дзейсны змагар за вызваленне радзімы.

Творы І. Шамякіна прасякнуты публіцыстычнай накіраванасцю думкі, высокім грамадзянскім пафасам, страснасцю, вызначаюцца займальнасцю сюжэта, кампазіцыйнай стройнасцю, актуальнасцю тэматыкі. Пісьменнік часта звяртаецца да надзённых праблем сучаснасці. У рамане “Атланты і карыятыды” аўтар даследуе праблемы жыцця сучаснага горада. Галоўны архітэктар горада Максім Карнач — мастак, эстэт, неардынарны, мэтанакіраваны, адказны і сумленны чалавек — выступае супраць будаўніцтва на тэрыторыі горада хімічнага камбіната. У вобразах Карнача і яго ярых апанентаў Макаеда і Ігнатовіча паказваецца барацьба, супрацьстаянне архітэктурна-гарманічнага (комплекснага) і кансерватыўна-практычнага (абыякавага) поглядаў на забудову сучаснага горада.

Раман “Злая зорка” — першы празаічны твор пра чарнобыльскую бяду ў беларускай літаратуры. Напісаны з сацыяльна-публіцыстычным і гуманістычным пафасам, ён раскрывае адну з драматычных старонак у жыцці нашага народа. Дзеянне ў рамане адбываецца ў адным з раёнаў Гомельскай вобласці. Пачынаецца твор са сцэны вяселля Глеба Пустахода і Ірыны Пыльчанка, якое, на жаль, прынесла не радасць, а бяду. Аўтар паказвае трагічны лёс людзей, якія, пражыўшы ўсё жыццё на гэтай зямлі, вымушаны ехаць на чужыну. Ахвярамі Чарнобыля становяцца Ліза Пустаход і Глеб Пыльчанка. Трагічнае гучанне ў рамане набываюць прыродаапісанні і пейзажныя вобразы. Туман, напрыклад, становіцца ўвасабленнем сілы зла. Сонца перастала

несці людзям святло і жыццё, яно нібы адарвалася ад неба, спыніла свой ход і павісла: “І гэтак будзе вісець. І не здолее ўзысці, страціўшы сілу”. Прырода як бы спыніла сваё развіццё, пратэстуючы супраць безгаспадарлівых адносін да ўсяго навакольнага, нядбайнасці і бяздушнасці. Аўтар крытычна паказвае кіруючую, командна-бюракратычную сістэму рэспублікі, на сумленні работнікаў якой перакрэсленыя чалавечыя жыцці, пакалечаныя лёсы, страчаныя надзеі (вобразы першага сакратара раённага камітэта партыі Сінякова і яго стрыечнага брата Лявонція Мікалаевіча). Увесь жа цяжар чарнобыльскай аварыі абрушваецца на плечы старшыні райвыканкама Уладзіміра Паўлавіча Пыльчанкі, які ў крытычных абставінах адчувае адказнасць за людзей, востра перажывае бяду роднай зямлі, кіруе высяленнем з атручанай зоны.

Складаныя і супярэчлівыя змены ў грамадскім жыцці 80 — 90-х гг. аказалі значны ўплыў на творчасць многіх пісьменнікаў, у тым ліку і І. Шамякіна. Маэстра слова, застаючыся прыхільнікам “сацыяльна-справядлівага” сацыялізму, не ўсё прымае ў сённяшняй рэчаіснасці. У аповесцях “Сатанінскі тур”, “Падзенне”, “Без пакаяння”, “Выкармак” ён выступае супраць ўсталявання ўлады долара і воўчых адносін паміж людзьмі, выкрывае новаспечаных “прадпрымальнікаў” і “дзелавых” людзей, якія спрабуць стаць гаспадарамі жыцця, змагаецца з жорсткасцю, насіллем, бязладдзем, якія запанавалі ў грамадстве, нясе чытачам праўду пра трагізм сённяшняга жыцця, дзе на вачах пачынаюць абясцэньвацца самыя высокія маральныя і агульначалавечыя каштоўнасці.

**92**

## АПОВЕСЦЬ ІВАНА ШАМЯКІНА “АХВЯРЫ”

Аповесць І. Шамякіна “Ахвяры”, як і многія творы пісьменніка, прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны.У ёй аўтар уздымае новую для беларускай літаратуры праблему, якая доўгі час змоўчвалася ці няправільна ацэньвалася. У цэнтры ўвагі пісьменніка — дзейнасць Мінскага падпольнага і партызанскага руху, а таксам складаныя ўмовы ўзаемадзеяння падпольнага кіраўніцтва з прадстаўнікамі НКУС, засланымі быццам бы для карэкціроўкі сумесных дзеянняў арганізацый.

Падзеі адбываюцца ў адным з партызанскіх атрадаў, які ўзначальвае Аляксей Іванавіч Ман. Паміж камандзірам атрада, начальнікам штаба Навумам Брагінскім і камісарам Ігарам Кіпенем складваюцца адносіны ўзаемаразумення, узаемавыручкі, што, безумоўна, дапамагала ў агульнай барацьбе з акупантамі. Няма ніякага недаверу і недагаворвання паміж героямі твора, хаця Брагінскі — былы капітан-акружэнец, а Ман — былы “вораг” народа, які зведаў на сабе ўсе жахі допытаў у засценках НКУС.

У жыццё партызанскага атрада ўмешваецца прадстаўнік спецгрупы НКУС Золатаў Якаў Міхайлавіч, закінуты ў тыл ворага для кантролю над дзейнасцю партызанаў і падпольшчыкаў. Усю сваю кіпучую дзейнасць ён будуе на недаверы, падазронасці, збіранні кампраматаў, падаўленні волі чалавека, на шантажах, правакацыях, грубай фізічнай сіле. Прымітыўна разумеючы задачы барацьбы з ворагам, Золатаў спрабуе ўзяць у свае рукі кіраўніцтва атрадам. На шчасце, гэтага не атрымалася, бо людзі больш давяраюць Ману. Прыслужнік  сталінскай машыны, Золатаў любой цаной хоча выслужыцца перад кіраўніцтвам. І таму ён лёгка прыняў за праўду

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

варожыя выдумкі аб тым, што падполле арганізавалі самі немцы ў правакацыйных мэтах, і паслаў у Маскву радыёграму. Шкода, якую нарабілі гэтыя дзеянні, сёння агульнавядомая. Па загадзе П. К. Панамарэнкі ўсім аб’яднанням і групам было забаронена ўступаць у якія-небудзь сувязі з мінскімі арганізацыямі, што, па сутнасці, паралізавала іх дзейнасць, прымусіла змагацца без скаардынаванасці, паасобку. У такіх умовах Золатаў стаў асабліва “пільным”. Ён з’яўляецца віноўнікам гібелі смелага і адважнага юнака, кіраўніка падпольнай групы Стася Шабовіча, многіх няшчасцяў у атрадзе. У канцы твора І. Шамякін паказвае маральны крах Золатава. Скінуты з саней Манам, ён трапляе ў рукі фашыстаў, дзе стаў спраўна служыць ім. Для такіх людзей усё роўна, каму і як прыслужваць, бо для ўласнага выжывання і дабрабыту яны гатовы ахвяраваць усім святым у жыцці.

93

**ВОБРАЗЫ ПЕТРАКА І СЦЕПАНІДЫ (АПОВЕСЦЬ В. БЫКАВА “ЗНАК БЯДЫ”)**

Вайна наклала глыбокі адбітак на творчасць Васіля Быкава, які прыйшоў у літаратуру з палымяным жаданнем расказаць пра жахі яе ад імя цэлага пакалення, ад імя тых дзевяноста сямі працэнтаў сваіх равеснікаў, якія загінулі, не вярнуліся з крывавых палеткаў вайны. Галоўнай тэмай твораў В. Быкава з’яўляецца франтавое жыццё, партызанская і падпольная барацьба беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў. Крыху ў іншым ракурсе раскрываецца тэма вайны ў аповесці “Знак бяды”, за якую аўтару ў 1986 г. была прысуджана Ленінская прэмія. Вайна ў аповесці паказана праз успрыняцце яе мірнымі жыхарамі. Героямі твора з’яўляюцца не

партызаны і падпольшчыкі, а звычайныя мірныя жыхары, для якіх уласны хутар становіцца месцам здзекаў і катаванняў, Галгофай.

Пачынаецца аповесць апісаннем спаленага хутара. І гэта не проста надуманае жаданне аўтара: лёс жыхароў хутара служыць своеасаблівым папярэджаннем для людзей, што бяда побач, што яна толькі прыхавалася, чакаючы свайго часу.

Дзеянне адбываецца ў першыя месяцы вайны, хаця нямала старонак аповесці прысвечана перадваеннаму жыццю. Праз успаміны галоўных герояў — Сцепаніды і Петрака Багацькаў — В. Быкаў паказвае перыяд масавай калектывізацыі на Лепельшчыне, складаны 1937 год. Сцепаніда (былая парабчанка ў пана Адольфа Яхімоўскага) заўсёды верыла ў справядлівасць і перамогу дабра, была перакананa, што на чужым няшчасці сваё шчасце не пабудуеш. Уражвае, напрыклад, той момант, калі Сцепаніда і Пятрок, атрымаўшы дзве дзесяціны зямлі з надзелаў пана Адольфа, правялі бяссонную ноч у трывогах, роздумах і сумненнях. Можа, лепш адмовіцца ад зямлі? А як жыць без яе? Калі ж браць, то як глядзець у вочы свайму быламу гаспадару?!.. У гэтых разважаннях мы бачым высакароднасць, прыгажосць, багацце душы герояў твора.

Чуйная да чужога гора, Сцепаніда сэрцам успрымала тую несправядлівасць, якая спадарожнічала калектывізацыі, не прымала гвалтоўнасці, здзеку і абразаў, якія чыніліся ў дачыненні да кулакоў. Таму рашуча выступіла супраць раскулачваннння сваіх аднавяскоўцаў, якіх і кулакамі назваць было цяжка. Бо ці ж кулак той, хто усё стварае сваім мазалём? Таму збірала яна подпісы ў абарону старшыні Лявона. Каб дапамагчы яго вызваленню з турмы, адправіла нават Петрака ў Мінск да Чарвякова. Аднак супрацьстаяць рэпрэсіўнай машыне было немагчыма: нават той жа Чарвякоў, як

відаць з падзеяў твора, быў толькі паслухмяным вінцікам гэтага бесчалавечнага механізма і сам стаў яго ахвярай.

Сцепаніда, якая і да вайны ўмела пастаяць за справядлівасць, не змагла змірыцца з новымі парадкамі, прынесенымі на нашу зямлю гітлераўцамі. Свядома канфліктуючы з няпрошанымі гасцямі, яна змагалася з імі магчымымі для старой жанчыны сродкамі: схавала газу, пазбавіўшы гэтым немцаў святла; прыхавала ў лесе парсючка, каб той не дастаўся ворагам; укінула ў глыбокі калодзеж вінтоўку... Пасля арышту Петрака Сцепаніда, застаўшыся на хутары адна, вырашае змагацца з ворагам больш дзейсна: купіць у Карнілы за апошняга парсючка бомбу і знішчыць узноўлены мост. Здаецца, задуманае ёю вось-вось здзейсніцца. Але фашысцкія паслугачы арыштавалі Карнілу і выйшлі на след Сцепаніды. Апошняе, што яна паспявае зрабіць, — гэта перахаваць бомбу ў іншае месца. А калі вечарам паліцаі пачалі ламацца ў хату, Сцепаніда, выразна ўсведамляючы свой лёс, аблівае сябе газай і падпальвае. Задыхаючыся ў дыме і полымі, ад якога ўжо смылелі валасы на галаве, гарэлі рукавы ватоўкі, Сцепаніда падумала, як бы апраўдваючы свой учынак з бомбай: "Можа, й добра, што з бомбай яе ніхто не бачыў. Добрым людзям і не трэба, а гэтыя хай шалеюць. Хай думаюць — дзе? І не спяць ні ўдзень, ні ўначы — баяцца да скону". Трагічная смерць Сцепаніды ўспрымаецца як знак непераможнасці народа, нязломнасці яго духу.

Адна з галоўных думак, якую спрабуе давесці да чытача аўтар твора, заключаецца ў рытарычным пытанні: што лепш: памерці без супраціўлення, пасіўна ўспрымаючы гвалт, які чыніць вораг на роднай зямлі, ці змагацца з гэтым гвалтам актыўнымі дзеяннямі, ад якіх вораг не будзе мець спакою ні ўдзень, ні ўночы. Зыходзячы з

гэтага, Петрака можна ў нейкай ступені разглядаць як супрацьлеглы Сцепанідзе вобраз.

Пятрок, па натуры ціхі, памяркоўны, крыху палахлівы , спрабуе прыстасавацца да абставін, перачакаць навалу. Ён улагоджвае паліцэйскіх самагонкай, паслухмянасцю дагаджае фашыстам. У гэтым выяўляецца адна з рыс сялянскай псіхалогіі: абы было ціха. Аднак поўнасцю прыстасавацца да жудасных умоў фашысцкай акупацыі немагчыма. Паступова ў душы нясмелага, далікатнага чалавека выспявае гнеўны пратэст. Пятрок пераасільвае сваю слабасць, знаходзіць у сабе незвычайныя сілы і выказвае паліцаям усю сваю нянавісць і пагарду. Гэты ўчынак заканчваецца арыштам, турмой і, урэшце, смерцю. Вобразам Петрака В. Быкаў сцвярджаў, што ў часы цяжкіх выпрабаванняў лавіраванне паміж сваімі і чужымі, хаванне за спіны іншых заканчваюцца трагічна. Чалавек павінен з першай хвіліны акупацыі заняць цвёрдую, непрымірымую пазіцыю ў дачыненні да ворагаў.

Аповесць “Знак бяды” — твор, па сведчанні П. Дзюбайлы, “аб нечалавечых пакутах і аб сапраўднай чалавечнасці, аб сіле і нязломнасці чалавечага духу, сапраўды народнага характару”. Назва твора набывае сімвалічнае значэнне. Знак бяды — гэта мяжа, на якой чалавек павінен даць адказ свайму сумленню: ці здатны ён да абароны сваёй годнасці і гонару роднай зямлі. У вобразе Сцепаніды В. Быкаў увасобіў лепшыя рысы беларускай жанчыны: працавітасць, сумленнасць, душэўнасць, сілу і нязломнасць чалавечага духу, высокую чалавечую годнасць. А яшчэ — гатоўнасць да самаахвяравання. Была ж у гераіні магчымасць жыць, перачакаць вайну. Але не было магчымасці выжыць, застацца чалавекам са

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сваімі прынцыпамі. І менавіта гэтыя прынцыпы знайшлі сваё выяўленне ў апошнім учынку Сцепаніды.

## 94

## “СВАЕ” І ЧУЖЫЯ Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “ЗНАК БЯДЫ”

Аповесць В. Быкава “Знак бяды” адметная. Вайна ў ёй разглядаецца праз успрыняцце яе мірнымі жыхарамі, для якіх уласны хутар становіцца месцам здзекаў і гвалту, своеасаблівай Галгофай. Мінулая вайна, на думку В. Быкава, паказала, “якім высокім і якім нізкім можа быць чалавек, да якой велічы могуць узняцца адны і да якой нізасці апусціцца другія”. Таму ў творы пісьменнік (выдатны псіхолаг) імкнецца выявіць прычыны здрадніцтва, прыстасавальніцтва, маральнага падзення адных і духоўнай велічы, высакароднасці, нязломнасці духу другіх. Зразумела, што здрадніцтва не можа нарадзіцца далёка ад нас, саміх сябе. Яно найбольш праяўляецца ў часы цяжкіх выпрабаванняў, калі чалавек стаіць на мяжы выбару паміж жыццём і смерцю. Адны выбіраюць жыццё і тым самым здраджваюць сабе, радзіме, народу, пачынаюць прыслужваць іншаму рэжыму, прыстасоўваюцца да выгаднай для сябе сітуацыі. Другія (напрыклад, Сцепаніда) з першыў дзён не мірацца з новымі парадкамі, свядома канфліктуюць з няпрошанымі гасцямі, змагаюцца з ворагам да апошняга ўздыху.

“Сваімі” і адначасова чужымі ў аповесці паказаны Гуж, Каландзёнак і Недасека.

Сярод усіх паліцаяў сваёй жорсткасцю, бесчалавечнасцю вылучаўся Гуж, які яшчэ да вайны, пасля раскулачвання бацькі, з абрэзам паляваў на людзей. У перыяд акупацыі ён зноў адчуў сваю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сілу. Упіваючыся неабмежаванай уладай, Гуж здзекваўся з людзей не толькі па загадзе немцаў, але і дзеля свайго задавальнення. З лютай нянавісцю спрабаваў ён адпомсціць за даўнюю крыўду. Яшчэ больш небяспечным (з-за сваёй затоенасці, непрадказальнасці ўчынкаў) з'яўляецца Каландзёнак — "няўклюда лягчоная, ні хлопец, ні дзеўка — паскуда адна". У гады калектывізацыі ён прыкідваўся прыхільнікам новых змен, дапамагаў адшукваць "ворагаў" народа і за паклёпніцкі данос нават быў узнагароджаны рэквізаванымі ботамі. З прыходам фашыстаў ён з лёгкасцю і спраўна стаў служыць фашысцкай сістэме так жа, як калісьці служыў савецкай уладзе. В. Быкаў, удзяляючы ў аповесці значнае месца паліцаям, бачыў у іх затоенасці, скрытнасці, прыстасавальніцтве не меншую небяспечнасць, чым у заведама адкрытай чалавеказабойчай палітыцы ворагаў-чужынцаў.

Немцам-захопнікам В. Быкаў у аповесці адводзіць не так многа ўвагі. З імі мы сустракаемся толькі тады, калі яны некалькі дзён жылі ў хаце Сцепаніды і Петрака. Але і гэтага дастаткова, каб упэўніцца ў тым, што перад намі заваёўнікі, якія ўсімі магчымымі сродкамі будуць імкнуцца да панавання і знішчэння існуючага ладу.

Фашысты з'яўляюцца адкрытымі ворагамі, і ад іх нельга чакаць асаблівай павагі, міласэрнасці. Горшыя за іх з-за сваёй затоенасці, скрытнасці, непрадказальнасці дзеянняў паліцаі, якія не часова, а ўжо назаўсёды сталі чужымі для аднавяскоўцаў і якім ніколі не давяралі ворагі.

Такім чынам, чужых у аповесці "Знак бяды" можна ўмоўна падзяліць на дзве катэгорыі: чужыя, якія адначасова з'яўляюцца ворагамі-захопнікамі, і былыя свае людзі, якія з-за здрады і прадажнасці сталі чужымі для свайго народа. Аўтар сцвярджае, што

свае ”чужыя” больш страшныя за адкрытага ворага, яны здольны служыць любому злу, якое знаходзіцца пры ўладзе. Вайна — тая крытычная сітуацыя ў жыцці герояў твора, калі выяўляецца іх сапраўдная сутнасць: сутнасць чалавечая або звярыная, дзікунская. На жаль, праблема сваіх-”чужых” застаецца актуальнай і для нашага часу.

**95**

**ВЫЯЎЛЕННЕ САПРАЎДНАЙ СУТНАСЦІ ЧАЛАВЕКА Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “АБЕЛІСК”**

Адным з самых запамінальных твораў В. Быкава з’яўляецца аповесць “Абеліск”. Галоўны герой — вясковы настаўнік Алесь Іванавіч Мароз. Ад дзейнасці настаўніка, вядома, залежыць маральнае здароўе нацыі, яе будучыня. У Мароза была ўнутраная патрэба рабіць людзям дабро. Нікому ні ў чым не адмаўляючы, ён быў не толькі настаўнікам, але і дарадчыкам, доктарам, ветэрынарам. Са сваімі вучнямі ён паводзіў як роўны з роўнымі, імкнуўся далучыць іх да вяршыняў агуначалавечай і нацыянальнай культуры.

У часы  фашысцкай акупацыі Мароз з-за калецтва не змог ваяваць на фронце ці ў партызанскім атрадзе. Ён уступіў у няроўнае змаганне (магчымымі сродкамі) за душы моладзі. І, калі яго выхаванцы былі арыштаваны, ён кінуўся ў партызанскі атрад, каб знайсці выратаванне вучням. Фашысты ж паставілі  страшную ўмову: калі настаўнік з’явіцца ў паліцыю, хлопцаў адпусцяць. Нягледзячы на забарону партызанскага кіраўніцтва, Мароз добраахвотна здаўся фашыстам. Ён хацеў у апошні міг жыцця быць

побач са сваімі выхаванцамі, духоўна падтрымаць іх перад пакараннем. Цудам застаўся жыць толькі адзін вучань — Павел Міклашэвіч. Як прадаўжальнік справы свайго настаўніка, ён дабіваецца справядлівай ацэнкі ўчынку Мароза. Яго клопатамі ў вёсцы Сяльцо быў збудаваны абеліск, дзе побач з пяццю юнацкімі імёнамі было выведзена і імя Мароза.

Пра герояў твора і акалічнасці тых падзей мы даведваемся з успамінаў былога камандзіра партызанскага атрада Ткачука і чыноўніка-дагмата Ксяндзова. Яны па-рознаму (нават дыяметральна супрацьлегла) ацэньваюць учынак настаўніка. Не асабліва мэтазгодным, бессэнсоўным лічыць яго Ксяндзоў, які з-за сваёй абмежаванасці не ўяўляе сапраўднай ролі настаўніка ў грамадстве і не разумее таго, што выхоўваць можна і ўласным прыкладам. Для Ткачука Мароз — герой, барацьбіт, увасабленне духоўнай велічы чалавека, які ўласнай смерцю прадэманстраваў непарыўнасць слоў і спраў настаўніка, вернасць высокаму настаўніцкаму прызванню. Спрэчка, якая вядзецца ў аповесці, прымушае задумацца над сэнсам гераізму, подзвігу і самаахвярнасці, дапамагае адшукаць маральныя вытокі геранічных учынкаў, мнагастайнасць іх праяўлення не толькі ў ваенныя гады, але і ў мірны час. На кантрасце, сутыкненні розных думак і поглядаў дасягаецца вастрыня і палемічнасць у вырашэнні складанага пытання пра абавязак кожнага чалавека перад грамадствам, сваім сумленнем, пытання даволі актуальнага і для нашых сучаснікаў.

**96**

**ДУХОЎНЫ ВЫБАР ГЕРОЯЎ У АПОВЕСЦІ ВАСІЛЯ БЫКАВА “СОТНІКАЎ”**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У аповесці “Сотнікаў”, як і ў большасці твораў В. Быкава, узнімаецца праблема асабістай адказнасці чалавека за лёс іншых людзей, высвятляюцца прычыны маральнага падзенння, здрадніцтва адных і духоўнай велічы, высакароднасці другіх. Аўтар даследуе пытанне, на што здольны чалавек ва ўмовах, “калі магчымасці абараніць жыццё вычарпаны ім да канца і прадухіліць смерць немагчыма”.

Цэнтральнымі героямі аповесці з’яўляюцца партызаны Сотнікаў і Рыбак. У барацьбе з ворагам яны не навічкі. Сын героя грамадзянскай вайны, камандзір батарэі Сотнікаў ваяваў на фронце, трапіў у палон, цудам вырваўся з яго і прадоўжыў барацьбу ў партызанскім атрадзе. За плячыма старшыны стралковай роты Рыбака франтавыя баі, акружэнне, удзел у партызанскім руху. Лёс асабліва зблізіў герояў твора пры выкананні задання па здабычы для партызан харчоў. Ідучы на выкананне задання, яны па-рознаму рэагуюць на будучую небяспеку, і здаецца, што дужы, энергічны і кемлівы Рыбак больш здольны на подзвіг, чым фізічна слабы і хворы Сотнікаў. Але калі Рыбак, які ўсё жыццё “ўхітраўся знайсці які-небудзь выхад”, унутрана гатоў да здрады, то Сотнікаў да апошняга ўздыху застаецца верным абавязку чалавека і грамадзяніна.

Героям твора не ўдалося выканаць апошняе партызанскае даручэнне: яны трапілі пад абстрэл паліцаяў і, хаваючыся ад іх на гарышчы ў хаце Дзёмчыхі, былі ўзяты ў палон. Перад смяротэльнай пагрозай Сотнікаў і Рыбак паводзяць сябе адпаведна сваім характарам і ідэйным перакананням. Сотнікаў з гонарам праходзіць праз цяжкія выпрабаванні і ў самай бесчалавечнай сітуацыі застаецца чалавекам, адданым Радзіме, верным сваім высакародным ідэалам. Ён, безумоўна, жадаў бы загінуць у баі і амаль “ужо

зайздросціў тысячам тых шчасліўцаў, што знайшлі свой канец на шматлікіх палях баёў”. Але гэта стала немагчымым. І таму ў ноч перад пакараннем Сотнікаў думае не пра сябе, а кіруецца высокімі маральнымі прынцыпамі, думае пра тое, як выратаваць Дзёмчыху і старасту Пётру. Запатрабаваўшы следчага, ён заявіў: “Я — партызан, астатнія тут ні пры чым”. На жаль, гэта прызнанне не падзейнічала на катаў: раніцай з пяці падрыхтаваных для павешання петляў засталася свабоднай толькі адна, прызначаная для Рыбака.

Паводзіны Рыбака ў крытычнай для яго жыцця сітуацыі іншыя. Не будучы нягоднікам, перакананым здраднікам і ворагам, ён любымі магчымымі сродкамі (нават смерцю таварыша) хоча захаваць жыццё. Рыбаку здаецца, што, застаўшыся жывым, ён зможа ашукаць ворагаў, уцячы да партызанаў і прадоўжыць там далейшую барацьбу з акупантамі. Аднак сітуацыя, у якой апынуўся герой твора, вымушае яго крок за крокам дагаджаць і уступаць каварнаму і бязлітаснаму ворагу, хітраваць і выкручвацца перад ім, думаць толькі аб сабе, ігнараваць інтарэсы іншых і, нарэшце, скаціцца ў духоўную бездань. Зразумеўшы жахлівасць свайго здрадніцкага становішча, Рыбак спрабуе павесіцца (у прыбіральні), але гэтаму перашкодзілі абставіны. І тады герой твора спрабуе апраўдаць свае дзеянні, вінаваціць за гэта не столькі сябе, колькі жорсткія ваенныя ўмовы, ненавісны вайсковы лёс і нават Сотнікава, хвароба і раненне якога нібыта паслужылі асноўнай прычынай іх палону.

Аповесць “Сотнікаў” вызначаецца глыбокім філасофскім роздумам аб жыцці і смерці, аб чалавечым абавязку і гуманізме, якія несумяшчальныя з любымі праявамі эгаізму. Паглыблены псіхалагічны аналіз кожнага дзеяння і руху герояў, кожнай іх думкі і слова — адна з вызначальных рыс твора. Вялікая духоўная моц

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сотнікава заключаецца ў тым, што ён, пастаўлены перад выбарам жыцця і смерці, здолеў прыняць смерць і тым самым паказаў веліч чалавечага духу, нязломнасць характару, непахісную веру ў будучыню людзей.

**97**

ВОБРАЗ ЯГОРА АЗЕВІЧА (АПОВЕСЦЬ ВАСІЛЯ БЫКАВА “СЦЮЖА”)

Аповесць Васіля Быкава “Сцюжа” пра калектывізацыю і пачатак Вялікай Айчыннай вайны. У цэнтры твора — вясковы хлопец, сын простых радавых сялян Ягор Азевіч. Ён трапляе ў раённы цэнтр, дзе становіцца камсамольскім і партыйным работнікам. Удзельнічаючы ў будаўніцтве “лепшага, заможнага калгаснага жыцця”, Азевіч становіцца прыслужнікам антычалавечай сістэмы, выканаўцам любога яе загаду. Ён піша данос на свайго непасрэднага начальніка Зарубу, у час збожжанарыхтовак разбівае сялянскія жорны сваіх аднавяскоўцаў (у тым ліку і бацькоўскія) і прымушае іх падпісацца на пазыку.

У першыя дні вайны Ягор спрабуе вырвацца з акупіраванай тэрыторыі да сваіх, каб “да скону біцца за савецкую ўладу”. Блукаючы па знаёмых мясцінах, хаваючыся ад фашыстаў і сваіх землякоў, Азевіч захварэў і ў забыцці, непрытомнасці трызніў, гаварыў сам з сабою, спрабаваў апраўдаць свае дзеянні і ўчынкі: “Чужая воля правіла свой д’ябальскі баль на людскіх касцях, і што на тым балі залежала асабіста ад Ягора Азевіча? Дужа мала, калі не сказаць нічога. Ён жыў па чужым сумленні, па чужых звычаях, чужых законах. Жыццё і людзі распараджаліся ім, як хацелі. І як было ў такіх умовах зрабіць што інакш? Або зусім не зрабіць нічога? Як бы яму тое ўдалося, ён не разумеў і цяпер. Яго б за некалькі дзён

сцерлі на парахню. Таму круціўся як мог, пакутаваў і саромеўся. Толькі каму была справа да яго пачуццяў, калі ад яго патрабаваліся вынікі”. Герой аповесці пачынае адчуваць сваю віну за бальшавіцкія злачынствы , сваю адказнасць за без віны загубленых людзей, аб чым яскрава сведчыць яго страшны сон: “Кроў лілася з кветніка, цурчала з голых абрываў на тым беразе, крывавыя ручаі сцякалі ў дно і нікуды болей не цяклі, кроў сабралася там у глыбокую сажалку. І тады ён убачыў, што і ягоныя рукі ў крыві...” Адкупіцца ж за здзейсненае немагчыма.

Перад намі трагічны лёс, ахвяра таго складанага часу. І ў злую завею і сцюжу Азевіч пакінуў сваё апошняе прыстанішча. “З наганам  напагатове ён памалу патупаў да ўзлесся, штораз азіраючыся. Ззаду за ім, не падбягаючы блізка, то бег, то прыпыняўся Ваўкалака. Чагосьці чакаў ад чалавека...” Магчыма, пярэварацень страшыў Азевіча за крыўду, якую прынёс ён іншым людзям, за жыццё не па чалавечых законах. А можа, Ваўкалака хацеў напіцца яго крыві, пазбавіцца закляцця і стаць урэшце чалавекам? Несумненна толькі адно: не можа спадарожнік Ваўкалака прадвяшчаць нешта добрае. Прынамсі, канчатковы адказ пра лёс Азевіча можна знайсці ў асобным выданні аповесці, якое выйшла ў 1993 г. Там у якасці своеасаблівага эпіграфа прыводзіцца фрагмент надпісу з прыдарожнага абеліска, які сведчыць, што сярод пахаваных партызан знайшоў свой апошні рытулак і Ягор Азевіч.

**98**

**НОВЫЯ ТВОРЫ ВАСІЛЯ БЫКАВА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Васіль Быкаў — агульнапрызнаны майстар такога жанру празаічнай творчасці, як аповесць. Апошнім творам у гэтым накірунку з'явілася аповесць "Пакахай мяне, салдацік". Яна вылучаецца тым, што , у адрозненне ад ранейшых твораў, у ёй В. Быкаў надае значную ўвагу вобразу жанчыны.

Дзеянне ў аповесці "Пакахай мяне, салдацік" адбываецца ў апошнія дні Вялікай Айчыннай вайны ў ваколіцах невялічкага аўстрыйскага гарадка. Галоўны герой — камандзір узвода лейтэнант Змітрок Барэйка, ад імя якога вядзецца апавяданне. Сустрэўшыся з малодзенькай зямлячкай Франяй, лейтэнант закахаўся ў яе. Аднак шчырае і чыстае пачуццё Змітрака трагічна абарвалася з-за забойства Франі, разам з якой загінулі яе нямоглыя гаспадары — прафесар біялогіі Шарф і яго жонка фрау Сабіна. Змітрок праклінае забойцаў: "Хто б яны ні былі — нашыя ці немцы! Бальшавікі ці фашысты!" Прасочваючы лёс Змітрака і Франі, аўтар выступае супраць неапраўданай помслівасці, жорсткасці і тых ахвяр, не выкліканых ваеннай неабходнасцю, гаворыць пра небяспеку і фашызму, і бальшавізму.

Нельга не адзначыць, што ў апошні час пісьменнік аддае перавагу апавяданню. І звязана гэта ў першую чаргу з імкненнем пісьменніка ў больш кароткай, у параўнанні з аповесцю, форме данесці да чытача сваю думку.

Тэме бальшавіцкага таталітарызму прысвечаны такія творы В. Быкава, як "На чорных лядах", "Перад канцом" і "Жоўты пясочак". У апавяданні "На Чорных лядах" аўтар звяртаецца да нядаўняй гісторыі — Слуцкага ўзброеннага паўстання 1920 г., накіраванага супраць бальшавісцкай акупацыі Беларусі. Восем чалавек, знясіленых, без ежы і патронаў, адважваюцца на самагубства: яны капаюць сабе агульную магілу і па чарзе кладуцца ў яе. Гэтыя людзі, якія хацелі дабра сабе і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

свайму народу, свядома ідуць на смерць не з-за нейкага фанатызму, а кіруюцца гуманістычным меркаваннем: не “пацягнуць на пакуты іншых, тых, дзеля каго, па сутнасці, распачалі” паўстанне. З васьмі чалавек застаўся жыць толькі пятнаццацігадовы  Валодзька Сулашчык, якому камандзір даручыў закапаць і зруйнаваць з зямлёй магілу паўстанцаў. Выратаванне Валодзькі — надзея на тое, што трагічная самаахвярнасць паўстанцаў не згіне бясследна ў гісторыі, не забудзецца нашчадкамі. Праз трагедыю герояў твора аўтар паказвае нацыянальную трагедыю, выкрывае зло, што прынёс  беларускаму народу бальшавізм.

Падзеі ў апавяданні “Перад канцом” адбываюцца “ ў хуткім часе пасля кастрычніцкага перавароту ў Расіі. Цэнтральны персанаж твора — былы падпаручнік царскай арміі, які па недарэчнасці трапляе ў засценкі ЧК: пры вобыску на вакзале чэкісты знаходзяць ў ягоным рэчывым меху пісталет. Апынуўшыся ў няволі, падпаручнік не губляе надзеі на лепшае. Таму ён адразу згаджаецца на прапанову аднаго з сукамернікаў напасці на варту і паспрабаваць уцячы на волю. Астатнія, паколькі іх не кармілі некалькі дзён, вырашаюць, што яны ўжо асуджаныя, і таму таксама падтрымліваюць прапанову. Аднак, калі вартавы прынёс , як свінням, вядро кашы, усе, за выключэннем падпаручніка, адмаўляюцца ад ранейшай задумы. Аўтар паказвае, да чаго можа давесці людзей таталітарная ўлада: яны гатовы за вядро кашы адмовіцца ад свабоды, ад апошняга шанцу застацца людзьмі.

Тэме палітычных рэпрэсій 20-30-ых гадоў прысвечана апавяданне “Жоўты пясочак”. У ім В. Быкаў па-мастацку дакладна і псіхалагічна выверана перадае атмасферу тых жахлівых часоў. Ён паказвае, як машына рэпрэсій раскручвае свае шалёныя абароты, патрабуючы ўсё новых і новых ахвяр. Адзін з цэнтральных эпізодаў твора звязаны з лёсам былога супрацоўніка НКУС. На яго сумленні не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адно загубленае жыццё — ён верна служыў сістэме. Але надышоў час, калі сістэма адвергла яго і ператварыла ў такую ж ахвяру, як і тыя, каго ён з асалодай забіваў з пісталета ў патыліцу. Былы кат да самага канца не верыць у блізкасць сваёй смерці, а зразумеўшы яе непазбежнасць, патрабуе для сябе асобнай магілы, каб не ляжаць у зямлі побач з розным "быдлам". Такім чынам, персанаж паўстае перад намі не столькі ахвярай рэжыму, колькі ахвярай уласнай абмежаванасці і непрадбачлівасці.

Аб глыбіні маральнага падзення чалавека ва ўмовах рэжыму татальнага кантролю ўсіх сфер жыцця гаворыць В. Быкаў у апавяданні "Бедныя людзі". Два героі твора — прафесар і аспірант — пасля доўгіх сумненняў у шчырасці сваіх дзелавых адносін (кожны паасобку) пішуць даносы адзін на аднаго ў "органы". Аўтар паказвае, на якой псіхалагічнай аснове будуе сваю дзейнасць таталітарная ўлада: на страху, недаверы, падступстве і псіхалагічным ціску на кожнага нязгоднага члена грамадства. З гэтым апавяданнем тэматычна звязана і наступнае — "Сцяна". Зрэшты, яно па сіле свайго абагульнення нагадвае хутчэй прытчу. Безыменны герой твора жыве ў безыменнай краіне, у якой правіць баль жорсткая дыктатура. Знаходзячыся ў турме, ён спрабуе знайсці слабое месца ў каменным муры сваёй цямніцы. Калі ж ён зрабіў у сцяне адтуліну і змог вылезці на вуліцу, яго чакала горкае расчараванне: з адной камеры ён трапляе ў другую — з шыбеніцай. Нягледзячы на песімістычны фінал, прытчавы характар твора дапускае шматзначнасць яго тлумачэння.

Такім чынам, В. Быкаў у апошнія гады пашырае тэматыку сваёй творчасці, звяртаецца да новых, забароненых раней тэматычных пластоў. Але не пакідае пісьменнік і сваёй любімай тэмы — вайны і лёсу чалавека на ваёне. Аб гэтым сведчаць яго новыя творы дадзенай тэматыкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(“Зенітчыца”, “Палкаводзец”, “Пагорак”, “Палітрук Каламіец”, “Падоранае жыццё” і “Кацюша”).

**99**

## “ЛЮБЛЮ ЎСЕ КОЛЕРЫ ЖЫЦЦЯ” (ТВОРЧАСЦЬ СЯРГЕЯ ГРАХОЎСКАГА)

Шукаць, знаходзіць, быць няспынным,
Не проста існаваць, а жыць.
*С. Грахоўскі*

Творчую біяграфію С. Грахоўскага можна назваць драматычнай. Першы яго верш быў надрукаваны ў часопісе “Беларусі піянер” (1926), калі аўтару споўнілася 13 год. Першы ж вершаваны зборнік “Дзень нараджэння” (1958) пабачыў свет толькі праз 32 гады. А паміж гэтымі датамі — страчаная маладосць, абарваныя юнацкія мары і надзеі, пакутніцкі шлях, раздзелены з мільёнамі нявольнікаў, “заплямленых страшэнным таўром 58-й пробы”. І таму многія вершы першага зборніка пазначаны пякучым болем душы, нагадваюць пра жыццёвыя страты, з’яўляюцца ўспамінамі пра маладосць, маці, каханую (“Белыя ліпы”, “Я цябе прыгадаў”, “Ноч над Мінскам”, “Мама”, “Ты помніш чэрвеньскія ночы”).

Сярод твораў С. Грахоўскага нямала пейзажных замалёвак, якія яскрава перадаюць шматгалосы птушыны звон, стракатыя адценні фарбаў восені, снежную белізну зімовых дзён, веснавое абуджэнне зямлі (вершы ”Колеры”, “Вяной”, “Прадвесне”, “Подых лета”, “Асенні дзень”, “Снежань”, “Завіруха”). Паэт, захапляючыся навакольнай прыгажосцю, перадае бясконцы рух і зменлівасць у прыродзе, ад якіх самому хочацца шукаць, гарэць, тварыць:

Я не стаю на раздарожжы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мне пэўны шлях даўно відзён:
Усё жыццё ў падарожжы —
Ад першых да апошніх дзён.

Сплавам лірычнага і драматычнага напружання характарызуюцца паэмы С. Грахоўскага “Спаленыя масты” і “Ростань на світанні”, прысвечаныя гістарычным асобам — Аляксандры Мураўёвай і Лесі Украінцы.

Многія творы С. Грахоўскага маюць гуманістычную скіраванасць, прапаведуюць дабро, справядлівасць, услаўляюць любоў, каханне, шчасце і, па вызначэнні А. Лойкі, спрыяюць “выхаванню пачуццяў добрых і прыгожых” (вершы “Патрэбен чалавеку чалавек”, “Давер”, “Любоў”, “Як я жыў без цябе?”). У аповесці “А маці не спіць” уздымаецца праблема адказнасці дзяцей перад сваімі бацькамі, неўладкаванай адзінокай старасці пры жывых дзецях. Галоўны герой — Павел Кастрыцкі — адмовіўся ад маці, пакінуўшы яе без кута і грошай. Аглядаючыся на пражытыя гады, маці ўспамінае дні калектывізацыі і раскулачвання, высылку ў Сібір бацькоў, адвечных працаўнікоў, вайну, партызанства, гібель мужа. Гераіня шукае сваю віну ў тым, што сын стаў эгаістам, пачаў цурацца ўсяго роднага, сваёй вёскі, мовы і ўрэшце старой маці. Не змаглі, значыць, бацькі прылучыць уласных дзяцей да роднай зямелькі, навучыць іх любіць яе так, як любілі самі. У творы асуджаецца жорсткасць і бесчалавечнасць у адносінах да старэйшых, бездапаможных людзей, якія ў ганебных і подлых учынках родных дзяцей спрабуюць адшукаць і сваю віну.

Асобнае месца ў творчасці С. Грахоўскага займаюць дакументальна-мемуарныя творы, прысвечаныя асэнсаванню трагічнага мінулага. Гэта аповесці “Зона маўчання”, “З воўчым білетам”, “Такія сінія снягі”, паэма “Балючая памяць”, кніга паэзіі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Споведзь”. У іх узнаўляюцца карціны, эпізоды, дэталі нечалавечага лагернага жыцця, якое растаптала маладосць і сілы, але не змагло вынішчыць памяць, веру, надзею. Пісьменнік у падрабязнасцях апісвае ўмовы лагернага быту і непасільнай рабскай працы, жыццё ў ачапленні лагерных дратоў, аўчарак і вартавых,  атмасферу чалавечых адносін. Ён расказвае пра трагічны лёс без віны вінаватых “ворагаў народа” Сяргея Дарожнага, Уладзіміра Мяжэвіча, Юрыя Такарчука, Васіля Шашалевіча, Ізота Цымбалюка, Іосіфа Коўтуна і іншых людзей, якія ўзняліся над суцэльным страхам і подласцю, не заплямілі свайго сумлення. Разам з тым пісьменнік, як сведка тых падзей,  даносіць праўду і пра тых, хто зрабіўся ўдзельнікам крывавых злачынстваў (следчых, суддзяў, канвойных, розных бюракратаў і чыноўнікаў). Безумоўна, яны не могуць мець ні даравання, ні апраўдання. Але С. Грахоўскі ў гэтых творах не абмяжоўваецца толькі канстатацыяй фактаў. Ён уздымае пытанне безабароннасці чалавека перад дзяржаўным беззаконнем, спрабуе выкрыць яго прычыны, даследуе дыялектыку дабра і зла. Творы вызначаюцца не толькі болем ад незагоеных ран, але і чалавечым клопатам за родную зямлю, за лёс новых пакаленняў, за заўтрашні дзень.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 100

## “А ЧАСУ БОЛЬШ, ЧЫМ ВЕЧНАСЦЬ...” (ТВОРЧАСЦЬ МАСЕЯ СЯДНЁВА)

Я знаю — знойдуцца,
што абгавораць,
а можа й праклянуць,
ды ўсё дарма —
табе аднэй пажалюся я горам:
мне сумна, што ты ёсць,
смяртэльна — што няма.

*М. Сяднёў*

Творчасць Масея Сяднёва, самабытнага і таленавітага эміграцыйнага паэта, празаіка і перакладчыка, стала аб’ектам айчыннага літаратуразнаўства параўнальна нядаўна. Яго творы ў сваёй большасці выйшлі за мяжой (у Германіі і ЗША). Тэматыка іх надзвычай шырокая. У далёкі час юнацтва паэт апяваў прыгажосць роднай зямлі, узнёсла пісаў пра еднасць душы чалавека і навакольнай прыроды (“Сонца”, “Жыццё”, “У дарозе”, “Адзінства хараства”). Пазней у вершах з’яўляюцца матывы перажытага ў турмах і лагерах (“Зманлівасць”, “Жах”, “Крывічом”) і падзеі другой сусветнай вайны (“Мая вайна”, “Забраны Мінск”, “Мікола Бугроў”, “Цень Янкі Купалы”). Асноўнае ж месца ў творчасці паэта-эмігранага, які называе сябе выгнанцам, займае тэма Радзімы. Думамі пра Бацькаўшчыну — куточак зямлі, дзе нарадзіўся чалавек, упершыню ўбачыў свет, пазнаў першыя радасці, — прасякнуты многія вершы паэта:

Я восеняй жыву ў трывозе;
забудуся, ды зноў кране:
падпаленыя восеняй бярозы
гарэць пякучай ранай у мяне.

Пякучай ранай гарэць успаміны паэта пра родную вёску Мокрае, хату з ліпінай, адвечныя курганы, бацьку, маці з яе кроснамі, сястру Дар’ю, наогул, маленства. Радзіма, якая для паэта “залацісцей усіх брам”, ніколі не можа сцерціся з памяці. “Калі я гэты бераг і абраў, не значыць, што забыў я іншы бераг...”, — прызнаецца паэт у вершы Айчына”. Разважаючы над лёсам беларускіх эмігрантаў і іх жыццём на чужыне, М. Сяднёў задае пытанне: “Нашто ж, скажы, між Захадам і Усходам вачыма сінімі ты прарасла?” Гэта радкі з верша “Радзіма”, чытаючы якія можна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яскрава ўявіць чалавека, які даўно адарваўся ад бацькоўскай зямлі, але ўвесь час жыве думамі аб ёй.

Многім вершам Масея Сяднёва ўласцівы элегічная танальнасць, філасофская паглыбленасць, спавядальнасць. У іх прысутнічаюць матывы адзіноты, бездапаможнасці, цяжкіх жыццёвых дарог, цемры, ночы, аб чым яскрава сведчаць самі іх назвы (“Смутак”, “Вось і ноч”, “У адзіноце блукаў я”, “Вёрсты шлях мой далёкі накрылі”, “Не дасягнуць, не ўзяць, не разгадаць”).

Празаічныя творы М. Сяднёва многа ў чым аўтабіяграфічныя. Дзеянне ў рамане “Раман Карзюк” адбываецца ў Мінску і яго наваколлі ў часы масавых рэпрэсій. Перадваеннаму жыццю і пачатку Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны раман “І той дзень надышоў”. Напісаны ад першай асобы, ён узнаўляе пражытае аўтарам, уваскрашае тагачаснае вясковае жыццё. Праўдзівымі і пераканаўчымі ў творы з’яўляюцца вобразы маці, бацькі, аднавяскоўцаў і тых людзей, хто ў той час жыў з пісьменнікам.

Вынікам глыбокага асэнсавання  рэчаіснасці, пошукаў адказаў на шматлікія пытанні сённяшняга дня з’явілася кніга літаратурна-крытычных артыкулаў “Масеева кніга”, якую аўтар назваў “споведдзю аб сваім краю і аб сабе”. У ёй змешчаны нататкі аб жыцці і творчасці Янкі Купалы, Якуба Коласа, Язэпа Пушчы, Алеся Дудара, Тодара Кляшторнага, праблемныя артыкулы, старонкі турэмнага дзённіка, успаміны, лірычныя замалёўкі, лісты. У кнізе спалучыліся публіцыстычны пафас і мяккі лірызм, філасофская паглыбленасць і катэгарычнасць меркаванняў,  агульнае і ўласнае, суб’ектыўнае і аб’ектыўнае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**101**

## ВАЙНА І СУЧАСНАСЦЬ У ТВОРАХ ІВАНА НАВУМЕНКІ

Імя народнага пісьменніка Івана Навуменкі шырока вядома ў рэспубліцы і за яе межамі. Ён з’яўляецца аўтарам 12 зборнікаў апавяданняў, аповесцей, 6 раманаў, шматлікіх прац па літаратуразнаўстве.

Пачатку Вялікай Айчыннай вайны і перыяду разгортвання партызанскага руху на Беларусі прысвечана трылогія “Сасна пры дарозе”, “Вецер у соснах”, “Сорак трэці”. Сам аўтар назваў яе творам аб акупацыі. Падзеі разгортваюцца ў мястэчку Бацькавічы і ў навакольных вёсках. Аўтар паказвае, як на шлях барацьбы з чужынцамі становяцца Сцяпан Птах і яго сын Міця, Аўсянік, Кардаш, Мацвей Шэлег, Шура Гаранка, Іван Лобік, Саша Плоткін і іншыя змагары. Аўтар дакладна адлюстроўвае складаны і супярэчлівы працэс фарміравання волі і характару маладых людзей, іх духоўны свет — свет філасофскіх разважанняў, рамантыкі і юнацкага максімалізму. І. Навуменка ўзнаўляе сцэны партызанскай вайны на Палессі, прасочвае шлях станаўлення, унутранага гартавання герояў твора, для якіх змаганне з ворагам — галоўная мэта жыцця. Пісьменнік ускрывае прычыны духоўнага падзення, здрады такіх тыпаў, як Юрый Басняк, Крамер, Забела, Дзеніскевіч. Гэтымі вобразамі аўтар выносіць суровы прысуд здрадніцтву, эгаізму, бездухоўнасці, паразітычным адносінам да жыцця.

Праз усе раманы трылогіі праходзіць сімвал адзінокай сасны. Гэты своеасаблівы вобраз твора выражае пачуцці герояў, узмацняе драматызм і напал апісваемых сітуацый. Завяршаецца трылогія сцэнай прыходу Чырвонай Арміі ў беларускія гарады і вёскі, вяртання Міці ў родныя мясціны, да прыдарожнай сасны, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўвасабляе бессмяротнасць жыцця. Трылогія з'яўляецца праўдзівай гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны. Не спрашчаючы рэальных абставін, І. Навуменка паказаў праўду жорсткага ваеннага часу.

Жыццю моладзі і праблемам сучаснасці прысвяціў І. Навуменка аповесць "Бульба", зборнікі апавяданняў "Таполі юнацтва" і "Вераніка". У многіх творах пісьменнік спрабуе адказаць на вострыя пытанні рэчаіснасці, задумваецца над прыродай чалавечага характару, уздымае маральна-этычныя праблемы сённяшняга дня. Раман "Смутак белых начэй" з'яўляецца працягам рамана "Сорак трэці". Гэта ўспаміны аб падзеях 1944 года на Ленінградскім фронце, сведкам якіх быў сам аўтар. Героі твора — Сяргей Каліноўскі, Косця Русаковіч, Васіль Лебедзь — тыповыя прадстаўнікі ваеннага пакалення, што са зброяй у руках змагалася за вызваленне Айчыны. Раман "Летуценнік" прысвечаны станаўленню творчай і навуковай інтэлігенцыі ў 50-я гады. Цэнтральным героем рамана "Асеннія мелодыі" з'яўляецца загадчык кафедры гісторыі прафесар Аляксей Андрушкевіч. Аўтар паказвае яго цяжкое мінулае , ахопленае ваенным ліхалеццем, і сённяшнюю працу на ніве навукі, дзе нярэдка сустракаюцца ананімкі, падножкі сумленным навукоўцам, маральнае раздваенне.

**102**

## ГІСТАРЫЧНАЕ МІНУЛАЕ Ў ПРОЗЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Ты верны рыцар
Слоў крывіцкіх, гойных,
Якія не загубяцца нідзе.
Твой цень відушчы
Па забытых гонях
Ідзе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І за сабой сляпых вядзе.

*Р. Барадулін*

Уладзімір Караткевіч вядомы ў беларускай літаратуры як празаік, паэт, драматург, сцэнарыст, публіцыст, перакладчык, літаратурны крытык. Але перш за ўсё ён — заснавальнік нацыянальнага гістарычнага рамана.

Мастацкаму ўвасабленню гістарычных падзей прысвяціў У. Караткевіч раманы “Хрыстос прызямліўся у Гародні”, “Каласы пад сярпом тваім”, “Чорны замак Альшанскі”, “Леаніды не вернуцца да Зямлі”(“Нельга  забыць”), аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”, “Чазенія”. Са старонак гэтых твораў паўстаюць змагары за народнае шчасце, прарокі, інтэлігенты, рыцары і прыгоннікі, кардыналы і чароўнай прыгажосці дзяўчаты. Яны ўмеюць па-свойму любіць, ненавідзець, пакутаваць, адстойваць свае погляды. Іх лёсы неадрыўныя ад гістарычных падзей і абумоўлены імі. І ў кожным творы — эпоха, складаны і часам трагічны лёс Белай Русі, народ, які не скарыўся перад нястачамі і прагне волі. Пісьменнік не толькі ўзнаўляе карціны жыцця сярэднявечча і наступных эпох, але і асэнсоўвае гістарычны працэс, што дазваляе зразумець таямніцы чалавечага быцця, аснову ўзаемаадносін людзей з навакольным светам.

Падзеі ў аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”адбываюцца ў канцы 80-х гадоў XIX стагоддзя. Вучоны-фалькларыст Андрэй Беларэцкі (галоўны герой твора) трапляе ў маёнтак Балотныя Яліны, дзе становіцца сведкам самых незвычайных здарэнняў. Уладальніцай маёнтка з’яўляецца апошняя прадстаўніца калісьці магутнага роду Надзея Яноўская. Па начах у доме бачаць Малога Чалавека і Блакітную Жанчыну, прадвеснікаў смерці кагосьці з роду Яноўскіх. Страх на ўсё наваколле наганяе дзікае паляванне караля

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Стаха, падчас якога (два гады назад) быў забіты бацька Надзеі. Яно ж пагражае смерцю дачцэ. Беларэцкі вырашыў раскрыць таямніцу гэтых з'яў і дапамагчы ўладальніцы Балотных Ялін.

З бібліятэчнай кнігі герой твора даведваецца пра караля Стаха і радавое пракляцце Яноўскіх. У пачатку XVII ст. Стах Горскі, у жылах якога цякла каралеўская кроў, вырашыў дабіцца незалежнасці. Стах меў вялікае войска і карыстаўся падтрымкай у сялян. Аднак дасягнуць самастойнасці Стаху не давялося: ён быў забіты сваім сябрам Раманам Яноўскім, якога калісьці выратаваў ад смерці. У перадсмяротны час кароль Стах праклінае ўвесь род Яноўскіх. Гэта пракляцце праз стагоддзі дайшло і да Надзеі.

Андрэю Беларэцкаму ўдалося выкрыць таямнічыя сілы і разам з Рыгорам і сялянамі атрымаць перамогу над прафесійнай бандай. Высветлілася, што легенду пра Стаха жорстка выкарыстаў Дубатоўк, які стаў кіраўніком палявання. Ён прагнуў смерці Надзеі, каб стаць гаспадаром Балотных Ялін. Заканчваецца твор ад'ездам Беларэцкага і Надзеі Яноўскай (яго будучай жонкі) з Балотных Ялін.

У рамане "Каласы пад сярпом тваім" пісьменнік паказаў шырокую панараму народнага жыцця напярэдадні сялянскага паўстання 1863 г., стварыў цудоўны вобраз рэвалюцыянера-дэмакрата і рамантыка Алеся Загорскага, сапраўднага змагара за лепшую долю свайго народа, дзеля свабоды якога ён гатовы ісці ў бой і ахвяраваць сабой.

Раман "Хрыстос прызямліўся ў Гародні"прысвечаны падзеям беларускай гісторыі XVI ст. У цэнтры ўвагі пісьменніка — жыццё праўдашукальніка, пакутніка і змагара Юрася Братчыка, які па волі лёсу вымушаны быў выдаваць сябе за Хрыста. Разам з дванаццаццю апосталамі ён вандраваў па Беларусі, рабіў цуды, наводзіў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

справядлівыя парадкі (дапамагаў бедным, караў царкоўнікаў, магнатаў, гандляроў, змагаўся з татара-манголамі). З самых неверагодных сітуацый герой твора выходзіў пераможцам. Народны заступнік Юрась Братчык — сын сярэднявечай эпохі з яе рэзкімі кантрастамі, інквізіцыяй, барацьбой царкоўнікаў і прадстаўнікоў улады з асветнікамі і вучонымі, нараджэннем парасткаў Рэнесансу. Герой твора, спасцігнуўшы вялікую веру ў чалавека, спрабуе вызваліцца ад путаў сярэднявечча, хоча засвоіць духоўныя набыткі новага часу, запаліць агонь чалавечнасці, шукае шляхі да пабудовы вольнага жыцця. У. Караткевіч паказаў, што такія людзі выяўляюць дух Беларусі, нязломны і непераможны народны характар, узнавіў тую глебу, на якой нараджаліся гуманістычныя ідэі беларускага сярэднявечча, і прыгодніцкі сюжэт твора напоўніў сацыяльна-філасофскім і псіхалагічным зместам.

Дзеянне ў рамантычнай легендзе “Ладдзя Роспачы”адбываецца ў беларускім горадзе Рагачове ў XVIст. Галоўны герой — дваранін Гервасій Выліваха — за свае грахі аказаўся на тым свеце. Але і ў падземным царстве ён не губляе жыццёвага аптымізму, бадзёрасці, гумару. Смерць не можа перамагчы Гервасія, у вобразе якога пісьменнік увасобіў тыповыя рысы нацыянальнага характару беларусаў — непакорлівасць, стойкасць, аптымізм, жыццялюбства.

Падзеі ў псіхалагічным дэтэктыве “Чорны замак Альшанскі” разгортваюцца на працягу XVII — XX стагодддзяў. Антону Космічу, спецыялісту па сярэднявяковай гісторыі, удалося раскрыць злачынствы як чатырохсотгадовай даўнасці, так і мінулай вайны і сучаснасці (хто з’яўляецца забойцам Ганны Альшанскай і яе каханага Валюжыніча, Мар’яна Пташынскага, Людвіка Лапатухі і іншых сумленных людзей, куды зніклі фамільныя скарбы, што

адбылося ў замку ў апошнюю вайну?). У раскрыцці злачынстваў Космічу дапамагаюць супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі Хілінскі і Шчука, вясковыя настаўнікі Змагіцель і Шаблыка, айцец Жыховіч, вартаўнік замка і касцёла Мультан. У рамане сцвярджаецца, што чалавек павінен заставацца чалавекам у самых крытычных і экстрэмальных сітуацыях. Твор вучыць любіць сваю Бацькаўшчыну, развівае цікавасць да гісторыі свайго народа, бо, кажучы словамі Косміча, "хто не памятае мінулага, хто забывае мінулае — асуджаны зноў пераажыць яго".

У. Караткевіча называюць гонарам і сумленнем беларускай літаратуры. Гэта так. Пісьменнік дасканала ведаў гісторыю свайго краю, якая стала арганічнай часткай яго духоўнага жыцця, яго стыхіяй і натхненнем, яго болем і адчаем. Творы выдатнага мастака слова не толькі паглыбляюць нашы веды па гісторыі, але і вучаць любіць і берагчы чалавечнае ў чалавеку, змагацца з бездухоўнасцю, знаходзіць ідэальнае і гарманічнае ў жыцці і прыродзе.

**103**

## РАМАНТЫЧНЫ ГЕРОЙ У РАМАНТЫЧНЫХ АБСТАВІНАХ (ПА РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА"КАЛАСЫ ПАД СЯРПОМ ТВАІМ")

А будучыня парасткам належыць.

*У. Караткевіч*

Развіццё рамантычнай плыні ў беларускай літаратуры звязваецца з творчасцю Янкі Купалы, асабліва з яе пачатковым этапам, калі паэт адчуваў моцны ўплыў польскага рамантызму XIX ст. У прозе рамантызм дасягнуў вяршыні свайго развіцця ў творах У. Караткевіча "Сівая легенда", "Цыганскі кароль", "Нельга забыць" і асабліва ў рамане "Каласы пад сярпом тваім".

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каноны рамантызму патрабавалі стварэння ідэальнага ва ўсіх адносінах героя — змагара за праўду і волю, абаронца бедных і пакрыўджаных, патрыёта сваёй бацькаўшчыны. І калі ў польскім рамантызме такім прататыпам з'явіўся Т. Касцюшка, то ў беларускім ім мог быць К. Каліноўскі. Таму зварот У. Караткевіча да падзей пярэдадня паўстання 1863 — 1864 гг. не з'яўляецца выпадковым. У літаратуры наспела неабходнасць стварэння абагуленага рамантычнага героя, і ён з'явіўся ў "Каласах пад сярпом тваім". Праз лёс аднаго героя выявіць характар і ідэалы эпохі — такая асноўная задача, якую вырашае аўтар у сваім творы.

Назва рамана і яго дзвюх частак невыпадковыя. Каласы — людзі, якіх, нібы серп, зразае смерць з палеткаў жыцця. Серп, хутчэй за ўсё, — уціск царызму, прадбачанне пісьменнікам трагічнага "жніва". "Выйсце крыніц" — гэта вытокі маладога пакалення, звязанага кроўнымі сувязямі з бацькоўскай зямлёй, з Айчынай. Прадстаўнікі гэтага пакалення — Алесь Загорскі і Кастусь Каліноўскі — павінны аб'яднаць, згуртаваць людзей, павесці іх за сабой, каб кроплі народнага гора паступова зліліся і ператварыліся ў магутную раку гневу і помсты. "Сякера пры дрэве" — гэта і сялянская зброя, якая чакала свайго часу, і "зброя" генерала-вешальніка Мураўёва, які жорстка расправіўся з удзельнікамі паўстання.

Галоўны персанаж рамана — Алесь Загорскі. І хаця мы ўспрымаем яго як гістарычную асобу, не трэба забываць, што гэта ідэальны, а не канкрэтны герой. Ён увасобіў спрадвечную мару народа аб месіі, збавіцелю, які абудзіць родную зямлю ад доўгага сну, верне яе да жыцця. У гэтым выяўляецца яшчэ адна рыса рамантызму, якая бярэ пачатак з вуснай народнай творчасці. І хаця

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Алесь не робіць нейкіх звышнатуральных учынкаў, ён — рамантычны герой, бо ў яго душы спалучаюцца рысы сапраўднага змагара за народнае шчасце і наіўнага летуценніка, які верыць у ідэалы дабра і справядлівасці, змагара, які выяўляе памкненні ўсіх пакленняў: вольна, свабодна жыць на роднай зямлі. І, можа, ніхто не адчуваў так востра гэтай патрэбы, як чалавек працы — селянін. Таму аўтар ідзе на свядомае парушэнне гістарычных рэалій: Алеся аддаюць на дзядзькаванне, хаця ў XIX ст. гэтага звычаю шляхта ўжо не прытрымлівалася. Чалавек, нават калі ён і шляхціц, павінен з дзяцінства зведаць на ўласным вопыце цяжкую сялянскую працу і побыт. Толькі ў гэтым выпадку ён будзе ведаць іх сап раўдны кошт і зможа выступіць у абарону тых, хто за яго бяднейшы і мае менш правоў. Такім уяўляецца аўтару шлях станаўлення сапраўднага беларуса, выратавання яго спадчыны і роднай культуры.

Вобраз Алеся грунтуецца не толькі на рамантычным, але і на рэальным светаўспрыманні, бо рамантыка — гэта заўсёды пэўнае адлюстраванне рэчаіснасці. Алесь выступае як рыцар з высакародным і шчырым сэрцам, якое чула ўспрымае ўсе беды народа. У сям’і Кагутоў ён навучыўся цаніць гонар і годнасць простага чалавека, не прыніжаць іншых і самому ні перад кім не прыніжацца, ашчадна адносіцца да духоўнай спадчыны сваіх продкаў і тых каштоўнасцей, якія набывалі для іх часам значэнне сакральнага сімвала. Адным з сімвалаў чалавечай працы і поту быў хлеб. У гэтым плане паказальны той эпізод з рамана, калі юны князь Загорскі падымае кавалак хлеба, які ўпаў са стала, і цалуе яго са словамі “Даруй, Божухна!” Алесь не толькі рамантык, які бачыць у сне белых коней — увасабленне свабоды і светлых ідэалаў, але адначасова і рэаліст, які думае аб самых звычайны, паўсядзённых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

справах (карысці цукраварні, ролі грошай і матэрыяльнага дабрабыту ў жыцці людзей). У вобразе маладога Загорскага выяўляюцца рысы характару і паводзін рэальнага чалавека.

Грамадзянскае сталенне Загорскага, такім чынам, узнікае не толькі на рамантычным грунце. Бацькі Алеся добра ўсведамлялі, што, каб быць патрыётам сваёй зямлі, патрэбна найперш ведаць яе мінулае — тое, што надае змаганню мэту і служыць светлым ідэалам гэтага змагання. Вялікую ролю ў гэтым адыграў стары Вежа, дзед Алеся, прозвішча якога таксама невыпадковае. Вежа — гэта нібы маяк, на які павінна арыентавацца маладое пакаленне. Нездарма дзед кажа, што ён "трошкі лепшы" за ўнука. Дзед навучыў Алеся таму, што павінен ведаць сапраўдны грамадзянін: праўду аб прыгоне і парадках, якія панавалі ў Расіі, аб шляхах грамадскага развіцця. І, пазнаючы гэту праўду жыцця, Алесь разумее, што здольны змяніць рэчаіснасць, яле яшчэ не ўсведамляе як. Гэты разрыў паміж здольнасцю і немагчымасцю (пакуль) ажыццявіць задуманае — яшчэ адна рыса героя рамантычнага характару. Разумеючы, што нельга абхапіць неабдымнае, Алесь дае сабе клятву змяніць хаця б нешта, тое, на што ў яго хопіць моцы. "Колас да коласа — сноп будзе", — кажуць у народзе. Загорскі ўсведамляе, што адзін ён, як колас у полі, што патрэбна вялікая сіла, каб зварухнуць акамянелыя пласты жыцця. Сустрэча з Каліноўскім натхніла Алеся прыкладам адданага служэння справе, за якую ахвяраваць можна не толькі каханнем, але і жыццём. Увабраўшы ў сябе ўсё лепшае ад простага народа і ўзбагаціўшыся веданнем сапраўднай мінуўшчыны, уступае герой у дарослае жыццё, выразна ўсведамляючы цяжкасці на шляху да дасягнення выпакутаванай мэты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ці з’яўляецца Алесь рамантычным героем? Безумоўна, з’яўляецца. Бо не можа не быць рамантыкам герой, які ахвярує сабою і сваім лёсам дзеля светлых ідэалаў жыцця і справядлівасці , герой, дэвізам якога маглі б стаць словы “за нашу і вашу свабоду” і “людзьмі звацца”. Словы двух рамантыкаў XIX і XX стст. — Тадэвуша Касцюшкі і Янкі Купалы.

**104**

**ДРАМАТУРГІЧНАЯ СПАДЧЫНА АНДРЭЯ МАКАЁНКА**

Народны пісьменнік Беларусі Андрэй Макаёнак быў усебакова адораным чалавекам: ён добра маляваў, рэзаў па дрэве, меў акцёрскі талент, быў паэтам, празаікам, драматургам, перакладчыкам. З імем Андрэя Макаёнка звязваюць пачатак новага этапу ў развіцці беларускай сатырычнай камедыі. Першай такой камедыяй стала п’еса “Выбачайце, калі ласка!” У цэнтры яе — старшыня райвыканкама Калібераў, які з дапамогай падхалімаў Моцкіна і Печкурова спрабуе вывесці раён на першае месца па хлебанарыхтоўцы і тым самым вярнуць сабе страчаны аўтарытэт і цёплае месца ў Мінску. І толькі дзякуючы Ганне Чыхнюк удаецца выкрыць махляроў і прыпісчыкаў і вывесці іх на чыстую ваду. Аўтар камедыі вядзе бескампрамісную барацьбу з рознымі махінатарамі, хапугамі, бюракратамі, з заганнымі метадамі кіраўніцтва народнай гаспадаркай, з паказухай і фармалізмам.

А. Макаёнак імкнуўся да жанравай разнастайнасці беларускай камедыі, пашырэння сродкаў яе сцэнічнай выразнасці. Ён выступіў у новым для беларускай драматургіі жанры — жанры трагікамедыі. Адна з першых такіх п’ес — “Зацюканы апостал” — прысвечана праблеме бацькоў і дзяцей. У ёй выкрываюцца вузкамяшчанскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ідэалы і звычкі, эгаістычны побыт, бяздушнасць і амаральныя адносіны паміж людзьмі ў сям'і і грамадстве. Напісаная на замежным матэрыяле, трагікамедыя паказвае калізіі і заганы чалавечага характару любой краіны, у тым ліку і нашай.

Падзеі ў трагікамедыі "Трыбунал" адбываюцца ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Былы калгасны пастух, бацька вялікай сям'і становіцца старастам, фашысцкім паслугачом. Сямейны савет (дзеці, нявестка, жонка Паліна), які ператвараецца ў трыбунал, вырашае ўтапіць яго, калі той не адмовіцца ад пасады старасты. У канцы п'есы сітуацыя праясняецца: Цярэшка ніякі не здраднік, а выканаўца загаду партызанскага камандавання. Яго ж сын Валодзя, не ведаючы гэтага, падрывае нямецкую камендатуру і гіне, рэабілітуючы сябе і сваю сям'ю за ўчынак бацькі. Многія літаратуразнаўцы па-рознаму імкнуцца вызначыць жанр гэтай п'есы. Яе называюць трагікамедыяй, фарсам, п'есай-апафеозам, п'есай -гімнам чалавечай мужнасці. Несумненна, у творы ёсць прыкметныя элементы трагізму. Пры ўважлівым яе прачытанні, лічаць многія даследчыкі, можна адшукаць элементы гераічнай балады і сямейна-бытавой камедыі. Усё ў творы сінтэзавана, пераплецена. Найбольш жа трывала за п'есай замацавалася назва трагікамедыі.

У пошуках новых жанравых і кампазіцыйных форм А. Макаёнак прыходзіць да камедыі-рэпартажу "Таблетку пад язык" (тут уздымаюцца праблемы перабудовы жыцця вёскі) і складанай у жанравых адносінах камедыі "Кашмар" (вядома і пад назвай "Святая прастата"). Дзеянне ў апошняй развіваецца ў двух планах — рэальным і ўмоўным (фантастычным). Рэальным з'яўляецца вобраз сумленнага і даверлівага Старога, якога непакояць не столькі растраты сына-прадаўца, колькі сам факт растраты. Умоўнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з’яўляюцца падзеі ў сне, дзе Стары, на пасадзе прэзідэнта адной з капіталістычных дзяржаў, хоча паканчыць з вайной, устанавіць мір, дабро і справядлівасць, навесці парадкі ў адпаведнасці са сваёй жыццёвай мудрасцю і сваім разуменнем законаў свету. Асноўная ідэя п’есы — пратэст супраць гонкі ўзбраенняў і пагрозы тэрмаядзернай вайны.

У п’есе “Пагарэльцы”, прысвечанай выкрыццю прыстасавальніцтва, чыноўніцтва, жорсткасці і бесчалавечнасці бюракратычнай сістэмы, А. Макаёнак адмаўляецца ад традыцыйнай сюжэтна-кампазіцыйнай структуры твора, даючы толькі пралог і эпілог адной трагікамічнай гісторыі. Дзеянне адбываецца ў пакоі камунальнай кватэры былога інструктара, цяперашняга старшыні гарвыканкама, кар’ерыста і цыніка Ухватава. Само прозвішча героя асацыіруецца са словамі “хапаць”, “ухапіць”, “хватка”. Праз дваццаць гадоў тут размясціўся кватэрны аддзел на чале з падхалімамі Бусько, Кудасавым і Сіланам, прызначанымі некалі самім Ухватавым. Змяніўся час, і былы гаспадар горада, персанальны пенсіянер, нікому не патрэбен, бо для былых яго хаўруснікаў ”чалавек без улады — не чалавек”. Ухватаў спрабуе адпомсціць Бусько — істоце, ім жа народжанай. Аднак сам сутыкаецца з жорсткасцю бюракратычнай сістэмы, раўнадушшам і абыякавасцю. Зняважаны і знясілены, ён памірае ад інфаркту каля дзвярэй Бусько, так і не знайшоўшы ратунку і справядлівасці. Такая жорсткая і зларадная помста быламу шэфу можа быць вытлумачана словамі народнай мудрасці: што пасеяў, тое і пажаў гэты ўладалюбны чалавек. Канчатковы ж прысуд усім “ухватаўцам” выносіцца ў паведамленні пра хуткую ліквідацыю “канторы” на чале з Бусько.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Апошні закончаны твор А. Макаёнка — трагікамедыя “Дыхайце эканомна!”. У ёй аўтар апісаў сітуацыю пачатку вайны, якую ўсё ж такі ўдалося прадухіліць. “Лепшыя” прадстаўнікі грамадства і дзяржаўныя кіраўнікі ратуюцца ў падземным сховішчы, разлічаным на 25 гадоў аўтаномнага існавання. П’еса, скіраваная супраць тэрмаядзернай катастрофы, у вострай сатырычнай форме выкрывае рэальныя заганы чалавечага грамадства.

## 105

## НАДЗЁННАСЦЬ ПРАБЛЕМ, УЗНЯТЫХ У КАМЕДЫІ А. МАКАЁНКА “ВЫБАЧАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА!”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Выкрыццю шматлікіх заган чалавечай душы прысвяціў сваю творчасць Андрэй Макаёнак. Адной з самых удалых спроб у гэтым кірунку заслужана лічыцца сатырычная камедыя “Выбачайце, калі ласка!” У ёй асуджаюцца кар’ерызм, прыстасавальніцтва, дэмагогія, выкрываюцца заганныя метады кіраўніцтва народнай гаспадаркай, паказуха і фармалізм. Галоўны герой — старшыня райвыканкама Калібераў Сцяпан Васільевіч, які ў мінулым займаў адказную пасаду ў сталіцы рэспублікі. Па нейкіх прычынах яго “панізілі” і паслалі ў раён. На новым месцы Сцяпан Васільевіч імкнецца любой цаной паправіць сваю кіраўніцкую рэпутацыю, каб зноў вярнуцца ў сталічны кабінет.

Старшыня пачынае бурную дзейнасць, якая, на жаль, пераўтвараецца ў “засядацельскую мітусню” з бясконцымі пагрозамі і запалохваннем падначаленых. Імкнучыся выканаць план хлебанарыхтовак раней за іншыя раёны, Калібераў свядома дае згоду на махінацыі, прапанаваныя Моцкіным. Дамовіўшыся з дырэктарам

спіртзавода, раённае кіраўніцтва атрымала фіктыўныя квітанцыі аб здадзеным збожжы.

Калібераў у п’есе паказаны пустым і нікчэмным чалавекам, балбатуном, прайдзісветам, прыстасаванцам, які дзеля ўласнай кар’еры гатовы пайсці на ўсё. Ён не мае ні сур’ёзнай адукацыі, ні спецыяльнасці, ні арганізатарскіх талентаў. Але затое мае талент хітрага і скрытага палітыка. Добра ведаючы пра сэнс з пустымі квітанцыямі, ён робіць выгляд, што не бачыць падману. Крок гэты зразумелы ўсім: у выпадку правалу не папасці пад падазрэнне, застацца ўбаку, не несці за ўдзел у злачынстве ніякай адказнасці. Прытворства Калiберава, яго паказушніцтва і крывадушнасць асабліва праяўляюцца ў сцэнах з выдуманай хваробай (камянях у печані). Гэтай хваробай Каліберaў хацеў паказаць, што ён — чалавек прынцыповы, гарыць у працы, заклапочаны справай і інтарэсамі народа. Праўда, гэта прытворства з хваробай бачыць нават прыяцель па махінацыях Моцкін, які з’едліва заўважае: “ У яго ж камень ў пячонках! Булыжнік!.. Кіньце дурня строіць!”.

Дапамагаюць Каліберaву ў афёры з пустымі квітанцыямі раённы ўпаўнаважаны па нарыхтоўках Моцкін, дырэктар спіртзавода Печкуроў. Гэта людзі са спецыфічнымі поглядамі на жыццё, сваёй філасофіяй. Яны не мараць пераехаць у сталіцу, а шукаюць выгоду на месцы, хочуць жыць ціха, спакойна, матэрыяльна забяспечана. Моцкіну, напрыклад, важна заняць галоўную пасаду на базе “Заготзбожжа”, Печкурову хочацца як мага хутчэй дабудаваць (за дзяржаўны кошт) шыкоўны ўласны дом. Каб паказаць сябе перадавікамі, выдатнымі арганізатарамі, яны здольны на жульніцтва, спекуляцыю, падхалімства. У небяспечных жа для іх жыццёвых сітуацыях яны гатовы перакласці ўсе беды і грахі на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чужыя галовы, нават на тых, каму нядаўна ўслужвалі і перад кім прыніжаліся.

Супярэчлівым, у нечым падобным да Тулягі з камедыі К. Крапівы “Хто смяецца апошнім” з’яўляецца вобраз старшыні калгаса Ягора Гарошкі. З аднаго боку, ён павінен дагаджаць Каліберava, яго жонцы (уладарнай мяшчанцы) і іншым раённым начальнікам, якія для выканання агульнараённага плана вымушаюць яго ісці на розныя ашуканствы. З другога боку, на яго ціснуць калгаснікі, патрабуюць мінімальнай аплаты за працадзень. І таму Гарошка, запалоханы і зацюканы раённым начальствам, вымушаны круціцца, лавіраваць, прытварацца, дагаджаць, нават хавацца ад разгневанага начальства на гарышчы ўласнай хаты. Але ў адрозненне ад дэмагогаў і дзялкоў Каліберава і Моцкіна, ён яшчэ не страціў свайго сумлення. Яму хочацца рабіць дабро людзям, плаціць больш калгаснікам, быць гаспадарлівым кіраўніком. Аднак з-за сваёй празмернай падатлівасці і палахлівасці ён дае згоду на ашуканства, хаця і не дапускае ніякай думкі, каб выкруціцца ад хлебаздачы. У канцы п’есы герой твора скідае з сябе палахлівасць, нерашучасць і выступае (разам з калгасніцай Ганнай Чыхнюк, брыгадзірам Міхальчуком, пракурорам Курбатавым, журналістам Гардзіюком) адным з выкрывальнікаў злачынных махінацый Каліберава.

П’еса А. Макаёнка, на першы погляд, прысвечана выкрыццю некаторых недарэчнасцей у калгасных хлебапастаўках, заганных метадаў кіраўніцтва гаспадаркай. На самай жа справе драматургу ўдалося ў вострай сатырычнай форме высмеяць паказуху і падман у жыццядзейнасці афіцыйнага кіраўніцтва раёна, паказаць, якую эканамічную і палітычную шкоду прыносіць краіне грубае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самавольства яе кіраўнікоў і, урэшце,  выкрыць карэнныя недахопы ў сацыялістычным грамадстве тых часоў.

## 106

## “ЖЫЦЦЁ — ВЫПРАБАВАННЕ ЧАЛАВЕКА НА ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ” (ТВОРЧАСЦЬ АЛЯКСЕЯ ДУДАРАВА)

Сучасную драматургію нельга ўявіць без творакасці Аляксея Дударава, аўтара вядомых п’ес “Выбар”, “Вечар”, “Злом”, “Парог”, “Радавыя”, “Адцуранне”. Пачынаў свой творчы шлях А.Дудараў як празаік. У першай кнізе прозы “Святая птушка” аўтар уздымае маральна-этычныя і духоўныя праблемы жыцця свайго сучасніка.

Пачаткам жа драматургічнай творчасці А. Дударава лічыцца п’еса “Парог”, прысвечаная тэме заняпаду маральных каштоўнасцей. У цэнтры п’есы — жахлівая і неверагодная гісторыя Андрэя Буслая. Гэта гісторыя ператварэння працавітага вясковага хлопца ў п’яніцу без сям’і, без хаты, без сяброўскіх сувязей. Ён замярзае ў снезе ў той час, калі бег за бутэлькай. А. Дударава цікавіць, чаму чалавек даходзіць да парога, што прымушае яго зрабіць гэта. Герой зламаўся ад таго, што аддаваў перавагу матэрыяльным каштоўнасцям, свету рэчаў.

“Жыццё — выпрабаванне чалавека на чалавечнасць. І ў вечары павінна свяціць сонца”, — так сказаў А. Дудараў пра сваю п’есу “Вечар”. У гэтым творы адчуваецца трывога за лёс неперспектыўных вёсак. Галоўныя героі — Ганна, Васіль-Мульцік і Мікіта-Гастрыт. Яны складаюць усё насельніцтва выміраючай вёскі Вежкі. У кожнага з іх было сваё няпростае жыццё. Ганна ўсё жыццё працавала на зямлі, ніколі не ведаючы ні адпачынку, ні радасці: у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вайну ляжала пад бомбамі, гарэла ва ўласнай хаце, пахавала трох дзяцей за адзін месяц. І, да ўсяго, апошні сын мала радасці прынёс — праводзіць жыццё ў турме. Але Ганна не азлобілася на жыццё, яна толькі не разумее, чаму гэта так — працуеш-працуеш, а пакінуць пасля сябе няма чаго.Дык навошта наогул ёй было нараджацца?

Другі персанаж п'есы — Васіль-Мульцік — чалавек шчыры, даверлівы, улюбёны ў жыццё. Ён здаецца дзіваком, бо размаўляе з сонцам і тэлевізарам, хоча, каб старшыня калгаса выкарыстаў яго паслугі ў якасці жывога барометра. Дзівацтва яго абумоўлена адкрытасцю характару, імкненнем жыць у згодзе і зладжанасці з прыродай і навакольным светам. Зусім іншы вобраз Мікіты-Гастрыта. Ён увесь час нечым незадаволены (аб чым сведчыць нават ягоная мянушка), заўсёды шукае лягчэйшага хлеба, таму ён адарваны ад зямлі, ад вясковага побыту. У гады калектывізацыі Мікіта "выкарчоўваў" кулакоў. Рабіў Мікіта гэта па загадзе, і тут няма яго вялікай віны. Але ж потым Гастрыт па ўласнай ініцыятыве напісаў данос на хлопца, які збіраўся засылаць сватоў да яго будучай жонкі. Аднак пакаянне Мікіты запозненае і непаслядоўнае.

Для герояў п'есы надыходзіць вечар жыцця: час роздуму над пражытым і перажытым. У гэтых роздумах і боль за паламаныя лёсы, і пакаянне ў грахах. Якім будзе "вечар", залежыць толькі ад самога чалавека.

У п'есе "Радавыя" Вялікая Айчынная вайна паказваецца як трагедыя сусветнай, агульначалавечай гісторыі. Аўтар паказвае не толькі гераізм людзей і нязломнасць іх волі да перамогі, але і закранае балючую тэму — якой цаной далася перамога. Героі п'есы — пяцёра радавых салдат. Кожны з іх мае свой лёс, і кожнага закранула нейкая трагедыя. Так, салдат Дзерваед, нягледзячы на тое,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

што на яго вачах фашысты спалілі жонку і дзіцця, не ачарсцвеў, не стаў жорсткім і бязлітасным. Наадварот, сваё гора зрабіла яго больш успрымальным да чужой бяды: ён аддае свой салдацкі паёк хвораму нямецкаму хлопчыку. Бушцец жа, пайшоўшы на фронт з-за вясельнага стала. зрабіўся злым і помслівым, здольным забіваць кожнага немца без разбору. Радавому Саляніку забіваць людзей не дазваляе вера, але ён вымушаны быць на вайне. Па-бацькоўску ставяцца салдаты да 18-гадовага Лёнькі Адуванчыка, на вачах у якога немцы забілі маці і сястрычку. Дугін, які ў свой час быў разжалаваны ў радавыя і пабываў у штрафным батальёне, становіцца Героем Савецкага Саюза. Даўняя ўзнагарода знаходзіць героя, але, на жаль, ён гіне ў апошні дзень вайны. П’еса “Радавыя” — рэквіем па ўсіх, хто загінуў у гады ваеннага ліхалецця.

У 1981 годзе ў друку з’явілася п’еса “Парог”, прысвечаная тэме заняпаду маральных каштоўнасцей. Яна лічыцца пачаткам драматургічнай творчасці А. Дударава. У цэнтры п’есы — жахлівая і неверагодная гісторыя Андрэя Буслая. Гэта гісторыя ператварэння працавітага вясковага хлопца ў п’яніцу без сям’і, без хаты, без сяброўскіх сувязей. Ён замярзае ў снезе ў той час, калі бег за бутэлькай. А. Дударава цікавіць, чаму чалавек даходзіць да парога, што прымушае яго зрабіць гэта. Герой зламаўся ад таго, што аддаваў перавагу матэрыяльным каштоўнасцям, свету рэчаў.

Маральна-этычныя праблемы сённяшняга дня асэнсоўваюцца А. Дударавым у п’есах “Злом”, “Выбар”, “Адцуранне”( прысвечана чарнобыльскай трагедыі). Дзеючымі асобамі п’есы “Купала”, прысвечанай беларускай гісторыі XV ст., з’яўляюцца Вітаўт, Ягайла, каралева Ядвіга, Кейстут, многія міфалагічныя вобразы.

А. Дудараў знаходзіцца ў няспынным творчым пошуку. Перш за ўсё яго цікавіць унутраны стан чалавека, яго непарыўныя сувязі з грамадствам і навакольным асяроддзем. Гэтым вызначаюцца асаблівасці яго творчай манеры.

**107**

**САТЫРЫЧНАЯ КАМЕДЫЯ М. МАТУКОЎСКАГА “АМНІСТЫЯ”**

П’еса М. Матукоўскага “Амністыя” скіравана на выкрыццё прыстасавальніцтва, паказушнасці, кар’ерызму. Дзеянне адбываецца на фабрыцы па вырабе дзіцячых цацак, дзе дырэктарам з’яўляецца даволі памяркоўны і асцярожны Якаў Фаміч Добрых. Ён згодзен праводзіць новаўвядзенні і бачыць у гэтым разумную перспектыву для прадпрыемства. І ў той жа час дае дазвол на выраб нецікавых і нікому не патрэбных цацак. Добрых з’яўляецца вінцікам адміністрацыйна-каманднага апарату, якому ніколі не дазвалялі прымаць самастойных рашэнняў. Смерць дырэктара ў сваім кабінеце ад інфаркту (яна была выклікана нервовым стрэсам ад чарговай праверкі, справакаванай слесарам Салавейчыкам) заканамерная. Драматург адкрыта не пратэстуе супраць, на першы погляд, даверлівага і клапатлівага дырэктара, але робіць вывад, што такім людзям кіраваць прадпрыемствам небяспечна.

Асноўны канфлікт у п’есе разыгрываецца паміж галоўным канструктарам Рагнедай Божашуткавай і галоўным мастаком Ізабелай Дрозд. Божашуткава заўсёды прыслужвала начальству, жыла па прынцыпе “абы было ціха”, спрабавала стварыць ілюзорнае ўяўленне аб перадавым прадпрыемстве, дзе пануюць дэмакратыя, павага, узаемаразуменне. Асноўнымі яе арыенцірамі былі паказушнасць, імкненне любымі сродкамі выканаць план, паказ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

надуманай рэспектабельнасці. Гэта жанчына жыве старымі нормамі, не можа і не хоча вырвацца з круга даўно знаёмых ёй рэчаў. І калі слесару Салавейчыку (пасля чарговага дэбошу) пагражала турэмнае зняволенне, галоўны канструктар пачынае акцыю ў абарону свайго супрацоўніка — грубіяна, прагульшчыка і маральна нізкага чалавека. Фабрыка змагалася за званне калектыву камуністычнай працы, і гэты скандал мог перакрэсліць усе надзеі на яго атрыманне. Вызваленне Салавейчыка з-пад стражы і яго амністыя (перавыхаванне ў калектыве) былі дасягнуты амаральнымі сродкамі. Слесар жа і не збіраўся перахоўвацца, а, наадварот, ператварыўся ў пачвару, правакатара, вымагальніка.

Антыподам Божашуткавай у п'есе з'яўляецца галоўны мастак Ізабела Дрозд. Яна не баіцца сказаць праўду ў вочы, адкрыта выступае супраць выканання планаў любымі сродкамі, супраць штампоўкі "піянераў", "акцябронкаў", прымітыўных цягачоў і пісталетаў. Гэта толькі дзякуючы яе намаганням, Салавейчыку-гегемону прыпомнілі ўсе грахі і паставілі на месца. Як перадавы, здольны, адукаваны і перспектыўны спецыяліст, Дрозд распрацавала ўзоры новых цацак і змагаецца за зацвярджэння іх вытворчасці. Пасля смерці Добрых яна становіцца дырэктарам фабрыкі, і перад ёй адкрыліся вялікія перспектывы ажыццяўлення задуманага.

П'еса скіравана не толькі супраць прыстасаванства і паказушнасці, але і на выкрыццё прычын страты ў рабочых адказнасці за вынікі працы і агульныя інтарэсы, гонару за сваю прафесію, пачуцця гаспадара прадпрыемства, нараджэння ў працоўных калектывах атмасферы хлусні, цынізму і хцівасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

108

## ПАЭЗІЯ НІЛА ГІЛЕВІЧА

Пакуль паэты будуць пець —
Не быць радзіме безыменнай,
Зямлі бацькоў — не анямець.
*Н. Гілевіч*

У творчай спадчыне народнага паэта Беларусі, вядомага перакладчыка, вучонага-фалькларыста, крытыка, публіцыста, грамадскага дзеяча Ніла Гілевіча нямала зборнікаў (“Неспакой”, “Бальшак”, “Перазовы”, “Актавы”, “У добрай згодзе”, “Повязь”, “Жыта, сосны і валуны”, “На высокім алтары”) , асноўным зместам якіх з’яўляецца лёс беларускай мовы і культуры, духоўная спадчына народа, памяць мінулай вайны. У вершах пра маці пульсуе ўсведамленне свайго сыноўскага абавязку перад самым дарагім чалавекам, нейкай унутранай віны і адначасова пакаяння. У вершах пра сучасную вёску паэт сцвярджае, што спрадвеку вёска была і застаецца захавальніцай маральнай і моўнай чысціні народа. Паэт уздымае голас супраць бездухоўнасці і абыякавага стаўлення да нацыянальнай культуры, выступае за маральную чысціню сучаснікаў. Публіцыстычнасцю, бескампраміснасцю, прамоўніцкай інтанацыяй і ў той жа час унутранай засяроджанасцю, медытатыўнасцю характарызуюцца вершы “Трывайма. браты”, “Мэта”, “Здарэнне”, “Што я думаў...”, “Як доўга?”. У вершы “ І ўсё-такі дойдзем!..” паэт з упэўненасцю сцвярджае, што беларусы, нягледзячы на нейкае пракляцце, змогуць пазбавіцца пачуцця сваёй другараднасці, прыслухацца адзін да другога, аб’яднацца і дайсці да беларускасці — чалавечнасці і людскасці:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Відаць, пракляцця знак ляжыць
На нас ад роду, і таму
Так цяжка шлях нам церабіць
Да Беларусі!
Равуць вятры, грымяць грамы,
Пыл засціць вочы нам, і ўсё ж,
І ўсё ж мы дойдзем, дойдзем мы
Да Беларусі!..

Праблемы нацыянальнага адраджэнны Н.Гілевіч звязвае з роднай мовай, і шматлікія пытанні яе развіцця ніколі не здымаліся з парадку дня паэта. Зусім нядаўна выйшла новая кніга "Любоў прасветлая: Роздумы ў вершах і прозе аб роднай мове", у якой паэт прадаўжае дыялог з чытачом аб мове і яе ролі ў жыцці чалавека, грамадства (вершы "Родная мова", "Роднае слова", "Мова майго народа", "Мара Скарыны", "Спадчына"). Падкрэсліваючы гуманістычную сутнасць вучэння Ф. Скарыны, паэт імкнецца далучыць сваіх суайчыннікаў да набыткаў агульначалавечай культуры:

Марыў калісьці славуты Скарына
"Ціснучы" кнігі на мове бацькоў:
Простаму люду ў роднай краіне
Зробіць даступнай ён мудрасць вякоў.

Адной з галоўных тэм у творчасці Н. Гілевіча з'яўляецца тэма роднага краю, бацькоўскай зямлі. Верш "Край мой беларускі, край", напісаны ў форме звароту да роднага краю. вызначаецца асаблівай пранікнёнасцю, чуласцю, шчырасцю — усім тым, што выверана і вынашана паэтам. Лірычны герой хоча прыгарнуцца да ляснога долу, напіцца вады гаючай з крыніцы, прайсці па бясконцых шляхах і прасторах, наглядзецца на лугі і рэчкі, каб узяць усё гэта з сабой у вечнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У вершы “Ах, якая над Гайнай купальская ноч” паэт не столькі знаёміць чытача з чароўным светам  святочных абрадаў, колькі заклікае да аднаўлення забытых традыцый. Заклік у абарону родных бароў і пушчаў, пратэст супраць бездухоўнасці ў адносінах да прыродных багаццяў гучыць у вершах “Даруйце, родныя бары і пушчы”, “Сіняя птушка”.

Памяць вайны, якая не адпускае пааэта ўсё жыццё, з’яўляецца тэмай паэмы “Гарыць, гарыць мая Лагойшчына”, шматлікіх вершаў (“Ты кажаш, я не ведаю вайны”, “Сто вузлоў памяці”). Паэт вітае мір, не хоча паўтарэння жудасных ваенных гадоў:

Застаўшыся з маленства на вайне,
Я аднаго хачу, мая краіна:
Каб гэта скончылася ўсё на мне,
Каб гэта ўсё не стала доляй сына.

Адрасатам многіх вершаў паэта з’яўляецца моладзь. У вершы “Парада маладым чытачам” Н. Гілевіч пераканаўча і проста сцвярджае мудрыя жыццёвыя ісціны: трэба чытаць казкі, бо “навукі мудрай — край там непачаты!”. З кожнай казачнай фабулы маладыя чытачы павінны зразумець няхітрую жыццёвую праўду, выказаную паэтам у яскравых параўнальных зваротах: “чаму лісе не трэба верыць здохлай, як гэта дзед адзін зрабіў калісьці”( не трэба давяраць хітраму чалавеку), “чаму ваўку не трэба камізэлька з двума радамі гузікаў на бруху”   ( не адзенне ўпрыгожвае чалавека, а прыгожыя ўчынкі), “чаму царэвіч там, дзе ўпала стрэлка, узяў за жонку брыдкую рапуху” (дабрыня і спагада вышэй за знешнюю прыгажосць), “чаму быў вымушаны памірыцца Музыка з яшчаркай, як гора ўспала” (да сяброў трэба звяртацца нетолькі ў час бяды), “чаму, пабыўшы ўжо царом з царыцай, дзед зноў стаў дзедам, баба — бабай стала” (прагнасць, сквапнасць не даводзяць да дабра).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пра сучаснасць, пра людзей і справы сённяшніх дзён расказваецца ў рамане ў вершах Н. Гілевіча “Родныя дзеці”. У лірычных адступленнях гэтага выдатнага твора аўтара, які цеснымі цеснымі і непарыўнымі сувязямі звязаны з Радзімай,

Не раз’яднаць і не адсекчы
Ні ручайка, пакуль жывы.
Тваіх артэрый дух адвечны —
Давечны ток маёй крыві.

Паэзія Ніла Гілевіча вабіць чытача не толькі сваёй мастацкай дасканаласцю і прыгажосцю гучання, але і вастрынёй тых праблем, якія ўздымае паэт у сваіх творах. Спавядальнасць, шчырасць, тонкі лірызм і метафарычнасць складаюць адметнасць творчай манеры Н. Гілевіча. Аўтар не абмінае сваёй увагай “нязручныя” праблемы, паслядоўна і доказна вядзе з чытачом гаворку аб складанасцях сучаснага жыцця. Наогул, паэзію Ніла Гілевіча можна было б акрэсліць як філасофскую лірыку грамадзянскага гучання.

**109**

## ІДЭЙНА-ТЭМАТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ РАМАНА Ў ВЕРШАХ Н. ГІЛЕВІЧА “РОДНЫЯ ДЗЕЦІ”

Мы — тройчы дзеці ў вечным крузе:
Мы дзеці роднае сям’і,
І дзеці маці-Беларусі,
І дзеці Матухны-Зямлі.

*Н. Гілевіч*

Н. Гілевіч — аўтар першага ў беларускай літаратуры рамана ў вершах “Родныя дзеці”, у якім адлюстроўваецца побыт і жыццё беларускага народа, выяўляецца сутнасць душы беларуса, паэтызуецца прырода, раскрываецца высокі і трагічны сэнс кахання,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

узнімаюцца пытанні экалогіі, мовы, маральнай адказнасці чалавека за свае дзеянні, учынкі.

Кампазіцыя твора даволі арыгінальная. У ім чатырнаццаць раздзелаў, аб'яднаных у пары. Пасля першых шасці пар прыводзяцца аўтарскія адступленні: паэтычнае, іранічнае, гістарычнае, у гонар маці, кулінарнае і педагагічнае. Пачынаецца раман запеўкай, заканчваецца — дапеўкай, у якіх аўтар звяртаецца да чытача, абгрунтоўвае выбар тэмы.

Экспазіцыяй твора з'яўляецца першы раздзел "Прычына", дзе мы ўпершыню знаёмімся з галоўным героем Сцяпанам Якубавічам Вячоркам, калі той раздумвае над "пісьмом-павесткай" — запрашэннем на сямідзесяцігадовы юбілей маці. Асноўная сюжэтная лінія "Родных дзяцей" звязана з лёсам Сцяпана — прафесійнага музыканта і кампазітара, чалавека шматграннага, душэўна шчодрага, выпрабаванага часам, памяццю, сумленнем. У размовах Сцяпана на вясковай вуліцы, за сталом, на могілках (з братам Антосем, дзядзькам Лёксам, Мікітам, Лёдзяй, Тамашом, дзедам Сіўцом і інш.) абмяркоўваюцца шматлікія пытанні гісторыі, культуры, экалогіі, маралі, робяцца высновы аб непарыўнай еднасці чалавека з прыродай, бацькоўскай зямлёй, акрэсліваюцца чалавечыя лёсы.

Раздзелы "Белы май", "Ганьба", "Разлад", "На ўзвеях часу" з'яўляюцца ўспамінамі Сцяпана аб студэнцкіх гадах, каханні да Альжбеты Францаўны Кудзёлкі, майскіх шчаслівых вечарах. Ёсць ва ўспамінах героя і прыкрыя моманты, звязаныя са "шлюбам" з Гіленай, ганьбай, якую справакаваў аднакурснік Юзік Бэнсь, няўдалай жаніцьбай і разводам з Феняй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Даволі важныя праблемы ўзнімаюцца ў раздзеле “Бацькоўскі кут”. У полі зроку паэта — зямля, якая заўсёды была для чалавека і карміцелькай, і духоўнай крыніцай. З-за няўмелага гаспадарання яна пачынае ператварацца ў тарфяны пыл, у “бясплодны, мёртвы мінерал”:

Зямля ляціць у небе пылам,
Лячыць, імчыцца ўдалячынь,
Дзесь ападзе за небасхілам —
І не вярнуць яе нічым!

Занепакоены гэтым, аўтар усклікае:

Зямля! Твой люд цябе вякамі
Бярог, любіў — не памірай.
Жыві, карміцелька-зямліца!
Радзі! Пладзі! Святкуй жніво!
І дзень і ноч гатоў маліцца
Я за здароўе за твaё.

Але малітва не заўсёды можа дапамагчы. Для выратавання зямлі, сцвярджае паэт, перш за ўсё патрэбен “разумны, рупны гаспадар”.

У гэтым жа раздзеле размова вядзецца пра вайну, якая трагічным рэхам адгукаецца ў лёсах многіх герояў твора. На могілках, дзе пахаваны сястра Крыстына і брат Лёнік, Сцяпан сустрэў старога згорбленага дзеда Валенту Дразда. Як высветлілася з размовы, дажывае ён свой век адзін: два сыны не вярнуліся з фронта, жонка загінула на чужыне, дачку Мальвіну фашысты расстралялі разам з грудным дзіцем. Сустрэча з дзедам выклікала ў героя твора трывожны роздум аб сэнсе чалавечага жыцця, аб тым, што забыццё, выкрэсліванне чалавека з людской памяці страшней за фізічную смерць. І таму чалавек з маленства павінен думаць, “які — ці светлы, ці прыгожы — пакіне ў памяці ён след!”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У лірычных адступленнях акрэсліваецца грамадзянская пазіцыя аўтара, даюцца пэўныя рэкамендацыі, рэцэпты. У паэтычным і гістарычным адступленнях, напрыклад, Н. Гілевіч узгадвае гістарычнае мінулае Беларусі, выдатных князёў Уладзіміра і Рагвалода, прызнаецца ў шчырай любові да Радзімы, цеснай і непарыўнай сувязі з ёй:

Не раз’яднаць і не адсекчы
Ні ручайка — пакуль жывы.
Тваіх артэрый ток адвечны —
Давечны ток маёй крыві.

У лірычным адступленні ў гонар маці паэт выказвае шчырую падзяку маці, якая дзеля шчасця дзяцей гатова ахвяраваць сабой. Перажыўшы вайну, “разбой, пажар смяротны”, маці змагла выхаваць дзяцей, уваскрэсіць для жыцця родны дом. Паэт упэўнены,

Што ў цэлым свеце, на планеце,
Ва ўсіх краях, ва ўсіх кутках —
З’яднае ўсе людскія сэрцы
Твой вобраз з дзіцем на руках!..

У творы нямала гумарыстычных радкоў (асабліва ў раздзелах “Гамана ў застоллі”, “Кулінарнае адступленне”), з дапамогай якіх паэт змог стварыць запамінальныя партрэты герояў, высмеяць негатыўныя з’явы, падзеі, факты, а таксама паказаць сутнасць прайдзісветаў, ілжэвучоных, кар’ерыстаў, бюракратаў.

Раман у вершах “Родныя дзеці”, багаты на герояў і падзеі, паказвае неразрыўнасць чалавечага існаванння ў часе ў прасторы, сцвярджае непераможнасць жыцця. Ён вучыць па-сапраўднаму любіць Бацькаўшчыну, шанаваць яе гісторыю, родную мову, помніць пра свае карані і вытокі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 110

## ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ... (ПА ТВОРАХ РЫГОРА БАРАДУЛІНА)

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.
*Р.Барадулін*

Паэзія народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна — з’ява надзвычай непаўторная, унікальная. Яна шматколерна, пластычна і эмацыянальна ўзнаўляе навакольны свет, адлюстроўвае прыгажосць роднай зямлі, пафас стваральнай працы. Вершы яго нават без подпісу пазнаюцца па яркай вобразнасці, рытміцы, унутранай рыфме, выразным гукапісе.

Р. Барадулін — прадстаўнік таго пакалення творчай інтэлігенцыі, якое ўвайшло ў мастацкае жыццё рэспублікі ў пасляваенны час. Балючая памяць аб апаленым вайной маленстве, аб гераізме, душэўнай стойкасці змагароў пранізвае паэмы “Блакада”, “Балада Брэсцкай крэпасці”, “Кожны чацвёрты”, вершы “Палата мінёраў”, “Прадвесне ў Хатыні”, “1103-ці дзень вайны”. Матыў чакання з вайны родных і блізкіх асабліва моцна і трагічна гучыць у вершы “Бацьку”. Паэт перадае псіхалагічны стан хлопчыка з далёкіх пасляваенных гадоў, якому ў кожным салдаце хацелася пазнаць бацьку:

Каторы раз сыходзіў снег...
Дамоў вярталіся суседзі.
Я кожнаму насустач бег
І чуў кароткае: “Прыедзе...”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кожны з твораў пра вайну — гэта яшчэ адна старонка ў паэтычным летапісе гераізму народа ў Вялікай Айчыннай. Р. Барадулін асуджае войны і напамінае аб неабходнасці паўсядзённай барацьбы за забарону ядзернай зброі. Яго турбуе, што “самалёт бомбу атамную губляе”.

Асаблівае месца ў творчасці Р. Барадуліна займае тэма Бацькаўшчыны — малой радзімы, Ушаччыны. Нямала радкоў прысвяціў паэт матчынай хаце, роднай вёсцы, таму кутку, дзе былі зроблены першыя крокі па зямлі, дзе застаўся ляжаць у магіле бацька-партызан (вершы “Мая Бацькаўшчына”, “Заінелая Ушаччына”, “Зямля бацькоў”, “Прыцягненне Віцебскай зямлі”). Шчымлівыя, пранізлівыя барадулінскія радкі аб вернасці бацькоўскаму дому робяць чалавека лепшым, дабрэйшым, далучаюць да вечных крыніц духоўнасці і чалавечнасці:

Наведвайце бацькоў,
пакуль яны жывыя,
Пакуль дымяцца коміны —
нагрэйцеся ў бацькоў.
Калі адчай вякоў
гайнёй ваўкоў завые,
Не трэба анікому ён,
сум ля сляпых слупкоў.

Паэт задумваецца над гістарычным мінулым Айчыны. З яго вершаў можна ўявіць старадаўні Мінск, які ніколі не мяняў свабоду на ярмо, Полаччыну, вядомую святлом “кірыліцы Скарынавай”, Белую Русь, што “бласлаўляла даланёю кляноваю сваіх сыноў, слязамі дабяла бяліла лён на світку Каліноўскаму і Нёманам у сны Урублеўскага плыла”. Сутнасць народных традыцый і святаў раскрываюцца ў вершах “Каляды”, “Асяніны”, “Вадохрышча”,

“Купалле”, “Вялікадне”. Героямі твораў Р. Барадуліна з’яўляюцца і змагары пад Грунвальдам, і слуцкія паўстанцы, і шматлікія дзеячы культуры, асветы (вершы “Грунвальд”, “Слуцкім паўстанцам”, “Язэп Драздовіч”, “Дуніну-Марцінкевічу”). Родная зямля паўстае ва ўсёй сваёй непаўторный красе, і паэт адкрыта прызнаецца:

Я шчасны,
што сынам быць
гэтай зямлі
Мне лёсам наканавана.

Бадай, самым галоўным у творчасці Р. Барадуліна з’яўляецца вобраз маці. Для паэта маці — увасабленне дабра і справядлівасці, спагады і жалю, чалавечай шчодрасці і самаахвярнасці. І невыпадкова апошняя кніга паэта носіць назву “Евангелле ад мамы”. Яна асвечана дабравесцем, благаславеннем, бо маці — пачатак жыцця, ідэал працавітасці, сумлення і дабрыні, зберагальніца маральных каштоўнасцей, выпрацаваных чалавецтвам на працягу вякоў. З радкоў вершаў “Куліна”, “Матчына хата”, “Матчыны рукі”, “Веды”, “Вогнепаклонніца” паўстае вобраз маці паэта Куліны Андрэеўны. Гэта звычайная вясковая жанчына, якую не песціў лёс: не дачакалася з вайны мужа, адна гадавала сына, перажыла пасляваенныя цяжкасці. Зямны, рэальны вобраз маці паступова перарастае ў адзіны суладны вобраз маці-Радзімы:

Мамы не стала — не стала радзімы,
Дзе нарадзіўся старэць,
І падалася душа ў пілігрымы
З мараю маму сустрэць.

У цэнтры паэтычнага бачання Р. Барадуліна знаходзяцца такія важныя праблемы, як будучыня беларускай мовы і культуры, духоўная спадчына народа. У вершах “Мая мова”, “Беларуская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мова", "Наша мова", "Долі інакшай не трэба зямной..." гаворыцца аб спрадвечнасці і неўміручасці мовы, багацці і непаўторнасці жывога роднага слова:

Ты ад маці, ты матчына,
Беларуская мова.
Зорамі растлумачана
Сэрцу кожнае слова.
Там, дзе ёсць ты, — пагоднее,
Дзе няма — там зімова.
Будзь для ўдзячных паходняю,
Беларуская мова!

У многіх вершах Р. Барадуліна ставяцца пытанні ўнутранай духоўнасці чалавека, яго маральнай адказнасці за сябе і за іншых людзей. Кожны чалавек павінен задумацца над тым, што ён пакідае сваім нашчадкам:

Якія будуць сніцца сны
Нашчадкам нашым:
Ці дзень вясны,
Ці цень сасны,
Ці шум лясны.
Ці нашум?

Лёс Беларусі, ідэі нацыянальнага адраджэння нязменна хвалююць паэта. У вершах "Як трываеш?", "Беларусь на крыжы", нізках "Трыкірый", "Сэрца стане Віфліемам..." аўтар звяртаецца да Бога з просьбай вярнуць "блудныя душы з выгнання", дараваць вераадступнікамі, уратаваць іх "ад рукатворнага жаху" і "напасцяў варожых":

Божа, пашлі Беларусі
Ласку і Тваімі вачамі,
Сэрцы суцеш у скрусе,
Злітуйся над крывічамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вершы, напісаныя на аснове біблейскіх запаветаў і матываў, даюць магчымасць далучыцца да таямніц і скарбаў мудрасці, падштурхоўваюць да роздуму над зменлівасцю і бясконцасцю Сусвету.

Р. Барадулін, з'яўляючыся прадаўжальнікам сваіх вялікіх папярэднікаў, светачаў нашага Адраджэння Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, М. Багдановіча, знаходзіцца ў няспынным творчым пошуку, у пошуку новых адкрыццяў. Ён ідзе ў нагу са сваім часам, чуйна рэагуючы на ўсе праявы грамадскага жыцця. Творы яго, захоўваючы сакавітую і найлагоднейшую матчыну мову, вучаць высокай праўдзе, справядлівасці, дабру і чалавечнасці.

**111**

## АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ ТВОРЧАСЦІ ГЕНАДЗЯ БУРАЎКІНА

Генадзь Бураўкі адносіцца да таго пакалення паэтаў, якое адчула на сабе цяжар пасляваеннага аднаўленчага перыяду. Творчасць яго характарызуецца публіцыстычным і грамадзянскім запалам, шырынёй погляду на свет, філасофска-аналітычным асэнсаваннем рэчаіснасці. Паэт піша аб маральнай чысціні нашага сучасніка, аб мінулай вайне, аб каханні, па-філасофску развважае над тэмамі агульначалавечай значнасці:

Я ўсё стражэй да слоў сваіх і рук,
Трывожыць сэрца мне любая дробязь,
Нібы адказнасць я за ўсё бяру,
Што ў цэлым свеце думаюць і робяць.

Г. Бураўкін не выпускае з поля зроку праблемы нацыянальнага і духоўнага адраджэння, пытанні, звязаныя з чарнобыльскай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аварыяй, экалагічнай сітуацыяй у рэспубліцы. У час, калі “па ўсім вясновым краі ідуць кіслотныя дажджы”, калі “на дымным ядзерным крыжы прырода курчыцца пакутна”, паэт заклікае:

Смутнаю парою нелюдзімай,
Калі ўсё наўкол ідзе на злом,
Божа,
Захіні маю Радзіму
Мудрасцю,
Спакоем
І Цяплом.

Паэт пільна ўглядаецца ў наша сённяшняе жыццё з усімі яго фарбамі і адценнямі. Не даспадобы яму двурушныя, беспрынцыповыя людзі, абывацелі. Змагаючыся з чалавечым раўнадушшам, Г. Бураўкін просіць больш чуйна адносіцца да блізкіх і знаёмых, не забывацца, што “бягуць гады няўмольна і паспешна, навек згараюць znічкамі”. Глыбокім філасофскім роздумам аб сталасці свайго пакалення, аб большай патрабавальнасці да сябе напоўнены многія творы паэта:

Як многа ў нас звычайнасці!
Як мала ў нас адчайнасці!
Як многа ў нас прабачлівасці!
Як мала ў нас прадбачлівасці!

Ёсць у творчасці паэта і любоўныя вершы. Г. Бураўкін змог праўдзіва і пранікнёна расказаць аб каханні і яго загадкавых таямніцах, горычы расстанняў і радасці сустрэч, аб беражлівых адносінах да спадарожніц жыцця. Ён здзіўляецца перад хараством жанчыны, выказвае ёй удзячнасць за “тайнапіс вачэй”, за “святыя хвілі радасці жывой”, за “душ яднанне”. Вершы пра каханне склалі цэлы зборнік “Пяшчота”. Многія з іх пакладзены на музыку кампазітарамі Г. Вагнерам, Я. Глебавым, Э. Зарыцкім, С. Картэсам, І.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Лучанком, В. Раінчыкам, Э. Ханком, В. Івановым, А. Эшпаем. Чытаючы вершы з гэтага зборніка, міжвольна прыгадваеш майстэрскае выкананне салістамі ансамбля “Песняры” наступных радкоў:

Сэрцу радасна і балесна
Ад таго, як прыходзіш зноў
Ты, мая беларуская песня,
Да сваіх і чужых сыноў.

Вершы Г. Бураўкіна цікавыя і ўражлівыя. Яны дапамагаюць акрэсліцца ў нашым бурлівым жыцці, асвятляюць у ім усё самае высокае і чалавечнае. Вершы гэтага паэта нельга ўспрыняць з першага прачытання. Яны патрабуюць удумлівасці і разважання, за іх знешняй лёгкасцю прыхаваны глыбокі філасофскі роздум.

## 112

## “ТЫ МОЙ БОЛЬ СВЯТЫ, БЕЛАРУСЬ МАЯ...” (ТВОРЧАСЦЬ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ)

Адзінай мэты не зракуся,
І сэрца мне не задрыжыць:
Як жыць — дык жыць для Беларусі,
А без яе — зусім не жыць.
*Л. Геніюш*

Асноўнае месца ў творчасці Ларысы Геніюш — паэтэсы, бясконца ўлюбёнай ў свой родны край, у людзей сваёй зямлі, шчыра адданай Бацькаўшчыне, — займае тэма Радзімы. Любоў да яе — пачуццё вечнае і нязменнае, без якога не можа існаваць кожны сумленны чалавек. Усведамляючы сябе часцінкай беларускай зямлі, Л. Геніюш сцвярджае:

Ты — як праўда праўд,
ўсюды свой і брат,
мовы роднае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

звонкі дар.
Ты мой шлях круты,
ты мой боль святы,
Беларусь мая,
мой алтар.

Аднак у жыцці ўсё склалася інакш: бацька паэтэсы прапаў у гродзенскай турме пасля 1939 г., маці памерла ад голаду ў Казахстане, брат загінуў ў баях з фашыстамі ў Італіі, а яе разам з мужам прыгаварылі да 25-гадовай высылкі. Асуджаная пад нумарам “0-287”, яна прайшла праз усе кругі пекла ГУЛАГа і з-за турэмных кратаў змагла перадаць  страшную праўду пра тое, як подласць, бесчалавечнасць, зброя кіравалі жыццём (вершы “Замерзлымі пальцамі”, “Стукачы”, “Крывёй напоўніліся поймы рэк”):

Крывёй напоўніліся поймы рэк,
Бурліць адчаем слёз людскіх разводдзе.
Гляджу на свет. Я — лагернік, я — зэк,
Засуджаны на мукаў чвэрць стагоддзя.
Мяне драты, сабакі сцерагуць.
Дзікіх надзораў зграя нада мною,
І лоб штодня мой на прыцэл бяруць
Навучаныя забіваць канвоі.

І ў гэтыя драматычныя гады жыцця Л. Геніюш змагла выстаяць, не здрадзіць сабе і сваім ідэалам, не змірылася са сталінскай ідэалогіяй, не спалохалася механізма татальнага знішчэння іншадумцаў:

Не згінай мяне, я не сагнуся,
Не баюся ні страхаў, ні зла.
Нездарма я з зямлі беларускай
Непахіснай сасною ўзрасла.

Паэтэса заўсёды выступала супраць несправядлівасці, хлусні, верыла ў перамогу дабра над чорнымі сіламі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не быць начы!
Няма жыцця без сонца.
Узыдзе сонца, азарыць акно.
Хлусня хлуслівых страціць абаронцаў
І волавам апусціцца на дно.

Адвечнасцю і глыбіннасцю дыхае кожны паэтычны радок аўтара, рознакаляровымі фарбамі пераліваюцца яе вершы аб роднай мове, гістарычным мінулым Бацькаўшчыны, яе выдатных дзеячах (Усяславу Чарадзею, Ефрасінні Полацкай, Францішку Скарыне, Кастусю Каліноўскім) і сучасных працаўніках (земляробах, будаўніках, касманаўтах). Разважаючы над сэнсам сваёй творчасці, паэтэса пераконвае чытача ў тым, што “з маленькіх пачуццяў не зродзіцца верш, як з пустога вядзерца вада не нальецца”. Для яе:

Пісаць пра мінулае — не крочыць назад,
Пісаць пра сучаснасць — не рвацца наперад.
Трэба ў паэму жыццё нанізаць —
зважыць былое, у заўтра паверыць.

Асаблівае месца ў творчасці Л. Генію́ш займае кніга ўспамінаў “Споведзь”. Гэта своеасаблівая споведзь душы перад Богам, сучаснікамі і нашчадкамі. Ва ўспамінах адлюстравалася драматычная рэчаіснасць Заходняй Беларусі ў часы польскай акупацыі, жыццё беларускай эміграцыі ў Празе, лёс заснавальнікаў БНР і іх паслядоўнікаў, падзеі ваеннага часу. Аўтар даверліва размаўляе з чытачом аб тых падзеях, якія ёй давялося перажыць, і пра тых людзей (ворагаў і сяброў), з якімі звёў яе лёс. Моцным лірычна-настальгічным настроем прасякнуты радкі, прысвечаныя жыццю паэтэсы ў Зэльве. Сваёй жорсткай праўдай кранаюць запісы пра дэпартацыю з Прагі, пра засценкі МДБ у Мінску, этапы, перасылкі, лагеры смерці на далёкай Поўначы — пра тыя 25 гадоў, што правяла яна ў сталінскіх турмах. Нягледзячы на жорсткія і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бесчалавечныя ўмовы жыцця, паэтэса не стала на калені, не скарылася ў змаганні за сваю чалавечую годнасць.

## 113

## АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ ТВОРЧАСЦІ СЯРГЕЯ ЗАКОННІКАВА

Дзе ўзяць той мёртвай і жывой вады,
Каб імі пакрапіць маю зямлю?
І мушу, як замову ад бяды,
Шаптаць адно-адзінае: "Люблю..."
*С. Законнікаў*

Творчасць Сяргея Законнікава сведчыць аб яго непаўторным асэнсаванні рэчаіснасці, уменні гаварыць з чытачом эмацыянальна-напружана і ў той жа час душэўна-даверліва. Сваю жыццёвую пазіцыю паэт адкрыта заявіў у вершы "Спрадвечны круг жыцця і смерці":

Я ведаю, спазнаўшы поўна
Цану і радасці і бед,
Мне не ўсё роўна, не ўсё роўна,
Якім пакіну белы свет.
Я кроўнасцю намёртва звязан
З усім, што будзе, ёсць, было.
І мой галоўны абавязак
Рабіць дабро і нішчыць зло.

У паэтычных зборніках "Пакуль жыве мая бяроза", "Вера, надзея, любоў", "Сутнасць", "Заклінанне", "Святая воля" С. Законнікаў асэнсоўвае гістарычныя падзеі ў сувязі з днём сённяшнім, разважае над складанымі праблемамі сучаснага існавання людзей, асуджае мяшчанскія погляды на свет чалавечых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пачуццяў, выступае супраць вайны, паказвае мужнасць людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Звяртаючыся да свайго сучасніка, паэт напамінае: “Ты сам зямлі часцінка... Ёй — маці — не змані, каб не сысці з гасцінца любові, дабрыні”.

У С. Законнікава асабліва многа вершаў аб жыцці і смерці. Асэнсоўваючы праблемы жыцця, паэт падыходзіць да іх вырашэння аптымістычна, жыццесцвярджальна:

Даўно з бяссмерцем людзі ў добрай згодзе.
Яно заўжды трымаецца на тым —
Мы каласамі ў гэты свет прыходзім,
Каб сілу даць зярняткам залатым.

Паэма С. Законнікава “Чорная быль” прысвечана жахлівай экалагічнай катастрофе на Чарнобыльскай АЭС. У ёй аўтар спрабуе выявіць прычыны трагедыі, заклікае да барацьбы з беспрынцыповасцю, безадказнасцю, абыякавасцю людзей, папярэджвае аб наступленні духоўнага Чарнобылю:

Калі ж і зараз ты не загукаеш,
А будзеш жыць пад страхам і прынукай,
Чарнобыль не такі яшчэ чакае
Тваю зямлю, тваіх дзяцей і ўнукаў.

Аўтар паэмы паказвае трагічны лёс старых людзей, якія ўсё жыццё пражылі на гэтай зямлі, а зараз вымушаны ехаць на чужыну. Паэт нагадвае выпадак з бабуляй, якую затрымалі ў зоне забруджвання. Ёй напомнілі, што навакол радыяцыя, а старая “выцірала слёзы чорнай ссохлай жменькай”:

Дзеці не пускалі, уцякала, як злодзей.
Самі мае ножанькі прывялі да дому...

Драматычным напалам, пачуццём адказнасці за ўсё, што адбываецца на роднай зямлі, патрабаваннем праўды жыцця, няхай суровай і горкай, поўняцца радкі паэмы С. Законнікава:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Маўчыць, нібы камень, зямля,
Палын невядомасцю свеціць...
Што будзе, што будзе пасля? —
Не скажа ніхто ў гэтым свеце.
Ёсць праўда адна — праўдай жыць,
Няхай і суровай, і горкай...
У небе над намі стаіць,
Як зніч, палыновая зорка.

Паэма С. Законнікава “Зязюля” (“Полымя”, 1996, № 4) прысвечана народнамау пісьменніку Беларусі Васілю Быкаву. У 17 яе частках з выключнай завостранасцю ўзнімаюцца актуальныя праблемы нашага часу: чарнобыльская трагедыя, адраджэнне Бацькаўшчыны, яе мовы, культуры, сучаснае грамадскае жыццё, абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, лёс будучыні краіны. Тут і нагадванне слаўнай мінуўшчыны Беларусі, і горкі роздум над сучасным яе станам, і папрок у безадказнасці перад гісторыяй, часам, і адчуванне віны за лёс будучых пакаленняў, і асуджэнне рэнегацтва, здрадніцтва, сквапнасці і хцівасці дзяржаўных чыноўнікаў... Праблема нацыянальнага гора, бяды выходзіць далёка за межы чарнобыльскай трагедыі. Глабальнасць нацыянальнай катастрофы бачыцца ў ”распадзе душы беларускай”, якую можна выратаваць толькі шляхам нацыянальнага і духоўнага адраджэння. Паэт як бы перасцярагае ад непапраўнай бяды, просіць:”Толькі не патушы свечку сваёй душы!”

Цэнтральным, скразным вобразам паэмы з’яўляецца зязюля. Душа і выяўленне беларускага лесу, яна не толькі напамінае чалавеку пра яго маленства, “дзе сонца, як мама, цалуе ў макушку”, але і нагадвае аб хуткаплыннасці, скарацечнасці чалавечага жыцця:

Хутка змяце, як вецер,
Семя пустое час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Будуць усе на свеце,
Толькі не будзе нас.

Зязюля- вяшчунка — гэта і прадказанне анямелых брагінскіх лясоў, і прадбачанне духоўнага Чарнобыля, і прароцтва чалавечага існавання наогул. Бацькаўшчына ўяўляецца паэту ў вобразе бяздомнай, гаротнай зязюлі. Будучыня яе залежыць ад усведамлення таго, што неабходна віць “уласнае гняздо, будаваць свой нацыянальны дом”. Паэт упэўнены, што

...прыйдзе той час,
сціхнуць спрэчкі і сваркі,
Мы дружнай сям’ёю засцелем абрус,
Каб высака ўзняць крышталёвыя чаркі
За веліч і славу тваю, Беларусь.

## 114

## ІВАН ЧЫГРЫНАЎ — ПРАЗАІК І ДРАМАТУРГ

У першых празаічных творах Івана Чыгрынава (апавяданні “Птушкі ляцяць на волю”, “Па сваіх слядах”, “Бульба”, “Дзічка”, “Плывун”) знайшлі выяўленне духоўная сіла чалавека, яго ўнутраны стан, маральная прыгажосць, вернасць абавязку, памяць вайны. Асноўнай жа ў творчасці пісьменніка стала тэма вайны, якой прысвечаны раманы “Плач перапёлкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужынцы”, “Вяртанне да віны”, “Не ўсе мы згінем”. Падзеі ў пенталогіі пачынаюцца з першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны і заканчваюцца летам 1944 г. Вайна ў творах разглядаецца як трагедыя ўсёй Беларусі, дзе загінуў кожны трэці чалавек, незалежна ад таго, прымаў ён у ёй дзейсны ўдзел ці стаў нявінная ахвярай. Асноўны акцэнт  пісьменнік робіць на ўспрыманні вайны мірнымі

жыхарамі, якія (па маральных нормах) не павінны былі ваяваць, але з-за складаных абставін вымушаны былі ўзяцца за зброю.

У рамане “Плач перапёлкі” паказваецца жыццё ў вёсцы Верамейкі ў першыя тыдні і месяцы вайны, калі Чырвоная Армія адступіла, а немцы яшчэ не прыйшлі. Вёска як бы замерла, прыцішылася ў трывожным чаканні вялікай бяды, трагічных падзей, якія прадвяшчае нават перапёлка. “Калі птушкі так плачуць са свайго гора, то як жа тады павінны галасіць людзі, у якіх гора наогул бывае незраўнана больш, а цяпер дык і зусім цераз край?” — разважае галоўны герой Дзяніс Зазыба. Тое, чаго чакалі жыхары вёскі ў першым рамане, у наступных творах стане жахлівай рэальнасцю, калі верамейкаўцы тварам у твар сустрэнуцца з ворагам.

У першых раманах І. Чыгрынаў выпісаў яркія, запамінальныя вобразы вяскоўцаў (Парфёна Вяршкова, Кузьмы Прыбыткова, Івана Падзерына, Розы Самусёвай, Марфы Зазыбы, Ганны Карпілавай і інш.), кожны з якіх характарызуецца сваім успрыманнем рэчаіснасці, сваімі адносінамі да жыцця, працы, людзей, ваенных падзей. Сярод усіх верамейкаўцаў вылучаюцца  Радзівон Чубар і Дзяніс Зазыба, якія ў цяжкіх сумненнях, супярэчлівых развагах і памылках становяцца на шлях актыўнай барацьбы з ворагам.

Радзівон Чубар, старшыня калгаса, выхаваны на строгім падпарадкаванні партыйнай дысцыпліне, жыве па інструкцыях, указаннях і распараджэннях начальства, не заўсёды здольны да самастойных рашэнняў. І таму ў першыя дні вайны адчуў разгубленасць, бездапаможнасць, безвыходнасць. У такім стане ён аказаўся здольным на самыя рызыкоўныя і бессэнсоўныя ўчынкі. Палічыўшы разважанні ваенурача шкоднымі для разгортвання

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

партызанскай барацьбы, ён учыняе над ім самасуд. Пасля блуканняў па лесе ў пошуках партызан ён вяртаецца ў родныя мясціны і падпальвае копы жыта, каб тыя не дасталіся немцам. Пры гэтым герой твора не разумее, што жыта пазней можа спатрэбіцца сялянам, партызанам.

У наступных раманах Чубар стане больш разважлівым, самастойным, пачне кіравацца канкрэтнай неабходнасцю, абставінамі, умовамі барацьбы, а не голымі інструкцыямі і партыйнымі лозунгамі. Трапіўшы ў рукі нямецкага карнага атрада, кіраўнікі якога патрабавалі паказаць размяшчэнне партызанскага атрада Мітрафана Нарчука, ён праявіў вытрымку, мужнасць, высокую чалавечую годнасць і выбраў смерць, а не здрадніцтва.

Процілегласцю Чубара ў рамане выступае Дзяніс Зазыба, удзельнік грамадзянскай вайны, патомны земляроб, былы старшыня (пазней намеснік старшыні) мясцовага калгаса. Селянін паводле сваёй псіхалогіі, ён клапоціцца пра людзей і ў мірны, і ў ваенны час, не ўяўляе свайго жыцця без роднай вёскі, без яе жыхароў. Таму і вяртаецца герой твора ў вёску, хоць была магчымасць застацца за лініяй фронту. “Хто з роднай зямлі ўцякае, той ворага не перамагае”, — пацвярджае ён свой учынак мудрай прыказкай.

Вобраз Зазыбы даволі складаны, драматычны. Камуніст па перакананнях, змагар за ўсталяванне новага ладу, арганізатар партызанскага руху, ён паступова пачынае ўсведамляць, што і за савецкую ўладу, і за вызваленне Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў праліта многа крыві, якую поўнасцю апраўдваць нельга. Эвалюцыя яго поглядаў на сталінскія рэпрэсіі яскрава праследжваецца ў адносінах да сына Масея. Калі ў першых творах (асабліва пасля вяртання Масея ў вёску) Зазыба лічыць яго не ахвярай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

несправядлівай таталітарнай сістэмы, а злым выпадкам, то ў наступных раманах адкрыта гаворыць аб тэроры, які ажыццяўляў Сталін супраць уласнага народа. “Праўду не заўсёды робяць шаблямі”, — прыходзіць да такой высновы Зазыба, які застаўся ў спаленай вёсцы адзін: жонку забілі партызаны, а сын, як былы “вораг народа”,  вымушаны ўцякаць, назаўсёды пакідаючы бацьку і Радзіму. У вобразе  Масея паказаны пэўныя моманты біяграфіі вядомага пісьменніка-эмігранта Масея Сяднёва.

І. Чыгрынаў унёс значны ўклад у развіццё беларускай драматургіі. У цэнтры ўвагі драматурга перш за ўсё гістарычныя падзеі,  выдатныя дзеячы беларускай  гісторыі. Драма “Звон — не малітва” прысвечана полацкай князёўне Рагнедзе і яе сыну Ізяславу, “Прымак” — беларуска-літоўскаму князю Ягайлу, яго жонцы Соф’і Гальшанскай, князю Івану Друцкаму, “Чыстыя рэкі, мутныя воды” — ваяводу,  гетману Вялікага княства Літоўскага,  кіраўніку войск-пераможцаў у Аршанскай бітве 1514 г. Канстанціну Астрожскаму, “Следчая справа Вашчылы” —выдатнаму  кіраўніку антыфеадальнага сялянскага паўстання ў Крычаве ў 1743 — 1744 гг. У некаторых п’есах І. Чыгрынава (“Чалавек з мядзведжым тварам” і “Іграки”) узнаўляюцца трагічныя падзеі нядаўняй гісторыі, калі набірала моц таталітарная сістэма і генацыд супраць нацыі выконваўся рукамі сталінскіх “троек”. У п’есах “Хто вінаваты” і “Толькі мёртвыя не вяртаюцца” зроблена спроба асэнсавання вынікаў  чарнобыльскай трагедыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 115

## “З МСЦІЖАЎ БАЧНЫ СВЕТ...” (ТВОРЧАСЦЬ ІВАНА ПТАШНІКАВА)

У творчасці Івана Пташнікава, якога В. Палтаран назвала “чалавекам на вятрах часу”, выявілася глыбокая ўвага да маральных вытокаў народнага жыцця, яго сучаснага і мінулага, да ўнутранага свету чалавека, яго адносін да бацькоўскай зямлі, прыроды і навакольнага свету. У сваіх ранніх творах (“Іллюк Чачык”, “Не па дарозе”, “Чакай у далёкіх Грынях”) пісьменнік стварыў яркія, каларытныя карціны вясковага побыту, прыроды роднага Прывілля, шчыра выказаў сваю любоў да яго, строга асудзіў драпежніцкія і спажывецкія адносіны да прыроды. Больш паглыбленае асэнсаванне рэчаіснасці і ўзаемаадносін чалавека з навакольным светам назіраецца ў апавяданнях “Алені”, “Алёшка”, “Бежанка”, аповесці “Лонва”.

Падзеі ў аповесці “Лонва” адбываюцца ў пасляваенныя гады ў паўночнай беларускай вёсцы. Перад чытачом праходзіць звычайна жыццё жыхароў вёскі Лонвы, якія і ў мірны час адчуваюць водгулле вайны. Падлетак Юрка Даліна, цудам выратаваўшыся ў вайну (у яго стралялі фашысты), недарэчна загінуў ад выбуху снарада.

Тэме Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны аповесці “Тартак” і “Найдорф”. Першая аповесць, на думку Т. Шамякінай, з’яўляецца адным з самых бязлітасных драматычных твораў у беларускай літаратуры”. Яе цэнтральныя героі — сямёра сялян, што з Дальвы вязуць у Тартак (месца, дзе раней знаходзілася лесапільня) збожжа. У кожнага з іх — свой лёс, сваё разуменне і адчуванне рэчаіснасці. Па дарозе возчыкі сустрэліся з карнікамі, і тыя прымусілі іх ехаць наперадзе, каб тым самым уратавацца ад куль народных мсціўцаў. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

змаганні партызан з карнікамі гінуць дальванцы. Уратавацца ўдалося аднаму Алёшу. Вярнуўшыся ў родную вёску, ён убачыў толькі сляды пажару і вынішчэння. Фашысты спалілі яе разам з жыхарамі.

Дзеянне ў аповесці “Найдорф” адбываецца ў перыяд мая — чэрвеня 1944 г., калі рэзервовыя групы гітлераўскай арміі “Цэнтр” праводзілі аперацыю па знішчэнні партызанскіх брыгад. Пяцёра партызан прыкрываюць адыход галоўных сіл, а таксама мірнага насельніцтва. Пасля жорсткага бою ў жывых засталіся толькі Яфрэм Жаваранка і падлетак Алёша Белановіч. Яны з цяжкасцю прабіваюцца да сваіх. Па дарозе героі твора наведалі вызваленую ад фашыстаў родную вёску і захапілі ў палон групу немцаў, што спрабавала выйсці з акружэння. Непадалёку ад вёскі Найдорф адбылася (амаль выпадковая) сутычка з карнікамі, у якой Жаваранка і Алёша загінулі.  У вобразе галоўных герояў твора пісьменнік раскрывае гераічны пачатак у барацьбе з фашызмам, паказвае людзей, якія ў час самых цяжкіх і суровых выпрабаванняў не здрадзілі сабе і Радзіме,  захавалі вернасць бацькоўскай зямлі. На прыкладзе жыцця Жаваранка асабліва адчуваецца несумяшчальнасць вайны з усёй чалавечай сутнасцю, яе антымаральнасць і бесчалавечнасць.

Праблеме ўзаемаадносін чалавека з прыродай і навакольным светам прысвечаны аповесці І. Пташнікава “Мсціжы”, раман “Алімпіяда”.  Перад галоўным героем Андрэем Вялічкам пастаўлены выбар: пераехаць з-за працы пад Полацк ці застацца ў родных Мсціжах. Для Вялічкі пераезд азначае развітанне з роднай зямлёй, з якой ён звязаны тысячамі ніцяў, дзе пахавана яго жонка і дзе сам пражыў амаль усё жыццё. І таму герой твора робіць выбар на

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

карысць Мсціжоў: “Нікуды не паеду! Тут я нарадзіўся, тут і памру”. Вялічка, як бачна, не стаў перакаці-полем, а захаваў вернасць бацькоўскай зямлі і людзям.

Раман “Алімпіяда” ў структурным плане складаецца з чатырох частак (“Лета. Пыл”, “Бальніца”, “Застава. Сорак першы” і “Сын”), аб’яднаных лёсам галоўнай гераіні Алімпіяды Падаляк. Дзеянне адбываецца ў вёсцы Крамянец на рубяжы 70 — 80-х гг. Гераіня твора працуе на жывёлагадоўчай ферме з 1938 года і не ўяўляе свайго жыцця без гэтай працы. Нават у перадінфарктным стане яна спрабуе ратаваць калгасных бычкоў, якія засталіся ў гарачыню на полі без вады. Па-іншаму паступіць жанчына не можа, і ў гэтым — знітаванасць, цесная сувязь чалавека з працай, зямлёй. Раман мнагапланавы: у ім узнімаюцца праблемы чалавечнасці, сумленнасці, дабрыні, працавітасці, уважлівых адносін да прыроды, пераемнасці пакаленняў.

Творы І. Пташнікава з’яўляюцца самабытнай і значнай з’явай у беларускай літаратуры. Асноўны цэнтр іх прыцягнення — чалавек у яго шматлікіх узаемасувязях і ўзаемаабумоўленасцях, пошуках адказаў на спрадвечныя жыццёвыя і маральна-этычныя праблемы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**116**

## ПАД МІРНЫМ НЕБАМ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ (ТВОРЧАСЦЬ БАРЫСА САЧАНКІ)

Барыс Сачанка адносіцца да ліку пісьменнікаў, чыё дзяцінства было апалена вайной. Менавіта гэта акалічнасць паспрыяла выбару асноўнай тэмы яго творчасці — тэмы Вялікай Айчыннай вайны.

Многія апавяданні першай кнігі “Дарога ішла праз лес” з’яўляюцца своеасаблівымі даследаваннямі вытокаў народнай

стойкасці і мужнасці, праўдзівымі гісторыямі пра смеласць, гераічнасць і самаахвярнасць беларусаў у гады ваеннага ліхалецця (“Апошняя спроба”, “На сваёй магіле”, “Адведкі”, “Голас”, “Сустрэча з чалавекам”, “Сонца”). Лёс чалавека ў складаных умовах вайны, яго псіхалагічны стан, уменне пераадолець сябе і выстаяць у выключных сітуацыях раскрываюцца ў аповесці “Палон”. Раман у навелах “Чужое неба” шмат у чым аўтабіяграфічны. У вобразе галоўнага героя Сымона Гарапашкі знайшлі адлюстраванне многія факты з жыцця самога аўтара. У трылогіі “Вялікі Лес” на прыкладзе сям’і Дарошкаў і жыхароў вёскі Вялікі Лес пісьменнік паказаў працоўны і ратны подзвіг беларускага народа ва ўмовах фашысцкай акупацыі. У аповесці “Загадка аднаго падполля” Б. Сачанка вядзе размову пра гераічнае змаганне маладых падпольшчыкаў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, пра трагічную гібель 47 юнакоў і дзяўчат у невялікім палескім гарадку Вепры. У цэнтры аповесці “Аксана” — лёс і трагічнае каханне ўкраінскай дзяўчыны Аксаны да французскага палоннага Мішэля.

Акрамя ваеннай, у творчасці Б. Сачанкі знайшлі адлюстраванне і многія іншыя тэмы. “Малой” радзіме, Палессю, прыродзе прысвечаны цыкл апавяданняў “Палессе”, нарыс “Зямля маіх продкаў”, аповесць “Баравое рэха”. Гістарычнае мінулае палескага краю раскрыта ў аповесцях “Варэйка золата”, “Англіцкая сталь”, “Дыярыуш Мацея Белановіча”, “Трэцяе вока”. Пра чарнобыльскую трагедыю, якая не абмінула і яго родную вёску, вядзецца размова ў “Запісках аб радыяцыі”, аповесцях “Родны кут”, “Еўка”. Пісьменнік многа піша і пра сучасны гарадскі побыт. У аповесцях “Не на той вуліцы”, “Запіскі Занядбайлы”, апавяданнях “Успамін”, “Пра аднаго паэта”, “Даволі цікавая кабета”, “Без пяці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мінут прахвесар" выкрываюцца многія заганы жыцця гараджан (мяшчанства, прыстасавальніцтва, графаманства, спекуляванне, спажывецкія адносіны да жыцця і інш.).

Б. Сачанка з'яўляецца рупліўцам у справе адраджэння гістарычнай памяці, вяртання ў літаратуру незаслужана забытых імёнаў і прозвішчаў. Беларускаму эміграцыйнаму руху, жыццю і дзейнасці "выгнаннікаў", рэпрэсіраваных пісьменнікаў і грамадскіх дзеячаў (П. Крачэўскаму, У. Жылку, М. Забэйду-Суміцкаму, Н. Арсенневай, М. Сяднёву, Л. Геніюш), літаратурнаму руху 20-х — 30-х гг. нашага стагоддзя прысвечаны кнігі "Беларуская эміграцыя", "Сняцца сны аб Беларусі".

**117**

## ТЭМА ВАЙНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АЛЕСЯ АДАМОВІЧА

Большасць літаратурных твораў Алеся Адамовіча прысвечана Вялікай Айчыннай вайне, што абумоўлена фактамі біяграфіі пісьменніка (яго актыўным удзелам у падпольнай і партызанскай барацьбе). Вопыт перажытага падчас вайны знайшоў сваё адлюстраванне ў дылогіі "Партызаны" (раманы"Вайна пад стрэхамі" і "Сыны ідуць у бой".

Вялікая Айчынная вайна закранула дом кожнага беларускага жыхара, кожную сям'ю. Пісьменнік, імкнучыся замацаваць у народнай памяці трагедыю кожнага чалавека, аб'ездзіў (разам з Я. Брылём і У. Калеснікам) амаль усю Беларусь, запісаў звыш 300 жахлівых маналогаў-успамінаў ад удзельнікаў вайны і ахвяр фашызму. У выніку з'явілася кніга "Я з вогненнай вёскі"— публіцыстычны дакумент-абвінавачанне фашызму, малюнак жудаснага генацыду. Антычалавечая сутнасць фашызму, псіхалогія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

здрадніцтва раскрываецца ў аповесці А. Адамовіча “Карнікі” — жахлівым расказе пра людзей, якія ператварыліся ў катаў, нелюдзяў.

“Хатынская аповесць”, як і многія іншыя творы А. Адамовіча, заснавана на дакументальных фактах. Твор як бы сатканы з успамінаў жывых сведак спаленння беларускіх вёсак, партызанаў, падпольшчыкаў. Галоўным героем аповесці з’яўляецца Фларыян Пятровіч Гайшун, ветэран вайны, выкладчык псіхалогіі. Ён разам з былымі партызанамі Касачом, Косцем, Сталетавым, Лапцёнкам едзе ў Хатынь. Перад вачамі Гайшуна, сляпога чалавека, як бы ажывае ваеннае ліхалецце. Падлеткам ён ваяваў у партызанскім атрадзе, цудам вырваўся з “вогненнай вёскі”, бачыў смерць блізкіх людзей, сяброў. Ніколі не можа сцерціся з памяці героя твора жудасная расправа карнікаў над мірнымі жыхарамі вёскі Пераходы, смерць маці, дзвюх сястрычак-блізнят, лепшага сябра... Аповесць гучыць як мастацкі дакумент, абвінавачанне фашызму, як заклік да аб’яднання ў барацьбе з карычневай чумой. Важнае месца ў “Хатынскай аповесці” займае палеміка Гайшуна з яго аспірантам Бокіем, праз якую аўтар спрабуе асэнсаваць складаныя і супярэчлівыя пытанні сучаснасці, абараніць вечныя гуманістычныя каштоўнасці чалавека.

Па матывах “Хатынскай аповесці”ў Дзяржаўным рускім драматычным тэатры Беларусі пастаўлена п’еса “Вяртанне ў Хатынь”. Кінарэжысёрам Э. Клімавым у 1985 г. знята мастацкая кінастужка “Ідзі і глядзі”, у аснову якой пакладзена “Хатынская аповесць”. Фільм атрымаў першую прэмію на Маскоўскім міжнародным кінафестывалі і ўзнагароджаны залатым медалём.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**118**

## ”ХАРАСТВО І БОЛЬ ЖЫЦЦЯ” (ТВОРЧАСЦЬ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА)

Творчасць Вячаслава Адамчыка займае даволі адметнае месца ў беларускай літаратуры. У полі зроку пісьменніка знаходзяцца суровыя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, пасляваенная рэчаіснасць, жыццё ў заходнебеларускай вёсцы.

Апавяданне “Урок арыфметыкі” вяртае нас у апошні год вайны, калі герой твора, падлетак Мечык, вучыўся ў школе. Недасведчаны ў жыцці хлапчук, які ўжо бачыў людскія трагедыі, гвалт і несправядлівасць, адчуў улюбёнасць да настаўніцы арыфметыкі Чаславы Карлаўны. Яна здавалася яму чалавекам незвычайнай прыгажосці і чуласці. Калі ж настаўніцы не стала ў школе, Мечык стаў сумаваць, а даверлівая і паэтычная душа хлопчыка выношвала мару пра новыя сустрэчы з Чаславай Карлаўнай. Прайшлі гады, а ўспаміны пра першае трапяткое пачуццё не зніклі. Герой твора і праз дваццаць з нечым гадоў такі ж даверлівы, рамантычны і шчыры. “Але, пэўна, і цяпер я не сказаў бы ёй пра тое, што я яе любіў, любіў з неразважнай, смешнай дзіцячай затоенасцю. Не сказаў бы. Бо мы заўсёды мала добрага гаворым другім, баючыся чужое радасці, і, мусіць, гэтак трацім сваю”, — такімі словамі заканчваецца апавяданне пра чысціню, шчырасць і харавство чалавечай душы.

Героем апавядання “Салодкія яблыкі” з’яўляецца падлетак Тонік — натура ўражлівая, чыстая, сумленная. Ён стаў сведкам арышту аднавяскоўца Сямёна Мокуця, якога пазней фашысты застрэлілі. У гэтым здарэнні, безумоўна, хлопчыка вінаваціць нельга. Але Тонік не можа змірыцца з тым, што меў дачыненне да гэтага

няшчасця, абвінавачвае сябе. Шчыры і сумленны чалавек не можа абыякава адносіцца да лёсу іншых людзей і ў выпадку іх трагедыі ці няшчасця павінен браць на сябе пэўную адказнасць за гэта. Такую думку сцвярджае аўтар у гэтым апавяданні.

Вячаслаў Адамчык з’яўляецца аўтарам шырока вядомай тэтралогіі “Чужая бацькаўшчына”, “Год нулявы”, “І скажа той, хто народзіцца”, “Голас крыві брата твайго” . Дзеянне адбываецца ў заходнебеларускай вёсцы Верасава. Аўтар прасочвае жыццё герояў на працягу даволі вялікага перыяду. Тут і часы даваеннай польскай дзяржавы, і першыя гады савецкай улады, і перыяд фашысцкай акупацыі. На вобразе Міці Корсака (галоўнага носьбіта нацыянальнай ідэі) В. Адамчык паказаў трагічнасць шляху лепшых і найбольш свядомых прадстаўнікоў беларускага народа да вольнасці Бацькаўшчыны, марнасць іх надзей на жыццё (ва ўмовах сацыяльнай і нацыянальнай няроўнасці) па нормах агульнапрынятай маралі.

У рамане “Чужая бацькаўшчына” В. Адамчык выкрывае меркантыльнасць, уласніцтва, прагу нажывы, бездухоўнасць. У цэнтры твора — сям’я Уласа Корсака. Рана страціўшы жонку, Улас не ажаніўся другі раз. Дзеля дапамогі па гаспадарцы ўзяў у хату выхаванку са сваёй радні Хрысцю. Жыццё самога Уласа, здаецца, не заслугоўвае папрокаў: не краў, не падманваў, не рабіў зла людзям, не быў гультаём і абібокам. Але ж жыў па прынцыпе “мая хата з краю”. Нікому ён асабліва не дапамог, заўсёды заставаўся ў цені. Аб гэтым яскрава сведчыць выпадак з раненым камандзірам: Улас схаваў яго, а калі адчуў нябяспеку, выдаў. Пакаранне ж за жыццё ў сваёй нары, толькі дзеля сябе, не мінула героя твора, паламаўшы лёс яго дачкі Алесі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дачка Корсака Алеся — вясковая прыгажуня. Жыла яна хціва, зайздросна, з бабскімі забабонамі і сваркамі. Паступова Алеся страціла чалавечую годнасць, пераступіла праз народную мараль і этыку і аказалася здольнай на злачынства, здраду. Узяўшы ў прымы маладога і прыгожага Імполя, яна атручвае свякруху і нямую залоўку і перапісвае іх зямлю на сваё імя. Але чужая бацькаўшчына не прыносіць шчасця Алесі, і яна ператвараецца ў рабыню зямлі, маёмасці і бытавых абставін. Няўтульна становіцца і Імполю, для якога шырокі свет закрыўся вузкаэгаістычнымі, дробнымі ітарэсамі. Калі ж Імполь больш зблізіўся з Хрысцяй, Алеся намерваецца кінуцца пад колы цягніка, але застаецца жыць дзеля дзіцяці.

Міця Корсак — сын Уласа. Ён не жыве па прынцыпах, якімі кіруецца яго бацька ці Алеся, а прагне глыбокага пазнання свету. Калі Заходняя Беларусь была вызвалена, Міця вярнуўся з польскай турмы і пачаў вучыцца ў вячэрняй школе. Ён бачыў, як на яго вачах набірала моц таталітарная сістэма (арышты Аўсяніка, Вайтовіча, Табеша, Чыжэўскага і інш.). Надзея Міці стаць вольным і ўзмахнуць крыламі не апраўдалася. У час нямецкай акупацыі ён трапляе ў турму як савецкі служачы і актывіст.

Заключны твор тэтралогіі — раман “Голас крыві брата твайго” — прысвечаны падзеям Вялікай Айчыннай вайны.  Героі яго (Алеся, Імполь, Міця Корсак, Хрысця) прайшлі праз цяжкія ваенныя выпрабаванні. Раман заканчваецца сцэнай гібелі Міці Корсака. Алеся і Імполь вязуць нябожчыка на могілкі. “Жыць трэба, жыць!”, — усклікае Алеся, убачыўшы бягучага насустрач ёй шасцігадовага сына. Так,  жыццё нельга спыніць, перарваць. Яно прадаўжаецца ў нашых дзецях і ўнуках.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 119

## “МНЕ Ў ДУШУ СТАГОДДЗЯЎ ГЛЯНУЦЬ ХОЧАЦЦА” ТВОРЧАСЦЬ ЛЕАНІДА ДАЙНЕКІ)

Не кліч, не кліч — мне ў далеч добра крочыцца,
Аддамся я шляхам, вытокам, нетрам,
Бо мне ў душу стагоддзяў глянуць хочацца,
Нібы ў акно, расчненае ветрам.
*Л. Дайнека*

У творчай спадчыне Л. Дайнекі — розныя па жанрах і стылёвых выяўленнях творы. Гэта вершы, навелы, апавяданні, раманы, крытычна-публіцыстычныя артыкулы. Але найбольш талент пісьменніка выявіўся ў раманным эпасе. У дылогіі “Людзі і маланкі”, “Запомнім сябе маладымі” аўтар звярнуўся да тэмы рэвалюцыйных падзей на Беларусі, акупацыі, аднаўлення дзяржаўнасці беларускага народа. Адлюстроўваючы гераічны характар падзей мінулага, пісьменнік паказаў барацьбу бальшавікоў супраць старога свету, бальшавізацыю свядомасці народных мас.

Праблеме адказнасці чалавека за ўсё зробленае ім у жыцці прысвечаны раман “Футбол на замініраваным полі”. Дзеянне адбываецца ў нашы дні, хаця нямала старонак адведзена падзеям вайны. Іван Памалейкін, вярнуўшыся з канцлагера, прытулак для свайго сумлення шукае ў новых месцах жыхарства, новых працах і шлюбах. Аднак і ў яго 53-гадовым узросце яму не дае спакою памяць вайны, на якой ён клапаціўся (не выбіраючы сродкаў) толькі пра захаванне свайго жыцця. Падслухаўшы размову фашыстаў аб тым, што палонныя будуць гуляць у футбол на замініраваным полі, Памалейкін не папярэдзіў таварышаў. Сам жа, прыкінуўшыся хворым на сэрца, адстаяў на полі ў якасці бакавога суддзі. На яго вачах загінулі сябры, якія пасля вайны ўсё часцей стануць

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыходзіць у сны, клікаць да адказнасці. І не будзе даваць спакою выраз вачэй Рыгора Невідовіча ў той момант, калі той, акрываўлены, "поўз праз дым і агонь  з футбольнага замініраванага поля".

Падзеям даўняй  гісторыі Беларусі прысвечаны раманы "Меч князя Вячкі", "След ваўкалака" і "Жалезныя жалуды".  У цэнтры іх — вядомыя гістарычныя асобы Вячаслаў Барысавіч, Усяслаў Чарадзей, князёўна Соф'я, Рагнеда, Міндоўг і інш., а таксама гераічная барацьба беларускага народа з крыжакамі.

Галоўным героем рамана "Меч князя Вячкі" з'яўляецца Вячаслаў Барысавіч (Вячка) — князь паўночнага фарпоста Полацкага княства Кукенойса. Аўтар прасочвае яго жыццё ад самога дзяцінства, калі  фарміраваліся асноўныя рысы характару будучага князя. У 16-гадовым узросце юнак даў клятву, што да апошняга ўздыху будзе бараніць сваю Айчыну ад чужынцаў. І гэту клятву Вячка не парушыў. Чалавек вялікай душы, крыштальнага сумлення і моцнай сілы волі, ён выступаў за аб'яднанне сіл у барацьбе з ворагамі,  у час сечы "не туліўся за спіны свайго войска", а знаходзіўся ў цэнтры баявых дзеянняў. Мужна і з гонарам трымаецца князь тады, калі ворагі выкралі яго пяцігадовую дачку Соф'ю і за яе вызваленне запатрабавалі палову зямлі і палову горада. Князь па-геройску гіне пры абароне крэпасці. У часе бою яму адсеклі адну руку, але і перад смерцю Вячка паспявае засекчы тэўтонца і перадаць свой меч Якаву Палачаніну. Меч у творы — сімвал барацьбы за незалежнасць, непераможнасці духу войска, сувязі і пераемнасці гераічных спраў розных пакаленняў беларусаў.

У творы многа іншых дзеючых асоб. Гэта Якаў Палачанін (адважны воін, удзельнік Неўскай бітвы, выратавальнік мяча князя Вячкі), полацкі князь Уладзімір (ён выступае антыподам Вячкі),

літоўскі князь Дайгерут (замест паходу на тэўтонцаў ён збіраў даніну), тэўтонскі епіскап Альберт (выкрадальнік Соф'і) і інш. Аўтар узнаўляе ўклад тагачаснага жыцця ў гарадах і вёсках, заняткі і звычаі працоўных людзей, багатую духоўную культуру нашых продкаў.

Галоўным героем рамана "След ваўкалака" з'яўляецца полацкі князь Усяслаў Чарадзей, імя якога яшчэ пры жыцці было авеяна легендамі. У творы адлюстроўваецца найбольш цяжкі перыяд жыцця князя, калі ён у 1067 г. разам з сынамі Барысам і Расціславам быў захоплены ў палон князямі Яраславічамі. Усяслаў у рамане паказваецца адукаваным чалавекам, клапатлівым бацькам, смелым і мужным воінам. У выніку кіеўскага паўстання, сцэна якога даволі падрабязна і дэталёва апісана ў творы, Усяслаў Чарадзей быў вызвалены, а пасля заняў кіеўскі вялікакняжацкі пасад. Не жадаючы братазабойчых войнаў, а жадаючы міру і згоды паміж язычнікамі і хрысціянамі, князь добраахвотна адмовіўся ад кіеўскага пасаду і вярнуўся ў Полацк. Гэты выпадак (даволі рэдкі ў гісторыі) сведчыць аб бязмежнай адданасці князя роднай зямлі і вялікім клопаце аб захаванні на ёй мірнага жыцця.

Цэнтральны герой рамана "Жалезныя жалуды" — князь Міндоўг. Аўтар падкрэслівае вялікую ролю князя ў аб'яднанні беларускіх і літоўскіх зямель у складзе Вялікага княства Літоўскага і ў перамозе над крыжакамі. У творы, нягледзячы на станоўчую ацэнку Міндоўга, не абыходзяцца ўвагай і яго адмоўныя якасці: бязлітасная суровасць, несправядлівасць у адносінах да братоў і пляменнікаў, якія былі жорстка пакараны па волі князя. Сам жа Міндоўг, які імкнуўся да стварэння магутнай дзяржавы і падаўляў усялякія спробы самаўладства, быў жорстка засечаны разам з

сынамі. Гэтыя крывавыя старонкі гісторыі сведчаць пра цяжкі і цярністы шлях беларускага народа да сваёй незалежнасці.

## 120

## "Я — СВЯДОМАСЦЬ..." (ПАЭЗІЯ АЛЕСЯ РАЗАНАВА)

Не вернецца воін,
вандроўнік не вернецца.
вернецца сейбіт...
Заўсёды вяртаецца сейбіт.
*А. Разанаў*

Творчасць Алеся Разанава як прадстаўніка інтэлектуальнай паэзіі вось ужо чвэрць стагоддзя ўяўляе сабой эксперымент, у якім арганічна спалучыліся традыцыяналізм і наватарства. Паэзія мэтра радка і слова — гэта не столькі прадаўжэнне і развіццё традыцый Я. Купалы і М. Багдановіча, не столькі схематычны перанос на нацыянальную глебу заходнееўрапейскага мадэрнізму і авангардызму, колькі ўзор сінкрэтычнага мастацкага мыслення, дзе цесна зніталіся разнастайныя кірункі і стылі і ўласная манера паэта.

Паэзія Алеся Разанава ўражвае сваёй неардынарнасцю, вобразнай асацыятыўнасцю, метафарычнасцю. Ён аўтар зборнікаў "Адраджэнне", "Назаўжды", "Каардынаты быцця", "Шлях-360", "Вастрыё стралы", "У горадзе валадарыць Рагвалод", "Паляванне ў райскай даліне". У творах паэта, якія патрабуюць не аднаго прачытання, — філасофская змястоўнасць, ускладненасць думкі, шматлікія сэнсы, нюансы і алюзіі, спрадвечныя пытанні быцця і рэчаіснасці:

Няўжо рэчаіснасць — толькі

дрэвы і небасхіл,
замкнёныя кругазваротам?..
І сцежкі людскія замкнёны,
і парыванні таксама...

Лірычны герой А. Разанава ўзнімаецца над будзённым, звычайным і аднастайным, заклікае людзей абудзіцца ад раўнадушша і абыякавасці, якія ў нашы дні раўназначны забыццю і смерці:

Не спіце...
Працінае нябёсы твой голас...
Галасы мёртвых зор...
галасы мёртвых вёсак...
і крывавых адбіткаў нашых —
сярод голасу галасы,
аб'яўляйце,
тлумачце,
даводзьце
з таго боку зямной раўнавагі,
як губляецца раўнавага!..
Не дазвольце, каб суд наш і ўчынкі
апярэджвалі нас,
абмяжуйце
валадарства наша,
паўстаньце
вартавымі на нашай дарозе.

Паэзія А. Разанава вылучаецца гукавымі асацыяцыямі, разбурэннем многіх традыцыйных форм і канонаў, дзёрзкай эксперыментальнасцю, сінтэзам вершаў і прозы авангардысцкага кірунку. Ён увёў у беларускую літаратуру версэты, квантэмы, вершаказы, пункціры, зномы. У іх асабістае "я" паэта як бы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

праламляецца праз “каардынаты быцця і асобы”, героі пазбаўлены канкрэтных чалавечых рысаў:

Я — свядомасць,
я — цела,
я — свет,
у якім — гарызонтам шкельцы, —
гэта я,
ні аб’ект, ні суб’ект, проста я:
бог, вар’ят і пачвара.

Ёсць у А. Разанава і вершы, дзе не прысутнічае цьмянасць, незразумеласць і метафарычны сэнс зразумелы большасці чытачоў. Так, у вершы “Радзіма”, “Паэме святла” і верлібры з яе “Час шукаць Радзіму” паэт спрабуе вызначыць інгрэдыенты складанага паняцця “Радзіма”. З уласцівымі творцу медытацыямі і складанымі асацыяцыямі ў іх сцвярджаецца, што Радзіма — гэта непарыўная сувязь мінулага, сённяшняга і будучага, гэта праўдзівая гісторыя роднага краю, строгая адказнасць кожнага чалавека за лёс Айчыны, пакаянне за здзейсненыя памылкі. У творах пра гістарычных асоб (Рагнеду, Лазара Богшу, Рагнеду, Каліноўскага, Багушэвіча) паэт не імкнецца ўзнавіць факты іх біяграфіі, а спрабуе асэнсаваць іх ролю і значэнне для беларусаў. У радзе выпадкаў аўтар перадае псіхалагічны стан герояў, якія стаяць перад маральным выбарам паміж жыццём і смерцю, сваімі і чужымі: Каліноўскі памірае на шыбеніцы, Вячка гіне на полі бітвы, Рагнеда адмаўляецца ад свецкага жыцця...

Галоўны тон у паэзіі А. Разанава — гэта чуйнае, засяроджанае ўслухоўванне ў “невядомага рытму струмень, невядомай галактыкі хвалю”. Творы незвычайнага чалавека і зямныя, і касмічныя адначасова. У іх мноства зямных, прызначаных для чалавека, парад,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэкамендацый, формул-афарызмаў: “існуе знікаючы”, “раскрыжаваныя ў целе, не чуем сябе, не бачым” (“Паэма выніку”); “час будаваць, вечнасць раструшчваць пабудаванае” (“Паэма святла”); “і ўсё менш ува мне мяне і ўсё больш бязмежжа” (“Бязмежжа”).

З твораў А. Разанава паўстае сённяшні чалавек, які пакутуе ад нявырашанага пытання: “Кім я ёсць?” Ён шукае сваё імя і, незадаволены пошукамі, усклікае: “Я сам сабе не ведаю імёнаў... Я той, хто неназваны...” Паэт вучыць бачыць нябачнае, чуць нячутнае, заўважаць не толькі зямлю пад нагамі, але і далеч неба, кідаць погляд у іншыя вымярэнні, адчуваць усеабдымнасць, узаемную спалучанасць усяго існага:

І не хапае мне дня, каб усюды
паспець,
І не хапае начы, каб адусюль
вярнуцца,
І не хапае жыцця, каб жыць,
І, каб не жыць, не хапае смерці.

Алесь Разанаў — наш сучаснік, які знаходзіцца ў нязменным пошуку, гарэнні, прымушае сваіх чытачоў зірнуць на свет іншымі вачыма. Яго творы ўзбагацілі беларускую літаратуру новымі формамі і жанрамі, тэмамі, філасофскім асэнсаваннем рэчаіснасці, уменнем раскрыць у слове яго патаемныя магчымасці. Па сваіх ідэйна-эстэтычных якасцях яны адпавядаюць лепшым узорам еўрапейскага і сусветнага паэтычнага мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**121**

# ЖЫЦЦЁ ДАЕЦЦА, КАБ ЖЫЦЦЁ ТВАРЫЦЬ ... (ПА ТВОРАХ АНАТОЛЯ ВЯРЦІНСКАГА)

Анатоль Вярцінскі адзін з першых паэтаў, які па-філасофску інтэлектуальна асэнсоўвае рэчаіснасць і шматгранныя аспекты яе праяўлення. Кожная яго кніга — сведчанне таленту, глыбокага разумення сэнсу жыцця, актыўнага пошуку высокага ідэалу, гармоніі. Выкарыстоўваючы духоўны вопыт біблейскіх прытчаў, міфаў і філасофскіх канцэпцый, паэт вучыць чалавечнасці, патрабуе высокамаральнага і сумленнага стаўлення да жыцця. Сваё жыццёвае крэда А. Вярцінскі сфармуляваў так: “Для чалавека мала проста ненавідзець. Для чалавека мала проста любіць. Для чалавека мала быць проста сумленным. І проста чалавечным мала быць для чалавека. Чалавек яшчэ павінен адчуваць адказнасць за лёс другіх людзей, жыць для другіх, змагацца за агульныя інтарэсы і ідэалы”.

Творам А. Вярцінскага ўласцівы высокі грамадзянскі пафас, філасафічнасць, аналітычнасць. Паэт асэнсоўвае вечныя праблемы чалавечага існавання, маральныя каштоўнасці жыцця, услаўляе духоўную веліч чалавека, выкрывае абыякавасць і самазадаволенасць. У вершах яго можна знайсці мастацкае тлумачэнне такіх катэгорый, як дабро, праўда, шчасце, ісціна. Сапраўднае шчасце для паэта “не ружова-наіўнае, як першы веснавы цвет”, а “сурова-зімняе, што знаходзіць свой шлях у муках і баях”. Праўда — гэта тое, што “відавочна, што можна ўбачыць і ўчуць, што можна сэрцам адчуць”. А. Вярцінскі “хлуснёю называе хлусню, а мітуснёю — мітусню, нядоўгае — нядоўгім, нядобрае — нядобрым, нячыстае — нячыстым, злачыннае — злачынствам”. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

невялічкім па памеры вершы “Акіян і лужына” ён выкрывае людзей з беспадстаўнымі прэтэнзіямі, маніяй велічы.

Лірычны герой многіх твораў А. Вярцінскага — няўрымслівы “дзівак-чалавек”, які не можа змірыцца з няпраўдай, імкнецца да ўдасканалення навакольнай рэчаіснасці, не заўсёды задаволены вынікамі сваёй дзейнасці, марыць аб “цярністых шляхах з іх круцізною, з іх небяспечнай загадкаю”, хоча годна прайсці свой шлях і не здацца нягодам. Нягледзячы на жыццёвыя недарэчнасці, няўдачы і расчараванні, гэты герой паўтарае,

Што ёсць дабро на свеце,
Што будзе дабро,
Што пераможа дабро.

Памяці маці прысвяціў А. Вярцінскі паэму “Заазер’е”. З радкоў гэтага твора паўстае вобраз маці-працаўніцы, якая “была з тых, хто ў жыцці не кране птушаня”, “каго крыўдзяць, як птушку, часта”. Памерла маці — і асірацеў родны кут. Аплакваючы маці, аўтар узнімае праблему міласэрнасці, павагі да жанчыны, нагадвае сучаснікам пра святы абавязак дзяцей перад сваімі бацькамі.

Верай у перамогу дабра, гармоніі на зямлі напоўнена паэма А. Вярцінскага “Колькі лет, колькі зім!”. Грозныя буры і стыхіі, якія праляталі над планетай, стараліся прыдаць жыццю неўладкаванасць, унесці ў яго дысгармонію. Але нязменна планета рухалася па шляху абнаўлення, перамагаючы зло:

Чутна: вярнулася птушка з выраю,
песню спявае сваю ціхамірную.
Звісаюць з нябёс да ўлоння зямнога
плады залатыя жыцця... Перамога!
Перамаглі: гармонія — тлум,
добрая воля — гвалт і глум,
святло — карычневую чуму,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вясна — зіму.

Многія радкі вершаў А. Вярцінскага створаны пад уплывам вуснай народнай творчасці (асабліва прыказак і прымавак), успрымаюцца як афарызмы. Напрыклад: “Нашто бяссрэбранікам серабро — пасрэдных людзей пасрэднік”, “Не ўсе хочуць быць добрымі, ды хочуць усе дабраты”, “Расстаёмся з самімі сабою — нехта з боем, а нехта без бою”, “Самае лепшае свята на зямлі, калі яго спраўляюць двое”. Паэт, працуючы ў розных паэтычных жанрах, спрыяў сціранню ўмоўных межаў паміж імі. Ён першы ў беларускай літаратуры стварыў новы жанр прозапаэзіі, які ўяўляе з сябе своеасаблівы пераход ад вершаванай да празаічнай мовы.

У складаны час напярэдадні XXI ст. паэт, на думку А. Вярцінскага, павінен “гаварыць пра сябе як пра час і пра час — як пра сябе, гарэць у вершах усёй сваёй чалавечай сутнасцю”, садзейнічаць дасягненню кожным чалавекам “высокага неба ідэала”. Разважаючы над мінулым і сённяшнім жыццём чалавецтва, паэт у адным з вершаў зборніка “Ветрана” сцвярджае:

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць.
Маральны самы, самы натуральны
пачатак гэты вось жыццестваральны.
Інакш — якая ад жыцця карысць?
Тварыць!
Жыццё даецца, каб жыццё тварыць,
Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, —
Тварыць!

**122**

**СЛЯДЫ, ШТО ПАКІНУЎ НАВЕКІ ШЛЯХ НАШ СУРОВЫ (ПА ТВОРАХ ГЕНРЫХА ДАЛІДОВІЧА)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Толькі той край блаславенны ў Бога, дзе
шануюцца продкі і іхняе далей доўжаць
нашчадкі. Калі гэтая повязь абарваная,
дык нашчадкі няшчасцяць свой край, сябе,
сваіх дзяцей і ўнукаў, а ўрэшце выраджаюцца,
і на гэтай зямлі прарастае наноснае семя.
*Г. Далідовіч*

Г. Далідовіч вядомы ў беларускай літаратуры найперш як пісьменнік гісторыка-эпічнага мыслення, нястомны даследчык гістарычнага мінулага нашай Бацькаўшчыны. На сённяшні дзень галоўнае месца ў яго творчай біяграфіі займае трылогія, што складаецца з кніг “Гаспадар-камень”, “Пабуджаныя” і “Свой дом”. Яна прысвечана станаўленню беларускай дзяржаўнасці ў 1917 — 1919 гг. Аўтар на аснове шматлікіх дакументальных матэрыялаў змог расказаць пра тых, хто вёў барацьбу за нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне беларусаў, імкнуўся да пабудовы свайго “беларускага дома”.

У першым рамане “Гаспадар-камень” узнаўляецца жыццё вёскі і горада перад першай сусветнай вайной. У цэнтры твора — жыццё сем’яў Нямкевіча, Гарбацэвіча, братоў Чорных. Аўтар паглыбляецца ў тагачасную рэчаіснасць, выяўляе сацыяльна-псіхалагічную атмасферу тых часоў на Беларусі. Значная ўвага ўдзяляецца вясковаму побыту, сялянскай працы, народным звычаям, абрадам і традыцыям (гуканне вясны, абрадавыя песні, святкаванне сёмухі, вялікадня, купалля, заручын і інш.). На прыкладзе Алеся — старэйшага сына Нямкевіча — Г. Далідовіч спрабуе асэнсаваць ролю інтэлігенцыі ў пошуках шляхоў да пабудовы свабоднай і незалежнай Айчыны. Алесь — перадавы інтэлігент, які скончыў Нясвіжскую семінарыю, працаваў у школе, удасканальваў свой дух у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

высылках. Ён хоча абудзіць у людзях пачуццё нацыянальнай свядомасці, марыць аб тым, каб “выкрасаць у сабе і ў людскіх сэрцах іскры”.

У раманах “Пабуджаныя” і “Свой дом” пісьменнік адлюстроўвае драматызм падзей той складанай эпохі, супрацьстаянне розных сацыяльных і палітычных сіл і рухаў у пошуку шляхоў да стварэння самастойнай беларускай дзяржавы.Творы насычаны гістарычнымі падзеямі (Лютаўская рэвалюцыя, абвяшчэнне БНР, дзейнасць Беларускай сацыялістычнай грамады, утварэнне БССР, Трэці Усерасійскі з’езд і інш.). У іх дзейнічаюць як рэальныя гістарычныя асобы (Зміцер Жылуновіч, Аляксандр Чарвякоў, Язэп Дыла, Аляксандр Мяснікоў, Вільгельм Кнорын, Карл Ландэр), так і вобразы, створаныя творчай фантазіяй пісьменніка.

Апошні твор трылогіі “Свой дом” прысвечаны аднаму з самых цікавых і трагічных эпізодаў гісторыі Беларусі — стварэнню БНР і БССР. У першай яго частцы расказваецца пра намаганні беларускіх адраджэнцаў  па стварэнні незалежнай беларускай дзяржавы. Дзякуючы ўдаламу падбору фактаў і звароту да маналагічнай формы самавыражэння герояў, пісьменніку ўдалося на высокім мастацкім узроўні перадаць атмасферу таго часу,  паказаць прычыны і ўмовы, якія прывялі да разгону бальшавікамі Усебеларускага з’езду ў снежні 1917 г. і ліквідацыі БНР у канцы 1918 г. У другой частцы апісваюцца тыя падзеі, што папярэднічалі абвяшчэнню ў Смаленску БССР, і тыя людзі, якія гэтаму паспрыялі (Сталін, Мяснікоў, Жылуновіч). У гэтым творы Г. Далідовіч сутыкнуў два падыходы да пытання аб незалежнасці Беларусі: стварэнне сваёй дзяржаўнасці ўласнымі сіламі і навязванне ўяўнай самастойнасці бальшавікамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Завяршаецца трылогія аптымістычна, узнёсла: Ц. Гартны і Я. Дыла дзеляцца з Янкам Купалам навіной аб тым, што Беларусь атрымала савецкую дзяржаўную незалежнасць.

У рамане "Заходнікі" адлюстроўваецца даволі складаны час жыцця ў Заходняй Беларусі ў першыя пасляваеннныя гады. Раман "Кліч роднага звона" — пра лёсавызначальны перыяд нашай гісторыі, пра час, калі стваралася Вялікае княства Літоўскае. Цэнтральнымі дзеючымі асобамі ў ім з'яўляюцца князі Ізяслаў, Міндоўг, ваявода і пасаднік Усяслаў.

**123**

## "КРЫЖ ПАКУТАЎ І ПАМЯЦІ" (ТВОРЧАСЦЬ ВІКТАРА КАЗЬКО)

Віктар Казько адносіцца да ліку пісьменнікаў т. зв. "сярэдняга" пакалення, дзяцінства якога было апалена вайной. У полі зроку пісьменніка знаходзяцца тэма вайны і пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі, праблемы ўзаемаадносін чалавека з прыродай, даследванні дзеяння маральнага закону ў гісторыі і мн. інш.

Гады ваеннага дзяцінства пісьменніка найбольш поўна ўвасобіліся ў аповесці "Суд у Слабадзе". У ёй аўтар паказаў жорсткае аблічча вылюдкаў-вампіраў, якія ў гады вайны пераўтваралі палонных дзяцей у донараў для сваіх салдат і афіцэраў. У вобразе Колькі Лецечкі, асуджанага на павольную смерць, В. Казько паказаў неймаверныя пакуты, што выпалі на долю дзяцей вайны, дзетдомаўцаў. Суд у мястэчку Слабада над былымі паліцэйскімі — гэта сведчанне таго, што зло будзе пакарана, што ніколі не могуць сцерціся з людской памяці ўчынкі пачвараў, якія некалі шпрыцамі высмоквалі кроў з дзіцячых цел.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Героямі аповесці “Выратуй і памілуй нас, чорны бусел!” з’яўляюцца звычайныя палешукі, якія многа чаго зведалі ў сваім нялёгкім жыцці. Жывучы надзённымі клопатамі аб ежы, кураве, адзенні, яны як бы змірыліся са сваім лёсам і “бесперспектыўным” становішчам, адышлі ад грамадскай дзейнасці. Калі ж паўстала пытанне аб знішчэнні парадзелай ад шматлікіх вырубак дубровы, дзе жыў занесены ў Чырвоную кнігу чорны бусел, людзі прачнуліся. Яны нарэшце зразумелі, што іх раўнадушша, абыякавасць да навакольнага свету могуць прывесці да бездані, забыцця, самазнішчэння. Аўтар сцвярджае, што кожны чалавек павінен заняць актыўную жыццёвую пазіцыю ў адносінах да прыроды і жывёльнага свету, грамадства наогул.

Раман В. Казько “Неруш” прысвечаны Палессю, асушэнню балот. У цэнтры ўвагі пісьменніка — пытанні ўзаемаадносін чалавека і прыроды, надзённыя і актуальныя праблемы сённяшняй вёскі. Дзеянне адбываецца ў палескай вёсцы Княжбор, на вачах жыхароў якой пачалося бяздумнае асушэнне балот. Разам з меліярацыяй адбываецца знішчэнне сялянскага побыту, старажытных традыцый і звычаяў, забыццё сваёх каранёў і вытокаў.

Галоўны герой рамана — Мацвей Роўда — сумленна працуе на пасадах начальніка будаўніча-мантажнага упраўлення і старшыні калгаса, безадказна выконваючы інструкцыі і распараджэнні начальства, не дбаючы пра сістэму вадасховішчаў. Задумаўшыся аб выніках сваёй дзейнасці, Роўда зразумеў, што ён спрыяў парушэнню раўнавагі ў прыродзе і таму павінен несці адказнасць за здзейсненае. Жалезны Чалавек, яго двайнік, судзіць галоўнага героя: “Ты ўзяў зямлю ў першароднасці і квецені, без смецця і паскудства. Чыстымі былі туманы, вольнымі птушкі, пладзіліся жывёлы твае, пладаносілі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дрэвы, яшчэ Княжбор дастаўся табе ў першароднасці і першастворанасці лясоў, рэк і крыніц, верхавых і нізавых балот, але ты кінуўся, улёг перарабляць яго, муляла вока табе першастворанасць, крануў ты неруш, крануў і сябе. І цяпер ужо тваё ўласнае дзіця, машына, створаная табой жа, і шкодзіць табе ж. Хутка ты сам будзеш шкодзіць, ужо шкодзіш, ужо лішні сам сабе, імкнешся пераступіць і цераз сябе. Але я табе не дазваляю, не даю. І тваё шчасце, што ў цябе ёсць я, што пакуль яшчэ існую". Роўда прыходзіць да канчатковай высновы, што здрадзіць сваёй зямлі нельга, што неабходна змагацца за Княжбор, шукаць разумных узаемаадносін з прыродай і навакольным светам, што трэба процістаяць прагматыкам Шахраю і Рачэўскаму, якія знішчэнне прыроды апраўдваюць утылітарнымі мэтамі. Прайшоўшы праз уласны суд, Мацвей праяўляе рашучасць і смеласць: насуперак бюракратычнаму начальству і іх шматлікім інструкцыям засявае тарфянікі травамі, узрывае дамбу, каб напаіць пасевы.

Раман "Неруш" глыбока сучасны твор. Ён прасякнуты трывогай і болем за прыроду, вялізную шкоду якой наносяць паспешлівасць, неашчаднасць, няўмелае вядзенне гаспадаркі. Усім зместам кнігі аўтар пратэстуе супраць варварскіх адносін да прыроды, выступае не толькі за яе чысціню, але і чысціню чалавечых адносін, гармонію і цэласнасць чалавечай душы.

Цэментуючай асновай у рамане"Хроніка дзетдомаўскага сада", дзе спалучыліся падзеі мінулага (рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, калектывізацыі, другой сусветнай вайны, пасляваеннага аднаўлення) і сённяшні дзень, з'яўляецца сад. Калісьці яго пасадзіў Трафім Трубецкі, які верыў, што дрэвы — гэта працяг чалавечага жыцця, сувязь пакаленняў. Чалавек, на думку героя твора, жыве,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“пакуль пра яго не забыліся”: “Пасаджанае табою дрэва — гэта ты сам, гэта чалавек, працяг яго ў вяках... Людзі пра яго не забудуцца, сад будзе расці”. Аднак у гады вайны сад быў знішчаны фашыстамі. Але зноў зашапацелі маладой лістотай дрэвы сада, які пасля вайны аднавіў дырэктар дзіцячага дома Мар’ян Знавец са сваімі выхаванцамі. Клопаты пра сад аб’ядналі герояў твора, зблізілі іх духоўна. У барацьбе з Сідарам Місцюком, які на месцы сада пабудаваў сваю хату, маральную перамогу атрымалі дырэктар і яго выхаванцы. Сад для іх, як і прырода наогул, — гэта аснова чалавечага жыцця. яго будучыні.

**124**

## МЕМУАРНАЯ І ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ПРОЗА Ў СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Мемуарная проза мае ў беларускай літаратуры даўнія традыцыі. У гэты жанры напісаны дзённік Ф. Еўлашоўскага, “Дыярыуш” А. Філіповіча, “Авантуры майго жыцця” С. Пільштыновай”, “Падарожжа ў Святую Зямлю“ М. К. Радзівіла. Дакументальныя ж празаічныя творы атрымалі сваё сапраўднае развіццё толькі ў XX ст.

У апошнія гады былі створаны (у некаторых выпадках — вернуты да чытача) такія творы, як “Свой дом” Г. Далідовіча, “Без эпітафіі” Э. Ялугіна, “Сцежкамі жыцця” П. Мядзёлкі, “Споведзь” Л. Геніюш, “Зона маўчання” і “З воўчым білетам” С. Грахоўскага, “Яжовыя рукавіцы” П. Пруднікава, “У кіпцюрох ГПУ” Ф. Аляхновіча, “Аповесць для сябе” Б. Мікуліча,”Цар-зэк Сямён Івашкін” В. Хомчанкі і інш. З гэтых твораў паўстаюць падрабязнасці тых страшных падзей, высвечваюцца аблічча катаў і шматлікіх ахвяр бальшавісцкага тэрору і сталінскіх рэпрэсій.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мастацка-дакументальная аповесць Г. Далідовіча “Свой дом” прысвечана аднаму з самых цікавых і трагічных эпізодаў гісторыі Беларусі — стварэнню БНР і БССР. У першай частцы твора расказваецца пра намаганні беларускіх адраджэнцаў  па стварэнні незалежнай беларускай дзяржавы. Дзякуючы ўдаламу падбору фактаў і звароту да маналагічнай формы самавыражэння герояў, пісьменніку ўдалося на высокім мастацкім узроўні перадаць атмасферу таго часу,  паказаць прычыны і ўмовы, якія прывялі да разгону бальшавікамі Усебеларускага з’езду ў снежні 1917 г. і ліквідацыі БНР у канцы 1918 г. У другойчастцы апісваюцца тыя падзеі, што папярэднічалі ўзнікненню ў Смаленску БССР, і тыя людзі, якія гэтаму паспрыялі (Сталін, Мяснікоў, Жылуновіч). У гэтым творы Г. Далідовіч сутыкнуў два падыходы да пытання аб незалежнасці Беларусі: стварэнне сваёй дзяржаўнасці ўласнымі сіламі і навязванне ўяўнай самастойнасці бальшавікамі.

Трагічнаму лёсу беларускага пісьменніка і дзяржаўнага дзеяча, першага старшыні Беларускага ўрада Жылуновіча (Цішкі Гартнага) прысвяціў Э. Ялугін аповесць “Без эпітафіі”. У ёй расказваецца пра юнацкія гады Ц. Гартнага,  цяжкую гарбарскую працу, пра палітычную і літаратурную дзейнасць. Найбольшую ўвагу чытача прыцягваюць тыя раздзелы аповесці, дзе вядзецца гаворка аб апошніх днях жыцця героя. І гэта зразумела, бо доўгія гады абставіны смерці Ц. Гартнага старанна замоўчваліся. Твор Э. Ялугіна адметны сваім высокім псіхалагізмам і лёгкасцю выкладання матэрыялу.

У 1995 г. у часопісе “Полымя” пабачыла свет другая, раней забароненая частка ўспамінаў грамадскай і культурнай дзяячкі, першай выканаўцы ролі Паўлінкі П. Мядзёлкі. Увагу чытача адразу

ж прыцягвае шчырасць і спавядальнасць манеры выкладання. Найбольшую каштоўнасць уяўляюць тыя раздзелы мемуараў, якія апавядаюць пра сям'ю Янкі Купалы, яго ўзаемаадносіны з жонкай, пісьменнікамі і самой Паўлінай Вікенцьеўнай. Нельга абысці ўвагай радкі, прысвечаныя Т. Грыбу, П. Бадуновай, ксяндзу Адаму Станкевічу. Кніга вызначаецца катэгарычнасцю ацэнак пэўных людзей, з'яў грамадскага жыцця і гістарычных падзей. Але заўважна і тое, што П. Мядзёлка не замоўчвае нявыгадных для сябе пытанняў.

Асаблівае месца сярод мемуарных твораў займае "Споведзь" Л. Геніюш — паэтэсы, бясконца ўлюбёнай ў свой родны край, у людзей сваёй зямлі, шчыра адданай Бацькаўшчыне. Гэта кніга — споведзь душы перад Богам, сучаснікамі і нашчадкамі. Ва ўспамінах адлюстравалася драматычная рэчаіснасць Заходняй Беларусі ў часы польскай акупацыі, жыццё беларускай эміграцыі ў Празе, лёс заснавальнікаў БНР і іх паслядоўнікаў, падзеі ваеннага часу. Аўтар даверліва размаўляе з чытачом аб тых падзеях, якія ёй давялося перажыць, і пра тых людзей (ворагаў і сяброў), з якімі звёў яе лёс. Моцным лірычна-настальгічным настроем прасякнуты радкі, прысвечаныя жыццю паэтэсы ў Зэльве. Сваёй жорсткай праўдай кранаюць запісы пра дэпартацыю з Прагі, засценкі МДБ у Мінску, этапы, перасылкі, лагеры смерці на далёкай Поўначы — пра тыя 25 гадоў, што правяла яна ў сталінскіх турмах. Нягледзячы на жорсткія і бесчалавечныя ўмовы жыцця, паэтэса не стала на калені, не скарылася ў змаганні за сваю чалавечую годнасць.

У наш час вяртаюцца да чытача ўсё новыя і новыя творы дакументальна-мемуарнага характару. Яны з'яўляюцца своеасаблівымі сведчаннямі эпохі, дапамагаюць глыбей зразумець

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мінулае і вучаць праўдзіва жыць, каб жахаў той страшнай эпохі не зведалі нашы дзеці і ўнукі.

**125**

## ТЭМА РАДЗІМЫ Ў ПАЭЗІІ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ

Адзінакроўныя браты.
Адзінамоўныя паэты,
Вяртаецеся з небыцця,
Вяртаецеся з нематы,
Як злом замглёныя планеты,
Што дажылі да адкрыцця.
*Р. Барадулін*

Важнае месца ў беларускай літаратуры займае эмігранцкая паэзія. Яе творцы — людзі, якія воляй абставін у канцы мінулай вайны аказаліся ў ЗША, а таксама іншых краіных свету. Доўгі час імёны іх і творы забараняліся, не згадваліся ў друку, а самі яны абвінавачваліся ў здрадзе, лічыліся ворагамі народа. Сёння няма варожасці, недаверу, непрыязі да паэтаў-эмігрантаў, большасць якіх з гонарам вытрымала выпрабаванне лёсу, захавала вернасць Бацькаўшчыне, беларускаму слову і роднай песні. Анталогіяй паэзіі беларускай эміграцыі з’яўляецца кніга “Туга па Радзіме”, у якой змешчаны творы Наталлі Арсенневай, Масея Сяднёва, Алеся Салаўя, Уладзіміра Клішэвіча, Рыгора Крушыны, Міхася Кавыля, Хведара Ілляшэвіча, Янкі Золака і іншых нашых суайчыннікаў.

Адным з самых яркіх прадстаўнікой беларускага паэтычнага замежжа з’яўляецца Наталля Арсеннева. Апошняя з яе кніг называецца “Між берагамі”. Вершы ў ёй, пазначаныя высокай мастацкасцю, філасофскай назіральнасцю, мінорнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

спавядальнасцю, адлюстроўваюць жыццё чалавека, адарванага прасторам і часам ад Бацькаўшчыны. Тут і тужлівыя радкі пра родны край, нараканні на лёс, які абышоўся з ёй не лепшым чынам, успаміны пра Беларусь, прызнанне ў шчырай любові да яе. Паэтэса і на чужыне ўслаўляе “ціхую і ветлую” Беларусь, у будучае якой бязмерна верыць. Аптымізмам, верай у тое, што Бог дапаможа ўсталяваць справядлівасць, прынясе адраджэнне роднаму краю, напоўнены добра вядомы многім верш “Малітва”:

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых,
над Беларуссю, ціхой і ветлай,
рассып праменне Свае хвалы...

Думамі пра Бацькаўшчыну — куточак зямлі, дзе нарадзіўся чалавек, упершыню ўбачыў свет, пазнаў першыя радасці, — прасякнуты таксама многія вершы Масея Сяднёва (аўтара зборнікаў “Ачышчэнне агнём”, “А часу больш, чым вернасць”):

Я восеняй жыву ў трывозе;
забудуся, ды зноў кране:
падпаленыя восеняй бярозы
гарыць пякучай ранай у мяне.

Пякучай ранай гараць успаміны паэта пра родную вёску Мокрае, хату з ліпінай, адвечныя курганы, бацьку, маці з яе кроснамі, сястру Дар’ю, наогул, маленства. Радзіма, якая для паэта “залацісцей усіх брам”, ніколі не можа сцерціся з памяці. “Калі я гэты бераг і абраў, не значыць, што забыў я іншы бераг...”, — прызнаецца паэт у вершы “Айчына”. Разважаючы над лёсам беларускіх эмігрантаў і іх жыццём на чужыне, М. Сяднёў задае пытанне: “Нашто ж, скажы, між Захадам і Усходам вачыма сінімі ты прарасла?” Гэта радкі з верша “Радзіма”, чытаючы якія можна

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

яскрава ўявіць чалавека, які даўно адарваўся ад бацькоўскай зямлі, але ўвесь час жыве думамі аб ёй.

Большую частку свайго жыцця пражыў у Аўстраліі і Алесь Салавей (Альфрэд Радзюк). Творчасць яго пранізана шчымлівым болем за Радзіму, якая ўмяшчала ў сябе роднае Крысава на Дзяржыншчыне, званы Святой Сафіі, знаёмыя з дзяцінства Стажары, назаўсёды страчанае каханне, і “лясы, і лугі, і блакітныя нівы, неба — вечная сінь, дол — зяленіва шоўк”... Любоў да далёкай, недасяжнай Радзімы для лірычнага героя верша “Ты” — гэта пакуты, расчараванні, сумленні і ў той жа час адзіная ўмова жыцця, яго надзея, спадзяванне:

За любоў да Цябе я пакутаваць мушу,
а ў разлуцы з Табой — існаваць, а не жыць...

Вобраз Радзімы ў паэзіі У. Клішэвіча (“Сняцца сны мне залатыя”), Р. Крушыны (“Дорогі”, “Сны і мары”), М. Кавыля (“Першая рана”, “Міжагнёўе”), Я. Золака (“Мая Беларусь”, “Маці мая — Беларусь”) — гэта перш за ўсё бацькоўская зямля, якая ў кожным творы атрымлівае канкрэтнае ўвасабленне. Гэта васількі на родных палетках, восень з кастрыцай, вясновы бурлівы разліў, пахілы крыж над магілай дзеда, родная мова — “аксаміт жаўруковае песні”, маці з лучынаю ў хаце, шчырая вера, Каліноўскі, Скарына, Багушэвіч, Купала... Усведамляючы сябе часткай Баларусі, Янка Золак прызнаецца:

Белая, светлая, чыстая,
Мой галасісты жаўрук!
Ты — мая доля вячыстая,
Маці мая — Беларусь.

Тэма Радзімы, такім чынам, займае галоўнае месца ў творчасці паэтаў беларускага замежжа. Знаходзячыся далёка ад бацькоўскага

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дома, паэты-эмігранты не схілялі па-халопску галоў ні перад чужынцамі, ні перад заўзятымі адрачэнцамі. Яны былі сапраўднымі сынамі свайго народа, услаўлялі родную Беларусь, верылі ў яе адраджэнне, паводзіля сябе, як справядліва зазначае А. Каўка, мужна, па-рыцарску, “пакутуючы, гоячы, насколькі стае паэтычнага дару, раны маці-Радзімы, баронячы яе чалавечы, нацыянальны гонар”.

## 126

## ТВОРЧЫ ШЛЯХ НАТАЛЛІ АРСЕННЕВАЙ

Дзіўна песні Твае расцвітаюць далёка зузор’ямі,
над другімі палямі яны сіратліва мігцяць,
і таму яны, пэўна, над роднымі сёння разорамі
асыпаюцца
золатам восені,
асыпаюцца шумам трысця...

*М. Танк*

Доўгім і нялёгкім быў жыццёвы шлях Наталлі Арсенневай. І ўсе свае пачуцці, думкі, мары, уражанні і настроі сабрала яна, як самотныя кветкі беларускіх палёў, у чароўны паэтычны букет. І прынесла гэты дар нам, чытачам. Яна тварыла дзеля таго, каб мы верылі ў светлую будучыню сваёй краіны, каб мы заўсёды помнілі, што мы — народ.

Першы зборнік вершаў Н. Арсенневай “Пад сінім небам” выйшаў у Вільні ў 1927 г., другі зборнік “Сягоння” — у Мінску ў 1944 г. Найбольш жа поўным выданнем твораў паэтэсы з’яўляецца кніга “Між берагамі” (Нью-Йорк — Таронта, 1979).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У ранніх творах Н. Арсенневай пераважаюць пейзажныя, прыродаапісальныя матывы. У полі зроку паэтэсы аказваюцца восеньскія, вячэрнія, начныя пейзажы, сузіранне якіх выклікае ў лірычнага героя не філасофска-элегічны роздум аб хуткасці плыні жыцця, а надзею на хуткае абнаўленне прыроды, вяртанне лепшых чалавечых пачуццяў:

Хай паўзуць над зямлёю калматыя хмары,
хай цямнее рака, хай жыццё замірае,
не агорнуць  нас восені горкія мары,
кожны з нас яшчэ светлае шчасце пазнае, —
 будзем чакаць вясны!

Большасць вершаў са зборніка “Сягоння” скіравана ў бок філасофскага асэнсавання  тагачасных падзей. Вайну паэтэса ўспрымае як вялікую трагедыю еўрапейскіх народаў. Яна аднолькава шкадуе ўсіх загінуўшых: і сыноў Дняпра, і сыноў Рэйна. Не дзелячы ўдзельнікаў вайны на сваіх і чужых, пераможцаў і пераможаных, Н. Арсеннева асуджае войны і зачынальнікаў крывавых завірух. Знаходзячыся па-за палітыкай, яна шукае выйсця з трагічных абставін. “Ой, калі ж высахне кроў, знойдзецца нейкае выйсце?” — задае ўсхвалявана-рытарычнае пытанне лірычны герой верша “Калі”. У гэты час у душы паэткі зліліся два процілеглыя пачуцці: вера ў адраджэнне нацыі і адначасова прадчуванне трагедыі народа.

Вершы кнігі “Між берагамі” пазначаны высокай мастацкасцю, філасофскай назіральнасцю, мінорнай спавядальнасцю. Яны адлюстроўваюць жыццё чалавека, адарванага прасторам і часам ад Бацькаўшчыны. Тут і тужлівыя радкі пра родны край, нараканні на лёс, які абышоўся з ёй не лепшым чынам, успаміны пра Беларусь, прызнанне ў шчырай любові да яе:

Не цалавала рук

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нікому я ў жыцці,
Табе ж,
мая зямля,
Я цалавала б ногі...

Паэтэса і на чужыне ўслаўляе “ціхую і ветлую” Беларусь, у будучае якой бязмерна верыць. У вершах “Не астыць нас”, “25 сакавіка”, “Прадмова да ненапісанае паэмы”, “А мне сніцца”, “На Слуцкія ўгодкі” ўзнаўляюцца старонкі гістарычнага мінулага Айчыны: Грундвальдская бітва, паўстанне К. Каліноўскага, бітва пад Оршай, Слуцкае ўзброенае паўстанне. Аптымізмам, верай у тое, што Бог дапаможа ўсталяваць справядлівасць, прынясе адраджэнне роднаму краю, напоўнены верш “Малітва”:

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых,
над Беларуссю, ціхой і ветлай,
рассып праменне Свае хвалы...
Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот:
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
краіну нашу і наш народ!

Праграмны верш “Між берагамі”, напісаны ў 1971 г. у Рочэстэры, напоўнены мужным болем, усведамленнем таго, што паэтэса выстаяла, не здрадзіла свайму народу і суровай праўдзе тагачасных абставін:

А я б — яшчэ плыла, няхай між берагамі
каменне, і віры, і дна глыбінны жвір...
Ці раз параненая імі да крыві,
не паддалася ўсё ж, не пала я ў змаганні.

Паэзія Наталлі Арсенневай, прасякнутая бязмежнай любоўю да Радзімы, пранізаная шчымлівым болем за страчаную Бацькаўшчыну, вучыць нас быць мужнымі ў часы суровых

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выпрабаванняў, з высокай чалавечай годнасцю выходзіць з самых складаных жыццёвых абставін, любіць і шанаваць Айчыну, нязменна верыць у яе адраджэнне.

**127**

## "ПАКУЛЬ ЗЯМЛЯ ТВАЯ ЖВАЯ, І ТЫ — ЖЫВЫ" (ТВОРЧАСЦЬ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА)

Яшчэ не скончана дарога
І хочаш думаць аб зямным.
Не пакідай мяне, трывога,
Будзь спадарожнікам маім.
*А. Пысін*

У творчасці Аляксея Пысіна найбольш выразна выявіліся пачуцці, думкі і перажыванні салдата Вялікай Айчыннай вайны, які прайшоў праз пекла франтавых дарог і сучаснае жыццё вызначае мерай ваеннага часу — высокай чалавечай годнасцю, цвёрдасцю маральных прынцыпаў, праўдзівасцю, сумленнасцю, адказнасцю, строгай патрабавальнасцю да сябе. Трывалая памяць вайны, дзе спалучыліся франтавыя дарогі, бліндажы, партызанскія вогнішчы, баі, акружэнні, атакі, прысутнічае ў вершах "Сны", "На суровым сваім рубяжы...", "Байцам не сняцца пантэоны...", "Іван-чай", "Пяць патронаў у абойме...", "Балада пра каску", "Адыходзяць далей батальёны..." і інш.

Шчымлівым болем па загінуўшых баявых сябрах прасякнуты верш-элегія "Іван-чай". Як жывыя, праходзяць перад вачыма былога франтавіка "Аляксеі, Віктары, Іваны...", што палеглі пад вёскай Будай на Смаленшчыне. У вершы паэт выкарыстоўвае фальклорна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

казачны сюжэт, па якім загінуўшы чалавек ажывае, прабіваецца з-пад зямлі раслінай або кветкай:

Узышлі травой і гарыцветам,
Узышлі на радасць ці жальбу?
Вунь стаіць Іван па-над кюветам,
Галавойківае: “Вось жыву”.

Лірычны герой вядзе дыялог са сваімі таварышамі, якіх так не хапае яму ў сённяшнім жыцці. Рамантызаваны вобраз іван-чая ўвасабляе бяссмерце гераічных учынкаў воінаў, якія дзеля вызвалення Радзімы ахвяравалі самым дарагім — сваім жыццём.

Вайна, франтавыя ўспаміны з’яўляюцца своеасаблівым фонам многіх твораў А. Пысіна пра сучаснасць. Пра вайну паэт згадвае і ў філасофскім вершы “Акопы, ямы, дол парваны...”. У першых яго радках апісваецца зямля, на якой пасля  вайны засталіся раны — акопы, варонкі ад выбухаў бомбаў, траншэі... Па гэтых ранах лірычны герой можа беспамылкова прачытаць біяграфію краіны і народа. Аўтар, выкарыстоўваючы прыём *персаніфікацыі*, лічыць родную зямлю жывой істотай, а траву — доктарам,  які перавязвае ёй раны, выратоўвае ад смерці:

Акопы, ямы, дол парваны
Перада мной, перад табой,
Зямля травою лечыць раны,
Травой, травой.

Зямля, на думку паэта, патрабуе лячэння — абароны, аховы. І чалавек, звязаны з зямлёй тысячамі ніцяў, павінен быць яе абаронцам і ахоўнікам, бо гэтым самым ён абараняё і сваё жыццё:

Пакуль зямля твая жвая,
І ты — жывы.

Прадаўжаючы традыцыі Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, А. Пысін у многіх вершах выступае  абаронцам беларускай мовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

(“Дала мне маці гэту мову...”, “Яшчэ не скончана дарога...”, “Сабака ў моры”, “Магілёўская гаворка”). Паэт падкрэслівае мілагучнасць і хараство роднай мовы, багацце яе слоўнікавага складу, дзе словы “прапахлі сонцам і падзолам, дажджамі, сокамі раслін”, дае наказ паслядоўнікам, маладому пакаленню беражліва адносіцца да “матчынай” “вечнай” песні, праяўляць клопам і пашану да яе:

Дала мне маці гэту мову,
Каб не нямым прыйшоў у свет,
Дала мне маці гэту мову
Як спадчыну і запавет.

Пачуццём бязмернай павагі да жанчыны, яе хараства і душэўнай чысціні, рамантычнай узнёсласцю, сцвярджэннем вечнасці і бессмяротнасці кахання прасякнуты радкі інтымных вершаў “На схіле дня святла яшчэ даволі...”, “Усмешка”, “У смузе асядалі дубровы...”. Паэт акцэнтуе ўвагу на вялікую жыццёвую і стваральную сілу кахання, якое ўзвышае чалавека, робіць яго высакародным, можа загаіць самыя цяжкія раны, невідушчага зрабіць відушчым:

І я адчую, ўбачу, невідушчы,
Далонямі тваімі ўбачу я
Ў палёце ластаўку, рабіну ў пушчы,
Любоў мая.

Тэма кахання непасрэдна звязана з тэмай жанчыны-маці, якая для паэта з’яўляецца прыкладам чалавечай дабрыні, працавітасці, увасабленнем самаахвярнасці і бескарыслівасці. Асабліва кранаюць радкі верша “Светла так на могілках і суха...”, напісанага ў форме народнага плачу:

Толькі рэчанька даўно не льецца,
Можа, рэчка з ціхаю вадой
У зямлю сышла ў тое лета —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

За табою, маці, за табой.

Многія вершы А. Пысіна напоўнены філасофскім роздумам над вечнымі праблемамі жыцця, прызначэннем чалавека на зямлі, болем і адказнасцю за навакольны свет, хвалюючымі турботамі пра сённяшні дзень. Лірычны герой верша "Забыта многае ў жыцці" імкнецца спасцігнуць сэнс чалавечага жыцця, яго няспынны рух наперад. Жыта ў вершы сімвалізуе само жыццё, яго вечнасць, бессмяротнасць:

Забыта многае ў жыцці,
З дарогі змецена і змыта.
Мне ў жыта хочацца ўвайсці,
Мне вечнасцю здаецца жыта.

Герой твора адчувае бязмежнасць развіцця чалавецтва ў часе і прасторы, сваю апасродкаваную сувязь з далёкім продкам-хлебаробам, з якім яго звязвае шурпаты жытнёвы колас:

Вазьму шурпаты каласок
На чуйным провадзе саломы —
І адзавецца мне здалёк
Мой продак — сейбіт незнаёмы.

Разважаючы пра будучыню, пра пераемнасць пакаленняў, няспыннасць і вечнасць жыцця, паэт клапоціцца, каб плён нашай сённяшняй працы змаглі адчуць нашчадкі, "каб нас таксама дзесь пачулі".

Асэнсоўваючы сучаснасць ў спалучэнні з мінулым, адчуваючы дыялектыку жыцця, сцвярджаючы дабро, справядлівасць і чалавечнасць, ненавідзячы зло, прыстасавальніцтва і мяшчанства, паэт быў у няспынным руху, у вечным пошуку ісціны. "Перада мною пошукі, здзяйсненні і кіламетры сумныя няўдач", — прызнаваўся ў адным з вершаў аўтар, які заўсёды адчуваў сваю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

злітнасць з роднай зямлёй, далучанасць да ўсяго, што адбываецца ў свеце:

Прыцягненне — гэта далучэнне
Лёсаў нечых і трывог,
Засяленне светам, напаўненне
Тым, што зведаў і збярог.

**128**

**ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ І МІНУЛЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АЛЯКСЕЯ КАРПЮКА**

Асноўная тэматыка творчасці Аляксея Карпюка — заходнебеларуская рэчаіснасць, падзеі далёкай гісторыі і Вялікай Айчыннай вайны, маральна-этычныя праблемы сучаснасці.

Адным з лепшых твораў А. Карпюка з’яўляецца аповесць “Данута”. Яна прысвечана, па сведчанні самога аўтара, каханню, барацьбе і геройству. У цэнтры ўвагі пісьменніка — рамантычнае і велічнае каханне вясковага хлопца Яна Барташэвіча і генералавай дачкі Дануты.

Перад вайной Ян едзе вучыцца ў Вільню, дзе актыўна ўключаецца ў дэмакратычны рух. Выхадзец з беларускай вёскі, ён яшчэ многа ў чым закамплексаваны, абмежаваны і кансерватыўны. Таму з прадузятасцю і катэгарычнасцю ставіцца ён да палякаў, лічачы іх амаль што сваімі ворагамі. Карані гэтага — у сямейным выхаванні, жыцці ў пагранічнай вёсцы, дзе спрадвеку назіралася адчужанасць паміж касцёлам і царквой. Пераадоленню гэтага нацыянальнага табу дапамагла сустрэча з полькай-харысткай Данутай, душэўнае хараство якой, а пазней і чыстае, прыгожае каханне да яе аказаліся мацнейшымі за класавыя і нацыянальныя забабоны. Дзяўчына змагла разгледзіць пад вышыванай кашуляй

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беларускага хлопца высакародную душу і прыродны розум. Каханне да Яна нарадзіла ў Дануце пачуццё адказнасці за любімага чалавека, гатоўнасць да самаахвяравання, жаданне дапамагчы яму ў цяжкія жыццёвыя хвіліны. У гады Вялікай Айчыннай вайны яна ўключылася ў падпольны польскі рух, выратоўвала людзей, што траплялі ў фашысцкі палон, дзеля набліжэння перамогі ахвяравала сваім жыццём.

Сапраўднае каханне, такім чынам, напаўняе жыццё светам, радасцю, дапамагае жыць, змагацца і перамагаць. І ў пасляваенныя гады, калі Ян стане мужам былой радысткі Станіславы Дварэцкай, каханне да Дануты не можа загаснуць у яго душы. Яно будзе "балець", прыходзіць у снах, нагадваць пра сябе на працягу ўсяго яго далейшага жыцця.

Аповесць "Пушчанская адысея" прысвечана тэме Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар, прасочваючы ваенны шлях Алёшы Кучынскага, паказвае жорсткі рэалізм тых часоў, сапраўдную сутнасць вайны, неапраўданасць многіх чалавечых ахвяр і людскіх пакут, абвяргае ідэалагічныя схемы, скіраваныя на хутчэйшую справаздачу аб правядзенні баявой аперацыі, часам зусім нязначную і немэтазгодную.

Раман "Вершалінскі рай" створаны на аснове атэістычнага нарыса "Пярэварацень" і адлюстроўвае жыццё беларускага сялянства ў Заходняй Беларусі ў 30-я гг. У цэнтры ўвагі пісьменніка — дзейнасць вершалінскай секты Гальяша і яе кіраўніка. Гальяш — спрактыкаваны ашуканец, авантурыст, прайдзісвет, які для дасягнення сваіх карыслівых і прагматычных мэт не грэбуе ніякімі сродкамі. Ён скарыстоўвае неадукаванасць, адсталасць, прастадушнасць сялян, якія ў пошуках сродкаў збаўлення ад гора,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бяды і беднасці прымаюць за збавіцеля прапаведніка-цемрашала. Запалохваючы людзей канцом свету, спекулюючы на іх імкненні да лепшага жыцця, Гальяш змог падпарадкаваць сабе волю і душы многіх даверлівых людзей. Дзейнасць Гальяша, даводзіць нам аўтар, паразітычная і амаральная, бо пабудавана на чалавечым горы і бядзе.

У рамане “Карані” пісьменнік асэнсоўвае маральна-этычныя праблемы жыцця сучаснай вёскі і горада, разважае над духоўнымі сувязямі пакаленняў, адносінамі бацькоў і дзяцей. Галоўным героем твора з’яўляецца 75-гадовы Лаўрэн Маркевіч, удзельнік нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, сябар паэта-рэвалюцыянера Міхася Васілька. Пасля смерці жонкі ён застаўся адзін, і сыны, праявіўшы клопат і павагу да бацькі, забралі яго на сталае месцажыхарства ў горад, а хату прадалі. Адарваны ад зямлі, сялянскай працы, аднавяскоўцаў, ён адчуў сябе як дрэва, штучна перасаджанае з паўночнай паласы ў паўднёвую. Бестурботнае і бесклапотнае гарадское жыццё здалося яму божым пакараннем. Ва ўтульнай і камфартабельнай кватэры сына стары чалавек быў адзінокім, нікому не патрэбным, сам-насам са сваімі пачуццямі, думкамі, імкненнямі і трывогамі. Сыны ж, амаль поўнасцю адарваныя ад родных каранёў, страцілі здольнасць зразумець душэўны стан бацькі. Яны паглазлі ў меркантыльных інтарэсах, прымітыўных мяшчанскіх патрабаваннях да сябе і лічылі, што цёплая кватэра, сытасць, апранутасць і тэлевізар забяспечаць бацьку добрую старасць, а ім — павагу суседзяў. Цярплівы ад прыроды, Лаўрэн змог вытрымаць толькі пяць месяцаў такога райскага жыцця. Вяртаючыся ў родную вёску, ён замярзае ў полі каля могілак, і толькі праз тры месяцы быў знойдзены і пахаваны. А. Карпюк, такім чынам, ставіць актуальнае і для нашых дзён пытанне міласэрнасці,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

беражлівых адносін да старых людзей, для якіх адарванасць ад звыклага ўкладу жыцця і прымусовае перасяленне ў горад заканчваюцца трагічна.

**129**

**ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК У ТВОРАХ ВІКТАРА КАРАМАЗАВА**

Віктар Карамазаў прыйшоў у літаратуру ў другой палове 60-х гг. Асноўнай тэмай яго творчасці з'яўляецца прырода, псіхалагічныя і сацыяльныя узаемаадносіны чалавека з навакольным асяроддзем. Творы пісьменніка прасякнуты мяккім лірызмам, сцвярджэннем духоўнасці і чалавечнасці.

Раман "Пушча" — пра веліч і прыгажосцьляснога царства. Ён прасякнуты гуманістычным пафасам, думкамі аб сэнсе чалавечага жыцця, верай у добрыя справы добрых людзей. Героі твора — Міхаіл Пятровіч Валошка, Макар Курнопа, Андрэй Старапольны, дзед Гарох — зрадніліся з лесам, без яго не ўяўляюць свайго існавання. Адчуўшы грозны наступ цывілізацыі на прыроду, яны пачынаюць выступаць супраць высячэння лясоў, знішчэння флоры і фаўны, спрабуюць дапамагчы пушчы абараніцца ад практычна-бяздушных людзей тыпу дырэктара лясгаса Зімаўца, лесніка Рысева. Асабліва ўражвае сцэна, калі ляснік у зімовую сцюжу выводзіць ласіную сям'ю з месца, дзе павінна было адбыцца паляванне. Выратаванне звяроў — гэта і выратаванне надзеі на тое, што пушчу не чакае трагічны лёс.

Тэме арганічнага адзінства чалавека з бацькаўшчынай прысвечана аповесць В. Карамазава "Дзень Барыса і Глеба". Героя

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аповесці Цімафея Мурашку паклікаў вялікі горад, дзе ён загубіўся сярод чужых і незнаёмых людзей. Аднак Цімафей не пераўтварыўся ў блуднага сына, не страціў адчування сваёй прыналежнасці да малой радзімы, кроўных сувязей з роднай зямлёй.

Аповесць В. Карамазава “Краем Белага Шляху” прысвечана чарнобыльскай тэме. У ёй пісьменнік спрабуе высветліць спрадвечныя пытанні жыцця і смерці, духоўнасці і бездухоўнасці, адказнасці і безадказнасці. Галоўны герой твора — тыповы прадстаўнік забруджанай зоны, хірург Васіль Валетаў. Аб’язджаючы забруджаныя радыяцыяй месцы, ён бачыць, як пусцеюць навакольныя вёскі, паміраюць людзі. Шкадуючы вяскоўцаў, ён спрабуе іх суцешыць, абнадзеіць (нават шляхам хлусні). Але пры гэтым ён не саромееца збіраць даніну з тых, каму калісьці дапамог, і з тых, каму меркаваў дапамагчы. Характар Валетава супярэчлівы, раздвоены. Апынуўшыся ў маральным тупіку (пасля смерці першай каханай Танькі Лісавай) ён не шукае выйсця, не хоча і не можа змагацца з няпраўдай. Вытокі асабістай драмы Валетава не толькі ў мінулым жыцці, але і ў нормах жыцця сучаснага грамадства, дзе смела замоўчваецца праўда пра самую жудасную трагедыю. Хлусня ж, нават самая пышнаслоўная, прыносіць толькі шкоду.

Аповесць “Крыж на зямлі і поўня ў небе”прысвечана беларускаму  жывапісцу Бялыніцкаму-Бірулю. На першым плане ў ёй — Біруля-мастак, які праз неймаверныя пакуты (асабліва ў савецкі перыяд) змог спасцігнуць свет і дасягнуць вяршынь майстэрства.

В. Карамазаў плённа працуе на ніве беларускай прозы і застаецца верным сваёй асноўнай тэме — тэме прыроды і чалавека. Прырода, на думку аўтара, — лепшы прафесар. І хто будзе вучыцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ў гэтага прафесара, ніколі не здрадзіць сваёй зямлі, будзе адчуваць не толькі гарманічнае адзінства і злітнасць з ёй, але і адказнасць за яе будучыню.

## 130

## ВЕЧНЫ ЖУРАЎЛІНЫ КРЫК (ТВОРЧАСЦЬ АЛЕСЯ ЖУКА)

Па вобразным выражэнні Алеся Марціновіча, у сваіх творах Алесь Жук змагаецца за чалавечнасць у чалавеку. Практычна ва ўсіх яго творах, прысвечаных вёсцы, ваенным падзеям, каханню ці іншым тэмам, уздымаюцца маральна-этычныя праблемы.

Героямі ваенных апавяданняў “Гаркавы дым”, “Свята Перамогі”, “Асеннія халады”, “Каценька-Кацюша”, “Багамолка” з’яўляюцца воіны, партызаны, сувязныя, жыхары акупіраванай тэрыторыі, а таксама ветэраны вайны, нашы сучаснікі, з успамінаў якіх узнаўляюцца гады ваеннага ліхалецця.

У цэнтры аповесці “Праклятая любоў” — працавіты і гаспадарлівы селянін Ян Кулеш. Сваё жыццё ён пражыў сумленна: аддана працаваў на зямлі, ваяваў з ворагам, гадаваў дзяцей, нідзе не схітрыў, да людзей адносіўся па-людску. І вось на схіле жыцця прыйшло да яго крыху запозненае, але сапраўднае каханне. Але стаць шчаслівым герою твора не было суджана. Злыя языкі, пляткарства, дзеянні грубай і недалёкай розумам жонкі прымусілі каханую выехаць з вёскі. Ад перажыванняў у Яна абвастраецца старая кантузія, ад чаго ён аслеп. Урачы змаглі толькі часткова вярнуць яму зрок. Кулеш, такім чынам, жорстка караецца ў старасці. Аўтар не дае канкрэтнага тлумачэння прычын гэтай кары. Магчыма, за “праклятую любоў” да зямлі-карміцелькі, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

засланіла іншыя жыццёвыя праблемы і не дала магчымасці бачыць жыццё ва ўсёй яго мнагастайнасці. А чалавек павінен быць відушчым.

Тэме жыцця ў невялікіх і неперспектыўных вёсках, экалагічным праблемам прысвечаны творы А. Жука "Не забывай мяне", "Халодная птушка", "Белым снегам", "Паляванне на Апошняга Жураўля". Сярод іх асабліва вылучаецца аповесць "Паляванне на Апошняга Жураўля", якая прымушае адарвацца ад дробязнага, мімалётнага, выпадковага і задумацца над сэнсам чалавечага жыцця, яго непарыўнай еднасці з прыродай і сусветам.

Галоўны герой аповесці — былы партызан , брыгадзір Сцяпан Дзямідчык. Усё сваё жыццё ён сумленна працаваў на зямлі, "хварэючы" і за вырашчаны хлеб, і за алешнік каля вёскі, і за зайцоў, курапатак, і за сям'ю баброў. Сцяпан выступае супраць безгаспадарлівасці ў калгасе, яго турбуе выміранне роднай вёскі. З некалі вялікай вёскі засталося ўсяго 37 двароў, і толькі чатыры з іх не пенсіянерскія. "Адышлі людзі, адыходзяць і коні, кажуць, адыходзіць, вымірае і сама вёска. Вось дажывуць яны, цяперашнія старыя, і не будзе больш Альховых Крыніц", — з жалем і шчымлівым болем зазначае галоўны герой твора. У Дзямідчыка складаны, уедлівы, няўжыўчывы характар, за якім хаваецца чулая і ўзнёслая душа. Герою твора да ўсяго ёсць справа. Яго рэзкасць, непрымірымасць неабходна трактаваць як своеасаблівую рэакцыю чалавека на несправядлівасць, безгаспадарлівасць, абыякавасць жыццёвай пазіцыі многіх аднавяскоўцаў. Не даспадобы Дзямідчык і старшыні калгаса Прымачку, які ў хуткім часе расправіўся над незгаворлівым брыгадзірам, адправіўшы таго на пенсію.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзямідчык гіне ў барацьбе з браканьерамі.  Цяжка паранены, ён, так і не ачуняў на працягу трох дзён. Перад смерцю як бы ў сне праходзіць усё яго жыццё (вайна, праца ў вёсцы, каханне, сям’я), асвечанае верай у справядлівасць і чалавечнасць. Развітальны жураўліны кліч, зліты з небам, родным полем і цішынёю, як бы яднае душу Сцяпана з космасам, не дае ёй знікнуць бясследна. Аўтар аповесці ўзнімае праблему заўчаснага старэння вёсак, выступае супраць бяздумных і жорсткіх адносін да прыроды. Разам са старым пакаленнем, заўважае А. Жук, вымірае і  любоў да зямлі, сялянскай працы. Апошнія прадстаўнікі старэйшага пакалення сялян-працаўнікоў, як апошнія жураўлі, самотна і тужліва ўглядаюцца ў сённяшні дзень, заклікаюць моладзь да захавання “жураўлінай радзімы”, вяртання да вытокаў жыцця, яго першаасновы: “Прамiналі гады, не стала за палямі тых вялікіх і родных балот, і цяпер на новыя паселішчы другая пралягла жураўліная дарога. Але кожнага года прылятаці жураўлі на роднае поле, кружыліся, доўга шукалі пакінутае і забытае і потым адляталі, адляталі туды, дзе няроднае цёплае сонца... Малыя жураўлі не ведалі , не памяталі тых палёў і тае свае жураўлінае радзімы, дзе засталася душа старых жураўлёў, дзеці пачалі любіць за сваё чужое”.

Алесь Жук плённа працуе ў рэчышчы сучаснай прозы. Ён пашырыў тэматыку твораў, а таксама жанравыя магчымасці прозы. “Чорны павой”, напрыклад, з’яўляецца дэтэктыўна-прыгодніцкай аповесцю, а “Белым снегам” — кінааповесцю.

**131**

## “І ЎСІХ ПРАЦЯГАЎ Я — ПАЧАТАК” (ТВОРЧАСЦЬ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА)

Мільёны год, мільёны год

Да сонца з цемені ірвуся.

Мільёны год, мільёны год

Іду. Іду — і не спынюся.

На ніве смерці і жыцця

Мне вечна юным быць аратым,

Бо ўсіх пачаткаў я — працяг

І ўсіх працягаў я — пачатак.

*В. Зуёнак*

У абліччы Васіля Зуёнка, пісаў Р. Барадулін, ёсць адначасова “нешта і ад разважлівага хлебароба, і ад засяроджанага над праблемамі веку інтэлектуала”. Паэт піша пра ўсё, што хвалюе нашых сучаснікаў: пра родную зямлю, прыроду, экалогію, гісторыю Айчыны, мінулую вайну, каханне, жыццё і смерць, пераемнасць пакаленняў і інш. Але найперш аўтар скіроўвае свой позірк на бацькоўскі кут, “малую” Радзіму, праз малюнкі і вобразы якой паказвае жыццё ўсяго беларускага народа, прасочвае яго гістарычны лёс. З бацькоўскага дома пачынаюцца жыццёвыя дарогі паэта, усе яго “вышыні і глыбіні”:

На скрыжаванні ўсіх дарог,

Усіх вятроў, усіх эпох

Мая вякуе вёска.

Усіх надзей, усіх трывог,

Усіх смярцей і перамог

Жывуць тут адгалоскі...

Любоў да Айчыны — самае святое пачуццё, якое прыходзіць з калыскаю, “свеціцца над зямлёй мамінаю хусцінкаю”,у “сэрцы звініць трысцінкаю”:

Сяўбой і жнівом сагрэтая,

Здабытая потам, раллёй,

Душою і сэрцам апетая —

Любой да Айчыны сваёй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Яна не бывае адступнаю,
Яна — назаўжды з табой.
Яна бывае пакутнаю —
Любоў да Айчыны сваёй.
*(“Любоў да Айчыны сваёй”)*

Шчырая ўдзячнасць бацькам, вернасць бацькоўскім запаветам выказваецца ў вершы “Прыйдзі аднойчы”. Пра Вялікую Айчынную вайну, гераізм і мужнасць воінаў, лёс жанчын-салдатак і ўдоў ідзе размова ў вершах “Помнік”, “З вайны сустрэлі мацяркі сыноў”, “Гаварыла маці”, “Прапаў без вестак”. Памяць мінулай вайны нагадвае аб сабе і зараз салдацкімі пратэзамі і мыліцамі, асірацелымі матулямі, якія “між рэчаў самых дарагіх кашулю сына беражна” хаваюць.

У многіх вершах В. Зуёнак задумваецца над сэнсам, таямніцамі чалавечага жыцця, яго хуткаплыннасцю, углядваецца ў духоўны свет нашага сучасніка, шукае адказы на шматлікія пытанні чалавечага быцця і небыцця (“Як лёгка наперад глядзець”, “Пачатак”, “Змярканне”, “Непаўторнасць”). Аўтар чуйна рэагуе на змены ў грамадскім жыцці, з публіцыстычнай завостранасцю выступае супраць негатыўных з’яў у грамадстве, дэгуманізацыі (“Атамная малітва”, “Гэты час...”, “Век дваццаты — прарок ці шулер?”). У вершах “Лета трывожных дажджоў”, “Урок паўтарэння” ён асэнсоўвае вынікі і прычыны чарнобыльскай трагедыі.

Нямала вершаў прысвяціў В. Зуёнак вечнай мелодыі жыцця — каханню, дзе па-сапраўднаму выпрабоўваецца і загартоўваецца чалавек. Так, лірычны герой верша “Не бяжы, не ўцячэш ад сябе” выяўляе глыбіню, высакароднасць, прыгажосць сваіх думак і пачуццяў да каханай, бязмежную адданасць ёй:

Буду садам тваім па вясне,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Буду ў полі сцяжынкай забытай:
Перапёлка на золку засне —
Прыбягай дажынаць сваё жыта.
Буду раніцай лёгкім дымком
Над страхой тваёй віцца ў просінь,
Буду ціхім дымавіком
Сны жаданыя ў хату прыносіць.

В. Зуёнак паспяхова працуе ў жанры паэмы. У яго паэтычным цыкле “Пяцірэчча”, які складаецца з пяці паэм (“Сяліба”, “Маўчанне травы”, “Прыцягненне”, “Лукам’е”, “Падарожжа вакол двара”) знайшлі адлюстраванне многія пытанні сучаснага жыцця і гістарычнага мінулага нашага краю.

У паэме “Сяліба” аўтар уздымае праблему аховы акаляючага асяроддзя, выступае супраць бяздумнага ўмешвання чалавека ў развіццё прыроды, спробы яе пакарыць і перайначыць (вобраз Крамёнка), згадвае далёкія часы, калі буяла расліннасць, цяклі паўнаводныя рэкі, прыводзіць шматлікія легенды і паданні (пра лёс самародка Ахрэма і яго каханую, пра хцівага пана Заброцкага і інш.). Паэма “Маўчанне травы” ў многім аўтабіяграфічная. Прататыпам галоўнага героя стаў бацька паэта Васіль Захаравіч. Падзеі ў ёй адбываюцца ў вёсцы Узбор’е. На прыкладзе жыцця адной вёскі і яе жыхароў паэт раскрыў духоўна-маральную аснову народнага жыцця, праўдзіва адлюстраваў лёс беларускага сялянства на працягу XX ст. (у гады грамадзянскай вайны, калектывізацыі,  фашысцкай акупацыі, пасляваеннага аднаўленчага перыяду).  Ліра-публіцыстычная паэма “Прыцягненне” прысвечана палёту ў космас земляка паэта Уладзіміра Кавалёнка. У 12 яе раздзелах — сеансах касмічнай радыёсувязі — аўтар узгадвае родныя мясціны касманаўта, разважае над праблемамі чалавечага існавання, непарыўнай сувязі Сусвету і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

чалавека, часу і прасторы. Паэма “Лукам’е” ўзнаўляе падзеі амаль 500-гадовай даўнасці. Галоўным героем твора з’яўляецца князь Іван Лукомскі, нашчадак старажытнага роду Ізяславічаў, якому давялося адстойваць незалежнасць Лукомскага княства як ад польскіх, так і ад рускіх захопнікаў. Цэнтральным у паэме “Падарожжа вакол двара” з’яўляецца вобраз маці, усе клопаты і ўчынкі якой (здаваліся б, зусім нязначныя) прасякнуты жыццёвай мудрасцю, духоўнасцю, чалавечнасцю. Аўтар узнаўляе старонкі мінулага жыцця, закранае многія праблемы нашых сучаснікаў, выступае за беражлівыя адносіны да прыроды, змагаецца з жорсткасцю, ачарсцвеннем душ, варожымі адносінамі паміж людзьмі, верыць у неперарможнасць і вечнасць жыцця:

І на ганку мачулінскай школы
Прачытаюць праз тысячу год
Дзеці гэткія ж — купкай вясёлай:
“Мама, мова, Радзіма, народ...”

## 132

## “ЛЮБОЎ МАЯ, ТЫ ПЕСНЯ І МАРКОТА...” (ТВОРЧАСЦЬ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ)

Жыццё маё, як дзікая шыпшына,
Хоць колецца, а ўсё-такі — цвіце.
*Я. Янішчыц*

Творам Я. Янішчыц уласцівы шчырасць, апавядальнасць, страснасць. Яна прыйшла ў паэзію ў пачатку 70-х гг., заявіўшы ўсяму свету, што ў аснове ўсяго жывога на зямлі — любоў, што без яе не магчыма чалавечае існаванне:

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды.
Пачынаецца ўсё з любві —
Нават ненавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві,
А інакш і жыць немагчыма.

Скразной тэмай твораў Я. Янішчыц з'яўляецца Палессе, родная вёска, аднавяскоўцы. Невыпадкова Г. Бураўкін назваў паэтэсу "палескай ластаўкай". Каларыт родных палескіх мясцін адбіўся ў многіх вершах Я. Янішчыц. З іх можна ўявіць вёскі Велясніцы, Ягадны Хутар, рэкі Ясельду і Лану, землякоў — дзядзьку Арцёма, цётку Клаву, бабулю Паланею ("Тут", "Прыедзь у край мой ціхі", "Добры вечар, землякі!", "Апавяданне пра жытнёвы сноп", "У бабулі Паланеі", "Цётка Матрона", "Дзед Сымон"). Вершы пра маці, бацьку, сына, клопаты селяніна, яго працу, будні вёскі, прыгажосць палескай прыроды — гэта старонкі не толькі асабістай біяграфіі, але і лірычнай хронікі беларускай сям'і, гісторыі народа, Радзімы:

Свет адкрыты і босы
На радзіме маёй.
Жаўруковыя росы
І трава — зверабой...
Паясочкам — сцяжына,
Перавяслам жытло,
І Любоў, і Айчына.
Так, як зроду было.

Малая радзіма для паэтэсы — гэта любоў да Ясельды і "айчынных шляхоў", памяць пра "забытыя магілы" і "калодзеж

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзядоў”, гэта частка яе лёсу, боль і паратунак, шчасце і крыніца натхнення:

Я у птушак надвор’я пытала.
Вёў шыпшыннік са мною хаўрус.
З трох крыніц я вады паспытала —
Наталіла адна Беларусь.

Сучаснай вёсцы, справам вясковых працаўнікоў прысвечаны “Зорная паэма” і “Ягадны Хутар”. У іх уздымаюцца праблемы неперспектыўных вёсак, дзе засталіся дажываць свой век адны старыя. Моладзь жа, раз’ехаўшыся па свеце, адвучылася ад працы на зямлі, здрадзіла ёй. Паэма “Ягадны Хутар”, спалучыўшы ў сабе верш і прозу, напісана ў выглядзе лістоў ад маці, дзядзькі Арцёма, стрыечнага брата і паэтычных каментарыяў да іх. Гэта паэма з’яўляецца як бы люстэркам вясковага жыцця, у ёй адчуваецца непарыўная сувязь паэтэсы з бацькоўскай зямлёй.

Сярод твораў, прысвечаных родным і блізкім, вылучаюцца вершы пра маці (”Мама”, “Мамчына сіла”, “Ля ложка хворай маці”, “Ты вучыла мяне сеяць жыта і лён”). Яны напоўнены глыбокім роздумам пра цяжкі жаночы лёс, шчырай удзячнасцю матулі, якая стала для паэтэсы верным сябрам і дарадчыкам, настаўнікам, увасабленнем чалавечай дабрыні, высакароднасці, працавітасці:

Мама, сею не жыта я, сею не лён.
Але з лёну і жыта я словы складаю.
І калі углядаюся ў парасткі дзён —
Чую крокі твае. І свае вымяраю.

Ёсць у Я. Янішчыц і вершы пра вайну. Самая страшная навала XX ст. адгукнулася ў творах нашай сучасніцы, якая пра вайну ведае толькі з кніг і ўспамінаў старэйшых людзей. Паэтэса, ведучы дыялог з ветэранамі, людзьмі, якія прайшлі праз полымя вайны, паказвае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вялікую народную трагедыю (“Салдаткі”, “Абеліскі”, “Сустрэча на пераправе”, “Пасля вайны”).

Інтымная лірыка Я. Янішчыц з’яўляецца адной з лепшых у беларускай паэзіі. Не ўтойваючы ад чытачоў сваіх пачуццяў, паэтэса асабліва пранікнёна піша аб першым каханні, якое ўпрыгожвае і ўзвышае чалавека: “Мой боль — на вышыні святла, таму і ноччу мне світае”, — сцвярджае паэтэса. Расстанне ж з каханым успрымаецца як наканаванне лёсам : “Ні на міг, ні на век — не твая. Так і трэба, відаць, так і трэба!” Радкі інтымных твораў Я. Янішчыц выразна раскрываюць унутраны стан лірычнага героя, яго пошукі і страты, сустрэчы і расстанні, радасці і трывогі, зямную рэўнасць і высокую ўзнёсласць.

Паэзія Я. Янішчыц, выяўляючы жыццё чалавека ва ўсёй сукупнасці перажытага і адчутага, набывае філасофскае гучанне, сцвярджае высокачалавечыя адносіны паміж людзьмі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**133**

## З ГІСТОРЫЯЙ НА “ВЫ” (ГІСТАРЫЧНАЯ ТЭМА Ў ТВОРЧСЦІ УЛАДЗІМІРА АРЛОВА)

У творчасці Уладзіміра Арлова дамініруе гістарычная тэма. Са старонак многіх твораў паўстаюць патрыёты роднай зямлі, выдатныя дзеячы Беларусі, паэты, рэвалюцыянеры, якія памнажалі славу і гонар Айчыны, не шкадавалі жыцця дзеля яе росквіту. Так, аснову аповесці “Дзень, калі ўпала страла” складаюць драматычныя падзеі Полацкай дзяржавы, калі барацьбу супраць нямецкіх тэўтонаў узначаліў князь Уладзімір (Вальдэмар). Князь у творы паказаны як народны правадыр, адданы патрыёт роднай зямлі, разважлівы і

асцярожны палітык. Ён абураны паводзінамі і ўчынкамі паўночных суседзяў з Ноўгарада і Пскова, якія прымірыліся з крыжацкай навалай і адмовіліся ад сумеснага змагання з ворагам. Разлічваючы на ўласныя сілы і свой народ, Уладзімір дбайна і рупліва рыхтуецца да смяротнага бою. Адзінай мэтай князя, прагным яго жаданнем з'яўляецца вызваленне роднай Полаччыны, зямлі сваіх продкаў ад агрэсіі чужынцаў. “Невідочная страла” ў аповесці не толькі пазначае жыццёвы шлях чалавека, але і сімвалізуе пераемнасць пакаленняў, непарыўную сувязь чалавека з Бацькаўшчынай, яго адказнасць за свае дзеянні і ўчынкі перад часам, гісторыяй і будучыняй.

Апавяданне “Пішу вам у Масковію” прысвечана Лівонскай вайне, якую распачаў у 1558 г. Іван IV супраць Літвы і Беларусі, апавяданне “Пяць мужчын у леснічоўцы” — удзельнікам паўстання 1863 г. (пасля яго паражэння), аповесць “Сны імператара” — выгнанню напалеонаўскага войска з Беларусі ў 1812 г., кніга “Прысуд выканаў невядомы” — трагічнаму лёсу рэвалюцыянера-нарадавольца Ігната Грынявіцкага, які быў выканаўцам смяротнага прыгавору рускаму цару Аляксандру II.

Кнігі “Асветніца з роду Усяслава: Ефрасіння Полацкая”, “Еўфрасіння Полацкая”, ”Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны” прысвечаны жыццю і асветніцкай дзейнасці славутай Ефрасінні Полацкай. Аўтар на аснове гістарычных кніг, архіўных запісаў, навуковай літаратуры і іншага фактычнага матэрыялу раскрыў рамантычныя і драматычныя старонкі жыцця адной з самых адукаваных жанчын Еўропы XII ст., якая была “памочніца пакрыўджаным, зажураным суцяшэнне, распранутым адзенне, хворым наведванне ці, проста кажучы, — для ўсіх была ўсім”. У кнігах увага акцэнтуецца на светапоглядзе князёўны, яе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

самаадданым служэнні Бацькаўшчыне, актыўным удзеле ў адкрыцці школ, скрыпторыяў, будаўніцтве храмаў, стварэнні крыжа, грамадска-палітычным і культурным жыцці Полацкага княства.

З усіх кніг пра Ефрасінню Полацкую вылучаецца ”Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны”. Выдадзеная з падзагалоўкам “Гісторыя Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай”, яна расказвае пра стварэнне Лазарам Богшам славутага крыжа, яго драматычны лёс у мінулыя стагоддзі, загадкавае знікненне ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны, пошукі ў нас час. У кнізе змешчаны шматлікія гравюры, мініяцюры, малюнкі, фотаздымкі і іншыя ілюстрацыйныя матэрыялы. Раздзел “Адраджэнне святыні” прысвечаны творчаму подзвігу беларускага майстра Міколы Кузьміча (ураджэнца Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці), дзякуючы таленту і высокаму майстэрству якога крыж быў узноўлены. 27 снежня 1997 г. узноўленая святыня была асвечаны, а 6 снежня вернута на спрадвечнае месца — у збудаваны па заказе полацкай асветніцы Спасаўскі храм.

У аповесці “Час чумы”аўтар, абапіраючыся на гістарычныя факты і змест  паэмы “Песня пра зубра”, стварыў цікавы вобраз Міколы Гусоўскага. Пісьменнік паглыбіўся ў атмасферу  грамадскага жыцця тагачаснага Рыма, дзе фарміраваліся гуманістычныя перакананні паэта, выспявалі натхнёныя ідэі, на высокім творчым уздыме ствараліся старонкі паэмы. Поруч з Міколам Гусоўскім у аповесці дзейнічае яго сябар, мецэнат мастацтваў, дзяржаўны дзеяч Эразм Вітэліус. Нават перад тварам блізкай смерці ён не перастае турбавацца пра лёс выдатнага твора і яго стваральніка, якога называе “філосафам і географам, гісторыкам і жывапісцам,... першым паэтам Кароны і Княства”. Кранальна і хвалююча апісана сцэна развітання

Міколы Гусоўскага з гордай рымлянкай Франчэскай, якую паэт горача пакахаў. Праз узаемаадносіны Гусоўскага з іншымі персанажамі У. Арлоў змог раскрыць псіхалогію, яркую індывідуальнасць паэта, які "перадаў наступнікам непадлеглы тленню вобраз эпохі і Бацькаўшчыны". Апісваючы драматычныя часы далёкай мінуўшчыны, пісьменнік імкнецца давесці, што і сённяшняму грамадству пагражае небяспека. Аб гэтым сведчыць не толькі змест аповесці, але і словы М. Гусоўскага "Мы пад сякерай...", узятыя ў якасці эпіграфа да твора.

**134**

**СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ДРАМАТУРГІЯ (АГУЛЬНЫ АГЛЯД)**

Сучасная беларуская драматургія вызначаецца багаццем і разнастайнасцю тэматыкі, актуальнасцю праблем. Яе немагчыма ўявіць без творчасці Аляксея Дударава, Мікалая Матукоўскага, Алеся Петрашкевіча.

Вядомыя чытачу і гледачу п'есы А. Дударава "Выбар", "Вечар", "Парог", "Радавыя", "Адцуранне", "Купала" прысвечаны тэме вайны, маральна-этычным і духоўным праблемам нашых сучаснікаў, нялёгкім пошукам героямі свайго жыццёвага шляху. У п'есах М. Матукоўскага ("Мужчына, будзь мужчынам!", "Амністыя", "Мудрамер", "Бездань", "Калізей"), драматурга вострай сацыяльнай накіраванасці, бескампраміснай грамадзянскай пазіцыі, раскрываюцца надзённыя маральна-этычныя праблемы, асуджаюцца бюракратызм, чыноўніцтва, кар'ерызм, абыякавасць, узнімаюцца пытанні аховы акаляючага асяроддзя. Творам А. Петрашкевіча, аўтара п'ес "Трывога", "Соль", "Укралі кодэкс", "Мост упоперак ракі", "Напісанае застаецца", "Прарок для Айчыны", "Куды ноч,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

туды сон”, “Дагарэла свечачка да палічкі”, “Злавеснае рэха”, уласцівы публіцыстычнасць, дынамізм сюжэта, спалучэнне народнага гумару і вострай сатыры.

Час патрабуе ад сённяшніх драматургаў адлюстравання суровай праўды жыцця, стварэння праўдзівых характараў нашых сучаснікаў. Таму лейтматывам многіх п’ес з’яўляецца думка аб складанасці сучаснага жыцця, месцы і ролі ў ім чалавека. Разам з традыцыйнымі тэмамі (подзвіг у Вялікай Айчыннай вайне, мірная стваральная праца, жыццё калгаснай вёскі, маральна-этычныя праблемы) у беларускай драматургіі ўзнікаюцю новыя. І адна з іх — белыя плямы ў гісторыі беларускага народа і час змрочных рэпрэсій. У драме І. Чыгрынава “Чалавек з мядзведжым тварам” узнімаецца праблема асабістай адказнасці за лёс людзей і краіны ў змрочныя часы сталіншчыны. Былы член НКУС, член сталінскіх “троек” каецца ў злачынствах, не адмаўляючы сваёй асабістай віны.

Абвостраная цікавасць да гісторыі Бацькаўшчыны, сучаснае асэнсаванне падзей далёкага мінулага, узнаўленне жыцця і дзейнасці выдатных гістарычных асоб і гістарычных падзей характэрны для драматычных твораў У. Караткевіча (“Званы Віцебска”, “Маці ўрагану”), Э. Скобелева (“Кастусь Каліноўскі”), А. Петрашкевіча (“Напісанае застаецца”, “Прарок для Айчыны”), І. Чыгрынава (“Звон — не малітва”, “Следчая справа Вашчылы”), Р. Баравіковай (“Барбара Радзівіл”), М. Арочкі (“Судны дзень Скарыны”), У. Дзюбы (“Мікалай Судзілоўскі”), М. Арахоўскага (“Машэка”) і інш. У творах ажываюць у мастацкіх вобразах падзеі і героі беларускай гісторыі — Ізяслаў, Рагнеда, Васіль Вашчыла, Барбара Радзівіл, Скарына, Кастусь Каліноўскі, старонкі Віцебскага паўстання 1623 г., Крычаўскага паўстання 1743 — 1744 гг. і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Экалагічная тэма прадстаўлена сёння драматычнымі творамі А. Петрашкевіча (“Соль”), , М. Матукоўскага (“Бездань”), А. Дударава (“Адцуранне”) . У іх гучаць трывожныя і заклапочаныя словы аб тым, што паветра, вада і зямля — аснова ўсяго жывога на зямлі — забруджваюцца, што неабходна з выключнай адказнасцю ставіцца да ўсяго навакольнага і зрабіць кожны куточак зямлі лепшым , прыгажэйшым.

Значнае месца ў драматургіі сённяшняга дня займаюць маладыя аўтары. Вялікую папулярнасць і сцэнічнае жыццё атрымалі п’есы Уладзіміра Бутрамеева, Галіны Каржанеўскай, Уладзіміра Сауліча, Ігара Сідарука, Сяргея Кавалёва, Уладзіміра Клімовіча, Алеся Асташонка, Міколы Казачонка, Андрэя Федарэнкі, Уладзіміра Іскрыка і інш. Маладыя драматургі скіроўваюць сваю ўвагу на праблемы сучаснасці (узаемаадносіны чалавека і грамадства, асобы і ўлады, стан сістэмы педагагічнага выхавання), агульначалавечыя праблемы маралі, сумлення, чысціні душы, выкрываюць кар’ерызм, меркантылізм, карыслівасць, чэрствасць, эгаізм і іншыя людскія заганы. У творах маладых драматургаў намячаецца спроба развіцця жанру п’есы, што абумоўлена сённяшнімі патрабаваннямі да сцэнічнага твора. Так, фарс-абсурд “Галава” І. Сідарука створаны па прынцыпах тэатра абсурду, п’еса “Сабака з залатым зубам...” У. Сауліча лічыцца трагіфарсам, “Беркуты” У. Клімовіча— трагедыяй-”прыпавесцю”,”Нябесныя мігдалы” У. Іскрыка — містэрыяй (духоўнай трагедыяй).

**135**

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ (АГУЛЬНЫ АГЛЯД)

Паэзія, твой крок чуваць,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Твой стан, здаецца, бачу!..

А як цябе мне адшукаць —

Нялёгкая задача!

П. Броўка

Сучасная беларуская паэзія нараджаецца з жыцця і адлюстроўвае яго ва ўсёй складанасці і супярэчлівасці. Яна ўсё глыбей пранікае ў сутнасць чалавека, яго ўнутраны свет, паказвае адзінства яго з навакольным светам. Паэты, якія пішуць “у рытме свайго сэрца, зямлі і падзей”, імкнуцца ўвасобіць у словах, у гуках усё лепшае, што ёсць у чалавеку. Пры гэтым — у чалавеку звычайным, радавым. Яны раскрываюць яго духоўныя магчымасці, сцвярджаюць адзінства праўды, дабра і прыгажосці.

Сучасная беларуская паэзія прадстаўлена паэтамі розных пакаленняў і рознай творчай манеры. Гэта і вядомыя майстры паэтычнага радка, чыё дзяцінства было апалена Вялікай Айчыннай вайной (А. Лойка, Н. Гілевіч, А. Вярцінскі, П. Макаль, Ю. Свірка, К. Цвірка, Р. Барадулін, В. Зуёнак, Я. Сіпакоў), і пакаленне, народжанае ў цяжкія гады аднаўленчага перыяду (В. Іпатава, В. Коўтун, У. Някляеў, С. Законнікаў, Р. Баравікова, А. Разанаў, Я. Янішчыц, Л. Галубовіч), і паэты, якія адчулі боль і асалоду ад творчай працы ў 70 — 80-я гг. (А. Каско, Л. Тарасюк, І. Рубін, М. Мятліцкі, К. Жук, А. Пісьмянкоў, П. Марціновіч, Л. Дранько-Майсюк, С. Сокалаў-Воюш, А. Сыс, А. Бадак).

Тэматыка сучаснай паэзіі надзвычай шырокая і разнастайная: Радзіма, бацькоўскі дом, родная мова, гістарычнае мінулае, прырода, экалогія, чарнобыльская трагедыя, жыццё сучаснай вёскі, працоўныя будні, каханне, прызначэнне паэта і паэзіі... І гэта далёка не поўны тэматычна-праблемны абсяг сучаснай паэзіі, якая даволі разнастайная і ў жанравых адносінах. Поруч з ужо трывала

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

замацаванымі ў паэзіі вершам і паэмай сучасныя паэты шырока выкарыстоўваюць балады (эпічныя, лірычныя, драматычныя), оды (медытатыўныя, выяўленчыя, партрэтныя, сатырычныя), санеты, верлібры, элегіі, пасланні, эпіграмы, а таксама новыя, эксперыментальныя формы тыпу версэтаў, квантэм, вершаказаў, пункціраў, зномаў, што сінтэзавалі ў сабе прыватнае, індывідуальнае і агульнае, канкрэтнае  і абстрактна-паняційнае, традыцыйнае і новае.

Адной з цэнтральных тэм у сучаснай паэзіі з’яўляецца тэма Вялікай Айчыннай вайны. Боль і горыч  ад панесеных народам велізарных чалавечых страт трывожыць сумленне М. Лужаніна (“Марш несмяротнасці”), Н. Гілевіча (“Гарыць, гарыць мая Лагойшчына”, “Ты кажаш, я не ведаю вайны”), С. Гаўрусёва (“Я вырас пад гарматнымі ствaламі”, “Рэквіем”),  П. Прыходзькі (“Скрыжаванні”), П. Макаля (“Поле”), А. Вярцінскага (“Рэквіем па кожным чацвёртым”, “Дынамік”), Р. Барадуліна (“Кожны чацвёрты”, “Бацьку”),  Ю. Свіркі (“Мадонна”), Я. Янішчыц (“Абеліск”), Р. Баравіковай (“У час прагулкі з бацькам”), А. Жыгунова (“Прыходзяць да мяне штодзень...”), У. Карызны (“Бацька”). Паэты асуджаюць войны, нагадваюць аб неабходнасці паўсядзённай барацьбы за мір, забарону ядзернай зброі.

Паэтычнае асэнсаванне Радзімы, бацькоўскага дому, вяртанне памяці ў незабыўныя гады дзяцінства — пашыраны матыў паэтычных твораў А. Лойкі,  Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, Г. Пашкова, С. Законнікава, В. Коўтун, В. Аколавай, М. Мятліцкага, Л. Тарасюк і іншых майстроў слова. Мясціны дзяцінства — самыя непаўторныя і прыгожыя. Там кожнае дрэўца дыхае знаёмым водарам, у кожным спеве птушак і журчанні ручайка  ўгадваецца гучанне матчынай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

песні, і трава там больш мяккая, і неба больш высокае, і сонца, здаецца, свеціць ярчэй. Апяваючы прыгажосць роднай зямлі, паэты паказваюць гарманічную блізкасць, адзінства чалавека з навакольным светам. Спасцігаючы мнагастайнасць гэтага дзяцінства, малады паэт А. Каско піша:

Я часцінка зямлі,
і таму мне балюча,
калі нішчацца дрэвы,
высыхаюць крыніцы.
Гэты мой востры боль
крыкам жаласным кані
прылятае так часта
да сяліб з сенажацей.

У беларускай паэзіі апошняга дзесяцігоддзя поруч з тэмай прыроды трывала замацавалася чарнобыльская тэма. Адным з першых адгукнуўся на чарнобыльскую трагедыю, якую часта называюць беларускай Хірасімай, Рыгор Барадулін. У "Зажураным трыпціху" ён перадае прадчуванне чалавекам таго, што родная зямля, яе песні могуць "у радыеактыўным пыле задыхнуцца". Пазней з'явіліся творы А. Вялюгіна, М. Танка, Г. Бураўкіна, В. Зуёнка, У. Някляева, С. Законнікава, Я. Сіпакова, А. Грачанікава, М. Мятліцкага, А. Зэкава, В. Аколавай, А. Сыса, Ю. Свіркі і мн. інш.

Сённяшнія паэты спрабуюць знайсці адказы на пытанні агульначалавечай вартасці і значнасці. Яны па-новаму раскрываюць таямніцы жыцця, яго трагізм і аптымізм, яго адхіленне ад агульнапрынятых норм і гуманістычную сутнасць. Паэты нагадваюць людзям, што сучаснасць — няспынны рух вечнасці, і ў гэтым вечным руху чалавек не можа знікнуць бясследна, павінен пакінуць пасля сябе след. У рэчышчы медытатыўнай,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

інтэлектуальна-філасофскай лірыкі сёння працуюць Р. Барадулін, А. Разанаў, С. Законнікаў, П. Макаль, А. Пысін, А. Каско, Н. Мацяш, З. Дудзюк, В. Сахарчук, многія паэты маладзейшага ўзросту.

Вялікае месца ў сучаснай паэзіі займае тэма кахання. З радкоў паэтычных твораў А. Ставера (“Дзе ты маё каханне”), С. Дзяргая (“Вочы”), У. Някляева (“Залатая залатая”), А. Каско (“Мы сто гадоў назаўсёды”) і многіх іншых паэтаў можна яскрава ўявіць, адчуць і пераджыць абуджэнне першага пачуцця, калі на жыццёвай дарозе сустракаеш роднага, блізкага табе чалавека, легкадумнасць і сур’ёзнасць учынкаў закаханых, чысты і светлы ўспамін пра першую сустрэчу, боль ад расстання, разгубленасць, безнадзейнасць і адчай ад безадказнага пачуцця і інш. А. Грачанікаў у “Актавах кахання” заяўляе, што “на свеце без кахання жыцця няма — ёсць толькі існаванне”. Паэты складаюць каханню вечны гімн, услаўляюць яго як найвышэйшае выражэнне гуманнасці і высакароднасці чалавека.

Сучасная беларуская паэзія — невычэрпная крыніца духоўнага хараства. Яна вучыць высокай праўдзе і чалавечнасці, раскрывае ўнутраны свет чалавека, падымае душу народа над над будзённа-павярхоўным і дробязным. Гісторыя існавання чалавека, сацыяльнае і нацыянальнае адраджэнне, пераломныя гістарычныя моманты, мірная праца, змаганне ў гады ліхалецця, сённяшні дзень, наш сучаснік — усё гэта знайшло сваё ўвасабленне ў паэтычных радках. На поўны голас гучыць сёння зварот паэтаў да сучаснікаў з просьбаў не паддавацца звычцы, прагнуць вялікіх мэт, жыць у пульсе часу, верыць у перамогу мудрасці і духоўнасці, ажыццяўленне мары аб тым, што у будучым “будзе горад светлы і прыгожы... Там будзе многа сонца і жыцця. Там будзе Мір” (В. Коўтун).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**136**

## СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПРОЗА (АГУЛЬНЫ АГЛЯД)

Сучасная беларуская проза, з’яўляючыся своеасаблівым адбіткам часу, жыве клопатамі пра наш дзень, народны лёс, які праламляецца ў лёсе асобных людзей. Яна вызначаецца пільнай увагай да асобы чалавека і штодзённых праяў жыцця. Па-ранейшаму актуальнымі для беларускай прозы застаюцца маральна-этычныя і філасофскія праблемы, падзеі Вялікай Айчыннай вайны, пытанні гісторыі Радзімы, жыццё сённяшняй вёскі, прырода і экалогія. Разам з традыцыйнымі ў сучаснай беларускай літаратуры з’явіліся новыя тэмы, уласцівыя менавіта сённяшняму дню. Гэта перш за ўсё чарнобыльская тэма, сталінскія рэпрэсіі 30-х гг., шматлікія пытанні жыцця нашага сучасніка.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны, да якой звяртаюцца пісьменнікі як старэйшага, так і малодшага пакаленняў, стала вызначальнай для сучаснай беларускай літаратуры. Гэтай тэме прысвечаны творы, А. Савіцкага, У. Дамашэвіча, Л. Дайнекі, І. Пташнікава, В. Казько, І. Чыгрынава, А. Кулакоўскага і мн. інш. Ад імя таго пакалення, чыё юнацтва прыпала на гады ваенных выпрабаванняў, піша Аркадзь Марціновіч. Убачанае і перажытае на вайне паслужыла яму матэрыялам для раманаў “Не шукай слядоў сваіх”, “Груша на Голым Полі”, аповесці “Няхай ідзе дождж”.

У беларускай прозе нямала твораў, у якіх народ і вайна разглядаюцца праз прызму ўспрыняцця мірнага жыхара. Гэта раманы “Плач перапёлкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужынцы”І. Чыгрынава, “Тартак” І. Пташнікава, “Чужое неба” Б. Сачанкі, “У падзямеллі” М. Аўрамачыка, “Знак бяды” В. Быкава. Кніга А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка “Я з вогненнай вёскі” грунтуецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

на дакументальнай аснове. З ваенных эпізодаў, фактаў, лічбаў, фотаздымкаў, галасоў людзей, якія цудам ўратаваліся з агню, складваецца цэласны вобраз нязломнага беларускага народа. Са старонак кнігі паўстаюць маці, бацькі, дзеці, якія выжылі, каб расказаць усяму свету пра здзекі катаў-нелюдзяў, пра адну з самых трагічных старонак у гісторыі беларусаў. Дакументальнай па характары з’яўляецца і аповесць С. Алексіевіч “У вайны не жаночае аблічча”.

Для беларускай прозы не новай з’яўляецца тэма жыцця сучаснай вёскі, якая знайшла сваё адлюстраванне ў аповесцях “Ціхае лета” П. Міська, “Паляванне на Апошняга Жураўля” А. Жука, “Алімпіяда” І. Пташнікава, “Раданіца” А. Кудраўца, “Вёска” А. Федарэнкі, “Вечнасць дымоў” Л. Калодзежнага, “Палескае лета” М. Капыловіча, “Ці то грэбля, ці то гаць” В. Гардзея, рамане І. Шамякіна “Вазьму твой боль” і яго аповесці “Палеская мадонна”. Запусценне вёсак, у якіх шчырыя аратыя і сейбіты дажываюць свой век ў адзіноце, паказана ў аповесці С. Грахоўскага “А маці не спіць”. Павел Кастрыцкі — галоўны герой аповесці — адмовіўся ад маці, пакінуўшы яе без кута  і грошай. Аглядаючыся на пражытыя гады, маці ўспамінае дні калектывізацыі і раскулачвання, высылку ў Сібір бацькоў, адвечных працаўнікоў, вайну, партызанства, гібель дзяцей і мужа. Гераіня шукае сваю віну ў тым, што сын стаў эгаістам, стаў цурацца ўсяго роднага, сваёй вёскі, мовы і ўрэшце старой маці. Не змаглі, значыць, бацькі прылучыць уласных дзяцей да роднай сямейкі, навучыць іх любіць яе так, як любілі самі. Старэйшае пакаленне адчувае віну за гэта — такую думку праводзіць С. Грахоўскі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У сучаснай беларускай літаратуры пачынае замацоўвацца так званая гарадская тэматыка. У гэтым напрамку плённа працуюць Б. Сачанка (“Не на той вуліцы”, “Запіскі Занядбайлы”, “Пра аднаго паэта”, “Даволі цікавая кабета”, “Без пяці мінут прахвесар”), А. Глобус (“Слон”), У. Сцяпан (“Насланнё”), В. Гігевіч (“Доказ ад процілеглага”, “Карабель”), Г. Багданава (“Ларыкаў сад”).

Праблемам узаемаадносін чалавека з прыродай, экалагічнай тэме прысвечаны творы В. Казько, І. Пташнікава, В. Карамазава, А. Кудраўца, Х. Лялько, А. Наварыча, У. Ягоўдзіка, А. Кажадуба. У іх сцвярджаецца адзінства прыроды і людзей, неабходнасць беражлівых адносін да прыроды, узнаўляюцца складаныя праблемы сённяшняга дня, калі ідзе упартае супрацьстаянне прыроды агрэсіўнаму наступу з боку чалавека і “цывілізацыі”

У апошні час у беларускай літаратуры пачынаюць гучаць трывожныя і заклапочаныя словы аб будучым нашай прыроды, аб тым, што паветра, вада і зямля — аснова ўсяго жывога на зямлі — забруджваюцца. Атручванне прыроды звязана з безгаспадарчай дзейнасцю чалавека, якая і прывяла да самай страшнай катастрофы сучаснасці — аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Гэтай тэме прысвечаны творы І. Шамякіна (“Злая зорка”), В. Карамазава (“Краем Белага Шляху”), І. Пташнікава (“Львы”), Б. Сачанкі (“Родны кут”, “Запіскі аб радыяцыі”), В. Гігевіча “Пярэварацень” і інш.

Характэрнай асаблівасцю сучаснай прозы з’яўляецца вяртанне да мінулага Радзімы. Увагу пісьменнікаў прыцягваюць усе эпохі і перыяды жыцця народа. Адбываецца пераасэнсаванне колішніх падзей з пазіцый сучаснасці. Падзеі пачынаюць разглядацца ў кантэксце часу мінулага і сённяшняга, у сучасным інфармацыйным

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

полі. Мастацкаму ўвасабленню гістарычных падзей, асветнікам, постацям далёкай мінуўшчыны, барацьбітам за незалежнасць Бацькаўшчыны прысвечаны творы К. Тарасава, У. Арлова, А. Лойкі, В. Коўтун, В. Іпатавай, Г. Далідовіча, Р. Баравіковай, А. Карпюка, Л. Дайнекі.

Апошнія гады называюць гадамі праўды, якая стала неад'емнай часткай нашага жыцця. У літаратуры пачынаюць узнаўляцца падзеі 30-х — 50-х гг., расказваецца аб Курапатах, аб масавых ахвярах таго часу. Скалечаныя таталітарнай сістэмай лёсы пісьменнікаў і іх творчасць сёння становяцца прадметам спецыяльнага даследавання. І ўжо духоўным набыткам шырокага кола чытачоў сталі дакументальныя аповесці і апавяданні С. Грахоўскага (“Зона маўчання”, “З воўчым білетам”), П. Пруднікава (“Яжовыя рукавіцы”, “Пекла”), Ф. Аляхновіча (“У капцюрох ГПУ”), Б. Мікуліча (“Аповесць для сябе”), Я. Скрыгана (“Рубец”, “Скураное паліто”, “Узнагарода”), В. Хомчанкі (Цар-зэк Сямён Івашкін”). З іх паўстаюць падрабязнасці тых страшных падзей, высвечаюцца абліччы катаў і шматлікіх іх ахвяр. Крык збалелай душы чуецца ў творах былых вязняў і сёння, калі ўжо зарубцаваліся раны і ў дачыненні да іх вярнулася справядлівасць.

Падзеям сённяшняй рэчаіснасці, тэме “новых” людзей прысвечаны творы І. Шамякіна (“Сатанінскі тур”, “Падзенне”, “Без пакаяння”, “Выкармак”), І. Ждана (“У Маскву, па даляры”, “У Мінск, па зайцы”, “Польшча — не заграніца”), Ю. Станкевіча (“Апошні кінасеанс”), А. Наварыча (“Дзённікі Рабунькі”), У. Рубанава (“Распусная”). У іх у вострай крытычнай (часам з'едліва сатырычнай) форме адлюстроўваюцца складаныя і супярэчлівыя падзеі сучаснасці, дзе пачалі ўсталёўвацца воўчыя прынцыпы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

выжывання і ўлада долара, абясцэньвацца многія маральныя каштоўнасці, а “новымі” гаспадарамі жыцця становяцца новаспечаныя “прадпрымальнікі”.

У беларускай літаратуры пачынаюць паступова абжывацца дэтэктыўна-прыгодніцкі і фантастычны жанры. Аўтарамі такіх твораў з’яўляюцца, як правіла, маладыя пісьменнікі Алесь Асташонак, Адам Глобус, Васіль Гігевіч, Алесь Наварыч, Анатоль Казлоў, Максім Клімковіч, Андрэй Федарэнка і інш.

Сучасная беларуская проза развіваецца ў розных жанрах, вядучымі сярод якіх па-ранейшаму з’яўляюцца раман, аповесць, апавяданне. У апошні час назіраецца цікавасць да лірычных мініяцюр, абразкоў, эсэ (творы Я. Брыля, У. Арлова, Х. Лялько, А. Асташонка, В. Чаропкі). Беларускія пісьменнікі па-філасофску ацэньваюць грамадска-сацыяльныя працэсы сённяшняга дня, удумліва ўглядаюцца ў мінулае. Агульнымі для многіх твораў з’яўляюцца шырыня ахопу падзей, гуманістычны пафас, імкненне аўтараў даць праўдзівую ацэнку таму, што робіцца сёння на Зямлі.

**137**

## КОЛЬКІ ТАЛЕНТАЎ ЗВЯЛОСЯ...

Колькі талентаў звялося,
Колькі іх і дзе ляжыць
Невядомых, непрызнаных,
Неаплаканых нікім,
Толькі ў полі адспяваных
Ветру посвістам пустым!
*Я. Колас*

Шматпакутная Беларусь... Скрыжаванні дарог з усходу на захад... Скрыжаванні войнаў і рэвалюцый, дабрыні і зла,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нацыянальна-вызваленчага руху і жорсткага яго падаўлення. Калісьці Я.Колас пісаў:

Тут схадзіліся плямёны
Спрэчкі сілаю канчаць,
Каб багата адароны
Мілы край наш зваяваць.
А нас цяжка ў сэрцы раніць,
Пад прыгон узяць навек,
Нашы скарбы апаганіць,
Душу вынесці на здзек.
Каб у віры той ашукі
Знішчыць нашы ўсе сляды,
Каб не ведалі і ўнукі,
Хто такія іх дзяды.

Лагерны пыл сталінскага ГУЛАГа і радыеактыўны чарнобыльскі попел змяшаліся разам на гістарычным шляху Беларусі. І ў бездарожжы і віхуры, у акрыленасці надзей і гвалтоўным іх знішчэнні імкнуліся лепшыя сыны Беларусі да ўсталявання яе незалежнасці, да спрадвечнай мары “людзьмі звацца”. Яны любілі Айчыну самааддана, пяшчотна, як маці, як родную песню, як жыццё. Выразней адчуваючы рытм і пульс чалавечага жыцця, яны гатовы былі ахвяраваць сабой дзеля свабоднай і шчаслівай Бацькаўшчыны.

Углядваешся, нават не вельмі пільна, у гісторыю беларускай літаратуры 20—30-х гг., і болем сціскаецца сэрца. Сотні загубленых лёсаў! Выдатныя пісьменнікі і паэты раптам станавіліся “ворагамі народа”, “цемрашаламі”, “буржуазнымі нацыяналістамі”, “нацдэмамі”, “контррэвалюцыянерамі” і падвяргаюцца арыштам, здзекам, катаванням. Па фальсіфікаванай “справе” антысавецкай нацдэмаўскай арганізацыі “Саюз вызвалення Беларусі” было

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

асуджана каля 200 выдатных дзеячаў нацыянальна-вызваленчага руху. Расстраляных у Курапатах, асуджаных і вывезеных на Калыму цяжка пералічыць. “Колькі ж вас загінула, скажыце? Дзе вас пахавалі і калі?” — усклікае былы вязень сталінскага ГУЛАГа Сяргей Грахоўскі. Пад гэтымі радкамі маглі падпісацца сотні такіх жа. Гордая і непакорная Ларыса Геніюш, якая прайшла ўсе кругі пекла ГУЛАГа, успамінае:

Крывёй напоўнілі поймы рэк,
Бурліць адчаем слёз людскіх разводдзе.
Гляджу на свет. Я — лагернік, я — зэк,
Засуджаны на мукаў чвэрць стагоддзя.
Мяне драты, сабакі сцерагуць.
Дзікіх надзораў зграя нада мною,
І лоб штодня мой на прыцэл бяруць
Навучаныя забіваць канвоі.

У цяжкія часы сталінскага генацыду былі расстраляны акадэмікі Вацлаў Ластоўскі і Бранiслаў Тарашкевіч, пісьменнікі Міхась Чарот, Уладзімір Галубок, Платон Галавач, Алесь Салагуб, Алесь Дудар, Тодар Кляшторны, Анатоль Вольны, Юлій Таўбін. У 1931 г. быў сасланы ў Кіраў, а ў 1938 г. расстраляны Максім Гарэцкі. Яго раманы “Віленскія камунары” і “Камароўская хроніка” выйшлі з друку толькі пасля рэабілітацыі пісьменніка ў 1963 г. За праўдзівае адлюстраванне калектывізацыі ў рамане “Вязьмо” яго аўтар Міхась Зарэцкі быў арыштаваны і ў 1941 г. расстраляны. Амаль па тры дзесяцігоддзі правялі ў ссылках вялікія пакутнікі Уладзімір Дубоўка і Язэп Пушча. За кратамі і ў высылцы апынуліся Кузьма Чорны, Максім Лужанін, Сяргей Грахоўскі, Уладзімір Жылка, Мікола Хведаровіч, Юрка Гаўрук, Змітро Віталін.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не ўсё вядома пра апошнія гады жыцця Валерыя Маракава, Сяргея Ракіты, Уладзіміра Хадыкі, Васіля Шашалевіча, Янкі Туміловіча, Міхася Багуна, якія загінулі ў высылцы. Васіль Шашалевіч (брат Андрэя Мрыя) быў высланы ў працоўна-папраўчы лагер на Калыму. За гумарыстычную п'еску з лагернага жыцця яму прыйшлося жорстка расплаціцца. Хтосьці "падпілаваў бярозу і спусціў проста на Шашалевіча. Яна прыціснула яго да тлеючага кастра. Возчыкі пачулі гул зваленага дрэва і раздзіраючы душу крык. Падбеглі да да вогнішча. У ім гарэў прыціснуты бярозаю і патрушчаны ўчотчык... Калі, дзе і з кім яго пахавалі, ніхто не ведае і не дазнаецца ніколі. Там цяпер шуміць паўвекавы лес" (С. Грахоўскі. "Два лёсы — дзве трагедыі").

Літаратараў знішчалі не толькі фізічна. Іх творы знікалі з часопісаў, кніг, бібліятэчных фондаў. Знішчаліся рукапісы, картатэкі, дзённікі. Але пакаранне забыццём не можа быць вечным. Сёння ў літаратуру вяртаюцца забытыя імёны. У наслаеннях хлусні, замоўчвання і адмаўлення адшукваецца ядро праўды, бо, па словах У. Дубоўкі,

Жыццё закон нязломны мае:
Ніколі паўда не ўмірае.
Адно хоць зернетка малое
Ды застанецца пра былое.

Скалечаныя таталітарнай сістэмай лёсы пісьменнікаў і іх творчасць сёння становяцца прадметам спецыяльнага даследавання. І ўжо духоўным набыткам шырокага кола чытачоў сталі дакументальныя аповесці і апавяданні Сяргея Грахоўскага ("Зона маўчання", "З воўчым білетам"), Паўла Пруднікава ("Яжовыя рукавіцы", "Пекла"), Францішка Аляхновіча ("У кіпцюрох ГПУ"), Барыса Мікуліча ("Аповесць для сябе"), Яна Скрыгана ("Рубец",

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Скураное паліто”, “Узнагарода”), Васіля Хомчанкі (“Цар-зэк Сямён Івашкін”). З іх паўстаюць падрабязнасці тых страшных падзей, высвечваюцца абліччы катаў і шматлікіх іх ахвяр. Крык збалелай душы чуецца ў творах былых вязняў і сёння, калі ўжо зарубцаваліся раны і ў дачыненні да іх вярнулася справядлівасць. “Як бы ні рвануўся я сэрцам з былога, з тае праклятай Інты, памяць цяжкой, неадступнай аблогай раняць ГУЛАГаў драты”, — скажа Васіль Супрун.

Праўда пра трагічны лёс сумленных і светлых ахвяр дзікай, крывавай несправядлівасці павінна ўваскрэснуць. Яна дапаможа нашым сучаснікам у іх барацьбе за адраджэнне Бацькаўшчыны. Сённяшнім болем і памяццю пра той час аплачвае наша пакаленне ўчарашнія грахі. І гэта новае пакаленне свабодных і высакародных людзей, дай Божа, будзе варта свабоднай  Айчыны.

Магутны Божа! Ўладар сусветаў,
вялізных сонцаў і сэрц малых.
Над Беларуссю, ціхой і ветлай,
рассып праменне Свае хвалы...
Дай урадлівасць жытнёвым нівам,
учынкам нашым пашлі ўмалот.
Зрабі свабоднай, зрабі шчаслівай
краіну нашу і наш народ!
*(Н.Арсеннева. “Малітва”)*

**138**

## ТЭМА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Літаратура заўсёды адлюстроўвае жыццё ў найбольш важныя, пераломныя моманты развіцця гісторыі. Нямала твораў у беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

літаратуры прысвечана калектывізацыі. Даваенная літаратура, як правіла, сцвярджала гістарычную неабходнасць калектывізацыі, пры гэтым хаваючы ці павярхоўна паказваючы сапраўдныя эканамічныя інтарэсы сялян. Гвалт, прымусовасць, беззаконне ў правядзенні калектывізацыі і яе бесчалавечны характар тлумачыліся перагібамі і адступленнямі ад палітыкі Сталіна. Праўда, праз афіцыёзную і цэнзурна-лозунгавую літаратуру таго часу прабіваліся праўдзівыя творы, якія не толькі паказвалі трагічнасць сялянскай долі ў гады "вялікага" пералому, але і былі скіраваны супраць калектывізацыі і раскулачвання. Шмат горкай праўды аб тым часе можна знайсці ў аповесці П. Галавача "Спалох на загонах" і яго рамане "Праз гады", паэме У. Дубоўкі "Штурмуйце будучыні аванпосты!", раманах М. Зарэцкага "Вязьмо" і Л. Калюгі "Пустадомкі".

Раман М. Зарэцкага "Вязьмо" быў напісаны ў пачатку 30-х гг., калі вынікі калектывізацыі ўжо добра адчуваліся. Аўтар паказвае сапраўдную сутнасць тых падзей, узнаўляе грамадскую атмасферу 20-х гг. у вёсках Сівец і Сівалапы. Востра крытыкуючы суцэльную калектывізацыю, абараняючы інтарэсы працоўнай вёскі, М. Зарэцкі паказвае, як руйнаваліся чалавечыя лёсы, душэўна нявечыліся людзі, як стваралася атмасфера ўсеагульнага страху, падазронасці і варожасці. Тагачасныя ўлады не маглі дараваць гэтага пісьменніку. Яго "зрабілі" ворагам народа і ў 1937 г. расстралялі. Жыццём заплацілі за сваю мужнасць П. Галавач і Л. Калюга, якіх таксама расстралялі ў тым жа 1937 г. Лёс У. Дубоўкі быў больш міласцівы: пасля 28-гадовай ссылкі вялікі пакутнік змог вярнуцца на Беларусь.

Новы падыход да паказу селяніна і адлюстравання калектывізацыі пачаўся ў літаратуры 60-х і наступных гадоў. З твораў на гэту тэму перш за ўсё неабходна назваць "Палескую

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

хроніку” І. Мележа і аповесці В. Быкава “Знак бяды”, “Аблава”, “Сцюжа”.

У “Палескай хроніцы” І. Мележ паказвае спрадвечны ўклад народнага жыцця і яго перабудову ў пераломны час нацыянальнай гісторыі. Барацьбітамі за “светлае” будучае сялян у творы выступаюць Міканор, Апейка, а таксама “маленькія сталіны” Башлыкоў і Харчаў. Аўтар праўдзіва адлюстроўвае драматычнае становішча многіх сялян, якія, моцна прывязаныя да зямлі-карміцелькі, не ўспрымаюць калектывізацыі. Супраць яе выступае Васіль, але ён, бяссільны перад уладай, вымушаны аддаць зямлю. І. Мележ пераасэнсоўвае традыцыйны погляд на заможных сялян (кулакоў). Так, старога Глушака ён паказвае як руплівага, працавітага гаспадара, як ахвяру несправядлівага сацыяльнага ладу.

У аповесцях В. Быкава “Знак бяды” і “Сцюжа” даваеннае сялянскае жыццё паказана ў рэтраспектыўным плане. Сцепаніда Багацька (гераіня аповесці “Знак бяды”) — жанчына складанага лёсу. Былая парабчанка пана Яхімоўскага, яна пры савецкай уладзе атрымала кавалак зямлі, стала абжывацца на ім. Сцепаніда заўсёды верыла ў справядлівасць і перамогу дабра, была пераканана, што на чужым няшсасці сваё шчасце не пабудуеш. Таму рашуча выступіла яко супраць гвалту над людзьмі ў час правядзення калектывізацыз, супраць раскулачвання сваіх аднавяскоўцаў, збірала подпісы ў абарону старшыні Лявона (каб дапамагчы вызваліць яго з турмы, адправіла Петрака ў Мінск да Чарвякова). Але баявітасць Сцепаніды, змаганне з несправядлівасцю не змаглі паўплываць на ход падзей. Не можа яна дапамагчы і сяброўцы Анютцы, якая разам з раскулачанымі бацькамі павінна ехаць у высылку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У цэнтры аповесці “Сцюжа” — вясковы хлопец, сын простых радавых сялян Ягор Азевіч. Ён трапляе ў раённы цэнтр, дзе становіцца камсамольскім і партыйным работнікам. Удзельнічаючы ў будаўніцтве “лепшага, заможнага калгаснага жыцця”, Азевіч становіцца прыслужнікам антычалавечай сістэмы, выканаўцам любога яе загаду. Ён піша данос на свайго непасрэднага начальніка Зарубу, у час збожжанарыхтовак разбівае сялянскія жорны сваіх аднавяскоўцаў (у тым ліку і бацькоўскія) і прымушае іх падпісацца на пазыку. Вайна прымусіла Азевіча па-новаму паглядзець на сваё жыццё, дзе “чужая воля правіла свой д’ябальскі баль на людскіх касцях”. Герой аповесці пачынае адчуваць сваю віну за бальшавіцкія злачынствы, сваю адказнасць за без віны загубленых людзей, аб чым яскрава сведчыць яго страшны сон: “Кроў ліласчя з кветніка, цурчала з голых абрываў на тым ьеразе, крывавыя ручаі сцякалі ў дно і нікуды болей не цяклі, кроў сабралася там у глыбокую сажалку. І тады ён убачыў, што і ягоныя рукі ў крыві...” Адкупіцца ж за здзейсненае немагчыма, і герой твора гіне.

У аповесці “Аблава” В. Быкаў адлюстроўвае жахлівы лёс беларускага селяніна Хведара Роўбы, які стаў ахвярах сталінскай палітыкі суцэльнай калектывізацыі. Сыну вёскі, “пагарджанаму” парабку ў мінулым, “патомнаму” бяззямельцу новая ўлада выдзяляе добры кавалак панскай зямлі. Уласнымі рукамі, сваімі мазалямі нажывае рупны працаўнік дабро: будуе хату, гумно, хлеў, купляе малатарню... Але нядоўга цягнуўся для Хведара “зіхоткі” рай. Змяніўся час, і ў адзіг міг ён страціў усё, стаўшы “ворагам” народа, кулаком, “прыгнятальнікам”. Тая ж самая ўлада расправілася з Хведарам і яго сям’ёй, выселіўшы іх з наседжанага гнязда ў далёкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

край. Ідучы на катаргу, ён не разумее сваёй віны, пытае: “Завошта?” Але да канца жыцця не пачуе на гэта пытанне адказу.

Шмат пакут выпала на долю Хведара ў Котласе. На балотных прамерзлых могілках пахаваў ён сваю жонку Ганулю. Бесчалавечны парадак “спецперасяленцаў” забівае дачку Волечку. Сам ён, уцёкшы з лагера, гіне ў родных мясцінах, загнаны ў багну аднавяскоўцамі на чале з родным сынам Міколкам (партыйным кіраўніком раёна). Смерцю галоўнага героя В. Быкаў паказаў жорсткую бесчалавечнасць “раскулачвання”, цяжкі трагічны лёс пакалення людзей, якім выпала доля нарадзіцца сялянмі ў той складаны час.

Такім чынам, тэма калектывізацыі ў беларускай літаратуры не новая. Творы на гэту тэму, праўдзіва адлюстроўваючы даваеннае жыццё, паказваюць трагедыю сялянства ў часы калектывізацыі і сталіншчыны, якія растапталі ў людзей пачуццё спагадлівасці, міласэрнасці, сяброўства і ўсіх агульначалавечых маральна-этычных нормаў, знішчылі гаспадарлівых і клапатлівых працаўнікоў, ператварыўшы іх у раўнадушных і абыякавых выканаўцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**139**

## ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Адплаціць за добрае я рады,
Абавязак просты прада мной:
Закрываць ад куль і ад снарадаў
Тое, што лічу сваёй зямлёй.

*А. Сербантовіч*

Больш за 50 гадоў прайшло з дня заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Але і да гэтага часу пякучым болем адзываецца найцяжэйшая з войнаў у сэрцы кожнага чалавека. Мы не павінны забываць пра жахі вайны, смерць і пакуты мільёнаў людзей. Помніць аб вайне,

гераізме і мужнасці тых, хто змагаўся з ворагам і выратаваў ад фашысцкага нашэсця Радзіму, — гэта значыць змагацца за мір. Гэта абавязак усіх, хто жыве на зямлі. І таму тэма Вялікай Айчыннай вайны з’яўляецца адной з важнейшых у беларускай літаратуры.

Да тэмы вайны звяртаюцца пісьменнікі як старэйшага, так і малодшага пакаленняў. Ад імя таго пакалення, чыё юнацтва прыпала на гады ваенных выпрабаванняў, піша А. Марціновіч. Убачанае і перажытае на вайне паслужыла яму матэрыялам для раманаў “Не шукай слядоў сваіх”, “Груша на Голым Полі”, аповесці “Няхай ідзе дождж”. Галоўны герой рамана “Груша на Голым Полі” — буларускі юнак Ігнат Валока. Скончыўшы ваеннае вучылішча, ён становіцца камандзірам узвода супрацьтанкавых гармат. Часць, дзе ён пачынае новую службу, рыхтуецца да адпраўкі на фронт. А потым — перадавая, баі, удачы і няўдачы, горыч страт, успаміны пра родных, смерць... У заключным раздзеле рамана Ігнатаў бацька, у якога загінулі два сыны і два зяці, ставіць на папялішчы новую хату. Жыццё, на думку аўтара, нягледзячы на страты і згубы, нельга спыніць, яно прадаўжаецца.

Пачатку вайны і перыяду разгортвання партызанскага руху на Беларусі прысвечаны раманы І. Навуменкі “Сасна пры дарозе”, “Вецер у соснах”, “Сорак трэці”, “Смутак белых начэй”. Дзеянне ў іх адбываецца ў мястэчку Бацькавічы і ў навакольных вёсках. Аўтар паказвае, праз якія цяжкія, пакутлівыя выпрабаванні прайшлі Сцяпан Птах, Кардаш, Хадоська, Нічыпар, Вадэйка, якія становяцца актыўнымі барацьбітамі супраць ворага ў партызанскіх атрадах. Пісьменнік ускрывае і прычыны духоўнага падзення, здрады Басняка, Забелы, Дзяніскевіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У беларускай літаратуры нямала твораў, у якіх вайна падаецца праз успрыняцце яе мірным жыхаром. Гэта раманы “Плач перапёлкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужынцы” І. Чыгрынава, “Тартак” І. Пташнікава, “Чужое неба” Б. Сачанкі, “У падзямеллі” М. Аўрамчыка, “Знак бяды” В. Быкава. Трагедыя тут у тым, што чалавек безабаронны перад жорсткасцю, несправядлівасцю нават ва ўласным доме. Яго могуць вывезці ў чужую краіну і ператварыць у раба, прыкрыцца ім ад куль. Галгофай, месцам здзекаў і гвалту, напрыклад, стаў для герояў В. Быкава ўласны хутар. Гэтым падкрэсліваецца асабліва трагічнае становішча чалавека на вайне.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны выразна раскрывалася ў творах пра Хатынь. Гэта “Хатынская аповесць” А. Адамовіча, дакументальная кніга А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка “Я з вогненнай вёскі”. З ваенных эпізодаў, фактаў, лічбаў, фотаздымкаў, галасоў людзей, якія цудам ураталіся з агню, складваецца цэласны вобраз нязломнага беларускага народа. Са старонак аповесці “Я з вогненнай вёскі” паўстаюць маці, бацькі, дзеці, якія выжылі, каб расказаць усяму свету пра здзекі катаў-нелюдзяў. Аповесць не толькі страсны публіцыстычны дакумент, абвінавачванне фашызму, але і сцвярджэнне таго, што дарога да Хатыні не павінна зарастаць у сэрцы кожнага чалавека. Пра гэта і верш П. Панчанкі “Горкая гордасць”:

Жыта шчодрае косім,
Славім шчасця гады,
А гасцей усё возім
У Хатынь, у Хатынь.
На зямлі нашай светлай
Добра жыць і любіць.
Аб чацвёртым, чацвёртым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мы не можам забыць.

Да тэмы вайны звяртаецца А. Дудараў у п’есе “Радавыя”. Героямі яе з’яўляюцца пяць радавых салдат (Дзерваед, Бушцец, Салянік, Дугін, Лёнька Адуванчык), якія на сваіх плячах вынеслі ўвесь цяжар вайны. У кожнага з іх своё лёс, свая трагедыя. На вачах у Дзерваеда фашысты спалілі жонку і маленькага сына. Але гора не зрабіла салдата жорсткім, бязлітасным, аб чым сведчыць выпадак з хворым нямецкім хлопчыкам, якому Дзерваед аддаў свой салдацкі паёк. Бушцец, які пайшоў на вайну з-за вясельнага стала, наадварот, зрабіўся злым, помслівым, здольным застрэліць кожнага немца. Складаны лёс у Саляніка, якому вера не дазваляе страляць у людзей, забіваць іх. Па-бацькоўску адносяцца салдаты да васемнаццацігадовага Лёнькі Адуванчыка, на вачах якога фашысты забілі маці і сястрычку. Дугін, за плячыма якога разжалаванне, раненне, штрафны батальён, становіцца Героем Савецкага Саюза. На шчасце, даўняя ўзнагарода знайшла Дугіна, але, на жаль, салдат гіне ў апошні дзень вайны. П’еса “Радавыя” гучыць як рэквіем па ўсіх, хто загінуў у гады ваеннага ліхалецця.

У дакументальнай аповесці С. Алесіевіч “У вайны не жаночае аблічча” сабраны амаль дзвесце споведзяў жанчын-франтавічак, падпольшчыц і партызанак. Медыкі, сувязісткі, сапёры, лётчыцы, снайперы, стралкі, зенітчыцы, танкісты, дэсантнікі, шафёры, яны прайшлі праз усе выпрабаванні жорсткага часу. На самай страшнай вайне XX ст. жанчыне давялося стаць салдатам. Яна не толькі ратавала, перавязвала параненых, але і страляла са “снайперкі”, бамбіла, падрывала масты, хадзіла ў разведку. Жанчына забівала ворага, які з нечуванай жорсткасцю знішчаў усё жывое на сваім шляху. “Не жаночая гэта доля — забіваць”, — згодзімся мы з

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

гераіняй гэтай кнігі. Але вайна, у якой зусім не жаночы твар, прымусіла ўзяцца за зброю і жанчын. Сабраныя разам расказы жанчын малююць аблічча вайны, гучаць як сведчанні-абвінавачванні фашызму.

Пра вайну напісана шмат. Гэта аповесці В. Быкава (“Жураўліны крык”, “Трэцяя ракета”, “Альпійская балада”, “Сотнікаў”, “Абеліск”, “Воўчая зграя”, “Знак бяды”, “Сцюжа”), раманы А. Савіцкага (“Літасці не чакай”, “Памерці заўсёды паспееш”, “Зямля не раскажа”, “Верасы”, “Обаль”), апавяданні Я. Брыля (“Маці”, “Memento mori”), раман-эпапея М. Лынькова “Векапомныя дні”, пенталогія І. Шамякіна “Трывожнае шчасце”, паэма А. Куляшова “Сцяг брыгады”, шматлікія вершы сучасных беларускіх паэтаў. Усе яны аб’яднаны памяццю сэрца, моцным жаданнем уваскрэсіць бессмяротныя подзвігі салдат, партызан і падпольшчыкаў, паказаць мірных жыхароў у выпрабаваннях вайны. Кнігі пра вайну можна лічыць своеасаблівым помнікам загінуўшым. Яны вучаць нас мужнасці, адвазе, бясстрашнасці, высокай маральнасці, шчырай адданасці Айчыне, змаганню за мір і справядлівасць на ўсёй планеце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**140**

## ТЭМА КАХАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Тэма кахання — усеабдымная. Каханне ўслаўлялі і ўслаўляюць пісьменнікі ўсіх часоў і народаў. Гэта своеасаблівы вечны гімн, які ўзвышае чалавека і робіць высакародным. Гэта крыніца радасці і лепшых імкненняў чалавека, пачуццё бязмернай павагі да жанчыны, яе харaства, прывабнасці, душэўнай чысціні. Пройдземся і мы па

старонках твораў, асвечаных пачуццём радасці і трывогі, веры і нявер'я, упэўненасці і безнадзейнасці, шчырасці і горычы.

У беларускай літаратуры нямала твораў, героі якіх, праходзячы праз цяжкія выпрабаванні, захавалі на ўсё жыццё першае нясмелае юнацкае пачуццё. Хіба не можа кранаць лёс Ядвісі і Лабановіча з трылогіі "На ростанях" Я. Коласа, Ганны і Васіля з "Палескай хронікі" І. Мележа, Марысі і Каліноўскага з паэмы "Хамуціус" А. Куляшова, Сашы і Пятра з "Трывожнага шчасця" І. Шамякіна?

Увасабленнем прыгажосці, загадкавай таямніцай з'яўляецца Ядвіся з коласаўскай трылогіі "На ростанях". Яна азарыла жыццё Лабановіча, кранула яго сэрца не спазнаным дасюль пачуццём кахання. На жаль, шляхі "найлепшай, найпрыгажэйшай казкі Палесся" і Лабановіча разыходзяцца. Для героя трылогіі казка знікла, знікла таямніца, і, блукаючы па шырокіх прасторах жыцця, ён згубіў сваё першае каханне, сваё шчасце.

Няспраўджанае каханне і ў гераіні "Палескай хронікі" І. Мележа. Рэдкая прыгажуня, прывабная і сціплая дзяўчына з чулай душой, яна пяшчотна, горача і самааддана пакахала Васіля. Васіль таксама пакахаў Ганну. Здавалася, шчасце будзе бясконцым. Але ў жыцці ўсё склалася інакш. Першае каханне, трапяткое і нясмелае пачуццё, абразіў Васіль. Паверыўшы ў брыдкія плёткі, ён растаптаў усё тое прыгожае, што існавала паміж імі. І Ганна, абражаная і пакрыўджаная, насуперак свайму жаданню выходзіць замуж за Яўхіма, спадзеючыся на спрадвечнае "сцерпіцца — злюбіцца". Але не злюбілася і не сцярпелася... Васіль жа, згубіўшы сваю радасць, сваю прыгожую "рабіну", ажаніўся з багатай Маняй. Не склаўся лёс у Васіля з Ганнай, скончылася цудоўная песня кахання. Але яна ўсё

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

жыццё будзе трывожыць іх сэрцы, шчымліва нагадваючы шчаслівыя і непаўторныя дні маладосці.

Маладыя, закаханыя адзін у аднаго Саша Траянава і Пятро Шапятовіч з'яўляюцца галоўнымі героямі пенталогіі І. Шамякіна "Трывожнае шчасце". Яны праходзяць праз цяжкія выпрабаванні (падполле, фронт, партызанская барацьба, аднаўленчы перыяд) і не страчваюць велічнага, чыстага і глыбокага пачуцця, якое вытрымала суровы жыццёвы экзамен.

Тэма кахання займае значнае месца ў творчасці М. Багдановіча, Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, А. Куляшова, М. Танка, У. Караткевіча, Г. Бураўкіна, Я. Янішчыц, Р. Баравіковай і многіх іншых пісьменнікаў. Кожны з іх, раскрываючы глыбіню цудоўных чалавечых пачуццяў, услаўляе, абагаўляе сваю адзіную і непаўторную: М. Багдановіч — Вераніку, Я. Купала — Паўлінку, А. Куляшоў — Алесю.

Сімвалам кахання ў рамансе М. Багдановіча "Зорка Венера" становіцца самая яркая зорка на небасхіле — Венера. Герой твора засмучаны тым, што павінен расстацца з любай дзяўчынай. Ён абяцае, што ўсё сваё жыццё будзе помніць каханую. Пра яе будзе напамінаць і Венера, якой, безумоўна, вядома пра пакуты разлучаных сэрцаў:

Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.

П. Броўка ў невялікім па памеры і вядомым многім вершы "Пахне чабор" таксама праспяваў гімн каханню і маладосці. Вобраз дзяўчыны "ў белай іскрыстай хусцінцы" кліча і вабіць паэта, як само юнацтва, бо па-маладому ярка выяўлена разнастайная гама

пачуццяў: і ўспаміны аб даўнім, беззваротным юнацтве, і першае каханне, што апаліла душу героя, і прыгажосць чыстай душы, яе рамантычная ўзнёсласць, і юнацкая нерашучасць, і боль страты, і дакор сабе:

Час той схаваўся за дальняй гарою,
Здасца хвілінай — яна прада мною...
Выйду. Гукаю. Маўклівы прастор.
Пахне чабор.
Пахне чабор...

Лірычны герой інтымных вершаў “Гісторыя з першым каханнем”, “Фантазія”, “Раманс аб расстраляным каханні”, “Калі памірае каханне” У. Караткевіча перапоўнены светлым і трывожным пачуццём, болем ад расстання, душэўным сумам, верай у вечнае незямное каханне:

О каханне маё бясконцае,
Не ўцякай ад мяне, пашкадуй!
За табой, як за светлым сонцам,
Па штодзённай дрыгве іду.

Перагортваць старонкі твораў пра каханне можна бясконца. З радкоў гэтых твораў можна яскрава ўявіць, адчуць і перажыць абуджэнне першага пачуцця, калі на жыццёвай дарозе сустракаеш роднага, блізкага табе чалавека, легкадумнасць і сур’ёзнасць учынкаў закаханых, чысты і светлы ўспамін пра першую сустрэчу, нялёгкі боль ад расстання, разгубленасць, безнадзейнасць і адчай ад безадказнага пачуцця і інш. Паэты і пісьменнікі складаюць каханню вечны гімн, услаўляюць яго як найвышэйшае выражэнне гуманнасці і высакароднасці чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**141**

## ГІМН ЖАНЧЫНЕ-МАЦІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

У сусветнай літаратуры і мастацтве ёсць вобраз, якога не мінуў у сваёй творчасці ні адзін значны пісьменнік, мастак, скульптар, паэт. Ён авеяны самай высокай паэзіяй. Гэты вобраз — увасабленне дабрыні, самаахвярнасці, бескарыслівасці. Ён называецца кароткім, але вельмі дарагім для чалавека словам — маці.

Маці — найдаражэйшы на свеце чалавек. Ніхто не можа так горка і ціха тужыць, як маці. Ніхто не ўмее так любіць, як маці, не ўмее так цярпець і ахвяраваць сабой. І адразу ўспамінаецца старадаўняя прытча пра юнака, які ў ахвяру няўмольнай і хцівай каханцы прынёс матчына сэрца. Ён бег з ім у руках, спатыкнуўся аб камень і застагнаў. “Ой, табе ж баліць, сынок! Ідзі цішэй, дзіцятка”, — прашаптала чулае матчына сэрца. Кожная сынава драпіна адзывалася ў матчыным сэрцы нясцерпным болем, гора і няўдачы дзіцяці станавіліся яе горам і пакутамі.

Аб самаахвярнасці маці, яе гатоўнасці ў любы момант засланіць сваіх дзяцей ад бяды і небяспекі ў беларускай літаратуры створана нямала твораў, і адзін з іх — верш А. Куляшова “Маці”. У ім расказваецца аб цяжкім чаканні маці свайго сына. На шчасце, каб сын хутчэй вярнуўся, маці пасеяла зярняткі. Але яны ўпалі на камень і не ўзышлі. Дарэмна чакае маці:

Не ўзыдуць зярняты,
Бо ўпалі на камень шчарбаты.
Не першая ты
Каля камня заходзішся з жалю.
Не раз на ім сеялі, але ні разу не жалі.

І тады маці тройчы пракляла камень. Ад матчыных слёз “стаў камень зямлёю, сама ж яна каменем стала”. Толькі тады ўзышлі

зярняты і дахаты вярнуўся сын. Вось такая вялікая моц матчынай любові і вернасці.

Голас маці, на думку М. Танка, можа не толькі прымусіць жыць і змагацца, але нават вярнуць з таго свету:

Голас незнаёмага можа здзівіць,
Голас друга — на хвіліну спыніць,
Голас любай — сагрэць сонцам лета,
Голас маці — вярнуць з таго свету.
*(“Голас”)*

Праз якія толькі выпрабаванні не прайшла жанчына-маці дзеля шчасця сваіх дзяцей. Для маці, якая праводзіла на вайну сваіх сыноў, кожны салдат будзе здавацца сынам. У цэнтры апавядання Я. Брыля “Маці” — трагічны лёс сціплай і мужнай жанчыны. Шмат гора зведала яна на сваім шляху (служба парабчанкай у панскім двары, смерць мужа, трывога за двух старэйшых сыноў, якіх выгнала з хаты вайна, і малодшага Васіля). У цяжкую для іх часіну маці дала прытулак знясіленым палонным, што ўцяклі з фашысцкага лагера. А раніцай за гэты ўчынак яна расплацілася жыццём. Ідучы на смерць, маці не просіць ні літасці, ні спагады. Па твары яе цякуць слёзы крыўды за чужых маці, якія нарадзілі фашыстаў-нелюдзяў. Маці моліцца за палонных, з якімі так зрадніла яе доля, за сыноў, і за сваіх і за чужых.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аб болю і трывозе чакання, якое здаецца бязмерна доўгім, — верш М. Танка “Маці”. Старая жанчына доўгімі начамі вышывае кашулю сыну, які змагаецца ў партызанскім атрадзе. На кашулі яна тчэ закляцце:

Закляцце ад варожай кулі,
Ад лютай смерці, ад пятлі,
Ад груганоў, каб праз кашулю
Дастаць да сэрца не змаглі.

Маці верыць, што гэта кашуля ўратуе сына ад варожай кулі і ён вернецца жывым.

Пра трагічны лёс маці-паланянкі расказваецца ў паэме П. Броўкі “Голас сэрца”, якая прасякнута вялікім і бязмерным горам за маці і за ўсіх, хто загінуў у Асвенціме. У імя перамогі над фашысцкімі захопнікамі свядома ідзе на смерць Сцепаніда Багацька з аповесці В. Быкава “Знак бяды”. Дзесяткі лёсаў жанчын, кінутых у пекла вайны, сабрала ў кнізе “У вайны не жаночае аблічча” С. Алексіевіч. Са старонак гэтай кнігі паўстаюць духоўна прыгожыя, мужныя, здольныя на подзвіг простыя жанчыны, якія пакінулі сваю маладосць на палях вайны.

Без светлага вобліку маці-працаўніцы, маці-руплівіцы немагчыма ўявіць ні роднай хаты, ні самага дарагога кутка на зямлі. Маці — увасабленне і прыклад чалавечай дабрыні, высакароднасці, працавітасці. Сапраўдным гімнам маці з’яўляецца верш М. Танка “Рукі маці”. У ім — цэлы свет чалавечага жыцця з бясконцымі клопатамі і трывогамі, з бяссоннымі начамі, самаахвярнай любоўю да дзяцей. На руках маці шмат слядоў, шрамаў, якія пакінулі праца, цяжкія жыццёвыя пуцявіны і дарогі. Але калі маці пакладзе свае спрацаваныя, мазольныя рукі на стол, “быцца ад сонца, ад іх пасвятлее ў хаце і ў сэрцы”.

У творах беларускіх пісьменнікаў гучаць пранікнёныя словы ўдзячнасці маці за падараванае жыццё, за бяссонныя ночы, праведзеныя над калыскай, за дні, поўныя клопатаў і турбот, трывогі і болю, якія часам прычынялі ёй дзеці, самі таго не ўсведамляючы, за добрае сэрца і чулую душу:

Дзякуй, маці, што мне падарыла
Ты любоў да зямлі маёй роднай,
Дзе ўсміхаецца сонца так міла,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дзе бягуць хвалі рэк мнагаводных.

*(Е. Лось. “Маці”)*

Пра маці можна гаворыць бясконца. Вобраз яе не пакідае беларускіх пісьменнікаў у іх блуканнях па жыццёвых і творчых дарогах. І пакуль жыве маці, пакуль сустракае нас яе ласкавая ўсмешка, пакуль у дні поспехаў і страт ёсць каму сказаць пявучае слова “мама”, мы адчуваем сябе маладымі і дужымі, упэўненымі ў заўтрашнім дні. І таму трэба берагчы, шанаваць і любіць сваіх маці, не гора, а радасць і кветкі прыносіць ім.

**142**

**ТАБЕ СКЛАДАЮ ШЧЫРЫ СВОЙ САНЕТ, ПРАПРАДЗЕДАЎ МАІХ ЖЫВАЯ МОВА**

Як самую звонкую ў свеце
навуку,
Як ройных вякоў пчаліную
складчыну,
Прымаю па складу, па смаку,
па гуку
Мову маю матчыну!..

*П. Макаль*

Родная мова ўваходзіць у наша жыццё з вуснаў маці. Прыгожае гучанне роднага слова мы пачынаем успрымаць з матчыных песень, цудоўных беларускіх казак, легендаў, паданняў. З роднай мовай мы пакідаем бацькоўскі парог, адпраўляючыся ў далёкія вандраванні. І пачуццё роднай зямлі, якое неяк губляецца, калі ты жывеш на ёй, асабліва абвастраецца, калі апынаешся дзесьці далёка. Тады ўспамінаецца кожны куток роднай зямлі, яе людзі, асабліва мілагучнай становіцца мова.

Мова продкаў нашых і нашчадкаў —

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Шэпт дубровы і пчаліны звон, —
Нам цябе ласкава і ашчадна
Спазнаваць ажно да скону дзён.
Па чужых краях не пабіраецца,
Не аддаць цябе на забыццё,
Наша невычэрпнае багацце,
Наша несмяротнае жыццё.

Гэтыя цудоўныя радкі Г. Бураўкіна гавораць аб цяжкім і складаным шляху, які прайшла беларуская мова, пакуль “выйшла на волю, як кветка красы”. Перыяд росквіту яе выпаў на час Рэнесансу: у Вялікім княстве Літоўскім яна выконвала функцыю дзяржаўнай мовы. На ёй выпрацоўваліся заканадаўчыя кодэксы і акты, яна гучала ў замкавых і земскіх судах, у гарадскіх магістратах і магдэбургіях, каралеўскіх канцылярыях. На беларускай мове намаганнямі Ф. Скарыны, В. Цяпінскага, С. Буднага загучалі многія кнігі Бібліі.

Мяняецца час, і ў новых гістарычных умовах сярэдзіны XVII ст. беларуская мова прыходзіць у заняпад. Сейм Рэчы Паспалітай, а пазней царскі ўрад забаранілі беларускаму народу карыстацца роднай мовай. Больш за два стагоддзі адбіралі ў беларусаў іх мову: то цалкам, то па сказе, па слове, па гуку. І рэдкім госцем пачала заходзіць у хаты матчына мова. Выгналі яе і са школ.

У XIX ст. адраджаюцца многія славянскія народы і іх мовы. У гэты час фарміруецца новая беларуская літаратура, якая пракладвала сабе дарогу перш за ўсё праз паэтычныя творы Я. Чачота, А. Рыпінскага, Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, А. Гурыновіча. Паэты пакінулі нам не толькі ўзоры выкарыстання слова, але і сваё разуменне значэння мовы ў жыцці грамадства. Яны памагалі выжыць роднаму слову, адстойвалі яго права на існаванне. Так, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прадмове да зборніка “Дудка беларуская” Ф. Багушэвіч падкрэслівае спрадвечнасць “нашай бацькавай мовы”, яна “такая ж людская і панская, як французская, альбо нямецкая, альбо і іншая якая”. Ён заклікае шанаваць, не пакідаць нашай мовы беларускай, каб не памерці. Шкада толькі, што шлях слоў Ф. Багушэвіча да сэрцаў нашых людзей аказаўся  занадта доўгім.

Лагічны працяг думак Ф. Багушэвіча гучыць у радках паэтаў і пісьменнікаў пачатку XX ст. Верай і надзеяй на адраджэнне роднай мовы прасякнута творчасць Цёткі,  Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча. Песняры, голас і думкі якіх былі непадзельна звязаны з беларускай зямлёй, мужна адстойвалі права беларусаў на карыстанне роднай мовай. Так, Цётка ў артыкуле “Шануйце роднае слова” грунтоўна паказала ролю і месца роднай мовы ў жыцці беларускага народа. Яна сцвярджае, што мова яднае людзей, дае магчымасць зразумець адзін аднаго. Я. Купала ў вершы “Роднае слова” заклікае:

Загнанае слова, ты, роднае слова!
Грымі ж над радзімай зямлёй:
Што родная мова, хоць бедная мова,
Мілей найбагатшай чужой!

Час адраджэння беларускай мовы быў не такі ўжо працяглы. Памылковая дзяржаўная палітыка зліцця нацый і моў прывяла да заняпаду і мовы, і культуры беларусаў. Ёй прарочылі знікненне і небыццё, замену міжнацыянальнай рускай мовай. І тут нельга не ўспомніць героя п’есы Я. Купалы “Тутэйшыя” Мікіту Зноска: “Эх, каб я быў... царом! Завёў бы я... адзін непадзельны рускі язык і жыў бы сабе тады прыпяваючы”. І як адчайны пратэст супраць гэтага загучалі словы П. Панчанкі:

Кажуць, мова мая аджывае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.
Для мяне ж яна вечна жывая,
Як раса, як сляза, як зара.

Сёння абуджаецца гістарычная памяць беларусаў, адраджаецца іх мова, пачынаецца нацыянальнае ўваскрэсенне. Сёння, напэўна, няма пісьменнікаў і паэтаў, якія не выказалі б сваіх адносін да роднай мовы. У шматлікіх радках песняроў падкрэсліваецца значэнне яе ў жыцці грамадства, багацце і адметнасць, паказваецца сувязь мовы народа, культуры і гістарычнай памяці, узнімаюцца пытанні гісторыі і лёсу роднай мовы, гучаць словы ў яе абарону. Верш М. Танка “Родная мова”, напісаны ў час Вялікай Айчыннай вайны, з’яўляецца гімнам беларускай мове. Аўтар прасочвае вытокі сілы і прыгажосці беларускага слова, якое дапамагло людзям выстаяць, не страціць веры ў заўтрашні дзень:

З легендаў і казак былых пакленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор’яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, —
Ты выткана, дзіўная родная мова.

Адным з найвялікшых і найдаражэйшых скарбаў чалавека лічыць родную мову Я. Крупенька:

Слова маці! Цябе перадам я сынам.
Ты — мой скарб дарагі,
Найсвятлейшая спадчына.
За цябе, калі трэба, жыццё я аддам.
Толькі песня не моўкнула б матчына.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мова — душа народа, векавая праца многіх пакаленняў, люстэрка духоўнага жыцця і творчасці грамадства, наш галоўны нацыянальны скарб. Родная мова, як піша У. Караткевіч, — гэта “мова першай матчынай калыханкі і апошняга “бывай”, мова пажаўцелых статутаў і мова кахання”. Жыве мова — жыве народ, жыве памяць продкаў. Няма мовы — няма суцяшэння ў горы, няма слоў радасці. Ці доўга пражыве дрэва, калі ў яго абсякуць карані? Загіне дрэва. Якім жа стане чалавек, калі ў яго вырвуць зямлю з-пад ног, родную мову? Загіне чалавек. І сёння гонар і абавязак усіх нас — шанаваць родную мову, садзейнічаць яе развіццю і росквіту. Мы павінны быць не маўклівымі сведкамі часу, не суддзямі яго, а актыўнымі і дзейснымі ўдзельнікамі тых змен, якія адбываюцца зараз у нашай рэспубліцы.

**143**

## ПРЫРОДА — КРЫНІЦА ПРЫГАЖОСЦІ

Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!
Не раз, утомлены дарогай,
Жыццём вясны мае убогай,
К табе я ў думках залятаю
І там душою спачываю.
*Я.Колас*

Гэтыя пранікнёныя радкі сталі своеасаблівай формулай выражэння любові да роднага краю, бацькоўскай зямлі, бо для кожнага з нас гэта зямля — самая ласкавая і непаўторная. І дзе б мы не апынуліся пазней, у якіх цудоўных палацах-музеях не пабывалі, мы заўсёды вяртаемся на радзіму свайго дзяцінства. Гэтыя знаёмыя з маленства мясціны, дзе мы выраслі і жывём, — ёсць часцінка таго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вялікага і святога, што мы называем словамі Айчына, Бацькаўшчына.

Адвечная прыгажосць роднага краю, яго прырода апета многімі мастакамі слова, ёй прысвечаны самыя задушэўныя старонкі кніг. Асабліва многа цудоўных пейзажных замалёвак у Я. Коласа:

Малюнкі родныя і з’явы!
Як вы мне любы, як цікавы!
Як часта мілай чарадою
Вы ўстаяце перада мною!

Чытаючы “Новую зямлю”, “Сымона-музыку”, “На ростанях”, мы можам уявіць і палюбавацца ўзыходам сонца і летняй раніцай, пачуць бусліны клёкат і спеў жаўрука, пабываць на квітнеючым лузе і пясчаным беразе, пачуць шум бору, шапаценне калосся на ніве. “Прырода з людзьмі жыве супольна, згодна”, — падкрэслівае гэту думку Я. Колас. Яна то тужлівая, змрочная, як доля селяніна, то светлая і радасная, як мары чалавека, спадзяванні на лепшае будучае. Малюнкі прыроды чаргуюцца ў Я. Коласа з філасофскімі разважаннямі і важнымі абагульненнямі пра жыццё чалавека, яго лёс.

Прызнанне ў любові да роднага краю гучыць і ў вядомым вершы-рамансе К. Буйло “Люблю”. Радкі яго, эмацыянальныя, узвышаныя, кранаюць душу:

Люблю наш край — старонку гэту,
Дзе я радзілася, расла,
Дзе першы раз пазнала шчасце,
Слязу нядолі праліла.

Зачараваным царствам паказвае родную прыроду М.Багдановіч. У такім царстве жывуць легенды, паданні, народныя павер’і. Вось гудзе і кружыцца падвей, брыдзе па дзікім лесе касматы лясун; белы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

месяц цягне з возера срэбныя ніці, у якіх русалкі заблыталі свае косы; залёг у ціне, спіць на дне ракі вадзянік. Хараство рэальнай прыроды не псуюць гэтыя міфічныя істоты. М. Багдановіч цудоўна перадае фарбы і гукі прыроды. Яго вабіць час змяркання, пераходу дзённага святла ў цемень і золак, “той дзень, што мае нарадзіцца, і знікшы дзень”. Музыка прыроды — музыка сэрца паэта, яго душэўныя перажыванні і думы — гучыць у вершы “Па-над белым пухам вішняў...”:

Па-над белым пухам вішняў,
Быццам сіні аганёк,
Б’ецца, ўецца шпаркі, лёгкі
Сінякрылы матылёк...
Не паняць таго ніколі,
Не разведаць, не спазнаць:
Не даюць мне думаць зыкі,
Што ляцяць, дрыжаць, звіняць.

Аб светлай пары лета з навальніцамі і спякотай, аб усходзе сонца і жнівеньскім вечары, бяскрайнім жытнёвым моры, рознакаляровых красках на ўзмежках і пожнях, аб летняй ночы з светлячкамі, аб рыбнай лоўлі гучаць радкі В. Вярбы, А. Вялюгіна, Р. Ігнаценкі, Т. Хадкевіча, В. Віткі, М. Танка, К. Кірэенкі, Ю. Свіркі.

Тужлівая восень з навальніцамі і дажджамі, непаўторнымі фарбамі лясоў, вераснёўскімі вечарамі знайшла сваё адлюстраванне ў творчасці амаль усіх паэтаў і празаікаў як старэйшага, так і малодшага пакалення. Восень выклікае глыбокі роздум аб жыцці. Прыгадаем пачатак верша “Восень” П. Панчанкі:

Сляды гарачыні
Яшчэ на тварах носім,
Ды паплылі ўжо дні
У залатую восень.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Самотны крык гусей
Даносіцца з-пад воблак.
У асмужанай красе
Твой бачу, восень, воблік.

Нямала слоў сказана пра зіму і белы снежань, які “мяккім пухам апрануў палі і луг”. У зімовых замалёўках зрокава ўспрымаеш нахіленыя пад цяжарам снегу сасновыя галіны, голыя сучкі дуба ці бярозы — зімні адпачынак прыроды, якая заснула толькі на міг і чакае свайго абуджэння.

Вясна, цудоўная пара года, што сімвалізуе сабой вечнае абнаўленне жыцця, апісана ў вершах Я. Купалы, М. Багдановіча, П. Панчанкі, П. Броўкі, празаічных творах М. Лынькова, І. Мележа, І. Шамякіна, І. Пташнікава, Б. Сачанкі, Я. Скрыгана і інш. Абуджэнне прыроды заўсёды з’яўляецца для чалавека доўгачаканай падзеяй. З надыходам вясны ажываюць у нашых душах даўнія мары і спадзяванні. Нам хочацца бясконца любавацца гэтым ажыўшым пасля доўгага зімовага сну наваколлем, любіць і кахаць, ствараць велічныя гімны прыродзе, а таксама любіць яе і шанаваць. Без гэтага можа здарыцца так, што чалавек аднойчы не пачуе ранішняй песні жаўрука, не сарве ў полі прыгожай кветкі, не заслухаецца начнымі трэлямі салаўя. Ці будзе наша прырода такой жа, як сёння, непаўторнай і багатай, — залежыць ад чалавека. Нам неабходна з выключнай адказнасцю ставіцца да ўсяго навакольнага, зрабіць кожны куточак зямлі лепшым, прыгажэйшым. Хараство прыроды павінна радаваць не толькі нас, але і нашых нашчадкаў. Прырода сёння не можа выстаяць перад нястрымным наступам тэхнікі. Яна патрабуе абароны. А абараніць прыроду — значыць абараніць жыццё, абараніць Радзіму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 144

## БУДЗЕ, БУДЗЕ ДА СКОНУ МНЕ ЧАРНОБЫЛЬ БАЛЕЦЬ...

Вясна заўсёды цешыць душу, нясе радасць, надзею. З кожнай вясной чалавек як бы нараджаецца зноў. Вясна ж 1986-га прынесла бяду. Гэты год, як калісьці ваенны 1941-ы, прайшоўся пякучым болем па лёсе амаль кожнага беларуса. Ён усклаў на плечы яшчэ адно выпрабаванне, прымусіў іншымі вачыма глянуць вакол сябе.

І зусім інакш глядзім мы сёння на знаёмыя абрысы карты Беларусі. Цяпер ужо чорнымі плямамі афарбаваны яны. А ў іх Хойнікі, Брагін, Краснаполле, Чачэрск... І часцей ужо можна пачуць выразы “зона забруджання”, “зона адсялення”... А чым вымераць гора людзей, якія вымушаны пакінуць магілы родных, хаты дзяцінства, вёскі, дзе кожны сусед быў братам? Багаты палескі край аказаўся безабаронным і сам пачаў несці пагрозу людзям. І ўжо пустымі аканіцамі сустракаюць гасцей пакінутыя вёскі. Пустазеллем пакрыліся палеткі. І галасы птаства ўжо не вабяць чалавечыя душы...

У зоне адчужэння і адсялення засталіся родныя вёскі І. Мележа (Глінішча) і М. Мятліцкага (Бабчын). Мікола Мятліцкі аднойчы сказаў, што паэтам яго зрабіў Чарнобыль. Напэўна, гэта так. Паслячарнобыльскія кнігі паэта (“Шлях чалавечы”, “Палескі смутак”) — гэта памяць жывога жыцця на зямлі. Іх шчымлівыя вершы асабліва кранаюць і трывожаць, бо да драбніц уваскрашаюць страчанае, вяртаюць у родныя мясціны.

Адным з першых адгукнуўся на чарнобыльскую трагедыю, якую часта называюць беларускай Хірасімай, Рыгор Барадулін. У “Зажураным трыпціху” ён перадае прадчуванне чалавекам таго, што родная зямля, яе песні могуць “у радыеактыўным пыле задыхнуцца”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Пазней з’явіліся творы А. Вялюгіна (“Вясна трывогі нашай”), М. Танка (“Пасля аварыі”), В. Зуёнка (“Касмічная вестка”, “Атамная малітва”), У. Някляева (”Зона”), С. Законнікава (“Чорная быль”), Я. Сіпакова (“Одзіум”), І. Пташнікава (“Львы”), А. Грачанікава (“Ах, Чарнобыль”), А. Зэкава (“Аварыя сумлення”) і мн. інш.

Раман І. Шамякіна “Злая зорка” — першы празаічны твор пра чарнобыльску бяду ў беларускай літаратуры. Дзеянне ў рамане адбываецца ў адным з раёнаў Гомельскай вобласці. Увесь цяжар чарнобыльскай аварыі абрушваецца на плечы старшыні райвыканкама Пыльчанкі, якому прыходзіцца высяляць людзей з атручанай зоны. Крытычна аўтар паказвае кіруючую сістэму рэспублікі, на сумленні работнікаў якой перакрэсленыя чалавечыя жыцці, пакалечаныя лёсы, страчаныя надзеі.

С. Законнікаў у паэме “Чорная быль” спрабуе асэнсаваць прычыны трагедыі, заклікае да барацьбы з безадказнасцю і беспрынцыповасцю, папярэджвае аб наступленні духоўнага Чарнобыля:

Калі ж і зараз ты не загукаеш,
А будзеш жыць пад страхам і прынукай,
Чарнобыль не такі яшчэ чакае
Тваю зямлю, тваіх дзяцей і ўнукаў.

Аўтар паэмы паказвае трагічны лёс старых людзей, якія ўсё жыццё пражылі на гэтый зямлі, а зараз вымушаны ехаць на чужыну. Паэт нагадвае выпадак з бабуляй, якую затрымалі ў зоне забруджання. Ёй напомнілі, што навокал радыяцыя, а старая “выцірала слёзы чорнай ссохлай жменькай”:

Дзеці не пускалі, уцякла, як злодзей.
Самі мае ножанькі прывялі дадому...

Страшна глядзець на апусцелыя вёскі, пакінутыя хаты, непрыбраныя хлебныя палі, жывёл, якіх не можа выратаваць чалавек, на сонца, якое нібы “адарвалася ад неба, а зямля не прымае яго, і яно павісла. І гэтак будзе вісець. І не здолее ўзысці, страціўшы сілу”. Драматычным напалам, пачуццём адказнасці за ўсё, што адбываецца на роднай зямлі, патрабаваннем праўды жыцця, няхай суровай і горкай, поўняцца радкі паэмы С. Законнікава:

Маўчыць, нібы камень, зямля,
Палын невядомасцю свеціць...
Што будзе, што будзе пасля? —
Не скажа ніхто ў гэтым свеце.
Ёсць праўда адна — праўдай жыць,
Няхай і суровай, і горкай...
У небе над намі стаіць,
Як зніч, палыновая зорка.

Чарнобыльская трагедыя — боль, смутак, крык чалавечай душы, плач, выміранне. А яшчэ гэта пакаранне за нашы недарэчныя ўчынкі, безгаспдарлівыя адносіны да ўсяго навакольнага. Там, дзе народ не гаспадар сваёй зямлі, дзе няма нацыянальнага ўсведамлення, лёгка адбыцца непапраўнай бядзе. У Бібліі ёсць такія словы: “Трэці Анёл пратрубіў, і ўпала з неба вялікая Зорка, якая гарэла падобна свяцільні, і ўпала на трэцюю частку рэк і на крыніцы вод. Імя той зоркі — палын (чарнобыль), і трэцяя частка вод зрабілася палыном, і многія з людзей памерлі ад вод, таму што яны сталі горкімі”. Калі здарылася аварыя ў Чарнобылі, людзі прыгадалі гэтае выказванне з Бібліі. Я. Сіпакоў, успрымаючы чарнобыльскую бяду як несправядлівую д’ябальскую кару, як экалагічную катастрофу, звяртаецца да Усявышняга з просьбай заступіцца за Беларусь і яе цярплівых пакутнікаў, быць літасцівым да іх. Паэта не

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пакідае надзея на неператожнасць і бясконцасць жыцця: “І ўсё ж падай, семя, на маю зняможаную зямлю! І прарастай. І спялі такую патрэбную нам зараз надзею. Бо калі ёсць бяда, трэба, каб была і надзея” (паэма “Одзіум”).

Сёння ўсе мы разам і кожны паасобку адказваем за тое, што адбываецца на Зямлі. Мы павінны зрабіць усё магчымае, каб дапамагчы людзям выжыць пасля той трагедыі. Мы павінны захаваць цудоўны прыродны скарб для нашых нашчадкаў. Але і праз гады, у новым і шчаслівым жыцці, як папрок, як напамін, як папярэджанне, маленькім чырвоным сцягам будзе пульсаваць зорка Чарнобыля.

**145**

НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА...

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.
*Я. Купала*

Спадчына! Якое простае слова і які няпросты яго сэнс! Спадчына — гэта наша мінулае, наша памяць. Сапраўды, цяжка ўявіць сабе чалавека без гісторыі, без кроўных сувязей з роднай зямлёй, без адчування сваіх вытокаў, без памяці, без роду і племені. Давайце ж пройдземся сцежкамі памяці беларускага народа, прыгадаем яго спадчыну.

Гісторыя нашай зямлі багатая на падзеі і імёны. Панараму духоўнага жыцця ў XII ст. нельга ўявіць без князёўны, ігуменні Ефрасінні Полацкай, якая ў юнацкія гады пастрыглася ў манашкі і стала выдатнай асветніцай, а пасля была прылічана да святых і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прызнана нябеснаю апякункай Беларусі. На залатую пару, зорны час старажытнай беларускай культуры прыпадае дзейнасць выдатных дзеячаў нашай мінуўшчыны Францішка Скарыны (друкара і перакладчыка на беларускую мову 23 кніг Бібліі), Міколы Гусоўскага (аўтара “Песні пра зубра”), Льва Сапегі (стваральніка Статута 1588 года). Жывуць у свядомасці беларусаў, не паміраюць праз многія стагоддзі такія постаці, як Усяслаў Чарадзей, Кірыла Тураўскі, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Лявонцій Карповіч, Мялецій Сматрыцкі, Лаўрэнцій Зізаній, Сімяон Полацкі, Кастусь Каліноўскі.

Самыя запаветныя думы і мары беларускага народа выказалі ў сваіх творах Ф. Багушэвіч, Цётка, Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч. Крыштальна-агністыя пацеркі іх вершаў можна нанізаць на нітку памяці, найярчэй на ёй будуць ззяць радкі-заклікі да беларусаў “людзьмі звацца”.

Спадчына — гэта народныя звычаі і культура, якія складваліся вякамі ў беларускім народзе і якія засталіся нам. Спадчына — гэта наша родная мова, у якой увасоблена духоўнае жыццё народа — яго гісторыя, яго слава і веліч, яго мінулае і сучаснае. Калі памірае мова народа, паміраюць яго песні, казкі і паданні, памірае яго літаратура і культура. Памірае яго душа. “Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі”, — папярэджваў больш за сто гадоў назад Ф.Багушэвіч. Шкада толькі, што шлях гэтых слоў да сэрцаў беларусаў быў занадта доўгім.

Ад былых пакаленняў нам засталася дзіўная і непаўторная прырода. Ёсць на Беларусі бязмежныя палі і лясы, прыгожыя рэкі і азёры... І мы павінны пакінуць у спадчыну нашым нашчадкам не водгулле чарнобыльскай трагедыі, не збяднелую зямлю, а шчодрыя і

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўрадлівыя палі, крыштальна чыстыя рэкі і азёры. Бацькоўская зямля павінна быць заўсёды такой, як у вершы Я. Купалы:

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.
Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам.

Нам засталася спадчына багатая і разнастайная, цікавая і загадкавая. Той, хто хоча зразумець дух свайго народа, павінен ведаць яго вытокі. Спадчына можа навучыць нас цаніць вечнае, духоўнае. І нам неабходна вярнуць і адрадзіць страчанае, рассеяць цемру людскога непаразумення, змагацца ў імя будучага. Хіба не да гэтага заклікаў нас У. Караткевіч?

Унукі Скарыны,
Дзе ваш гонар, моц і краса?
Ёсць і ў вас, як у іншых, святыня.
Не давайце святыні псам!
Не давайце з яе глуміцца,
Бо праспіць яна ясну зару,
Бо святы ізумруд заімгліцца
У пярсцёнку тваім, Беларусь.

“Са старажытных цудоўных камянёў складаюцца прыступкі будучыні”, — гаварыў мастак і філосаф М. Рэрых. Без мінулага немагчыма ні сучаснае, ні будучае. Мінулае — гэта пачатак. Сучаснае і будучыня — працяг. Мінулае — гэта карані, сучаснае — само дрэва, а будучае — плод. І як дрэва і плод немагчымы без каранёў, так сучаснае і будучае немагчымы без мінулага, без памяці, без спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**146**

## КОЖНЫ З НАС ВЫБІРАЕ СЦЯЖЫНУ ЖЫЦЦЯ...

Нашто жыве і ў дыме гіне вулей,
Нашто стагоддзі беспрасветных мук?!
*У. Караткевіч*

У саму чалавечую натуру самой прыродай закладзена непазбежнасць роздуму аб жыцці і нормах, якіх неабходна прытрымлівацца дзеля таго, каб жыць “правільна”. Звычайна іх называюць мараллю.

Аднак тое, што ў адным грамадстве лічыцца нармальным, у другім можа ўспрымацца як ненармальнасць або дзікунства. Дзе мяжа гэтаму паняццю? Дзе адказ на гэтае пытанне, якое хвалюе чалавека праз усё ягонае жыццё? Так, чалавек смяротны і, як трапна заўважыў адзін з герояў М. Булгакава, “смяротны раптоўна”. А тэрмін, які складаецца з імгнення паміж мінулым і будучым, бывае занадта малым, каб можна было ім грэбаваць.

“Усё пакінуць след павінна”, — сцвярджае Пятрусь Броўка ў вершы “Сляды”. Сваім творам паэт даносіць да чытача ўніверсальны закон светабудовы, згодна з якім усё, што створана прыродай, павінна хоць нешта пакінуць на зямлі. А ад чалавека, які лічыць сябе “вянцом прыроды”, гэты закон патрабуе найвялікшай адказнасці за зробленае ў жыцці. І ўзнагарода за чэсна пражытыя дні — добрая памяць пра чалавека і захаванне адбіткаў ягоных спраў, думак, мараў і перажыванняў у сэрцах тысяч і тысяч людзей.

І дзеля гэтага не абавязкова здзяйсняць нейкі подзвіг. Дастаткова быць чэсным, адкрытым і прыязным чалавекам, які

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

любіць свет і сябе ў гэтым свеце, і таму не раўнадушны да яго лёсу. Тым больш, што з бязмежнага мора чалавечых узаемаадносін і стасункаў цяжка вылучыць тое, па чым “звоняць званамі”, і тое, што ўзносяць “пад гукі фанфараў”. Відаць, большае значэнне мае не адзінкавы, здзейснены на вачах у людзей подзвіг, а той, які працягваецца праз усё жыццё — як жыццё Ефрасінні Полацкай.

Жывеш не вечна, чалавек,--
Перажыві ж у момант век! —

заклікаў нас Максім Багдановіч.

Увесь да дна трэба выпіць свой келіх жыцця —
Ці з вадой жыватворнай, ці з ядам, —

пісаў у свой час Янка Купала.

Але ж ці варта катаваць сябе, пакутаваць у пошуку ісціны, калі зручней быць вужакай, якой заўсёды цёпла і сытна? Канец жа для ўсіх адзін — смерць. А калі б чалавек быў неўміручым! Мыгчыма, тады ўсё ў ім было б у парадку: сядзі сабе дома, думай, выбірай лепшы варыянт — наперадзе ж цэлая вечнасць! “Не, і тады чалавек не змяніў бы натуры,” — сцвярджае К. Крапіва ў сваёй фантастычнай камедыі “Брама неўміручасці”. Галоўны герой твора прафесар Дабрыян адкрыў закон неўміручасці. Здзейснілася спрадвечная мара чалавецтва. Але адразу ж узнікаюць новыя невырашальныя праблемы — “як пагадзіць рамантычную мару жыць вечна з празаічнай праблемай, чым карміць людзей, у што апранаць?”, “як паўплывае неўміручасць на этыку, каханне, мараль, шлюб?”

Але людзей мала хвалююць гэткія “нязначныя” пытанні, яны ашалела імкнуцца да аднаго — любым чынам аказацца сярод тых, хто можа разлічваць на несмяротнасць. У фінале камедыі, як і варта было чакаць, усе застаюцца ля разбітага карыта: ім не пад сілу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

разбурыць галоўны закон прыроды — закон адмірання старога і нараджэння новага. “Падтэкстам п’есы, — лічыць вядомы літаратурны крытык Р. Шкраба, — з”яўляецца думка аб тым, што чалавек можа абяссмерціць сваё імя добрымі справамі, сумленным жыццём”.

Матыў суадносін жыцця і смерці ніколі не страціць сваёй актуальнасці, чалавек зноў і зноў будзе звяртацца да вечнай праблемы. Акурат гэтай тэме прысвечаны твор Ул. Караткевіча “Ладдзя роспачы”. Галоўны герой твора Гервасій Выліваха так любіў жыццё, што нават смерць не адолела яго. Дасціпнасць, прыродная мудрасць Гервасія уступаюць у паядынак з халоднай, няўмольнай разважлівасцю Смерці. “Чалавек толькі тады чалавек, калі ён дзёрзка рве панылае наканаванне і плюе на “спрадвечны закон”, — гаворыць галоўны герой.

Але наўрад ці здольны нехта, акрамя літаратурнага персанажа, паўтарыць тое ж самае. Мы — частка прыроды. І зусім не абавязкова быць богам, каб жыць па-боску, у згодзе з людзьмі і сваім сумленнем. Проста трэба памятаць, што ўсе мы імкнёмся да шчасця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**147**

БУДУЧАЕ ПАЧЫНАЕЦЦА СЁННЯ

Будучае... Яно заўсёды цікавіла людзей, хвалявала іх уяўленне сваёй містычнай таемнасцю, турбавала невядомасцю і непрадказальнасцю. Аднак яшчэ ў антычныя часы людзі пачалі разумець, што, калі ў будучае нельга зазірнуць, то на яго можна і патрэбна паўплываць сваімі ўчынкамі і ідэямі сёння. Пры гэтым заўсёды паўстае пытанне маральнага выбару: прынясуць пэўны

ўчынак ці добрая, на першы погляд, ідэя дабро ці зло? І тут усё будзе залежаць ад чалавека, ад таго, якія каштоўнасці ў яго за душой. Адзін вучоны змог раскрыць таямніцы ядзернай рэакцыі — даў людзям магчамасць атрымліваць шмат таннай энергіі, але знайшоўся і другі вучоны — скарыстаў гэтае адкрыццё для стварэння ядзернай зброі. Дзе мяжа паміж дабром і злом? Знакаміты вучоны, стваральнік Тэорыі адноснасці Альберт Эйнштэйн знішчыў перад смерцю ўсе дадзеныя аб сваіх вельмі важных адкрыццях, якія дапамаглі б чалавецтву вырашыць шмат праблем. Аднак ён разумеў, што гэтыя адкрыцці людзі могуць скарыстаць у іншых мэтах — для знішчэння сабе падобных. Эйнштэйн зрабіў выбар, бо не быў упэўнены ў тым, што ягоныя вынаходствы прынясуць толькі карысць. І хто ведае — можа гэты выбар адной асобы выратаваў чалавецтва? І вельмі важна, каб душы людзей былі чыстымі і светлымі. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывае літаратура — яна не толькі выхоўвае, але і закладвае асновы светапогляду, папярэджвае зло. Усім добра вядомыя словы чэшскага пісьменніка Юліуса Фучыка: “Людзі, будзьце пільнымі!” Ён папярэджвае пра небяспеку распаўзання фашызму па ўсім свеце. На жаль, яшчэ і сёння гэтыя словы не пачуты ўсімі людзьмі.

Або згадаем творы Камю і Сартра. Сваёй творчасцю яны папярэджваюць аб іншай небяспецы — аб разбурэнні грамадства, аб чалавечай адзіноце і непатрэбнасці нікому, аб росквіце самых дзікунскіх чалавечых інстынктаў.

Не з’яўляецца тут выключэннем і беларуская літаратура. Дзеля будучых пакаленняў пісалі свае творы, выдавалі кнігі Ф. Скарыны і М. Гусоўскі, В. Цяпінскі і С. Будны, Ф. Багушэвіч і Цётка, Я. Колас, Я. Купала і шмат іншых выдатных прадстаўнікоў нашага народа. Кожны з іх у меру сваіх магчымасцяў працаваў дзеля будучыні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кожны яе ў нечым прадавызначаў. Ф. Скарына паклаў пачатак кнігадрукаванню на роднай мове, М. Гусоўскі стварыў найвыдатнейшы твор пра Беларусь на лацінскай мове, С. Будны выдаў першы беларускі катэхізіс. З Ф. Багушэвіча, М. Багдановіча, Я. Купалы і Я. Коласа пачалася новая Беларусь. Ва ўсе часы ў беларускай культуры самымі надзейнымі былі пытанні мовы і нацыянальнага самавызначэння беларусаў. Яшчэ С. Будны і В. Цяпінскш ў сваіх “Прадмовах...” папярэджвалі паноў і шляхту аб небяспецы вырачэння сваіх каранёў, адцурання ад мовы і культуры зямлі, якая дала жыццё. Такія людзі заўсёды выклікалі толькі пагарду. Менавіта вобраз такога чалавека стварыў Я. Купала ў “Тутэйшых”: паказаў, у што ператвараецца той, хто саромеецца свайго беларускага паходжання; ён нібы між небам і зямлёй — адарваўся ад роднае глебы, але і не дасягнуў чужога неба. Такая асоба нянавісць да сваёй культуры заўсёды пераўтварае ў разбуральную сілу. Я. Купала прадбачыў тое вынішчэнне, якое напаткала ўсё беларускае праз некалькі год пасля напісання “Тутэйшых”.

Гэтая тэма атрымала сваё далейшае развіццё ў літаратуры 20-30-х гадоў. Прыгадаем аповесць М. Зарэцкага “Голы звер”, у якой аўтар стварыў вобраз нахабнага, эгаістычнага, разбэшчанага маладога чалавека. Ягонае сапраўднае аблічча схавана за знешняй прыстойнасцю і шляхетнасцю. Ці не гэткія паводзіны былі характэрны не тое што для чалавека — для ўсёй нашай былой вялікай краіны яшчэ ў нядаўнія часы? А пісьменнік прадбачыў гэта яшчэ ў 20-я гады. І як тут абысці ўвагай знакамітыя “Запіскі Самсона Самасуя” Андрэя Мрыя?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гэты твор аказаўся настолькі дасціпным і праўдзівым, што толькі нядаўна знайшоў дарогу да масавага чытача. Зрэшты, ён ува многім застаецца актуальным і сёння. Прыклады можна доўжыць бясконца. Але заўсёды паўстае пытанне: чаму людзі амаль ніколі не прыслухоўваюцца да папярэджанняў? Відаць, таму, што не разумеюць — любое папярэджанне, успрынятае чалавецтвам, змяняе яго будучыню да лепшага.

Так, мы самі прадвызначаем сваю будучыню. Яна — адбітак нашых сённяшніх і ўчарашніх спраў, учынкаў, імкненняў, жаданняў і думак.

**148**

## УСЁ ПАКІНУЦЬ СЛЕД ПАВІННА...

Усё пакінуць след павінна,
Бо, як пачаўся белы свет,
Прамень, пясчынка і расіна
Нязменна пакідаюць след.
*П. Броўка*

Старажытныя рымляне гаварылі: “Думай пра смерць”. А навошта пра яе думаць? Мы ж яшчэ маладыя, і наперадзе — цэлае жыццё. І ўсё ж такі трэба думаць. Чалавечае жыццё не вечнае. А ў канцы жыццёвай дорогі кожны з нас павінен адказаць на пытанні: “Для чаго я жыў? Які след пакінуў пасля сябе?..”

Пад словамі “след на зямлі” мы разумеем не адбітак босай нагі на мокрым пяску і не помнік на могілках, а нейкія ўчынкі, справы чалавека, па якіх яго маглі б помніць. Існуе ж мудрае выказванне, што чалавек пражыў жыццё не дарэмна, калі пабудаваў дом, пасадзіў дрэва, выгадаваў сына. І яшчэ — чалавек павінен пакінуць сваім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

нашчадкам не разбураную і разрабаваную зямлю, а цудоўны свет, у якім яны маглі б жыць і гадаваць сваіх дзяцей.

Усё жывое імкнецца да сонца. Цягнуцца да сонца лісты, кветкі, дрэвы... Без сонца не могуць існаваць ні жывёлы, ні птушкі, ні людзі. Жыццё на зямлі наогул немагчыма без сонца. Гэта неаспрэчная ісціна. Чалавек жа нараджаецца не толькі для таго, каб есці і піць. Для яго імкненне да сонца — гэта імкненне да сваёй мэты, жаданне яе здзейсніць.

У маладосці, па словах Я. Коласа, “сотні новых, шчаслівых дарог рассцілае жыццё прад табою”. Які ж шлях выбраць у гэтым бязмежным жыцці? Чаму прысвяціць сябе? Адразу і не адкажаш на гэтыя пытанні. Але адно несумненна. Чалавек павінен жыць дзеля дабра. Ён павінен быць патрэбным людзям. У гэтым яго найвялікшае шчасце. Высакародную мэту паставіў перад сабой Андрэй Лабановіч — герой трылогіі Якуба Коласа “На ростанях”. Для яго “намацаць галінамі сонца” — гэта значыць зрабіць жыццё людзей лепшым, ніколі не адступацца ад праўды, не ісці на кампраміс са сваім сумленнем. Ён думае аб дабраўпарадкаванні зямлі, гаспадарскім яе выкарыстанні, аб тым, каб людзі маглі карыстацца вынікамі ўласнай працы. Шукаючы ў бурлівым жыцці сваю дарогу, Лабановіч часта задумваўся над спрадвечнымі філасофскімі пытаннямі: што такое жыццё? У чым яго сэнс? Для чаго чалавек жыве на зямлі? Адказам на іх стаў асноўны жыццёвы прынцып героя твора: “Чалавек павінен жыць для дабра, ён павінен быць карысным людзям”.

Нямала разважанняў аб лёсе чалавека і яго прызначэнні на зямлі і ў творах Уладзіміра Жылкі. У час грозных бітваў чалавек павінен быць свабодалюбівым, непакорным, з бунтарскім духам. Толькі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тады магчыма перамога. “Лепш быць пакутнікам, жабраком, чым рабом”, — сцвярджае паэт у вершы “Ляпей жабрацкі лёс”.

П. Панчанка ў вершы “Той дзень прапаў...” лічыць непатрэбным жыццё без дабрыні, спагады, чуласці, сардэчнасці, міласэрнасці.

Той дзень прапаў і страчаны навекі,
Калі ты не зрабіў таго, што мог;
Калі не паспрыяў ты чалавеку,
Няшчыры быў, зманіў, не дапамог.
Той дзень збяднеў, зліняў на сотню радуг
І, попелам пасыпаны, сканаў,
Калі не падзяліў з суседам радасць
І больш за дзень узяў ты, чым аддаў.

Чалавечае жыццё ў параўнанні з вечнасцю — міг. І пражыць яго, лічыць М. Багдановіч, трэба ярка, хвалююча. Хіба можна прайсці па жыцці, “не пакінуўшы свайго ценю на сцяне?” Гэтыя словы В. Гюго М. Багдановіч выкарыстаў у якасці эпіграфа да верша “Жывеш не вечна, чалавек...”

Жывеш не вечна, чалавек, —
Перажыві ж у момант век!
Каб хвалявалася жыццё,
Каб больш разгону ў ім было,
Каб цераз край душы чуццё
Не раз, не два пайшло!
Жыві і цэльнасці шукай,
Аб шыраце духоўнай дбай.

У складаны час напярэдадні XXI ст. чалавек, на думку Анатоля Вярцінскага, павінен жыць у імя “высокага неба ідэала”. Асэнсоўваючы вечныя праблемы чалавечага існавання, маральныя каштоўнасці жыцця, услаўляючы духоўную веліч чалавека, выкрываючы абыякавасць, самазадаволенасць, А. Вярцінскі сцвярджае:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Жыццё даецца, каб жыццё тварыць,
Не марнаваць, не нішчыць, не бурыць, —
Тварыць!

“Жыццё пражыць — не поле перайсці”, — так гучыць народная мудрасць. І з ёй нельга не пагадзіцца. Чалавеку, як Ікару, трэба расправіць крылы і здзейсніць намечанае, пакінуць пасля сябе добрыя справы. Ефрасіння Полацкая пакінула пасля сябе славуты крыж. Муры Сафійскага сабора помняць добрыя ўчынкі князя Усяслава Чарадзея. Ф. Скарына пакінуў нашчадкам 23 кнігі Бібліі, М. Гусоўскі — тры паэмы і каля 10 вершаў, М. Багдановіч — зборнік вершаў “Вянок”. Справе нацыянальна-вызваленчага руху аддаў усяго сябе К. Каліноўскі, пакінуўшы свой наказ беларускаму народу ў “Пісьме з-пад шыбеніцы”. Самыя запаветныя і выпакутаваныя думкі Я. Купалы і Я. Коласа засталіся ў многіх іх кнігах.

Паэты і пісьменнікі ўсіх пакаленняў і часоў задумваліся над сэнсам чалавечага жыцця, давалі самыя розныя адказы на складаныя філасофскія пытанні. Для большасці з іх “намацаць галінамі сонца” — гэта здзейсніць намечанае, пакінуць пасля сябе добрую памяць. “Чым цягнецца вышэй у неба дрэва — глыбей ідуць карэнні ў зямлю”, — праўдзіва заўважыў у адным са сваіх вершаў Рыгор Барадулін. Імкненне да ідэалу, высокага і прыгожага, узвышае душу чалавека, робіць жыццё паўнакроўным, асэнсаваным, змястоўным.

Зорка ці метэарыт, згараючы, пакідаюць за сабой след. І чалавек не павінен бясследна знікнуць з Зямлі. Які ж след пакіне пасля сябе сённяшні малады чалавек, цалкам залежыць ад яго самога.

Вы выйшлі ўдалеч, маладыя
Вам доўга крочыць праз гады.
Не забывайцеся ж, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вы пакідаеце сляды.

**149**

## РАДЗІМА МАЯ — БЕЛАРУСЬ

Радзіма мая — Беларусь

Да вас іду, адважныя, палеглыя.
І разам з вамі за народ свой б'юся.
І праз усе нягоды і адлегласці
Нам свецяць вочы роднай Беларусі.
Л. Дайнека

Бацькаўшчына, Радзіма, Айчына, бацькоўская зямля, родная старонка — такімі шчырымі словамі мы называем той адзіны і непаўторны куточак на зямлі, дзе нарадзіліся, выраслі, спазналі першыя радасці і няўдачы, адкрылі шырыню і прыгажосць свету. І куды б не закінуў нас лёс у сталым узросце, нам ніколі не пазбыцца тугі па малой Радзіме, заўсёды будзем вяртацца мы да яе ва ўспамінах і снах як да крыніцы сваёй душы.

Думаючы пра бацькоўскі дом, калыску маленства, мы думаем пра Беларусь — вялікую Радзіму. Пачуўшы назву Беларусь, многія адразу ўяўляюць магутнага зубра ці белага бусла, які ляціць над зямлёй, раскінуўшы шырокія крылы. Нездарма сваю вядомую кнігу пра Беларусь У. Караткевіч назваў "Зямля пад белымі крыламі". Першыя звесткі пра Беларусь няцяжка адшукаць у "Аповесці мінулых гадоў", "Жыціі" Ефрасінні Полацкай, летапісах XIV — XVII ст. З іх вядома, што першая беларуская дзяржава — Полацкае княства — пачала сваё існаванне ў часы княжанне Рагвалода (другая палова X ст.). Гэта была цалкам самастойная дзяржава з усімі адпаведнымі атрыбутамі: суверэннай уладай князя і веча, адміністрацыяй, сталіцай, войскам, грашовай сістэмай. У ёй развіваліся шматлікія рамёствы, гандаль, высокага росквіту

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дасягнула мастацтва, адукацыя дойлідства. У Полацкім княстве жыла славутая дачка беларускага народа, князёўна, перапісчыца і перакладчыца кніг Ефрасіння Полацкая. Тут нарадзіўся першадрукар, вучоны і асветнік, культурны дзеяч эпохі Адраджэння Францішак Скарына.

На долю Беларусі выпалі цяжкія выпрабаванні. За сваю шматвяковую гісторыю яна перажыла шмат войнаў. Не дапусціў беларускі народ на сваю зямлю татара-манголаў, змагаўся ён з крыжакамі і шведамі, граміў войскі Напалеона ў 1812 годзе, перамог у Вялікай Айчыннай вайне 1941 — 1945 гг. Гэтыя падзеі беларускай гісторыі адлюстраваны ў шматлікіх творах У. Караткевіча, А. Лойкі, К. Тарасава, Я. Сіпакова, У. Арлова, Л. Дайнекі, В. Чаропкі, В. Быкава, А. Савіцкага, І. Чыгрынава, Я. Брыля і многіх іншых пісьменнікаў. І ўсе мы павінны асэнсаваць мнагалучную сувязь чалавека з гісторыяй народа і, па словах У. Караткевіча, “не пагарджаць святым мінулым, а заслужыць яшчэ і вартым быць яго”. Той, хто забывае сваю гісторыю, бяднее, ператварае сваё жыццё ў шумнае сіроцкае існаванне без каранёў, без вытокаў, і, значыць, без будучыні.

У беларускай літаратуры, напэўна, няма такіх пісьменнікаў, у творах якіх не знайшлося хаця б некалькі радкоў-прызнанняў у шчырай любові да бацькоўскай зямлі, адданасці і вернасці ёй. “Маленства край! Ты з намі да скanання, чысты, святы, як першае каханне”, — пісаў пра сваю Навагрудчыну славуты Адам Міцкевіч. З Бацькаўшчынай звязаны самыя светлыя надзеі і спадзяванні Янкі Купалы, яго мары аб шчасці і свабодзе беларускага народа. Паэт заўсёды адчуваў сябе неадлучнай “мільённай часцінкай” роднай нівы. Бацькаўшчына для яго — гэта і “вясеннія праталіны, і лесу

шэлест верасны, і ў полі дуб апалены”, і “стары амшалы тын”, і рэчка “з плытнікамі Нёман”, і “пушчы Белавежскай гоман”... Любоў да радзімы, на думку паэта, напаўняе жыццё чалавека глыбокім сэнсам. І гэтым пачуццём неабходна даражыць, не трэба імкнуцца шукаць шчасця-долі “на чужым, далёкім полі”, “за шумным лесам-борам, за шырокім сінім морам”. Бацькаўшчына — гэта самы вялікі скарб, які беларусы павінны зберагчы і захаваць для нашчадкаў.

Адчуванне сваёй непарыўнай лучнасці з бацькоўскай зямлёю, злітаванне свайго духоўнага свету з народнай душою дапамагаюць беларускім пісьменнікам ярка, шматфарбна і шчыра-ўзнёсла пісаць вялікую кнігу жыцця роднай краіны. Шмат было іх, не прызнаных сыноў і дачок Айчыны, якіх яшчэ зусім нядаўна мы бяздумна, з усёй бескарыслівасцю беларускай душы, аддавалі суседнім культурам. Але, на шчасце, усвядомілі, што патрыёт — гэта не толькі той, хто размаўляе і стварае па-беларуску, што нашы польскамоўныя і рускамоўныя землякі могуць быць не меншымі за нас патрыётамі. Нарэшце, нас пачала цікавіць не знешняя, моўная, прымета, а нешта больш існае, сутнаснае — душа творцы. І таму сёння мы не маем права таго ж Адама Міцкевіча або Яна Баршчэўскага ўспрымаць як пасынкаў нашаў культуры. “Літва, Айчына мая!” — усклікаў ліцвін А. Міцкевіч, вялікі геній беларускай зямлі, карані паэтычнага таленту якога жывіліся з навагрудскіх крыніц.

Вобраз малой радзімы — невялічкая пясчынка ў акіяне чалавечага сусвету, але менавіта ён дапамагае чалавеку выстаяць і захаваць сваю годнасць перад тварам зменлівага лёсу. Ён — той патаемны куток людскае душы, у які не дадзена заглянуць нікому, акрамя самога чалавека. Гэта і святая любоў, і боль, і сумненне, гэта само жыццё. Таму, па словах П. Панчанкі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Кожны з нас прыпасае Радзімы куток,
Каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны —
Дым над хатай, снапамі прыціснуты ток,
Матчын спеў і гароды, прапахлыя кмінам...

Для П. Панчанкі Бацькаўшчына — “зямля бацькоўская, святая”, “увесь народ”, краіна, што прыходзіць у сны, хмарою праплывае, птушкай садзіцца “на ціхі клён, звонкім дажджом” ападае (вершы “Зямля бацькоў”, “Краіна мая”).

Многія пісьменнікі пад словам Бацькаўшчына разумеюць і родную мову, і культуру, гісторыю беларускага народа, яго эпас, фальклор, народныя звычаі і традыцыі... І з імі нельга не пагадзіцца, бо наша Бацькаўшчына — гэта не толькі мы, якія жывуць сёння, але і тыя, хто аблюбаваў калісьці гэты блаславёны Богам край , — нашы прашчуры. Бацькаўшчына — гэта наша мінуўшчына, сучаснасць і будучыня, гэта Беларусь у прасторы і часе, у нашых думках, памкненнях і сэрцах. Радзіма — гэта наш беларускі Космас, наш духоўны Сусвет, аснова, без якой мы — дым на папялішчы. І мы павінны захаваць скарб, дадзены нам самім Усявышнім на шчасную долю, зберагчы для нашчадкаў і зуброў з буслямі, і старыя вежы, і цішыню пушчы, і міласэрнасць, і чалавечнасць... І ў гэтым заключаецца хаця б невялікі, але подзвіг кожнага з нас.

**150**

## БЫВАЙ, XX СТАГОДДЗЕ!..

Хоць змрочны далягляд перад вачыма
І цяжкі камень на душы ляжыць,
Спяваць без хвалявання немагчыма,
Без спадзявання немагчыма жыць.
*С. Грахоўскі*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як хутка, да крыўднага хутка і няўмольна ляціць час! Здаецца, толькі ўчора сустракалі 1999 год, ускладвалі на яго новыя спадзяванні, мары, жаданні. А ўжо на падыходзе чарговы — год надзвычай знамянальны, выніковы. Ён распачынае першае стагоддзе ўжо трэцяга тысячагоддзя  жыцця чалавецтва пасля нараджэня Ісуса Хрыста. І калі нашы далёкія прашчуры лічылі за шчасце сагрэцца каля вогнішча, то сучасны чалавек імкнецца пакарыць час, стаць поўным гаспадаром у сусвеце. Што ж прынесла чалавецтву XX стагоддзе? У чым яго адметнасць у гісторыі? Што перанясуць у наступнае стагоддзе нашы сучаснікі?

Літаратура і мастацтва даволі поўна і ўсебакова адлюстравала жыццё чалавека ў гэты складаны і супярэчлівы перыяд. Пачатак нашага стагоддзя азнаменаваўся першай сусветнай вайной, рэвалюцыяй, калектывізацыяй, усталяваннем дыктатуры пралетарыяту і ваяўнічым разгулам злачыннай  ідэлогіі. Гэта быў час нараджэння і разбурэння штучных ідэалаў, таталітарнага знішчэння палітычных іншадумцаў, рэлігійных і культурных дзеячаў, вайскоўцаў, навукоўцаў. Пра жорсткасць і бесчалавечнасць вайны праўдзіва і з дакументальнай падрабязнасцю расказаў М. Гарэцкі ў аповесці “На імперыялістычнай вайне”, пра калектывізацыю пісалі П. Галавач (“Спалох на загонах”), У. Дубоўка (“Штурмуйце будучыні аванпосты!”), М. Зарэцкі (“Вязьмо”), І. Мележ (“Палеская хроніка”). У аповесці В. Быкава “Аблава” знайшоў адлюстраванне перыяд, калі вынішчаліся лепшыя прадстаўнікі сялянства, тыя людзі, якія хацелі жыць на зямлі сваіх продкаў, працаваць на ёй, гадаваць дзяцей. Прымусовай жа радзімай для іх сталі неабжытыя сібірскія прасторы, таёжная глухамань.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

XX стагоддзе ўвойдзе ў гісторыю як стагоддзе кантрастаў. Гэта перыяд распаду каланіяльнай сістэмы, перамогі над раней невылечнымі хваробамі, асваення касмічнай прасторы, развіцця камп'ютэрнай тэхнікі і інтэрнэту. А побач з гэтым — дзве сусветныя і шэраг лакальных войнаў, новыя, пакуль што непераможныя хваробы, пагроза тэрмаядзернай вайны, аварыя на Чарнобыльскай станцыі і іншыя экалагічныя катастрофы. Пра хуткаплыннасць гэтага "жорсткага" і "бяздушнага" стагоддзя, пра надыход новай эпохі піша Павел Канаш:

Жорстка і горача —
"Новага! Новага!" —
век праскрыпеў, уздымаючы пыл.
Пад скрыгатанне суперкамп'ютэраў,
пад шаргатанне рухавых машын,
перавышаючы і абганяючы,
абагульняючы і ачышчаючы,
век асляпляльны з хуткасцю
атамнай прагрукатаў, —
і знік.

Адзін з герояў п'есы Г. Багданавай "Рамантычнае падарожжа", разважаючы пра тое, што чакае чалавека, грамадства, беларускі народ у наступным тысячагоддзі,спадзяецца: "Можа, дасць Бог, крыві меней пральецца, чым у бяздушным дваццатым". Маладога паэта М. Скоблу не пакідаюць думкі пра страты беларусамі сваіх духоўных каштоўнасцей, пра іх адступніцтвы і выраканні:

Праўды святой супольніцы —
кнігі Скарыны, Буднага,
Крыж Еўфрасінні Полацкай...
"Страчана..."

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“Знішчана...”

“Згублена...”

Літаратура, з’яўляючыся люстэркам і адбіткам жыцця чалавека і грамадства, не абышла ўвагай і чарнобыльскую аварыю. У творах В. Зуёнка (“Атамная малітва”), У. Някляева (”Зона”), С. Законнікава (“Чорная быль”), Я. Сіпакова (“Одзіум”), І. Пташнікава (“Львы”), А. Грачанікава (“Ах, Чарнобыль”), А. Зэкава (“Аварыя сумлення”), І. Шамякіна (“Злая зорка”), В. Карамазава (“Краем Белага Шляху”) асэнсоўваюцца прычыны трагедыі, якая ўспрымаецца як бездань смерці, праява злых чараў і цемры, пакаранне за раўнадушша, абыякавае стаўленне чалавека да прыроды.

Кідаючы развітальны позірк у ХХ стагоддзе, нельга не ўзгадаць слаўныя імёны заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, якія змагаліся за права беларусаў “людзьмі звацца”. Творчасць гэтых пісьменнікаў з’яўляецца своеасаблівым летапісам жыцця, працы і барацьбы беларускага народа на розных этапах яго гістарычнага развіцця. Іх імёны, як і імёны іншых выдатных дзеячаў беларускай культуры і навукі, застануцца ў памяці ўдзячных нашчадкаў не толькі ў ХХІ, але і наступных стагоддзях.

Да надыходу ХХІ стагоддзя засталося не так многа дзён. Многім з нас здаецца, што ў новым тысячагоддзі нас чакае нязведаная і загадкавая будучыня. Кожнаму простаму чалавеку хочацца, каб яна была светлай і радаснай, каб на зямлі ўсталяваліся мір і спакой, каб выбухі бомбаў і лязгат зброі засталіся ў мінулым. Аб гэтым заўсёды марылі лепшыя розумы чалавецтва. Але ж, як вядома, паміж задумаю і яе ўвасабленнем у жыццё часам ляжыць доўгі і пакутлівы шлях. У канцы ХХ стагоддзя людзі нарэшце прыйшлі да высновы, што чалавек не заваёўнік, не пакарыцель

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прыроды, а яе неад'емная часцінка, што ён нясе адказнасць за вынікі сваіх навуковых адкрыццяў, за існаванне ўсяго жывога на зямлі і будучыню самога чалавецтва. У вяртанні да сваёй нацыянальнай існасці, памяці пра свае карані і вытокі, шанаванні ўсяго роднага — гарантыя таго, што, гістарычная спадчына і культура беларусаў, іх мова ніколі не стануць музейнымі экспанатамі. У гэты складаны час мы павінны верыць у мудрасць чалавека, яго здольнасць захаваць для будучых пакаленняў крыштальна чыстую ваду, стронгавыя рэкі, крыштальнае неба і незабруджаную глебу. “Пі, як продак піў з крынічкі, кожнай кропляй даражы!” — з такою просьбаю звяртаецца да нашых сучаснікаў  паэт Алесь Пісьмянкоў.

У новае тысячагоддзе мы павінны прыйсці з поўным усведамленнем мнагалучнай сувязі чалавека з прыродай, неабходнасці яе абароны, абароны жыцця наогул, усведамленнем свайго непасрэднага ўдзелу ў гэтай абароне і стварэнні новага жыцця, лепшага і  шчаслівейшага. І тады наступіць мір і згода для ўсяго жывога на Зямлі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

З м е с т

АД АЎТАРА **Ошибка! Закладка не определена.**
АГУЛЬНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА НАПІСАННЯ САЧЫНЕННЯЎ **Ошибка! Закладка не определена.**
МАГЧЫМЫЯ ТЭМЫ САЧЫНЕННЯЎ **Ошибка! Закладка не определена.**
Т Э К С Т Ы С А Ч Ы Н Е Н Я Ў **Ошибка! Закладка не определена.**
1 **Ошибка! Закладка не определена.**
ДЗЯДЫ — ВЫТОКІ КОЖНАГА НАРОДА **Ошибка! Закладка не определена.**
2 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПОСТАЦІ ДАЛЁКАЙ МІНУЎШЧЫНЫ **Ошибка! Закладка не определена.**
3 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПА СТАРОНКАХ ТВОРАЎ ПРА МІНУЛАЕ **Ошибка! Закладка не определена.**
4 **Ошибка! Закладка не определена.**
НЯБЕСНАЯ ЗАСТУПНІЦА БЕЛАРУСІ ЕФРАСІННЯ ПОЛАЦКАЯ **Ошибка! Закладка не определена.**
5 **Ошибка! Закладка не определена.**
БЕЛАРУСКІ “ЗЛАТАВУСТ” КІРЫЛА ТУРАЎСКІ **Ошибка! Закладка не определена.**
6 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАДЗЕІ І ФАКТЫ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТОРЫІ Ў “СЛОВЕ ПРА ПАХОД ІГАРАЎ” **Ошибка! Закладка не опреде**
7 **Ошибка! Закладка не определена.**
БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАЕ ЛЕТАПІСАННЕ **Ошибка! Закладка не определена.**
8 **Ошибка! Закладка не определена.**
ФРАНЦІШАК СКАРЫНА — ВЫДАТНЫ ПРАДСТАЎНІК БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ ЭПОХІ АДРАДЖЭННЯ **Ошибка! Закладка не определена.**
9 **Ошибка! Закладка не определена.**
СЫМОН БУДНЫ І ВАСІЛЬ ЦЯПІНСКІ — ПРАДАЎЖАЛЬНІКІ ТРАДЫЦЫЙ Ф. СКАРЫНЫ **Ошибка! Закладка не определена.**
10 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЭМА МІКОЛЫ ГУСОЎСКАГА “ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА” **Ошибка! Закладка не определена.**
11 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗ КНЯЗЯ ВІТАЎТА Ў ПАЭМЕ М. ГУСОЎСКАГА “ПЕСНЯ ПРА ЗУБРА” **Ошибка! Закладка не опреде.**
12 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЛЕМІЧНАЯ ЛІТАРАТУРА (КАНЕЦ XVI — ПАЧАТАК XVII СТ.) **Ошибка! Закладка не определена.**
13 **Ошибка! Закладка не определена.**
РЭЛІГІЙНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МЯЛЕЦІЯ СМАТРЫЦКАГА **Ошибка! Закладка не определена.**
14 **Ошибка! Закладка не определена.**
ЛІТАРАТУРНАЯ СПАДЧЫНА СІМЯОНА ПОЛАЦКАГА **Ошибка! Закладка не определена.**
15 **Ошибка! Закладка не определена.**
ДЗЕЙНАСЦЬ ШКОЛЬНЫХ ТЭАТРАЎ **Ошибка! Закладка не определена.**
16 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗ ПАЛЯСОЎШЧЫКА ТАРАСА Ў ПАЭМЕ “ТАРАС НА ПАРНАСЕ” **Ошибка! Закладка не определена.**
17 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЭМА В. РАВІНСКАГА “ЭНЕІДА НАВЫВАРАТ” **Ошибка! Закладка не определена.**
18 **Ошибка! Закладка не определена.**
МІНУЛАЕ ВУЧЫЦЬ НАС, ЯК ЖЫЦЬ СЁННЯ” (ПА ТВОРАХ ЯНА БАРШЧЭЎСКАГА) **Ошибка! Закладка не**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

19 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТВОРЧАСЦЬ ЯНА ЧАЧОТА **Ошибка! Закладка не определена.**
20 **Ошибка! Закладка не определена.**
ЖАЎРУКОВАЯ ПЕСНЯ ПАЎЛЮКА БАГРЫМА **Ошибка! Закладка не определена.**
21 **Ошибка! Закладка не определена.**
“КАБ ЗБЫЦЬ НЯВОЛІ ПУТЫ...” (ДЗЕЙНАСЦЬ ФІЛАМАТАЎ І ФІЛАРЭТАЎ)**Ошибка! Закладка не определе**
22 **Ошибка! Закладка не определена.**
“ЛІРНІК ЗЯМЛІ БЕЛАРУСКАЙ” (ТВОРЧАСЦЬ УЛАДЗІСЛАВА СЫРАКОМЛІ)**Ошибка! Закладка не опреде.**
23 **Ошибка! Закладка не определена.**
“ІДЫЛІЯ” В. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА **Ошибка! Закладка не определена.**
24 **Ошибка! Закладка не определена.**
ГУМАНІСТЫЧНЫ ПАФАС ПАЭМЫ В. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА “ ГАПОН”**Ошибка! Закладка не определе**
25 **Ошибка! Закладка не определена.**
КРЫТЫКА ЦАРСКАЙ СУДОВАЙ БЮРАКРАТЫІ Ў КАМЕДЫІ В. ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА “ПІНСКАЯ ШЛЯХТА” **Ошибка! Закладка не определена.**
26 **Ошибка! Закладка не определена.**
ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ К. КАЛІНОЎСКАГА І ЯГО РЭВАЛЮЦЫЙНА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ **Ошибка! Закладка не определена.**
27 **Ошибка! Закладка не определена.**
Ф. БАГУШЭВІЧ — АБАРОНЦА ПРАВОЎ ПРЫГНЕЧАНАГА БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСТВА **Ошибка! Закладка не определена.**
28 **Ошибка! Закладка не определена.**
“НЕ ПАКІДАЙЦЕ Ж МОВЫ НАШАЙ БЕЛАРУСКАЙ, КАБ НЕ ЎМЁРЛІ”**Ошибка! Закладка не определена.**
(Ф. БАГУШЭВІЧ) **Ошибка! Закладка не определена.**
29 **Ошибка! Закладка не определена.**
ЖЫЦЦЁВЫ ШЛЯХ АЛІНДАРКІ — АДЛЮСТРАВАННЕ ГОРКАЙ ДОЛІ ПРАЦОЎНАГА НАРОДА (ПА ПАЭМЕ Ф. БАГУШЭВІЧА “КЕПСКА БУДЗЕ!”)**Ошибка! Закладка не определе**
30 **Ошибка! Закладка не определена.**
“НЕ Я ПЯЮ — НАРОД БОЖЫ” (ТВОРЧАСЦЬ ЯНКІ ЛУЧЫНЫ)**Ошибка! Закладка не определена.**
31 **Ошибка! Закладка не определена.**
РЭВАЛЮЦЫЙНА-ВЫЗВАЛЕНЧЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ ЦЁТКІ**Ошибка! Закладка не определена.**
32 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА РЭВАЛЮЦЫІ Ў АПАВЯДАННІ ЦЁТКІ “ПРЫСЯГА НАД КРЫВАВЫМІ РАЗОРАМІ” **Ошибка! Закладка не определена.**
33 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА МАСТАКА І МАСТАЦТВА Ў ПАЭМЕ ЯНКІ КУПАЛЫ “КУРГАН”**Ошибка! Закладка не определена.**
34 **Ошибка! Закладка не определена.**
МАТЫВЫ ТРАГІЗМУ Ў ДРАМАТЫЧНЫХ ПАЭМАХ ЯНКІ КУПАЛЫ “АДВЕЧНАЯ ПЕСНЯ” І “СОН НА КУРГАНЕ” **Ошибка! Закладка не определена.**
35 **Ошибка! Закладка не определена.**
УСЛАЎЛЕННЕ НАРОДНАЙ ГЕРАІНІ БАНДАРОЎНЫ Ў АДНАЙМЕННАЙ ПАЭМЕ ЯНКІ КУПАЛЫ **Ошибка! Закладка не определена.**
36 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗ СЫМОНА Ў ДРАМЕ Я. КУПАЛЫ “РАСКІДАНАЕ ГНЯЗДО”**Ошибка! Закладка не определена.**
37 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗЫ ПАЎЛІНКІ І ПАНА БЫКОЎСКАГА Ў КАМЕДЫІ ЯНКІ КУПАЛЫ “ПАЎЛІНКА” **Ошибка! Закладка не определена.**
38 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА БЕЛАРУСІ Ў ЛІРЫЦЫ Я. КУПАЛЫ ПЕРШАГА ПАСЛЯРЭВАЛЮЦЫЙНАГА ДЗЕСЯЦІГОДДЗЯ **Ошибка! Закладка не определена.**
39 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАКАЗ ТРАГІЧНАГА ЛЁСУ НАРОДНАГА ПАЭТА Ў ПАЭМЕ ЯНКІ КУПАЛЫ “ТАРАСОВА ДОЛЯ” **Ошибка! Закладка не определена.**
40 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТУТЭЙШЫЯ Ў АДНАЙМЕННАЙ ТРАГІКАМЕДЫІ ЯНКІ КУПАЛЫ**Ошибка! Закладка не определена.**
41 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА ПАЭТА І ПАЭЗІІ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ КУПАЛЫ **Ошибка! Закладка не определена.**
42 **Ошибка! Закладка не определена.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ І ВОБРАЗЫ ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЛІРЫКІ ЯКУБА КОЛАСА**Ошибка! Закладка не**
43 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЭМА ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ” — ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКАГА СЯЛЯНСТВА Ў ДАРЭВАЛЮЦЫЙНЫ ЧАС **Ошибка! Закладка не определена.**
44 **Ошибка! Закладка не определена.**
ЖЫЦЦЁВАЯ ДАРОГА МІХАЛА (ПАЭМА ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ”)**Ошибка! Закладка не опреде**
45 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗ ДЗЯДЗЬКІ АНТОСЯ Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ”**Ошибка! Закладка не определе**
46 **Ошибка! Закладка не определена.**
НЕЗАБЫЎНЫ СВЕТ МАЛЕНСТВА (ДЗЕЦІ Ў “НОВАЙ ЗЯМЛІ” ЯКУБА КОЛАСА)**Ошибка! Закладка не опре**
47 **Ошибка! Закладка не определена.**
КАРЦІНЫ ПРЫРОДЫ Ў ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА “НОВАЯ ЗЯМЛЯ”**Ошибка! Закладка не определена.**
48 **Ошибка! Закладка не определена.**
БЕЛАРУСКІ МУЗЫКА-АРФЕЙ (ПА ПАЭМЕ ЯКУБА КОЛАСА “СЫМОН-МУЗЫКА”)**Ошибка! Закладка не о**
49 **Ошибка! Закладка не определена.**
ДУХОЎНЫ СВЕТ, МАРАЛЬНАЯ ВЫСАКАРОДНАСЦЬ АНДРЭЯ ЛАБАНОВІЧА (ТРЫЛОГІЯ Я.КОЛАСА “НА РОСТАНЯХ”) **Ошибка! Закладка не определена.**
50 **Ошибка! Закладка не определена.**
СЯЛЯНЕ-ПАЛЕШУКІ І ІНТЭЛІГЕНЦЫЯ Ў ТРЫЛОГІІ ЯКУБА КОЛАСА “НА РОСТАНЯХ” **Ошибка! Закладка не определена.**
51 **Ошибка! Закладка не определена.**
“КАЗКІ ЖЫЦЦЯ” ЛЮДСКОГА... (АЛЕГАРЫЧНЫЯ АПАВЯДАННІ ЯКУБА КОЛАСА)**Ошибка! Закладка не**
52 **Ошибка! Закладка не определена.**
НАРОД І РАДЗІМА Ў ЛІРЫЦЫ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА **Ошибка! Закладка не определена.**
53 **Ошибка! Закладка не определена.**
ЛІРЫКА КАХАННЯ Ў ПАЭЗІІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА **Ошибка! Закладка не определена.**
54 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАТРЫЯТЫЧНЫ ГІМН БЕЛАРУСІ (“ПАГОНЯ” М. БАГДАНОВІЧА)**Ошибка! Закладка не определена.**
55 **Ошибка! Закладка не определена.**
Творчасць Алеся Гаруна **Ошибка! Закладка не определена.**
56 **Ошибка! Закладка не определена.**
“У ВАСКРОСШУЮ ВЕРЫЦЬ КРАІНУ...” (ТВОРЧАСЦЬ ЦІШКІ ГАРТНАГА)**Ошибка! Закладка не определен**
57 **Ошибка! Закладка не определена.**
АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ ТВОРЧАСЦІ ЗМІТРАКА БЯДУЛІ **Ошибка! Закладка не определена.**
58 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗ САМСОНА САМАСУЯ Ў РАМАНЕ А. МРЫЯ “ЗАПІСКІ САМСОНА САМАСУЯ”. **Ошибка! Закладка не определена.**
59 **Ошибка! Закладка не определена.**
“ГЛЯДЖУ Я Ў ПОТНАЕ АКНО ВЯЛІКАЙ БУДУЧЫНІ...” (ТВОРЧАСЦЬ МІХАСЯ ЧАРОТА) **Ошибка! Закладка не определена.**
60 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВЯЛІКАЯ ПРОЗА МІХАСЯ ЗАРЭЦКАГА **Ошибка! Закладка не определена.**
61 **Ошибка! Закладка не определена.**
БРАМУ СКАРБАЎ СВАІХ АДЧЫНЯЮ... (ТВОРЧАСЦЬ М. ГАРЭЦКАГА)**Ошибка! Закладка не определена.**
62 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТВОРЧЫ ШЛЯХ ПЛАТОНА ГАЛАВАЧА **Ошибка! Закладка не определена.**
63 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЧЫНАЛЬНІК ВЯЛІКАЙ ПРОЗЫ (ТВОРЧАСЦЬ ЯДВІГІНА Ш.)**Ошибка! Закладка не определена.**
64 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПЕРШЫ НАРОДНЫ АРТЫСТ БЕЛАРУСІ (ДРАМАТУРГІЧНАЯ СПАДЧЫНА УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА) **Ошибка! Закладка не определена.**
65 **Ошибка! Закладка не определена.**
МАЙСТЭРСТВА КАНДРАТА КРАПІВЫ — БАЙКАПІСЦА **Ошибка! Закладка не определена.**
66 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВЫКРЫЦЦЁ ГАРЛАХВАЦКАГА І ГАРЛАХВАТЧЫНЫ Ў КАМЕДЫІ КАНДРАТА КРАПІВЫ “ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ” **Ошибка! Закладка не определена.**
67 **Ошибка! Закладка не определена.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ПРАБЛЕМА ДАБРА І ЗЛА Ў КАМЕДЫІ КАНДРАТА КРАПІВЫ “БРАМА НЕЎМІРУЧАСЦІ” **Ошибка! Закладка не определена.**
68 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПА СТАРОНКАХ ТВОРАЎ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА **Ошибка! Закладка не определена.**
69 **Ошибка! Закладка не определена.**
ЦІ БЫЎ МІХАЛ ТВАРЫЦКІ ВОРАГАМ НАРОДА? (ПА РАМАНЕ К. ЧОРНАГА “ТРЭЦЯЕ ПАКАЛЕННЕ”) **Ошибка! Закладка не определена.**
70 **Ошибка! Закладка не определена.**
“... І СЯБЕ АСУДЗІЎ НА ПАКУТЫ” (ТВОРЧАСЦЬ ПЯТРА ГЛЕБКІ)**Ошибка! Закладка не определена.**
71 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЭЗІЯ ВОГНЕННЫХ ГАДОЎ **Ошибка! Закладка не определена.**
72 **Ошибка! Закладка не определена.**
“О БЕЛАРУСЬ, МАЯ ШЫПШЫНА...” (ТВОРЧАЦЬ УЛАДЗІМІРА ДУБОЎКІ)**Ошибка! Закладка не определен**
73 **Ошибка! Закладка не определена.**
МАТЫВЫ І ВОБРАЗЫ ПАЭЗІІ УЛАДЗІМІРА ЖЫЛКІ **Ошибка! Закладка не определена.**
74 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВАСЬКА ШКЕТАЎ І ВАНЬКА РАЗАНСКІ Ў АПАВЯДАННІ М. ЛЫНЬКОВА “НАД БУГАМ” **Ошибка! Закладка не определена.**
75 **Ошибка! Закладка не определена.**
СТРАТЫ ЗАХАРА КРЫМЯНЦА Ў ЗМАГАННІ ЗА СПРАВЯДЛІВАЕ ЖЫЦЦЁ (АПОВЕСЦЬ М. ЛЫНЬКОВА “СУСТРЭЧЫ”) **Ошибка! Закладка не определена.**
76 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЭЗІЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ ВАЕННЫХ ГАДОЎ **Ошибка! Закладка не определена.**
77 **Ошибка! Закладка не определена.**
АНТЫВАЕННАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ ПАЭМЫ П. БРОЎКІ “ГОЛАС СЭРЦА”**Ошибка! Закладка не определен**
78 **Ошибка! Закладка не определена.**
ДАВЕРАСНЁЎСКАЯ ЛІРЫКА МАКСІМА ТАНКА **Ошибка! Закладка не определена.**
79 **Ошибка! Закладка не определена.**
АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫЯ МАТЫВЫ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА**Ошибка! Закладка не определена.**
80 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА МАСТАКА І МАСТАЦТВА Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА ТАНКА**Ошибка! Закладка не определена.**
81 **Ошибка! Закладка не определена.**
АСНОЎНЫЯ ТЭМЫ І ВОБРАЗЫ ПАСЛЯВАЕННАЙ ЛІРЫКІ А. КУЛЯШОВА**Ошибка! Закладка не определе**
82 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЭМА А. КУЛЯШОВА “СЦЯГ БРЫГАДЫ” **Ошибка! Закладка не определена.**
83 **Ошибка! Закладка не определена.**
“У ПАЭТА НЯМА ЗАБАРОНЕНАЙ ЗОНЫ” (ПАТРЫЯТЫЧНЫЯ І ГРАМАДЗЯНСКІЯ МАТЫВЫ Ў ПАСЛЯВАЕННЫХ ТВОРАХ П. ПАНЧАНКІ) **Ошибка! Закладка не определена.**
84 **Ошибка! Закладка не определена.**
“Я ВЯРНУСЯ ТУДЫ, ДЗЕ МОЙ НАРОД” (ПА РАМАНЕ Я. БРЫЛЯ “ПТУШКІ І ГНЁЗДЫ”) **Ошибка! Закладка не определена.**
85 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВЫСАКАРОДНАСЦЬ ГЕРОЯЎ У АПАВЯДАННЯХ Я. БРЫЛЯ “МАЦІ” І “MEMENTO MORI” **Ошибка! Закладка не определена.**
86 **Ошибка! Закладка не определена.**
ШЧАСЦЕ... У ЧЫМ ЯНО? (ПАВОДЛЕ АПАВЯДАННЯ Я. БРЫЛЯ “ГАЛЯ”)**Ошибка! Закладка не определена**
87 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЛЕСКАЯ ВЁСКА 20-Х ГАДОЎ (“ПАЛЕСКАЯ ХРОНІКА” І. МЕЛЕЖА)**Ошибка! Закладка не определена.**
88 **Ошибка! Закладка не определена.**
ДРАМА ВАСІЛЯ ДЗЯТЛА (ПА “ПАЛЕСКАЙ ХРОНІЦЫ” І. МЕЛЕЖА)**Ошибка! Закладка не определена.**
89 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗ ГАННЫ (“ПАЛЕСКАЯ ХРОНІКА” ІВАНА МЕЛЕЖА) **Ошибка! Закладка не определена.**
90 **Ошибка! Закладка не определена.**
ШЛЯХІ-ДАРОГІ ПЯТРА ШАПЯТОВІЧА І САШЫ ТРАЯНАВАЙ (ПА ПЕНТАЛОГІІ І. ШАМЯКІНА “ТРЫВОЖНАЕ ШЧАСЦЕ”) **Ошибка! Закладка не определена.**
91 **Ошибка! Закладка не определена.**
ГАРТАЮЧЫ СТАРОНКІ ТВОРАЎ ІВАНА ШАМЯКІНА **Ошибка! Закладка не определена.**
92 **Ошибка! Закладка не определена.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

АПОВЕСЦЬ ІВАНА ШАМЯКІНА “АХВЯРЫ” **Ошибка! Закладка не определена.**
93 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗЫ ПЕТРАКА І СЦЕПАНІДЫ (АПОВЕСЦЬ В. БЫКАВА “ЗНАК БЯДЫ”)**Ошибка! Закладка не опреде**
94 **Ошибка! Закладка не определена.**
“СВАЕ” І ЧУЖЫЯ Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “ЗНАК БЯДЫ” **Ошибка! Закладка не определена.**
95 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВЫЯЎЛЕННЕ САПРАЎДНАЙ СУТНАСЦІ ЧАЛАВЕКА Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “АБЕЛІСК” **Ошибка! Закладка не определена.**
96 **Ошибка! Закладка не определена.**
ДУХОЎНЫ ВЫБАР ГЕРОЯЎ У АПОВЕСЦІ ВАСІЛЯ БЫКАВА “СОТНІКАЎ”**Ошибка! Закладка не определе**
97 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВОБРАЗ ЯГОРА АЗЕВІЧА (АПОВЕСЦЬ ВАСІЛЯ БЫКАВА “СЦЮЖА”)**Ошибка! Закладка не определена.**
98 **Ошибка! Закладка не определена.**
НОВЫЯ ТВОРЫ ВАСІЛЯ БЫКАВА **Ошибка! Закладка не определена.**
99 **Ошибка! Закладка не определена.**
“ЛЮБЛЮ ЎСЕ КОЛЕРЫ ЖЫЦЦЯ” (ТВОРЧАСЦЬ СЯРГЕЯ ГРАХОЎСКАГА)**Ошибка! Закладка не определе**
100 **Ошибка! Закладка не определена.**
“А ЧАСУ БОЛЬШ, ЧЫМ ВЕЧНАСЦЬ...” (ТВОРЧАСЦЬ МАСЕЯ СЯДНЁВА)**Ошибка! Закладка не определена**
101 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВАЙНА І СУЧАСНАСЦЬ У ТВОРАХ ІВАНА НАВУМЕНКІ **Ошибка! Закладка не определена.**
102 **Ошибка! Закладка не определена.**
ГІСТАРЫЧНАЕ МІНУЛАЕ Ў ПРОЗЕ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА**Ошибка! Закладка не определена.**
103 **Ошибка! Закладка не определена.**
РАМАНТЫЧНЫ ГЕРОЙ У РАМАНТЫЧНЫХ АБСТАВІНАХ (ПА РАМАНЕ У. КАРАТКЕВІЧА“КАЛАСЫ ПАД СЯРПОМ ТВАІМ”) **Ошибка! Закладка не определена.**
104 **Ошибка! Закладка не определена.**
ДРАМАТУРГІЧНАЯ СПАДЧЫНА АНДРЭЯ МАКАЁНКА **Ошибка! Закладка не определена.**
105 **Ошибка! Закладка не определена.**
НАДЗЁННАСЦЬ ПРАБЛЕМ, УЗНЯТЫХ У КАМЕДЫІ А. МАКАЁНКА “ВЫБАЧАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА!” **Ошибка! Закладка не определена.**
106 **Ошибка! Закладка не определена.**
“ЖЫЦЦЁ — ВЫПРАБАВАННЕ ЧАЛАВЕКА НА ЧАЛАВЕЧНАСЦЬ” (ТВОРЧАСЦЬ АЛЯКСЕЯ ДУДАРАВА) **Ошибка! Закладка не определена.**
107 **Ошибка! Закладка не определена.**
САТЫРЫЧНАЯ КАМЕДЫЯ М. МАТУКОЎСКАГА “АМНІСТЫЯ”**Ошибка! Закладка не определена.**
108 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАЭЗІЯ НІЛА ГІЛЕВІЧА **Ошибка! Закладка не определена.**
109 **Ошибка! Закладка не определена.**
ІДЭЙНА-ТЭМАТЫЧНАЯ НАКІРАВАНАСЦЬ РАМАНА Ў ВЕРШАХ Н. ГІЛЕВІЧА “РОДНЫЯ ДЗЕЦІ” **Ошибка! Закладка не определена.**
110 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТРЭБА ДОМА БЫВАЦЬ ЧАСЦЕЙ... (ПА ТВОРАХ РЫГОРА БАРАДУЛІНА)**Ошибка! Закладка не определена**
111 **Ошибка! Закладка не определена.**
АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ ТВОРЧАСЦІ ГЕНАДЗЯ БУРАЎКІНА **Ошибка! Закладка не определена.**
112 **Ошибка! Закладка не определена.**
“ТЫ МОЙ БОЛЬ СВЯТЫ, БЕЛАРУСЬ МАЯ...” (ТВОРЧАСЦЬ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ)**Ошибка! Закладка не опре**
113 **Ошибка! Закладка не определена.**
АСНОЎНЫЯ МАТЫВЫ ТВОРЧАСЦІ СЯРГЕЯ ЗАКОННІКАВА**Ошибка! Закладка не определена.**
114 **Ошибка! Закладка не определена.**
ІВАН ЧЫГРЫНАЎ — ПРАЗАІК І ДРАМАТУРГ **Ошибка! Закладка не определена.**
115 **Ошибка! Закладка не определена.**
“З МСЦІЖАЎ БАЧНЫ СВЕТ...” (ТВОРЧАСЦЬ ІВАНА ПТАШНІКАВА)**Ошибка! Закладка не определена.**
116 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПАД МІРНЫМ НЕБАМ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ (ТВОРЧАСЦЬ БАРЫСА САЧАНКІ)**Ошибка! Закладка не опреде**
117 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА ВАЙНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АЛЕСЯ АДАМОВІЧА **Ошибка! Закладка не определена.**
118 **Ошибка! Закладка не определена.**
”ХАРАСТВО І БОЛЬ ЖЫЦЦЯ” (ТВОРЧАСЦЬ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА)**Ошибка! Закладка не определена**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

119 **Ошибка! Закладка не определена.**
“МНЕ Ў ДУШУ СТАГОДДЗЯЎ ГЛЯНУЦЬ ХОЧАЦЦА” ТВОРЧАСЦЬ ЛЕАНІДА ДАЙНЕКІ) **Ошибка! Закладка не определена.**
120 **Ошибка! Закладка не определена.**
“Я — СВЯДОМАСЦЬ...” (ПАЭЗІЯ АЛЕСЯ РАЗАНАВА) **Ошибка! Закладка не определена.**
121 **Ошибка! Закладка не определена.**
ЖЫЦЦЁ ДАЕЦЦА, КАБ ЖЫЦЦЁ ТВАРЫЦЬ ... (ПА ТВОРАХ АНАТОЛЯ ВЯРЦІНСКАГА) **Ошибка! Закладка не определена.**
122 **Ошибка! Закладка не определена.**
СЛЯДЫ, ШТО ПАКІНУЎ НАВЕКІ ШЛЯХ НАШ СУРОВЫ (ПА ТВОРАХ ГЕНРЫХА ДАЛІДОВІЧА) **Ошибка! Закладка не определена.**
123 **Ошибка! Закладка не определена.**
“КРЫЖ ПАКУТАЎ І ПАМЯЦІ” (ТВОРЧАСЦЬ ВІКТАРА КАЗЬКО)**Ошибка! Закладка не определена.**
124 **Ошибка! Закладка не определена.**
МЕМУАРНАЯ І ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ПРОЗА Ў СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРЫ**Ошибка! Закладка не определен**
125 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА РАДЗІМЫ Ў ПАЭЗІІ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ **Ошибка! Закладка не определена.**
126 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТВОРЧЫ ШЛЯХ НАТАЛЛІ АРСЕННЕВАЙ **Ошибка! Закладка не определена.**
127 **Ошибка! Закладка не определена.**
“ПАКУЛЬ ЗЯМЛЯ ТВАЯ ЖВАЯ, І ТЫ — ЖЫВЫ” (ТВОРЧАСЦЬ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА)**Ошибка! Закладка не**
128 **Ошибка! Закладка не определена.**
ДЗЕНЬ СЁННЯШНІ І МІНУЛЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АЛЯКСЕЯ КАРПЮКА**Ошибка! Закладка не определена.**
129 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПРЫРОДА І ЧАЛАВЕК У ТВОРАХ ВІКТАРА КАРАМАЗАВА **Ошибка! Закладка не определена.**
130 **Ошибка! Закладка не определена.**
ВЕЧНЫ ЖУРАЎЛІНЫ КРЫК (ТВОРЧАСЦЬ АЛЕСЯ ЖУКА) **Ошибка! Закладка не определена.**
131 **Ошибка! Закладка не определена.**
“І ЎСІХ ПРАЦЯГАЎ Я — ПАЧАТАК” (ТВОРЧАСЦЬ ВАСІЛЯ ЗУЁНКА)**Ошибка! Закладка не определена.**
132 **Ошибка! Закладка не определена.**
“ЛЮБОЎ МАЯ, ТЫ ПЕСНЯ І МАРКОТА...” (ТВОРЧАСЦЬ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ)**Ошибка! Закладка не опред**
133 **Ошибка! Закладка не определена.**
З ГІСТОРЫЯЙ НА “ВЫ” (ГІСТАРЫЧНАЯ ТЭМА Ў ТВОРЧСЦІ УЛАДЗІМІРА АРЛОВА)**Ошибка! Закладка н**
134 **Ошибка! Закладка не определена.**
СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ДРАМАТУРГІЯ (АГУЛЬНЫ АГЛЯД)**Ошибка! Закладка не определена.**
135 **Ошибка! Закладка не определена.**
СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ (АГУЛЬНЫ АГЛЯД) **Ошибка! Закладка не определена.**
136 **Ошибка! Закладка не определена.**
СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПРОЗА (АГУЛЬНЫ АГЛЯД) **Ошибка! Закладка не определена.**
137 **Ошибка! Закладка не определена.**
КОЛЬКІ ТАЛЕНТАЎ ЗВЯЛОСЯ... **Ошибка! Закладка не определена.**
138 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ **Ошибка! Закладка не определена.**
139 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ**Ошибка! Закладка не определена.**
140 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТЭМА КАХАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ **Ошибка! Закладка не определена.**
141 **Ошибка! Закладка не определена.**
ГІМН ЖАНЧЫНЕ-МАЦІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ **Ошибка! Закладка не определена.**
142 **Ошибка! Закладка не определена.**
ТАБЕ СКЛАДАЮ ШЧЫРЫ СВОЙ САНЕТ, ПРАПРАДЗЕДАЎ МАІХ ЖЫВАЯ МОВА**Ошибка! Закладка не о**
143 **Ошибка! Закладка не определена.**
ПРЫРОДА — КРЫНІЦА ПРЫГАЖОСЦІ **Ошибка! Закладка не определена.**
144 **Ошибка! Закладка не определена.**
БУДЗЕ, БУДЗЕ ДА СКОНУ МНЕ ЧАРНОБЫЛЬ БАЛЕЦЬ... **Ошибка! Закладка не определена.**
145 **Ошибка! Закладка не определена.**
НАМ ЗАСТАЛАСЯ СПАДЧЫНА... **Ошибка! Закладка не определена.**
146 **Ошибка! Закладка не определена.**


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

КОЖНЫ З НАС ВЫБІРАЕ СЦЯЖЫНУ ЖЫЦЦЯ... **Ошибка! Закладка не определена.**
147 **Ошибка! Закладка не определена.**
БУДУЧАЕ ПАЧЫНАЕЦЦА СЁННЯ **Ошибка! Закладка не определена.**
148 **Ошибка! Закладка не определена.**
УСЁ ПАКІНУЦЬ СЛЕД ПАВІННА... **Ошибка! Закладка не определена.**
149 **Ошибка! Закладка не определена.**
РАДЗІМА МАЯ — БЕЛАРУСЬ **Ошибка! Закладка не определена.**
150 **Ошибка! Закладка не определена.**
БЫВАЙ, ХХ СТАГОДДЗЕ!.. **Ошибка! Закладка не определена.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вучэбнае выданне

Старычонак Васіль Дзянісавіч

150 сачыненняў па беларускай літаратуры: У дапамогу абітурыентам і школьнікам

Рэдактар Т. С. Жыткевіч

Мастак вокладкі і мастацкі рэдактар

Тэхнічны рэдактар

Карэктар

Аператар

Падпісана да друку з арыгінала-макета

Фармат 84х108/32. Папера . Гарнітура

друк. Умоўн. друк. арк.

Умоўн. фарбаадбіт. Ул-выд. арк.

Тыраж 10 тыс. экз. Заказ

Дзяржаўнае прадпрыемства выдавецтва "Вышэйшая школа" Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 5 ад 16. 01. 93 г.

220048, Мінск, праспект Машэрава, 11

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ